Томас М. Бон

# «Мінскі феномен»

## Гарадское планаванне і ўрбанізацыя ў Савецкім Саюзе пасля 1945 г.



Бібліятэка часопіса
“Беларускі Гістарычны Агляд”

Томас М. Бон

# «Мінскі феномен»

## Гарадское планаванне і ўрбанізацыя ў Савецкім Саюзе пасля 1945 г.

Пераклад з нямецкай

Мінск
Выдавец Зміцер Колас
2016

УДК 94(476-25)
ББК 63.3(4Беи)
Б81

Серыя заснавана ў 1999 годзе

Каардынатар і адказны рэдактар Генадзь Сагановіч

Пераклад з нямецкай Марыі Рытановіч паводле выдання:

Thomas M. Bohn. Minsk – Musterstadt des Sozialismus. Stadtplanung und Urbanisierung in der Sowjetunion nach 1945. Köln, Weimar, Wien: Böhlau Verlag, 2008.

**Бон,** Т. М.

Б81 «Мінскі феномен». Гарадское планаванне і ўрбанізацыя ў Савецкім Саюзе пасля 1945 г. / Томас М. Бон; пер. з ням. мовы М. Рытановіч; навук. рэд. Г. Сагановіч. – Мінск : Выдавец Зміцер Колас, 2016. – 436 с., [14] арк. іл. : іл. – (Бібліятэка часопіса «Беларускі Гістарычны Агляд»).

ISBN 978-985-6992-89-9.

Нямецкі гісторык раскрывае феномен беларускай сталіцы як «сацыялістычнага горада», створанага пасля Другой сусветнай вайны. У кнізе на багатым архіўным матэрыяле разглядаюцца гарадское планаванне і архітэктура, урбанізацыя і міграцыя, і таксама жыллёвае пытанне і штодзённае жыццё горада. Аўтар супастаўляе жаданае і сапраўднае савецкай сістэмы.

**УДК 94(476-25)**
**ББК 63.3(4Беи)**

**ISBN 978-985-6992-89-9**

© Томас М. Бон, 2016.
© Выданне на беларускай мове. «Беларускі Гістарычны Агляд», 2016.
© Афармленне. Выдавец Зміцер Колас, 2016..

# Змест


**Прадмова да беларускага выдання** . . . 7

**I. Уводзіны** . . . 11

1 Аб'ект даследавання . . . 11
2 Пастаноўка мэты . . . 24
3 Літаратура і крыніцы . . . 33

**II. Перадумовы ўрбанізацыі ў Беларусі** . . . 45

1 Змена горадабудаўнічага ўзору ў Савецкім Саюзе . . . 45
2 Асаблівасці ўрбанізацыі ў Беларусі . . . 70
3 Гісторыя "старога Мінска" да Другой сусветнай вайны . . . 83

**III. Праектаванне "сацыялістычнага горада"** . . . 95

1 Анатомія горада . . . 95
а) Планы развіцця горада ў 1930-я гады . . . 95
б) Генеральны план 1946 г. . . . 100
в) Папраўкі і новыя рэдакцыі Генеральнага плана . . . 108

2 Аблічча горада . . . 114
а) Дыскусіі пра архітэктуру "сацыялістычнага рэалізму" . . . 114
б) "Вялікі пералом у будаўніцтве" і архітэктура . . . 126
в) Урбаністычная настальгія і міф пра "горад-герой" . . . 130

3 Рэканструкцыя горада . . . 140
а) Арганізацыя аднаўлення . . . 140
б) Афармленне цэнтра . . . 154
в) Недахопы ў інфраструктуры і сферы абслугоўвання . . . 162

**IV. Міграцыя ў "сацыялістычны горад"** . . . 171

1 Крыніцы росту горада . . . 171
а) Прамысловая вытворчасць і працоўныя рэсурсы . . . 171
б) Натуральны рост насельніцтва і павелічэнне яго колькасці ў выніку міграцыі . . . 173
в) Склад, паходжанне і матывы мігрантаў . . . 180

2 Мерапрыемствы па абмежаванні росту горада . . . 186
а) Стварэнне сістэмы прапіскі і яе функцыянаванне . . . 186
б) Парушэнні і злоўжыванні ў сістэме прапіскі . . . 198
в) Субурбанізацыя і ўтварэнне агламерацыі . . . 211

3 Умовы жыцця мігрантаў у "закрытым" горадзе . . . 217
а) Кватаранты ў прыватных дамах і "времянках" . . . 217
б) Самавольныя забудоўшчыкі на ўскраінах горада . . . 221
в) Лімітчыкі на мінскіх прадпрыемствах . . . 226

**V. Жыллёвыя ўмовы ў “сацыялістычным горадзе”** . . . . . . . 231

1 Жыллёвае будаўніцтва . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 233
а) Узнікненне жыллёвага пытання . . . . . . . . . . . . . . . . 233
б) Цэнтралізацыя жылога фонду. . . . . . . . . . . . . . . . . . 238
в) Пераход да масавага жыллёвага будаўніцтва . . . . . . 245

2 Выдзяленне кватэр . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 252
а) Парадак выдзялення жылплошчы . . . . . . . . . . . . . . . 252
б) Дэфіцыт жылплошчы і патрэба ў жыллі . . . . . . . . . 258
в) Размеркаванне кватэр . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 265

3 Жыллёвыя ўмовы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 278
а) “Добраўпарадкаванне” як праява ўрбаннасці. . . . . . 278
б) Камуналка, барак, інтэрнат. . . . . . . . . . . . . . . . . . . 285
в) Маламетражныя кватэры ў мікрараёнах. . . . . . . . . . 294

**VI. “Шэрыя” зоны і паўафіцыйныя сферы савецкай штодзённасці** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 305

1 Новыя Шэйпічы – “нічыйны” пасёлак . . . . . . . . . . . . . 305
2 Рэпетыцыя паўстання: “тэмпературныя” ваганні ў перыяд “адлігі” . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 310
3 Пяцідзясятнікі – “уцекачы” з савецкага грамадства . . . . 316
4 Ваенны гарадок Усходні – анклаў бяспраўных цывільных асоб . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 323

**VII. Высновы** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 327

1 Праект “сацыялістычны горад” . . . . . . . . . . . . . . . . . . 328
2 Урбанізацыя Беларусі. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 331
3 Урокі гарадской гісторыі Мінска . . . . . . . . . . . . . . . . . 332

**Дадатак** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 339

**Скарачэнні** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 369

**Бібліяграфія** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 371

**Імянны паказальнік** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 433

# Прадмова
# да беларускага выдання

Мінск – адзін з самых фантастычных гарадоў свету. Упершыню прыехаўшы сюды ў 1997 г., я адчуў сябе перанесеным у Музей сацыялістычнага рэалізму пад адкрытым небам. А пад час апошняга наведвання ў 2015 г. мяне ўразіла еўрапейская метраполія. Горад сталінскіх часоў, які мяне да гэтага часу захапляў, паступова адступае на задні план. Як і раней, усё робіцца штучна. Няма амаль нічога гістарычнага. Акурат таму сучасны Мінск – павучальны прыклад для гарадской гісторыі і даследаванняў урбанізацыі.

У пошуках адпаведнай тэмы для сваёй другой дысертацыі я быў не толькі натхнёны вобразам горада, але і сустрэўся з суцяшальнай адкрытасцю архіваў для замежнага карыстальніка. Так у рамках партнёрскай супрацы з БДУ я дайшоў да тэмы майго даследавання. Маецца на ўвазе "сацыялістычны горад" – праблема, якая пасля распаду Савецкага Саюза пачала гістарызавацца. Агулам, перарываючыся на ўніверсітэцкія выкладанні, я правёў у мінскіх архівах і бібліятэках 12 месяцаў. Рукапіс быў прадстаўлены ў 2004 г. на філасофскім факультэце Універсітэта Фрыдрыха Шылера ў Ене. Праца апрача канцэптуальных разваг утрымлівае тое, што ўносяць крыніцы. Я разглядаю яе як піянерскае даследаванне, якое адкрывае шлях беларускім спецыялістам. Гэта вялікая задача: растлумачыць, як гарадскі арганізм функцыянуе ў зменлівым часе, і вызначыць, што павінна ўзяць у спадчыну сталіца Рэспублікі Беларусь. Сёння неабходны для гэтага матэрыял збіраецца пакуль энтузіястамі, а не навукоўцамі.

З асаблівым натхненнем я ўспрыняў раман Артура Клінава "Мінск. Горад СОНца"[1] і мемуары Васіля Шарапава "Нас время ставит на свои места"[2]. Шарапаў як былы старшыня Мінскага гарвыканкама фігуруе ў маёй кнізе – несумненна як адзін з галоўных выканаўцаў. Але мая пазнавальная цікаўнасць болей

[1] Нямецкае выд.: Klinaй A. Minsk. Sonnenstadt der Träume. Frankfurt am Main, 2006.

[2] Шарапов В. И. Нас время ставит на свои места. Минск, 2013.

тычылася той матэрыялізаванай пасля вайны ўтопіі, якую тэматызаваў постсавецкі pARTisan Клінаў. Такім чынам, мой сапраўдны герой – горад. Гаворыцца пра інсцэнізацыю крэатуры, якая яшчэ і сёння называецца "горадам-героем". Але што за гэтым фасадам – для мяне вымалёўваецца ўсё яшчэ толькі схематычна: гэта лёсы жыхароў, або гісторыя штодзённасці.

На таварыша Шарапава я ўвесь час натыкаўся ў архіўных актах, але асабіста з ім ніколі не сустракаўся. З яго ўспамінаў вынікае, што ён у свой час самаахвярна аддаўся мадэрнізацыі беларускай сталіцы і па пятніцах заўсёды прыслухоўваўся да патрэбаў яе жыхароў. Яго тэма – "індустрыяльны горад". Тое, што найбольш хвалюе яго – гэта тэмпы хуткіх пераўтварэнняў пад час выканання планаў "сямігодкі" (1958–1965). А тое, што ў яго кнізе найбольш турбуе мяне – гэта ігнараванне ўведзенага Хрушчовым абмежавання росту горада або неўпамінанне кантролю мігрантаў. Шарапаў агучвае толькі праблему інтэграцыі вайскоўцаў пасля дэмабілізацыі ў сярэдзіне 1950-х гадоў. Няўжо канструкт "закрытага горада", абумоўленага сістэмай прапіскі, быў толькі ў маіх фантазіях?

Для мяне было гонарам падыскутаваць з Артурам Клінавым у мінскай "Еўрапейскай кавярні" пра "Горад СОНца". У сваёй кнізе яму ўдалося прыўзняць таямніцы горада праз раскадаванне сімвалаў і выяўленне міфаў. Мне найбольш падабаецца гісторыя пра знявечанае цела даўняга Мінска, пра пасяленне на схаванай у зямлю рэчцы Нямізе, імя якой па-літоўску азначае 'бяссонне'. Віна за "ўрбіцыд", за смерць горада ўрэшце ляжыць на нацыянал-сацыялісцкіх акупантах. Праз палітыку Халакосту яны знішчылі мультыкультурную спадчыну горада і прывялі да спусташэння вялікіх плошчаў, што дазваляла савецкім планавікам прагматычна ствараць на яго паверхні нешта цалкам новае. Таму варта ўспамінаць аб палеглых у зямлю неспакойных продках, звесткам пра крывавую расправу над якімі горад абавязаны сваім першым упамінаннем у летапісе. Для беларускай сталіцы прыйшоў час думаць пра атмасферу, пра жыццёвасць горада. Менавіта гэтым вызначаецца "еўрапейскі горад".

Нямецкае выданне гэтай кнігі ўбачыла свет у 2008 г. пад назвай "Мінск – узорны горад сацыялізму"[3]. Пераклад на рускую

[3] Bohn T. M. Minsk – Musterstadt des Sozialismus. Stadtplanung und Urbanisierung in der Sowjetunion nach 1945. Köln, Weimar, Wien: Böhlau Verlag, 2008.

са скарочаным спасылачным апаратам і спрошчаным у некаторых месцах тэкстам, якому была вернута першапачатковая назва рукапісу, праз пяць гадоў выйшаў у Маскве[4]. Беларускі варынт кнігі з'яўляецца дзякуючы выдаўцу кніжнай серыі часопіса "Беларускі Гістарычны Агляд" Генадзю Сагановічу. Разам з перакладчыцай Марыяй Рытановіч і літаратурным рэдактарам Ларысай Дарожкай яны шмат зрабілі, каб наблізіць тэкст да нямецкага арыгіналу. Мяне радуе, што кніга ў такім варыянце нарэшце будзе даступнай чытачам у Мінску.

Напрыканцы не магу не сказаць пра адно асабістае ўражанне і анекдатычны выпадак, якія тычацца, з аднаго боку, касмапалітызму мінчан, а з другога – маіх падарожжаў да новых гарызонтаў. Сябрам і знаёмым я ўвесь час выказваў сваю незадаволенасць тым, што хоць у Мінску ёсць велазавод, але няма веласіпедыстаў. Тым часам я з сімпатыяй даведаўся, што беларусы не толькі захапляюцца веласпортам, але і ў настальгічнай манеры ставяць у якасці дэкарацый гістарычныя тыпы ровараў у дагледжаных скверах сваёй сталіцы. Калі я прыязджаў на даследаванні, то, каб адпачыць пасля працы ў архіве, бегаў уздоўж Свіслачы. І аднаго дня сярод гарадскога парку мне сустрэлася карова, хоць трыманне свойскай жывёлы ў межах горада было забаронена яшчэ на пачатку 1960-х гадоў. З пэўнай іроніяй я ўспрыняў гэта як позняе пацвярджэнне майго рызыкоўнага тэзіса пра часовае "асяляньванне" сталіцы. Тым часам ва Універсітэце Юстуса Лібіга ў Гісэне я займаюся даследчыцкім праектам, прысвечаным зубрам Белавежскай пушчы.

*Люты 2016, Гісэн* *Томас М. Бон*

[4] Бон Т. М. "Минский феномен". Городское планирование и урбанизация в Советском Союзе после Второй мировой войны. Москва: РОССПЭН, 2013.

# I. Уводзіны

*"Мінск – адзін з найбольш сумных гарадоў свету".*

Бертольд Брэхт

*"Вызвалены горад ажывае адразу".*

Уладзімір Карпаў

## 1 Аб'ект даследавання

Калі верыць словам пісьменніка з Усходняй Германіі Стэфана Гейма, дык не хто іншы, як сам Бертольд Брэхт выказаў сваё стаўленне да сталіцы Беларусі – Мінска, якое паказала гэты горад не ў самым лепшым святле. У 1955 годзе, пад час размовы пра сталінскую культурную палітыку, ён зазначыў, што пра савецкую літаратуру зноў можна будзе гаварыць толькі тады, калі на свет з'явіцца раман, які будзе пачынацца сказам: "Мінск – адзін з найбольш сумных гарадоў свету"[1]. З вуснаў славутага пісьменніка, вядомага сваімі сацыялістычнымі поглядамі, гэты выраз прагучаў даволі дзіўна. Калі глядзець на гэта з пазіцый марксізму-ленінізму, то беларускай сталіцы маглі пайсці ў залік рэвалюцыйныя традыцыі і актыўны ўдзел у Другой сусветнай вайне. Мінск быў вядомы ў Савецкім Саюзе як горад першага партыйнага з'езда сацыял-дэмакратаў; акрамя таго, у 1974 г. яму было прысвоена ганаровае званне "Горад-герой". І калі Бертольд Брэхт зафіксаваў толькі вобраз, які ўзнік на аснове фантазіі, то ўласцівая Гейму пагарда да савецкай правінцыі – проста негатыўны стэрэатып. Згодна з ім у Беларусі няма нічога, акрамя балот, і з гістарычнага пункту погляду яна не больш чым прахадны двор для замежных армій. Мінск паводле гэтага спрошчанага погляду паўстае нейкім выдуманым месцам, якое губляецца ў прасторы трыкутніка, створанага метраполіямі – Варшавай, Ленінградам (Санкт-Пецярбургам) і Масквой.

[1] Heym S. Die Langeweile von Minsk: Dokumente zur Kunst-, Literatur- und Kulturpolitik der SED / Hrsg. v. Schubbe E. Stuttgart, 1972. S. 1057.

Па іроніі лёсу ў той самы год, якім датуецца выказванне Брэхта, у часопісе “Беларусь” пачаў публікавацца твор, прысвечаны аднаўленню Мінска пасля Другой сусветнай вайны. Гаворка ідзе пра раман Уладзіміра Карпава “За годам год”. І гэты раман абяцаў сваім чытачам усё што заўгодна, але толькі не сум. Шматзначна гучыць ужо першы сказ: “Вызвалены горад ажывае адразу”[2]. Гэтае выказванне інтрыгуе і выклікае цікавасць. Карпаў нібы ажыўляе горад і ўдыхае ў яго жыццё; апісвае жыццядзейнасць арганізма, не тлумачачы пры гэтым яго прыроды. Абапіраючыся на партызанскую ідэалогію і міф пра Чырвоную армію, аўтар піша пра ўзрушэнні, якія перажыў горад у перыяд нямецкай акупацыі, на аснове гэтага сцвярджаючы, што Мінск адрадзіўся, як фенікс з попелу.

Уяўляючы сабе маштаб разбурэнняў, якія прынесла Другая сусветная вайна, можна было б пагадзіцца з тым, што ўсё неабходна было пачынаць з нуля, калі не ўлічваць гісторыі планавання і праектавання беларускай сталіцы ў сярэдзіне 1930-х гг. Больш сумнеўнай выглядае характарыстыка горада як аўтаномнага суб’екта, дадзеная яму пісьменнікам. У рамане Карпаў выкарыстоўвае метафару “адраджэнне”. Калі прытрымлівацца гэтага вобраза, то можна ўявіць сабе аднаўленне будынкаў і кансалідацыю грамадства. Але ні пра адну з гэтых з’яў у перыяд сталінізму ў Мінску не магло быць і гаворкі. Пасля адступлення нямецкіх акупантаў адбывалася рэгулярная змена насельніцтва і радыкальная перабудова горада. Ад “старога” Мінска, сталіцы царскай губерні, горада яўрэйскіх гандляроў і рускіх чыноўнікаў, нічога не засталося. Замест гэтага ўзнікла тое, што было запланавана яшчэ ў міжваенны час, а менавіта – “новы” Мінск, сталіца адной з савецкіх рэспублік, на самай справе – горад пралетарызаваных беларускіх сялян. І насуперак усёй прапагандзе ў першым пасляваенным дзесяцігоддзі Мінск быў цікавы не сваім агульным горадабудаўнічым ансамблем, а асобнымі манументальнымі архітэктурнымі праектамі. Пра існаванне ўрбанізаванага соцыуму, акрамя наяўнасці партыйнай грамадскасці, не магло быць і гаворкі; грамадства ўяўляла сабой своеасаблівую сумесь розных сацыяльных слаёў і субкультур. Шматлікімі кварталамі з драў-

[2] Карпаў У. За годам год. Раман. Мінск, 1957. С. 1. Новае выд.: За годам год. Збор твораў. Мінск, 1984. Т. 2. Пераклад на рускую мову: Карпов В. Б. За годом год. Роман. Минск, 1967.

лянымі будынкамі Мінск нагадваў велізарную вёску. І гэта быў не ўзорны горад для "новага чалавека", а хутчэй месца, дзе панавалі дэфіцыт і супярэчнасці. З прычыны вялікага прытоку вясковых жыхароў і абмежаванага жыллёвага фонду страціўся кантроль над насельніцтвам. З аднаго боку, грамадства заставалася "аморфнай масай", бо ва ўмовах сталінізму, нягледзячы на павелічэнне шчыльнасці насельніцтва, сувязі паміж членамі атамізаванага грамадства былі слабымі. З другога – меры, накіраваныя на абмежаванне колькасці мігрантаў, з-за існавання спецыяльных дазволаў і халатнасці начальства на практыцы не дзейнічалі. У дадзеным выпадку мы маем справу са сфінксам, які называецца "сталінскім", або "сацыялістычным", горадам.

З прычыны таго, што класікі марксізму-ленінізму не стварылі ніводнай утапічнай канцэпцыі горада, паняцце "сацыялістычны горад" да цяперашняга часу было хутчэй модным, чым навуковым тэрмінам[3]. Маркс і Энгельс вызначалі вялікія гарады свайго часу недвухсэнсоўна і проста, называючы іх "асяродкамі крызісу". У сваіх працах яны прыпісвалі працэсу ўрбанізацыі двайную функцыю: з аднаго боку, сучасныя капіталістычныя гарады праз свае сацыяльныя супярэчнасці лічыліся цэнтрамі рабочага руху[4], з другога боку, "супярэчнасці паміж горадам і вёскай" сімвалізавалі самааддаленне (самаадчужэнне) чалавека, якое ляжыць у аснове капіталістычнага раздзялення працы[5]. Такім чынам, падобны погляд на горад быў сацыяльным абвінавачваннем капіталізму. Дакладнае выражэнне гэтай думкі можна знайсці ў Энгельса: "Жаданне вырашыць жыллёвае пытанне і стрымаць рост сучасных вялікіх гарадоў з'яўляецца абсурдным. Сучасныя вялікія гара-

[3] Пар.: Lefèbvre H. Die Stadt im marxistischen Denken. Ravensbrück, 1975; Marxism and Metropolis. New Perspectives in Urban Political Economy / Ed. by Tabb W. K., Sawers L. New York, 1978.

[4] Engels F. Die Lage der arbeitenden Klassen in England. Nach eigner Anschauung und authentischen Quellen // Marx K., Engels F. Werke. Berlin, 1962. Bd. 2. S. 349.

[5] Marx K., Engels F. Die deutsche Ideologie. Kritik der neuesten deutschen Philosophie in ihren Repräsentanten Feuerbach, B. Bauer und Stirner, und des deutschen Sozialismus in seinen verschiedenen Propheten // ён жа. Werke. Berlin, 1962. Bd. 3. S. 9–530, тут S. 50; Engels F. Zur Wohnungsfrage // тамсама. Bd. 18. S. 243; Engels, F. Herrn Eugen Dührings's Umwälzung der Wissenschaft. Dritte, durchges. und vermehrte Aufl. // тамсама. Bd. 20. S. 270.

ды знікнуць толькі адмовіўшыся ад капіталістычнай вытворчасці, і тады будуць вырашацца зусім іншыя праблемы, а не забеспячэнне кожнага працоўнага яго ўласным дамком"[6]. Аднак, акрамя адмаўлення росту гарадоў і працэсу ўрбанізацыі, у працах Энгельса няма канкрэтных апісанняў будучых тыпаў паселішчаў і формаў жылля.

Як следства, савецкай публіцыстыцы была ўласцівая фобія гарадскога свету. Нягледзячы на тое, што праектаванне горада і ўрбанізацыя ў Савецкім Саюзе непасрэдна звязваліся з працэсам паскоранай індустрыялізацыі, яшчэ да пачатку Другой сусветнай вайны слова *ўрбанізацыя* лічылася непрымальным і ўжывалася толькі ў апісанні працэсаў развіцця "капіталістычных гарадоў"[7]. З гэтага вынікалі два азначэнні "сацыялістычнага горада", якія з-за сваёй шаблоннасці вельмі хутка апусціліся да ўзроўню клішэ: з аднаго боку, "антаганізм паміж горадам і вёскай", які лічыўся характэрнай рысай феадалізму і капіталізму, павінен быў пераадольвацца шляхам абмежавання росту гарадоў і механізацыі вёскі; з другога боку, лозунг "сацыяльная гігіена шляхам разгрупавання забудоў" азначаў парушэнне прынцыпу, асноватворнага для старых еўрапейскіх гарадоў: "урбанізацыя праз павелічэнне шчыльнасці"[8]. Наколькі змянялася стаўленне да паняцця "горад", можна найлепшым чынам прасачыць па розных выданнях "Вялікай Савецкай Энцыклапедыі": калі ў 1930 г. гаварылася пра разлажэнне гарадоў і індустрыялізацыю вёскі[9], то выданне 1956 г. не толькі прыпісвала гораду галоўную ролю ў грамадскім развіцці, але і абвяшчала існаванне "сацыялістычнага горада" і неабходнасць пераадолення супярэчнасцей паміж горадам і вёскай[10]. А ў выданні 1972 г. зусім не гаворыцца пра "сацыялістычны горад" і пра супярэчнасці паміж гора-

[6] Engels F. Wohnungsfrage. S. 243.

[7] Зайцев Д. Урбанизация // Большая Советская Энциклопедия. Гл. ред. О. Ю. Шмидт. Т. 56. Москва, 1936. С. 248–249.

[8] Пар.: сярод савецкай даведачнай літаратуры адна з асноўных прац па горадабудаўніцтве: Основы советского градостроительства. Т. I–IV. Москва, 1966–1969.

[9] Город // Большая Советская Энциклопедия. Гл. ред. О. Ю. Шмидт. Т. 18. Москва, 1930. С. 18–165 (пар. асабліва частку IV "Город будущего" Н. Мешчаракова, с. 117–126).

[10] Город // Большая Советская Энциклопедия. 2-е изд. Гл. ред. Б. А. Введенский. Т. 12. Москва, 1956. С. 172–209 (пар. асабліва частку VI "Социалистический город СССР", с. 202–207).

дам і вёскай[11]. Нічога дзіўнага ў такой трактоўцы не было: з аднаго боку, ва ўмовах "навукова-тэхнічнай рэвалюцыі" працэс урбанізацыі, які раней прыхарошваўся, і звязаная з ім канцэнтрацыя насельніцтва ў гарадах віталіся[12]; з другога – абвяшчэнне новай праграмы КПСС у 1961 г. прывяло да таго, што ў рамках актыўнай прапаганды пераходу ад "сацыялізму" да "камунізму" паняцце "сацыялістычны горад" выйшла з моды[13]. Замест гэтага ў новай рэдакцыі Генеральнага плана Масквы 1971 г. быў абраны новы тэрмін – "узорны камуністычны горад"[14]. "Сацыялістычны горад" здабыў гістарычнасць у дзвюх розных сферах. Першая сфера ўключае ў сябе дыскусію паміж урбаністамі і дэзурбаністамі ў Савецкім Саюзе на мяжы 1920–1930-х гг. Абмяркоўваліся пытанні пра распад сям'і і рэалізацыю формаў сумеснага пражывання з дапамогай будаўніцтва інтэрнатаў і клубаў для працоўных[15]. Другая сфера тычыцца ўніфікаванага ўзору горадабудаўніцтва ва Усходняй Еўропе, якія пасля Другой сусветнай вайны знаходзіўся пад моцным уплывам Генеральнага будаўнічага плана Масквы 1935 г., што

[11] Город // Большая Советская Энциклопедия. 3-е изд. Гл. ред. А. М. Прохоров. Москва, 1972. Т. 7. С. 111–121.

[12] Коган Л. Б., Покшишевский В. В. Урбанизация // Большая Советская Энциклопедия. 3-е изд. Гл. ред. А. М. Прохоров. Т. 27. Москва, 1977. С. 72–74. У другім выданні адсутнічае артыкул "Урбанизация". Пар.: Большая Советская Энциклопедия. 2-е изд. Гл. ред. Б. А. Введенский. Т. 44. Москва, 1956.

[13] Meissner B. Das Parteiprogramm der KPdSU 1903 bis 1961. 3. Aufl. Köln, 1965. С. 143–244, асабліва с. 145.

[14] Пар.: Постановление ЦК КПСС и Совета Министров СССР о генеральном плане развития г. Москвы 3 июня 1971 г. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). 9-е изд., доп. и испр. Т. 12. 1971–1975. Москва, 1986. С. 127–131, тут с. 131.

[15] Kopp A. Town and Revolution. Soviet Architecture and City Planning 1917–1935. New York, 1970; Quilici V. Città russa e città sovietica. Caratteri della struttura storica. Ideologia e practica della transformazione socialista. Milano, 1976; Michelis M., Pasini E. La città sovietica 1925–1937. Venezia – Padova, 1976; Magistris A. La construzione della città totalitaria. Il piano di Moscu e il dibattito sulla città sovietica tra gli anni venti e cinquanta. Milano, 1995; Хан-Магомедов С. О. Архитектура советского авангарда. Кн. 1. Проблемы формообразования. Мастера и течения. Кн. 2. Социальные проблемы. Москва, 1996–2001; Altrichter H. "Living the Revolution". Stadt und Stadtplanung in Stalins Rußland // Utopie und politische Herrschaft im Europa der Zwischenkriegszeit / Hrsg. v. Hardtwig W. München, 2003. S. 57–75.

базаваўся на радыяльна-кальцавой структуры і занальным дзяленні сфер пражывання, працы і правядзення вольнага часу[16]. І калі многія ўтапічныя ідэі, якія ўзніклі ў рамках рэвалюцыйнай культуры 1920-х гг., за малым выключэннем так і засталіся архітэктурнымі праектамі на паперы, то манументальныя цэнтры сталінскага часу, малапрывабныя мікраранёны "хрушчовак" і аднастайныя жылыя раёны часоў Брэжнева і сёння выступаюць сведчаннем спецыфічнай усходнееўрапейскай гарадской культуры.

З архітэктурна-гістарычнага пункту гледжання нараджэнне "сацыялістычнага горада" можна метафарычна апісаць трыма этапамі: спачатку зародкавую клетку фармавала авангардная канцэпцыя "сацгорада". Зыходзячы з канцэпцыі канструктывізму неабходна было дасягнуць мэтазгоднасці і рацыянальнасці. Пры гэтым цэнтральнае месца займала ідэя стварэння "новага чалавека". Непасрэдным наступствам гэтага працэсу стаў "горад сталінскага часу", горад "сацыялістычнага рэалізму". Горад падкупляў сваёй сіметрыяй і манументальнасцю, вытокі якіх знаходзіліся ў класіцызме. Усё паказвала на падпарадкаванне індывіда ўстаноўкам партыі і ўрада. У выніку на свет з'явілася своеасаблівае стварэнне пад назвай "савецкі", або "камуністычны", горад. Новы функцыяналізм задаваў рух і рытм; тэхнічны прагрэс служыў пераходам да светлай будучыні, а людзей запэўнівалі, што яны жывуць у гамагенным грамадстве, дзе ўсе роўныя[17].

Савецкай тыпалогіі горада ўласцівыя восем асноўных рысаў: а) землекарыстанне без уліку маёмасных адносін; б) структураванне прасторы шляхам пабудовы простых магістральных вуліц і характэрных вышынных будынкаў; в) узвядзенне ма-

[16] Goldzamt E. Städtebau sozialistischer Länder. Soziale Probleme. Berlin, 1974; Szczepański M. S. "Miasto socjalistyczne" i świat społeczny jego mieszkańców. Warszawa, 1991; Åman A. Architecture and Ideology in Eastern Europe during the Stalin Era. An Aspect of Cold War History. New York / Cambridge, Mass. / London, 1992; Marek M. Die Idealstadt im Realsozialismus. Versuch zu den Traditionen ihrer Notwendigkeit // Sozialgeschichtliche Kommunismusforschung. Tschechoslowakei, Polen, Ungarn und DDR 1948–1968 / Hrsg. v. Brenner C., Heumos P. München, 2005. S. 425–480.

[17] Kreis B., Müller R. Stadtplanung in der Sowjetunion // Archiv für Kommunalwissenschaft. 1978. H.17. S. 299–316; Karger A., Werner F. Die sozialistische Stadt // Geographische Rundschau. 1982. H. 34. S. 519–528.

нументальных адміністрацыйных і ўрадавых будынкаў у цэнтры горада; г) збудаванне грамадскіх месцаў цырыманіяльнага характару; д) адкрыццё паркаў культуры і адпачынку з сацыялістычнымі помнікамі; е) будаўніцтва жылых раёнаў з ідэнтычных элементаў; ё) сегрэгацыя, якая засноўвалася на патрон-кліенцкіх адносінах і ж) адсутнасць субурбанізацыі і агламерацыі[18].

"Сацыялістычны горад" прыцягнуў увагу заходнееўрапейскіх даследчыкаў толькі ў 1979 г. пасля выхаду кнігі Энтані Р. Фрэнча і Іэна Ф. Е. Гамільтана з аднайменнай назвай. Асновай публікацыі стаў міждысцыплінарны праект, у цэнтры якога знаходзілася геаграфія населеных пунктаў, а мэтай было апісанне трэцяга тыпу горада, разам з даіндустрыяльным і заходнеіндустрыяльным[19]. Да распаду сацыялістычнага блока ва Усходняй Еўропе бурны працэс росту гарадоў і ўрбанізацыі ў Савецкім Саюзе быў аб'ектам вывучэння дэмографаў, географаў і сацыёлагаў[20]. Названыя спецыялісты займаюцца вывучэннем сучасных грамадстваў, таму іх даследаванні накіраваны на праблемы трансфармацый на постсавецкай прасторы. У выніку гэтага паняцце "сацыялістычны горад", якое пастаянна ставіла-

[18] Pelzer F. Die sowjetischen Städte. Grundlage und Ergebnisse stadttypologischer Forschung. Phil. Diss. Münster, 1969; Häußermann H. Von der Stadt im Sozialismus zur Stadt im Kapitalismus // Stadtentwicklung in Ostdeutschland. Soziale und räumliche Tendenzen / Hrsg. v. Häußermann H., Neef R. Opladen, 1996. C. 5–47; асабліва с. 6–20; ён жа. Von der sozialistischen zur kapitalistischen Stadt // Prozesse und Perspektiven der Stadtentwicklung in Ostmitteleuropa / Hrsg. v. Kovács Z., Wießner R. Passau, 1997. C. 21–31, асабліва с. 23–25; Hofmeister B. Die Stadtstruktur. Ihre Ausprägungen in verschiedenen Kulturräumen der Erde. 3. überarb. Aufl. Darmstadt, 1996. S. 84–90; Stadelbauer J. Die Nachfolgestaaten der Sowjetunion. Großraum zwischen Dauer und Wandel. Darmstadt, 1996. S. 217.

[19] The Socialist City. Spatial Structure and Urban Policy / Ed. by. French R. A., Hamilton F. E., Chichester et al. 1979; таксама: The Contemporary Soviet City / Ed. by Morton H. W., Stuart R. C. Ann Arbor, 1984.

[20] Пар.: Harris Ch. D. Cities of the Soviet Union. Studies in Their Functions, Size, Density, and Growth. Chicago, 1970; Lewis R. A., Rowland R. H. Population Redistribution in the USSR. It's Impact on Society, 1897–1977. New York, 1979; Andrusz G. D. Housing and Urban Development in the USSR. London / Basingstoke, 1984. Пар. таксама агляд Bater J. H. The Soviet City. Ideal and Reality. London, 1980. Пар. таксама: Stadtentwicklungen in kapitalistischen und sozialistischen Ländern / Hrsg. v. Friedrichs J. Reinbek, 1978; Stadtentwicklungen in West- und Osteuropa / Hrsg. v. Friedrichs J. Berlin / New York, 1985.

ся пад сумнеў географам Ёргам Штадэльбаўэрам, страціла сваю здольнасць да аперацыяналізацыі[21]. Таму ў больш познім даследаванні Э. Фрэнч мадыфікаваў спецыфіку структурнай мадэлі, апісанай у 1979 г. З гэтага часу ён вызначаў савецкі горад як амальгаму, якая складаецца з капіталістычных рэліктаў і сацыялістычнага планавання[22]. На падставе "адначасовасці гістарычных (капіталістычных) і новых (сацыялістычных) структур" сацыёлаг Гартмут Гойсэрман выступіў у сярэдзіне 1990-х гг. за выкарыстанне тэрміна "горад у сацыялізме"[23]. "Праект сацыялістычны горад" (Гольгер Барт) быў зноў пастаўлены на парадак дня даследчыкамі, якія займаліся вывучэннем гісторыі будаўніцтва і планавання ў ГДР[24]. Гаральд Бодэншатц і Крысціяне Пост апісалі "пошук сацыялістычнага горада" ў Савецкім Саюзе ў перыяд з 1929 да 1935 г. як змену горадабудаўнічай парадыгмы, якая мае міжнароднае значэнне[25].

Але гістарычнае даследаванне Расіі і Савецкага Саюза было ўскладнена тым, што цэнтральныя катэгорыі аналізу заходняй гісторыі горада, напрыклад, буржуазія (Bürgertum) і грамадскасць (Öffentlichkeit), маглі быць ужыты толькі ўмоўна пры вывучэнні першай урбаністычнай трансфармацыі ў апошняй трэці XIX ст. у Расійскай імперыі, а ў даследаванні працэсаў індустрыялізацыі і ўрбанізацыі пры Сталіне і яго пераемніках

[21] Stadelbauer J. Das Ende der "Sozialistischen Stadt"? Zu einigen Transformationsansätzen in russischen Großstädten // Festschrift für Erdmann Gormsen zum 65. Geburtstag / Hrsg. v. Domrös M., Klaer W. Mainz, 1994. С. 179–196. Пар.: Cities after Socialism. Urban and Regional Change and Conflict in Post Socialist Societies / Ed. by Andrusz G., Harloe M., Szeleny I. Cambridge, Ma. / Oxford, 1996.

[22] French A. R. Plans, Pragmatism and People. The Legacy of Soviet Planning for Today's Cities. London, 1995.

[23] Häußermann. Stadt im Sozialismus... S. 5.

[24] Пар.: Projekt Sozialistische Stadt. Beiträge zur Bau- und Planungsgeschichte der DDR / Hrsg. v. Barth H. Berlin, 1998; Durth W., Düwel J., Gütschow N. Architektur und Städtebau in der DDR. Bd. 1: Ostkreuz. Personen, Pläne, Perspektiven. Bd. 2: Aufbau, Themen, Dokumente. Frankfurt / New York, 1998. Пар.: Bohn T. M. "Von der Sowjetunion lernen, heißt siegen lernen". – Potemkinsche Dörfer und ostdeutsche Stadtplanung in der Nachkriegszeit // Schönheit und Typenprojektierung. Der DDR Städtebau im internationalen Kontext / Hrsg. v. Bernhardt C., Wolfes T. Erkner, 2005. S. 61–80.

[25] Städtebau im Schatten Stalins. Die internationale Suche nach der sozialistischen Stadt in der Sowjetunion 1929–1935 / Hrsg. v. Bodenschatz H., Post C. Berlin, 2003; Mumford E. The CIAM Discourse on Urbanism, 1928–1960. Cambridge, Mass. / London, 2000.

названыя катэгорыі ўвогуле не маглі выкарыстоўвацца. Таму гісторыя горада аж да выхаду ў свет у 1976 г. зборніка "The City in Russian History" (Горад у рускай гісторыі) пад рэдакцыяй Майкла Ф. Гэма заставалася малавывучанай галіной у заходніх даследаваннях[26]. На надзвычайную актуальнасць гэтай тэмы Гэм звярнуў увагу яшчэ раз у адным артыкуле, паставіўшы правакацыйнае пытанне: "А ці ёсць гарады ў Расіі?"[27]. У дадатак да гэтага Гайка Гауман звярнуў увагу на "пранікальнасць паміж горадам і вёскай" як на структурную прыкмету рускай і савецкай гісторыі. Спробы ўзвесці выразную мяжу паміж горадам і вёскай звязваліся выключна з афармленнем прыгоннай залежнасці ў пачатку Новага часу і з прымацаваннем сялян да калгасаў у працэсе гвалтоўнай калектывізацыі сельскай гаспадаркі ў Савецкім Саюзе[28]. І толькі адраджэнне грамадзянскай супольнасці ў перыяд перабудовы і адкрыццё межаў пасля падзення "жалезнай заслоны" сталі, па словах Карла Шлёгеля, імпульсам да "вяртання гарадоў" ва Усходняй Еўропе[29].

Пачатак гістарычнага даследавання працэсу ўрбанізацыі быў пакладзены ў сярэдзіне 1980-х гг. дзякуючы тэзісу Мошэ Левіна наконт таго, што развіццё рускага горада вызначалася сувяззю з вёскай, характэрнай і для савецкага перыяду. Наём сельскіх жыхароў на сезонныя працы ў горад і распаўсюджанасць вясковых двароў стварылі ў сацыяльным і фенатыпічным плане яшчэ ў дарэвалюцыйнай Расіі перадумовы для "абсяляньвання горада". З прычыны дзвюх хваляў "уцёкаў з вёскі" (Landflucht) у 1930-я і 1950–1960-я гг. у Савецкім Саюзе сфар-

[26] The City in Russian History / Ed. by Hamm M. F. Lexington, Kentucky, 1976. Характэрна, што наступная манаграфія абмяжоўваецца даследаваннем Расійскай імперыі: The City in Late Imperial Russia / Ed. by Hamm M. F. Bloomington, 1986. Пар.: Gesellschaft als lokale Veranstaltung. Selbstverwaltung, Assoziierung und Geselligkeit in den Städten des ausgehenden Zarenreiches / Hrsg. v. Hausmann G. Göttingen, 2003; Städte im östlichen Europa. Zur Problematik von Modernisierung und Raum vom Spätmittelalter bis zum 20. Jahrhundert / Hrsg. v. Goehrke C., Pietrow-Ennker B. Zürich, 2006.

[27] Hamm M.F. The Modern Russian City. An Historiographical Analysis // Journal of Urban History. 1977. Vol. 4. P. 39–76.

[28] Haumann H. Die russische Stadt in der Geschichte // JGO. 1979. Bd. 27. S. 481–497.

[29] Пар.: Schlögel K. Das Wunder von Nishnij oder Die Rückkehr der Städte. Berichte und Essays. Frankfurt am Main / Wien, 1991; ён жа. Marjampole oder Europas Wiederkehr aus dem Geist der Städte. München / Wien, 2005.

мавалася так званае "грамадства плыннага пяску" (quicksand society)[30]. Абапіраючыся на гэты, пацверджаны ўжо на прыкладзе Расійскай імперыі, тэзіс, гаварылася пра "дуалізм" гарадоў у перыяд сталінізму. Згодна з гэтым пунктам гледжання, Масква называлася "сялянскай метраполіяй" (Дэвід Л. Хофман), горадам мігрантаў, якія працягвалі прытрымлівацца формаў жыцця і каштоўнасцяў, характэрных для паўсядзённага сельскага ладу[31]. У той жа час была звернута ўвага на падзел "сацыялістычнай метраполіі" на "манументальны горад" і "мінімальны горад" (Тымаці Дж. Колтан), г. зн. на кантраст паміж палацамі і праспектамі ў цэнтры горада і "времянками" ў рабочых пасёлках[32]. Ненашмат адрознівалася сітуацыя і ў спланаваным горадзе (Planstadt) Магнітагорску, які быў абвешчаны эксперыментальным полем "сталінскай цывілізацыі" (Стывен Коткін). З аднаго боку, калектыўнай свядомасцю настроенай узнёсла часткі працоўных маніпулявалі з дапамогай бальшавіцкіх лозунгаў; з другога боку, хаос і імправізацыя, якія вызначалі будаўніцтва металургічных заводаў і населеных пунктаў, пацягнулі за сабой "ідыятызм гарадскога жыцця" (Маркс і Энгельс дэзавуявалі яшчэ і вясковы свет)[33]. Згодна з вынікамі даследаванняў 1990-х гг., жаданае і сапраўднае ў "сацыялістычным горадзе" адчувальна разыходзіліся як у навакольным пабудаваным асяроддзі, так і ва ўмовах жыцця.

Гісторыкі, якія вывучалі Савецкі Саюз, канцэнтраваліся пераважна на даследаванні гісторыі сталінізму, таму працэсу ўрбанізацыі 1930-х гг. не аддавалася належнай увагі[34]. І нават працы па гісторыі архітэктуры абмяжоўваліся толькі сталінскай

[30] Пар.: Lewin M. The Making of the Soviet System. Essays in the Social History of Interwar Russia. London, 1985. C. 12–21; ён жа. The Gorbachev Phenomenon. A Historical Interpretation. Expanded Edition. Berkeley / Los Angeles, 1991. C. 13–42; ён жа. Russia / USSR in Historical Motion: An Essay in Interpretation // Russian Review. 1991. Vol. 50. P. 249–266.

[31] Пар.: Hoffmann D. L. Peasant Metropolis. Social Identities in Moscow, 1929–1941. Ithaca / London, 1994. PB 2000.

[32] Пар.: Colton T. J. Moscow. Governing the Socialist Metropolis. Cambridge, Ma. / London, 1995.

[33] Пар.: Kotkin S. Magnetic Mountain. Stalinism as a Civilization. Berkeley / Los Angeles / London, 1995. PB 1997. P. 106–147, P. 198–237.

[34] Пар.: Neutatz D. Die Moskauer Metro. Von den ersten Plänen bis zur Großbaustelle des Stalinismus (1897–1935). Köln / Weimar / Wien, 2001.

эпохай[35]. Што да гарадской гісторыі ў пасляваенны час, то ў гэтай галіне можна назваць нешматлікія даследаванні. Піянерская праца (1983) Альбрэхта Марціні "Bauen und Wohnen in der Sowjetunion nach dem Zweiten Weltkrieg" (Будаўніцтва і жыццё ў Савецкім Саюзе пасля Другой сусветнай вайны) прысвечана развіццю рускага правінцыйнага горада Яраслаўля. Недахоп архіўных крыніц дазваляе разглядаць яе толькі як працу, якая дае агульны агляд дадзенай тэмы. У змястоўным плане ў названым даследаванні памылкова тое, што аўтар, ідучы ад афіцыйных паведамленняў, датуе змену курсу ў галіне будаўнічай палітыкі толькі часам пасля смерці Сталіна. Але дзякуючы даступнаму стылю яе можна разглядаць як добрыя ўводзіны ў тэму[36]. У сувязі з тым, што даследаванне працэсаў урбанізацыі ў XX ст. не было задачай савецкай гістарычнай навукі[37], расійскія гісторыкі пачалі займацца гісторыяй савецкага горада толькі ў 1990-я гг. Што тычыцца гісторыі горада пасляваеннага перыяду, то на цяперашні момант можна адзначыць даследчыя працы двух аўтараў. Ю. Л. Касянкова даследавала будаўніцтва горада ў эпоху позняга сталінізму, вывучаючы сучасныя публікацыі ў галіне архітэктуры, а таксама выкарыстоўваючы працы архітэктараў і дакументы ўстаноў па планаванні і праектаванні. Пры гэтым яна прыйшла да высновы, што ад ідэй Генеральнага плана Масквы 1935 г. застаўся толькі міф пра існаванне агульнага горадабудаўнічага ансамбля. Акрамя таго, яна канстатавала той факт, што з-за неэфектыўнасці працы кіраўнічага апарату і з-за недахопу рэсурсаў на мяжы 1940–1950-х гг. савецкае горадабудаўніцтва знаходзілася ў стане крызісу[38]. А. С. Сяняўскі, аўтар дзвюх манаграфій па гэтай

[35] Пар.: Kopp A. L'architecture de la période stalinienne. Grenoble, 1978; Tarchanow A., Kawtaradse S. Stalinistische Architektur. München, 1992; Hudson Jr. H. D. Blueprints and Blood. The Stalinisation of Soviet Architecture, 1917–1937. Princeton, N. J., 1994.

[36] Пар.: Martiny A. Bauen und Wohnen in der Sowjetunion nach dem Zweiten Weltkrieg. Bauarbeiterschaft, Architektur und Wohnverhältnisse im sozialen Wandel. Berlin, 1983.

[37] Пар.: Lappo G. M. Hönsch F. W. Urbanisierung Russlands. Berlin / Stuttgart, 2000; Город и деревня в Европейской России. Сто лет перемен. Памяти Вениамина Петровича Семенова-Тянь-Шанского. Москва, 2001.

[38] Пар.: Косенкова Ю. Л. Советский город 1940-х – первой половины 1950-х годов. От творческих поисков к практике строительства. Москва, 2000.

праблеме, займаўся даследаваннем пытання, чаму пераход ад традыцыйнага аграрнага грамадства да ўрбанізаванага індустрыяльнага грамадства, з аднаго боку, спарадзіў таталітарную сістэму кіравання, а з другога – прывёў да працяглага сацыяльна-эканамічнага крызісу. Пры гэтым Сяняўскі сканцэнтраваў сваю ўвагу на вывучэнні тэрыторыі Расійскай Савецкай Федэратыўнай Сацыялістычнай Рэспублікі (РСФСР). Грунтуючыся на звестках афіцыйных палітычных паведамленняў і статыстычных штогоднікаў, ён прыйшоў да высновы, што цэнтралізаваныя вытворчыя планы, якія спускаліся зверху, ператварылі гарады толькі ў прыдаткі да буйных заводаў[39]. Прымаючы да ўвагі тое, што нават гісторыя асобных гарадоў пасля 1945 г. з'яўляецца прадметам вывучэння ў зусім нешматлікіх манаграфіях[40], гістарычныя даследаванні ўрбанізацыі ў пасляваенны час як галіна навуковых ведаў практычна адсутнічаюць.

Новыя навуковыя высновы аб "праекце сацыялістычнага горада", якія дапоўняць папярэднія даследаванні, можна будзе рабіць толькі тады, калі будзе вывучацца не толькі матэрыяльнае гарадское асяроддзе, але і жыццёвая прастора індывідаў, што жывуць у гарадах. Гаворка ідзе не толькі пра апісанне змены горадабудаўнічых узораў, але і пра асэнсаванне праблемы ўрбанізацыі ў грамадствах з позняй мадэрнізацыяй. Зыходзячы з гэтых перадумоў, паняцце "сацыялістычны горад" набывае эўрыстычнае значэнне. Яно можа служыць катэгорыяй для аналізу грамадстваў савецкага тыпу. З прычыны таго, што паняцце "сацыялістычны горад" па сваім вызначэнні процілеглае паняццю "капіталістычны горад", можна зрабіць дзве высновы. Па-першае, "праект са-

[39] Пар.: Сенявский А. С. Российский город в 1960-е – 1980-е годы. Москва, 1995; ён жа. Урбанизация России в XX веке. Роль в историческом процессе. Москва, 2003.

[40] Пар.: Ruble B. Leningrad. Shaping a Soviet City. Berkeley / Los Angeles / Oxford, 1990; Friedberg M. How things Were Done in Odessa. Cultural and Intellectual Pursuits of a Soviet City. Boulder / San Francisco / Oxford, 1991; Josephson P. J. New Atlantis Revisited. Akademgorodok, the Siberian City of Science. Princeton, N. J., 1997; Arnold C. R. Stalingrad im sowjetischen Gedächtnis. Kriegserinnerung und Geschichtsbild im totalitären Staat. Bochum, 1998; Hoppe B. Auf den Trümmern von Königsberg. Kaliningrad 1946–1970. München, 2000; Zhimbiev B. History of the Urbanization of a Siberian City: Ulan-Ude. Cambridge, 2000; Rüthers, M. Moskau bauen von Lenin bis Chruščev. Öffentliche Räume zwischen Utopie, Terror und Alltag. Wien / Köln / Weimar, 2007; Qualls, K. D. From Ruins to Deconstruction. Urban Identity in Soviet Sevastopol after World War II. Ithaca et al., 2009.

цыялістычны горад" рэалізаваўся ў той момант, калі пад знакам нацыяналізацыі рэсурсаў і ўстаноў увасаблялася ў жыццё палітыка індустрыялізацыі. Як адзінкавы феномен "сацыялістычны горад" можа быць лакалізаваны ў планавых гарадах ГДР, Польшчы ці Венгрыі, але ў поўным сэнсе яго варта разумець як праблему запозненай мадэрнізацыі ў краінах Усходняй і Паўднёва-Усходняй Еўропы. Па-другое, асаблівасцю "сацыялістычнага горада" было тое, што ён не прызначаўся для буржуазіі (Bürgertum), і гэта, у сваю чаргу, не давала магчымасці развівацца грамадзянскай супольнасці. Чаму "сацыялістычны горад" не змог стаць альтэрнатывай "капіталістычнаму гораду"? На нашу думку, ёсць дзве прычыны: з аднаго боку, працэс індустрыялізацыі пачаўся ў той момант, калі працоўны клас яшчэ практычна не сфармаваўся або існаваў толькі ўмоўна; з другога боку, урбанізацыя суправаджалася дынамічным працэсам уцёкаў насельніцтва з вёскі ў горад. Іншымі словамі, "ціск" сялянскай масы ўрэшце прывёў да таго, што развіццё горада выйшла з-пад кантролю і яго планаванне было ўскладнена рознымі супярэчнасцямі.

У дадзеным кантэксце Мінск – паказальны прыклад, бо да пачатку Другой сусветнай вайны Беларусь была аграрнай краінай з 80% сельскага насельніцтва, а пасля вызвалення ад нямецкай акупацыі разбураная беларуская сталіца ўяўляла сабой не больш чым *tabula rasa*. З гэтага вынікаюць дзве асаблівасці. Па-першае, усе прынцыпы гарадскога планавання маглі быць увасоблены ў Мінску ў чыстым выглядзе. Рэканструкцыя прадугледжвала ў дадзеным кантэксце не аднаўленне горада, які склаўся гістарычна, а пераадоленне недахопаў, якія прыпісваліся традыцыйнаму "капіталістычнаму гораду". Менавіта таму з гледзішча структуры і архітэктуры горад Мінск да цяперашняга часу – яскравы прыклад "сацыялістычнага горада". Цэнтр горада падобны на свайго роду музей "сацыялістычнага рэалізму" пад адкрытым небам. Па-другое, працэсы індустрыялізацыі і ўрбанізацыі ў БССР пачаліся пазней, чым у РСФСР, – толькі пасля Другой сусветнай вайны. Усе рэсурсы былі сканцэнтраваныя ў беларускай сталіцы, таму гэта прывяло да дэмаграфічнага выбуху ў Мінску, які на дзве трэці стаў вынікам працэсу ўцёкаў насельніцтва з вёскі. На падставе таго, што сярэдні каэфіцыент росту горада ў 1960-я гг. складаў 5,5% (такі высокі каэфіцыент не быў дасягнуты ні ў адным параўнальна вялікім савецкім горадзе), можна гаварыць пра "мінскі феномен". У гэтых умовах праблемы ўрбанізацыі выявіліся ў БССР яшчэ вастрэй, чым у іншых рэспубліках Савецкага Саюза.

## 2 Пастаноўка мэты

Каб разгадаць загадку “сацыялістычнага горада”, раней метафарычна названага сфінксам, неабходна не толькі даследаваць узаемасувязь паміж горадабудаўнічым вобразам, ростам горада і ўрбанізацыяй, але і падзяліць грамадскую і прыватную сферы, а таксама вывучыць “шэрыя зоны” паўсядзённага жыцця. Наратыўны агульны паказ гісторыі Мінска пасля Другой сусветнай вайны з усімі аспектамі палітычнага, эканамічнага, культурнага і сацыяльнага жыцця не з'яўляецца мэтай дадзенай працы. Для дакладнасці даследавання спачатку вызначым паняцці, якія ляжаць у яго аснове, потым сфармулюем навукова-даследчыя пытанні і на заканчэнне прапануем кароткі змест кожнага раздзела.

Пры даследаванні працэсу ўрбанізацыі ў Расійскай імперыі і Савецкім Саюзе неабходна ўлічваць той факт, што гісторыю рускіх і савецкіх гарадоў, з прычыны рознага з заходнімі гарадамі сацыяльна-эканамічнага развіцця, немагчыма апісаць прынятымі ў заходніх даследаваннях гісторыі горада канцэпцыямі “заходняга горада” (okzidentale Stadt) Макса Вэбэра (умацаванне, рынак і суд як асноўныя прыкметы гарадскога самакіравання) і “гарадскога ладу жыцця” (urban way of life) Луі Вірта (памер, шчыльнасць і гетэрагеннасць насельніцтва як асноўныя ўмовы для сегментацыі, дыферэнцыяцыі і касмапалітызму грамадства), якія, як і раней, выступаюць асноватворнымі ў заходніх даследаваннях гісторыі горада[41]. Разгляданая ў сучаснай навуковай літаратуры мадэль “еўрапейскага горада”, які ўяўляе сабой супрацьлегласць амерыканскаму гораду і, па сутнасці, абапіраецца на развітую грамадзянскую супольнасць, можа быць толькі ўмоўна дастасавана або наогул не будзе скарыстана для вывучэння рускіх і савецкіх гарадоў[42]. Таму неабходна для пачатку вызначыць

[41] Пар.: Murvar Vatro. Max Weber's Urban Typology and Russia // The Sociological Quarterly. 1967. Vol. 8 P. 481–494; Hildermeier M. Max Weber und die russische Stadt: Max Weber und die Stadt im Kulturvergleich / Hrsg. v. Bruhns H., Nippel W. Göttingen, 2000. S. 144–165.

[42] Пар.: Schubert D. Mythos “europäische Stadt”. Zur erforderlichen Kontextualisierung eines umstrittenen Begriffs // Die alte Stadt. 2001. Bd. 28. S. 270–290; Häußermann H. Die europäische Stadt // Leviathan. 2001. Bd. 29. S. 237–255; Kaelble H. Die Besonderheiten der europäischen Stadt im 20. Jahrhundert // тамсама. S. 256–274. Перадрук у: Die europäische Stadt im 20. Jahrhundert. Wahrnehmung – Entwicklung – Erosion / Hrsg. v. Lenger F., Tenfelde K. Köln / Weimar / Wien, 2006. S. 25–44; Lenger F.

крытэрыі, што падыходзілі б для даследавання працэсу ўрбанізацыі, які праходзіў пад знакам сацыялізму. Што да грамадскіх умоў ва Усходняй Еўропе, то яны істотна адрозніваліся ад нормаў заходняга "ўрбанізаванага грамадства" (Лутц Нітхамер), у якім гарадскі лад жыцця ў XX ст. распаўсюдзіўся на вёску[43].

Спачатку неабходна вызначыць паняццевы апарат: у той час як пры вывучэнні гісторыі горада даследчы інтарэс звернуты да некаторых канкрэтных гарадоў або груп гарадоў, пры вывучэнні ўрбанізацыі гаворка ідзе пра грамадскае развіццё ў цэлым. Тэрмін "урбанізацыя" азначае як колькасны, так і якасны працэсы. З аднаго боку, мы маем справу з канцэнтрацыяй насельніцтва ў гарадах, а з другога – з фармаваннем "сучаснага" ладу жыцця. Пры гэтым неабходна адрозніваць рост гарадоў за кошт прытоку працоўнай сілы, урбанізацыю, выкліканую канцэнтрацыяй насельніцтва ў вялікіх гарадах, а таксама распаўсюджванне гарадской атмасферы і гарадской культуры[44]. З часоў Другой

Probleme einer Geschichte der europäischen Stadt im 20. Jahrhundert – Anmerkungen zum Forschungsstand samt einiger Schlussfolgerungen // Informationen zur modernen Stadtgeschichte. 2005. H. 1. S. 96–113; ён жа. Die europäische Stadt im 20. Jahrhundert. Wahrnehmung – Entwicklung – Erosion / Hrsg. v. Lenger F., Tenfelde K. Köln / Weimar / Wien, 2006. S. 1–21; Hildermeier M. Die russische Stadt – Subtyp europäischer Entwicklungen? Тамсама. S. 45–60. Пар. тамсама: Auslaufmodell Europäische Stadt? Neue Herausforderungen und Fragestellungen am Beginn des 21. Jahrhunderts / Hrsg. v. Rietdorf W. Berlin, 2001; Die europäische Stadt – Mythos und Wirklichkeit / Hrsg. v. Hassenpflug D. 2. Aufl. Münster, 2002; Die europäische Stadt. / Hrsg. v. Siebel W. Frankfurt am Main, 2004.

43 Niethammer L. Stadtgeschichte in einer urbanisierten Gesellschaft // Sozialgeschichte in Deutschland. Entwicklungen und Perspektiven im internationalen Zusammenhang. Bd. II: Handlungsräume des Menschen in der Geschichte / Hrsg. v. Schieder W., Sellin V. Göttingen, 1986. S. 113–136, асабліва S. 117. Пар. тамсама: Tenfelde K. Die Welt als Stadt? Zur Entwicklung des Stadt-Land-Gegensatzes im 20. Jahrhundert // Die europäische Stadt im 20. Jahrhundert. Wahrnehmung – Entwicklung – Erosion / Hrsg. v. Lenger F., Tenfelde K. Köln / Weimar / Wien, 2006. S. 233–264.

44 Пар.: Teuteberg H. J. Historische Aspekte der Urbanisierung: Forschungsstand und Probleme // Urbanisierung im 19. und 20. Jahrhundert. Historische und geographische Aspekte. Köln / Wien, 1983. S. 2–34; Matzerath H. Lokalgeschichte, Stadtgeschichte, Historische Urbanisierungsforschung? // Geschichte und Gesellschaft. 1989. Bd. 15. S. 62–88; Reulecke J. Fragestellungen und Methoden der Urbanisierungsgeschichtsforschung in Deutschland // Stadtgeschichtsforschung. Aspekte, Tendenzen, Perspektiven. Linz / Donau, 1993. S. 215–236. Пар.: Perspektiven historischer Stadtforschung // Informationen zur modernen Stadtgeschichte. 2002. H. 1. S. 54–103.

сусветнай вайны паняцце "ўзор" (Leitbild) займае цэнтральнае месца ў дыскусіі аб развіцці горада ў Германіі. Яно апісвае ідэальныя ўяўленні пра горад як пра сацыяльную і прасторавую сістэмы парадку. Кожная сістэма ўлады выпрацоўвала свае паняцці "горада" і "гарадскога грамадства". У адпаведнасці з гэтым змена функцый узораў адлюстроўвае ролю, якую ў тым ці іншым разуменні планавання выконвае ўзаемасувязь паміж грамадствам і пабудаваным светам[45].

Каб зрабіць дадзены інструментар прыдатным для даследавання савецкай гісторыі, неабходна спачатку зразумець спецыфічныя ўмовы грамадскай сістэмы і сістэмы ўлады ў савецкім грамадстве. Калі разглядаць сталінізм як савецкі варыянт мадэрнізацыі, то ў канцы 1920-х гг. можна канстатаваць мабілізацыю грамадства (паскораная індустрыялізацыя і ўцёкі насельніцтва з вёскі), у канцы 1930-х гг. – атамізацыю грамадства (класавая барацьба і чысткі партыйнага апарату), а ў канцы 1950-х гг. – працэс кансалідацыі грамадства (Другая сусветная вайна і "дэсталінізацыя"). У якасці этапаў гэтага працэсу мадэрнізацыі варта вылучыць этап нівелявання насельніцтва (нацыяналізацыя прамысловасці, калектывізацыя сельскай гаспадаркі і ліквідацыя "ворагаў народа"), этап змены элітаў (пралетарызацыя былых сялян, пад'ём па сацыяльнай лесвіцы высокакваліфікаваных спецыялістаў, ліквідацыя старой бальшавіцкай эліты), узнікненне новых іерархічных структур (наменклатура, інтэлігенцыя як класавая сіла, патранат-кліенцкія адносіны). Гэты працэс працякаў на фоне інтэнсіўнай урбанізацыі, на якую пры складанні "грамадскай дамовы" вымушаны былі рэагаваць сацыяльныя планавальнікі. У галіне горадабудаўніцтва ў канцы 1920-х гг. вялася дыскусія пра ўтапічныя праекты сумеснага пражывання (дом-камуна), у сярэдзіне 1940-х гг. – пра задавальненне асноўных патрэбаў ("камуналка") і з 1960-х гг. – пра індывідуальнае развіццё (мікрараён, жылы раён). Пры Брэжневе "арганізаваны масавы кансэнсус" (Віктар Заслаўскі) засноўваўся на тым, што насельніцтва рэагавала на гарантаваныя з боку дзяржавы пастаяннае месца працы і стабільнасць цэн сыходам у прыватнае жыццё, а для задавальнення сваіх спажывецкіх інтарэсаў карысталася паслугамі ценявой эканомікі[46].

[45] Пар.: Ohne Leitbild? – Städtebau in Deutschland und Europa / Hrsg. v. Becker H., Jessen J., Sander R. 2., unveränderte Aufl. Stuttgart / Zürich, 1999.

[46] Пар.: Meissner B. Sowjetgesellschaft im Wandel. Rußlands Weg zur Industriegesellschaft. Stuttgart u.a. 1966; ён жа. Sowjetgesellschaft am

Зыходзячы з гэтых перадумоў, гарадскую атмасферу ў Савецкім Саюзе можна паказаць як вынік узаемадзеяння трох параметраў.

Першы – гэта "сістэма закрытых гарадоў. На працэс «"закрыцця" вялікіх гарадоў» упершыню звярнуў увагу Б. С. Хораў у сваёй публікацыі 1975 г. Каб стрымаць рост гарадоў, існавала, з аднаго боку, сістэма рэгістрацыі (1932 г. – пачатак увядзення пашпартоў у вялікіх гарадах і памежных рэгіёнах), і з другога – дэцэнтралізацыя індустрыяльных рэгіёнаў (1956 г. – забарона на будаўніцтва новых заводаў у вялікіх гарадах)[47]. Улічваючы сацыяльныя наступствы гэтай сістэмы, у 1982 г. Віктар Заслаўскі канстатаваў расслаенне савецкага грамадства, абумоўленае месцам жыхарства. Што тычыцца ўзроўню заработнай платы, асартыменту прапанаваных тавараў, устаноў адукацыі і аховы здароўя, а таксама магчымасцяў правядзення вольна-

Scheideweg. Beiträge zur Sozialstruktur der Sowjetunion. Köln, 1985; Inkeles A. Social Change in Soviet Russia. Cambridge, Mass, 1968; Matthews M. Class and Society in Soviet Russia. London, 1972; ён жа. Privilege in the Soviet Union. A Study of Elite Life Styles under Communism. London / Boston / Sydney, 1978; Mc Auley A. Economic Welfare in the Soviet Union. Poverty, Living Standards, and Inequality. Madison, Wisc., 1979; Kerblay B. Modern Soviet Society. London, 1983; Ruban M. E. u.a. Wandel der Arbeits- und Lebensbedingungen in der Sowjetunion 1955–1980. Planziele und Ergebnisse im Spiegelbild sozialer Indikatoren. Frankfurt am Main / New York, 1983; Stiller P. Sozialpolitik in der UdSSR 1950–80. Eine Analyse der quantitativen und qualitativen Zusammenhänge. Baden-Baden, 1983; Teckenberg W. Die soziale Struktur der sowjetischen Arbeiterklasse im internationalen Vergleich. Auf dem Weg zur industrialisierten Ständegesellschaft? München / Wien, 1977; ён жа. Gegenwartsgesellschaften: UdSSR. Stuttgart, 1983; Hoffmann E. P., Laird F. R. Technocratic Socialism. The Soviet Union in the Advanced Industrial Era. Durham, 1985; Lane D. Soviet Economy and Society. Oxford, 1985; ён жа. Soviet Society under Perestroika. Boston et al, 1990; Kelley D. R. The Politics of Developed Socialism. The Soviet Union as a Post-Industrial State. New York, 1986; Beyme K. von. Reformpolitik und sozialer Wandel in der Sowjetunion (1970–1988). Baden-Baden, 1988; Rywkin M. Soviet Society Today. Armonk, N.Y. / London, 1989; Cook L. J. The Soviet Social Contract and Why It Failed. Welfare Policy and Worker Politics from Brezhnev to Yeltsin. Cambridge, Mass. / London, 1993; Recent Social Trends in Russia, 1960–1995 / Ed. by Boutenko I. A., Razlogov K. E. London / Buffalo, 1997; Resnick C. A., Wolff R. F. Class Theory and History. Capitalism and Communism in the USSR. New York / London, 2002.

47 Пар.: Хорев Б. С. Проблемы городов (Урбанизация и единая система расселения в СССР). 2-е изд., доп. и перераб. Москва, 1975. С. 78–87.

га часу, то ў кірунку ад сталіцы і буйных гарадоў да сярэдніх і малых гарадоў і вёсак назіраліся, па словах Заслаўскага, істотныя адрозненні. Яшчэ адным фактарам расслаення можна назваць жыллёвую праблему ў шырокім сэнсе слова. Да гэтага адносяцца якасць і размяшчэнне кватэр (напрыклад, панэльны дом, цэнтр горада і г. д.) і форма пражывання (напрыклад, інтэрнат, кватэра для адной сям'і і г. д.)[48]. У 1930-я гг. для азначэння гарадоў і рэгіёнаў, дзе існаваў так званы пашпартны рэжым (забарона на пражыванне асобам, якім было адмоўлена ў атрыманні пашпарта), ужываўся тэрмін "рэжымная мясцовасць"[49]. Ад апісаных вышэй "закрытых гарадоў" неабходна адрозніваць засакрэчаныя гарады так званага ваенна-прамысловага комплексу і цэнтры атамных даследаванняў[50].

Другі параметр – анахранізм "сацыялістычнага рэалізму" ў архітэктуры сталінскага часу.

Андэрс Аман апісаў кантраст паміж мадэрнізмам (матэрыял, функцыя, канструкцыя) і традыцыяй (дэталь, фасад, ансамбль) як галоўную характарыстыку гісторыі архітэктуры XX ст. і канстатаваў у дадзенай сувязі кур'ёзнасць таго факта, што менавіта Савецкі Саюз сталінскага перыяду і яго саюзнікі, краіны народнай дэмакратыі, скарысталіся класічнай спадчынай "старога парадку" (ancien regime). Аман задаецца пытаннем: ці з'яўляецца "сацыялістычны рэалізм" кангеніяльным праяўленнем марксісцка-ленінскай ідэалогіі, якім ён быў у вачах яго прыхільні-

[48] Пар.: Zaslavsky V. The Neo-Stalinist State. Class, Ethnicity, and Consensus in Soviet Society. With a New Introduction. Armonk, N. Y., 1994. P. 130–164 (Closed Cities and the Organized Consensus); Smith G. Privilege and Place in Soviet Society // Horizons in Human Geography / Ed. by Derek G., Walford R. Houndmills / London, 1989. P. 320–340; Matthews M. The Passport Society. Controlling Movement in Russia and the USSR. Boulder / San Francisco / Oxford, 1993; Bohn T. M. Das sowjetische System der "geschlossenen Städte". Meldewesen und Wohnungsmangel als Indikatoren sozialer Ungleichheit // Die europäische Stadt im 20. Jahrhundert. Wahrnehmung – Entwicklung – Erosion / Hrsg. v. Lenger F., Tenfelde K. Köln / Weimar / Wien, 2006. S. 373–385.

[49] Пар.: Сидоров Н. "Изменение паспортной системы носит принципиально важный характер". Как создавалась и развивалась паспортная система в стране // Источник. Документы русской истории. 1997. № 6. С. 101–122, тут с. 113.

[50] Пар.: Lappo G., Poljan P. Transformation der geschlossenen Städte Rußlands. Köln, 1997; Schlegel, S. Der "Weiße Archipel". Sowjetische Atomstädte 1945–1991. Stuttgart, 2006.

каў, або адлюстраваннем таталітарнай улады, якім яго бачылі крытыкі? У дадзеным выпадку закранаецца пытанне пра суадносіны формы і ідэі ў архітэктуры. Аман супрацьпаставіў сродкі выражэння "эстэтычнага традыцыяналізму" (багацце формаў, пластычнасць, вертыкальнасць, сіметрыя, іерархія формаў і функцый) і "эстэтычнага мадэрнізму" (спрошчанасць формаў, гарызантальнасць, асіметрыя / паўтарэнні, прыпадабненне формаў і функцый) і паспрабаваў вырашыць праблему ідэйнага зместу праз крытычнае асэнсаванне пераменлівасці разумення архітэктуры. Аналізуючы дадзены дыскурс, даследчык канстатаваў, што для 1920-х гг. характэрна канвергенцыя сацыялізму і мадэрнізму, для 1930-х гг. – канвергенцыя савецкай сістэмы і традыцыі, для перыяду пасляваеннага часу – канвергенцыя дыктатуры і традыцыі. Вызначыўшы вышэйназваныя ўзаемасувязі, Аман прыйшоў да высновы, што сувязь паміж сацыяльным парадкам і эстэтычнай формай не існуе сама па сабе, а канструюецца актарамі ў адпаведнасці з тым ці іншым палітычным кантэкстам[51].

І, нарэшце, трэці параметр – гэта разрыў паміж "грамадскай прасторай" і "прыватнай сферай".

Сістэма ўлады Савецкага Саюза імкнулася перашкаджаць узнікненню аўтаномных супольнасцяў. Яна манапалізавала грамадскую сферу і палітычны дыскурс, каб дэманстраваць сваю ўладу і прапагандаваць генеральную лінію партыі. Пры гэтым свабода дзеянняў сацыяльных актараў была абмежаваная. "Грамадства" зводзілася да партыйнай грамадскасці. Між тым, дэпалітызацыя насельніцтва ні ў якім разе не азначала татальнага кантролю над штодзённым жыццём з боку партыі. Больш за тое, у "шэрых зонах" паўафіцыйных і нелегальных сфер усё больш выяўлялі сябе самыя сапраўдныя субкультуры (напрыклад, секты або "стылягі"). Акрамя таго, сістэма прывілеяў, якая аформілася на аснове пастаяннага недахопу тавараў, стымулявала развіццё ценявой эканомікі. У выніку ўзаемадзеяння звычайнага права, сацыяльных сувязяў і карупцыі выявілася двудушнасць савецкай сістэмы. Савецкі чалавек жыў

[51] Пар.: Åman A. Architecture and Ideology in Eastern Europe during the Stalin Era. An Aspect of Cold War History. Cambridge, Mass. / London, 1992. P. 239–259; Die osteuropäische Architektur der Stalinzeit als kunsthistorisches Problem: Städtebau und Staatsbau im 20. Jahrhundert / Hrsg. v. Dolff-Bonekämper G., Kier H. München / Berlin, 1996. S. 131–150.

у шызафрэнічных умовах, калі ў грамадскім жыцці яму даводзілася практыкаваць адрозныя ад прыватнага жыцця нормы і формы паводзін. У афіцыйнай сферы працы і бюракратыі, якая знаходзілася пад кантролем партыі, лічылася неабходным падпарадкоўвацца інтарэсам калектыву і ідэалагічным прынцыпам крытыкі і самакрытыкі. Аднак у сферы сям'і і сяброў, якая вызначалася сацыяльнымі кантактамі, мелі месца ўяўленні індывіда, якія супярэчлі гэтаму, а таксама стратэгіі прытворства і ўкрывальніцтва[52].

У гэтым кантэксце праблема "сацыялістычнага горада" адкрываецца з новага боку. Пытанне пра генезіс, г. зн. пра тое, як развіваўся тып "сацыялістычнага горада", і пра каўзальнасць, г. зн. пра тое, чаму тэорыя і практыка гарадскога планавання і гарадскога будаўніцтва супярэчылі адно аднаму, могуць вызначыць толькі агульныя рамкі дадзенага даследавання. Над спецыфічнымі праблемамі "сацыялістычнага горада" неабход-

[52] Пар.: Shlapentokh V. Public and Private Life of the Soviet People. Changing Values in Post-Stalin-Russia. New York, 1989; Garcelon M. The Shadow of the Leviathan. Public and Private in Communist and Post-Communist Society: Public and Private in Thought and Practice. Perspectives on a Grand Dichotomy / Ed. by Weintraub J., Kumar K. Chicago / London, 1997. P. 303–322; Kharkhodin O. Reveal and Dissimulate: A Genealogy of Private Life in Soviet Russia: тамсама, P. 333–363; ён жа. The Collective and the Individual in Russia. A Study of Practices. Berkeley / Los Angeles / London, 1999; Schlögel K. Kommunalka – oder Kommunismus als Lebensform. Zu einer historischen Topographie der Sowjetunion // Historische Anthropologie. 1998. Bd. 6. S. 329–346; ён жа. Der "Zentrale Gor'kij-Kultur- und Erholungspark" (CPKiO) in Moskau. Zur Frage des öffentlichen Raums im Stalinismus // Stalinismus vor dem Zweiten Weltkrieg. Neue Wege der Forschung / Hrsg. v. Hildermeier M. München, 1998. S. 255–274; Studer B., Unfried B. "Das Private ist öffentlich". Mittel und Formen stalinistischer Identitätsbildung // Historische Anthropologie. 1999. Bd. 7. S. 83–108; ён жа. Der stalinistische Parteikader. Identitätsstiftende Praktiken und Diskurse in der Sowjetunion der Dreißiger Jahre. Köln / Weimar / Wien, 2001; Fuchs M. Die Grauzonen der Sowjetisierung oder die sozial-kulturellen Nischen in der sowjetischen Gesellschaft // Zeitschrift für Weltgeschichte. 2001. Bd. 2. S. 107–124; Грушин Б. А. Четыре жизни России в зеркале опросов общественного мнения. Очерки массового сознания россиян времён Хрущева, Брежнева, Горбачева и Ельцина. Жизнь 1-я. Эпоха Хрущева. Москва, 2001. Жизнь 2-я. Эпоха Брежнева. Москва, 2003; Sphären von Öffentlichkeit in Gesellschaften sowjetischen Typs. Zwischen parteistaatlicher Selbstinszenierung und kirchlichen Gegenwelten / Hrsg. v. Rittersporn G. T., Rolf M., Behrends J. C. Frankfurt am Main u.a., 2003.

на задумацца больш глыбока. Якая была ўзаемасувязь паміж сацыяльнай арганізацыяй грамадства і прасторавай структурай горада? На якія палітычныя патрабаванні і грамадскія праблемы даводзілася рэагаваць архітэктарам і планавальнікам горада? Якое значэнне мела сфармуляваная ў канцы 1920-х гг. канцэпцыя "сацыялістычнага горада" ў пасляваенны час? У якой ступені міграцыйныя працэсы паўплывалі на перагрупоўку грамадства? Адкуль паходзілі мігранты і з якіх груп яны складаліся? Чаму дзяржава і партыя не маглі абмежаваць рост вялікіх гарадоў? Ці можна гаварыць пра "ўрбанізацыю" грамадства ў цэлым або хутчэй пра "асяляньванне" гарадоў? Ці канстытуяваліся па-за партыйнай грамадскасцю супольнасці з альтэрнатыўнымі жыццёвымі праектамі? Якую ролю выконваў недахоп жылля ў дэстабілізацыі сістэмы? Як гарадскія жыхары вырашалі свае асабістыя жыллёвыя праблемы? Відавочна, што на пытанні пра тое, як змянілася форма савецкіх гарадоў з цягам часу, ці пра тое, чаму гарады постсавецкай прасторы прынялі выгляд, які яны маюць сёння, можна адказаць толькі тады, калі ў даследаванні будуць прыняты пад увагу сацыяльна-эканамічныя і культурна-палітычныя аспекты. Менавіта тут гісторык і атрымлівае шанец сказаць нешта новае.

У дадзенай працы будзе даследавана развіццё горада Мінска пасля Другой сусветнай вайны з улікам наступных аспектаў: планаванне і архітэктура, урбанізацыя і міграцыя, а таксама жыллёвае пытанне і штодзённае жыццё. Гаворка ідзе пра тое, каб супаставіць жаданае і рэчаіснасць савецкай сістэмы і "сацыялістычнага горада". Пры гэтым наша даследаванне зыходзіць з таго, што эканамічны план дзяржавы і генеральная лінія партыі вызначалі норму; што эфектыўнасць працы апарату і прадпрыемстваў паказвалі межы гэтай сістэмы; што дэфіцыт і ценявая эканоміка былі неад'емнай часткай жыцця.

У першай храналагічнай частцы даследавання пры дапамозе структурна-гістарычнага агляду паказаны фонавы кантэкст, на аснове якога можна будзе праводзіць крытычную інтэрпрэтацыю крыніц. Пры гэтым асаблівая ўвага будзе аддадзена тром асноўным тэндэнцыям: 1) змена горадабудаўнічага ўзору ў Савецкім Саюзе ў 1930–1950-я гг. і звязанае з гэтым стварэнне "сістэмы закрытых гарадоў"; 2) працэсы індустрыялізацыі і ўрбанізацыі, пачатыя ў ходзе запозненай мадэрнізацыі ў БССР у XX ст.; 3) пераўтварэнне горада Мінска з лакальнага гандлёвага цэнтра ў савецкую індустрыяльную метраполію.

Зыходзячы з трох асноўных пытанняў, у галоўнай сістэматычнай частцы гэтай працы будзе праведзена эмпірычнае даследаванне гісторыі Мінска пасля Другой сусветнай вайны на аснове архіўных матэрыялаў. У першым раздзеле гаворка пойдзе пра праектаванне "сацыялістычнага горада". Пры гэтым будуць разгледжаны тры аспекты: 1) вызначаная генеральным планам *структура горада*, г. зн. яго анатомія; 2) архітэктура, абумоўленая дыскусіяй пра "сацыялістычны рэалізм" і дэфармаваная "вялікім пераломам у будаўніцтве", г. зн. *твар горада*; 3) аднаўленне горада пасля вайны, якое адбывалася ва ўмовах хаосу і дэфіцыту, г. зн. *рэканструкцыя горада*. Другі раздзел прысвечаны пытанням міграцыі ў "сацыялістычны горад". У гэтым кантэксце будуць асветлены тры праблемы: 1) крыніцы росту горада і класіфікацыя мігрантаў; 2) беспадстаўнасць сістэмы рэгістрацыі як меры супраць уцёкаў з вёскі; 3) умовы жыцця мігрантаў у так званых "шэрых зонах" "закрытага горада". У трэцім раздзеле будзе разгледжана жыллёвая праблема ў "сацыялістычным горадзе". У рамках гэтага падзелу будуць даследаваны наступныя пытанні: 1) цэнтралізацыя і вынікі жыллёвага будаўніцтва; 2) патрэба ў жыллі і яго размеркаванне; 3) пераход ад калектыўных да індывідуальных формаў пражывання.

У заключнай, трэцяй, частцы з дапамогай спецыяльных даследаванняў будуць паказаны паўафіцыйныя сферы і "шэрыя зоны" савецкай штодзённасці. Гаворка ідзе пра спробу наблізіцца да рэалій жыцця таго часу шляхам разгляду асобных выпадкаў. Былі абраны прыклады з архіўных матэрыялаў, якія часам даходзяць да абсурду і падобныя на анекдоты: 1) нелегальнае паселішча Новыя Шэйпічы, якое ўзнікла на ўскраіне Мінска ў пачатку 1950-х гг. – прававы "вакуум" у перыяд сталінізму; 2) місіянерская дзейнасць пяцідзясятнікаў у прыватным сектары Мінска сярэдзіны 1950-х гг. – праект "жыцця ў свеце па-за Савецкім Саюзам"; 3) калектыўная акцыя пратэсту жыхароў, якія мерзлі ў мікраараёне на вуліцах Розы Люксембург і Карла Лібкнехта ў канцы 1950-х гг. – фармаванне "паралельнай грамадскасці" (Gegenöffentlichkeit) у перыяд "адлігі" пры Хрушчове; 4) невыносныя жыллёвыя ўмовы цывільнага насельніцтва ў ваенным гарадку Усходні ў канцы 1960-х гг. – пазбаўлены правоў анклаў у перыяд "развітога сацыялізму" пры Брэжневе.

## 3 Літаратура і крыніцы

Гісторыя Беларусі па-ранейшаму належыць да маладаследаванай галіны ў заходняй гістарыяграфіі. Не трэба асабліва цешыць сябе з нагоды выдадзенага ў 2001 г. Дзітрыхам Байрау і Райнэрам Ліндпэрам "Handbuch der Geschichte Weißrußlands" (зборнік артыкулаў па гісторыі Беларусі), бо ён складаецца ў асноўным з работ беларускіх аўтараў[53]. Да цяперашняга часу гісторыяй Беларусі займаліся перш за ўсё беларускія эмігранты ў ЗША[54]. Умовы для з'яўлення фундаментальных даследаванняў былі створаны толькі пасля адкрыцця архіваў Рэспублікі Беларусь. Дзякуючы гэтаму ў апошні час быў апублікаваны цэлы шэраг навуковых дысертацый. Агульны агляд развіцця беларускай гістарыяграфіі ў XIX і XX стст. прапануе выдадзеная ў 1999 г. манаграфія Райнэра Ліндпэра[55]. Для гісторыі міжваеннага перыяду знакавай з'яўляецца праца Дыяны Зіберт 1998 г., прысвечаная стратэгіям выжывання беларускіх сялян ва ўмовах савецкай гвалтоўнай калектывізацыі сельскай гаспадаркі[56]. Узнікненне новых крыніц стымулявала даследаванне

[53] Пар.: Handbuch der Geschichte Weißrußlands / Hrsg. v. Beyrau D., Lindner R. Göttingen, 2001.

[54] Пар.: Vakar N. P. Belorussia. The Making of a Nation. A Case Study. Cambridge, Mass., 1956; Lubachko I. C. Belorussia under Soviet Rule, 1917–1957. Lexington, 1972; Byelorussian Statehood. Reader and Bibliography / Ed. by Kipel V. and Z. New York, 1988; Zaprudnik J. Belarus. At a Crossroads in History. Boulder / San Francisco / Oxford, 1993; Kipel V. Belarusans in the United States. Lanham, MD / New York / Oxford, 1999.

[55] Пар.: Lindner R. Historiker und Herrschaft. Nationsbildung und Geschichtspolitik in Weißrußland im 19. und 20. Jahrhundert. München, 1999. У беларускім варыянце: Ліндпэр Р. Гісторыкі і ўлада: нацыятворчы працэс і гістарычная палітыка ў Беларусі XIX–XX ст. / пер. з ням. Л. Баршчэўскага. С.-Пецярбург, 2003. Пар.: Wexler P. N. Purism and Language: A Study in Modern Ukrainism and Belorussian Nationalism (1840–1967). New York / The Hague, 1974; ён жа. A Historical Phonology of the Belorussian Language. Heidelberg, 1977; Mc Millin A. B. Die Literatur der Weißrussen. A History of Byelorussian Literature. From its Origins to the Present Day. Gießen, 1977; ён жа. Belarusian Literature in the 1950th and 1960th. Release and Renewal. Köln / Weimar / Wien, 1999.

[56] Пар.: Siebert D. Bäuerliche Alltagsstrategien in der Belarussischen SSR (1921–1941). Die Zerstörung patriarchalischer Familienwirtschaft. Stuttgart, 1998. Пар. да пытання пра Другую Польскую Рэспубліку і яе саветызацыю пасля далучэння да БССР у 1939 г. таксама:

перш за ўсё гісторыі Другой сусветнай вайны. Бернгард К'яры ў 1998 г. выдаў працу пра паўсядзённае жыццё беларускага насельніцтва ва ўмовах нямецкай акупацыі. Услед за гэтым у 1999 г. з'явілася праца Крысціяна Герлаха пра нацыянал-сацыялістычную эканамічную палітыку і палітыку знішчэння[57]. Палітычным развіццём пасля Другой сусветнай вайны займаўся толькі Майкл Е. Урбан. У яго працы, выдадзенай яшчэ ў 1989 г., вывучалася пытанне пра ролю пакалення партызан у беларускай партыйнай эліце[58]. З тых часоў у паліталагічных даследаваннях асвятляецца ў першую чаргу праблема трансфармацыі адносна легітымізацыі дзяржаўнага суверэнітэту і зацвярджэння нацыянальнай незалежнасці[59].

Да гэтага часу ў заходняй гістарыяграфіі не прымалася пад увагу, што Мінск быў не толькі ўзорным "сацыялістычным горадам", але і ўяўляў сабою феномен вялікага горада Савецкага

Gross J. T. Revolution from abroad. The Soviet Conquest of Poland's Western Ukraine and Western Belorussia. Princeton, N. J., 1988; таксама. Und wehe, du hoffst. Die Sowjetisierung Ostpolens nach dem Hitler-Stalin-Pakt 1939–1941. Freiburg i. Br., 1988; The Soviet Takeover of the Polish Eastern Provinces, 1939–1941 / Ed. by Sword K. Houndmills / London, 1991; Sword K. Deportation and Exile. Poles in the Soviet Union, 1939–1948. Houndmills / London, 1994. Пар.: Benecke W. Die Ostgebiete der zweiten polnischen Republik. Staatsmacht und öffentliche Ordnung in einer Minderheitenregion 1918–1939. Köln / Weimar / Wien, 1999.

57 Пар.: Chiari B. Alltag hinter der Front. Besatzung, Kollaboration und Widerstand in Weißrußland 1941–1944. Düsseldorf, 1998 (у беларускамоўным перакладзе: К'яры Б. Штодзённасць за лініяй фронту: Акупацыя, калабарацыя і супраціў у Беларусі (1941–1944) / пер. з нямецкай мовы Л. Баршчэўскага. Мінск, 2005); Gerlach Ch. Kalkulierte Morde. Die deutsche Wirtschafts- und Vernichtungspolitik in Weißrußland 1941 bis 1944. Hamburg, 1999. Пар. таксама: Eckmann L., Lazar Ch. The Jewish Resistance. The History of the Jewish Partisans in Lithuania and White Russia during the Nazi Occupation 1940–1945. New York, 1977; Turonek, J. Bial

58 Urban M. E. An Algebra of Soviet Power. Elite Circulation in the Belorussian Republic 1966–1986. Cambridge, 1989.

59 Пар: аб праблеме трансфармацыі: Sahm A. Die weißrussische Nationalbewegung nach der Katastrophe von Tschernobyl (1986–1991). Münster / Hamburg, 1994; яна ж. Transformation im Schatten von Tschernobyl. Umwelt- und Energiepolitik im gesellschaftlichen Wandel von Belarus und der Ukraine. Münster / Hamburg / London, 1999; Marples D. Belarus: From Soviet Rule to Nuclear Catastrophe. New York, 1996; ён жа. Belarus: A Denationalized Nation. Amsterdam, 1999; Belarus at the Crossroads / Ed. by Garnett S. W., Legvold R. Washington, D.C., 1999; Belarus. Zwischenbilanz einer stornierten Transformation / Hrsg. v. Scharff R. Osnabrück, 2001.

Саюза, які рос вельмі хутка. Акрамя агульных аглядаў па гісторыі горада XIX і XX стст. у зборніку артыкулаў па гісторыі Беларусі пад рэдакцыяй Байрау і Ліндنэра[60] з работ на заходнееўрапейскіх мовах можна назваць толькі магістарскую працу Увэ Гартэншлегера пра жыццё ў акупаваным Мінску, дысертацыю Барбары Эпштэйн пра супрацíў у мінскім гета пад час Другой сусветнай вайны[61], артыкул Леаніда Смілавіцкага пра мінскіх яўрэяў у перыяд позняга сталінізму[62], прапанаваныя Робертам Брымам вынікі апытання сярод яўрэйскіх эмігрантаў[63], артыкул

[60] Пар.: Schybeka S. Das "alte" Minsk – vom zarischen Gouvernementszentrum zur sowjetischen Hauptstadt: Handbuch der Geschichte Weißrußlands / Hrsg. v. Beyrau D., Lindner R. Göttingen, 2001. C. 308–318; Bohn T. M. Das "neue" Minsk – Aufbau einer sozialistischen Stadt nach dem Zweiten Weltkrieg // Тамсама. С. 319–333. Пар. таксама: Bohn T. M. Menesk – Mensk – Minsk. Wit-Russische hoofdstad, sovjetheldenstad, socialistische modelstad // Ost-Europa Verkenningen. 2002. Bd. 167. P. 62–70; ён жа. Das "Phänomen Minsk". Sozialistische Stadtplanung in Theorie und Praxis: Städteplanung – Planungsstädte / Hrsg. v. Fritsche B., Gilomen H.-J., Stercken M. Zürich, 2006. S. 141–155; ён жа. Das "Minsker Phänomen". Stadtwachstum und Wohnungsnot in der Sowjetunion nach dem Zweiten Weltkrieg // Städte zwischen Wachstum und Schrumpfung. Wahrnehmungs- und Umgangsformen zwischen Geschichte und Gegenwart / Hrsg. v. Schildt A., Schubert D. Dortmund, 2008. S. 145–159.

[61] Пар.: Gartenschläger U. Living und Surviving in Occupied Minsk // The People's War. Responses to World War II in the Soviet Union / Ed. by Thurston R. W., Bonwetsch B. Urbana, Chicago, 2000. P. 13–28. Пар.: ён жа. Die Stadt Minsk während der deutschen Besetzung (1941–1944). Dortmund, 2001; Epstein B. Allies in Resistance: Jews and Belarussians in German-Occupied Minsk // Colaboration and Resistance during the Holocaust. Belarus, Estonia, Latvia, Lithuania / Ed. by Gaunt D., Levine P., Palosuo L. Bern et al., 2004. P. 431–457; яна ж. The Minsk Ghetto 1941–1943. Jewish Resistance and Soviet Internationalism Berkeley et al., 2008. Пар. таксама: Cholawsky Sh. The Judenrat in Minsk // Patterns of Jewish Leadership in Nazi Europe, 1933–1945. Proceedings of the Third Yad Vashem International Historical Conference / Ed. By Gutman I., Haft C. J. Jerusalem, 1979. P. 113–132; ён жа. The German Jews in the Minsk Ghetto // Yad Vashem Studies. Jerusalem. 1986. Vol. 17. P. 219–245; Hecker C. Deutsche Juden im Minsker Ghetto // Zeitschrift für Geschichtswissenschaft. 2008. Bd. 56. S. 823–843.

[62] Пар.: Smilovitsky L. Jewish Religious Life in Minsk, 1944–1953 // JEE. 1996. Vol. 30. P. 5–17. Рускае выданне: Смиловицкий Л. Попытки возобновления еврейской религиозной общины в Минске, 1944–1954 гг. // ён жа. Евреи Беларуси. Из нашей общей истории. 1905–1953. Минск, 1999. С. 286–302.

[63] Пар.: Brym R. J. The Jews of Moscow, Kiev and Minsk. Identity, Antisemitism, Emigration / Ed. by Spier, H. Houndmills / London, 1995.

Джона Сальнова пра рэгіянальнае планаванне ў Мінскай вобласці ў 1970-я гг.[64], а таксама эсэ Кая Фёклера пра афармленне грамадскіх сфер у пераходны перыяд[65]. Такім чынам, гарадская гісторыя і ўрбанізацыя Беларусі – "белыя плямы" ў заходніх даследаваннях па гісторыі Усходняй Еўропы.

Пры гэтым першае знаёмства з гісторыяй Мінска палегчыла дапаможная літаратура. З нагоды 900-гадовага юбілею горада ў 1967 г. былі выдадзены дзве бібліяграфіі[66] і храналогія XX стагоддзя, заснаваная на газетных артыкулах[67]. У сувязі з прысваеннем Мінску ў 1974 г. звання "Горад-герой" апублікаваны дзве энцыклапедыі, якія хоць і прысвечаны рэвалюцыйнай спадчыне і традыцыям партызанскай барацьбы, але, тым не менш, утрымліваюць асноўную інфармацыю па гісторыі горада[68]. У 1980-я гг. з'явіліся на свет яшчэ дзве падрабязныя энцыклапедыі з біяграфіямі гістарычных асоб, ушанаваных у назвах вуліц беларускай сталіцы, і з апісаннямі архітэктурных помнікаў Мінска[69]. У рамках серыі "Памяць", якая ў роўнай ступені прысвечана як ахвярам Другой сусветнай вайны, так і гістарычнай спадчыне беларускіх гарадоў і рэгіёнаў, у 2001–2005 гг. выйшаў у свет чатырохтамовы даведнік пра Мінск[70]. Услед за гэтым у 2006 г.

[64] Пар.: Sallnow J. The Minsk City Region, an Example of Soviet Regional Planning // SG. 1982. Vol. 23. P. 445–451.

[65] Пар.: Vöckler, K. Öffentlicher Raum, Minsk – Räume des Jubels und die Entstehung neuer Öffentlichkeiten // Transiträume. Frankfurt / Oder, Poznan, Warschau, Brest, Minsk, Smolensk, Moskau. Berlin, 2006. S. 420–445.

[66] Пар.: Древнему и вечно юному Минску 900 лет (Обзор художественной литературы). Минск, 1966; Мінску – 900 год. Рэкамендацыйны паказальнік літаратуры. Мінск, 1967. Пар.: Гарады Беларусі. Рэкамендацыйны бібліяграфічны паказальнік. Мінск, 1987.

[67] Пар.: Минск. Краткая хроника (ноябрь 1917 – 1966). Минск, 1967.

[68] Пар.: Минск. Город-герой. Справочник. Минск, 1976; Минск. Энциклопедический справочник. Изд. 2-е, доп. и перераб. Минск, 1983. Пар.: Гарады і гарадскія пасёлкі Беларусі. Мінск, 1981. С. 152–169; Освобождение городов. Справочник по освобождению городов во время Великой Отечественной войны. 1941–1945 / под общ. ред. С. П. Иванова. Москва, 1985.

[69] Пар.: Их именами названы... Энциклопедический справочник. Минск, 1987; Збор помнікаў культуры і гісторыі Беларусі. Мінск. Мінск, 1988. Пар.: Жучкевич В. А. Улицы помнят. История, события, люди в названиях улиц и площадей города-героя Минска. Минск, 1979; Чернявская Т. И., Петросова Е. Ю. Памятники архитектуры Минска XVII – начала XX в. Минск, 1984.

[70] Пар.: Памяць. Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. Мінск. Кн. 1–4. Мінск, 2001–2005.

Яўген Малашэвіч прапанаваў падрабязную храналогію гісторыі горада Мінска[71].

Што тычыцца гістарычнага даследавання Мінска савецкай гістарыяграфіяй, то варта адзначыць выдадзеную ў 1957 г. на рускай мове "Гісторыю Мінска", дапоўненую і перавыдадзеную на беларускай мове да юбілею горада ў 1967 г. У адпаведнасці з жанрам савецкай гістарычнай калектыўнай працы XX стагоддзе паказана тут як перыяд эканамічнага будаўніцтва і сацыяльнага прагрэсу. Ігнаруючы шматлікія бакі рэальнасці, выданне асвятляе перш за ўсё дасягненні працоўнага класа на шляху да сацыялізму[72]. Нягледзячы на новае выданне гісторыі Мінска на дзвюх мовах (2006), якое замест марксісцка-ленінскага тлумачэння прапануе патрыятычны погляд на гісторыю горада, яно змяшчае няшмат новага матэрыялу, бо эмпірычна грунтуецца на тых самых крыніцах, што і два папярэднія выданні[73].

Грунтоўна з навуковага пункту гледжання вывучана гісторыя дарэвалюцыйнага Мінска. Асноватворныя ў галіне заснавання і ранняй гісторыі горада – працы археолага Э. М. Загарульскага[74]. Сацыяльны склад насельніцтва і эканамічныя магчымасці горада ў эпоху канца Расійскай імперыі прааналізаваны гісторыкам З. В. Шыбекам, які ўзнавіў вобраз паўсядзённага жыцця і культуры дарэвалюцыйнага Мінска[75]. Гісторыя ж Мінска міжваеннага перыяду пададзена толькі ў адным фотаальбоме, такім чынам, гэта маладаследаваны перыяд у гісторыі горада[76]. Для вывучэння пасляваеннага перыяду можа быць прыцягнута зноў-такі вялікая колькасць савецкай і постсавецкай даведач-

[71] Пар.: Малашевич Е. Минск. Книга жизни: 4500 событий и фактов из истории города. Минск, 2006.

[72] Пар.: История Минска. Москва, 1957; Гісторыя Мінска. Мінск, 1967. Пар. таксама: Мартинкевич Ф. С. Минск. Минск, 1958.

[73] Пар.: Гісторыя Мінска / пад рэд. У. А. Бабкова. Мінск, 2006.

[74] Пар.: Загорульский Э. М. Древний Минск. Минск, 1963; ён жа. Возникновение Минска. Минск, 1982.

[75] Пар.: Шибеко З. В. Минск в конце XIX – начале XX в. Очерк социального и экономического развития. Минск, 1985; ён жа, Шибеко С. Ф. Минск. Страницы жизни дореволюционного города. Минск, 1990. Беларускае выданне: Шыбека З. В., Шыбека С. Ф. Мінск. Старонкі жыцця дарэвалюцыйнага горада. Мінск, 1994. Новае выданне: Шыбека З. Мінск сто гадоў таму. Мінск, 2007. Пар.: ён жа. Гарады Беларусі (60-я гады XIX – пачатак XX ст.). Мінск, 1997; ён жа. Гарадская цывілізацыя. Беларусь і свет. Курс лекцый. Вільня, 2009.

[76] Пар.: Мінск незнаёмы. 1920–1940 / аўтар-укладальнік І. Куркоў. Мінск, 2002; Ивашин В. Г. Великий Октябрь в Минске. Минск, 1957.

най і прапагандысцкай літаратуры. У якасці асноўнай працы па гісторыі планавання горада можна назваць зборнік 1966 г., які наглядна дэманструе аднаўленне беларускай сталіцы. У гэтым зборніку гаворка ідзе пра матэрыялы, прапанаваныя непасрэдна ўстановамі, якія займаюцца гарадскім планаваннем, таму названы зборнік можна разглядаць як крыніцу[77]. Спецыяльныя даследаванні па развіцці Мінска пасля Другой сусветнай вайны былі зроблены архітэктарамі і дэмографамі. Калі ў савецкі перыяд беларускія гісторыкі архітэктуры былі вымушаны паказваць толькі светлыя бакі жыцця пры сацыялізме, то пасля здабыцця Рэспублікай Беларусь незалежнасці яны пачалі актыўна займацца пошукам асаблівасцяў нацыянальных традыцый мінулага. Фотаальбомы А. А. Воінава, В. І. Анікіна, А. І. Лакоткі і В. І. Кірычэнкі прапануюць нам, з аднаго боку, наглядны матэрыял па гісторыі архітэктуры Мінска, з другога боку, – планы і схемы па гарадскім і жыллёвым будаўніцтве[78]. Акрамя ілюстрацый архітэктараў, цікавасць выклікаюць і звесткі, прапанаваныя дэмографамі[79]. Прывілеяванае становішча дэмаграфіі

[77] Пар.: Минск. Послевоенный опыт реконструкции и развития. Москва, 1966.

[78] Пар.: Воинов А. А. Жилищное строительство в Белорусской ССР. Минск, 1980; ён жа. История архитектуры Белоруссии. II. (Советский период). 2-е изд., перераб. и доп. Минск, 1987; Аникин В. И. и др. Архитектура Советской Белоруссии / под общ. ред. В. И. Аникина. Москва, 1986; ён жа. Жилой район крупного города (Опыт Белоруссии). Москва, 1987; ён жа і інш. Градостроительство Белоруссии / под общей ред. А. В. Сычевой. Минск, 1988; ён жа. Минск, архитектура столицы Республики Беларусь. Минск, 1997; Лакотка А. І. Сілуэты старога Мінска. Нарысы архітэктуры. Мінск, 1991; ён жа. Беларусы. Т. II: Дойлідства. Мінск, 1997; ён жа. Нацыянальныя рысы беларускай архітэктуры. Вёска, мястэчка, горад. Мінск, 1999; Кірычэнка В. І. Мінск. Гісторыя пасляваеннага аднаўлення. 1944–1952. Мінск, 2004; ён жа. Мінск. Гістарычны партрэт горада. 1953–1959. Мінск, 2006; ён жа. Мінск. 1960–1969. Дзесяцігадовы шлях сталіцы. Десятилетний путь столицы. Минск, 2007. Пар. таксама: Егоров Ю. А. Ансамбль главной магистрали Минска: Ансамбль в градостроительстве СССР. Очерки. Москва, 1961. С. 129–174; Лысенко А. В. Главная улица Минска (Ленинский проспект). Минск, 1963; Потапов Л. С. Силуэт Минска. Минск, 1980; Денисов В. Н. Площадь Свободы в Минске. Минск, 1982; Общественные центры городских населённых мест БССР (Опыт формирования, проблемы и направления развития ) / под общ. ред. Е. Л. Заславского. Минск, 1991.

[79] Пар.: Раков А. А. Население БССР. Минск, 1969; ён жа. Белоруссия в демографическом измерении. Минск, 1974; Демографическое раз-

ў Савецкім Саюзе можна растлумачыць тым, што фетышызацыя фактару працы ў працэсе планавання патрабавала дакладных звестак па велічыні і размеркаванні патэнцыялу рабочай сілы. У гэтым кантэксце С. А. Польскі звярнуў увагу ў сваёй манаграфіі "Дэмаграфічныя праблемы развіцця Мінска", выдадзенай у 1976 г., на тое, што беларуская сталіца з 1960-х гг. была горадам Савецкага Саюза, які рос найбольш хутка. У 1991 г. Польскі змог пазнаёміць са сваім тэзісам аб "мінскім феномене" нямецкую аўдыторыю праз часопіс "Petermanns Geographische Mitteilungen" ("Геаграфічныя весткі Петэрмана")[80], які выходзіць у Гоце. Менавіта гэты тэзіс натхніў аўтара на дадзенае даследаванне. Гаворка ідзе пра вызначэнне "мінскага феномена" на падставе міграцыйных дадзеных, якія былі або зусім недаступныя, або часткова даступныя Польскаму, а таксама пра высвятленне наступстваў нарастання "ціску" насельніцтва на гарадское грамадства.

З гэтым у той жа час звязана і адна з галоўных праблем дадзенага даследавання. З-за адсутнасці прац у гэтай галіне і сучасных крытычных публіцыстычных артыкулаў сацыяльнае развіццё Мінска складана прасачыць без прыцягнення дадатковых крыніц. У агульным і цэлым, ідэалагічная манаполія марксізму-ленінізму ў Савецкім Саюзе абмяжоўвала правядзенне навуковых сацыялагічных даследаванняў. Паколькі аж да распаду Савецкага Саюза сацыялогія не была ўключаная ў праг-

витие и трудовые ресурсы БССР (Социально-экономические проблемы) / под ред. Я. И. Рубина, А. А. Ракова. Минск, 1988; Манак Б. А. Насельніцтва Беларусі. Рэгіянальныя асаблівасці развіцця і рассялення. Мінск, 1992; Манак Б. А., Антипова Е. А. Экономико-географический анализ демографической ситуации размещения населения на территории Республики Беларусь. Минск, 1999; Шахотько Л. П. Население Республики Беларусь в конце XX века. Минск, 1996; Нацыянальна-дэмаграфічныя працэсы на Беларусі. Зб. навук. арт. / пад. рэд. А. А. Каваленi, В. Ф. Касовiча. Мiнск, 1998.

80 Пар.: Польский С. А. Демографические проблемы развития Минска. Минск, 1976. Пар.: ён жа. Проблемы рационального использования трудовых ресурсов Минска: Проблемы расселения в БССР / ред. С. А. Польский. Минск, 1980. С. 136–150; ён жа. Ключевые проблемы социально-экономического развития г. Минска. Минск, 1981; ён жа. Урбанизация Белорусской ССР. Учебно-методическое пособие. Минск, 1985; ён жа. Ещё раз о "минском феномене": Экономика социальной сферы крупного города: Опыт, проблемы, перспективы. Тезисы докладов научно-практической конференции. Минск, 29–30 мая 1989 г. Минск, 1989. С. 3–4.

раму беларускіх вышэйшых навучальных установ, можна гаварыць пра існаванне толькі невялікай колькасці праведзеных апытанняў і наяўных сацыялагічных звестак. На жаль, выказанае С. А. Польскім меркаванне пра неабходнасць прыняцця пад увагу новага сацыяльнага пласта "сялян-рабочых" так і не знайшло водгуку ў савецкім Мінску[81]. У сувязі з тым, што і пасля абвяшчэння незалежнасці Рэспублікі Беларусь сацыялогія горада не атрымала належнага развіцця, такія комплексныя тэмы, як сацыяльная структура, сацыяльнае асяроддзе і сегрэгацыя грамадства да цяперашняга часу застаюцца маладаследаванымі. Гэта, у сваю чаргу, можна растлумачыць тым, што географы ў сваіх даследаваннях звярталіся хутчэй да пытанняў размяшчэння прамысловых цэнтраў і міжрэгіянальных сетак забеспячэння, чым да гарадскога ландшафту[82]. Працы, прысвечаныя гарадскому ладу жыцця, можна часцей за ўсё сустрэць у этнолагаў, навуковы інтарэс якіх у савецкі перыяд складаўся, аднак, толькі ў тым, каб паказаць памяншэнне адрозненняў паміж горадам і вёскай[83]. Гэтыя даследаванні хоць і ўтрымліваюць неабходную інфармацыю пра беларускія абрады, але для рэтраспектыўнага вывучэння гісторыі грамадства і менталітэту непрыдатныя. Наведванне сельскай мясцовасці Беларусі дае магчымасць і сёння ўбачыць розніцу паміж сельскім і га-

[81] Польский С. А. Современные процессы урбанизации и место в них маятниковой миграции // Город и маятниковая миграция населения / под ред. С. А. Польского. Минск, 1973. С. 10–42, тут с. 25.

[82] Пар.: Абрасимов П. А. Минск. Историко-экономический очерк. Минск, 1956; Жучкевич В. А., Малышев А. Я., Рогозин Н. Е. Города и сёла Белорусской ССР. Историко-географические очерки. Минск, 1959; Белогорцев И. Д., Гурин И. И., Кустанович С. М. Развитие городов Белоруссии. Минск, 1967; Богданович А. В., Сидоров П. А. Города Белоруссии. Краткий экономический очерк. Минск, 1967; Польскі С. А. Нарысы геаграфіі гарадоў Беларускай ССР (1917–1941). Мінск, 1973; Козлов Г. С., Харевский В. Я. Экономические и социальные проблемы градостроительства Белоруссии. Минск, 1980.

[83] Пар.: Корзун И. П. Преодоление различий между городом и деревней в быту и культуре. Историко-этнографическое исследование по материалам БССР. Минск, 1972; Изменения в быту и культуре городского населения Белоруссии / под ред. В. К. Бондарчика. Минск, 1976; Этнические процессы и образ жизни (По материалам исследования городов БССР) / ред. В. К. Бондарчика. Минск, 1980; Касперович Г. И. Миграция населения в города и этнические процессы (по материалам иследования городского населени БССР). Минск, 1985; Грамадскі быт і культура гарадскога насельніцтва Беларусі / нав. рэд. В. К. Бандарчык. Мінск, 1990.

радскім ладам жыцця. Нарэшце, эканамічная гістарыяграфія ва ўмовах сацыялізму, з аднаго боку, перадавала колькасныя паказчыкі пяцігадовых планаў і эканамічныя рэзалюцыі партыйнага і дзяржаўнага кіравання, а з другога – падкрэслівала дасягненні працоўнага класа ў працэсе паляпшэння ўзроўню жыцця насельніцтва[84]. У постсавецкай гістарыяграфіі пасляваенны час не асветлены. У сваіх даследаваннях беларускія гісторыкі не выходзяць за часавыя рамкі перыяду Другой сусветнай вайны. Наватарскім можна назваць толькі падыход Артура Клінава, які пасля праблематычных прэзідэнцкіх выбараў 2006 г., спасылаючыся на твор Тамаза Кампанелы "Горад сонца" (1602) і выкарыстоўваючы савецкую прапаганду 1960-х гг., выдаў фотаальбом і эсэ, у якіх разгарнуў мастацкую палеміку на тэму "Мінск – горад Сонца", паказаўшы пры гэтым усю абсурднасць, якую выклікалі і выклікаюць дыктатарскія рэжымы

[84] Пар.: Марченко И. Г. Рабочий класс БССР в послевоенные годы (1945–1950). Минск, 1962; ён жа. Трудовой подвиг рабочего класса Белорусской ССР (1943–1950 гг.). Минск, 1977; Экономическая история БССР / под общей ред. С. Н. Малинина, К. И. Шабуни. Минск, 1969; Социально-экономические преобразования в Белорусской ССР за годы Советской власти / под ред. Ф. С. Мартинкевича. Минск, 1970; Развитие экономики Белоруссии в 1921–1927 гг. / под ред. Ф. С. Мартинкевича и В. И. Дрича. Минск, 1973; Развитие экономики Белоруссии в 1928–1941 гг. / под ред. В. И. Дрича. Минск, 1975; Гилицкий Ф. И. Социально-экономические проблемы трудовых ресурсов БССР. Минск, 1977; Развитие экономики Белоруссии в 1961–1970 гг. / под ред. Ф. С. Мартинкевича и В. И. Дрича. Минск, 1978; Развитие отраслей народного хозяйства в Белоруссии (историко-географические очерки) / под ред. В. П. Бородиной, В. А. Жучкевича, Н. Т. Романовского. Минск, 1978; Экономическая география Белоруссии / под общ. ред. С. Мельничука. 3-е изд., перераб. и доп. Минск, 1982; Региональные проблемы экономического и социального развития БССР / науч. ред. А. В. Богданович. Минск, 1982; История рабочего класса БССР / глав. ред. коллегия: П. Т. Петриков и др. Т. I. Рабочий класс Белоруссии в период капитализма. Минск, 1984. Т. II. Рабочий класс БССР в годы Великой Октябрьской социалистической революции и годы построения социализма (1917–1937). Минск, 1985. Т. III. Рабочий класс БССР накануне и в годы Великой Отечественной войны, в период упрочнения и развития социалистического общества (1938–1960). Минск, 1985. Т. IV. Рабочий класс БССР на этапе совершенствования социализма (1961–1986). Минск, 1987; Экономика Беларуси в период послевоенного возрождения / под ред. В. И. Дрича. Минск, 1988; Эканамічная гісторыя Беларусі. Выд. 3-е, дап. і перапрац. / пад рэд. В. І. Галубовіча. Мінск, 1999; Сасим А. Промышленность Беларуси в XX столетии. Минск, 2001.

ў беларускім грамадстве[85]. Такім чынам, дынамічны працэс урбанізацыі (індустрыялізацыя, міграцыя і гарадская культура), які працякаў на тэрыторыі Беларусі ў XX ст., быў даследаваны толькі часткова.

У нашай кнізе гаворка ідзе хутчэй не пра "ўсёабдымную" гісторыю Мінска, а пра асобныя фрагменты карціны, якая вымалевалася на аснове працы з архіўнымі крыніцамі. Пры гэтым была зроблена спроба параўнаць тэорыю і практыку, паказаць кантраст паміж жаданым і сапраўдным, г. зн. супрацьпаставіць афіцыйным рэзалюцыям і дзяржаўнай статыстыцы рэальныя праблемы насельніцтва. Дадзенае даследаванне можна лічыць піянерскім, бо ў яго аснове ў першую чаргу – эмпірычны матэрыял. У працы дэманструецца гратэскавасць, хаатычнасць і супярэчлівасць функцыянавання нібыта ўсёмагутнай каманднай савецкай сістэмы ў беларускай перыферыі. Прычына таго, што многія тэмы раскрыты толькі часткова, – стан постсавецкіх архіваў[86].

У даследаванні прыводзяцца пераважна статыстычныя звесткі са штогодніка "Народная гаспадарка СССР", якія выдаваўся з 1959 г., заснаваныя на дадзеных перапісаў насельніцтва 1959, 1970, 1979 і 1989 гг., на службовых справаздачах па выкананні пяцігадовых планаў, а таксама на звестках аб прапісцы і падатках. У штогодніку за 1962 г. упершыню былі апублікаваны дадзеныя за перыяд з 1950 г. да перапісу насельніцтва ў 1959 г.; аднак яны абмяжоўваліся толькі ўсесаюзным узроўнем. У адпаведнасці з гэтым непасрэдна пасляваенны перыяд, фаза позняга сталінізму, уяўляе сабой *tabula rasa* з пункту гледжання дэмаграфічнай карціны. Можна меркаваць, што не толькі колькасць ахвяр сталінскага тэрору і колькасць загінулых у час Другой сусветнай вайны, але і наступствы Халакосту і голаду ў 1946–1947 гг. хаваліся ад грамадскасці. Тым не менш пачынаючы з 1950 г. прыведзеная афіцыйная савецкая статыстыка можа лічыцца надзейнай крыніцай. Пры гэтым неабходна мець на ўвазе жаданне прадстаўнікоў дзяржаўнай улады прыхаваць непажаданую праўду, напрыклад, пра ролю такіх

[85] Пар.: Клінаў А. Горад СОНца. Візуальная паэма ў трох частках. Мінск, 2006; ён жа. Minsk. Sonnenstadt der Träume. Frankfurt am Main, 2006.

[86] Пар.: Bohn T. M. Das Rätsel der "sozialistischen Stadt". Archivarbeit in der Republik Belarus' // Russische Archive und Geschichtswissenschaft. Rechtsgrundlagen, Arbeitsbedingungen, Forschungsperspektiven / Hrsg. v. Creuzberger S., Lindner R. Frankfurt am Main u. a., 2003, S. 195–203.

нацыянальных меншасцяў у Беларусі, як палякі, пра негатыўны ўплыў ваеннай прамысловасці на валавы нацыянальны прадукт ці пра прыкметнае павелічэнне смяротнасці немаўлят у 1970-я гг. і рэзкае зніжэнне працягласці жыцця, асабліва сярод мужчынскага насельніцтва рэспублікі[87]. Зборнікі "Народная гаспадарка Беларускай ССР" (з 1975 г.), "Беларуская ССР у лічбах" (з 1962 г.) і "Прамысловасць Беларускай ССР" (з 1965 г.) выдаваліся ў БССР нерэгулярна. Яны адлюстроўвалі працэсы эканамічнага росту ў рэгіёне, у якім у 1950–1960-я гг. адбыўся пераход ад аграрнай краіны да індустрыяльнай і які ў 1970-я гг. ужо прэтэндаваў на статус "паказальнай рэспублікі" Савецкага Саюза. У дачыненні да жыллёвага будаўніцтва неабходна ўлічваць, што рэгулярная публікацыя дадзеных у гэтай галіне мела месца толькі з 1960 г. і што да 1960-х гг. не колькасць кватэр, а агульная жылая плошча служыла адзінкай вымярэння. Пры дапамозе такіх хітрыкаў хаваўся той факт, што сумеснае пражыванне (камунальныя кватэры, інтэрнаты, баракі і г. д.) доўгі час было паўсядзённай практыкай у беларускіх гарадах, а захаванне санітарных нормаў індывідуальнай жылой плошчы для большасці насельніцтва стала магчымым толькі ў канчатковай фазе існавання Савецкага Саюза.

Для збору матэрыялаў была праведзена работа ў наступных архівах: Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ), Беларускі дзяржаўны архіў навукова-тэхнічнай дакументацыі (БДАНТД, да 1993 г. ЦДАНТД), Беларускі дзяржаўны архіў кінафотафонадакументаў (БДАКФФД), Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці (ДАМВ). Акрамя таго, значную карысць даследаванню прынеслі дакументы архіва Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь (АМУС) і Мінскага гарадскога ўпраўлення статыстыкі (МГУС).

Найбольш прадуктыўнай стала праца з архіўнымі матэрыяламі НАРБ і ДАМВ. У Нацыянальным архіве асаблівую каштоўнасць для даследавання ўяўлялі наступныя фонды: Цэнтральнага Камітэта КПБ (фонд 4), Савета Міністраў БССР (фонд 7), Статыстычнага ўпраўлення Савета Міністраў БССР (фонд 30), Дзяржаўнай планавай камісіі (Дзяржплан; фонд 31), Міністэрства дзяржаўнага кантролю (Дзяржкантроль; фонд 690), Мініс-

[87] Пар.: Chinn J. Manipulating Soviet Population Resources. London, 1977; Research Guide to Russian and Soviet Censuses / Ed. by Clem R. S. Ithaca, 1986.

тэрства будаўніцтва (фонд 780), Упраўлення па аднаўленні Мінска (фонд 781), Упраўлення па справах архітэктуры (фонд 903) і Камісіі па дзяржаўным кантролі (фонд 911). У архіве Мінскай вобласці найбольш рэлевантнымі для дадзенай працы сталі наступныя фонды: Мінскага абласнога камітэта КПБ (фонд 1), Мінскага гарадскога камітэта КПБ (фонд 69), Выканаўчага камітэта Мінскага гарадскога Савета (фонд 6), Статыстычнага ўпраўлення г. Мінска (фонд 105), Статыстычнага ўпраўлення Мінскага раёна (фонд 2305) і Мінскай гарадской планавай камісіі (Гарплан; фонд 2631). У архіве БДАНТД асабліва цікавымі былі матэрыялы наступных фондаў: Беларускага дзяржаўнага праектнага інстытута (Белдзяржпраект; фонд 3), Мінскага праектнага інстытута (Мінскпраект; фонд 10), Саюза архітэктараў (фонд 68). У АМУС інфарматыўным выявіўся фонд пашпартных сталоў міліцыі (фонд 49). Варта таксама адзначыць, што брашуры для службовага карыстання, выдадзеныя Мінскім упраўленнем статыстыкі, утрымлівалі вялікую колькасць неапублікаваных звестак па гісторыі развіцця сталіцы.

У цэлым найбольш прадуктыўнай была праца з наступнымі відамі крыніц: а) матэрыяламі аб планаванні Упраўлення па справах архітэктуры, Саюза архітэктараў і Дзяржаўнай планавай камісіі (Дзяржплан); б) скаргамі і заявамі насельніцтва ў партыйныя і дзяржаўныя інстанцыі, газетнымі артыкуламі і актамі Камісіі дзяржаўнага кантролю (Дзяржкантроль); в) актамі Савета Міністраў БССР і Цэнтральнага Камітэта КПБ, а таксама Выканаўчага камітэта Мінскага гарадскога Савета і Мінскага гарадскога камітэта партыі.

# II. Перадумовы ўрбанізацыі ў Беларусі

## 1 Змена горадабудаўнічага ўзору ў Савецкім Саюзе

У савецкай канцэпцыі "сацыялістычнага горада" гаворка ішла не толькі пра стварэнне амбіцыйнага праекта, які ўяўляў сабою мадэль, процілеглую заходнім метраполіям, але і пра славалюбівую спробу пераадолець сацыяльна-эканамічную адсталасць населеных цэнтраў Расійскай імперыі. Таму савецкія праектавальнікі горада сутыкаліся з умовамі, якія не ўзнікалі пры планаванні "капіталістычнага" або "еўрапейскага" горада.

У ходзе чатырохсотгадовай экспансіі, пачынаючы з сярэдзіны XVI ст. і да пачатку Другой сусветнай вайны, у склад шматнацыянальнай Расійскай імперыі, а потым Савецкага Саюза былі інтэграваны гарады розных культур. Такім чынам, побач са "старажытнарускім горадам" (тыпу "крэмль"), які ўзнік вакол цэнтральнага ўмацавання, атрымалі развіццё наступныя тыпы гарадоў: "руска-царскі горад з рэзідэнцыяй, умацаваннем і кіраваннем" XVII і XVIII стст.; размешчаны ў стэпе, на Паўночным Каўказе, у Казахстане і ў далёкаўсходне-сібірскай паласе "рускі каланіяльны горад" XVIII і XIX стст.; "сярэднееўрапейскі балтыйскі горад", які зазнаў уплыў Ганзы і шведскага панавання; "цэнтральна-ўсходнееўрапейскі горад у стылі барока", які зведаў польска-літоўскі і аўстрыйска-габсбургскі ўплывы; "каўказскі горад", які захаваў у сабе элементы хрысціянскай і ісламскай традыцый; і, нарэшце, распаўсюджаны ад Каспійскага мора да Сярэдняй Азіі "ісламa-ўсходні горад", асобныя элементы якога пашыраны і ў Паволжы[88].

Да пачатку Першай сусветнай вайны больш за 80% насельніцтва Расійскай імперыі жыло ў сельскай мясцовасці, таму "ўрбаністычная рэвалюцыя" (Даніэл Р. Броўэр) апошняй трэці XIX ст., выкліканая бурным ростам гарадоў, мела месца толькі ў некаторых адміністрацыйных і індустрыяльных цэнтрах.

[88] Stadelbauer J. Die Nachfolgestaaten der Sowjetunion. Großraum zwischen Dauer und Wandel. Darmstadt, 1996. S. 218. Пар. таксама: Hofmeister B. Die Stadtstruktur. Ihre Ausprägungen in den verschiedenen Kulturräumen der Erde. 3., überarb. Aufl. Darmstadt, 1996. S. 86–90.

З аднаго боку, працэс урбанізацыі не быў непасрэдна звязаны з будаўніцтвам фабрык і прамысловых прадпрыемстваў; з другога – па прычыне міграцыі з вёскі і феномена адыходніцтва значная частка гарадскога насельніцтва належала да сялянскага саслоўя. Дзякуючы рудыментарнай урбанізацыі і ва ўмовах аўтакратычнага рэжыму гарадская грамадскасць змагла праявіць сябе толькі часткова. Горадабудаўнічыя інвестыцыі, як правіла, абмяжоўваліся цэнтрам, а на перыферыі пераважалі кварталы з драўлянымі жылымі дамамі без якой-небудзь інфраструктуры, таму характэрнай рысай нават вялікіх гарадоў быў дваісты характар, дзе суіснавалі гарадскі і сельскі лад жыцця[89].

З улікам вышэйсказанага зразумела, што заклік пераадолець "супярэчнасці паміж горадам і вёскай" (Фрыдрых Энгельс), якія ў Расіі ніколі не былі яскрава выражаны, увасабляў савецкую альтэрнатыву заходняй урбанізацыі і з самага пачатку не мог мець рэвалюцыйнага размаху. Змены, звязаныя з працэсам паскоранай індустрыялізацыі і з сістэмай сацыялістычнай планавай эканомікі, не маглі не прывесці да таго, што, нягледзячы на розныя гістарычныя карані, савецкія гарады мелі аднолькавае знешняе аблічча (іл. 1).

Пасля нацыяналізацыі зямлі і ўвядзення сацыялістычнай планавай эканомікі ў маладой савецкай дзяржаве былі створаны новыя агульныя ўмовы для горадабудаўнічых праектаў. Абвешчанае ў партыйнай праграме 1919 г. "масавае перасяленне рабочых з ускраін у дамы буржуазіі" (так званы "кватэрны перадзел"), паслядоўнасць якога можна паставіць пад сумнеў, паспрыяла рэструктурызацыі гарадскога грамадства, якая назіралася ў Петраградзе / Ленінградзе і Маскве дзякуючы выцясненню верхніх слаёў грамадства (так званых "былых людзей") і ператварэнню "камуналак" у найважнейшую форму пражы-

[89] Пар.: Fedor T. S. Patterns of Urban Growth in the Russian Empire During the Nineteenth Century. Chicago, 1975; The City in Russian History / Ed. by Hamm M. F. Lexington, 1976; Bradley J. Muzhik and Muscovite. Urbanization in Late Imperial Russia. Berkeley u. a., 1985; The City in Late Imperial Russia / Ed. by Hamm M. F. Bloomington, 1986; Brower D. R. The Russian City between Tradition and Modernity, 1850–1900. Berkeley / Los Angeles / Oxford, 1990; Gesellschaft als lokale Veranstaltung. Selbstverwaltung, Assoziierung und Geselligkeit in den Städten des ausgehenden Zarenreiches / Hrsg. v. Hausmann G. Göttingen, 2003; Städte im östlichen Europa. Zur Problematik von Modernisierung und Raum vom Spätmittelalter bis zum 20. Jahrhundert / Hrsg. v. Goehrke C., Pietrow-Ennker B. Zürich, 2006.

вання ў 1920-я гг.[90]. З улікам гэтага ў гарадскім планаванні 1920-х гг. неабходна адрозніваць дзве фазы.

Пасля таго як рэвалюцыя і грамадзянская вайна прывялі да скарачэння насельніцтва ў вялікіх гарадах і бальшавікі пачалі масавую электрыфікацыю краіны, у 1922–1923 гг. разгарнулася дыскусія архітэктараў пра канцэпцыю "горад-сад". Абапіраючыся на падставовую праграмную працу Эбенэзера Ховарда (1898) і зыходзячы не толькі з санітарна-гігіенічных і мастацкіх меркаванняў, але і з магчымасці самазабеспячэння прадуктамі харчавання, архітэктары аддалі перавагу сістэме паселішчаў з перавагай індывідуальных дамоў, цэнтрам якой быў горад сярэдняй велічыні з насельніцтвам не больш за 58 тыс. чалавек, акружаны зялёным поясам малых сельскагаспадарчых гарадоў з насельніцтвам да 32 тысяч. Акрамя праектаў "Новая Масква" і "Вялікая Масква", распрацаваных у 1921–1925 гг. дзвюма рознымі камісіямі, у Савецкім Саюзе ў гэты перыяд праектаваліся толькі рабочыя пасёлкі, але тыя праекты не былі рэалізаваны на практыцы[91].

З прыняццем першага пяцігадовага плана (1928–1932), які прадугледжваў паскораную індустрыялізацыю і калектывізацыю сельскай гаспадаркі і быў заснаваны на тэзісе пра "пабудову сацыялізму ў адной краіне", рэвалюцыйны парыў авангарду, які выявіўся ў горадабудаўнічай дыскусіі 1929–1930 гг., яшчэ раз атрымаў шырокія магчымасці для рэалізацыі сацыяльных утопій. Па адзін бок знаходзіліся так званыя "ўрбаністы", прыхільнікі кампактнага пасялення (абмежаванне росту гарадоў і дэцэнтралізацыя гарадоў), па другі бок – так званыя "дэзурбаністы", прыхільнікі лінейнага паселішча (ліквідацыя гарадоў

[90] Meissner B. Das Parteiprogramm der KPdSU 1903–1961. 3. Aufl. Köln, 1965. S. 139. Пар.: Лебина Н. Б. Повседневная жизнь советского города. Нормы и аномалии. 1920–1930 годы. С.-Петербург, 1999. С. 178–204; Нормы и ценности повседневной жизни. Становление социалистического образа жизни в России, 1920–30-е годы. С.-Петербург, 2000; Лебина Н. Б., Чистиков А. Н. Обыватели и реформы. Картины повседневной жизни горожан в годы НЭПа и хрущевского десятилетия. С.-Петербург, 2003. С. 22–45; Obertreis J. Tränen des Sozialismus. Wohnen in Leningrad zwischen Alltag und Utopie 1917–1937. Köln / Weimar / Wien, 2004.

[91] Пар.: Хан-Магомедов С. О. Архитектура советского авангарда. Кн. 1. Проблемы формообразования. Мастера и течения. Кн. 2. Социальные проблемы. Москва, 1996–2001, тут кн. 2, с. 46–74. Пар. таксама: Kreis B. Moskau, 1917–35. Vom Wohnungsbau zum Städtebau. 1985. S. 31–62; Colton T. J. Moscow. Governing the Socialist Metropolis. Cambridge, Ma. / London, 1995. P. 215–247.

і механізацыя вёскі). У цэнтры дыскусіі, якая вялася дзвюма групамі пра "сацгород" з насельніцтвам 80–100 тысяч чалавек, былі камуналкі, дамы-камуны (калектыўная форма пражывання), клубы для рабочых і сталовыя (абагульнены лад жыцця) – жыццёвыя праекты, якія замянялі сям'ю і спрыялі эмансіпацыі жанчын. Часткова гэтая ідэя фармавання "новага чалавека", якая абапіралася на архітэктурны мадэрн, была ўвасоблена пры пабудове жыллёвых комплексаў для новых індустрыяльных гігантаў у такіх гарадах, як Кузнецк і Магнітагорск (іл. 2)[92].

На палітычным узроўні на парадак дня была пастаўлена задача "рэканструкцыі" і "аднаўлення" наяўных гарадоў, а таксама будаўніцтва новых індустрыяльных цэнтраў і ўзвядзенне планавых сацыялістычных гарадоў у адпаведнасці з рэзалюцыяй Цэнтральнага Камітэта партыі бальшавікоў "Аб маскоўскай гарадской гаспадарцы і аб развіцці гарадской гаспадаркі ў СССР" ад 15 чэрвеня 1931 г. У ёй абвяшчаліся неабходнасць новай планіроўкі Масквы як "сацыялістычнай сталіцы пралетарскай дзяржавы" і накіраванае супраць "малоха вялікага горада" абмежаванне росту горада шляхам рацыянальнага архітэктурнага вырашэння пры пабудове жылых раёнаў (г. зн. дэканцэнтрацыя насельніцтва і ўстаноў), а таксама дэцэнтралізацыя прамысловых цэнтраў (забарона на будаўніцтва новых прамысловых прадпрыемстваў у Маскве і Ленінградзе). Такім чынам, авангардысцкім прапановам па ліквідацыі гарадоў быў пакладзены канец. Акрамя таго, у інтарэсах грамадскай гігіены і індывідуальнага дабрабыту планавалася паляпшэнне жыллёвай сітуацыі, інфраструктуры і камунальнага забеспячэння. У канчатковым рахунку выхад на сучасны ўзровень павінен быў быць дасягнуты шляхам ажыццяўлення планаў па развіцці гарадоў[93].

Пад уплывам працэсу індустрыялізацыі ў пачатку 1930-х гг. пачаў выкрышталізоўвацца горадабудаўнічы ўзор, які засноўваўся, з аднаго боку, на канцэпцыі кампактнага горада абме-

92 Пар.: Der Architektenstreit nach der Revolution. Zeitgenössische Texte Rußland, 1920–1932 / Hrsg. v. Pistorius E. Basel / Berlin / Boston, 1992; Miljutin N. A. Sozgorod. Die Planung der neuen Stadt. Basel / Berlin / Boston, 1992. Пар. таксама: Хан-Магомедов. Архитектура советского авангарда II. С. 125–269; Kotkin S. The Search for the Socialist City // Russian History. 1996. Vol. 23. P. 231–261.

93 Пар.: Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК. Изд. 9-е, доп. и испр. Т. 5. 1929–1932. Москва, 1984. С. 313–326, тут с. 318.

жаванага памеру, а з другога – на адступленні ад прынцыпаў сучаснай архітэктуры, у тым ліку і ад асаблівай формы канструктывізму, якая атрымала развіццё ў Савецкім Саюзе. Для перыяду сталінізму было характэрнае адмаўленне ад утапічных праектаў, таму ў канцэптуальным плане "сацыялістычны горад" перажыў пэўную метамарфозу: цяпер не змест, г. зн. чалавек (арганізацыя паўсядзённага жыцця), а толькі форма, г. зн. вытворчасць (паляпшэнне інфраструктуры), выконвала вырашальную ролю. Быў абвешчаны курс на поўную перабудову Масквы – яе планавалася пераўтварыць з выкарыстаннем канцэпцый "сацыялістычнага рэалізму" ў архітэктуры, якія адлюстраваліся ў праекце Палаца Саветаў у Маскве (1931–1934) і "Генеральным плане" забудовы Масквы (1935)[94].

"Твар горада" (вертыкальная структура забудовы), увасоблены ў архітэктурную форму пасля аб'яднання ў 1932 г. усіх творчых арганізацый у саюзы, павінен быў прыводзіцца ў адпаведнасць з прынцыпамі "сацыялістычнага рэалізму". Найбольш выразна гэтыя асноўныя прынцыпы, абавязковыя да выканання, былі сфармуляваны на з'ездзе Саюза пісьменнікаў у 1934 г. "Партыйнасць", "народнасць" і "тыповасць" склалі асноўныя кампаненты канона, што павінен быў знайсці адлюстраванне ў літаратурных тэкстах у асобе "станоўчага героя", які прыносіць сябе ў ахвяру рэвалюцыйнай справе Леніна[95]. У гарадскім будаўніцтве новая плынь атрымала першы рэзананс у конкурсе на найлепшы праект Палаца Саветаў (1931–1933; два адкрытыя і два закрытыя туры), што павінен быў замяніць храм Хрыста Збавіцеля ў якасці новага сімвала савецкай сталіцы. Перад архітэктарамі паставілі наступныя задачы: "манументальнасць, простасць, закрытасць і прыгажосць". У час конкурсу стала відавочна, што запазычанне гістарычных узораў найбольш ад-

[94] Гэтыя метафары запазычаны з кніг: Kostof S. Das Gesicht der Stadt. Geschichte städtischer Vielfalt. Frankfurt / New York, 1992; ён жа. Die Anatomie der Stadt. Geschichte städtischer Strukturen. Frankfurt / New York, 1993. Пар. таксама: Castillo G. Cities of the Stalinist Empire // Forms of Dominance on the Architecture and Urbanism of the Colonial Enterprise / Ed. by Sayyad N. A. Aldershot et al., 1992. P. 261–287.

[95] Пар.: Günther H. Die Verstaatlichung der Literatur. Entstehung und Funktionsweise des sozialistisch-realistischen Kanons in der sowjetischen Literatur der 30er Jahre. Stuttgart, 1984; Lahusen T. How Life Writes the Book. Real Socialism and Socialist Realism in Stalin's Russia. Ithaca / London, 1997; Socialist Realism without Shores / Ed. by Lahusen T. Durham / London, 1997.

павядала густу журы. Спраектаваны Б. М. Іафанам будынак, які павінен быў служыць пастаментам для велізарнай фігуры Леніна, так і не быў выкананы, але гэты конкурс і дыскусія вакол прапанаваных праектаў прывялі да таго, што архітэктура сталінскага часу стала грунтавацца на канцэпцыі неакласіцызму і яго рэпрэзентатыўных разнавіднасцях[96].

"Анатомія горада" (г. зн. гарызантальная структура закладкі сеткі вуліц і размяшчэння грамадскіх месцаў) была выразна прапісана ў Генеральным плане Масквы. Пры гэтым канцэптуальна адпрэчваліся і прапанова поўнага захавання тагачаснай архітэктурнай субстанцыі, і прапанова зносу цэлых кварталаў. "Рэканструкцыя" ў савецкім разуменні не абавязкова была залатой сярэдзінай паміж перапланаваннем або перабудовай горада і радыкальным зносам па прынцыпе барона Асмана ў Парыжы ў XIX ст. У якасці структурных элементаў разам з Масквой-ракой павінны былі выступаць імпазантны цэнтр і спалучэнне радыяльных і кальцавых вуліц. Разам з гэтым меркавалася рацыянальна падзяліць гарадскую прастору на жылыя кварталы і прамысловыя раёны, а насельніцтва забяспечыць камунальнымі паслугамі, стварыўшы неабходную інфраструктуру. Па сутнасці, як у плане, так і ў каментарах да яго гаворка ішла пра пракладванне праспектаў і пра колькасць паверхаў у вышынных будынках; у дачыненні да жылых раёнаў была канкрэтызавана толькі колькасць жыхароў (іл. 3). На практыцы Генеральны план абяцаў перш за ўсё толькі паляпшэнне транспартнай сітуацыі (будаўніцтва метрапалітэна) і павышэнне эфектыўнасці пры таваараабмене. Насельніцтву Масквы, на якое быў вызначаны ліміт 5 млн., заставалася толькі спадзявацца на рашэнне жыллёвага пытання. Урэшце "сапраўды сацыялістычны горад" павінен быў не толькі гарантаваць "нармальныя, здаровыя ўмовы жыцця", але і сімвалізаваць грамадскі парадак і палітычную іерархію[97].

[96] Пар.: Дворец Советов. Всесоюзный конкурс 1932 г. Москва, 1933; Cooke C., Kazus I. Sowjetische Architekturwettbewerbe 1924–1936. Basel, 1991. S. 59–83; Lizon P. The Palace of the Soviets. The Paradigm of Architecture in the USSR. Colorado Springs, Co., 1992; Pistorius E. Der Wettbewerb um den Sowjetpalast // Kultur im Stalinismus. Sowjetische Kultur und Kunst der 1930er bis 50er Jahre / Hrsg. v. Gorzka G. Bremen, 1994. S. 153–167; Hoisington S. S. "Ever Higher". The Evolution of the Project for the Palace of Soviets // SR. 2003. Vol. 62. P. 41–68.

[97] Пар.: Генеральный план реконструкции города Москвы. Т. 1. Постановления и материалы. Москва, 1936. Цытаты: с. 2, 3; Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конферен-

У цэлым Генеральным план Масквы 1935 г. уяўляў сабой праект рэканструкцыі разрослага горада, асабліва палітычнае значэнне якога падкрэслівалася шляхам архітэктурных выпрашэнняў, але ніяк не ўніверсальную інструкцыю па планаванні гарадоў. На самай справе "сапраўды сацыялістычны горад" маскоўскага ўзору адпавядаў у сваіх асноўных планавых рысах як гораду ў стылі барока (дэманстрацыя праз бачную вось, просталінейнасць, раўнамернаць, манументальнасць)[98], так і найбольш важным прасторавым малюнкам сучаснага заходняга горада[99]. На аснове гэтага заключэння можна паставіць пад сумнеў падставовае значэнне Генеральнага плана Масквы для горадабудаўніцтва ў Савецкім Саюзе і ва Усходняй Еўропе пасля Другой сусветнай вайны. Застаўся толькі міф пра агульны горадабудаўнічы ансамбль.

На разбурэнне 1710 гарадоў і больш як 70 тысяч вёсак нямецкім Вермахтам у 1941–1945 гг. савецкі ўрад адрэагаваў разгорнутай праграмай па аднаўленні[100], для рэалізацыі якой 29 верасня 1943 г. быў заснаваны Камітэт па справах архітэктуры пры Саўнаркаме СССР на чале з А. Р. Мардвінавым[101]. 14 кастрычніка 1943 г. Мардвінаў атрымаў дырэктывы па аднаўленні ў лісце Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета М. І. Калініна, які летам 1944 г. быў апублікаваны ў часопісе "Архітэктура СССР". Калінін звярнуў увагу на той факт, што разбурэнні, прычыненыя вайной, даюць унікальны шанец для "стварэння

ций и пленумов ЦК (1898–1986). Изд. 9-е, доп. и испр. Т. 6. 1933–1937. Москва, 1985. С. 241–253. Пар. таксама: Städtebau im Schatten Stalins. Die internationale Suche nach der sozialistischen Stadt in der Sowjetunion 1929–1935 / Hrsg. v. Bodenschatz H., Post C. Berlin, 2003.

98 Пар.: Kostof. Gesicht… S. 229–274.

99 Дэтлеф Іпсэн адрознівае пяць катэгорый: а) філасофія і практыка магчымага; б) ідэя і практыка спажывецтва раскошы; в) гігіенічны горад; г) месца парадку; д) горад зручнасці. Ipsen D. Moderne Stadt – was nun? // Ohne Leitbild? – Städtebau in Deutschland und Europa / Hrsg. v. Becker H., Jessen J., Sander R. 2., unveränderte Aufl. Stuttgart / Zürich, 1999. S. 41–54.

100 Дзеля прэстыжу было вырашана адбудаваць 15 старых рускіх гарадоў, а менавіта Смаленск, Курск, Арол, Растоў-на-Доне, Вязьму, Новарасійск, Пскоў, Ноўгарад, Севастопаль, Варонеж, Вялікія Лукі, Калінін, Бранск, Краснадар, Мурманск. Пар.: Восстановим города, разрушенные врагом! // Правда. 16.11.1945. № 273. С. 1.

101 Сборник постановлений, приказов и инструкций по вопросам планировки населенных мест и архитектурного проектирования. Москва, 1948. С. 3–14.

сапраўды сацыялістычных гарадоў” у вялікім маштабе. У жылых дамах вырашальную ролю павінен быў выконваць прынцып зручнасці, а ў грамадскіх будынках – практычнай карысці. Па словах М. І. Калініна, неабходна было старацца прадухіліць усялякія “выкрунтасы”: “Сацыялістычнае будаўніцтва павінна быць прыгожым і радаваць погляд, а не быць вычварным і прэтэнцыёзным”[102]. На Усерасійскай канферэнцыі гарадскіх архітэктараў у ліпені 1945 г. Мардвінаў, спасылаючыся на Калініна, абвясціў задачай савецкіх архітэктараў будаўніцтва “эканамічна прыгожых, здаровых, статных гарадоў”. У якасці “горадабудаўнічага мінімуму” ён вызначыў сем умоў: а) спалучэнне горада з прыродай (азеляненне); б) наяўнасць аднаго кампазіцыйнага цэнтра (цэнтральная плошча, галоўная вуліца); в) канцэнтрацыя вялікіх і з архітэктурнага пункту гледжання каштоўных грамадскіх будынкаў на кампазіцыйных вузлавых кропках горада (сілуэт); г) комплексны ансамбль забудовы жылых вуліц і раёнаў (занальнае дзяленне шляхам пабудовы вышынных дамоў); д) чысціня і светлыя адценні будынкаў (прыклад рускага класіцызму); е) рацыянальнае планаванне камунальнай інфраструктуры (тэхнічнае абсталяванне); ё) пастаянная барацьба за якасць праектаў і будаўніцтва (праверкі). На заканчэнне, абапіраючыся на прапагандаваны з 1934 г. савецкі патрыятызм, Мардвінаў паспрабаваў выратаваць гонар рускай дарэвалюцыйнай архітэктуры, якая нароўні з інтэрнацыянальным класіцызмам і мадэрнізмам павінна была скласці аснову савецкай архітэктуры[103].

Акрамя гэтага, догмай у галіне аднаўлення і планавання горада сталі два непрадуманыя выказванні Сталіна. Па-першае, 6 лістапада 1943 г. у прамове, прысвечанай 26-й гадавіне Кастрычніцкай рэвалюцыі, Сталін асноўнай задачай па аднаўленні вызначыў стварэнне “нармальных умоў жыцця”, што ўжо згад-

[102] Восстановительное строительство и задачи архитекторов. Письмо Председателя Президиума Верховного Совета СССР Михаила Ивановича Калинина Председателю Комитета по делам архитектуры при СНК СССР А. Г. Мордвинову // АСССР. 1944. № 4. С. 1. Перадрук у: Из истории советской архитектуры 1941–1945 гг. Документы и материалы. Хроника военных лет. Архитектурная печать / отв. ред. К. Афанасьев. Москва, 1978. С. 102.

[103] Мордвинов А. Г. Важнейшие задачи в работе главного архитектора. Материалы Всесоюзного совещания Главных архитекторов городов (2–6 июля 1945 г.). Москва, 1946. С. 3–7. Пар.: ён жа. О строительстве городов // Правда. 1945. № 196. С. 2.

валася ў каментары да Генеральнага плана Масквы 1935 г.[104]. Па-другое, 7 верасня 1947 г. у прамове з нагоды 800-годдзя з дня заснавання Масквы, як і ў справаздачным дакладзе на XVII з'ездзе партыі 26 студзеня 1934 г., Сталін пастараўся наглядна прадэманстраваць перавагі сацыялізму, паказваючы на той факт, што рабочыя буйных заходнееўрапейскіх гарадоў вымушаны туліцца ў трушчобах на ўскраінах, у той час як рабочыя кварталы савецкіх гарадоў выглядаюць лепш, чым цэнтр[105]. У выніку ў колах архітэктараў нармалізацыя ўмоў жыцця была абвешчана горадабудаўнічай праграмай, якая была санкцыянавана "сталінскім клопатам пра чалавека" і прадугледжвала будаўніцтва жылля, зручнага для ўсёй сям'і[106]. Пазней канцэпцыя гарадскога цэнтра як месца пражывання рабочага класа, абвешчаная ў праграме партыі 1918 г., трансфармавалася ў вобраз "горада без ускраін", злучанага праспектамі ў адно цэлае[107].

У асяроддзі архітэктараў дыскусія атрымала новыя імпульсы ў сувязі з кампаніяй, разгорнутай ЦК УКП(б) у асобе А. А. Жданава ў жніўні – верасні 1946 г. супраць уяўных выраджэнняў ("касмапалітызм", "аб'ектывізм", "фармалізм") у галіне літаратуры (публікацыя твораў Зошчанкі і Ахматавай у часопісах "Звезда" і "Ленинград"), тэатра (дэфіцыт савецкіх п'ес на сучасныя

[104] Сталин И. 26-я годовщина Великой Октябрьской социалистической революции. Доклад Председателя Государственного Комитета Обороны на торжественном заседании Московского Совета депутатов трудящихся с партийными и общественными организациями г. Москвы 6 ноября 1943 года // ён жа. О Великой Отечественной войне Советского Союза. Изд. 5-е. Москва, 1950. С. 218.

[105] Сталин И. В. Отчетный доклад XVII съезду партии о работе ЦК ВКП(б) // ён жа. Вопросы Ленинизма. Изд. 11-е. Москва, 1947. С. 457. Перадрук у: ён жа. Сочинения. Т. 13. Июль 1930 – январь 1934. Москва, 1951. С. 334–335. Пар. падобнае выказванне ў нататцы "Правды" ад 7 верасня 1947 г. "Приветствие Москве" // ён жа. Сочинения. Т. 16. 1946–1952. Москва, 1997. С. 68–69.

[106] Пар.: Fitzpatrick S. Postwar Soviet Society. The "Return to Normalcy", 1945–1953 // The Impact of World War II on the Soviet Union / Ed. by Linz S. J. Totowa, N. J., 1985. P. 129–156; Bonwetsch B. Sowjetunion – Triumph im Elend // Kriegsende in Europa. Vom Beginn des deutschen Machtzerfalls bis zur Stabilisierung der Nachkriegsordnung 1944–1948 / Hrsg. v. Herbert U., Schildt A. Essen, 1998. S. 52–88; Данилов А. А., Пыжиков А. В. Рождение "сверхдержавы": СССР в первые послевоенные годы. Москва, 2001.

[107] Косенкова Ю. Л. Советский город 1940-х – первой половины 1950-х годов. От творческих поисков к практике строительства. Москва, 2000. С. 151–158, 176–177.

тэмы) і кінамастацтва (паказ адной з вугальных шахтаў і пасёлка пры шахце на Данбасе ў фільме "Вялікае жыццё"). Такія паняцці, як "савецкі патрыятызм", "партыйнасць" і "сацыялістычны рэалізм", былі абвешчаны абавязковымі для ўсіх галін культуры[108]. І нягледзячы на тое, што гэтая кампанія непасрэдна архітэктуру не закранула, усе без выключэння праявы мадэрнізму як бы забаранілі сябе самі. "Нацыянальная па форме, сацыялістычная па змесце" – так гучала новая формула культуры, што вынікала з выказванняў Сталіна 1925 і 1950 гг. пра значэнне нацыянальных моў для савецкай культуры[109]. Паказальнымі для архітэктуры пераможцаў у пасляваенны час сталі сем манументальных высотак у неагатычным "кандытарскім" стылі (Zuckerbäckerstil) (універсітэт, адміністрацыйны будынак, гатэлі і жылыя дамы), якія дзякуючы шматпавярховым асновам і верхняй пірамідальнай частцы, завершанай шпілем, рабілі сілуэт Масквы непаўторным[110].

Такім чынам, планаванне "сацыялістычнага горада" сталінскага перыяду з сярэдзіны 1930-х да сярэдзіны 1950-х гг. можна звесці да простай схемы. Калі гаворка ішла пра будаўніцтва новага горада, цэнтр планаваўся як прыдатак да прамысловага прадпрыемства. Істотным структурным элементам выступаў арыентаваны на патрэбы прамысловых прадпрыемстваў праспект, па ім не толькі ажыццяўляўся асноўны гарадскі транспартны рух, ён ад-

[108] Пар. адпаведныя заключэнні Цэнтральнага Камітэта КПСС па: Beiträge zum Sozialistischen Realismus. Grundsätzliches über Kunst und Literatur. Berlin, 1953. S. 60–73. Пар. таксама: Hahn W. G. Postwar Soviet Politics. The Fall of Zhdanov and the Defeat of Moderation, 1946–53. Ithaca / London, 1982.

[109] Першапачатковая фармулёўка, выказаная хутчэй між іншым, была наступнай: "Пролетарская по своему содержанию, национальная по форме – такова та общечеловеческая культура, к которой идёт социализм". Сталин И. В. О политических задачах университета народов Востока. Речь на собрании студентов КУТВ 18 мая 1925 г. / ён жа. Сочинения. Т. 7. 1925. Москва, 1950. С. 133–152, тут с. 138. На момант спаду ў дыскусіі пра "соцыялістычны рэалізм" у архітэктуры Сталін заявіў, што "современная русская, украинская, белорусская культура и т. д." з'яўляецца "социалистической по содержанию и национальной по форме". Сталин И. В. Марксизм и вопросы языкознания. Относительно марксизма и языкознания // ён жа. Сочинения. Т. 16. 1946–1952. Москва, 1997. С. 104–124, тут с. 115 (упершыню надрукавана ў газеце "Правда" ад 20.6.1950).

[110] Пар.: Tarchanow A., Kawtaradse S. Stalinistische Architektur. München, 1992. S. 120–144.

начасова служыў галоўнай вуліцай для дэманстрацый. Каб стварыць адпаведны антураж, фасады будынкаў шыкоўна афармляліся ў манументальным стылі. Сэрцам горада была цэнтральная плошча, на якой знаходзіліся будынкі, выкананыя ў эклектычным архітэктурным стылі, дзе размяшчаліся партыйныя органы, установы культуры і масавыя грамадскія арганізацыі. Цэнтральная плошча таксама выконвала функцыю месца для выступленняў пад час правядзення дэманстрацыяй. Нароўні з тыпавымі жылымі кварталамі і ўстановамі побытавага абслугоўвання важнае месца ў планіроўцы горада адводзілася таксама парку культуры і адпачынку. Прынцып занальнага падзелу на сферы працы, жылля і вольнага часу можна было заўважыць толькі часткова (іл. 4). У дыскусіях пра архітэктуру пасляваеннага часу ад Генеральнага плана Масквы 1935 г. застаўся ў асноўным толькі пафас горадабудаўнічага ансамбля. Горад разглядаўся як агульны твор мастацтва, у кампазіцыі якога найперш павінны быць улічаны патрэбы прамысловасці і толькі потым – інтарэсы насельніцтва[111]. Зыходзячы з гэтага, пра формы жылля, якія прадугледжваў авангард 1920-х гг., не магло быць і гаворкі.

З улікам таго, што пасля заканчэння Другой сусветнай вайны ўнутранае становішча Савецкага Саюза характарызавалася дэфіцытам і хаосам, планаванне гарадоў і будаўнічая практыка ў рэальнасці значна адрозніваліся. У выніку канфліктаў паміж асобнымі ўстановамі і ўмяшання партыйных органаў і Саюза архітэктараў прыняцце рашэнняў зацягвалася, а калі рашэнні і прымаліся, то не заўсёды выконваліся. Да жніўня 1948 г. толькі 4 з 48 савецкіх вялікіх гарадоў – Мінск, Петразаводск, Растоў-на-Доне і Сталінград (Валгаград) – падалі генеральныя планы, запатрабаваныя Саветам Міністраў СССР яшчэ ў снежні 1947 г. На мяжы 1940–1950-х гг. стала відавочна, што горадабудаўніцтва ў Савецкім Саюзе знаходзіцца ў глыбокім крызісе. Развіццё гарадоў часта цалкам супярэчыла генеральным планам, якія яшчэ знаходзіліся ў праектнай стадыі. "Рэканструкцыя" ахоплівала, калі яна наогул праводзілася, толькі цэнтры гарадоў, у той час як ускраінам не аддавалася ніякай увагі. Што да трыумфальнай архітэктуры, то неўзабаве стала відавочна: эканамічныя магчымасці савецкай сістэмы ў гэтай галіне вельмі абмежаваныя[112]. У выніку 9 траўня 1950 г. Савет Міністраў

[111] Косенкова. Советский город 1940-х... С. 187–189, 294.
[112] Тамсама. С. 106, 159–167, 194, 196.

СССР выдаў распараджэнне аб скарачэнні ўкладанняў у будаўнічую сферу на 25%. Пры гэтым указвалася на дэкаратыўныя "празмернасці", якія дагэтуль дапускаліся пры будаўніцтве заводаў (плошчы і пабудовы), на нізкі ўзровень механізацыі ў будаўніцтве, на ігнараванне прамысловых метадаў, г. зн. не браліся за аснову тыпавыя праекты і гатовыя канструкцыі[113]. 27 жніўня 1950 г. газета "Правда" апублікавала справаздачу пра сход маскоўскіх архітэктараў, які прайшоў пад лозунгам "Будаваць хутка, танна і прыгожа!" (пазней ён лёг у аснову цэлага кірунку ў архітэктуры і будаўніцтве, які аддаваў перавагу "прамысловым метадам" і адмаўляўся ад "празмернасцяў" у будаўніцтве)[114]. Такім чынам, "вялікі перадом", пазней ажыццёўлены Хрушчовым у галіне будаўнічай палітыкі, быў звязаны з новым кірункам у гарадскім планаванні, які пачаўся яшчэ пры Сталіне ў сувязі з недахопам жылля.

Прычынай вялікіх выдаткаў у галіне будаўніцтва сталі дарагія дэкаратыўныя "празмернасці" на фасадах будынкаў, што адзначыў Хрушчоў 3 ліпеня 1954 г. у звароце да членаў і кандыдатаў у члены Прэзідыума ЦК КПСС і намеснікаў Старшыні Савета Міністраў СССР, спасылаючыся на скаргі архітэктараў і інжынераў. Віну за тое, што новыя тэхнікі не выкарыстоўваліся ў будаўніцтве, усклалі на "манапольную групу" (25–30 чалавек), якая вызначала напрамак развіцця савецкай архітэктуры і кіравалася пры гэтым уласнымі мастацкімі меркаваннямі. Каб надалей ажыццяўляліся тыпавыя праекты, былі неабходныя цэнтралізацыя будаўнічых устаноў, рэарганізацыя Саюза архітэктараў і архітэктурныя дыскусіі[115]. З гэтай мэтай ад 30 лістапада да 7 снежня 1954 г. у Крамлі праходзіла Усесаюзная канферэнцыя будаўнікоў, архітэктараў і работнікаў будаўнічай прамысловасці, у праграму якой былі ўключаны пытанні скарачэння тэрмінаў будаўніцтва, зніжэння сабекошту і павышэння якасці шляхам індустрыялізацыі будаўніцтва праз пры-

[113] Решения партии и правительства по хозяйственным вопросам. Т. 3. 1941–1952 годы. Москва, 1968. С. 603–614, асабліва с. 605.

[114] Строить быстро, дешево и красиво. Совещание архитекторов столицы в МГК ВКП(б) // Правда. 27.8.1950. № 329. С. 2.

[115] Жилищный вопрос. На жилой площади в 30 кв. м поселено 16 семей, в том числе 36 детей… // Источник. 2001. № 1. С. 78–104, тут с. 90, 94, 97–98. Пар. таксама: Об изменении Генплана реконструкции Москвы. Записка МК КПСС и исполкома Моссовета Г. М. Маленкову и Н. С. Хрущеву. 1953 г. // Исторический архив. 1997. № 5-6. С. 51–74.

няцце за аснову тыпавых праектаў і мантажнага будаўніцтва (жалезабетонныя канструкцыі, сценныя блокі і асобныя часткі, г. зн. чатырох- і пяціпавярховыя панэльныя дамы). Мэтай савецкага гарадскога будаўніцтва, як гаварылася ў прынятым на канферэнцыі звароце да працоўных будаўнічай галіны прамысловасці, было не добраўпарадкаванне праспектаў і плошчаў, а задавальненне патрэбаў насельніцтва[116].

Той факт, што названая канферэнцыя была запланавана Цэнтральным Камітэтам КПСС як расправа з архітэктарамі сталінскага часу, стаў відавочны раніцай 1 снежня 1954 г., калі даклад А. Р. Мардвінава, выбранага ў 1950 г. Прэзідэнтам Акадэміі архітэктуры, неаднаразова перарываўся рэплікамі Хрушчова. Канфлікт абвастрыўся, калі Мардвінаў агучыў сваё архітэктурнае крэда. У тым, што з дэкаратыўнай "празмернасцю" неабходна змагацца, Мардвінаў быў цалкам згодны з Хрушчовым. Для рашэння гэтай праблемы ён прапанаваў зацвердзіць нормы для стандартызаваных праектаў, аднак ён лічыў, што ў дачыненні да афармлення фасадаў можна захаваць ступеністую сістэму, паводле якой рашэнні будуць прымацца ў адпаведнасці са значэннем горада ці вуліцы. Мардвінаў, як і раней, заставаўся ў палоне катэгорый сталінскага часу. Ён імкнуўся выратаваць гонар няпэўнага "сацыялістычнага рэалізму", гаворачы на неабходнасць альтэрнатывы паміж класіцызмам, які падтрымлівалі партыя і ўрад, і канструктывізмам, які, на яго думку, парушае на практыцы законы эстэтыкі, але быў рэзка абарваны Хрушчовым. Адзінае, з чым пагадзіўся Хрушчоў, была цана за адзін квадратны метр будаўнічай плошчы[117]. У гэты ж дзень пазіцыю Мардвінава рэзка раскрытыкаваў у сваім дакладзе кіраўнік аддзела па грамадзянскім і прамысловым будаўніцтве Інстытута архітэктуры пры Акадэміі архітэктуры Г. А. Градаў, які падзяліў архітэктараў на прыхільнікаў эстэтычнага разумення мастацтва і прыхільнікаў тэхнічнай эфектыўнасці. Пасля гэты даклад заслужыў высокую ацэнку Хрушчова. Градаў звёў прычыны памылак і недахопаў архітэктараў, якіх крытыкавалі, да чатырох

[116] Всесоюзное совещание строителей, архитекторов и работников промышленности, строительных материалов, строительного и дорожного машиностроения, проектных и научно-исследовательских организаций. 30 ноября – 7 декабря 1954 г. Сокращенный стенографический отчёт. Москва, 1955. С. 411–422, тут с. 412, 418.

[117] Всесоюзное совещание строителей... Москва, 1955. С. 115–135, тут с. 121–124.

пунктаў: а) антымарксісцкае ідэалістычнае разуменне задач архітэктуры; б) падзел будаўніцтва на "высокую" і "простую" архітэктуру, які азначаў нераўназначную ацэнку індывідуальных і масавых тыпавых праектаў; в) ігнараванне новых тэхнік і прынцыпу эканоміі; г) празмернае імкненне захаваць архітэктурную спадчыну[118]. У апошні дзень канферэнцыі ў заключнай прамове Хрушчоў рэзка раскрытыкаваў і высмеяў сталінскіх архітэктараў. Ён прапанаваў разгарнуць кампанію па барацьбе з дэкаратыўнай "празмернасцю" ў будаўніцтве. З аднаго боку, Хрушчоў настойліва паўтарыў сваё патрабаванне зрабіць кошт за квадратны метр плошчы вырашальным крытэрыем у будаўніцтве, з другога боку, ён ускосна рэабілітаваў канструктывізм: "Немагчыма больш здавольвацца тым фактам, што пад прыкрыццём фраз аб барацьбе супраць канструктывізму і сацыялістычнага рэалізму ў архітэктуры многія архітэктары неашчадна выкарыстоўваюць сродкі народа. <...> Мы не супраць прыгажосці, але мы супраць любога выяўлення празмернасці"[119]. Такім чынам, сталінскія архітэктары і праектавальнікі горада былі пастаўлены на месца і вымушаны былі прыняць новыя патрабаванні да савецкага горадабудаўніцтва.

Пазней новыя напрамкі ў галіне будаўнічай палітыкі вызначалі дзве пастановы Цэнтральнага Камітэта КПСС і Савета Міністраў СССР. Пастанова ад 23 жніўня 1955 г. "Аб мерах па далейшай індустрыялізацыі будаўніцтва па паляпшэнні якасці пабудоў і зніжэнні будаўнічых выдаткаў" загадвала вызначыць асноўнай формай будаўніцтва тыпавыя праекты, выкарыстоўваць канструкцыі з жалеза і лёгкага бетону, а таксама метад буйнаблокавага будаўніцтва[120]. Пастанова ад 24 жніўня 1955 г. "Аб зацвярджэнні планавых і будаўнічых праектаў для гарадоў" прадугледжвала перадачу права прыняцця рашэнняў (апрача Масквы і Ленінграда) ад Савета Міністраў СССР да Са-

[118] Тамсама. С. 162–168. З выступлення Хрушчова на канферэнцыі вынікае, што Мардвінаў яшчэ да канферэнцыі хацеў выкрасліць Градава са спіса выступоўцаў. Тамсама, с. 394.

[119] Всесоюзное совещание строителей... С. 379–409, тут с. 393; пар.: Bittner S. V. Remembering the Avantgarde. Moscow Architects and the "Rehabilitation" of Constructivism, 1961–64 // Kritika. Explorations in Russian and Eurasian History. 2001.Vol. 2. P. 553–576.

[120] Постановления ЦК КПСС и Совета Министров СССР по вопросам строительства от 23, 24 августа и 4 ноября 1955 г. Москва, 1956. С. 3–22; Решения партии и правительства по хозяйственным вопросам. Т. 4. 1953–1961 годы. Москва, 1968. С. 250–268.

ветаў Міністраў саюзных рэспублік[121]. Акрамя таго, у пастанове ад 5 лістапада 1955 г. «Аб ліквідацыі дэкаратыўнай "празмернасці" ў праектаванні і будаўніцтве індывідуальных праектаў з рэпрэзентатыўнымі фасадамі» былі супрацьпастаўлены мэтазгоднасць інтэр'еру і ўлік кошту і эфектыўнасці[122].

Калі будаўнічы кангрэс у лістападзе – снежні 1954 г. меў вынікам канчатковую адмову ад архітэктуры сталінізму, то XX партыйны з'езд, які праходзіў з 14 да 25 лютага 1956 г. і прыцягнуў увагу сусветнай грамадскасці дзякуючы закрытаму дакладу Хрушчова "Аб кульце асобы Сталіна і яго наступствах", заклаў асновы для чарговага адгароджвання савецкага грамадства ад знешняга свету шляхам "закрыцця" гарадоў і звязанага з гэтым абмежавання правоў насельніцтва на свабоду перамяшчэння і пражывання. У рэальнасці "дэсталінізацыя" ў стылі Хрушчова мела на мэце не толькі рэстаўрацыю ленінізму, але і ўмацаванне тагачаснай сістэмы ўлады. Адной з найважнейшых умоў для гэтага стала "ўтаймаванне" савецкага "грамадства плыннага пяску" (Мошэ Левін), якое засноўвалася на міграцыі з вёскі. Патрэба ва "ўтаймаванні" паўстала тады, калі ў 1956 г. права на звальненне (права на свабодны выбар месца працы), часова адмененае ў 1940 г., адкрыла новыя перспектывы для рынку працы і перамяшчэння насельніцтва ўнутры краіны[123]. Пазней

[121] Постановления ЦК КПСС и Совета Министров СССР по вопросам строительства... С. 160–162. Указ Савета Міністраў СССР ад 21 жніўня 1963 г. прадугледжваў пацвярджэнне адпаведнымі Саветамі Міністраў і Дзяржаўным камітэтам па будаўніцтве СССР (Дзяржбуд) генеральных планаў для сталіц саюзных рэспублік і гарадскіх новабудоўляў; акрамя таго, у гарадах з насельніцтвам больш як 500 тыс. жыхароў павінен быў далучацца Дзяржаўны планавы камітэт СССР (Дзяржплан). Сборник нормативных и справочных материалов по развитию городов. Москва, 1980. С. 34–35.

[122] Постановления ЦК КПСС и Совета Министров СССР по вопросам строительства... С. 163–173; Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Изд. 9-е, доп. и испр. Т. 8. 1946–1955. Москва, 1986. С. 522–536.

[123] Пар.: Lewin M. The Making of the Soviet System. Essays in the Social History of Interwar Russia. London, 1985. P. 12–21; ён жа. The Gorbachev Phenomenon. A Historical Interpretation. Expanded Edition. Berkeley / Los Angeles, 1991. P. 13–42; ён жа. Russia / USSR in Historical Motion. An Essay in Interpretation // Russian Review. 1991. Vol. 50. P. 249–266. Пар. таксама: Grandstaff P. J. Interregional Migration in the U.S.S.R. Economic Aspects, 1959–1970. Durham, N. C., 1980. P. 119; Granick D. Job Rights in the Soviet Union. Their Consequences. Cambridge et al., 1987.

Хрушчоў развіў гэтую думку на XX з'ездзе партыі (14 лютага 1956 г.) у справаздачным дакладзе ЦК КПСС "Пытанне аб паляпшэнні жыллёвых умоў у такіх вялікіх гарадах, як Масква, Ленінград, Кіеў і іншых, цесна звязана з прыростам насельніцтва з прычыны яго прытоку з іншых рэгіёнаў краіны". Паказваючы на фактар натуральнага прыросту, ён пад апладысменты дэлегатаў з'езда прадоўжыў: "Таму неабходна пакласці канец прыцягненню працоўнай сілы з іншых абласцей у вялікія гарады і пакрываць узніклую патрэбу вялікіх гарадоў у працоўнай сіле прадстаўнікамі мясцовага насельніцтва"[124]. Тым самым Хрушчоў закрануў адну з асноўных праблем сацыялістычнага шляху развіцця грамадства: у сувязі з тым, што індустрыялізацыя і ўрбанізацыя ў Савецкім Саюзе ажыццяўляліся рэкорднымі тэмпамі, гэта прывяло да ўзнікнення дэфіцыту ў розных галінах эканомікі, пераадоленне якога павінна было стаць меркай дзейснасці дзяржаўнага апарату. У выніку міграцыі насельніцтва з вёскі стабільнасць сацыяльнай сістэмы і эфектыўнасць планавай эканомікі выклікалі сумнеў. Таму рашэнне жыллёвай праблемы і абмежаванне росту гарадоў сталі ключавымі пытаннямі савецкай сістэмы пасляваеннага часу[125].

[124] Отчетный доклад Центрального Комитета Коммунистической партии Советского Союза XX съезда партии. Доклад Первого секретаря ЦК КПСС Н.С. Хрущева. XX съезд Коммунистической партии Советского Союза. 14–25 февраля 1956 г. Стенографический отчёт. Т. I. Москва, 1956. С. 9–120, тут с. 79.

[125] Прыняты на XX з'ездзе партыі план 6-й пяцігодкі (1956–1960) прадугледжваў індустрыялізацыю будаўніцтва ў інтарэсах зніжэння будаўнічых затрат на 20% і павелічэння жыллёвага будаўніцтва ў два разы, а таксама скарачэнне тэрмінаў будаўніцтва. Пар.: Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Изд. 9-е, доп. и испр. Т. 8. 1946–1955. Москва, 1986. С. 28–90, тут с. 64, 71. З 1971 г. у планах пяцігодак было прынята абмежаванне росту гарадоў. Пар.: Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Изд. 9-е, доп. и испр. Т. 12. 1971–1975. Москва, 1986. С. 39–103, тут с. 82; Т. 13. 1976–1980. Москва, 1987. С. 11–88, тут с. 73; Т. 14. 1981–1984. Москва, 1987. С. 38–113, тут с. 45; Т. 15. 1985–1988. Москва, 1989. С. 183–254, тут с. 235–236. Пар. таксама: Решения партии и правительства по хозяйственным вопросам. Т. 8. 1970 г. – февраль 1972 г. Москва, 1972. С. 356–418, тут с. 398; Т. 11. Ноябрь 1975 г. – июнь 1977 г. Москва, 1977. С. 227–302, тут с. 288; Т. 13. Апрель 1979 г. – март 1981 г. Москва, 1981. С. 646–720, тут с. 653; Т. 16. Ч. II. Февраль – декабрь 1986 г. Москва, 1988. С. 96–165, тут с. 147.

Для рэгулявання міграцыйных плыняў палітычнае кіраўніцтва краіны выкарыстоўвала два механізмы: *пашпартную сістэму* і *дэцэнтралізацыю прамысловых раёнаў*, якія ў спалучэнні пад час кіравання Хрушчова прывялі да ўзнікнення неафіцыйнай сістэмы "закрытых гарадоў".

*Пашпартная сістэма.* Ва ўмовах масавага перасялення вясковага насельніцтва ў горад пасля распачатай у 1929 г. гвалтоўнай калектывізацыі і непасрэдна звязаных з гэтым рэпрэсій супраць так званых "кулакоў" галоўнай мэтай пастаноў Савета Народных Камісараў СССР ад 27 снежня 1932 г. аб увядзенні пашпартнай сістэмы і аб выдачы ўнутраных пашпартоў ад 28 красавіка 1933 г. было закрыццё гарадоў для "класавых ворагаў". Меліся на ўвазе асобы буржуазнага паходжання, якія да таго часу ўжо былі пазбаўлены выбарчага права (так званыя "лишенцы"), і "лішнія элементы" – валацугі і святары. Пашпартызацыя распаўсюджвалася на насельніцтва гарадоў, рабочых пасёлкаў, раённых цэнтраў, машынна-трактарных станцый, наваколляў Масквы, Ленінграда, Кіева, Харкава, прыгранічных рэгіёнаў (ад 16-гадовага ўзросту), а таксама на работнікаў суднаходства і чыгункі, але не на сельскіх жыхароў. Паселішчы, дзе ў 1930-я гг. паслядоўна ўводзілася пашпартная сістэма або пашпартны рэжым, лічыліся "рэжымнай мясцовасцю"; каб атрымаць дазвол на пражыванне ў іх, неабходна было падаваць заяву ў адпаведныя органы. Дазвол атрымлівалі пасля ўнясення ў пашпарт штампа аб так званай "прапісцы". У якасці механізму супраць натуральнай міграцыі насельніцтва пашпартны рэжым стаў асабліва эфектыўным толькі пасля смерці Сталіна. Пастанова Савета Міністраў СССР ад 21 кастрычніка 1953 г. дапускала атрыманне дазволу на пражыванне ў вялікіх гарадах толькі пры прад'яўленні пацверджання аб наяўнасці ў адпаведнасці з санітарнай нормай жылой плошчы 9 кв. м. на чалавека ў жылых дамах, 6 кв. м. – у студэнцкіх інтэрнатах і 4,5 кв. м. – у інтэрнатах для рабочых. Такім чынам, пашпартная сістэма служыла як мерай па ўліку насельніцтва, так і сродкам замацавання насельніцтва за месцам пражывання. У выніку сістэма пашпартнага рэжыму стварыла двухкласавае грамадства, бо сельскае насельніцтва было загнана ў "другое прыгоннае права". Калгаснікі заставаліся *de jure* прымацаванымі да калгасаў, бо не мелі права на атрыманне пашпарта, а магчымасць змяніць месца працы залежала ад дазволу старшыні калгаса. Толькі 28 жніўня 1974 г. у сувязі з прыняццем Саветам Міністраў СССР рашэння аб увядзенні і выдачы новых пашпартоў усяму насельніцтву Са-

вецкага Саюза ў перыяд з 1 студзеня 1976 г. да 31 снежня 1980 г. калгаснікі набылі статус раўнапраўных грамадзян[126].

*Дэцэнтралізацыя прамысловых раёнаў.* Каб нейкім чынам супрацьстаяць прывабнасці прамысловых цэнтраў і іх росту, ужо ў рэзалюцыі ЦК УКП(б) аб развіцці гарадской гаспадаркі ў Савецкім Саюзе ад 15 чэрвеня 1931 г. быў уведзены ліміт на колькасць прамысловых прадпрыемстваў у вялікіх гарадах. Пашырэнне вытворчасці забаранялася ў Маскве і Ленінградзе з 1932 г., а ў Кіеве, Харкаве, Растове-на-Доне, Горкім (Ніжнім Ноўгарадзе) і Свярдлоўску (Екацярынбургу) – з 1939 г.[127]. Калі пасля Другой сусветнай вайны насельніцтва Савецкага Саюза зноў атрымала права на звальненне з працы і паўстала неабходнасць прыняцця мер па рацыянальным размеркаванні рабочай сілы, Дзяржплан у 1956 г. увёў абмежаванне прамысловага развіцця, якое распаўсюджвалася практычна на ўсе вялікія гарады з насельніцтвам больш за 200 тыс. чалавек (у 48 "закрытых гарадах" увялі забарону на размяшчэнне новых прадпрыемстваў і пашырэнне наяўных, акрамя сферы абслугоўвання; 23 гарадам абмежавалі магчымасці ў адкрыцці новых прадпрыемстваў)[128].

[126] Пар.: "Изменения паспортной системы носят принципиально важный характер". Как создавалась и развивалась паспортная система в стране // Источник. 1996. № 6. С. 101–121; Собрание постановлений правительства Союза Советских Социалистических Республик. 1974. № 19. Ст. 19. С. 387–396, Ст. 10. С. 396–398. Пар. таксама: Matthews M. The Passport Society. Controlling Movement in Russia and the USSR. Boulder, 1993; Попов В. П. Паспортная система в СССР (1932–1976 гг.) // Социологические исследования. 1995. № 8. С. 3–14, 1995. № 9. С. 3–13; Moine N. Passeportisation, statistique de migrations et contrôle de l'identité sociale // CMR. 1997. Vol. 38. P. 587–600; Kessler G. The Passport System and State Control over Population Flows in the Soviet Union, 1932–1940 // CMR. 2001. Vol. 42. P. 477–504; Goldman W. Z. The Internal Soviet Passport. Workers and Free Movement // Extending the Borders of Russian History. Essays in Honor of Alfred J. Rieber / Ed. by Siefert M. Budapest / New York, 2003. P. 315–331.

[127] Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК. Изд. 9-е, доп. и испр. Т. 5. 1929–1932. Москва, 1984. С. 313–326, тут с. 323.

[128] Хорев Б. С. Проблемы городов (Урбанизация и единая система расселения в СССР). Изд. 2-е, доп. и перераб. Москва, 1975. С. 78–79, 86–87. У "Справочном пособии заказчика-застройщика" быў апублікаваны спіс з 42 гарадоў, у якіх было цалкам забаронена будаўніцтва новых і пашырэнне старых прамысловых прадпрыемстваў, а таксама названы яшчэ 16 гарадоў і некаторых курортаў паўднёвага ўзбярэжжа Крыма,

З прычыны спалучэння двух разгледжаных фактаў і насуперак ідэалагічным установкам адбылося замацаванне падзелу краіны на горад і вёску. З аднаго боку, практыка жорсткай сістэмы прапіскі прывяла да таго, што жыццё ў гарадскіх цэнтрах стала ўспрымацца як саслоўны прывілей; з другога боку, зніжэнне прамысловага росту горада абмяжоўвала патрэбу ўжо наяўных прадпрыемстваў у рабочай сіле звонку. Але, як паказала практыка, для мігрантаў адкрываліся ўсё новыя і новыя нелегальныя або паўлегальныя шляхі перасялення ў горад.

Толькі пасля "закрыцця" гарадоў на XX партыйным з'ездзе была прынята праграма па масавым жыллёвым будаўніцтве. У пастанове ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР аб развіцці жыллёвага будаўніцтва ў СССР ад 31 ліпеня 1957 г. у якасці асноўных прычын недахопу жылля быў названы бурны рост насельніцтва, звязаны з індустрыялізацыяй і паляпшэннем медыцынскага абслугоўвання ў пасляваенны час; яшчэ адна прычына – не былі асвоены або былі нерацыянальна выкарыстаны выдзеленыя для будаўніцтва жылля сродкі. Таму было аддадзена распараджэнне дамагчыся вырашэння жыллёвага пытання ў бліжэйшыя 10–12 гадоў шляхам выкарыстання тыпавых праектаў і прамысловых метадаў[129]. У выніку гэтага ядро "сацыялістычнага горада" канца 1950-х гг. перамясцілася з цэнтра ў мікрараён. Гаворка ішла пра комплекс панэльных шматкватэрных пяціпавярховых дамоў з роўнымі дахамі, без праходных і галоўных вуліц, які спачатку разлічваўся на 10–12 тыс. чалавек і павінен быў мець установы сферы абслугоўвання (дзіцячыя садкі і крамы) і зоны адпачынку (тэрыторыі з зялёнымі насаджэннямі і спартыўныя пляцоўкі). У адпаведнасці з сістэмай ступеністага забеспячэння некалькі мікрараёнаў аб'ядноўваліся ў "жылы раён", першапачаткова разлічаны на 30–50 тыс. чалавек, з установамі культуры (бібліятэкі і кінатэатры), установамі абслугоўвання насельніцтва (паліклінікі

дзе прадугледжваліся некаторыя выключэнні. Пар.: Сборник нормативных и справочных материалов по развитию городов. Москва, 1980. С. 66–67. Гэты спіс раней не даследаваўся. Пар. на падставе заяваў Хорава, напр.: Buckley C. The Myth of Managed Migration. Migration and Market in the Soviet Period // SR. 1995. Vol. 54. P. 896–916.

[129] Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Изд. 9-е, доп. и испр. Т. 9. 1956–1960. Москва, 1986. С. 193–208. Сёмая пяцігодка (1959–1965) паставіла мэту забяспечыць кожную сям'ю кватэрай. Решения партии и правительства по хозяйственным вопросам. Т. 4. 1953–1961 годы. Москва, 1968. С. 479–564, тут с. 545.

і крамы), а таксама са спартыўнымі пляцоўкамі і паркамі. Для мільённых гарадоў была прадугледжана яшчэ і планіровачная зона для 600 тыс. – 1 млн. жыхароў. У той час у народзе на аснове камбінацыі прозвішча Першага сакратара ЦК КПСС М. С. Хрушчова і слова *трушчоба* з'явілася назва *хрушчоба*[130].

Наступныя ініцыятывы канца 1950-х – пачатку 1960-х гг., накіраваныя на рашэнне жыллёвага пытання і абмежаванне росту гарадоў, зводзіліся да вызначэння ідэальнага памеру горада і канцэнтрацыі на працы па рэгіянальным планаванні. На Усесаюзнай канферэнцыі па пытаннях будаўніцтва (Масква, 10–12 красавіка 1958 г.) і на Усесаюзнай канферэнцыі па пытаннях горадабудаўніцтва (Масква, 7–10 чэрвеня 1960 г.) была вызначана аптымальная велічыня горада, якая складала ад 100 да 250 тыс. жыхароў. Гэта было зроблена на аснове ўліку кошту і эфектыўнасці інфраструктурнага і транспартна-тэхнічнага напаўнення занальнага арэала, які характарызаваўся функцыянальным падзелам[131]. Звязанае з гэтым патрабаванне аб стварэнні гарадоў-спадарожнікаў, як правіла, з насельніцтвам 30–50 тыс. жыхароў і ў рэдкіх вы-

[130] Правила и нормы планировки и застройки городов. Утверждены Государственным комитетом Совета Министров СССР по делам строительства по поручению Совета Министров СССР 1 декабря 1958 г. Москва, 1959. С. 58–59, 94–98. У сярэдзіне 1960-х гг. для вышыні будынкаў прапаноўвалася, як правіла, 5–9 паверхаў, у выключных выпадках – да 16 і вышэй. Колькасць жыхароў у мікрараёнах пры наяўнасці шматпавярховых дамоў павялічылася на 16–20 тыс. чалавек і ў жылых раёнах – да 70 тыс. Указания по проектированию новых жилых районов и микрорайонов в г. Москва (Дополнения к правилам и нормам планировки и застройки городов). Утверждены Мосгорисполкомом 21 июля 1964 г. и согласованы с Госстроем СССР 5 ноября 1964 г. Москва, 1965. С. 3–4. Пар. таксама: Andrusz G. D. Housing and Urban Development in the USSR. London / Basingstoke, 1984. P. 127–132; French R. A. Plans, Pragmatism and People. The Legacy of Soviet Planning for Today's Cities. Pittsburgh, Pa. / London, 1995. P. 75–83; Лебина Н. Б., Чистиков А. Н. Обыватель и реформы… С. 162–194.

[131] Кудрявцев А. О. "О правилах и нормах планировки и застройки городов". Всесоюзное совещание по строительству. Секция жилищного и культурно-бытового строительства, планировки и застройки городов. Москва, 1958. С. 108–148, тут с. 113; Баранов Н. В. О состоянии и задачах проектирования городов и внедрении прогрессивных приемов застройки населенных мест. Всесоюзное совещание по градостроительству. 7–10 июня 1960 г. Сокращенный стенографический отчет. Москва, 1960. С. 84–158, тут с. 115–116. Крыніца савецкага горадабудаўніцтва ў сярэдзіне 1960-х гг. зрушыла верхнюю мяжу да 300 тыс. жыхароў. Основы советского градостроительства. Т. I. Москва, 1966. С. 79.

падках да 80 тыс. (разам з масавым жыллёвым будаўніцтвам – яшчэ адна кропка судакранання з архітэктурным мадэрнізмам 1920-х гг.) усё ж не спыніла бурнага росту вялікіх гарадоў з-за састарэлай сістэмы кантролю і павелічэння колькасці адказных за прынятае рашэнняў[132]. Тым не менш, па-ранейшаму падкрэсліваліся прагрэсіўныя элементы савецкага горадабудаўніцтва. На Усесаюзнай канферэнцыі па пытаннях гарадскога будаўніцтва ў чэрвені 1960 г. Старшыня Дзяржаўнага камітэта па справах будаўніцтва СМ СССР (Дзяржбуд) У. А. Кучарэнка прыйшоў да наступнай высновы: "Перш за ўсё задавальненне патрэбаў людзей павінна ляжаць у аснове клопату пра прыгажосць нашых гарадоў. Задача ў тым, каб злучыць у адно цэлае функцыянальныя, эканамічныя, будаўніча-тэхнічныя, санітарна-гігіенічныя і эстэтычныя праблемы і будаваць гарады, у якіх людзям будзе камфортна і добра, у якіх будзе панаваць здаровая для іх фізічнага і маральнага развіцця атмасфера і ў якіх формы мастацтва будуць садзейнічаць выхаванню людзей". У адрозненне ад канцэпцыі Маркса і Энгельса горад быў абвешчаны крыніцай сацыялізацыі пры будаўніцтве "камуністычнага грамадства"; знік страх перад гарадскім светам, які з'явіўся ў дыскусіях 1920-х гг.[133].

Што да развіцця гарадоў, то ў гэтую ж логіку ўпісваюцца ўтапічныя палажэнні, змешчаныя ў Праграме КПСС, якая была абвешчана на XXII з'ездзе партыі ў 1961 г. З аднаго боку, у галіне вытворчых працэсаў і ўмоў жыцця было вылучана патрабаванне падняць вёску да ўзроўню горада. Гэтага планавалася дасягнуць шляхам дэцэнтралізацыі насельніцтва, звязанай з больш рацыянальным размяшчэннем вытворчасці, а таксама праз ператварэнне вёсак, якія належалі калгасам, у населеныя пункты гарадскога тыпу. З другога боку, рашэнне жыллёвай праблемы абвяшчалася галоўным сацыяльным пытаннем. Была пастаўлена задача ліквідаваць недахоп жылля да 1970 г., г. зн. менш чым за адно дзесяцігоддзе, а да 1980 г., на працягу наступнага дзеся-

[132] Правила и нормы планировки и застройки городов, утвержденные Государственным комитетом Совета Министров СССР по делам строительства по поручению Совета Министров СССР 1 декабря 1958 г. Москва, 1959. С. 7. Пар. таксама: Hausladen G. The Sattelite City in Soviet urban Development // SG 1984. Vol. 25. C. 229–247.

[133] Кучеренко В. А. О состоянии и мерах улучшения градостроительства СССР. Всесоюзное совещание по градостроительству. 7–10 июня 1960 г. Сокращенный стенографический отчет. Москва, 1960. С. 7–83, тут с. 83.

ціголдзя, кожная сям'я павінна атрымаць асобную кватэру з усімі выгодамі. У сувязі з гэтым таксама абяцалі скасаваць кватэрную плату. І нарэшце, у галіне гарадскога планавання быў сфармуляваны наступны лозунг: "Гарады і пасёлкі павінны ўяўляць сабой агульную рацыянальную структуру, якая складаецца з вытворчых зон і жылых раёнаў, сеткі грамадскіх і культурных установаў, прадпрыемстваў сферы абслугоўвання і транспарту, а таксама тэхнічных і энергетычных установаў, якія забяспечваюць зручныя ўмовы для працы, жыцця і адпачынку людзей"[134]. Без сумневу, у эпоху Хрушчова зноў выкарыстоўваліся ідэі 1920-х гг. Але ад першапачатковай канцэпцыі "сацыялістычнага горада" застаўся не больш чым праект мадэрнізацыі. У адрозненне ад сталінскага часу не фасад, а прапаганда павінна была хаваць рэальнасць і праецыраваць жаданы ідэальны вобраз у будучыню.

На практыцы недахопы савецкага гарадскога планавання былі відавочныя. Дзяржаўнае і партыйнае кіраўніцтва пастаянна ўносіла карэктывы ў свае планы. Істотнай для планавання гарадоў стала пастанова Цэнтральнага Камітэта КПСС і Савета Міністраў СССР ад 1 чэрвені 1962 г. аб індывідуальным і кааператыўным жыллёвым будаўніцтве, бо ў ёй была абвешчана не толькі замена прымітыўных аднакватэрных дамоў на камфартабельныя шматкватэрныя, але і спроба назаўжды пазбавіцца ад вёскі ў горадзе[135]. У пастанове Савета Міністраў "Аб паляпшэнні праектнай справы ў галіне грамадзянскага будаўніцтва, планіроўкі і забудовы гарадоў" ад 21 жніўня 1963 г. было ўказана на тое, што 600 гарадоў не выканалі распараджэнне 1957 г. аб стварэнні генеральных планаў або аб удасканаленні ўжо наяўных. З-за недахопу праектных інстытутаў жылыя раёны былі манатонныя (архітэктура, ландшафт), а ў кватэрах не хапала камфорту (кепская планіроўка, недастатковая гука- і цеплаізаляцыя)[136]. Перагляд будаўнічай палітыкі эпохі Хрушчова, які выяўляўся ў ажыўленні аблічча гарадоў і адмовы ад панэльнага будаўніцтва, пачаўся толькі з пастановай Цэнтральнага Камітэта КПСС і Савета

[134] Программа Коммунистической партии Советского Союза. XXII съезд Коммунистической партии Советского Союза. 17–31 октября 1961 года. Стенографический отчет. Т. III. Москва, 1962. С. 274, 281, 291, 298 (цытата, с. 298); таксама ў: Материалы XXII съезда КПСС. Москва, 1961. С. 320–428, тут с. 366, 374, 384, 390–391 (цытата, с. 391).

[135] Решения партии и правительства по хозяйственным вопросам. Т. 5. 1962–1965 годы. Москва, 1968. С. 93–96.

[136] Тамсама, с. 371–383.

Міністраў СССР аб мерах па паляпшэнні якасці жыллёва-грамадзянскага будаўніцтва ад 28 траўня 1969 г.[137].

Цэнтральная частка сучаснага "сацыялістычнага горада", які ў 1960–1970-я гг. служыў меркай ідэальнага горада, адпавядала формам прапагандаванага на Захадзе "горада для аўтамабіляў" з прычыны імкнення да спалучэння функцый. Каб забяспечыць прадуктыўнасць і прадэманстраваць адкрытасць свету, перажыткі горада сталінскага перыяду былі дапоўнены і пашыраны, з аднаго боку, за кошт будаўніцтва вышынных установаў сферы абслугоўвання, гатэляў і гандлёвых цэнтраў, а з другога боку, за кошт узвядзення жылых раёнаў з панэльнымі дамамі. У вобразе горада знайшлі адлюстраванне функцыяналістычная архітэктура, пано і гарэльефы на фасадах будынкаў. Пешаходна-гандлёвыя вуліцы і станцыі метро ўсё больш фармавалі ўнутрыгарадскую прастору, але пры гэтым яны не адпавядалі попыту на спажывецкія тавары і стану грамадскага транспарту. У 1980-я гг. стала відавочна, што буйнапанэльнае будаўніцтва, заснаванае на шырокамаштабнай перабудове, не адпавядала патрабаванню захоўнай рэканструкцыі горада. Патрэба ў эканоміі працягвала супярэчыць чаканням, якія распаўсюджваліся прапагандай (іл. 5).

Пасля Другой сусветнай вайны паняцце "сацыялістычны горад" у Савецкім Саюзе страціла сваё значэнне з прычыны двух фактараў. З аднаго боку, у перыяд сталінізму мела месца аддаленне ад ідэй авангарду; з другога боку, з абвяшчэннем Канстытуцыі 1936 г. Савецкі Саюз ва ўласным разуменні скончыў "будаўніцтва сацыялізму" і, у адрозненне ад краін народнай дэмакратыі, ужо знаходзіўся, як дэкларавалася ў Праграме КПСС 1961 г., у стадыі "пабудовы камуністычнага грамадства". Таму лагічна, што ў новай рэдакцыі Генеральнага плана 1971 г. Масква вызначалася як "узорны камуністычны горад"[138].

У выніку канцэпцыя "сацыялістычны горад" апынулася нежыццяздольнай з-за таго, што дзяржаўнае і партыйнае кіраўніцтва не змагло ўрэгуляваць міграцыйны ціск насельніцтва на гарадскія цэнтры. Сістэма "закрытых гарадоў" прывяла да таго, што савецкае грамадства стала структураваным у залежнасці ад месца жыхарства. Што да ўзроўню даходаў грамадзян, асар-

[137] Решения партии и правительства по хозяйственным вопросам. Т. 7. Июль 1968 – 1969 г. Москва, 1970. С. 459–471.

[138] Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1986). Изд. 9-е, доп. и испр. Т. 12. 1971–1975. Москва, 1986. С. 127–130.

тыменту тавараў, забеспячэння ўстановамі адукацыі, аховы здароўя і магчымасцяў правядзення вольнага часу, то тут выразна назіралася зніжэнне паказчыкаў у кірунку ад сталіцы і вялікіх гарадоў да сярэдніх і малых гарадоў, а ад іх – да вёскі[139]. Аднак патрэба прадпрыемстваў у рабочай сіле, навучанне ў сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных установах, а таксама будаўніцтва планавых гарадоў з прамысловымі прадпрыемствамі спрыялі таму, што ўсё больш маладых людзей накіроўваліся з вёскі ў горад. Такім чынам, Савецкі Саюз перажыў працэс урбанізацыі, які па сваіх маштабах не мае сабе роўных. Абсалютны рост гарадскога насельніцтва і яго рост адносна агульнага росту насельніцтва склаў 26 300 000 і 17,9% у 1926 г., 56 100 000 і 32,9% у 1939 г., 100 млн. і 47,9% у 1959 г. і, нарэшце, 188 800 000 і 65,8% у 1989 г. [140]. Насуперак ідэалагічным устаноўкам канцэнтрацыя насельніцтва ў вялікіх гарадах заставалася характэрнай рысай Савецкага Саюза. Колькасць гарадоў з насельніцтвам больш за 100 тыс. чалавек узрасла з 32 у 1926 г. да 146 у 1959 г. і да 309 у 1989 г.; колькасць мільённых гарадоў – з 3 да 23. За перыяд з 1926 да 1989 г. доля вялікіх гарадоў з больш як 100-тысячным насельніцтвам павялічылася з 36,1% да 60,6%; а колькасць насельніцтва, што жыло ў мільённых гарадах, павялічылася з 9,1% у 1959 г. да 21,8% у 1989 г.[141].

[139] Пар.: Zaslavsky V. Closed Cities and the Organized Consensus // ён жа. The Neo-Stalinist State. Class, Ethnicity, and Consensus in Soviet Society. 1982. With a New Introduction. Armonk, N.Y., 1994. P. 130–164; Smith G. Privilege and Place in Soviet Society // Horizons in Human Geography / Ed. by. Derek G., Walford R. Houndmills / London, 1989. P. 320–340; Bohn T. M. Das sowjetische System der "geschlossenen Städte". Meldewesen und Wohnungsmangel als Indikatoren sozialer Ungleichheit // Die europäische Stadt im 20. Jahrhundert. Wahrnehmung – Entwicklung – Erosion / Hrsg. v. Lenger F., Tenfelde K. Köln / Weimar / Wien, 2006. S. 373–385.

[140] Пар.: Lewis R. A., Rowland R. H. Population Redistribution in the USSR. It's Impact on Society, 1897–1977. New York, 1977; Knabe B. Bevölkerungsentwicklung und Binnenwanderung in der UdSSR 1967–1974. Dargestellt an ausgewählten Territorien und unter Berücksichtigung interregionaler Migrationen. Berlin, 1978; Grandstaff P. J. Interregional Migration in the U.S.S.R. Economic Aspects, 1959–1970. Durham, N. C., 1980; Lappo G. M., Hönsch F. W. Urbanisierung Rußlands. Stuttgart, 2000; Bohn T. M. Bevölkerung und Sozialstruktur / Handbuch der Geschichte Rußlands. Bd. 5. 1945–1991. Vom Ende des Zweiten Weltkrieges bis zum Zusammenbruch der Sowjetunion / Hrsg. v. Plaggenborg S. Stuttgart, 2003. S. 595–657.

[141] Народное хозяйство СССР в 1989 г. Статистический ежегодник. Москва, 1990. С. 25.

Жаданае і рэчаіснасць у жыллёвым пытанні разыходзіліся паміж сабой аж да распаду Савецкага Саюза, у прыватнасці ў галіне падзелу гарадской прасторы на зоны, мэтай якога была максімальная блізкасць месца працы да месца пражывання. Паказальна, што нягледзячы на вялікія абяцанні, якія знайшлі адлюстраванне ў Праграме КПСС 1961 г., Савецкая Канстытуцыя 1977 г. (так званая "брэжнеўская канстытуцыя") гарантавала толькі права на "жыллё", а не на асобную кватэру[142]. З жыллёвага пытання, якое нібыта стабілізавалася ў 1970-я гг., былі выключаны перш за ўсё маладыя сем'і. Дзяржаўная датацыя на кватэрную плату складала ў сярэднім менш за 5%, а жыллёвы рынак як такі афіцыйна не існаваў, таму цэны на жыллё на самай справе не мелі ніякага значэння. Праблема была толькі ў недахопе прапановы[143]. Магчымасць азнаямлення з сапраўды бядотным становішчам даюць нешматлікія статыстычныя звесткі, апублікаваныя толькі ў пачатку 1990-х гг. З іх вынікае, што ўсталяваную ў 1929 г. санітарную норму індывідуальнай жылой плошчы ў памеры 9 кв. м, г. зн. жыллёвую прастору на чалавека без уліку кухні, ваннай і калідора, атрымалася пераступіць у гарадах у сярэднім па Савецкім Саюзе толькі ў 1985 г.[144]. Яшчэ ў 1989 г. на падставе выбарачнай праверкі з 310 тысяч сем'яў 27,6% жылі ва ўмовах, якія не адпавядалі санітарнай норме 9 кв. м. на чалавека, а ў дачыненні да сем'яў, што жылі ў горадзе, гэты працэнт быў яшчэ вышэйшы і складаў 48,3%[145]. Нядзіўна, што ў праграме КПСС 1986 г. рашэнне жыллёвай праблемы было адкладзена да 2000 г.[146].

[142] Пар.: Verfassungen der kommunistischen Staaten / Hrsg. v. Brunner G., Eissner M., Paderborn B., u. a., 1979. S. 374–415, § 44.

[143] Пар.: Andrusz. Housing and Urban Development... S. 28.

[144] Санитарные правила по застройке жилых зданий. Утверждены Наркомздравом РСФСР по согласованию со Стройкомом РСФСР 26 июля 1929 г. Сборник постановлений, приказов и инструкций по вопросам планировки населенных мест и архитектурного проектирования. Москва, 1948. С. 172–180, тут с. 175; Социальное развитие СССР. Статистический сборник. Москва, 1990. С. 210.

[145] Народное хозяйство СССР в 1989 г. Статистический ежегодник. Москва, 1990. С. 171. Пар. таксама: Kalinina N. Housing and Housing Policy in the USSR // The Reform of Housing in Eastern Europe and the Soviet Union / Ed. by Turner B., Hegedüs J., Tosics I. London / New York, 1992. P. 245–275, асабліва P. 250.

[146] Meissner B. Das Aktionsprogramm Gorbatschows. Die Neufassung des dritten Parteiprogramms der KPdSU. Köln, 1987. S. 91–157, тут S. 123; 27. Parteitag der KPdSU, März '86. Sowjetunion zu neuen Ufern? Düsseldorf o. J., S. 167–269, тут S. 216.

## 2 Асаблівасці ўрбанізацыі ў Беларусі

Да пачатку Другой сусветнай вайны Беларусь з 80% сельскага насельніцтва належала да найбольш адсталых рэгіёнаў Усходняй Еўропы. У сувязі з тым, што карысныя выкапні абмяжоўваліся ў асноўным тарфянымі і салянымі радовішчамі, з даўніх часоў асноўнымі галінамі ў Беларусі былі сельская і лясная гаспадаркі. У выніку падзелаў Рэчы Паспалітай у канцы XVIII ст. Беларусь увайшла ў склад Расійскай імперыі і была падзелена на Гродзенскую, Віленскую, Мінскую, Віцебскую і Магілёўскую губерні. Паводле першага перапісу насельніцтва Расіі 1897 г., насельніцтва гэтых губерняў складала 6,5 млн. чалавек. З іх 5,8 млн. жылі ў сельскай мясцовасці і 655 063 былі жыхарамі гарадоў. Асаблівасць Беларусі заключалася ў тым, што яна знаходзілася ў цэнтры рысы аседласці яўрэйскага насельніцтва Расійскай імперыі. У той час як з 4,7 млн. беларусаў 4,6 млн., г. зн. 97,7%, жылі ў сельскай мясцовасці, яўрэі былі вымушаныя сяліцца ў гарадах. Адпаведна, гарадское насельніцтва складалася на 53,5% з яўрэяў, на 17,9% – з рускіх, толькі на 16,6% – з беларусаў і на 6,2% – з палякаў[147].

З прычыны таго, што Беларусь знаходзіцца на паўночным захадзе ад чарназёмных абласцей, яна ніколі не магла быць жытніцай. Для большасці беларускіх сялян гаворка ішла пра тое, каб забяспечыць харчаваннем сябе, перш за ўсё – вырошчваннем бульбы. Да пачатку савецкай гвалтоўнай калектывізацыі 1930-х гг. аграрны сектар характарызаваўся наяўнасцю прысядзібнай эканомікі. Праўда, была і абшчына рускага тыпу (ва ўсходняй частцы Беларусі каля Гомеля, Магілёва і на поўдні ад

[147] Шыбека З. Гарады Беларусі (60-я гады XIX – пачатак XX ст.). Мінск, 1997. С. 260. Пар. таксама: Iwanou M. Die jüdische Welt in Weißrußland vom Ende des 19. Jahrhunderts bis zum Holocaust // Handbuch der Geschichte Weißrußlands / Hrsg. v. Beyrau D., Lindner R. Göttingen, 2001. S. 392–407; Siebert D. Die Juden in Weißrußland vor der Schoa // "Existiert das Ghetto noch?" Weißrußland: Jüdisches Überleben gegen nationalsozialistische Herrschaft. Berlin / Hamburg / Göttingen, 2002. S. 268–276; Nesemann F. Versunkene Welten – Geschichte und Kultur der Juden Weißrußlands // Ost-West. Europäische Perspektiven. 2004. Bd. 5. S. 132–141; Bohn. T. M. Von jüdischen Schtetln zu sowjetischen Industriestädten. Paradoxien der Urbanisierung Weißrusslands // Von der "europäischen Stadt" zur "sozialistischen Stadt" und zurück? Urbane Transformationen im östlichen Europa des 20. Jahrhunderts. Jahrestagung des Collegium Carolinums und des Herder Forschungsrates in Bad Wiessee, 23.–25. November 2006 / Hrsg. v. Bohn T. M. Köln / Weimar / Wien 2009. S. 51–76.

Віцебска), асноўнымі рысамі якой былі пераразмеркаванне зямлі і кругавая парука, існаванне якой было пастаўлена пад пытанне ў выніку правядзення сталыпінскай рэформы 1906 г.[148].

Запозненае індустрыяльнае развіццё Беларусі можна, з аднаго боку, растлумачыць рэгіянальнымі асаблівасцямі, а з другога – той нязначнай роляй, якую царскі і савецкі ўрады адводзілі памежным рэгіёнам у эканамічнай і палітычнай сферах. Першыя імпульсы для развіцця эканамічны сектар Беларусі атрымаў у апошняй трэці XIX ст., што было непасрэдна звязана з будаўніцтвам чыгункі і асушэннем балот на Палессі, у басейне ракі Прыпяць. Нягледзячы на тое, што Беларусь атрымлівала выгаду ад тэхнічных інавацый, якія спрыялі прытоку інвестыцый, на самай справе яна выконвала толькі функцыю транзітнай краіны ў гандлёвых адносінах паміж Расійскай імперыяй і Захадам, а таксама пры пастаўках украінскага збожжа ў балтыйскія парты. Да пачатку новага стагоддзя тут сталі развівацца харчовая, папяровая і гарбарная прамысловасці[149]. Нягледзячы на адсутнасць цяжкой прамысловасці, перад пачаткам Першай сусветнай вайны можна зафіксаваць дзве асаблівасці эканамічнага развіцця рэгіёна. 1. Асноўнымі пастаўшчыкамі прамысловай прадукцыі былі ў першую чаргу мануфактуры і рамесная вытворчасць. У 1913 г. на 1282 буйных прадпрыемствах было занята 54 900 рабочых, на 7778 малых прадпрыемствах – 16 000 рабочых і ў 90 763 саматужных гаспадарках – 168 800 чалавек[150]. 2. Індустрыялізацыя не пацягнула за сабой працэсу ўрбанізацыі. У 1913 г. 68% фабрык знаходзілася за межамі гарадоў, а 51,4% занятых у прамысловай вытворчасці рабочых жылі ў сельскай мясцовасці[151].

У сувязі з узнаўленнем Польскай дзяржавы пасля Першай сусветнай вайны тэрыторыя Беларусі была зноў падзеленая. Павод-

[148] Пар.: Siebert D. Bäuerliche Alltagsstrategien in der Belarussischen SSR (1921–1941). Die Zerstörung patriarchalischer Familienwirtschaft. Stuttgart, 1998. S. 29–30; Kachanouski A. Die Bauernschaft im Wandel. Von der Aufhebung der Leibeigenschaft bis zur Kollektivierung (1861–1929) // Handbuch der Geschichte Weißrußlands / Hrsg. v. Beyrau D., Lindner R. Göttingen, 2001. S. 249–257.

[149] Пар.: Kischtymau A. Rückständigkeit und Industrialisierung im 20. Jahrhundert. // Handbuch der Geschichte Weißrußlands / Hrsg. v. Beyrau D., Lindner R. Göttingen, 2001. S. 258–275.

[150] Эканамічная гісторыя Беларусі / пад рэд. В. І. Галубовіча. Выд. 3-е, дап. і перапрац. Мінск, 1999. С. 192.

[151] Сасим А. М. Промышленность Беларуси в XX столетии. Минск, 2001. С. 35.

ле Рыжскай мірнай дамовы (1921) тэрыторыя абвешчанай у 1919 г. Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі (БССР) уключала ў сябе толькі невялікую вобласць вакол Мінска, але ўжо ў 1924 г. была пашырана шляхам далучэння Магілёўскай і Віцебскай абласцей, якія на той час уваходзілі ў склад Расійскай Савецкай Федэратыўнай Сацыялістычнай Рэспублікі (РСФСР), а ў 1926 г. далучылі тэрыторыі вакол Гомеля і Рэчыцы. У перыяд з 1926 да 1939 г. колькасць насельніцтва БССР, агульная плошча якой склала 125 950 кв. км., узрасла з 4,98 да 5,6 млн. чалавек (у параўнанні з 3,6 млн. на дадзенай тэрыторыі ў 1897 г.)[152]. У 1921 г. тэрыторыя Заходняй Беларусі агульнай плошчай 113 тыс. кв. км адышла да Польшчы. Ва ўсходніх абласцях Другой Рэчы Паспалітай ("Kresy Wschodnie", якія ўключалі ў сябе ваяводствы Вільня, Наваградак, Палессе і Беласток) у 1931 г. жыло 4,6 млн. чалавек, а ў 1939 г. – 5 млн.[153]. Абедзве часткі краіны – БССР і "Kresy" – развіваліся па-рознаму ў сацыяльна-эканамічным плане.

У выніку Першай сусветнай і грамадзянскай войнаў гарадское насельніцтва Беларусі зменшылася на адну трэць, а ўдзельная вага прамысловай прадукцыі склала толькі пятую частку ад ўзроўню 1913 г. Працэс прамысловага росту атрымаў развіццё толькі ў сярэдзіне 1920-х гг. У 1926–1927 гг. у БССР налічвалася 410 фабрык з 60 100 рабочымі і 60 178 рамесных вытворчасцяў з 146 500 занятымі. Праўда, толькі сталінская палітыка паскоранай індустрыялізацыі 1930-х гг. прывяла да структурных змен беларускай эканомікі. У гады першай пяцігодкі (1928–1932) было пабудавана 78 буйных і 480 сярэдніх і дробных прадпрыемстваў; у гады другой пяцігодкі (1933–1937) – яшчэ 1700 прадпрыемстваў. На гэтым фоне ўдзельная вага прамысловасці ў валавым нацыянальным прадукце павялічылася з 18% у сярэдзіне 1920-х гг. да 67% у канцы першай пяцігодкі і да 80% напярэдадні Другой сусветнай вайны. Разам з харчовай і дрэваапрацоўчай галінамі прамысловасці з'явіліся тэкстыльная і металаапрацоўчая галіны. За перыяд з 1926–1927 гг. да нападу Германіі на Савецкі Саюз удзельная вага металаапрацоўчай прамысловасці ў валавым нацыянальным прадукце павялічылася з 5,9% да

[152] Siebert D. Alltagsstrategien… S. 85, 91.
[153] Пар.: Benecke W. Die Ostgebiete der zweiten polnischen Republik. Staatsmacht und öffentliche Ordnung in einer Minderheitenregion 1918–1939. Köln / Weimar / Wien, 1999; ён жа. Kresy. Die weißrussischen Territorien in der Polnischen Republik // Handbuch der Geschichte Weißrußlands / Hrsg. v. Beyrau D., Lindner R. Göttingen, 2001. S. 153–165.

16,6%, тэкстыльнай прамысловасці – з 5,8% да 11,4% (пры гэтым швейнай прамысловасці – з 4,6% да 10,7%), у той час як удзельная вага харчовай прамысловасці заставалася прыблізна стабільнай, павялічыўшыся толькі з 22,9% да 24,5%, а ўдзельная вага дрэваапрацоўчай і папяровай галін прамысловасці скарацілася з 23,8% да 8,8%. З прычыны гэтага да пачатку Другой сусветнай вайны БССР мела абмежаваны асартымент тавараў, якімі яна магла задавальняць унутраныя патрэбы, а таксама пастаўляць іх на ўсесаюзны рынак. Удзельная вага БССР у валавым нацыянальным прадукце Савецкага Саюза ў вытворчасці фанеры складала 34,7%, у вытворчасці алейнага пакосту – 30%, у вытворчасці запалак – 28,6%, у вытворчасці дражджэй – 25%, у сферы вытворчасці панчошна-шкарпэткавых вырабаў – 16,7%, 14% – у пашыве бялізны, 11% – у вытворчасці маргарыну, у вытворчасці металарэзных станкоў – 10%, 10% – у здабычы торфу, 8,5% – у вытворчасці спірту, 6,3% – у папяровай прамысловасці, 4,4% – у вытворчасці аконнага шкла, 4% – у абутковай прамысловасці, 3,9% – у вытворчасці цэглы і 3,5% – у вытворчасці цэменту. У цэлым жа з прычыны адсутнасці буйнога прамысловага комплексу тэмп эканамічнага развіцця БССР заставаўся ніжэйшым за сярэднесаюзны ўзровень[154].

Па звестках перапісу насельніцтва 1926 г., толькі 8% беларусаў жылі ў гарадах. Гарадское насельніцтва складалася на 40,1% з яўрэяў, на 39,2% – з беларусаў, на 15,6% – з рускіх і на 2,3% – з палякаў. Яўрэйскія гандляры асабліва моцна пацярпелі ад абмежавання прыватнага сектара ў эканоміцы Савецкага Саюза. Асаблівасці менталітэту і практычныя меркаванні прывялі да таго, што міграцыя насельніцтва з вёскі была абмежаваная: з аднаго боку, беларускія сяляне, якія на Палессі яшчэ ў 1930-я гг. называлі сябе "тутэйшымі", заставаліся "прывязанымі" да сваёй зямлі; з другога боку, колькасць сялянскіх гаспадарак у БССР (770–800 тыс. двароў) заставалася ў 1930-я гг. стабільнай у параўнанні з іншымі рэспублікамі Савецкага Саюза (дзе колькасць такіх гаспадарак скарацілася на трэць), бо голад 1932 г. закрануў у большай частцы толькі чарназёмныя раёны. Пры гэтым неаб-

[154] Kischtymau A. Rückständigkeit… S. 264–267; Сасим А. Промышленность… С. 92, 103, 119, 128. Пар. таксама: Развитие экономики Беларуси в 1921–1927 гг. / под ред. Ф. С. Мартинкевича, В. И. Дрича. Минск, 1973; Развитие экономики в Беларуси в 1928–1941 гг. / под ред. В. И. Дрича. Минск, 1975; Нетылькин А. Т. Осуществление ленинской политики индустриализации в Белоруссии (1926–1941). Минск, 1979.

ходна прыняць да ўвагі, што гвалтоўная калектывізацыя адбывалася не так імкліва, як у Расіі ці Украіне, з прычыны бедных ураджаяў і сістэмы паселішчаў, часткова заснаванай на хутарах. Нягледзячы на працэс паскоранай індустрыялізацыі, гарадское насельніцтва павялічылася толькі з 17% у 1926 г. (у абсалютным вылічэнні – 847 360 чалавек) да 25% у 1939 г. (у абсалютным вылічэнні – 1,4 млн.)[155]. У той час як у агульнасаюзным маштабе ўдзельная вага гарадскога насельніцтва павялічылася за перыяд з 1926 да 1939 г. на 6,5%, штогадовы каэфіцыент прыросту ў БССР склаў толькі 3,8%[156]. Нацыяналізацыя прадпрыемстваў, з аднаго боку, а таксама міграцыя працоўнага насельніцтва, якое жыло ў вёсках і перасялялася ў прамысловыя цэнтры СССР, з другога боку, прывялі да дэмаграфічных зменаў у складзе яўрэйскага насельніцтва. З 1926 да 1939 г. колькасць яўрэяў у БССР у абсалютным вылічэнні зменшылася з 407 да 375 тыс., а ў працэнтных адносінах – з 8,2% да 6,7%[157].

Памежныя ўсходнія раёны ("Kresy Wschodnie") адносіліся да найбольш бедных раёнаў Польшчы. Больш за 90% насельніцтва займалася сельскай гаспадаркай. Нягледзячы на тое, што "Kresy" складалі адну пятую тэрыторыі і адну дзясятую частку насельніцтва польскай дзяржавы, да пачатку Другой сусветнай вайны тут знаходзілася толькі 5% заводаў з 1,8% рабочых. І толькі дрэваапрацоўчая прамысловасць магла падтрымліваць узровень вытворчасці дарэвалюцыйнага часу. У 1938 г. тут налічвалася 616 прадпрыемстваў з 16 740 рабочымі; на 216 дрэваапрацоўчых заводах было занята 8579 рабочых, на 187 харчовых прадпрыемствах працавала 2159 рабочых і на 20 металаапрацоўчых за-

155 Пар.: Siebert D. Vereinige und herrsche. Aufstieg und Niedergang des Chutorwesens im östlichen Weißrußland // JGO. 1995. NF 43. S. 58–77; idem, Alltagsstrategien… S. 85–99, 145, 185; Trepte H. C. Die "Hiesigen" (Tutejsi / Tutejšyja) – Regionales Bewußtsein im polnisch-weißrussischen Grenzraum / Regionale Bewegungen und Regionalismen in europäischen Zwischenräumen seit der Mitte des 19. Jahrhunderts. Hrsg. v. Ther P., Sundhaussen H. Marburg, 2003. S. 145–157. Пар. таксама: Касперович Г. И. Миграция населения в города и этнические процессы (на материалах исследования городского населения БССР). Минск, 1985. С. 38.

156 Harris C. D. Cities of the Soviet Union. Studies in Their Function, Size, Density, and Growth. Chicago, 1970, P. 408; Польский С. А. Урбанизация Белорусской ССР. Учебно-методическое пособие. Минск, 1985. С. 10.

157 Nesemann. Versunkene Welten… S. 138. Пар.: Chkolnikova E. The Transformation oft he Shtetl in the USSR in the 1930s // Jews in Russia and Eastern Europe. 2004. Vol. 52. P. 91–129.

водах – 2005 рабочых. У агульным і цэлым, у міжваенны перыяд "Kresy" не выйшлі за межы стадыі натуральнай сельскай гаспадаркі[158]. Акрамя таго, культуру рэгіёна ў вялікай ступені вызначала культура ўсходнеяўрэйскага штэтла. Паводле перапісу насельніцтва 1931 г., на гэтай тэрыторыі жыло 448 тыс. яўрэяў[159].

Другая сусветная вайна стала пераломным момантам. Заключэнне пакта Молатава – Рыбентропа (1939) прывяло да "ўз'яднання" БССР з тэрыторыяй Заходняй Беларусі (г. зн. з польскімі ўсходнімі раёнамі без Віленскага ваяводства), што пацягнула за сабой павелічэнне тэрыторыі на 45% і рост насельніцтва з 5,6 млн. да 10,4. млн. чалавек (330 тысяч чалавек з Заходняй Беларусі былі сасланыя як кулакі ў Сібір, у тым ліку шмат яўрэяў; пасля Другой сусветнай вайны заходнія раёны былога Беластоцкага ваяводства зноў адышлі да Польшчы)[160]. У выніку Халакосту і палітыкі "выпаленай зямлі" нямецкі акупацыйны рэжым 1941–1944 гг. нанёс непапраўную шкоду Беларусі: па афіцыйных дадзеных, загінула 2,2 млн. чалавек (чвэрць насельніцтва), 380 тыс. чалавек сагналі на прымусовыя работы ў Германію. Больш за тое, велізарнай шкодай стала разбурэнне 209 гарадоў і раённых цэнтраў, а таксама 9200 вёсак. Матэрыяльныя страты склалі 75 млрд. рублёў, што было роўнае 35 дзяржаўным бюджэтам за 1940 г. Па афіцыйных звестках, беларуская эканоміка была адкінута на ўзровень 1928 г., а ў асобных галінах прамысловасці і энергетыцы – нават на ўзровень 1913 г.[161]. Ажыўленне гарадоў і аднаўленне народнай гаспадаркі адбылося толькі ў 1950-я гг. Колькасць насельніцтва больш за 9 млн. чалавек (узровень 1940 г.) была дасягнута толькі ў 1970 г. (гл. дадатак, табліца I). Пры гэтым неабходна прыняць да ўвагі, што ў 1950–1960-я гг. у межах кампаніі па асваенні цаліны больш за мільён беларусаў перасялілася ў Сярэднюю Азію і Сібір[162]. Антысемітызм эпохі позняга сталінізму стаў прычынай таго, што не згадвалася колькасць яўрэяў сярод агульнай колькасці ахвяр нацыянал-

[158] Сасим А. Промышленность…. С. 136.

[159] Iwanou. Die jüdische Welt… S. 402.

[160] Chiari B. Alltag hinter der Front. Besatzung, Kollaboration und Widerstand in Weißrußland 1941–1944. Düsseldorf, 1998. S. 27–29. Пар. таксама: Gerlach C. Kalkulierte Morde. Die deutsche Wirtschafts- und Vernichtungspolitik in Weißrußland 1941 bis 1944. Hamburg, 1999.

[161] Белорусская Советская Социалистическая Республика / ред. колл. П. У. Бровка и др. Минск, 1978. С. 166.

[162] Пар.: Шахотько Л. П. Воспроизводство населения Белорусской ССР. Минск, 1985. С. 95.

сацыялістычнага рэжыму ў Беларусі. Па прыблізных звестках постсавецкага часу ў Другой сусветнай вайне загінула ад 400 да 650 тыс. беларускіх яўрэяў; выжыла 120–150 тыс.[163].

У рамках савецкай праграмы аднаўлення народнай гаспадаркі ў БССР пачаўся імклівы працэс індустрыялізацыі. У той час як колькасць занятых у сельскай гаспадарцы і лясной прамысловасці зменшылася з 57,6% да 19,3%, колькасць занятых у прамысловасці і ў будаўніцтве ў адносінах да агульнай колькасці тых, хто працаваў, з 1960 да 1990 г. вырасла з 20,7% да 42,2%. Колькасць занятых у прамысловасці ўзрасла з 29 400 у 1950 г. і 568 500 у 1960 г. да больш як 1 млн. у 1970 г., 1,4 млн. у 1980 г. і 1,5 млн. у 1985 г. З прычыны гэтага ўдзельная вага прамысловасці ў валавым нацыянальным прадукце павялічылася з 1960 да 1980 г. з 54,7% да 62,5% і потым знізілася да 60,9% (1990 г.). Удзельная вага сельскай гаспадаркі знізілася з 27,2% да 18,7% за перыяд з 1960 да 1980 г. і дасягнула ўзроўню 20,1% да 1990 г.[164].

Можна сцвярджаць, што беларуская эканоміка перажыла структурныя змены з пераважным развіццём машынабудаўнічай, металаапрацоўчай і хімічнай галін прамысловасці. Да галоўных прадпрыемстваў належалі Гомельскі завод сельскагаспадарчага машынабудавання (Гомсельмаш), Мінскі аўтамабільны завод (МАЗ), Мінскі трактарны завод (МТЗ), Беларускі аўтамабільны завод у г. Жодзіне (БелАЗ), чатыры калійныя камбінаты ў Салігорску і камбінат сінтэтычнага валакна ў Светлагорску. За перыяд з 1960 да 1985 г. колькасць занятых ад агульнай колькасці занятых у прамысловасці ўзрасла ў машынабудаванні і металаапрацоўчай прамысловасці з 27,1% да 45,7%, у хімічнай прамысловасці – з 2,3% да 6,9%, у той час як колькасць занятых у дрэваап-

[163] Черноглазова Р. А. Уничтожение евреев Белоруссии в годы немецко-фашистской оккупации в 1941–1944 гг. // Трагедия евреев Белоруссии в годы немецкой оккупации (1941–1944). Сборник материалов и документов / отв. ред. Р. А. Черноглазова. Минск, 1995. С. 20–26, тут с. 25; Смиловицкий Л. Евреи Беларуси. Из нашей общей истории. 1905–1953. Минск, 1999. С. 9; ён жа. Катастрофа евреев в Белоруссии 1941–1944 г. Тель-Авив, 2000. С. 27–30; Iwanou M. Terror, Deportation, Genozid. Demographische Veränderungen in Weißrußland im 20. Jahrhundert // Handbuch der Geschichte Weißrußlands / Hrsg. v. Beyrau D., Lindner R. Göttingen, 2001. S. 426–436, тут S. 435.

[164] Белорусская Советская Социалистическая Республика… С. 246–247; Промышленность Белорусской ССР. Статистический сборник. Для служебного пользования. Минск, 1986. С. 87; Народное хозяйство Белорусской ССР в 1990 г. Статистический ежегодник. Минск, 1991. С. 7, 35.

рацоўчай і папяровай прамысловасці знізілася з 17,1% да 7,2%[165]. У 1976 г. удзельная вага машынабудавання і металаапрацоўкі ў валавым нацыянальным прадукце склала 26,6%, хімічнай і нафтаперапрацоўчай прамысловасці – 16,7%, энергетыкі – 16,3%, харчовай прамысловасці – 8,7%, вытворчасці будаўнічых матэрыялаў – 8,4%, лёгкай прамысловасці – 7,7%, паліўнай – 7,0%, дрэваапрацоўчай і папяровай прамысловасці – 4,5%, шкляной прамысловасці і вытворчасці фарфору – 1,0%[166]. Больш за тры чвэрці прадукцыі знаходзілі збыт за межамі БССР. У 1976 г. удзельная вага Беларусі ў валавым нацыянальным прадукце СССР склала: па здабычы калійных угнаенняў – 42,8%, вытворчасці матацыклаў – 22,3%, штучнага валакна – 15,7%, трактароў – 15,4%, веласіпедаў – 14,1%, металарэзных станкоў – 14,1%, шарыкападшыпнікаў – 13,9%, наручных гадзіннікаў – 12,6%, здабычы мінеральных угнаенняў – 12,4%. У адрозненне ад саюзнага ўзроўню аж да перабудовы працэс эканамічнага росту БССР заставаўся стабільным, і толькі з 1970-х гг. можна гаварыць пра зніжэнне тэмпаў развіцця. Пра вытворчасць прадукцыі так званага ваенна-прамысловага комплексу на сённяшні дзень звестак няма[167].

Калі прыняць да ўвагі запозненасць працэс індустрыялізацыі, становіцца зразумелым, чаму пра працэс урбанізацыі ў Беларусі ў поўным сэнсе гэтага слова можна гаварыць толькі пачынаючы з пасляваеннага часу. Паводле ўказа ад 23 красавіка 1962 г.

[165] Промышленность Белорусской ССР… С. 88.

[166] Белорусская Советская Социалистическая Республика… 260.

[167] Пар.: Социально-экономические преобразования в Белорусской ССР за годы Советской власти / под ред. Ф. С. Мартинкевича. Минск, 1970; Развитие экономики Белоруссии в 1961–1970 гг. / под ред. Ф. С. Мартинкевича, В. И. Дрича. Минск, 1978; Экономика Белоруссии в период послевоенного возрождения / под ред. В. И. Дрича. Минск, 1988. Пар. таксама: Horak S. M. Belorussia. Modernization, Human Rights, Nationalism // Canadian Slavonic Papers. 1974. Vol. 16. P. 403–422, тут P. 409; перадрук у: Nationalism and Human Rights. Processes of Modernization in the USSR / Ed. by Kamenetsky I. Littleton, Co., 1977. P. 139–154, тут P. 143; Kipel V. Some Demographic and Industrial Aspects of Soviet Belorussia during 1965–1975 // Nationalism in the USSR and Eastern Europe in the Era of Brezhnev and Kosygin. Papers and Proceedings of the Symposium held at the University of Detroit on October 3–4, 1975 / Ed. by Simmonds G. W. Detroit, 1977. P. 96–104; тут P. 98–102; Dreifelds J. Belorussia and the Baltics // Economics of Soviet Regions / Ed. by Koropeckyj I. S., Schroeder G. E. New York, 1981. P. 323–385, тут P. 350–352; Sagers M. J. Structural Change and the Spatial Distribution of Industry in Belorussia // SG. 1984. Vol. 25. S. 328–353; Kischtymau A. Rückständigkeit… S. 267–270.

Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР меў права населеныя пункты, у якіх рабочыя і служачыя разам са сваімі сем'ямі складалі большую частку насельніцтва, у адпаведнасці з іх адміністрацыйнай функцыяй і эканамічным значэннем, прылічаць да наступных тыпаў паселішчаў: а) рабочыя пасёлкі (не менш за 500 жыхароў), б) гарадскія пасёлкі (не менш за 2 тыс. жыхароў), в) гарады раённага падпарадкавання (не менш за 6 тыс. жыхароў) і г) гарады абласнога падпарадкавання (не менш за 40 тыс. жыхароў)[168]. Такім чынам, статус горада быў звязаны з наяўнасцю прамысловых прадпрыемстваў, камунальнай гаспадаркі, дзяржаўнага жылога фонду і сеткі ўстаноў побытавога абслугоўвання.

Разам з разбурэннямі, прычыненымі вайной, і калектывізацыяй сельскай гаспадаркі ў былых польскіх усходніх раёнах працэс урбанізацыі ў Беларусі пасля 1945 г. характарызаваўся трыма асноўнымі рысамі: 1) бурным тэмпам росту сталіцы, 2) павелічэннем канцэнтрацыі насельніцтва ў вялікіх гарадах, 3) слабым развіццём малых гарадоў[169]. У сувязі з гэтым колькасць гарадскога насельніцтва адносна агульнай колькасці павялічылася з 21,0% у 1950 г. да 32,0% у 1960 г., 43,4% – у 1970 г., 56,0% – у 1980 і 66,3% – у 1990 г. (гл. дадатак, табліца I). У 1950-я гг. сярэдні прырост гарадскога насельніцтва склаў 4,9%, у 1960-я – 4,2%, у 1970-я – 3,3% і ў 1980-я – 2,4%[170].

Рост гарадоў адназначна звязаны з міграцыяй насельніцтва з вёскі. Паводле апытання 1970-х гг., 76% гарадскога насельніцтва складалі мігранты; 50% усіх гарадскіх жыхароў былі выхадцамі з вёскі[171]. У той час як за перыяд з 1950 да 1991 г. гарадское насельніцтва вырасла ў чатыры разы, павялічыўшыся з 1,6 млн.

[168] Сборник законов Белорусской ССР и указов Президиума Верховного Совета Белорусской ССР. 1938–1973 гг. Т. I. Минск, 1974. С. 270–271. Пар. таксама: Сборник нормативных и справочных материалов по развитию городов. Москва, 1980. С. 78–81.

[169] Польский С. Урбанизация... С. 10.

[170] Тамсама. С. 10–11. Пар. таксама: Манак В. А. Насельніцтва Беларусі. Рэгіянальныя асаблівасці развіцця і рассялення. Мінск, 1992; Шахотько Л. П. Население Республики Беларусь в конце XX века. Минск, 1996; Манак В. А., Антипова Е. А. Экономико-географический анализ демографической ситуации и размещение населения на территории Республики Беларусь. Минск, 1999.

[171] Этнические процессы и образ жизни (На материалах исследования городов БССР) / ред. В. К. Бондарчик. Минск, 1980. С. 70. Шэсць з дзесяці гараджан былі прыезджымі. Касперович И. Миграция населения в города и другие процессы (На материалах исследования городов БССР). Минск, 1985. С. 6.

да 6,9 млн. чалавек, сельскае насельніцтва за дадзены часавы адрэзак знізілася ўдвая – з 6,1 млн. да 3,4 млн. чалавек (гл. дадатак, табліца I). Пра старэнне сельскага насельніцтва і "вымыванне" вёсак сведчыць той факт, што з 1970 г. узровень нараджальнасці ў горадзе перавышаў узровень нараджальнасці ў вёсцы, у той час як аж да распаду Савецкага Саюза для сельскай мясцовасці быў характэрны высокі ўзровень смяротнасці[172]. З пачатку 1950-х гг. у вёсцы можна канстатаваць бесперапыннае падзенне нараджальнасці, у горадзе ж гэты працэс пачаўся толькі з пачаткам перабудовы. Такім чынам, да сярэдзіны 1980-х гг. у горадзе быў дасягнуты пік натуральнага прыросту колькасці насельніцтва, у той час як пачынаючы з канца 1970-х гг. імкліва скарачалася колькасць насельніцтва ў сельскай мясцовасці[173].

З сярэдзіны 1960-х да канца 1970-х гг. міграцыйны баланс прыносіў гарадам вялікую карысць. Да сярэдзіны 1970-х гг. адбывалася бурная міграцыя насельніцтва з вёскі. Так, напрыклад, за перыяд з 1961 да 1967 г. у некаторых раёнах Магілёўскай вобласці больш за 70% маладых беларусаў ва ўзросце 20–24 гадоў пакінулі родныя мясціны[174]. З прычыны гэтага патэнцыял сельскай мясцовасці пачаў вычэрпвацца, і таму ў першай палове 1970-х гг. быў адзначаны як самы высокі паказчык прыросту насельніцтва ў гарадах, так і самы высокі паказчык скарачэння насельніцтва ў вёсцы (гл. дадатак, табліца II). У сувязі з гэтым этнічны склад гарадскога насельніцтва змяніўся на карысць тытульнай нацыі. За перыяд паміж перапісамі насельніцтва 1959 і 1989 гг. колькасць беларусаў у складзе гарадскога насельніцтва павялічылася з 67,0% да 73,3%; колькасць жа рускіх знізілася з 19,4% да 17,5%. У выніку Халакосту адчувальна знізіўся працэнт яўрэяў, якія пражывалі ў Беларусі. У 1959 г. у Беларусі налічвалася 150 134 яўрэя. Гэта адпавядае 1,9% ад агульнай колькасці насельніцтва. З прычыны таго, што з канца 1960-х гг. прадстаўнікі яўрэйскай меншасці пачалі выкарыстоўваць магчымасці, якія

[172] Пар.: Сакович В. С. Белорусское село в 70–90-е годы. Миграция населения, трудовые ресурсы. Минск, 1997; Сарокін А. М. На ростанях айчыннай гісторыі. Беларуская вёска. Ад дэкрэта да кодэкса аб зямлі (1917 – 1990-я гады). Мінск, 1999.

[173] Население Республики Беларусь. Статистический сборник. Минск, 1995. С. 122–123.

[174] Пешкова А. Н. Миграция сельского населения БССР. Ее характер и социально-экономические последствия // Проблемы народонаселения и трудовых ресурсов. Сборник статей / вып. под ред. В. Ф. Медведева, А. А. Ракова, М. И. Горячко. Минск, 1970. С. 37–43, тут с. 39.

з'явіліся для эміграцыі, іх колькасць у 1989 г. паменшылася да 111 977, або да 1,1% ад агульнай колькасці насельніцтва. Улічваючы гэта, за перыяд з 1959 да 1989 г. колькасць яўрэяў у складзе гарадскога насельніцтва паменшылася з 5,8% да 1,7%[175].

За перыяд з 1959 да 1989 г. колькасць гарадоў і пасёлкаў гарадскога тыпу павялічылася з 184 да 211. Пры гэтым колькасць малых гарадоў з насельніцтвам да 50 тыс. жыхароў вырасла з 174 да 188, колькасць паселішчаў з насельніцтвам да 20 тыс. чалавек – з 167 да 173. Такім чынам, відавочнае толькі нязначнае павелічэнне колькасці малых гарадоў. Невялікая колькасць сярэдніх гарадоў (50–100 тыс. жыхароў) павялічылася толькі на дзве трэція – з 6 да 10. Вялікія ж гарады (больш за 100 тыс. жыхароў), наадварот, развіваліся вельмі дынамічна. Іх колькасць павялічылася ў чатыры разы – з 4 да 12 (гл. дадатак, табліца III). У 1959 г. толькі Мінск меў усе падставы называцца "буйным горадам" (мінімум 250 тыс. жыхароў). Да 1989 г. у гэтую катэгорыю трапілі яшчэ пяць гарадоў: Гомель, Магілёў, Віцебск, Гродна і Брэст[176]. Гэта сведчыць пра канцэнтрацыю насельніцтва ў вялікіх гарадах. З 1959 да 1989 г. колькасць жыхароў малых гарадоў знізілася з 44,6% да 25,8% ад агульнай колькасці гарадскога насельніцтва, а колькасць жыхароў сярэдніх гарадоў паменшылася з 17,2% да 11,3%. Пры гэтым колькасць насельніцтва ў вялікіх гарадах павялічылася з 38,1% да 62,8%, або з 17,6% да 39,0%, калі не ўлічваць Мінск (гл. дадатак, табліца IV).

У перыяд з 1959 да 1989 г. у Мінску жыло больш за 20% усяго гарадскога насельніцтва рэспублікі, а ў канцы 1970-х гг. гэтая лічба дасягнула нават 25% (гл. дадатак, табліца V). Дамінантны статус сталіцы робіцца відавочным, калі параўнаць рост насельніцтва ў Мінску з ростам насельніцтва ў іншых беларускіх гарадах: з 1972 г. Мінск быў горадам з мільённым насельніцтвам. За перыяд паміж перапісамі насельніцтва 1959 і 1989 гг. колькасць

[175] Колькасць палякаў і ўкраінцаў у гарадах мянялася зусім нязначна, з 1959 да 1989 г. з 3,4% да 3,0%, або заставалася на ўзроўні 3,5%. Национальный состав населения Беларуси и распространенность языков. Статистический сборник. Т. I. Минск, 2001. С. 17. Пар.: Brym R. G. The Jews of Moscow, Kiev and Minsk. Identity, Antisemitism, Emigration. Houndmills, Basingstoke / London, 1994.

[176] Да тыпалогіі горада пар.: Правила и нормы планировки и застройки городов. Утверждены Государственным комитетом Совета Министров СССР по делам строительства по поручению Совета Министров СССР 1 декабря 1958 г. Москва, 1959. С. 4; Сборник нормативных и справочных материалов…. С. 83.

насельніцтва Мінска павялічылася ў тры разы – з 500 тыс. да 1,5 млн. чалавек. Ні адзін буйны беларускі горад нават прыблізна не змог дасягнуць такога тэмпу росту. На 1970 г. ні ў адным з іх не быў перавышаны ўзровень насельніцтва, вызначаны ў 1960-я гг. як аптымальны для памеру горада[177]. Колькасці 300 тыс. жыхароў да распаду Савецкага Саюза дасягнулі толькі Гомель, Магілёў і Віцебск, а колькасці 200 тыс. – Гродна, Брэст і Бабруйск. У 1989 г. Гомель, другі па велічыні горад БССР, налічваў больш за 500 тыс. жыхароў (гл. дадатак, табліца V).

У рэальнасці аж да 1960-х гг. працэс урбанізацыі заставаўся на якасна нізкім узроўні. На падставе перапісу насельніцтва 1959 г. і праведзенай Цэнтральным статыстычным упраўленнем БССР у 1960 г. праверкі жылога фонду, у 1962 г. Беларускі дзяржаўны праектны інстытут (Белдзяржпраект) падрыхтаваў справаздачу аб колькасным складзе гарадскога і сельскага насельніцтва. Згодна з гэтым дакументам, 5,5 млн. чалавек жылі ў сельскай мясцовасці (68,4%) і 2,5 млн. чалавек – у 69 гарадах і 126 пасёлках гарадскога тыпу (31,6%). У сярэднім у кожнай вёсцы было 174 жыхара, а ў пасёлку гарадскога тыпу – 13 тыс. жыхароў. 17 гарадоў мелі прадпрыемствы розных галін прамысловасці, а 60 населеных пунктаў – прадпрыемствы перапрацоўчай прамысловасці. У іншых 23 гарадах і 98 населеных пунктах можна было таксама адзначыць наяўнасць вытворчых прадпрыемстваў. З транспартна-тэхнічнага пункту гледжання 18 гарадоў і 74 населеныя пункты былі недастаткова забяспечаныя. Жыллёвыя ўмовы таксама былі не найлепшыя. За перыяд з 1955 г. да 1 студзеня 1960 г. жылая плошча ў пасёлках гарадскога тыпу была павялічана толькі з 4,2 кв. м да 5,5 кв. м на чалавека, нягледзячы на тое, што санітарная норма прадугледжвала 9 кв. м. 52,7% гарадской жылой плошчы прыпадала на прыватныя дамы і толькі 47,3% належалі дзяржаве. 64,2% гарадской жылой плошчы складалі драўляныя дамы і толькі 33,6% – мураваныя. Калі не браць у разлік Мінск, то 80% гарадской жылой плошчы ў Беларусі прыпадала на аднапавярховыя дамы. З прычыны таго, што ў гарадах пераважалі (акрамя цэнтра) прыватныя дамы, гарады дэ-факта толькі нязначна адрозніваліся ад вёсак. Адпаведна была слаба развіта і інфраструктура. 75,5% гарадской жылой плошчы не мелі водаправода, цэнтральнага ацяплення і не былі

[177] Белогорцев И. Д., Гурин И. И., Кустанович С. М. Развитие городов Белоруссии. Минск, 1967. С. 34. Пар. таксама: Белогорцев И. Д. К проблеме оптимальных размеров современного города // СНРИСА. 1961. С. 20–29.

падлучаны да газавай сеткі і каналізацыі. Са 195 пасёлкаў гарадскога тыпу толькі 78 мелі водаправод, 53 – цэнтральнае ацяпленне, 35 – каналізацыю і 10 былі газіфікаваны. Толькі 33,8% вуліц асвятляліся электрычнасцю, толькі 18,9% вуліц былі заасфальтаваныя[178]. Паляпшэнні, якія адбыліся з 1965 да 1975 г., таксама былі нязначныя. Так, індывідуальная жылая плошча ў пасёлках гарадскога тыпу павялічылася толькі з 6 кв. м да 7,2 кв. м. У 1975 г. толькі 63,9% гарадской жылой плошчы былі забяспечаны водаправодам, 62,1% – каналізацыяй, 58,3% – цэнтральным ацяпленнем, 45,5% – гарачай вадой. На прыватныя дамы прыпадала 31,4% гарадской жылой плошчы[179]. Санітарная норма, якая складала 9 кв. м на чалавека, была дасягнута ў беларускіх гарадах толькі ў 1985 г. БССР з 9 кв. м жылой плошчы і 13,8 кв. м агульнай жылой плошчы на чалавека знаходзілася ніжэй сярэднесаюзнага ўзроўню, які вызначаўся нормай адпаведна 9,1 кв. м і 14,1 кв. м[180]. Нягледзячы на адрозненні ўмоў жыцця ў горадзе і вёсцы, якія назіраліся ў БССР аж да распаду Савецкага Саюза, прывабнасць жыцця ў гарадах, тым не менш, заставалася нязменнай (табліца 1).

**Табліца 1.** Добраўпарадкаванне ў БССР у горадзе і вёсцы, 1980–1990 (у канцы года; у %).

| Забеспячэнне дзяржаўнай, ведамаснай і кааператыўнай жылой плошчы | 1980 | | 1985 | | 1990 | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | Горад | Вёска | Горад | Вёска | Горад | Вёска |
| Водаправод | 92 | 46 | 94 | 52 | 95 | 60 |
| Каналізацыя | 91 | 40 | 93 | 45 | 95 | 52 |
| Цэнтральнае ацяпленне | 90 | 37 | 93 | 40 | 94 | 41 |
| Газ | 88 | 68 | 88 | 88 | 86 | 92 |
| Гарачая вада | 77 | 19 | 87 | 25 | 89 | 27 |
| Ванна (душ) | 87 | 33 | 90 | 39 | 92 | 47 |
| Электрычная пліта | – | – | 9 | 2 | 12 | 3 |

*Крыніца:* Народное хозяйство Республики Беларусь в 1991 г. Статистический сборник. Минск, 1993. С. 107.

[178] Схема размещения производительных сил Белорусской ССР на 1959–1980 годы. Ч. V. Население и расселение. Минск, 1962. ЦДАНТД, ф. 3, воп. 4, спр. 10, арк. 28–61.

[179] Социальные аспекты размещения промышленности / под ред. Л. В. Козловской. Минск, 1977. С. 159–160.

[180] Социальное развитие СССР. Статистический сборник. Москва, 1990. С. 209–210.

## 3 Гісторыя "старога Мінска" да Другой сусветнай вайны

Беларусь здаўна займала прамежкавае становішча паміж Сярэдняй і Усходняй Еўропай і да распаду Савецкага Саюза мела толькі нязначны вопыт незалежнасці ў 1918 г. (перыяд грамадзянскай вайны), таму Мінск на працягу стагоддзяў знаходзіўся пад уплывам розных культур. Гістарычная спадчына, якая выяўлялася ў звароце да нязначных рэліктаў дарэвалюцыйнага часу, зноў стала выконваць важную ролю толькі пасля здабыцця Рэспублікай Беларусь дзяржаўнай незалежнасці. У пачатку XXI ст. Мінск ствараў уражанне маладога горада, на абліччы якога адбіўся ў першую чаргу вопыт Другой сусветнай вайны і прынцыпы сацыялістычнага планавання[181].

Тым не менш за плячыма Мінска амаль тысячагадовая гісторыя. Першую згадку горада *Менеск* можна сустрэць на старонках найстарэйшага летапісу Русі "Аповесць мінулых гадоў" (1067). З аднаго боку, назва горада магла ўтварыцца ад слова *мяняць*, што паказвае на яго функцыю як гандлёва-перавалачнага пункта для Кіеўскай Русі, якую магло выконваць размешчанае на рацэ Свіслач замчышча ўнутры рачной сістэмы паміж Скандынаўскім паўвостравам і Візантыяй. З іншага боку, назва можа паходзіць ад паселішча ля рэчкі Менка, датаванага, згодна з археалагічнымі дадзенымі, X стагоддзем і размешчаным за 12 км на захад ад Мінскага княства, згадка пра якое датуецца 1104 годам[182].

У першай чвэрці XIV ст. замкавае паселішча ўвайшло ў склад Вялікага Княства Літоўскага, якое ў 1386 г. заключыла асабістую унію з Польскім каралеўствам. Пасля канстытуцыйнага ста-

[181] Палац Рэспублікі на Кастрычніцкай плошчы, будынак чыгуначнага вакзала, падземны гандлёвы цэнтр на плошчы Незалежнасці, помнік на штучным паўвостраве ракі Свіслач беларускім вайскоўцам, якія загінулі ў Афганістане, помнік Пушкіну на паўночна-ўсходнім беразе ракі Свіслач і рэканструяваны гістарычны будынак гарадской ратушы на плошчы Свабоды – гэта значныя элементы, якія з моманту атрымання незалежнасці ўзбагацілі гарадскі ландшафт.

[182] Пар.: Загорульский Э. М. Древний Минск. Минск, 1963; ён жа. Возникновение Минска. Минск, 1982; Штыхов Г. В., Лысенко П. Ф. Древнейшие города Белоруссии. Минск, 1966; Штыхов Г. В. Города Белоруссии по летописям и раскопкам (IX–XIII вв.). Минск, 1975; Штыхаў Г. Назваўся Менскам горад // ён жа. Ажываюць сівыя стагоддзі. Выд. 2-е, перапрац. і дап. Мінск, 1982. С. 143–174.

наўлення Рэчы Паспалітай у 1505 г. адбылося дзяржаўна-прававое аб'яднанне Літвы з Польшчай (1596). У Вялікім Княстве Літоўскім у якасці афіцыйнай мовы выкарыстоўвалася ўсходнеславянская мова, якая толькі ў 1697 г. была заменена на польскую і якая ляжыць у аснове сучаснай беларускай мовы, таму беларускія гісторыкі лічаць, што гэта можа быць асновай для стварэння нацыянальнай гісторыі краіны. Важнейшым за гэты патрыятычны пункт гледжання магло б стаць прыняцце пад увагу значэння прамежкавага рэгіёна паміж Захадам і Усходам, які на працягу стагоддзяў быў характэрным для Беларусі[183].

Тым не менш пасля атрымання Мінскам магдэбургскага права ў 1499 г. і з'яўлення тут каталіцкіх Ордэнаў (пасля заключэння Берасцейскай царкоўнай уніі 1596 г.) горад далучыўся да традыцый заходняй духоўнай культуры і сацыяльнай структуры, якія прывялі да эмансіпацыі буржуазіі (Bürgertum). У XV ст. у Мінску жыло каля 3–4 тыс. жыхароў, у пачатку XVI ст. – каля 5 тыс. Пасля пажараў 1547, 1552 і 1569 гг. цэнтр горада паступова зрушыўся ў паўднёвым кірунку: ад замка на Ніжнім рынку (сёння гэта плошча 8 Сакавіка) да Верхняга рынку (сучасная плошча Свабоды, іл. 6). У ходзе рэформаў 1564–1566 гг. Мінск быў абвешчаны рэзідэнцыяй ваяводы і нарэшце ў 1591 г. атрымаў уласны герб. У канцы XVI ст. у Мінску засядаў Вярхоўны літоўскі трыбунал – найвышэйшы апеляцыйны суд. Росквіт горада працягваўся аж да польска-рускай вайны 1654–1667 гг., якая абярнулася для Мінска пяццю гадамі акупацыі і скарачэннем колькасці насельніцтва да 2 тыс. чалавек. У перыяд Паўночнай вайны ў 1706 і 1708 гг. горад быў узяты рускімі і шведскімі войскамі, а ў 1710–1711 гг. ахоплены эпідэміяй. У 1790 г. у горадзе зноў жылі 6500–7000 чалавек[184].

[183] Пар.: Beyrau D., Lindner R. Einführung // Handbuch der Geschichte Weißrußlands / Hrsg. v. Beyrau D., Lindner R. Göttingen, 2001. S. 11–22.

[184] Пар.: Дружчыц В. Места Менск у канцы XV і пачатку XVI ст. // Працы Беларускага Дзяржаўнага Універсітэта. Мінск, 1926. № 12. С. 1–22; Игнатенко А. П. Ремесленное производство в городах Белоруссии в XVII–XVIII вв. Минск, 1963; Копысский З. П. Экономическое развитие городов Белоруссии в XVI – первой половине XVII в. Минск, 1966; ён жа. Социально-политическое развитие городов Белоруссии в XVI – первой половине XVII в. Минск, 1975; Гринкевич А. П. Частновладельческие города Белоруссии в XVI–XVIII вв. (Социально-экономическое исследование истории городов). Минск, 1975; ён жа. Социальная борьба горожан Белоруссии (XVI–XVIII вв.) / науч. ред. В. С. Поссе. Минск, 1979; Цітоў А. Вольныя беларускія месты. Самакіраванне ў нашых гарадах (XIV–XVIII стст.). Мінск, 1996.

У выніку другога падзелу Рэчы Паспалітай паміж Прусіяй і Расіяй у 1793 г. Мінск увайшоў у склад Расійскай імперыі. У XIX ст. і ў першай палове XX ст. у гісторыі горада можна вылучыць тры асноўныя асаблівасці: пачынаючы з перыяду французскай акупацыі ў 1812 г., а потым у перыяд нямецкай акупацыі 1918 г., польскай акупацыі 1919–1920 гг. і, нарэшце, зноў нямецкай акупацыі 1941–1944 гг. Мінск праз сваё стратэгічнае становішча вымушаны быў выконваць ролю арэны баявых дзеянняў для войнаў паміж Расіяй і яе заходнімі суседзямі. Што да складу насельніцтва, то аж да савецкай эпохі Мінск быў хутчэй яўрэйскім горадам, чым беларускім. Менавіта Беларусь стала цэнтрам вызначанай яшчэ указам Кацярыны II і ў 1835 г. устаноўленай законам "рысы аселасці", дзе павінны былі пражываць яўрэі, якія займаліся гандлем і рамяством[185]. Нарэшце, асаблівасці структуры занятасці пацягнулі за сабой кампанію бальшавікоў па ліквідацыі так званай "буржуазіі" (буржуазія ў заходнім разуменні існавала ў дарэвалюцыйным Мінску хіба збольшага), якая праводзілася ў той момант, калі рабочы клас як такі толькі пачаў фармавацца. Мінск як цэнтр губерні з 1796 г. падпаў пад русіфікацыю. Пасля антырасійскага паўстання 1830–1831 гг. былі зачынены каталіцкія манастыры, а ў якасці мовы навучання ў школы ўведзена руская мова; у 1839 г. была забаронена ўніяцкая царква, а з 1840 г. "нярускія" тэрыторыі сталі насіць назву "заходніх правінцый"[186].

У сваю чаргу, адкрыццё чыгуначных зносін паміж Масквой і Брэстам (1871) і Лібавай і Ромнамі (1874), якія звязалі Расію з Цэнтральнай Еўропай і Балтыку з Украінай, прывяло да эканамічнага ўздыму і прыкметнага росту горада. У цэнтры, на Сабornай плошчы (раней Верхні рынак), размясціліся дом губернатара, які знаходзіўся ў былой езуіцкай калегіі, акруговы суд у былым базыльянскім манастыры, банк і гандлёвы клуб у будынку былога "Гасцінага двара", гарадскі архіў у былым бернардынскім кляштары, сабор Пятра і Паўла, Свята-Духаўская царква (былы касцёл кляштара бернардынак) і сінагога (іл. 6). Інфраструктура характарызавалася наяўнасцю водапровода (1874), тэлефоннай сеткі (1890), конкі (1892) і электрычнага

185 Пар.: Иоффе Э. Г. Страницы истории евреев Беларуси. Краткий научно-популярный курс. Минск, 1997.
186 Пар.: Thaden E. C. Russia's Western Borderlands, 1710–1870. Princeton, N. J., 1984.

асвятлення вуліц (1895). Адкрыліся гарадскі тэатр (1890) і гасцініца "Еўропа" (1908)[187].

З'яўленне чыгункі спрыяла развіццю гандлю і рамяства. Разам з харчовай, гарбарнай, тэкстыльнай, а таксама дрэваапрацоўчай і папяровай галінамі прамысловасці стала развівацца металаапрацоўчая прамысловасць, якая спачатку атрымала развіццё на аснове чыгуначных майстэрняў. Праўда, прамысловая гаспадарка засноўвалася ў значнай ступені на рамесных майстэрнях даіндустрыяльнага ўзору і вялася майстрам самастойна або з памочнікам. Аднак да пачатку Першай сусветнай вайны прамысловая вытворчасць пачала выконваць больш значную ролю ў эканамічным жыцці Мінска. Калі не ўлічваць мануфактур, якія не выконвалі асаблівай ролі ў эканамічным жыцці, то для перыяду часу паміж 1895 і 1913 гг. можна адзначыць наступную супярэчлівую з'яву: нягледзячы на тое, што колькасць рамесных вытворчасцяў павялічылася з 1733 да 3259, а колькасць занятых у гэтай вытворчасці саматужнікаў узрасла з 4539 да 7983, колькасць фабрык таксама павялічылася з 18 да 77 і колькасць фабрычных рабочых узрасла з 952 да 4259. У той час як удзельная вага саматужнай прамысловасці ў валавым нацыянальным прадукце знізілася з 37,4% да 27,1%, удзельная вага фабрык узрасла з 42,7% да 68,8%. Паводле перапісу насельніцтва 1897 г., 25,9% рабочых Мінска былі заняты ў прамысловасці, 4,0% – у будаўніцтве, 16,8% – у гандлі і 10,6% – у транспартнай галіне. 15,3% усіх занятых належалі да абслуговага персаналу, 10,2% знаходзіліся на службе ва ўпраўленні і адміністрацыі, 4,4% займаліся свабоднымі прафесіямі, 5,5% складалі пенсіянеры. Толькі 2,5% насельніцтва займалася сельскай гаспадаркай[188]. Такім чынам, аж да пачатку Першай сусветнай вайны Мінск заставаўся цэнтрам гандлю мясцовага значэння. Аб прамысловым горадзе не ішло і гаворкі.

За перыяд з 60-х да 90-х гг. XIX ст. насельніцтва Мінска павялічылася ўтрая, з прыблізна 30 да 90 тыс. (гл. дадатак, таблі-

[187] Пар.: Schybeka Z. Das "alte" Minsk – vom zarischen Gouvernementszentrum zur sowjetischen Hauptstadt // Handbuch der Geschichte Weißrußlands / Hrsg. v. Beyrau D., Lindner R. Göttingen, 2001. S. 308–318. Пар. таксама: Лютый А. М. Социально-экономическое развитие городов Белоруссии в конце XVIII – первой половине XIX века / под ред. В. В. Чепко. Минск, 1987.

[188] Шибеко З. В. Минск в конце XIX – начале XX в. Очерк социально-экономического развития. Минск, 1985. С. 10–11, 26, 118; Шибеко З. В., Шибеко С. Ф. Минск. Страницы жизни дореволюционного города. Минск, 1990. С. 223.

ца VI). Аднак з-за слабога развіцця беларускіх гарадоў міграцыя насельніцтва з вёскі была абмежаваная. Імпульс да сезоннай міграцыі дала адмена прыгоннага права ў 1861 г. У адрозненне ад гарадоў Расійскай імперыі, якія імкліва раслі, доля сялян у агульным насельніцтве Мінска ў 1890 і 1896 гг. складала адпаведна толькі 2,5% і 4,8%[189]. Пры гэтым забарона 1882 г., згодна з якой яўрэям нельга было сяліцца за межамі гарадоў і мястэчак і набываць зямлю, паслужыла каталізатарам для этнічнай дынамікі насельніцтва Мінска[190]. Паводле першага перапісу насельніцтва Расіі 1897 г., колькасць яўрэяў сярод насельніцтва Мінска склала 51,2%; 25,8% усіх жыхароў былі рускія, 11,4% – палякі і толькі 9,0% – беларусы (гл. дадатак, табліца VII). Непасрэдна звязаны з індустрыялізацыяй рост насельніцтва прывёў да таго, што да 1909 г. колькасць рускіх узрасла да 34,8%, да 43,3% знізілася ўдзельная вага яўрэйскага насельніцтва ў сувязі з эміграцыяй у ЗША, выкліканай беднасцю, у той час як колькасць палякаў і беларусаў змянілася неістотна і склала адпаведна 11,4% і 8,2 %[191]. Такім чынам, яшчэ да Першай сусветнай вайны Мінск атрымаў статус вялікага горада, у якім, нягледзячы на перавагу рускай эліты з-за невялікага працэнта беларусаў з прычыны іх традыцыйнай прыхільнасці да зямлі, пераважала культура ўсходніх яўрэяў з-за спецыфічных асаблівасцяў рысы аселасці. Урэшце яўрэі таксама русіфікаваліся.

Нягледзячы на той факт, што ў савецкія часы Мінск мог прэтэндаваць на ролю горада рэвалюцыйнай традыцыі, бо менавіта тут у 1898 г. адбыўся I з'езд Расійскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі (РСДРП), да пачатку Другой сусветнай вайны горад у эканамічных і культурных адносінах заставаўся хутчэй правінцыйным. Не ў апошнюю чаргу гэта пацвярджаецца тым, што ў міжваенны перыяд статус Мінска як сталіцы не быў стабільны. 27 лютага 1919 г. перад пагрозай польска-рускай вайны – праз менш чым два месяцы пасля абвяшчэння 1 студзеня 1919 г. Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі (БССР) са сталіцай у Мінску – была ўтворана Літоўска-Беларуская Савецкая Рэспубліка (ЛітБел) са сталіцай у Вільні. У перыяд з 8 жніўня 1919 г. да 11 ліпеня 1920 г. Мінск быў акупаваны польскімі войскамі. Пасля вызвалення, 31 ліпеня 1920 г.,

[189] Шибеко З. В. Минск в конце XIX... С. 116.
[190] Пар.: Kochanouski A. Bauernschaft... S. 252–255.
[191] Шибеко З. В. Минск в конце XIX.... С. 117.

адбылося другое абвяшчэнне БССР, а статус Мінска як сталіцы быў адноўлены. Напярэдадні Другой сусветнай вайны Цэнтральны Камітэт партыі бальшавікоў Беларусі прапанаваў перанесці сталіцу ў стратэгічных мэтах на ўсход, у горад Магілёў. Ва ўказе Вярхоўнага Савета БССР ад 27 верасня 1938 г. пры класіфікацыі населеных пунктаў Мінску быў прысвоены толькі статус "горада абласнога падпарадкавання"[192].

Нягледзячы на гэта, у міжваенны перыяд Мінск працягваў развівацца і пératвараца ў сучасны горад. У галіне культуры ў рамках палітыкі "каранізацыі" (г. зн. інтэграцыі нацыянальных эліт у савецкую дзяржаву шляхам падтрымкі развіцця нацыянальных моў), якую праводзілі бальшавікі, можна адзначыць такія падзеі, як адкрыццё Нацыянальнага музея (1919, да 1923 – абласны музей), Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (1921), Інстытута беларускай культуры (1922, з 1929 – Акадэмія навук), Нацыянальнай бібліятэкі (1922), кансерваторыі (1932) і карціннай галерэі (1939). У 1924 г. дзяржаўнымі мовамі былі абвешчаны беларуская, руская, ідыш і польская. Праўда, сінагогі, таксама як і цэрквы хрысціянскіх канфесій, былі асуджаны стаць ахвярамі сталінскага рэжыму[193]. У галіне гарадской інфраструктуры да дасягненняў саветызацыі можна аднесці з'яўленне аўтобусаў (1924), трамваяў (1929) і каналізацыі (1930). У 1930-я гг. агульны выгляд горада быў дапоўнены з'яўленнем будынкаў у стылі канструктывізму. Да іх адносяцца Дом урада (1930–1934), будынак Тэатра оперы і балета (1933–1937), Дом Чырвонай арміі (1934–1939), галоўны будынак Акадэміі навук архітэктара І. Р. Лангбарда (1939), будынак Ленінскай бібліятэкі (1932) і Політэхнічнага інстытута архітэктара Г. Л. Лаўрова (1932), Палац піянераў (1937), будынак ЦК (1941) архітэктараў А. П. Воінава і У. М. Вараксіна, а таксама Інстытут фізічнай культуры архітэктараў А. П. Воінава і А. П. Брэгмана[194].

[192] Пар.: Сборник законов Белорусской ССР… Т. I. Минск, 1974. С. 305–308, тут с. 305; Кандрацьева Л. Праект пераносу сталіцы БССР у Магілёў // БГЧ. 1994. № 2-3. С. 44–46; Schybeka. Das "alte" Minsk… S. 312–313.

[193] Пар.: Chiari B. "Nationale Renaissance", Belorussifizierung und Sowjetisierung. Erziehungs- und Bildungspolitik in Weißrussland 1922–1944 // JGO. 1994. NF Bd. 42. S. 521–540; Zejmis J. Belarus in the 1920s. Ambiguities of National Formation // Nationalities Papers. 1997. № 25. P. 243–254.

[194] Пар.: Schybeka. Das "alte" Minsk… S. 313–316. Пар. таксама: Куркоў І. Мінск незнаёмы. 1920–1940. Мінск, 2002.

Суіснаванне фабрычнай і саматужнай прамысловасці заставалася структурнай асаблівасцю эканомікі Мінска ў міжваенны час. Абмежаванні ў галіне прыватнага гандлю закранулі перш за ўсё яўрэйскае насельніцтва. Новыя імпульсы прамысловаму развіццю далі два першыя савецкія пяцігадовыя планы. За перыяд з 1928 да 1933 г. было адкрыта дванаццаць новых прадпрыемстваў, у 1933–1937 гг. – яшчэ трыццаць. Паводле афіцыйных звестак з планаў развіцця горада 1930-х гг., колькасць рабочых, занятых у прамысловасці, павялічылася з 17 500 у 1933 г. да 20 757 у 1938 г.[195]. У 1940 г. гарадскім упраўленнем статыстыкі было зарэгістравана 332 прадпрыемствы з 24 954 рабочымі і 124 вытворчыя кааператывы з 4050 рабочымі[196]. Паводле ацэнак перыядычнага друку таго часу, прамысловыя прадпрыемствы міжрэгіянальнага значэння з колькасцю рабочых 12 550 вырабілі ў 1938 г. валавога прадукту на 216 200 000 рублёў, у той час як рамесныя кааператывы з колькасцю рабочых 3588 атрымалі прыбытак 74 500 000 рублёў. Аж да Другой сусветнай вайны пераважала харчовая прамысловасць, удзельная вага якой у валавым прадукце буйных прадпрыемстваў склала ў 1938 г. 31,5%; за ёй ішлі тэкстыльная (24,7%) і гарбарная галіны (24,1%) прамысловасці. Удзельная вага металаапрацоўчай прамысловасці склала толькі 14,3%. У цэлым доля Мінска ў валавым нацыянальным прадукце БССР у 1938 г. склала 18,4%[197]. Такім чынам, да пачатку Другой сусветнай вайны Мінск ператварыўся з гандлёвага цэнтра мясцовага значэння ў прамысловы цэнтр міжрэгіянальнага значэння.

На 1930-я гг. прыпаў першы дэмаграфічны бум. Пасля памяншэння колькасці насельніцтва да 100 тыс. у час Першай сусветнай вайны і абвастрэння грамадзянскай вайны з-за ўступлення польскіх войскаў у 1919–1920 гг., у 1926–1941 гг. назіраўся імклівы рост насельніцтва з 131 600 да 270 400 чалавек (гл. дадатак, табліца VI). Прычынамі такога росту былі, з аднаго боку, міграцыя насельніцтва з вёскі, якая знаходзілася ў непасрэднай сувязі з гвалтоўнай калектывізацыяй, і з другога – патрэба ў рабочай сіле, выкліканая працэсам паскоранай індуст-

[195] ЦДАНТД, ф. 6, воп. 2, спр. 18, арк. 9 зверху, спр. 20, 11, 14–15. Пар. таксама: Гнеўка В. Г. Да гісторыі развіцця народнай гаспадаркі Мінска ў першай пяцігодцы (1928/29–1932/33 гг.) // Весці АН. Сер. гум. навук. 1956. № 4. С. 33–42, тут с. 37.

[196] ДАМВ, ф. 2631, воп. 1, спр. 4, арк. 69–79.

[197] Либерман Б. И. Город Минск. Минск, 1940. С. 27–29.

рыялізацыі. Праўда, дзяржава ўнесла некаторыя абмежаванні. Пры ўвядзенні пашпартнай сістэмы ў 1933 г. каля 12 700 нядобранадзейных грамадзян, якія складалі 7% насельніцтва (так званыя "кулакі" і "лішнія элементы", г. зн. яўрэйскія гандляры і рабіны) былі пазбаўлены права пражывання ў горадзе[198]. Саветызацыя прывяла да карэнных змен у этнічным складзе. Рэвалюцыя і грамадзянская вайна пацягнулі за сабой ліквідацыю ўплыву рускіх эліт Расійскай імперыі і павелічэнне колькасці беларусаў у складзе насельніцтва. Паводле першага савецкага перапісу насельніцтва 1926 г., колькасць беларусаў у Мінску склала 42,4%, яўрэяў – 40,8%, рускіх – 9,6% і палякаў – 3,4%. Гэтая тэндэнцыя атрымала далейшае развіццё ў рамках праграмы індустрыялізацыі на працягу дзвюх першых пяцігодак. Паводле перапісу насельніцтва 1939 г., беларусы склалі большасць насельніцтва – 54,8%; колькасць яўрэяў скарацілася да 30,8% у сувязі з перасяленнем у сельскую мясцовасць і ў прамысловыя рэгіёны Савецкага Саюза, у той час як працэнт рускіх практычна не змяніўся (9,8%), а палякі сталі складаць толькі 1,5%. Але было б няправільна думаць, што колькасныя змены прывялі да якаснага ўзмацнення беларускасці Мінска, бо палітыка "каранізацыі", якая праводзілася Масквой у 1920-я гг., на пачатку 1930-х гг. змянілася палітыкай, накіраванай на развіццё савецкага патрыятызму. Яна прывяла да рэпрэсій супраць беларускай інтэлігенцыі і да вынішчэньня носьбітаў нацыянальнай культуры[199]. У выніку Мінск міжваеннага перыяду пачаў ператварацца з яўрэйскага горада ў савецкі.

Пасля нападу Германіі на Савецкі Саюз 22 чэрвеня 1941 г. абвешчанае ў Беларусі ў 1930-я гг. уступленне ў эпоху сучаснага развіцця было раптоўна спынена. Наколькі нечаканай дадзеная падзея апынулася для насельніцтва Мінска, сведчыць той факт, што на гэты дзень было прызначана адкрыццё Камсамольскага возера, створанага шляхам штучнага пашырэння берагоў Свіслачы на поўнач ад цэнтра горада. Узяцце Мінска пачалося 23–24 чэрвеня з бамбёжак; захоп горада Вермахтам адбываўся з 25 да 28 чэрвеня. У выніку трохгадовай акупацыі, ваенных

[198] Пар. нататку ў каментары да накіда Генеральнага плана 1936 г.: ЦДАНТД, ф. 6, воп. 2с, спр. 18, арк. 32 зверху – 33.

[199] Пар.: Адамушка У. Палітычныя рэпрэсіі 20–50-х гадоў на Беларусі. Мінск, 1994; Marples D. Die Sozialistische Sowjetrepublik Weißrussland (1917–1945) // Handbuch der Geschichte Weißrusslands / Hrsg. v. Beyrau D., Lindner R. Göttingen, 1999. S. 135–152, тут S. 140–142.

дзеянняў, Халакосту, а таксама з прычыны ўцёкаў, эвакуацыі і выгнання колькасць насельніцтва Мінска скарацілася з 270 да 100 тыс. чалавек. У дзень вызвалення горада 3 ліпеня 1944 г. колькасць жыхароў складала менш за 50 тыс. чалавек[200]. Фотаздымкі пасляваеннага часу, на якіх адлюстраваны цэнтральныя вуліцы горада, сведчаць пра тое, што пасля адступлення немцаў Мінск уяўляў сабой груды руінаў[201]. Пацвярджаюць гэта і звесткі, прыведзеныя ў публікацыі 1961 г. першага архітэктара горада пасляваеннага часу Ю. А. Ягорава, пра раён паміж паралельнымі вуліцамі, якія межавалі з Савецкай вуліцай з поўначы і поўдня, а таксама паміж плошчай Леніна на захадзе і ракой Свіслач на ўсходзе. Паводле гэтых звестак, за перыяд акупацыі з 825 будынкаў не падпалі пад разбурэнне толькі 60 мураваных і 20 драўляных дамоў[202]. У энцыклапедычным даведніку Мінска за 1983 г. гаворка ідзе пра разбурэнне 80% усяго жылога фонду[203].

На самай справе пра маштабы разбурэнняў у гады Другой сусветнай вайны можна гаварыць толькі прыблізна. Наколькі незразумелым было становішча спраў для саміх сучаснікаў, відаць з адсутнасці структуры справаздачы, складзенай пасля заканчэння вайны для ЦК КПБ старшынёй выканаўчага камітэта Мінскага гарадскога савета К. І. Бударыным. На падставе справаздачы, складаннем якой для Мінскай вобласці займалася Надзвычайная дзяржаўная камісія па вызначэнні і расследаванні злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў, Бударын пералічыў толькі пашкоджаныя аб'екты. Што тычыцца чалавечых ахвяр, ён не змог даць ніякіх звестак. Перш за ўсё ён адзначыў разбурэнне будынкаў універсітэта, Акадэміі навук, філармоніі,

[200] Пар.: Gartenschläger U. Living und Surviving in Occupied Minsk // The People's War. Responses to World War II in the Soviet Union / Ed. by Thurston R. W., Bonwetsch B. Urbana, Chicago, 2000. P. 13–28; ён жа. Die Stadt Minsk während der deutschen Besetzung (1941–1944). Dortmund, 2001 (= Magisterarbeit. Köln 1990); Epstein B. Allies in Resistance. Jews and Belarussians in German-Occupied Minsk // Colaboration and Resistance during the Holocaust. Belarus, Estonia, Latvia, Lithuania / Ed. by Gaunt D., Levine P., Palouso L. Bern et al., 2004. P. 431–457; яна ж. The Minsk Ghetto 1941–1943. Jewish Resistance and Soviet Internationalism Berkeley et al., 2008.

[201] Пар.: Мінск учора і сёння. Фотаальбом. Мінск, 1988. С. 170–199.

[202] Егоров Ю. А. Ансамбль главной магистрали Минска // ён жа. Ансамбль в градостроительстве СССР. Очерки. Москва, 1961. С. 129–174, тут с. 141.

[203] Пар.: Минск. Энциклопедический справочник. Изд. 2-е, доп. и перераб. Минск, 1983. С. 21.

кансерваторыі, карціннай галерэі і Тэатра оперы і балета. Далей ён удакладніў, што з 332 прамысловых прадпрыемстваў міжваеннага часу толькі 19 засталіся непашкоджанымі; 23 асноўныя прамысловыя прадпрыемствы былі цалкам знішчаны. І, нарэшце, ён канстатаваў поўнае разбурэнне 932 жылых мураваных дамоў, 2113 жылых драўляных дамоў (колькасць якіх пасля было зменена на 2222) і 109 жылых драўляна-мураваных дамоў, а таксама пашкоджанне 245 жылых мураваных дамоў і 16 драўляных дамоў. У агульным і цэлым, справаздача Бударына сведчыць, што ў культурнай, эканамічнай і сацыяльнай сферах Мінска ўсё трэба было пачынаць практычна з нуля[204].

З гістарычнага пункту гледжання лёс насельніцтва Мінска пад час акупацыі таксама нельга апісаць у лічбах. З прычыны таго, што Надзвычайная камісія займалася толькі рэгістрацыяй страт на тэрыторыі Мінска і Мінскай вобласці і пры гэтым не цікавілася паходжаннем ахвяр, то па беларускай сталіцы няма дадзеных пра ахвяр Халакосту, пра салдат Чырвонай арміі і партызанаў, а таксама пра эвакуяваных ва ўсходнія раёны Савецкага Саюза. У цэлым за перыяд Другой сусветнай вайны ў Мінску загінула 327 тыс. чалавек[205]. Ніколі не рабілася спроба высветліць, колькі сярод іх было непасрэдна жыхароў Мінска. Пры гэтым колькасць ахвяр сталінскага тэрору таксама засталася невядомай. Замест гэтага савецкая ўлада абмежавалася тым, што правяла рэгістрацыю тых людзей, якія ў час нямецкай акупацыі былі ў горадзе[206]. Такім чынам, у тых, каго гэта закранула, у біяграфіі з'явілася ганебная пляма, якая ў пасляваенны час значыла больш, чым непажаданае сацыяльнае паходжанне ў 1920–1930-я гг. Пытанне аб тым, якім чынам або з якіх груп склалася насельніцтва горада ў эпоху позняга сталінізму, дакладней сказаць, якія былі суадносіны карэнных жыхароў і мігрантаў, застаецца загадкай, якая можа быць разгадана толькі на прыкладзе асобных чалавечых лёсаў[207].

[204] НАРБ, ф. 4, воп. 29, спр. 206, арк. 6–16. Пар.: О злодеяниях немецко-фашистских захватчиков в городе Минск / Нюрнбергский процесс. Т. IV. Военные преступления против человечности. Москва, 1959. С. 83–91.

[205] Пар. аглядную табліцу пра ахвяр нямецкай акупацыі ў Мінску: НАРБ, ф. 4, воп. 29, спр. 206, арк. 47.

[206] Пар.: ДАМВ, ф. 170 (243 акты з рэгістрацыяй жыхароў Мінска 1944–1945 г.).

[207] Пар.: "Dann kam die deutsche Macht". Weißrussische Kinderhäftlinge in deutschen Konzentrationslagern 1941–1945. Eine Dokumentation. Köln, 1999; "Existiert das Ghetto noch?" Weißrussland: Jüdisches Überleben gegen nationalsozialistische Herrschaft. Berlin / Hamburg / Göttingen, 2003; Мін-

Не менш складаны і падлік страт у галіне жыллёвага фонду. Што тычыцца разбурэння жылых будынкаў, то лічбы, названыя Бударыным, а менавіта 932 мураваныя дамы і 2222 драўляныя дамы, былі яшчэ раз пацверджаны ў справаздачы Гарадской планавай камісіі (Гарплан) ад 25 сакавіка 1947 г.[208]. Па звестках гарадскога статыстычнага ўпраўлення, за перыяд вайны засталіся непашкоджанымі 2259 шматкватэрных дамоў агульнай плошчай 239 599 кв. м, а таксама 3088 прыватных дамоў агульнай плошчай 99 224 кв. м[209]. У адносным вылічэнні пры новых падліках страт жылой плошчы лічбы, названыя адразу пасля вайны, былі перагледжаны ў бок змяншэння. У ліпені 1945 г. старшыня Гарплана Е. Ігудэсман звярнуў увагу на тое, што жылая плошча паменшылася пад час вайны з 813 200 кв. м да 211 000 кв. м[210]. Гэта адпавядае стратам у памеры 74,4%. Аднак ужо ў сакавіку 1947 г. ён прыйшоў да высновы: мела месца памяншэнне жылой плошчы з 1 069 600 кв. м да 405 900 кв. м, што раўнялася стратам толькі ў 62,1%[211]. Апошнія лічбы абапіраюцца на дадзеныя гарадскога статыстычнага ўпраўлення за перыяд з 1 студзеня 1940 г. да 1 траўня 1945 г. Гарадское статыстычнае ўпраўленне выявіла, што страты ў дзяржаўным (63%) і прыватным сектарах (61%) былі прыблізна аднолькавыя. Жылая плошча шматпавярховых кватэрных дамоў зменшылася з 772 600 кв. м да 288 700 кв. м, а прыватных дамоў – з 297 000 кв. м да 117 200 кв. м[212]. Калі прыняць да ўвагі новыя пабудовы 1940–1941 гг. і адноўленыя дамы ў 1944–1945 гг., то можна прыйсці да высновы, што за перыяд Другой сусветнай вайны было знішчана дзве трэція гарадскога жыллёвага фонду.

Такім чынам, БССР, аб'яднаная з польскімі ўсходнімі абласцямі, уяўляла сабой развівальную краіну, а сталіца рэспублікі горад Мінск быў *tabula rasa*. У пасляваенны час адбыліся радыкальная перабудова горада, дынамічны працэс індустрыялізацыі і глыбокія дэмаграфічныя змены.

скае гета 1941–1943 гг. Трагедыя, гераізм, памяць / адк. рэд. К. Козак. Мінск, 2004; Спасенные из ада. Жизнь и судьба. Геня Завольнер, Римма Гальперина. Вып. 1 / отв. ред. К. Козак. Минск, 2004. Пар. таксама: ...На перекрестках судеб. Из воспоминаний бывших узников гетто и праведников народов мира / сост. О. М. Аркадьева и др. Минск, 2001.

208 ДАМВ, ф. 2631, воп. 1, спр. 4, арк. 69–79.

209 ДАМВ, ф. 2305, воп. 1, спр. 442, арк. 4, 8.

210 ДАМВ, ф. 69, воп. 1, спр. 35, арк. 32–65.

211 ДАМВ, ф. 2631, воп. 1, спр. 4, 11, тут арк. 72.

212 Тамсама, арк. 72.

# III. Праектаванне "сацыялістычнага горада"

*"Гарады камунізму, якія з'яўляюцца ўвасабленнем багацця і разнастайнасці духоўнага жыцця людзей і багацця матэрыяльнага ўзроўню насельніцтва, будуць гарадамі яшчэ нябачанай гісторыяй дасканаласці і прыгажосці, якія адпавядаюць усебаковым патрабаванням жыцця і эстэтычным уяўленням людзей з высокай культурай.*

*Камуністычныя гарады – гэта гарады высокай сацыяльнай гармоніі, непараўнальныя ў санітарным і гігіенічным плане, велічныя і з ярка выражаным архітэктурным абліччам"*

Асновы савецкага
горадабудаўніцтва (1966)[213]

## 1 Анатомія горада

### а) Планы развіцця горада ў 1930-я гады

Той факт, што пасля Другой сусветнай вайны на парадак дня было пастаўлена не аднаўленне, а поўная перабудова Мінска, у першую чаргу звязаны са спецыфічнымі ўмовамі, у якіх развівалася савецкае гарадское планаванне з пачатку 1930-х гг., а таксама са знішчэннем беларускай нацыянальнай эліты пад час Вялікага тэрору 1937–1938 гг. Пасля стварэння бальшавікамі сістэмы цэнтралізаванай планавай эканомікі, якая знайшла сваё ўвасабленне ў паскоранай індустрыялізацыі і гвалтоўнай калектывізацыі 1928–1929 гг., на аснове рэзалюцыі "Аб маскоўскай гарадской гаспадарцы і аб развіцці гарадской гаспадаркі

[213] Основы советского градостроительства. Москва, 1966. Т. I. С. 14.

ў СССР” ад 15 чэрвеня 1931 г. стала паслядоўна праводзіцца рэканструкцыя гістарычна разрослых “капіталістычных” і праектаванне новых, “сацыялістычных”, гарадоў[214]. У сувязі з адсутнасцю спецыялістаў у БССР адказнасць за развіццё Мінска была ўскладзена на Ленінградскі дзяржаўны інстытут па праектаванні, здымцы і планіроўцы населеных месцаў. З прычыны таго, што напярэдадні Другой сусветнай вайны Мінск пазбавіўся статусу сталіцы, праект Генеральнага плана, упершыню прапанаваны ў 1936 г., падлягаў перапрацоўцы ў 1939–1940 гг.[215].

Распрацоўка Генеральнага плана 1936 г. праходзіла ва ўмовах, калі Мінск у адміністрацыйным дачыненні павінен быў выконваць функцыю сталіцы, а ў геаграфічным дачыненні, як памежны горад, размешчаны за 30 км ад Польшчы, – функцыю “сацыялістычнага фарпоста на захадзе”, што цягнула за сабой выкананне адпаведных рэпрэзентатыўных задач[216]. Пры гэтым у эканамічным плане была прадугледжана спецыялізацыя ў галіне машынабудавання і апрацоўкі металу[217]. Зыходзячы з гэтага, рост горада павінен быў адбывацца ў тры этапы: да 1940–1942 гг. планам былі прадугледжаны наяўнасць 250 тыс. жыхароў і жылая плошча ў памеры 5,5 кв. м на чалавека, да 1948–1950 гг. прадугледжваўся рост насельніцтва да 310 тыс. жыхароў (жылая плошча ў памеры 7,0 кв. м на чалавека) і да 1958–1960 гг. прадугледжвалася павелічэнне колькасці жыхароў да 400 тыс. і жылой плошчы да 9,0 кв. м на чалавека[218]. Пе-

[214] Пар.: ч. I. 1.
[215] ЦДАНТД, ф. 6, воп. 2с, спр. 18–19: НККЧ – РСФСР. Государственный институт по проектированию, съемке и планировке населенных мест. Генеральный проект планировки города Минск (текстовая часть). Ленинград, 1936. Т. I–II; ЦДАНТД, воп. 2с, спр. 20: НККЧ – РСФСР. Государственный трест по планировке населенных мест и проектированию гражданского строительства “ГИПРОГОР”. Генеральная схема планировки гор. Минска (текстовая часть). Ленинград, 1939; ЦДАНТД, ф. 6, воп. 2с, спр. 21–22: Народный комиссариат коммунального хозяйства БССР. Белгоспроект. Генеральная схема планировки Минска. Часть вторая. 1. Характеристики природных условий. 2. Краткая санитарная характеристика. 3. Инженерная подготовка территорий. 4. Энергоснабжение. Часть третья. 1. Архитектурно-планировочная композиция. 2. Уличная сеть. 3. Внутригородской транспорт. 4. Зелёные насаждения. 5. Железнодорожный транспорт. Минск, декабрь 1940.
[216] ЦДАНТД, ф. 6, воп. 2с, спр. 18, арк. 7.
[217] ЦДАНТД, ф. 6, воп. 2с, спр. 19, арк. 133.
[218] Тамсама, арк. 131, 136адв.

равагу планавальнікі аддавалі развіццю прамысловасці. У той час як прадугледжвалася двухразовае павелічэнне колькасці насельніцтва ў бліжэйшыя дваццаць гадоў, павелічэнне санітарнай нормы жылой плошчы да 9,0 кв. м на чалавека было адкладзена. У сувязі з гэтым узнікае пытанне – якую ролю выконвала перабудова горада ў Генеральным плане 1936 г.? Першапачаткова была праведзена экспертыза архітэктуры, згодна з якой беларускай сталіцы была прыпісана "безаблічнасць"[219] – дакор, які сам па сабе ўжо быў падставай для значнага ўмяшання ў структуру горада. У ходзе экспертызы праектавальнікі горада, разгледзеўшы 9726 драўляных дамоў, якія пераважалі ў горадзе, вырашылі, што яны не маюць значэння для будучага аблічча горада, і сканцэнтраваліся на класіфікацыі 1447 мураваных дамоў, 927 з якіх знаходзіліся ў цэнтры. Пры гэтым яны вылучылі чатыры групы будынкаў: а) пашкоджаныя двух- і трохпавярховыя жылыя і гандлёвыя дамы XIX ст. з фасадамі ў стылі рэнесанс і ампір; б) чатырох- і пяціпавярховыя гандлёвыя і адміністрацыйныя будынкі мяжы XIX–XX стст. з фасадамі ў стылі рэнесанс і мадэрн; в) грамадскія будынкі дарэвалюцыйнага часу, якія, за выключэннем каталіцкага сабора на плошчы Свабоды (былы Верхні рынак), не мелі, на іх думку, ніякай архітэктурнай каштоўнасці; г) рэпрэзентатыўныя будынкі савецкага часу, якіх станавілася ўсё больш і якія з цягам часу павінны былі стварыць гарадскі ансамбль[220]. Акрамя таго, пректавальнікі горада лічылі праблематычнай сетку чыгункі, лініі якой перасякаліся ў паўднёва-заходняй частцы горада. У выніку таго, што будаўнічыя пляцоўкі горада ссоўваліся на ўсход, цэнтр горада ссоўваўся да ўскраін[221].

Гэтаму абліччу супрацьпастаўляўся новы горад, які павінен быў адрозніваецца прыгажосцю і добраўпарадкаваннем. З самага пачатку пры планаванні горада важная роля адводзілася эстэтыцы і функцыянальнасці[222]. Каб дасягнуць мэты праектавання, была, па-першае, ініцыявана радыкальная рэканструкцыя цэнтра, перагружанага архітэктурнымі перажыткамі дарэвалюцыйнага часу; па-другое, прапанавана ліквідацыя і азеляненне традыцыйна населенага яўрэйскімі гандлярамі і рамеснікамі квартала ўздоўж Нямігі на паўночны захад ад плошчы Свабоды;

[219] ЦДАНТД, ф. 6, воп. 2с, д. 18, арк. 288.
[220] Тамсама, арк. 288–289.
[221] Тамсама, арк. 290.
[222] Тамсама.

і, па-трэцяе, запланавана замена драўляных прыватных дамоў, якія надавалі гораду вясковае аблічча, шматпавярховымі шматкватэрнымі дамамі. Далей прапаноўвалася стварыць паркі культуры і адпачынку, а таксама архітэктурна аформіць рэльефы ракі Свіслач. Прадугледжанае планам будаўніцтва радыяльна-кальцавой сістэмы вуліц, якая б спалучалася з трыкутнай мадэллю наяўных чыгуначных ліній, было кампрамісным рашэннем[223]. Урэшце знеслі цэлыя вуліцы – іх аддалі ў ахвяру "здаровай і радаснай архітэктуры"[224]. Перавага была аддадзена не гістарычна складзенаму гораду, а выразна скампанаванаму ансамблю цэнтра горада па прынцыпе Генеральнага плана Масквы 1935 г.[225].

Сітуацыя ў праектаванні горада змянілася пасля таго, як дзяржаўнае і партыйнае кіраўніцтва па стратэгічных меркаваннях прыняло ў 1938 г. рашэнне перанесці сталіцу БССР у Магілёў, а Мінск зрабіць толькі адміністрацыйным абласным цэнтрам[226]. З аднаго боку, Мінск больш не карыстаўся рэпутацыяй "сацыялістычнага фарпоста", з другога боку, у сілу змененага стану бюджэту неабходна было перагледзець Генеральны план. Яго распрацоўка была зноў даручана Ленінградскаму дзяржаўнаму інстытуту па праектаванні, здымцы і планіроўцы населеных месцаў, які мог арыентавацца на прадпісанні мінскіх устаноў па гарадскім планаванні і камунальнай гаспадарцы[227]. У прапанаваным у 1939 г. праекце тэрмін планавання быў абмежаваны дзесяццю гадамі. Да завяршэння трэцяй пяцігодкі ў 1942 г. кожны мінчанін павінен быў атрымаць жылую плошчу ў памеры 5 кв. м (пры насельніцтве 250 тыс. жыхароў), да канца тэрміну планавання ў 1949–1950 гг. – 6 кв. м на чалавека (пры насельніцтве 300–325 тыс. жыхароў)[228]. Пры гэтым, з аднаго боку, былі зменшаны праектныя памеры горада, з другога – зроблены абмежаванні планавых паказчыкаў у жыллёвым будаўніцтве. Следствам страты Мінскам статусу сталіцы павінен была стаць адмова ад пашырэння спектра прадукцыі. Замест пашырэння тэрыторый, займаных прамысловымі прадпрыемствамі, былі намечаны толькі рацыяналізацыя

[223] Тамсама.
[224] Тамсама, арк. 293.
[225] Пар.: Либерман Б. И. Город Минск. Минск, 1940. С. 46–48.
[226] Пар.: Кандрацьева Л. Праект пераносу сталіцы БССР у Магілёў // БГЧ. 1994. № 2 (3). С. 44–46.
[227] Пар.: пра асаблівасці новай рэдакцыі і размеркаванне праекта ЦДАНТД, ф. 6, воп. 2с, спр. 20, арк. 4, арк. 197–197адв.
[228] Тамсама, арк. 199–200адв.

і механізацыя заводаў, размешчаных у большасці сваёй на ўсходзе і паўднёвым усходзе горада[229]. У выніку, нягледзячы на тое, што з далучэннем у верасні 1939 г. усходніх раёнаў Польшчы да БССР Мінск стаў знаходзіцца не на перыферыі, а ў цэнтры краіны, Генеральны план прадугледжваў яго правінцыялізацыю.

У адпаведнасці з гэтым у развіцці гарадской структуры ў асноўным прасочвалася імкненне да захавання прапорцый (іл. 7). З аднаго боку, ідэя перамяшчэння паваротнага трыкутніка для лакаматываў з ускраіны горада была прызнана непрыдатнай з прычыны таго, што будаўніцтва новай чыгункі немагчыма было рэалізаваць на працягу прадугледжанага планам перыяду. З іншага боку, у разлік быў прыняты функцыянальны падзел цэнтральнай часткі горада. Тэрыторыя паміж галоўнай магістраллю – вуліцай Савецкай, якая пралягала з паўночнага ўсходу на паўднёвы захад, – і плошчай Свабоды (гістарычным цэнтрам, аблямаваным з захаду ракой Свіслач) павінна была служыць культурным цэнтрам. Роля палітычнага цэнтра адводзілася раёну ад Дома ўрада з плошчай для парадаў перад ім аж да вакзала з размешчанымі там грамадскімі будынкамі і скверамі, якія павінны былі выконваць функцыю злучальнага элемента[230]. Каб утварыць прастору, неабходную для будаўніцтва дзвюх прамых магістральных і трох кальцавых вуліц, планавалася знесці дзясятую частку жылля ў мураваных дамах і пятую частку – у драўляных[231].

У такім выглядзе Генеральны план быў яшчэ раз перапрацаваны Беларускім дзяржаўным праектным інстытутам (Белдзяржпраект) да снежня 1940 г. Можна адзначыць, што ў ім былі прадугаданы асноўныя элементы пасляваенных планаў. Пры планіроўцы структуры горада за аснову прынялі палажэнні Генеральнага плана Масквы 1935 г. без уліку гістарычных асаблівасцяў горада. Характэрна тое, што рэлікты нібыта “капіталістычнага” горада дарэвалюцыйнага часу, нягледзячы на ўсе нацыянальныя традыцыі, разглядаліся як чужы вобраз, які неабходна было цалкам перарабіць[232]. Аднак у сувязі з пачаткам вайны тыя планы не рэалізаваліся.

[229] Тамсама, арк. 201.
[230] Тамсама, арк. 65–71адв.
[231] Агульную жылую плошчу мураваных дамоў 425 500 кв. м планавалі зменшыць на 420 00 кв. м, а драўляных дамоў плошчай 557 600 кв. м – на 102 500 кв. м. Тамсама, арк. 101.
[232] ЦДАНТД, ф. 6, воп. 2с, спр. 21–22.

## б) Генеральны план 1946 г.

У выніку Другой сусветнай вайны межы БССР, як і межы савецкай сферы ўплыву, зрушыліся на захад. Пры гэтым ужо нішто не перашкаджала правядзенню індустрыялізацыі Беларусі і развіццю Мінска як сталіцы. У святле Генеральнага плана Масквы і татальных разбурэнняў, якія прынесла вайна, “сацыялістычны горад” мог быць пабудаваны фактычна з нуля[233]. Распрацоўка планаў пачалася непасрэдна пасля адступлення нямецкіх войскаў. У жніўні 1944 г. Савет Народных Камісараў СССР аддаў распараджэнне падначаленаму яму Упраўленню па справах архітэктуры скласці першапачатковы варыянт Генеральнага плана да 15 кастрычніка 1944 г. і даць канчатковы варыянт да 1 сакавіка 1945 г.[234]. Праўда, пры складанні супрацоўнікі Упраўлення па справах архітэктуры абмяжоўваліся жорсткімі рамкамі. Яны павінны былі прытрымлівацца рэкамендацый камісіі Камітэта па справах архітэктуры пры Савеце Народных Камісараў СССР у складзе М. Дж. Колі, А. Р. Мардвінава, А. В. Шчусева і У. М. Сямёнава, якая прыехала з Масквы. Маскоўскія архітэктары зыходзілі з таго, што Мінск павінен адпавядаць функцыі сталіцы саюзнай рэспублікі, і прадугледжвалі ў сувязі з гэтым прырост насельніцтва да паўмільёна жыхароў. У дачыненні да будаўніцтва гарадскога асяроддзя прыярытэт аддаваўся ўзвядзенню грамадскага і адміністрацыйнага цэнтра з манументальнымі будынкамі. Каб добра праглядаўся сілуэт цэнтра, пры вызначэнні вышыннасці меркавалася будаўніцтва трох-, чатырох-, максімум пяціпавярховых дамоў у цэнтры горада і двух-, трохпавярховых дамоў на ўскраіне. Увогуле архітэктура павінна была быць “высакаякаснай” і “мастацкай”, а таксама адлюстроўваць як класічную спадчыну, так і народнае мастацтва Беларусі. Акрамя таго, у дачыненні да структуры горада вялікае значэнне надавалася тром характарыстыкам: з аднаго боку, сістэма радыяльна-кальцавых магістраляў павінна была вызваліць горад ад скразнога руху; з другога – перасоўванне фабрык і прамысловых раёнаў на ўскраіны горада палепшыла б санітарна-гігіенічныя ўмовы. І нарэшце скверы і паркі, а таксама берагавыя ўмацаванні ракі Свіслач павінны былі служыць насельніцтву зонамі

[233] Пар.: Минск. Послевоенный опыт реконструкции и развития. Москва, 1966. С. 17–30.

[234] НАРБ, ф. 903, воп. 1, спр. 18, арк. 101–102.

адпачынку. Пры гэтым апісваліся толькі рацыянальныя крытэрыі для будаўнічай структуры горада. Як ні дзіўна, маскоўскія карыфеі не паруліліся пра змястоўныя кампаненты, мэтай якіх была б непасрэдная рэалізацыя канцэпцыі "сацыялістычнага горада". Калі за іх праектам і стаяла ідэя па аднаўленні горада, то яна заключалася ў тым, каб зрабіць акцэнт на абароне Радзімы і адпоры акупантам: "Беларуская сталіца Мінск, якая паднялася з попелу і руін, будзе сімвалам шчаслівага жыцця расквітнелага гераічнага народа"[235].

З улікам названых мэтаў маскоўскія архітэктары сумесна з двума мінскімі архітэктарамі І. Р. Лангбардам і Н. Я. Трахтэнбергам, а таксама пры садзейнічанні Б. Р. Рубаненкі, які часова працаваў у Беларусі, склалі першапачатковы праект Генеральнага плана, ухваленага Цэнтральным Камітэтам КП(б)Б 13 верасня 1944 г.[236]. Той факт, што партыя запатрабавала канчатковы варыянт Генеральнага плана да 1 сакавіка 1945 г., сведчыць: улады знаходзіліся ў палоне ілюзій, мяркуючы, што ў пасляваенным хаосе на падмурку горада, які ляжаў у руінах і ў попеле, за паўгода можна было спланаваць новую структуру. Не прымалася пад увагу тое, што тэхнічную дакументацыю неабходна складаць нанова, бо адпаведныя дакументы зніклі пад час акупацыі[237]. У выніку гэтага, з аднаго боку, са спасылкай на недахоп спецыялістаў і, з другога – на затрымку конкурсу па афармленні цэнтра, Упраўленне па справах архітэктуры вымушана было падоўжыць распрацоўку плана яшчэ на два месяцы[238]. Дэ-факта Генеральны план быў прапанаваны да разгляду на год пазней. Гэтая акалічнасць прывяла да таго, што будаўнічыя арганізацыі ў сваёй працы былі вымушаны або парушаць дырэктывы, або займацца будаўніцтвам на ўскраінах горада ці ўвогуле бяздзейнічаць. Насельніцтва Мінска не мела выразнáга ўяўлення пра мэты і ход планавання, яно вымушана было здавольвацца артыкулам кіраўніка аддзела планавання Упраўлення па справах архітэктуры Трахтэнберга, апублікаваным у газеце "Советская Бе-

[235] Тамсама, арк. 60–65, цытата, арк. 65. Пар.: таксама копія ў дадатку да тэкставай версіі распрацаванага Белдзяржпраектам Генеральнага плана 1946 г. ЦДАНТД, ф. 3, воп. 1, спр. 1, арк. 171–174адв. (цытата, арк. 174адв.).

[236] НАРБ, ф. 4, воп. 61, спр. 79, арк. 3.

[237] Пар.: распрацаваны ў Белдзяржпраекце ў 1951 г. каментар да Генеральнага плана. ЦДАНТД, ф. 3. воп. 4, спр. 528, арк. 7–10.

[238] НАРБ, ф. 903, воп. 1, спр. 28, арк. 11–12.

лоруссия". У першапачатковых варыянтах Генеральнага плана Мінска Трахтэнберг прытрымліваўся прадпісанняў экспертнай камісіі з Масквы, пра якія ён нават не згадаў. Тым не менш, ён звярнуў увагу на тое, што разам з аднаўленнем горада праграма прадугледжвала і ліквідацыю структурных недахопаў. Пра ўтопіі 1920-х гг. не магло быць і гаворкі, таму чытачы маглі меркаваць, што меўся на ўвазе кампактны горад, дзе кожная сям'я будзе мець асобную кватэру ў шматкватэрным доме[239].

Пра размах запланаванай перабудовы горада гаварыў кіраўнік Упраўлення па справах архітэктуры А. П. Воінаў у дакладзе ў Акадэміі навук 20 красавіка 1945 г. Абапіраючыся на лозунг, высунуты ў кастрычніку 1943 г. Старшынёй Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР М. І. Калініным у дачыненні да гарадскога будаўніцтва, Воінаў у завуаляванай форме выказаў пункт гледжання аб тым, што ў ходзе вайны "вялікая частка умоваў", "якія маглі б абмежаваць магчымасці планавання", адпала сама сабой. Хоць ён і зрабіў з гэтага прагматычную выснову, што пытанне аб архітэктурна-прасторавай арганізацыі можа быць вырашана "прынцыпова па-новаму", аднак у сваіх развагах зайшоў не настолькі далёка, каб быць прыхільнікам аднаўлення разбураных вайной гарадоў з нуля. Ён хутчэй звярнуў увагу на тое, што разам з сучаснымі патрабаваннямі на парадку дня стаіць таксама пытанне аб захаванні гістарычнай спадчыны. Архітэктару ў працэсе горадабудаўніцтва, па яго словах, належыць роля "прадаўжальніка", а не "пачынальніка"[240]. Сярод мясцовых архітэктараў адчувалася не толькі эйфарыя з нагоды планавання, але і пэўны скептыцызм у дачыненні да ўтапічных праектаў.

М. С. Асмалоўскі, маскоўскі архітэктар беларускага паходжання, які змяніў Воінава на пасадзе кіраўніка Упраўлення па справах архітэктуры, вымушаны быў супрацьстаяць настальгічным настроям у шэрагах мясцовай партыйнай эліты. Пасля таго як 29 верасня 1945 г. на паседжанні бюро Мінскага абкама партыі Асмалоўскі прапанаваў дадаць да слова "аднаўленне" паняцце "рэканструкцыя" ў загалоўным радку пастановы аб мерапрыемствах па аказанні дапамогі Мінску, якое павінна было быць накіравана ў Маскву, ён сустрэў супраціў з боку першага сакратара абкама В. І. Казлова. Фармальна прапанова Асмалоўскага мела

[239] Трахтенберг Н. О будущем нашей столицы // СБ. 21.10.1944. № 198. С. 2–3.

[240] НАРБ, ф. 903, воп. 1, спр. 32, арк. 3–22, цытата, арк. 5.

на мэце выкарыстоўваць тэрміналогію Генеральнага плана Масквы 1935 г. Фактычна гэтая прапанова прадугледжвала перабудову горада. Супраць такога тлумачэння праграмы па аднаўленні запярэчыў Казлоў: "Тут гаворка ідзе не пра дэканструкцыю. Наадварот, мы збудуем горад Мінск наноў"[241]. Такім чынам, захаванне "старога Мінска" нават і не планавалася[242].

Пры гэтым Асмалоўскаму давялося правесці больш шырокую вытлумачальную працу, чым меркавалася спачатку. 6 лістапада 1945 г. у газеце "Советская Белоруссия" ён прапанаваў сваю версію Генеральнага плана, у якой апісваў будучы вобраз горада, не закранаючы пры гэтым ідэалагічных і канцэптуальных пытанняў. Урэшце ён прыйшоў да высновы, што "рэканструкцыя сталіцы" – справа "ўсёй савецкай грамадскасці, усяго народа"[243]. Аднак запланаваная дыскусія не адбылася з дзвюх прычын: па-першае, невялікая колькасць архітэктараў і інжынераў была занадта перагружана працай; па-другое, у гэты перыяд не магло быць і гаворкі пра існаванне грамадскага меркавання, перад якім трэба апраўдвацца. Для разумення матываў, якімі кіраваліся планавальнікі горада, і фактараў, якія вызначалі іх дзеянні, цікавасць уяўляюць разважанні Асмалоўскага ў апублікаванай у 1952 г. кнізе аб перабудове Мінска[244]. "Галоўнай ідэяй" Генеральнага плана Асмалоўскі лічыў вызначэнне асноўнай функцыі горада – паляпшэнне ўмоў жыцця жыхароў як "галоўная задача" архітэктараў. Пры гэтым ён спасылаўся, з аднаго боку, на рэпрэзентатыўную архітэктуру ў агульным гарадскім ансамблі і, з другога боку, на рашэнне жыллёвага пытання ў рамках комплекснай забудовы[245].

241 ДАМВ, ф. 1, воп. 2, спр. 100, арк. 30–34, цытата, арк. 30.

242 Старшыня Савета Народных Камісараў БССР Панцеляймон Панамарэнка агучыў на адной з нарад, прысвечанай аднаўленню гарадоў (28 траўня 1945 г.), і на паседжанні па Генеральным плане г. Мінска 10 снежня 1945 г. два палажэнні: "індустрыялізацыя горада" і "нармалізацыя ўмоў жыцця". Освобождённая Беларусь. Документы и материалы. Кн. 1. Сентябрь 1943 – декабрь 1944. Кн. 2. Январь – декабрь 1945 / сост. В. И. Адамушко и др. Минск, 2004–2005. Кн. 2. №. 47. С. 149–157. №. 104. С. 399–405.

243 Осмоловский М. Будущее Минска (К проекту Генерального плана восстановления и реконструкции Минска) // СБ. 6.11.1945. № 213. С. 3.

244 Осмоловский М. С. Минск. Практика советского градостроительства. Москва, 1952. Пар.: ён жа. Минск: Архитектура городов СССР. Москва, 1950. Абедзве працы грунтуюцца на кандыдацкай дысертацыі Асмалоўскага 1950 г.

245 Осмоловский М. Минск. Практика советского градостроительства… С. 54.

Асмалоўскі абапіраўся на палажэнні пяцігадовага плана, дзе Мінску ў рамках праграмы па аднаўленні БССР адводзілася роля прамысловага, адміністрацыйнага і культурнага цэнтра[246]. Апрача таго, ён выкарыстаў два выказванні Сталіна, паводле якіх адметная рыса "сацыялістычнага горада" – адсутнасць трушчоб, а мэта праграмы па аднаўленні – стварэнне нармальных умоў жыцця[247]. Прытрымліваючыся меркавання Сталіна, Асмалоўскі супрацьпастаўляў канцэпцыю "капіталістычнага горада" планам аднаўлення Мінска. Пры гэтым ён спасылаўся на нарыс Фрыдрыха Энгельса па жыллёвым пытанні і нават зайшоў настолькі далёка, што правёў паралель паміж "малохам"-Лонданам і дарэвалюцыйным Мінскам[248]. У сувязі з гэтым у якасці недахопаў "старога" Мінска Асмалоўскі пазначыў адсутнасць цэнтра, праспектаў і зялёных насаджэнняў, а таксама старую архітэктуру і архаічныя элементы, а значыць – хаатычную забудову і адсутнасць неабходных санітарных умоў[249]. Ён прапанаваў імкнуцца да пераадолення супярэчнасцяў паміж горадам і вёскай, а таксама паміж цэнтрам і перыферыяй[250]. Абапіраючыся на Генеральны план Масквы 1935 г., Асмалоўскі перанёс на Мінск адпаведную ідэалагічным прадпісанням партыі ўтопію пра "сапраўды сацыялістычны горад"[251]. Выказванні Асмалоўскага ўяўляюць пэўную каштоўнасць таму, што ў якасці кіраўніка Упраўлення па справах архітэктуры ён узначальваў распрацоўку Генеральнага плана і праектаванне цэнтра Мінска.

Пры складанні картаграфіі Генеральнага плана, як у дачыненні да закладкі вуліц, так і ў дачыненні да выкарыстання тэ-

[246] План пяцігодкі (1946–1950), прыняты Вярхоўным Саветам СССР 18 сакавіка 1946 г., прадугледжваў для БССР пашырэнне машынабудаўнічай прамысловасці і будаўніцтва аўтамабільнай прамысловасці. Закон о пятилетнем плане восстановления и развития народного хозяйства СССР на 1946–1950 гг. Решения партии и правительства по хозяйственным вопросам. Москва, 1968. Т. 3. 1941–1952 годы. С. 246–319, тут с. 297–299. Пар.: асобныя ўзнаўленчыя праекты, у прыватнасці, прыняты Вярхоўным Саветам 11 верасня 1946 г. пяцігадовы план. О пятилетнем плане восстановления и развития народного хозяйства Белорусской ССР на 1946–1950 гг. // Сборник законов Белорусской ССР и указов Президиума Верховного Совета Белорусской ССР. 1938–1955 гг. Минск, 1956. С. 236–259.

[247] Пар.: ч. II. 1.

[248] Осмоловский М. Минск. Практика советского градостроительства… С. 21–22.

[249] Тамсама. С. 32–33, 44.

[250] Тамсама. С. 30–31, 34.

[251] Тамсама. С. 79.

рыторый ад пачатку не былі прыняты пад увагу ні структуры, якія склаліся гістарычна, ні традыцыйная будаўнічая субстанцыя. У адрозненне ад праектаў 1930-х гг. адказнасць узялі на сябе беларускія ўстановы. Спачатку ў архітэктурных майстэрнях Беларускага дзяржаўнага праектнага інстытута (Белдзяржпраект) пад кіраўніцтвам І. Р. Лангбарда і Упраўлення па справах архітэктуры пад кіраўніцтвам Л. І. Баталава былі распрацаваны два варыянты плана. Пасля пад кіраўніцтвам Трахтэнберга быў створаны канчатковы план (іл. 8)[252].

У каментары да Генеральнага плана Мінску прыпісвалася функцыя адміністрацыйнага, навуковага, культурнага і прамысловага цэнтра. У рамках кампаніі па пасляваенным аднаўленні Беларусі гэта азначала не што іншае, як канцэнтрацыю ўсіх рэсурсаў у сталіцы. У гэтым сэнсе асноўнай задачай Генеральнага плана было хутка падняць Мінск да ўзроўню горада з паказальнай архітэктурай і інфраструктурай. Пры гэтым асаблівая ўвага аддавалася ўзвядзенню рэпрэзентатыўнага цэнтра. Разбурэнне горада разглядалася як шанец пераадолець дэфекты, што ўзніклі гістарычна (вузкія і крывыя вуліцы, бядотны стан драўляных дамоў), шляхам закладкі новай адкрытай забудовы, праспектаў і плошчаў з зялёнымі насаджэннямі. Каб забяспечыць насельніцтву "найлепшыя ўмовы ў галіне жылля, вытворчасці, культуры, побыту і сацыяльнай гігіены", былі прадугледжаны, з аднаго боку, размежаванне такіх сфер, як жыллё і праца, а з другога – закладка радыяльна-кальцавой структуры вуліц, што ствarала б умовы для бесперапыннага вулічнага руху. Важнымі структурнымі элементамі павінны былі стаць пашыраная да 48-метровага праспекта вуліца Савецкая і апраўленая берагавымі ўмацаваннямі і зялёнымі насаджэннямі рака Свіслач. Акрамя гэтага, планавалася пашырэнне горада на паўночны і паўднёвы ўсход. Да 1950 г. колькасць насельніцтва павінна было скласці 300 тыс. жыхароў, да 1960 г. – 450 тыс. Для забеспячэння насельніцтва жылой плошчай да 1950 г., з аднаго боку, меркавалася рэстаўрацыя дамоў агульнай плошчай 120 тыс. кв. м, з другога боку, узвядзенне новых дамоў агульнай плошчай 650 тыс. кв. м. Праект прадугледжваў памяншэнне канцэнтрацыі насельніцтва ад цэнтра да перыферыі: 50% жыхароў павінны былі жыць у трох-

[252] ЦДАНТД, ф. 3, воп. 1, спр. 1: Генеральный план восстановления и развития города Минска. Минск, 1946 (тут арк. 4). Пар. таксама арыгінальную версію карты, якую склаў Трахтэнберг: ЦДАНТД, ф. 3, воп. 4, спр. 527.

і чатырохпавярховых дамах, 30% – у двухпавярховых шматкватэрных дамах і 20% – у аднапавярховых прыватных дамах. Памер зямельнага ўчастка дома для адной сям'і павінен быў складаць 600–800 кв. м, а двухкватэрнага жылога дома – 500–600 кв. м на сям'ю[253]. Пры гэтым усе без выключэння планы мелі сваёй мэтай закладку кампактнага горада з прывабным манументальным цэнтрам і размешчанымі побач з аднолькавымі жылымі раёнамі асобнымі прамысловымі раёнамі.

Пасля таго як у лютым 1946 г. Генеральны план быў пададзены на разгляд Выканаўчага камітэта Мінскага гарадскога Савета, нарэшце зайшла размова пра прасторавае афармленне горада. Ідэалагічныя меркаванні не прымаліся пад увагу. У якасці асноўнага пытання на парадку дня стаяла значэнне “цэнтральнай плошчы”, г. зн. месца размяшчэння сэрца горада. Прынцыповых рознагалоссяў не ўзнікала толькі ў тым, што гістарычны цэнтр – плошча Свабоды – у гэтым сэнсе больш не прымаўся пад увагу. Альтэрнатыву склалі два праекты: Асмалоўскага, які бачыў цэнтр горада на плошчы, размешчанай на ўзроўні будынка Цэнтральнага Камітэта партыі на галоўным праспекце і акружанай манументальнымі будынкамі, і Лангбарда, які спрабаваў злучыць у адзіную кампазіцыйную частку Дом урада, які ляжаў на заходнім канчатковым пункце праспекта, і вакзал (іл. 9)[254]. Каб неяк канкрэтызаваць дыскусію, Трахтэнберг звярнуў увагу на тое, што пытанне аб дамінаванні адной цэнтральнай плошчы наогул не актуальнае, бо ў праекце галоўнага праспекта ўжо была прадугледжана закладка шэрагу плошчаў[255]. Кіраўнік Упраўлення па аднаўленні Мінска П. І. Катаводаў падтрымаў праект Лангбарда і выказаў асцярогу, што “цэнтральная плошча” з запланаванай даўжынёй 130 м можа апынуцца занадта маштабнай для горада з паўмільённым насельніцтвам. Як меркавалася, у Доме ўрада будуць працаваць тысячы людзей, а ў суседнім універсітэцкім квартале будзе жыць вялікая колькасць студэнтаў, таму плошча, па ўяўленнях Лангбарда, павінна мець шырокую зялёную зону, яна задумана як культурны форум[256]. Асмалоўскі спрабаваў абараніць сваю канцэпцыю катэгарычнай заявай аб тым, што “цэнтральная плошча” ў цэнтры горада “неабходная” для парадаў і сходаў, і адначасова папярэджваў, што

[253] ЦДАНТД, ф. 3, воп. 1, спр. 1, асабліва арк. 6–10, цытата, арк. 6.
[254] ДАМВ, ф. 6, воп. 4, спр. 87.
[255] Тамсама, арк. 11.
[256] Тамсама, арк. 40, 41.

ўтрыманне прадугледжанага праектам Лангбарда парку можа абысціся гораду вельмі дорага[257].

Заключная нарада па пытанні Генеральнага плана адбылася 10–11 траўня 1946 г. у прысутнасці мінскіх мастакоў і архітэктараў ва Упраўленні па справах архітэктуры, якое падпарадкоўвалася Савету Народных Камісараў БССР. Пры абмеркаванні былі ў асноўным закрануты тэмы аб функцыянальнасці і практычнасці архітэктурных праектаў. З прычыны таго, што ў праекце структуры горада гаворка ішла хутчэй пра копіі Генеральнага плана савецкай сталіцы, створанага маскоўскімі архітэктарамі, не чакалася сур'ёзных заўваг[258]. Тым не менш, скульптар А. А. Бембель выказаў прынцыповыя пярэчанні. Яго крытыка закранала два аспекты. Ён знаходзіў недахопы ў тым, што ў дачыненні да памераў гарадскіх збудаванняў былі ўзятыя за аснову перабольшаныя маштабы: разнастайнасць і памер запланаваных плошчаў падыходзілі б для 5–6 млн. чалавек, а горад з яго рэальным насельніцтвам мог здавацца пустынным. Бембель таксама звярнуў увагу на тое, што ў адрозненне ад іншых гарадоў галоўны праспект не злучаў паміж сабой два канкрэтныя пункты. Паводле яго слоў, ён хутчэй выглядаў "як частка галоўнай вуліцы або шашы, якая праходзіць па якім-небудзь малазначным пасёлку". Такім чынам стваралася ўражанне, што беларуская сталіца знаходзіцца дзесьці на ўзбочыне магістралі Масква – Брэст. Паводле яго слоў, праспекту не хапала пачатку і канца: "У праспекта няма свайго аблічча, акрамя таго, што ён, як вось, разразае ўвесь цэнтр і ўвесь план горада Мінска". У якасці "брамы горада" магла б служыць, напрыклад, Прывакзальная плошча. Аднак з прычыны свайго перыферыйнага размяшчэння яна не адпавядала патрабаванням сталічнага горада[259]. Нягледзячы на тое, што выказаныя Бембелем аргументы не былі пазбаўлены здаровага сэнсу, яго крытыка не атрымала ніякай рэакцыі. Планавальнікі карысталіся той свабодай дзеянняў, якую дапускалі прадпісанні Масквы, і былі ўпэўнены ў сваёй праваце. У далейшым Генеральны план быў перададзены Савету Народных Камісараў БССР[260]. Яго прыняцце адбылося ў чэрвені, а ў ліпені ён быў ухвалены Камітэтам па справах архітэктуры пры Савеце Міністраў СССР[261].

[257] Тамсама, арк. 47, цытата, арк. 49.
[258] НАРБ, ф. 903, воп. 1, спр. 60, арк. 59–92.
[259] Тамсама, арк. 76–79.
[260] Тамсама, арк. 56–58.
[261] Пар.: каментар да Генеральнага плана, выкананы ў Белдзяржпраекце ў 1951 г. ЦДАНТД, ф. 3, воп. 4, спр. 528, арк. 10.

## в) Папраўкі і новыя рэдакцыі Генеральнага плана

Пасля заканчэння першай пяцігодкі, калі меркаваная колькасць насельніцтва яшчэ не дасягнула 300 тыс. чалавек, на падставе мерапрыемстваў у мэтах эканоміі, якія з сярэдзіны 1950-х гг. у галіне будаўніцтва вызначаў маскоўскі ўрад, былі ўнесены папраўкі ў Генеральны план горада Мінска. 28 кастрычніка 1950 г. міністр будаўніцтва СССР Г. Папоў прапанаваў Старшыні Савета Міністраў БССР А. Я. Кляшчову на разгляд наступныя моманты: абгрунтаванасць павелічэння будаўнічай плошчы з 4600 да 9300 га, якое прывяло да падаражання інфраструктуры, а таксама неабходнасць адмяніць абмежаванні вышыні будынкаў на пяць-шэсць паверхаў і скарачэнне колькасці вышынных дамоў на 50% для размяшчэння большай колькасці людзей на наяўнай плошчы[262]. Такім чынам, зыходзячы з эканамічных меркаванняў, афіцыйнай канцэпцыі “сацыялістычны горад”, якая мела на мэце разгрупаванне пабудоў і дэцэнтралізацыю канцэнтрацыі насельніцтва, быў пакладзены канец, і на парадку дня зноў паўстаўла ўшчыльненне горада.

Пазней, восенню 1950 г., Кляшчоў даручыў Старшыні Мінскага гарадскога Савета К. Н. Длугашэўскому, начальніку Упраўлення па справах архітэктуры М. С. Асмалоўскаму і міністру камунальнай гаспадаркі С. А. Варно перапрацаваць праект горада Мінска да 1 красавіка 1951 г.[263]. У адказ на гэта ў Беларускім дзяржаўным праектным інстытуце (Белдзяржпраект) была складзена падрабязная тлумачальная запіска[264]. Прапанаваны Выканаўчым камітэтам Мінскага гарадскога Савета і Галоўным упраўленнем па справах архітэктуры БССР праект па аднаўленні і развіцці Мінска быў ухвалены Саветам Міністраў БССР толькі 16 студзеня 1952 г. Ён адпавядаў жаданням Масквы: да 1955 г. колькасць насельніцтва павінна была ўзрасці да 400 тыс. жыхароў, а ў цэлым горад разлічваўся на паўмільёна насельніцтва. Насуперак пастановам 1946 г., будаўнічую плошчу павялічвалі не з 4600 да 9300 га, а толькі да 6200 га; тэрыто-

[262] Пар.: дадатак да Генеральнага плана, складзенага Белдзяржпраектам. ЦДАНТД, ф. 3, воп. 4, спр. 529, арк. 2–3. Міністр грамадзянскага і гарадскога будаўніцтва СССР 12 жніўня 1950 г. у лісце да Савета Міністраў СССР выказаўся супраць праекта, прапанаванага Саветам Міністраў БССР. НАРБ, ф. 7. воп. 4, спр. 2080, арк. 292–293.

[263] Тамсама, арк. 297.

[264] ЦДАНТД, ф. 3, воп. 4, спр. 528.

рыя горада ў цэлым пашыралася не да 13 000 га, а ўсяго толькі да 8000 га. 70% кватэр павінны былі знаходзіцца ў чатырох- і пяціпавярховых дамах у цэнтры, 20% – у двух- і трохпавярховых дамах у прылеглых да цэнтра раёнах горада і 10% – у аднапавярховых дамах на ўскраінах горада, гэта значыць у прыватных дамах. У цэнтры горада планавалася нават збудаваць 12–16-павярховыя жылыя дамы[265]. У аснове плана ляжала ідэя кампактнага горада з канцэнтрацыяй насельніцтва ў вышынных шматкватэрных дамах. Гораду "сацыялістычнага рэалізму", які знаходзіў сваё адлюстраванне ў рэпрэзентатыўнай архітэктуры цэнтра, не надавалася больш ніякага значэння.

Наступная новая рэдакцыя Генеральнага плана горада Мінска стала неабходнай пасля дзвюх падзей: 23 жніўня 1955 г. Цэнтральны Камітэт КПСС і Савет Міністраў СССР аддалі распараджэнне аб мерапрыемствах па індустрыялізацыі будаўнічай галіны і ў лютым 1956 г. на XX з'ездзе КПСС было прынята рашэнне аб абмежаванні росту вялікіх гарадоў. Паказальны той факт, што 24 жніўня 1955 г. пытанне аб праектаванні горада стала галіной кампетэнцыі рэспублік[266]. Тым самым для рэалізацыі планаў, адпаведных савецкім нормам і прававым прадпісанням, беларускім установам давалася свабода дзеянняў без неабходнасці атрымліваць дазвол у Масквы. Улічваючы дамінантную пазіцыю, якую беларуская сталіца займала ў дачыненні да іншых гарадоў БССР, пытанне далейшага развіцця Мінска было асабліва важнае. Невыпадкова ўжо ў 1954 г. у Дзяржаўнай планавай камісіі БССР (Дзяржплан) гаворка ішла пра неабходнасць паменшыць канцэнтрацыю прамысловай вытворчасці рэспублікі ў Мінску[267]. Аднак партыйнае і дзяржаўнае кіраўніцтва БССР

[265] НАРБ, ф. 7, воп. 4, спр. 116, арк. 102–135; ф. 781, воп. 2, спр. 67, арк. 122–129.

[266] Пар.: ч. II. 1.

[267] У сваім лісце Старшыні Савета Міністраў СССР К. Т. Мазураву і сакратару ЦК КПБ М. С. Патолічаву старшыня Планавай камісіі (Дзяржплан) С. М. Малінін звяртаў увагу на тое, што ў пасляваенны час у Мінску аднабакова падтрымлівалася прамысловая вытворчасць, бо на аднаўленне выдзяляліся значныя сродкі. У выніку доля Мінска ў ВУП вырасла з 16,6% у 1940 г. да 18,9% у 1950 г. і да 26,3% у 1954 г. Ён таксама зазначаў, што далейшыя імпульсы чакаюцца ад новых прамысловых аб'ектаў, якія толькі пачалі вытворчасць, або тых, што толькі будуюцца. Далей ён рабіў выснову, што неабходна ў будучыні забараніць будаўніцтва буйных прамысловых аб'ектаў і асабліва абаронных прадпрыемстваў. Відавочна, што гэты ліст не быў разгледжа-

пачало працу над планам толькі пасля прад'яўлення Масквой адпаведных патрабаванняў[268]. Спачатку было незразумела, ці існуе наогул патрэба займацца гэтым. На сумесным паседжанні прадстаўнікоў Дзяржплана і гарадской камісіі па будаўніцтве і архітэктуры ў Мінску 23 чэрвеня 1956 г. з мэтай удакладнення Генеральнага плана беларускай сталіцы старшыня Планавай камісіі С. М. Малінін выказаў пункт гледжання аб тым, што Мінск яшчэ не належыць да катэгорыі "буйных гарадоў", рост якіх хацеў абмежаваць Хрушчоў[269]. На самай справе класіфікацыя, якая вызначыла колькасць жыхароў мінімум у 250 тыс. чалавек, была прынята Саветам Міністраў СССР толькі ў 1958 г.[270]. У дадзеным выпадку Малінін разумеў задачу маскоўскіх дырэктыў як вызначэнне перспектыў росту, а не стрымліванне росту насельніцтва Мінска на тагачасным узроўні[271]. У гэтай сувязі Н. Я. Трахтэнберг узяў на сябе смеласць зрабіць прагноз, згодна з якім колькасць занятых у горадаўтваральнай сферы камунальнай гаспадаркі (меліся на ўвазе прамысловыя і транспартныя прадпрыемствы, якія абслугоўваюць рынкі па-за горадам ці пастаўляюць тавары за межы горада, а таксама вышэйшыя навучальныя ўстановы, якія прымалі іншагародніх студэнтаў) да 1965 г. павялічыцца да 260–270 тыс., нягледзячы на тое, што Генеральны план прадугледжваў павелічэнне толькі на 164 тыс. Чаканая колькасць жыхароў у 1965 г. павінна была, па яго словах, скласці 620–650 тыс. чалавек[272]. На заканчэнне дыскусіі высветлілася, што планавальнікі горада гатовыя да адмовы ад усялякай гігантаманіі, але не гатовыя да абмежавання росту насельніцтва. У адпаведнасці з гэтым Малінін адмовіўся ад пастаўленай мэты аб

ны становіча. 22 лістапада 1957 г. Малінін перадаў яго далей аднаму з супрацоўнікаў з пазнакай прыняць да ўвагі пры планаванні наступнай пяцігодкі. НАРБ, ф. 31, воп. 7, спр. 1450, арк. 1–6. У 1954 г. Малінін напісаў рэзалюцыю для падпісання ў Савеце Міністраў БССР і ў ЦК КПБ, у якой, пачынаючы з 1955 г., забаранялася стварэнне новых буйных прамысловых прадпрыемстваў саюзнага і рэспубліканскага значэння ў Мінску. Тамсама, арк. 7–8.

[268] Пар.: ч. II. 1.

[269] НАРБ, ф. 31, воп. 6, спр. 759, арк. 1.

[270] Пар.: Правила и нормы планировки и застройки городов. Утверждены Государственным комитетом Совета Министров СССР по делам строительства по поручению Совета Министров СССР 1 декабря 1958 г. Москва, 1959. С. 4.

[271] НАРБ, ф. 31, воп. 6, спр. 759, арк. 29.

[272] Тамсама, арк. 7, 9.

мільённым горадзе і абвясціў у якасці кантрольнай лічбы на будучыню 700–750 тыс. чалавек[273]. Для рэгулявання росту насельніцтва Мінска на паседжанні ўрада было рэкамендавана праводзіць працу па рацыяналізацыі вытворчасці, адмовіцца ад новых прамысловых праектаў, пабудаваць гарады-спадарожнікі і адкрыць вышэйшыя сельскагаспадарчыя навучальныя ўстановы на перыферыі[274].

Пераглядам Генеральнага плана сталі займацца толькі пасля прыняцця пастаноў Цэнтральнага Камітэта КПСС і Савета Міністраў СССР ад 3 ліпеня 1957 г.[275] і Цэнтральнага Камітэта КПБ і Савета Міністраў БССР ад 20 лістапада 1957 г. аб інтэнсіфікацыі жыллёвага будаўніцтва[276]. Гаворка ішла пра перыяд часу, калі насельніцтва Мінска дасягнула адзнакі ў паўмільёна жыхароў і горад уступіў у фазу бурнага росту[277]. Зыходзячы з гэтага, у 1958–1959 гг. Генеральны план быў дапрацаваны ў тры этапы: спачатку яшчэ раз зацвердзілі распрацаванае ў пасляваенны час горадабудаўнічае аблічча, зафіксаванае Упраўленнем па справах архітэктуры Мінскага гарадскога Савета ў "Асновах Генеральнага плана горада Мінска". Згодна з гэтым дакументам, Мінск выконваў функцыю сталіцы як адміністрацыйны, прамысловы, навуковы і культурны цэнтр рэспублікі. Каб далей забяспечваць годны ўзровень у сферах жылля, вытворчасці, побыту і гігіены ва ўмовах дынамічнага росту горада, было прадугледжана пабудаваць новыя жылыя раёны, плошчы і вуліцы, а таксама пашырыць наяўныя зоны зялёных насаджэнняў і праспекты, палепшыць працу грамадскага транспарту[278]. Зыходзячы з гэтага, ва ўдакладненым варыянце Генеральнага плана ад 1946 г., які ўзнік у працэсе сумеснай работы Упраўлення па справах архітэктуры пры Савеце Міністраў і Беларускага дзяржаўнага праектнага інстытута (Белдзяржпраект), з'явіліся два новыя моманты. Па-першае, у аснову быў пакладзены прынцып "функцыянальнага горада": максімальная набліжанасць месца пражывання да месца працы, а таксама эканамічна апраўданыя рашэнні пры

[273] Тамсама, арк. 22.
[274] Тамсама, арк. 57–60.
[275] Пар.: ч. II. 1.
[276] Пар.: Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК. Т. 5. 1956–1965. Минск, 1986. С. 86–98.
[277] Пар.: Парсаданов Г. А., Кудинов М. Ф. О новом Генеральном плане города Минска // БГПИ СООТИ. 1958. № 1. С. 16–19.
[278] ДАМВ, ф. 69, воп. 1, спр. 1333, арк. 1–15.

рэалізацыі будаўнічых праектаў і пры стварэнні розных установаў інфраструктуры[279]. Па-другое, улічваючы паселішчы на ўскраінах горада, за ўзор узялі асноўныя рысы "падзеленага і разгрупаванага горада" (gegliederte und aufgelockerte Stadt), які ўвайшоў у моду ў Германіі, што азначаў "пераход ад кампактнай да дыферэнцаванай сістэмы паселішча"[280]. У якасці параметраў, якія мелі вырашальнае значэнне для складання плана горада, называліся наступныя: а) выкарыстанне натуральных умоў тэрыторыі як "гарантыя найлепшых жыццёвых умоў і як перадумова для таго, каб яскрава выявіць мастацкі вобраз горада"; б) занальны падзел паводле "прынцыпу функцыянальнага выкарыстання"; в) рацыянальная сістэма сувязі праспектаў і вуліц; г) ступеніста-іерархічная сістэма цэнтраў забеспячэння[281].

Нарэшце 26 траўня 1959 г. Савет Міністраў БССР зацвердзіў "Праект планіроўкі і забудовы Мінска", у якім гаварылася пра кароткатэрміновую (1965) і доўгатэрміновую (1985) фазы развіцця. Паколькі насельніцтва павінна было вырасці ў 1965 г. да 650 тыс. чалавек, а ў 1980 г. – да 800 тыс., плошча горада, якую меркавалася забудаваць, павінна павялічыцца спачатку да 10 200 га, а потым – да 13 700 га. У выніку ў цэнтры горада павінны былі пражываць 740–750 тыс. чалавек, а 50–60 тыс. чалавек – на ўскраінах горада. Індывідуальная жылая плошча павінна была скласці ў 1965 г. 8 кв. м, а ў 1980 г. – 12 кв. м. 75% насельніцтва павінны былі жыць у чатырох- і пяціпавярховых шматкватэрных дамах, 11% – у двух- і трохпавярховых і 14% – у прыватных дамах. Такім чынам, у дачыненні да плошчы горада ў аснову ляглі палажэнні Генеральнага плана 1946 г. аб велічыні горада, часова абмежаванай у 1952 г. Пры гэтым вонкавым абмежаваннем горада павінна была стаць кальцавая дарога. Адносна жылых раёнаў канцэпцыя вышынных дамоў, папулярная ў 1952 г., была заменена ідэяй мікрараёна, забудаванага пяціпавярховымі шматкватэрнымі дамамі[282].

Ва ўмовах бурнага гарадскога росту ў 1950–60-я гг. планавальнікі горада не змаглі хоць бы прыблізна спрагназа-

[279] ЦДАНТД, ф. 3, воп. 4, спр. 548: Главное управление по делам архитектуры СМ БССР. Белорусский государственный проектный институт "Белгоспроект". Проект планировки города Минска. Пояснительная записка. Минск, 1958. Кн. 1, тут арк. 103.
[280] ЦДАНТД, ф. 3, воп. 4, спр. 548, арк. 104.
[281] Тамсама, арк. 106.
[282] НАРБ, ф. 7, воп. 4, спр. 880, арк. 340–356.

ваць дынаміку росту насельніцтва Мінска. У 1965 г. яно склала 721 500 чалавек, а не 650 тыс., як прагназавалася ў 1958 г. (гл. дадатак, табліца VI). Тэрміновая неабходнасць новай рэдакцыі Генеральнага плана стала відавочнай ужо ў пачатку 1960-х гг. На гэты раз задачу ўсклалі на заснаваны ў 1959 г. Праектны інстытут Мінскага гарадскога Савета (Мінскпраект). Ухвалены ў 1965 г. Генеральны план прадугледжваў рост насельніцтва ў 1980 г. да аднаго мільёна чалавек. У якасці новага структурнага элемента ў плане з'явіўся жылы раён, які складаўся са шматлікіх мікрараёнаў. Норму вышыні жылых дамоў паднялі цяпер да 9–16 паверхаў. Пры гэтым гарадскую тэрыторыю падзялілі на шэсць планіровачных раёнаў. Такім чынам, горад набыў поліцэнтрычную структуру ў форме зоркі з адным цэнтрам і шасцю субцэнтрамі[283].

Пасля таго як 25 студзеня 1972 г. Мінск атрымаў статус горада з мільённым насельніцтвам[284], у 1974 г., не ў апошнюю чаргу ў сувязі з запланаваным будаўніцтвам метро, зноў спатрэбіліся змены ў Генеральным плане. Да канцэптуальна новай рэдакцыі справа дайшла толькі ў пачатку 1980-х гг. Генеральны план 1982 г. зыходзіў з павелічэння колькасці насельніцтва да 1,7 мільёна ў 1980 г. і да 2 мільёнаў у 2000 г. Для забеспячэння жыллём такой вялікай колькасці насельніцтва тэрыторыю горада меркавалася павялічыць з 19 200 да 26 000 га. Адначасова планавалася вырашыць жыллёвае пытанне: дзякуючы будаўніцтву новых жылых раёнаў агульная жылая плошча павінна была ў сярэднім узрасці з 13,3 кв. м да 18 кв. м на чалавека. Такім чынам, Генеральны план 1982 г. стварыў перадумовы толькі для дыферэнцыяцыі іерархічна падзеленай сістэмы забеспячэння на планіровачныя зоны для 600–800 тыс. чалавек, на планіровачныя раёны – для 100–300 тыс. чалавек і на жылыя раёны – для 30–80 тыс. чалавек[285]. Паколькі ніхто не мог прадбачыць маштабы эканамічнай рэцэсіі, выкліканыя перабудовай, планавальнікі зыходзілі на гэты раз з рэалістычных разлікаў: у 1990 г. Мінск перасягнуў рысу якраз у 1,6 млн чалавек (гл. дадатак, табліца VI).

[283] Пар.: Заславский Е. Л. Градостроительные проблемы современного крупного города (на примере развития Минска). Минск, 1975. С. 2–13.

[284] В Минске миллион жителей // СБ. 26.1.1972. № 21. С. 1.

[285] Вавакин Л. В. Новый Генеральный план Минска: вопросы реализации // САБ. 1982. № 4. С. 12–15; Градостроительство Белоруссии / под общ. ред. А. В. Сычёвой. Минск, 1988. С. 61–64.

## 2 Аблічча горада

### а) Дыскусіі пра архітэктуру “сацыялістычнага рэалізму”

У той час як у Генеральным плане былі вызначаны дакладныя палажэнні па прасторавай структуры і сацыяльна-эканамічным развіцці беларускай сталіцы, пытанне аб архітэктурным абліччы і індывідуальных умовах жыцця было спачатку аддадзена фантазіі архітэктараў. Зыходным пунктам стаў мемарандум, пададзены кіраўніком беларускага Упраўлення па справах архітэктуры А. П. Воінавым у кастрычніку 1944 г. Старшыні Савета Народных Камісараў БССР П. К. Панамарэнку. Спасылаючыся на дыскусіі 1930-х гг., Воінаў выказаўся за рашэнне ў духу “сацыялістычнага рэалізму”: “Беларуская архітэктура павінна быць нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па змесце”. Але як у дачыненні да будаўнічага стылю, так і ў дачыненні да ладу жыцця ён не змог даць дакладнага вызначэння гэтага паняцця[286]. Таму архітэктары, якія працавалі ў БССР, пры праектаванні будынкаў мелі свабоду дзеянняў, што зводзілася да арыентавання на маскоўскія ўзоры.

Да фундаментальнай рэфлексіі асноўных ідэй архітэктары звярнуліся толькі ў жніўні – верасні 1946 г., калі сакратар ЦК КПСС па культурна-палітычных пытаннях А. А. Жданаў абвясціў кампанію па барацьбе з “фармалізмам” і “касмапалітызмам” у галіне літаратуры, тэатра і кіно[287]. У выніку гэтага Прэзідыум Саюза архітэктараў СССР не ўпусціў магчымасці скарыстацца метадам крытыкі і самакрытыкі ў сталінскім духу: у рэзалюцыі ад 23 кастрычніка 1946 г. яго члены былі абвінавачаны ў адарванасці ад рэальнага жыцця. З аднаго боку, была адзначана перабольшаная “пагоня за прыгажосцю”. За гэтай крытычнай заўвагай прасочваецца думка пра тое, што класіцызм уяўляе сабой не ўзор для сляпога пераймання, а толькі форму выражэння, якая павінна быць прыведзена ў адпаведнасць з сучаснасцю. З іншага боку, “сталінскі клопат пра чалавека” няправільна тлумачыўся. З гэтым фактам быў звязаны заклік пераключыць увагу з фасада на інтэр’ер. Такім чынам, Прэзідыум звярнуў увагу на тое, што горад неабходна разглядаць як цэласны твор мастацтва, адметная рыса

[286] НАРБ, ф. 903, воп. 1, спр. 1, арк. 151.
[287] Пар.: ч. II. 1.

якога – сувязь кожнага асобнага архітэктурнага аб'екта з агульным планам забудовы[288]. Але Жданаў аж да пазбаўлення ўлады і смерці пры нявысветленых абставінах у 1948 г. так і не рашыўся на карэнныя змены ў галіне архітэктуры, таму рэзалюцыя не мела належнага эфекту. Менавіта з гэтай прычыны адмове ад "сацыялістычнага рэалізму", абвешчанай Хрушчовым на некалькі гадоў пазней у рамках кампаніі па барацьбе з дэкаратыўнай празмернасцю ў будаўнічай справе, была адведзена вырашальная роля.

З прычыны таго, што пачатак так званай ждануаўшчыны па часе супаў з прыняццем Генеральнага плана Мінска, архітэктурныя дыскусіі ў Беларусі адбываліся з асаблівай вастрынёй. Калі непасрэдна пасляваенная сітуацыя адрознівалася тым, што па пытанні стылю ў асяроддзі архітэктараў адсутнічала дакладнае ўяўленне аб суадносінах традыцыі і сучаснасці, а ў дачыненні да гарадскога планавання партыя не мела выразнай пазіцыі, то з прыняццем Генеральнага плана пачала прасоўвацца ідэя "новага Мінска"[289]. У далейшым гаворка ішла пра тое, каб знайсці форму выражэння для "сацыялістычнага рэалізму" ў архітэктуры, якая і выконвала б рэпрэзентатыўную функцыю, і задавальняла б патрэбы насельніцтва ў жыллі.

Сімптаматычнымі для процілеглых пазіцый былі высновы, якія зрабілі прадстаўнікі розных колаў беларускіх планавальнікаў і архітэктараў з абвінавачання ў тым, што цэнтр Мінска набыў "рысы дзяржаўных будынкаў старой Расіі", выказанага 23 кастрычніка 1946 г. Саюзам архітэктараў СССР[290]. У той час як новы кіраўнік Упраўлення па справах архітэктуры М. С. Асмалоўскі спрабаваў рэабілітаваць класіцызм, Беларускі саюз архітэктараў пад кіраўніцтвам А. П. Воінава прызнаў асобныя памылкі: 23 лістапада 1946 г. у газеце "Літаратура і мастацтва" Асмалоўскі аргументаваў свой пункт погляду тым, што горад павінен уяўляць сабой не "механічную суму асобных будынкаў", а "цэласны арганізм". Каб дамагчыся гэтага выніку,

[288] ЦДАНТД, ф. 68, воп. 1, спр. 22, арк. 45–49адв.

[289] 19 лістапада 1948 г. Мацкевіч апісаў у "Советской Белоруссии" "асноўныя рысы новага Мінска". Прапаноўваліся два шляхі. "Лёгкага", які прадугледжваў рэканструкцыю горада, варта было пазбягаць. Замест гэтага быў абраны "цяжкі", які азначаў паляпшэнне горада. Гутарка ідзе пра пошук "новых архітэктанічных формаў", якія адпавядалі б сацыялістычнай эпосе. Мацкевич Л. Черты нового Минска // СБ. 19.11.1948. № 229. С. 3.

[290] ЦДАНТД, ф. 68, воп. 1, спр. 22, арк. 45–49адв., тут арк. 46.

неабходна стварыць "новы стыль" – "пераможны стыль сацыялізму". Тым самым Асмалоўскі пастараўся абгрунтаваць сваё эстэтычнае разуменне ідэалагічным аргументам. Апелюючы да савецкага патрыятызму, ён паспрабаваў абвясціць рускі класіцызм асновай "беларускай нацыянальнай архітэктуры"[291]. Беларускі філіял Саюза архітэктараў СССР, наадварот, прыняў курс Масквы. У адной са сваіх рэзалюцый ад 20 снежня 1946 г. Саюз архітэктараў прызнаў, што ў практычнай працы дапусціў непрадуманае выкарыстанне архітэктурных формаў мінулага і абцяжарыў маладое пакаленне, якое не прайшло школу канструктывізму, схільнасцю да "ўпрыгожвальніцтва". Выхадам з гэтага складанага становішча павінны былі стаць ідэалагічная вучоба членаў Саюза, прымяненне прынцыпу крытыкі і самакрытыкі і ўдзел архітэктараў у будаўнічых працах[292].

Той факт, што за пастулатам "сацыялістычнага рэалізму" не стаяла адзіная канцэпцыя, зрабіўся чарговы раз відавочным у ходзе вырашэння пытання аб афармленні цэнтра Мінска. У лютым 1947 г. на сумесным паседжанні прадстаўнікоў Упраўлення па справах архітэктуры і Саюза архітэктараў (да таго часу ўжо пачаліся будаўнічыя работы на галоўным праспекце) Н. Я. Трахтэнберг выказаўся пра небяспеку неаднароднага аблічча. У той час як праект будынка Міністэрства дзяржаўнай бяспекі М. П. Паруснікава абапіраўся на класіцызм (іл. 10), сучасная архітэктура арыентавалася на стыль мадэрн, што сведчыла аб замяшанні ў асяроддзі архітэктараў. Трахтэнберг хацеў звярнуць увагу на тое, што архітэктура праектаваных на праспекце будынкаў мела патрэбу ў адзінай "ідэі". Зразумела, кіраўнік Упраўлення па справах архітэктуры Асмалоўскі выкарыстаў дадзенае пярэчанне для таго, каб выступіць на абарону спадчыны класіцызму[293].

Аднак Асмалоўскі не быў упэўнены ў поспеху сваёй пазіцыі. 23 ліпеня 1947 г. Упраўленне па справах архітэктуры трапіла пад агонь крытыкі "Советской Белоруссии". Вядучая газета рэспублікі выказвала незадаволенасць тым, што рэалізацыя праектаў ва ўстанове Асмалоўскага прасоўваецца павольна і з шкодай для якасці. Больш за тое, кіраўнічы персанал быў адкрыта абвінавачаны ў самаздаволенні і раскраданні дзяржаўных рэ-

[291] Асмалоўскі М. Аб архітэктуры // ЛМ. 23.11.1946. № 40. С. 3.
[292] НАРБ, ф. 903, воп. 1, спр. 88, арк. 7–9.
[293] Тамсама, арк. 1–47, тут арк. 26, 44.

сурсаў[294]. Папрокі ў халатнасці і сабатажы падарвалі аўтарытэт Асмалоўскага. Нягледзячы на прадчуванне бяды, ён усё ж паспрабаваў настаяць на сваёй пазіцыі ў галіне намінацыі праектаў на ўзнагароджанне Сталінскай прэміяй на агульным паседжанні прадстаўнікоў Упраўлення па справах архітэктуры і Саюза архітэктараў 15 лістапада 1947 г.: на першае месца ў спісе ён паставіў спраектаваны М. П. Парусьнікавым у духу класіцызму будынак Міністэрства дзяржаўнай бяспекі (іл. 10), а створаны І. Р. Лангбардам у духу канструктывізму праект будынка Тэатра оперы і балета – на другое месца (іл. 11)[295].

Да высвятлення адносін паміж дзвюма групамі беларускіх архітэктараў справа дайшла толькі ў пачатку 1948 г. Гэтаму спрыялі дзве падзеі. У абодвух выпадках сутнасць была ў рэакцыі на маскоўскія дырэктывы. У першым выпадку гаворка ішла пра паляпшэнне ўмоў працы архітэктараў і ўмацаванне іх прафесійнай этыкі. 11 лютага 1948 г. адбылося паседжанне Саюза архітэктараў БССР, прысвечанае барацьбе з "праектаваннем толькі на паперы", пра якую на XIII пленуме ў Маскве заявіла кіраўніцтва Саюза архітэктараў СССР (у духу сталінскіх установак)[296]. Падтрымліваючы гэтую крытыку, старшыня Саюза архітэктараў БССР А. П. Воінаў адзначыў, што праца архітэктараў у значнай ступені праходзіць толькі на паперы, без ведання абстаноўкі на будоўлях і без уліку грамадскай думкі. Воінаў запатрабаваў, каб яго калектыў паклапаціўся пра захаванне законнасці і эфектыўнасці. Яго дэвіз, які абапіраўся на канструктывізм пачатку 1930-х гг. і быў падобны да функцыяналізму будучай эры Хрушчова, гучаў наступным чынам: "Будаваць танна, проста, прыемна для жыцця і прыгожа". Эканомія, камфорт і эстэтыка павінны былі стаць тымі параметрамі, з улікам якіх належала развівацца беларускай архітэктуры[297]. Члены Саюза пагадзіліся з прапановай Воінава, прынялі рашэнне аб сумяшчэнні праектавання і будаўнічых работ, палічылі неаб-

[294] Волошин И. Улучшить работу управления по делам архитектуры // СБ. 23.7.1947. № 146. С. 3.

[295] ЦДАНТД, ф. 68, воп. 1, спр. 37, арк. 108–111. Прысуджэнне прэміі імя Сталіна за 1948 год адбылося ў 1949 г. Знакавым стала ўганараванне Сталінскай прэміяй не класіцыстаў, а архітэктараў неагатычных маскоўскіх шматпавярховікаў. Пар.: Корнфельд Я. А. Лауреаты сталинских премий в архитектуре 1941–1950. Москва, 1953. С. 105–172.

[296] НАРБ, ф. 903, воп. 1, спр. 129, арк. 37–46.

[297] Тамсама, арк. 47–51, цытата, арк. 50–51.

ходным інфармаваць грамадскасць і паставілі сваёй мэтай выкананне пяцігадовага плана за чатыры гады[298]. Але тэарэтычнае абгрунтаванне “сацыялістычнага рэалізму” ў архітэктуры і вызначэнне адпаведнага будаўнічага стылю пазніліся.

У другім выпадку гаворка ішла аб спробе выканаць патрабаванні савецкай культурнай палітыкі і падпарадкаваць архітэктуру канонам “сацыялістычнага рэалізму”. 11–12 сакавіка 1948 г. Саюз архітэктараў БССР разгледзеў рэзалюцыю ЦК УКП(б) ад 10 лютага 1948 г. аб оперы В. І. Мурадэлі “Вялікая дружба”, у цэнтры якой былі наступствы грамадзянскай вайны на Каўказе. Цэнтральны Камітэт палічыў оперу невыразнай і дысгарманічнай, асудзіў скажэнне гістарычных фактаў і адмову ад поліфаніі ў музыцы і спевах[299]. Для архітэктараў гэтая рэзалюцыя была важная таму, што ўслед за крытыкай фармалізму ў літаратуры, тэатры і кіно магла з’явіцца крытыка фармалізму ў архітэктуры. Убачыўшы ў гэтай рэзалюцыі сігнал небяспекі, яны хацелі папярэдзіць магчымы партыйны разнос прэвентыўнымі мерамі.

Як кіраўнік Упраўлення па справах архітэктуры Асмалоўскі, так і старшыня Саюза архітэктараў Воінаў выступілі 11 сакавіка з дакладамі, якія адпавядалі ўсёй сур’ёзнасці сітуацыі. Асмалоўскі адпаведна духу часу ўславіў дзяржаву, сказаў пра неабходнасць улічваць густ народа і на гэтай падставе прапанаваў адыход ад традыцыі: “Нашы жылыя дамы, нашы гарады і вёскі павінны быць больш зручнымі, больш прыгожымі, больш камфартабельнымі і больш маштабнымі; пабудаваныя дамы павінны быць прыгажэйшымі і лепшымі, чым дамы, узведзеныя да вайны”. Нягледзячы на тое, што ён тым самым умела адхіліў ідэю “афіцыйнага” стылю, гэтым выказваннем ён агучыў ускосную адмову ад канструктывізму. Пасля яго сцвярджэння, што ў аснове “савецкага” стылю ляжаць архітэктурныя конкурсы, стала відавочная яго прыхільнасць да класіцызму як дамінантнай плыні, якая абмяркоўвалася ў дыскусіі пра маскоўскі Палац Саветаў. Каб пазбегнуць падазрэння ў фармалізме, ён, аднак, утрымаўся і назваў рэчы сваімі імёнамі. Паказальна, што

[298] Побач з гэтым выказвалася незадавальненне недахопам персаналу (аўтамабільны і трактарны заводы яшчэ не былі ўкамплектаваныя архітэктарамі) і нізкім заробкам архітэктараў, якія ўжо працавалі. Тамсама, арк. 58–65.

[299] Пар.: Beiträge zum Sozialistischen Realismus. Grundsätzliches über Kunst und Literatur. Berlin, 1953. S. 73–78.

ён зыходзіў з вызначэння "прыгажосці", праўда, уключыўшы сюды такія агульныя паняцці, як "эканомія, камфорт, гігіена, а таксама пластычныя і эстэтычныя формы, якія ўздзейнічаюць на чалавека". У выніку Асмалоўскі звёў праблему толькі да пытання аб нацыянальных кампанентах у архітэктуры[300]. Воінаў жа падтрымаў і працягнуў крытыку Цэнтральнага Камітэта адносна зместу оперы і нават паспрабаваў зрабіць дыферэнцаваную выснову: "Калі ў галіне музыкі адмова ад поліфанічнай музыкі і поліфанічнага спеву і перавага монафаніі з'яўляецца істотнай прыкметай фармалістычнага напрамку, то і ў галіне архітэктуры гэта таксама адносіцца да аднастайнага, манатоннага і непрыгожага афармлення цэлага шэрагу будынкаў, жылых раёнаў і іншых аб'ектаў масавага будаўніцтва". Гэтым самым Воінаў выказаўся супраць "спрашчэння" архітэктурных рашэнняў. Пад гэтым ён разумеў як механічнае капіяванне класіцызму ў інтарэсах "упрыгожвальніцтва", так і серыйную вытворчасць, якую прынесла з сабой сучасная эпоха. У адрозненне ад Асмалоўскага Воінаў сцвярджаў, што ў галіне архітэктуры тэорыя "сацыялістычнага рэалізму" яшчэ павінна быць сфармуляваная. У канчатковым рахунку Воінаў разглядаў архітэктурны праект як індывідуальны твор мастацтва[301].

Першым у дыскусіі выступіў І. Р. Лангбард, выказаўшы сваю незадаволенасць наконт таго, што паняцці "фармалізм" і "класіцызм" – толькі шаблоны. Таму ён папрасіў даць яму магчымасць выказаць сваё меркаванне на наступным пасяджэнні больш падрабязна[302]. Наколькі абгрунтаванай была заклапочанасць Лангбарда, можна меркаваць па каментары наступнага дакладчыка. Галоўны архітэктар Мінска Ю. А. Ягораў паспрабаваў вызначыць сутнасць супярэчнасцяў паміж Асмалоўскім як прадстаўніком класіцызму і Воінавым як прадстаўніком канструктывізму (іл. 12), і гэтак жа, як Лангбард, абвінаваціў архітэктараў Мінска ў адставанні ад архітэктараў Масквы. Паводле Ягорава, архітэктары павінны былі выбраць або канструктывізм, які ўвасабляў стваральнік Дома ўрада Лангбард (іл. 13), або класіцызм, прадстаўніком якога быў стваральнік будынка Міністэрства дзяржаўнай бяспекі Парусьнікаў (іл. 10)[303]. У ранней выкладзенай пазіцыі Лангбард наадрэз адхіліў заяву аб

300 ЦДАНТД, ф. 68, воп. 1, спр. 52, арк. 4–14, цытата, арк. 7 і арк. 8.
301 Тамсама, арк. 14–25, цытата, арк. 16.
302 Тамсама, арк. 26–27.
303 Тамсама, арк. 36–39.

тым, што ў беларускай архітэктуры дамінуюць дзве канкурэнтныя школы. Па яго вызначэнні сучасны класіцызм уяўляў сабой толькі запазычанне, а не самастойнае дасягненне. У гэтым сэнсе для Лангбарда было асабліва важна адзначыць, што архітэктура відавочна вымяраецца іншымі крытэрыямі, чым музыка: "Калі вам прапануюць новую оперу, меладычную і добрую оперу, але з уступленнем, выкананым у класічнай манеры арыі са старой оперы <...> то вы адкідаеце гэтую оперу і кажаце, што гаворка ідзе пра нейкую бязглуздзіцу. Але ў архітэктуры такі працоўны метад <...> не толькі прымальны, але і мае поспех". Каб прадэманстраваць неадпаведнасць тэорыі і практыкі і перамагчы сваіх ворагаў, праціўнікаў канструктывізму, іх жа ўласных зброяй, Лангбард вызначыў паняцце "фармалізм у архітэктуры" наступным чынам: "Гаворка ідзе пра працоўны метад, пры якім формы не адпавядаюць зместу, пры якім формы не адпавядаюць нашай ідэалогіі". Лангбард разумеў адраджэнне класіцызму як анахранізм і лічыў: тыя (ім былі названыя Асмалоўскі, Воінаў і Ягораў), што не ўсведамляюць становішча і з-за невуцтва настойваюць на сваёй пазіцыі, у сваю чаргу таксама могуць быць абвінавачаны ў "фармалізме"[304].

Аднак Лангбарду не ўдалося знайсці саюзнікаў. Наадварот, У. Борман зноў прывёў у якасці прыкладу суперніцтва Асмалоўскага і Паруснікава, з аднаго боку, і Воінава і Лангбарда, з другога. Сваю прыхільнасць ён прадэманстраваў тым, што вызначыў класіцызм як "неабходны", а канструктывізм як "непатрэбны"[305]. Такім чынам, у Саюзе архітэктараў панавала ўсё, што заўгодна, але толькі не згода. Нягледзячы на тое, што падзел на розныя лагеры стаў відавочным, у сваім заключным слове Воінаў адмаўляў факт стварэння груповак. Паводле яго слоў, ён не належаў ні да аднаго лагера і не лічыў сябе абаронцам канструктывізму[306]. У процівагу гэтаму асабістаму прызнанню, Асмалоўскі сваё заключнае слова зрабіў праграмным. З аднаго боку, ён адмаўляў, што Воінаў і Лангбард у значнай меры вызначаюць беларускую архітэктуру, з другога – настойваў на сваім патрабаванні аб тым, што руская класічная архітэктура павінна стаць узорам[307].

[304] Тамсама, арк. 75–78, цытата, арк. 77 і арк. 78.

[305] Да таго ж, палемічна сцвярджаў Борман, у Лангбарда можна навучыцца толькі "грубасці" і "прымітыўнасці". Тамсама, арк. 86–87.

[306] Тамсама, арк. 91–96.

[307] Тамсама, арк. 97–99.

Гэты пастулат унеслі ў прынятую на агульным паседжанні рэзалюцыю. Спачатку было адзначана, што канцэнтрацыя архітэктараў на адарванай ад практыкі працы прывяла да "ігнаравання ідэйнага зместу будынкаў, а таксама густу і мастацкіх запытаў савецкага народа". Пры гэтым гаворка ішла не столькі пра практычную карысць асобных праектаў, колькі пра спробу самадысцыпліны, якая адлюстроўвалася ў прызнанні сябе вінаватымі ў "фармалізме". Далейшую крытыку зазнаў той факт, што "механічнае ўзнаўленне" архітэктурных стыляў Антычнасці і Рэнесансу пацягнула за сабой грэбаванне функцыянальнымі і эканамічнымі аспектамі, а таксама новымі тэхнічнымі магчымасцямі. На першы погляд, гэты аргумент быў рэверансам у бок сучаснасці. На самай жа справе гаворка ішла аб выратаванні гонару класіцызму, які яго прыхільнікі спрабавалі ў прамым сэнсе прыстасаваць да сучасных умоў. Каб схаваць гэты недахоп, неабходна было знайсці "ахвярнага казла", і ім стаў Лангбард: менавіта ў яго праектах, якія ўяўлялі сабой кампраміс паміж амбіцыямі канструктывізму і ідэалагічнымі прадпісаннямі, адбівалася "спрашчэнне і збядненне архітэктурных формаў", г. зн. эклектызм. У заключэнні рэзалюцыя закранула "балючае месца" – пытанне аб архітэктурным стылі "сацыялістычнага рэалізму". На "пытанне пра беларускую нацыянальную форму" яна адказала адназначным прызнаннем класіцызму. Пры гэтым віталася ўкараненне Беларусі ў рускае культурнае асяроддзе, пастаўленая задача гучала наступным чынам: "Стварэнне класічнай архітэктуры эпохі сацыялізму-камунізму на падставе крыніц і развіцця найлепшых прыкладаў рускай класічнай архітэктуры"[308].

[308] Тамсама, арк. 100–103; НАРБ, ф. 903, воп. 1, спр. 129, арк. 140–141адв., цытата, арк. 140адв. і арк. 141адв. Пасля таго як Лангбард трапіў у няміласць, ён перасяліўся ў 1949 г. у Ленінград, дзе і памёр 3 студзеня 1951 г. Захавалася недатаваная копія ліста да Асмалоўскага, дзе ён паспрабаваў яшчэ раз апраўдаць сябе. Лангбард спрабаваў спачатку растлумачыць, што ў беларускай архітэктуры міжваеннага перыяду было ўсвядомленае непрыманне буржуазнай ідэалогіі і формаў яе выражэння. Савецкая архітэктура знайшла сваё выражэнне ў "простасці", "простасці планаў і фасадаў", а таксама ў "простасці архітэктурнага падыходу, формаў і стандартаў". У гэтым Лангбард бачыў сваё крэда: «Я паўтараю, не "спрашчэнне", а простасць, строгая ўзбуджальная простасць, павінна, на маю думку, быць галоўным прынцыпам савецкай архітэктуры». Лангбард, разважаючы, даў зразумець, што толькі дурань можа ўбачыць пераемнасць

Фармальна Саюз архітэктараў БССР падтрымаў класіцызм. Аднак за кулісамі сітуацыя абвастралася. Усіх архітэктараў да адзінага меркавання схіліць не ўдалося. Увосень 1948 г. сталі відавочнымі канфлікты, якія выявіліся ў форме барацьбы кампетэнцый і асабістых нападак.

Праціўнікам Асмалоўскага прыйшоўся дарэчы артыкул у газеце “Правда” ад 25 верасня 1948 г., у якім галоўны архітэктар Кіева А. В. Уласаў зводзіў рахункі са сваімі калегамі. Ён скардзіўся на тое, што Маскоўская акадэмія архітэктуры не прапанавала ніводнай марксісцкай працы па тэорыі архітэктуры, і пры гэтым дыстанцыяваўся ад неакласіцызму і манументалізму школы Жалтоўскага. Напярэдадні хрушчоўскай эры, спасылаючыся на “сталінскі клопат пра чалавека”, ён вызначыў у якасці новых вядучых напрамкаў масавае жыллёвае будаўніцтва, тыпавыя праекты і прамысловыя метады. Уласаў не спрабаваў аспрэчваць той факт, што ў якасці прыкладу для савецкай архітэктуры павінна было служыць “вялікае класічнае і папулярнае мастацтва”. Аднак стыль гэтага мастацтва, як лічыў у тым ліку і Лангбард, павінен быў адрозніваецца “простасцю”. Мэтай была “простая ў сваёй самавітасці і грацыі форма”[309].

Ідэі Уласава абмяркоўваліся на цэлым шэрагу паседжанняў Саюза архітэктараў БССР у канцы верасня – пачатку кастрычніка[310]. Старшыня Саюза Воінаў паказаў у адным з дакладаў, датаваным 28 верасня, сітуацыю ў савецкай тэорыі архітэктуры наступным чынам: па гэтай тэматыцы не існуе “ніводнай марксісцкай працы”, а класіцызм усхваляецца як “пераможны стыль сацыялістычнай эпохі”. Гэтую дылему можа вырашыць толькі “барацьба за прынцыпы сацыялістычнага рэалізму ў архітэктуры”[311]. Нягледзячы на тое, што кірунак, у якім павінна адбывацца гэтае развіццё, яшчэ не быў вызначаны, пазіцыю Асмалоўскага відавочна паставілі пад сумнеў[312].

“сацыялістычнага рэалізму” ў рэштках рэліктаў эпохі італьянскага Адраджэння, эпохі пераходу ад феадальнага да буржуазнага ладу, у помніках царкоўнай архітэктуры, якія пабудавалі польскія паны ў Беларусі ў XVII–XVIII ст. для ўмацавання рымска-каталіцкай рэлігіі. ЦДАНТД, ф. 104, воп. 1, спр. 22, арк. 1–8.

309 Власов А. Назревшие вопросы советского зодчества // Правда. 25.9.1948. № 269. С. 2–3.

310 ЦДАНТД, ф. 68, воп. 1, спр. 53, арк. 138–140.

311 Тамсама, арк. 149–157.

312 А. П. Брэгман зазначыў, наколькі складанай была ўнутраная сітуацыя ў Саюзе архітэктараў. Ён папракнуў старэйшае пакаленне за не-

У адпаведнасці з гэтым у рэзалюцыі Саюза архітэктараў ад 9 кастрычніка 1948 г. гаворка ішла аб фундаментальнай крытыцы работы Упраўлення па справах архітэктуры. Па-першае, асуджалася адсутнасць Генеральных планаў для перыферыйных гарадоў, аднаўленне якіх, адпаведна, праходзіла адвольна. Па-другое, адзначалася, што асобныя жылыя дамы ў раёнах вялікіх мінскіх прадпрыемстваў не вельмі якасныя, бо будаўнічыя планы не падаваліся своечасова. Па-трэцяе, звярталася ўвага на паўсюдныя выпадкі дэкаратыўных "празмернасцяў"пры афармленні будынкаў. Па-чацвёртае, кіраўнічы склад Упраўлення па справах архітэктуры зазнаў крытыку за тое, што аказваў ціск на сваіх апанентаў. Па-пятае, Упраўленне па справах архітэктуры абвінавачвалі ў тым, што яно па-свойму трактавала стэнаграму паседжання, на якім спрэчна тлумачылася рэзалюцыя ЦК УКП(б) па оперы Мурадэлі. Па-шостае, грэбаванне прынцыпам калегіяльнасці і фармаванне каманднай сістэмы ў архітэктурным асяроддзі тлумачылася тым, што не было аддадзена належнай увагі ідэалагічнай падрыхтоўцы ў духу марксізму-ленінізму. Па-сёмае, было зафіксавана, што кіраўнікі Саюза архітэктараў і Упраўлення па справах архітэктуры і іх ініцыятывы часта ўступалі ў канфрантацыю адно з адным, бо іх кампетэнцыі не былі выразна абазначаны[313].

На заканчэнне кіраўніцтва Саюза архітэктараў БССР яшчэ раз звярнулася да падрабязнага справаздачнага даклада аб сваёй дзейнасці ў 1941–1948 гг. для таго, каб падкрэсліць сваю пазіцыю. З аднаго боку, яно лічыла, што Упраўленне па справах архітэктуры правакавала канфрантацыю паміж групоўкай, якая абапіралася на класічную спадчыну і рускі ампір, і прыхільнікамі канструктывізму, каб аслабіць уплыў архітэктараў, што працавалі ў БССР яшчэ да вайны. З другога боку, кіраўніцтва Саюза архітэктараў выказала падазрэнне, што ва Упраўленні па справах архітэктуры пераважны ўплыў мелі маскоўскія архітэктары. І нарэшце, пункт гледжання Асмалоўскага наконт

дастатковую актыўнасць, аргументуючы тым, што праўленне сваімі самаўладнымі паводзінамі спрыяла таму, што ініцыятыва членаў Саюза была роўнай нулю. Тамсама, арк. 166.

[313] Па 4-м пункце прыведзены два прыклады: І. М. Рудэнка быў зняты з пасады кіраўніка архітэктурнай майстэрні Мінгарвыканкама пасля таго, як ён раскрытыкаваў Асмалоўскага. Асмалоўскі адчытаў І. І. Валадзько за тое, што той засумняваўся ў працы Упраўлення архітэктуры ЦК КП(б)Б. Тамсама, арк. 141–148.

таго, што Саюз архітэктараў падпарадкоўваецца Упраўленню па справах архітэктуры, быў пастаўлены пад сумнеў[314].

Нягледзячы на гэта, канфлікт вакол Асмалоўскага безвынікова цягнуўся яшчэ больш за год. Для таго каб 2 лютага 1950 г. ЦК КП(б)Б распарадзіўся пачаць справу супраць Асмалоўскага, спатрэбіўся данос з боку яго работнікаў[315]. Следчая камісія прыйшла да высновы, што кіраўніцтва Упраўлення па справах архітэктуры адказнае за цэлы шэраг памылак. Нягледзячы на тое, што супраць Асмалоўскага былі сур'ёзныя абвінавачванні (злоўжыванне службовым становішчам, парушэнне інтарэсаў дзяржавы і партыі, няздольнасць да самакрытыкі), Цэнтральны Камітэт абмежаваўся тым, што 23 сакавіка 1950 г. вынес яму вымову з занясеннем у партыйны білет[316].

Крэсла пад Асмалоўскім захісталася толькі тады, калі ў савецкай будаўнічай палітыцы пазначыўся курс на эканомію, і ў Генеральны план Мінска неабходна было ўнесці адпаведныя змены[317]. 1 ліпеня 1950 г. газета “Советская Белоруссия” апублікавала нататку са шматзначным загалоўкам “Будаваць хутка, эканомна і добра”, якому наканавана было стаць лозунгам эры Хрушчова. З гэтага часу колькасць і якасць павінны былі вызначацца зыходзячы з інтарэсаў дзяржавы. З аднаго боку, ганіўся брак у будаўніцтве, з другога – прапагандаваліся механізацыя і індустрыялізацыя[318]. Нягледзячы на тое, што курс Асмалоўскага быў зменены да непазнавальнасці і разбіты дашчэнту, ён параўнальна лёгка выкруціўся. Пераезд у Маскву

[314] НАРБ, ф. 903, воп. 1, спр. 154, арк. 1–57, тут арк. 31–34.

[315] НАРБ, ф. 4, воп. 81, спр. 267, арк. 14.

[316] Следчая камісія прыйшла да высновы, што праект Асмалоўскага недастаткова прадуманы з фінансавага і тэхнічнага пункту погляду, таму пры выкананні былі выкарыстаны непатрэбныя матэрыялы. Апрача таго, Асмалоўскі ажыццяўляў праекты, якія фінансаваліся прыватнымі асобамі, не клапоцячыся пра кантроль філіялаў. Ён таксама прэтэндаваў на аўтарскія правы Генеральнага плана Мінска, які быў распрацаваны ў Белдзяржпраекце. Але і гэта было не ўсё: пад час удзелу ў конкурсе на забудову Цэнтральнай плошчы ён зрабіў так, што яго расходы ў 15 882 руб. узяло на сябе Упраўленне па справах архітэктуры, і гэта нягледзячы на тое, што ў многіх выпадках расходы маглі аплаціць самі аўтары. Больш за тое, ён разам са сваім намеснікам Уладзімірам Каралём ухіліўся ад выплаты падаткаў з атрыманай прэміі ў памеры 5200 рублёў. Тамсама, арк. 3–5.

[317] Пар.: ч. II. 3 і ч. III. 1.

[318] Строить быстро, экономно и хорошо. С республиканского совещания по строительству // СБ. 1.7.1950. № 132. С. 3.

ў пэўнай ступені азначаў яго рэабілітацыю. 14 красавіка 1951 г. ЦК КП(б)Б разгледзеў яго зварот, зняў вымову і прыбраў запіс з партыйнага білета[319].

Аднак гэты скандал меў працяг. Беларускія архітэктары былі катэгарычна не згодны з памяркоўным стаўленнем партыі да Асмалоўскага. Яшчэ большае раздражненне ў іх выклікалі дзве брашуры пра беларускую сталіцу, выдадзеныя Асмалоўскім у 1950 і 1952 г. пры падрыхтоўцы дысертацыі[320]. Аднак крытыка, што прагучала на паседжанні Саюза архітэктараў 10 ліпеня 1952 г.[321], была агучана толькі пасля смерці Сталіна. 24 траўня 1953 г. "Советская Белоруссия" апублікавала рэцэнзію за подпісам кіраўніка Саюза архітэктараў Воінава і галоўнага архітэктара Мінска Ягорава. Рэцэнзенты крытыкавалі публікацыі Асмалоўскага за "слабое веданне матэрыялу" і "нядобрасумленнасць пры яго прэзентацыі". Па іх словах, замест таго, каб годна ацаніць дасягненні беларускіх архітэктараў, аўтар брашур распаўсюджвае "хлусню" і займаецца "самарэкламай". Ён падае ўсё так, што нібыта з яго з'яўленнем ва Упраўленні па справах архітэктуры пачаўся "залаты век" беларускай архітэктуры. У канчатковым рахунку, на думку аўтараў артыкула, гэтыя брашуры змаглі ўбачыць святло толькі таму, што іх рукапісы не былі пададзены на абмеркаванне грамадскасці і Саюза архітэктараў[322].

Пасля знікнення з поля зроку апошняга прыхільніка класіцызму, г. зн. пасля зняцця Асмалоўскага з пасады кіраўніка Упраўлення па справах архітэктуры, дыскусіі пра "сацыялістычны рэалізм" завяршыліся. Перадавыя пазіцыі заняў функцыяналізм, таму пытанне пра "нацыянальную форму" ў беларускай архітэктуры засталося нявырашаным. Прынамсі, так гучыць выснова, зробленая Г. У. Заборскім на адным з паседжанняў Саюза архітэктараў 9 верасня 1953 г.[323]. Да распаду Савецкага Саюза ў гэтай галіне нічога не змянілася.

[319] НАРБ, ф. 4, воп. 81, спр. 414, арк. 11.

[320] Осмоловский М. С. Минск: Архитектура городов СССР. Москва, 1950; ён жа. Минск: Практика советского градостроительства. Минск, 1952.

[321] ЦДАНТД, ф. 68, воп. 1, спр. 107, арк. 2–9.

[322] Воинов А., Егоров Ю. Фактам вопреки... // СБ. 24.5.1953. № 121. С. 2–3. У лісце да кіраўніцтва Саюза архітэктараў БССР ад 12 чэрвеня 1953 г. Асмалоўскі скардзіцца на рэзкую крытыку і прыкладае абвяржэнне. ЦДАНТД, ф. 68, воп. 1, спр. 118, арк. 47. Пар.: Шэлестаў А. У крывым люстэрку. Пра кнігу М. С. Асмалоўскага "Мінск" // МП. 8.4.1953. № 70. С. 3.

[323] ЦДАНТД, ф. 68, воп. 1, спр. 117, арк. 240–241.

## б) "Вялікі пералом у будаўніцтве" і архітэктура

Выраз "вялікі пералом у будаўніцтве" ўяўляе сабой часта цытаваны топас, пры дапамозе якога маскоўская нарада будаўнікоў 1954 г. усё яшчэ характарызуецца як пераломны момант[324]. На самай справе змена горадабудаўнічага ўзору, якая звычайна прыпісваецца Хрушчову і звязваецца з працэсам дэсталінізацыі, адбывалася не імгненна, гэта быў працэс, які ахапіў дзесяцігоддзе – з 1950 да 1960 г. У той перыяд у галіне гарадскога планавання адбылося зрушэнне акцэнту з агульнага ансамбля на жыллёвае пытанне і перспектывы – з цэнтра на мікрараён. У будаўнічай практыцы гэта азначала паступовую замену індывідуальных планаў на стандартызаваныя праекты, г. зн. пераход ад жылых палацаў для прывілеяваных да панэльных будынкаў для мас. Незвычайным для названага дзесяцігоддзя стала тое, што ўслед за зніжэннем прафесіяналізму архітэктараў згасла і дыскусія пра горадабудаўніцтва. Характэрны ў гэтым выпадку і той факт, што паняцце "сацыялістычны горад" з'явілася ў перыядычных выданнях апошні раз у снежні 1950 г.: "Усё выразней вымалёўваецца гарманічны ансамбль новага, сапраўды сацыялістычнага горада", – так гучала эўфемістычнае апісанне "новага Мінска" ў "Советской Белоруссии"[325].

Аднак эстэтычныя прынцыпы ў пачатку 1950-х гг. яшчэ выконвалі важную ролю для архітэктараў Мінска. Гаворка ідзе пра перыяд часу, калі горад у працэсе аднаўлення знаходзіў свае контуры. У "Советской Белоруссии" ад 7 снежня 1952 г. са спасылкай на тагачасныя агульныя ансамблі з праспектаў, комплексаў будынкаў і грамадскіх месцаў галоўны архітэктар Мінска Л. П. Мацкевіч нават узвёў "прыгажосць" у ранг "закону савецкага горадабудаўніцтва"[326]. Але пытанні архітэктурнага стылю больш не абмяркоўваліся. Наадварот, кіраўнік Упраўлення па справах архітэктуры У. А. Кароль апісваў у артыкуле ў "Советской Белоруссии" ад 25 верасня 1954 г. імкненне калег кіравацца мастацкімі меркаваннямі як "памылковую тэндэнцыю" апярэджваць сваім падпарадкаваннем указы зверху. Ён адзначаў, што тыя, каго турбуе "прыгажосць фасада" дома, наўрад ці будуць заклапочаны тым, якія кватэры знаходзяцца "за фасадам". Гэ-

[324] Пар.: ч. II. 1.
[325] Кононова Н. Строители нового Минска // СБ. 16.12.1950. № 251. С. 2.
[326] Мацкевич Л. Город должен быть красивым! // СБ. 7.12.1952. № 288. С. 3.

тым самым Кароль упершыню выказаўся за дамінаванне зместу над формай[327]. У астатнім Упраўленне па справах архітэктуры ў пытанні “прыгажосці” лічыла неабходным працягваць дапаўняць гарадское аблічча так званай “архітэктурай малых формаў”. Мелася на ўвазе ўзвядзенне помнікаў, адкрыццё фантанаў і павільёнаў, пра што згадаў намеснік Караля В. І. Гусеў 27 лістапада 1954 г. у газеце “Мінская праўда”[328].

У снежні 1954 г. з паведамленняў прэсы беларускія архітэктары даведаліся пра тое, што маскоўская нарада будаўнікоў паставіла пад пытанне іх працу, а Хрушчоў кпіў з іх прафесіі[329], але ніякай рэакцыі не было. Ні ў прэсе, ні ў дакументах Упраўлення па справах архітэктуры і Саюза архітэктараў няма выказванняў на гэтую тэму. Дакументы пакідаюць уражанне, што менавіта напярэдадні працэсу дэсталінізацыі для архітэктараў надышоў “ледніковы перыяд”, які перажывалі прадстаўнікі іншых абласцей культуры ў часы ждanaўшчыны[330]. Прайшло паўгода да таго моманту, як рашэнні маскоўскай нарады атрымалі ўхвалу ў Мінску. У рэзалюцыі, прынятай Саюзам архітэктараў БССР на V канферэнцыі 10–11 чэрвеня 1955 г., было вырашана адмовіцца як ад выкарыстання ўпрыгожванняў, так і ад манументальнасці. У будучыні неабходна было імкнуцца да дамінавання тыпавых праектаў і да індустрыялізацыі будаўнічай галіны[331]. Такім чынам, Саюз архітэктараў апярэдзіў пастановы Цэнтральнага Камітэта КПСС і Савета Міністраў СССР, прынятыя ў жніўні і лістападзе 1955 г., якімі Хрушчоў надаў законную сілу сваёй новай будаўнічай палітыцы[332].

Усё гэта было зацверджана загадам ад 21 лістапада 1955 г. “Пра адхіленне празмернасцяў у праектаванні і будаўніцтве ў Бе-

[327] Король В. Некоторые вопросы градостроительства в Белоруссии // СБ. 25.9.1954. № 228. С. 2.

[328] Гусеў В. Развіваць архітэктуру малых форм // МП. 27.11.1954. № 235. С. 3.

[329] Пар.: Всесоюзное совещание строителей // СБ. 1.12.1954. № 284. С. 1; 2.12.1954. № 285. С. 1; 5.12.1954. № 288. С. 1; 8.12.1954. № 290. С. 1. Пар. таксама: МП. 1.12.1954. № 238. С. 1; 3.12.1954. № 239. С. 3; 8.12.1954. № 243. С. 1; О широком внедрении индустриальных методов, улучшении качества и снижении стоимости строительства. Речь товарища Н. С. Хрущева // СБ. 28.12.1954. № 307. С. 2–3; 29.12.1954. № 308. С. 2–3. Пар. таксама: МП. 29.12.1954. № 258. С. 2–4.

[330] Пар.: ч. II. 1.

[331] ЦДАНТД, ф. 68, воп. 1, спр. 132, арк. 280–290.

[332] Пар.: ч. II. 1.

ларускай ССР” Цэнтральнага Камітэта КПБ і Савета Міністраў БССР. Прычым упершыню ў пасляваенны час зайшла гаворка пра “лінію партыі і ўрада” ў галіне архітэктуры і гарадскога будаўніцтва: “У працах многіх архітэктараў і праектных арганізацый распаўсюдзіўся вонкава дэманстратыўны бок архітэктуры, для якога характэрна вялікая колькасць празмернасцяў, што не адпавядае лініі партыі і ўрада ў пытаннях архітэктуры і будаўніцтва”. Гэтым выказваннем Цэнтральны Камітэт і Савет Міністраў дыстанцыяваліся ад “сацыялістычнага рэалізму”. Адказнасць за прысутнасць неакласіцызму ў архітэктуры сталіцы была ўскладзена на кіраўнікоў Упраўлення па справах архітэктуры і Саюза архітэктараў, а таксама на галоўнага архітэктара Мінска[333]. З гэтай нагоды 23 лістапада 1955 г. у Мінску сабраліся архітэктары і інжынеры праектных арганізацый, каб заняцца самакрытыкай і падпарадкавацца новай лініі партыі[334]. Нягледзячы на тое, што паняцце “тэхніка” стала чароўным словам у будаўніцтве, у “Советской Белоруссии” ад 13 лістапада 1955 г. Савет Міністраў БССР і ЦК КПБ абвясцілі конкурс на самы прыгожы горад. Пры гэтым паняцце “прыгажосць” адносілася з дадзенага моманту не да архітэктуры, а да інфраструктуры[335]. У гэтым жа духу перадавы артыкул у “Советской Белоруссии” ад 8 снежня 1955 г. пад назвай “Ліквідацыя празмернасцяў пры праектаванні і будаўніцтве” абагульніў вынікі II Усесаюзнага з’езда архітэктараў у Маскве: для савецкай архітэктуры характэрны “простасць і строгасць формаў” і “эканомія пры прыняцці рашэнняў”. Адзначалася, што знешняя прыгажосць павінна быць да-

[333] НАРБ, ф. 4, воп. 81, спр. 1053, арк. 7–16, цытата, арк. 1, 8. 10 лістапада 1955 г. “Советская Белоруссия” апублікавала пастанову ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР “Об устранении избытков при проектировании и строительстве”, а 12 лістапада 1955 г. у гэтай жа газеце быў змешчаны матэрыял, дзе гаварылася, што беларускія архітэктары і будаўнікі далучыліся да маскоўскай дырэктывы. Постановление Центрального Комитета КПСС и Совета Министров СССР. Об устранении излишеств в проектировании и строительстве // СБ. 10.11.1955. № 266. С. 2; Устранить излишества в проектировании и строительстве. Архитекторы и строители республики одобряют постановление Центрального Комитета КПСС и Совета Министров СССР // СБ. 12.11.1955. № 268. С. 1.

[334] ЦДАНТД, ф. 68, воп. 1, спр. 134. Пар. таксама: Сход архітэктараў Мінска // МП. 25.11.1955. № 232. С. 3.

[335] О социалистическом соревновании городов республики за лучшее проведение работ по строительству, благоустройству и наведению в них санитарного порядка // СБ. 13.11.1955. № 269. С. 1.

сягнута не дзякуючы ўпрыгожванню, аздабленню або дэкарацыі, а дзякуючы адпаведным прапорцыям і матэрыялам, а таксама канструкцый[336]. Пры гэтым "прыгажосць" азначала цяпер не эстэтыку ансамбля, а функцыянальнасць горада.

У другой палове 1950-х гг. у гарадскім будаўніцтве надышоў пераходны перыяд, калі мінскія архітэктары ўстрымліваліся ад выказванняў. Нягледзячы на тое, што будаўнічая нарада 1954 г. абвясціла змену парадыгмы ў галіне будаўніцтва, у беларускай сталіцы да канца 1950-х гг. быў узведзены шэраг будынкаў, заснаваных на індывідуальных праектах (у прыватнасці, рэпрэзентатыўныя дамы на плошчы Перамогі пабудаваны ў 1958 г.), дзякуючы чаму горад набываў сваё аблічча. Якія ілюзіі былі звязаны з гэтымі праектамі, можна зразумець па ўражанні ад наведвання Мінска, выказанае ў прамове перад выбаршчыкамі Калінінскага раёна Масквы 14 сакавіка 1958 г. не кім іншым, як самім Хрушчовым: "Калі праязджаеш па галоўнай вуліцы Мінска, то ствараецца ўражанне, быццам знаходзішся на Неўскім праспекце". Варта заўважыць, што неакласіцызм мінскай архітэктуры адпавядаў густу Хрушчова і не разглядаўся ім як дэкаратыўная празмернасць[337]. Паказальна, што гэтае выказванне было працытавана ў "Советской Белоруссии" 16 сакавіка 1958 г., у дзень выбараў у Вярхоўны Савет СССР, у артыкуле, які запачаткаваў кампанію пад дэвізам "Любі Мінск, сталіцу сваёй рэспублікі".

Фактычна аблічча горада, якога дамагаліся ў пасляваенных планах, на справе пакутавала ад таго, што важныя элементы гарадскога ансамбля заставаліся незавершанымі, як, напрыклад, Цэнтральная плошча, афармленая толькі помнікам Сталіну. Нават праграма па будаўніцтве жылля 1957 г. не прывяла да пераважнага будаўніцтва панэльных будынкаў. Рэзалюцыя VI канферэнцыі Саюза архі-

[336] Устранить излишества в проектировании и строительстве // СБ. 8.12.1955. № 288. С. 1. Пар. таксама паведамленне кангрэса: II Всесоюзный съезд советских архитекторов // СБ. 2.12.1955. № 285. С. 1. На сходзе архітэктараў і інжынераў г. Мінска былі скептычна разгледжаны вынікі II Усесаюзнай канферэнцыі. Прадстаўнік спецупраўлення Беларускай ваеннай акругі М. І. Нікіценка зазначыў, што ўсе выступленні насілі аднолькавы характар. Таму склалася ўражанне, што дакладчыкі самі не былі ўпэўнены ў тым, што гаварылі. Апрача таго, сацыяльна-палітычнае патрабаванне Хрушчова было недаацэнена. Замест таго каб думаць пра жыллё для сямей, планавальнікі горада сканцэнтраваліся на праблемах паркоўкі аўтамабіляў. ЦДАНТД, ф. 68, воп. 1, спр. 148, арк. 1–9, тут арк. 4–6.

[337] Люби Минск, столицу своей республики // СБ. 22.6.1958. № 144. С. 2.

тэктараў БССР ад 21 лістапада 1958 г. канстатавала той факт, што канцэпцыя панэльнага будаўніцтва рэалізоўвалася толькі часткова. У гэтай рэзалюцыі адзначалася, што ў Мінску існавалі толькі два панэльныя дамы. Нягледзячы на тое, што гаворка ішла пра амбітныя праекты, будаўнічая фаза расцягнулася больш чым на два гады, і ў 1958 г. у БССР не было пабудавана ніводнага панэльнага дома[338]. У рэчаіснасці мікраараён як горадабудаўнічая канцэпцыя быў рэалізаваны толькі ў 1960-я гг. Цяпер старшыня Камітэта па пытаннях будаўніцтва БССР (Дзяржбуд) У. А. Кароль гаварыў, што “прыгажосць” сучасных гарадоў была вынікам не толькі параднага размяшчэння праспектаў і плошчаў, але перш за ўсё якасці частак горада, якія складаюцца з мікрараёнаў[339].

## в) Урбаністычная настальгія і міф пра “горад-герой”

У архітэктурных дыскусіях 1960-х гг. абазначыўся паступовы пераход ад тэхналагічнай утопіі да ўрбаністычнай настальгіі. Тон быў зададзены двума момантамі: неабходнасцю завяршыць планаванне гарадской структуры, якое пачалося яшчэ ў перыяд пасляваеннага аднаўлення, і стрымліваннем бурнага росту насельніцтва ў ходзе індустрыялізацыі. У гэтай сувязі ключавымі элементамі гарадскога планавання сталі так званая “архітэктура малых формаў”, а таксама афармленне мікрараёнаў[340]. Архітэктары па-ранейшаму лічылі “прыгажосць” галоўнай рысай забудаванай прасторы. У той момант, калі нават пры выкарыстанні сродкаў “прагрэсу” гэтая мэта апынулася недасяжнай, патрабаванне “мастацтва” было зноў пастаўлена на парадак дня. У канчатковым рахунку дамінаванне функцыяналізму неаднаразова ставілася пад пытанне прыхаванымі зваротамі да традыцыі.

Напярэдадні XXII з’езда КПСС (кастрычнік 1961 г.), на якім абвясцілі новую партыйную праграму па будаўніцтве камуністычнага грамадства, было сфармулявана новае горадабудаўні-

[338] ЦДАНТД, ф. 68, воп. 1, спр. 167, арк. 169–179, тут арк. 173.

[339] Король В. Проблемы градостроительства в Белоруссии // СБ. 10.1.1962. № 8. С. 3.

[340] Пар.: рэзалюцыя VII канферэнцыі беларускіх архітэктараў у траўні 1961 г. ЦДАНТД, ф. 68, воп. 1, спр. 284, арк. 244–245. У час паседжання архітэктар Г. В. Сысоеў апісаў “новы напрамак” сваёй прафесіі. Павінен быў карыстацца попытам стыль, які вылучаўся сваёй “функцыянальнасцю” і “лагічнымі, канструктыўнымі і горадабудаўнічымі формамі”. Тамсама, арк. 2–8, тут арк. 3.

чае бачанне: Мінск як “горад сонца”[341]. Зыходзячы з новай партыйнай праграмы, Саюз архітэктараў БССР і Саюз мастакоў БССР прынялі агульную рэзалюцыю, у якой забудаванай прасторы прыпісвалася выхаваўчая функцыя. Згодна з гэтай рэзалюцыяй архітэктары і мастакі павінны былі сфармаваць эстэтычны густ рабочых і зрабіць умовы жыцця настолькі прыемнымі, наколькі гэта магчыма. “Аблічча сучаснага горада” павінна было знайсці сваё выражэнне ў “камфорце, архітэктуры малых формаў, азеляненні і дэкаратыўнасці пры афармленні інтэр’ераў жылых дамоў і грамадскіх будынкаў”[342]. Адпаведна характарыстыкай камуністычнага горада рабілася камфартабельнасць грамадскай і прыватнай прасторы.

Для вырашэння гэтай праблемы газета “Літаратура і мастацтва” запрасіла сваіх чытачоў да дыскусіі на тэму аб “прыгажосці і мэтазгоднасці” ў архітэктуры і гарадскім будаўніцтве. Да лютага 1963 г. газета атрымала шэраг водгукаў. У бальшыні выказвалася згода з тым, што рэканструкцыя Мінска ў пасляваенны перыяд мела шмат недахопаў, і з тым, што канцэпцыя рэпрэзентатыўнасці ансамбля ў цэнтры не павінна выконваць вырашальную ролю ў горадабудаўніцтве. Так, 12 кастрычніка 1962 г. архітэктар А. Таф выказаў меркаванне, што азнаменаваная манументалізмам фаза аднаўлення завершана. Замест гэтага ён паставіў на парадак дня стварэнне “горада новага тыпу”, у аснове якога ляжаць як сацыяльныя, так і эстэтычныя ідэі “горада камуністычнай будучыні”. Для рэалізацыі гэтай утопіі праектавальнікам горада неабходна было сканцэнтравацца на прынцыпе мікрараёна і пераадолець аднастайнасць у архітэктуры пры будаўніцтве панэльных дамоў. Гаворка ішла аб закладцы функцыянальнага горада. У процівагу гэтаму мастак-графік С. П. Герус 26 кастрычніка 1962 г. крытычна падышоў да абмеркавання гэтага пытання. Ён заявіў, што рашэнне аднавіць пасляваенны Мінск па прынцыпе Ленінграда – памылковае. У той час як Неўскі праспект – адлюстраванне спадчыны рускага класіцызму, Мінск – гэта “горад сучаснасці”, перагружаны архітэктурай XVIII і XIX ст. У гэтай сувязі Герус выказаўся за праект “сучаснасці”, аснова якога была закладзена яшчэ

[341] Пар.: Кудинов М. Город, распахнутый солнцу // СБ. 3.7.1960. № 155. С. 2; Наша столица // СБ. 10.6.1961. № 136. С. 4. Пар. таксама мастацкую апрацоўку гэтага матыву ў фотаальбоме і эсэ Артура Клінава: Горад СОНца. Візуальная паэма ў трох частках. Мінск, 2006; ён жа: Minsk. Sonnenstadt der Träume. Frankfurt am Main, 2006.

[342] ЦДАНТД, ф. 68, воп. 1, спр. 186, арк. 5–14, тут арк. 5.

ў 1930-я гг. канструктывісцкімі будынкамі Лангбарда. Акрамя таго, мастак зазначыў: калі ён гуляе па праспекце Леніна, то ў яго ўзнікае тое ж пачуццё, што і пры праверцы студэнцкіх прац. Паўсюль відаць марнатраўства рэсурсаў. На яго думку, прыгажосць у архітэктуры, наадварот, вызначаецца “гармоніяй ліній”[343]. Аднак яго заклікі вярнуцца да ідэй авангарду не знайшлі прыхільнікаў. У выніку пытанне сумяшчальнасці функцыяналізму і эстэтызму ў горадабудаўніцтве так і засталося адкрытым.

Моцнае разыходжанне паміж жаданым і рэчаіснасцю можна прасачыць на прыкладзе заклiку, які з’явіўся ў “Советской Белоруссии” 11 траўня 1963 г. у загалоўку перадавога артыкула “Няхай прыгажэюць гарады!”. Прызнавалася, што прастора горада ў многіх адносінах недасканалая. Выхад з цяжкага становішча рэдакцыя, відавочна, хацела знайсці ў прапановах жыхароў. Яна апелявала да патрыятызму, сцвярджаючы, што “родны горад” – гэта тое ж самае, што “бацькоўскі дом”. Толькі пры ўмове, калі горад “камфартабельны, чысты і прыгожы”, са “свежым паветрам, ясным святлом, свежай зялянінай”, у ім можна жыць “добра і з радасцю”[344]. За гэтым выказваннем можна ўбачыць прызнанне таго, што толькі частка гарадской прасторы была забяспечана інфраструктурай і што паўсюдна адчуваліся недахопы ў грамадскай гігіене. Па пытанні “прыгажосці” 25 ліпеня 1963 г. Выканаўчы камітэт Мінскага гарадскога Савета ў пастанове аб мастацкім афармленні горада адзначаў, што на многіх вуліцах і плошчах яшчэ пануюць “дрэнны густ” і “элементы фармалізму”[345]. Праўда, пытанні

[343] Пар.: Белагорцаў І. Прыгажосць і мэтазгоднасць // ЛМ. 5.10.1962. № 80. С. 1–2; Таф А. Гарады будучага растуць сёння // ЛМ. 12.10.1962. № 82. С. 1, 4; 19.10.1962. № 84. С. 1, 4; Герус С. Ідучы па вуліцах Мінска… // ЛМ. 26.10.1962. № 86. С. 1; Юрэвіч У. Насустрач сонцу і паветру // ЛМ. 27.11.1962. № 95. С. 2, 4; Азгур З. Архітэктар і мастак // ЛМ. 21.12.1962. № 102. С. 3; Міхед А. Адказнасць архітэктара // ЛМ. 8.2.1963. № 10. С. 1; Воінаў А., Кулін В. Наша кватэра сёння і заўтра // ЛМ. 8.2.1963. № 12. С. 1; Шаціла В. У Гарадку і іншых “глыбінь-гарадках” // ЛМ. 19.2.1963. № 15. С. 1; Філімонаў С. Частка вялікай архітэктуры // ЛМ. 7.6.1963. № 46. С. 2.

[344] Пусть хорошеют города! // СБ. 11.5.1963. № 109. С. 1.

[345] ДАМВ, ф. 6, воп. 3, спр. 258, арк. 47–49. Але з ажыццяўленнем прадпісання не ўсё было гладка. Так, 24 лістапада 1963 г. два архітэктары скардзіліся ў “Советской Белоруссии” на тое, што іх малыя архітэктурныя формы (фантан, вазы, рэклама, сметніцы і г. д.), зацверджаныя дзяржаўным будаўнічым упраўленнем (Дзяржбудам), не будуць ажыццёўлены. Занкович В., Страхович А. Малые формы и большие трудности // СБ. 24.11.1963. № 276. С. 2.

архітэктуры для Мінскага праектнага інстытута сталі неактуальнымі. Замест гэтага ў "Советской Белоруссии" ад 24 жніўня 1963 г. М. Ф. Кудзінаў закрануў такія праблемы, як забруджванне паветра і вулічны шум, а галоўную праблему гарадскога планавання ён бачыў у суадносінах размяшчэння жылых раёнаў з размяшчэннем прамысловых прадпрыемстваў і пракладваннем праспектаў. Гарады, на яго думку, павінны былі ствараць перадумовы для духоўнага развіцця чалавека[346]. Дзякуючы функцыяналізму планавальнік горада ператварыўся ў сапраўднага стратэга.

Што да рэальнага аблічча горада, то цікавасць уяўляюць выказванні І. В. Мядзведзева з нагоды прызначэння яго галоўным мастаком Упраўлення па справах архітэктуры Мінска 15 студзеня 1959 г. У першапачатковых накідах мемуараў Мядзведзеў характарызаваў знешняе аблічча Мінска пачатку 1960-х гг. як "правінцыйнае". Паўсюдна панаваў "дрэнны густ". У першую чаргу Мядзведзеў меў на ўвазе "архітэктуру малых формаў", рэкламу і дошкі гонару[347]. Так, напрыклад, у сваім фотаальбоме Мядзведзеў змясціў рэкламу паветраных зносін, што была на даху дома на плошчы Перамогі (на яго думку – жахлівую), з партыйным лозунгам, які не меў да яе аніякага дачынення. Замест тавараў у вітрынах былі выстаўлены дрэнныя малюнкі. Кіёскі нагадвалі драўляныя будкі[348]. Каб выкрыць "беспрынцыповасць" і "адсутнасць мастацкага ўспрымання" ў адказных чыноўнікаў горада (г. зн. Упраўлення па справах архітэктуры), у канчатковым варыянце сваіх

[346] Мінскпраект распрацаваў новы перспектыўны план з чатырох пунктаў: 1) з улікам таго, што рух у горадзе канцэнтраваўся на вузкіх вуліцах, неабходна было распрацаваць канцэпцыю хуткасных дарог з дапушчальнай хуткасцю 80 км/г; 2) зялёныя зоны павінны былі пашырыцца; 3) трэба было зрабіць падзел на зоны для жылля, працы і кіравання; 4) нарэшце, неабходна было арганізаваць грамадскія цэнтры ва ўсіх частках горада. Кудинов М. Минск сегодня и завтра // СБ. 24.8.1963. № 199. С. 2.

[347] ЦДАНТД, ф. 177, воп. 1, спр. 91, без стар. "Советская Белоруссия" ад 27 верасня 1963 г. ганіла "дробязі" памылковага планавання, халатнасць і абыякавасць, якія абмяжоўвалі ўзровень жыцця насельніцтва. Культ асобы выканаў вялікую ролю пры аднаўленні Мінска. У выніку стаў пераважаць дробнабуржуазны густ, які аддаваў перавагу ўпрыгожванням. Сурский О. Чтобы было удобно, уютно, красиво. Несколько замечаний о "мелочах", которые вовсе не мелочи // СБ. 27.9.1963. № 228. С. 4.

[348] Медведев И. В. Творческий отчёт о работе по архитектурно-художественному оформлению г. Минска за 1959–1967 г. // ЦДАНТД, ф. 177, воп. 1, спр. 91.

успамінаў ён апісаў анекдатычны выпадак, які адбыўся з ім. Неўзабаве пасля прызначэння на пасаду ён атрымаў заказ ад Мінгарвыканкама перарабіць шыльду на піўным ларку літаральна за некалькі метраў ад абеліска на плошчы Перамогі (на шыльдзе былі намаляваныя заяц і вожык)[349]. Пра ўрбаністычнасць у сэнсе ўпрыгожання горада да святаў, прапаганды / рэкламы, а таксама дэкору / дызайну нават не ішла гаворка. Адзін маскоўскі мастак пад час візіту ў 1963 г. (магчыма, маецца на ўвазе галоўны мастак Масквы М. П. Ладур) абразіў беларускую сталіцу, сказаўшы, што "Мінск як быў вёскай, так і застаўся"[350].

На гэтым фоне ў другой палове 1960-х гг. у будаўнічай палітыцы адбылася рэабілітацыя мастацтва (эстэтызму). Змена тэндэнцыі развіцця пазначылася ўжо 13 лістапада 1965 г., калі ў "Советской Белоруссии" было апублікавана інтэрв'ю з намеснікам Старшыні Савета Міністраў СССР і старшынёй Дзяржаўнага камітэта па справах будаўніцтва СССР (Дзяржбуд) І. Т. Новікавым. Новікаў наракаў на тое, што ўзровень архітэктуры не адпавядае нарастальным патрэбам сацыялістычнага грамадства. "Пагоня за эканоміяй" выклікала ў дойлідаў грэбаванне патрэбай насельніцтва ў камфортным жыллі[351]. Тым самым упершыню ў БССР слоган эры Хрушчова "будаваць лепш, хутчэй, танней" быў пастаўлены пад сумнеў, і зноў стала запатрабаваная крэатыўнасць архітэктараў. Пазней, на IX з'ездзе беларускіх архітэктараў, які адбыўся 5 чэрвеня, галоўны архітэктар Мінска А. І. Наканечны звярнуў увагу на тое, што з'яўленне аднастайных жылых раёнаў у беларускай сталіцы звязана з тым, што пачынаючы з 1953 г. бюджэт на праектныя працы быў скарочаны з 180 000 да 46 000 рублёў. "Пагоня за зніжэннем выдаткаў на будаўніцтва" прывяла да частковага пагаршэння якасці эксплуатацыі жылля. Наканечны прыйшоў да наступнай высновы: "Архітэктура і будаўнічая справа… перасталі быць мастацтвам у поўным сэнсе гэтага слова"[352]. Такім чынам, ён адмовіўся ад канцэпцыі мікраараёна, які складаўся з пяціпавярховых панэльных дамоў.

Супярэчнасці ў канцэпцыі планавання "сацыялістычнага горада" былі яшчэ раз адзначаны на адной з закрытых нарад ЦК КПБ 30 траўня 1967 г. Запрошаны эксперт, прадстаўнік ленінградскіх

[349] Медведев И. В. Автобиография. Годы жизни и творчества. Минск, 1985 // ЦДАНТД, ф. 177, воп. 1, спр. 100, арк. 13.
[350] Тамсама.
[351] Архитектура наших городов и сёл // СБ. 13.11.1965. № 268. С. 1.
[352] ЦДАНТД, ф. 68, воп. 1, спр. 225, арк. 45–66, тут арк. 51–54, цытата арк. 54.

гарадскіх архітэктараў А. І. Навумаў прымусіў задумацца над тым, што з прычыны асаблівасцяў гістарычнага развіцця горад не мае "свайго аблічча". Яго рэкамендацыі складаліся ў тым, каб выкарыстоўваць вялікія прасторы і дапоўніць гарызантальную будаўнічую кампазіцыю вертыкальнай. Відавочна, што па прыкладзе Масквы сілуэт горада неабходна было дапоўніць пэўнымі дамінантамі. Старшыня Дзяржбуда БССР У. А. Кароль, наадварот, нагадаў, што ў час аднаго з візітаў на Украіну Першы сакратар ЦК КПБ П. М. Машэраў убачыў у Кіеве "перспектыву" для беларускай сталіцы. Па словах Машэрава, "на прыкладзе Кіева можна гаварыць пра нашу перспектыву, пра тое, што мы павінны рабіць"[353]. Выбар раскошнай кіеўскай вуліцы – Крашчаціка – у якасці прыкладу для праспекта Леніна дэманструе тую адвольнасць, якая ляжала ў аснове горадабудаўнічага бачання Мінска.

Аднак крытыка або сумненні з нагоды вынікаў работы па аднаўленні горада не маглі выказвацца адкрыта. Яшчэ да выхаду ў 1967 г. трэцяга нумара часопіса Саюза мастакоў СССР "Дэкаратыўнае мастацтва СССР", прысвечанага беларускаму мастацтву і падрыхтаванага работнікамі Маскоўскага інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору, сакратар ЦК КПБ С. А. Пілатовіч напісаў на яго рэцэнзію. Галоўная выснова была ў тым, што запланаваныя артыкулы ўтрымліваюць памылкі і тэндэнцыйныя сцверджанні. У "Нататках рэдактара" М. П. Ладур называў дваццатыя гады "залатым векам мастацтва". У артыкуле "Мінск шукае свой твар" Ю. Гярчук прадузята заявіў, што ён не ўбачыў у абліччы беларускай сталіцы нічога, акрамя "атрыбутаў класікі" і "безгустоўных і груваcткіх калон". Аўтар сцвярджаў, што "Мінск пасляваеннага часу будаваўся не як горад для людзей, а як помнік перамогі". Праспект Леніна аўтар характарызаваў як "адзіную ў сваім родзе трыўмфальную дарогу, увянчаную груваcткім помнікам-абеліскам у цэнтры Круглай плошчы". Пілатовіч палічыў гэтае выказванне прыніжальным і абразлівым, бо абеліск Перамогі быў сімвалам "мужнасці і гераізму" савецкага народа ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Адзінай светлай плямай у Мінску, на думку Герчука, быў кафедральны сабор XVII ст. Зыходзячы з гэтага, Пілатовіч не рэкамендаваў нумар да друку[354]. Таму трэці нумар "Дэкаратыўнага мастацтва" выйшаў толькі як тэматычны зборнік "Фантастыка ў мастацтве".

[353] НАРБ, ф. 4, воп. 95, спр. 114, арк. 1–43, тут арк. 20, арк. 31–32 і арк. 36.
[354] НАРБ, ф. 4, воп. 62, спр. 694, арк. 93–97. Вялікі дзякуй майму мінскаму калегу Захару Шыбеку за ўказанне на гэтую крыніцу.

У сувязі з правядзеннем конкурсу на афармленне цэнтра і ў рамках усесаюзнай ініцыятывы па захаванні архітэктурных помнікаў у канцы 1960-х зноў заявілі пра сябе традыцыяналісты. 13 красавіка 1969 г. у газеце "Правда" мастацтвазнаўца З. Пазняк і мастак Л. Баразна загаварылі пра павагу да гістарычнай спадчыны пры афармленні цэнтра Мінска. У якасці прыкладу яны разгледзелі выставу конкурсных работ, якая адбылася ў снежні 1968 г. у Палацы прафсаюзаў. У праектах прасочвалася як сляпое пераймание функцыяналізму, так і грэбаванне традыцыяй[355]. 27 траўня 1969 г. ад імя Таварыства па ахове помнікаў доктар мастацтвазнаўства М. С. Кацар, кандыдат гістарычных навук і старшыня секцыі па гістарычных і археалагічных помніках У. Д. Будзько, а таксама кандыдат мастацтвазнаўства Л. М. Дробаў і вядучы супрацоўнік Мастацкага музея Э. І. Вецер звярнуліся з лістом на імя Першага сакратара ЦК КПБ П. М. Машэрава. Яны паведамлялі: нягледзячы на тое, што загаданае законам узгадненне з прэзідыумам Таварыства па ахове помнікаў так і не было выканана, кіраўніцтва Мінскага праектнага інстытута (Мінскпраект) пачало знос будынкаў канца XVIII – пачатку XIX ст. па вуліцы Няміга[356]. Дзеянні праектнага інстытута, аднак, былі апраўданы афіцыйнай паперай ад 18 чэрвеня 1969 г., накіраванай старшынёй Мінгарвыканкама М. В. Кавалёвым Таварыству па ахове помнікаў і Цэнтральнаму Камітэту. Кавалёў звярнуў увагу на тое, што ва ўсіх Генеральных планах вуліцы Нямізе была прапісана функцыя галоўнай вуліцы для скразнога руху. Пры правядзенні конкурсу па афармленні цэнтра горада такое разуменне падзяліла і журы. Зыходзячы з гэтага, захаванне старых пабудоў па вуліцы Няміга было як непажаданым, так і немагчымым. У якасці кампенсацыі Мінгарвыканкам даручыў Мінскпраекту паклапаціцца пра захаванне будынкаў па вуліцах Астроўскага, Інтэрнацыянальнай і Рэвалюцыйнай, якія ўяўляюць гістарычную каштоўнасць, у "рамках мэтазгоднага і найбольш эфектыўнага афармлення новага цэнтра беларускай сталіцы"[357]. У дадатак да вышэйназваных аргументаў у лісце ад 9 ліпеня 1969 г., адрасаваным Таварыству па ахове помнікаў і ЦК КПБ, старшыня Дзяржбуда У. А. Кароль заявіў пра немагчымасць правядзення падземных работ пад час пракладкі вуліцы, бо рака Няміга працякае па жалезабетоннай трубе пад

[355] Позняк З., Борозна Л. Заботясь о будущем // Правда. 13.4.1969. № 103. С. 3.

[356] НАРБ, ф. 4, воп. 97, спр. 270, арк. 1–2.

[357] Тамсама, арк. 5–6.

дарожным пакрыццём. Аднак ён бачыў неабходнасць захаваць "фрагменты старога горада" ў раёнах, згаданых Кавалёвым[358]. На падставе гэтых прапаноў 14 ліпеня 1969 г. загадчык аддзела па будаўніцтве і камунальнай гаспадарцы ЦК КПБ Ю. Колакалаў параіў Першаму сакратару П. М. Машэраву закрыць справу[359].

З пачатку 1970-х гг. зноў сталі выказвацца думкі пра заняпад беларускай архітэктуры. Так, 5–6 кастрычніка 1970 г. на X з'ездзе беларускіх архітэктараў Л. М. Левін нагадаў пра дух 1920-х гг., які вызначаў не толькі "форму", але і "змест" праектаў[360]. Старшыня Саюза мастакоў В. А. Грамыка, маючы на ўвазе аднастайнасць архітэктуры, выказаў шкадаванне, што ў Мінску няма галоўнага мастака. Пры гэтым ён зноў звярнуўся да ідэі цэласнага ансамбля, які быў характэрны для "сацыялістычнага горада": "Горад – гэта грандыёзны твор мастацтва, які сваёй магутнасцю выклікае пачуццё вялікага эстэтычнага задавальнення, духоўнага прарыву. І менавіта такім і павінен быць сацыялістычны горад"[361]. Нягледзячы на рэзкія выступленні некаторых дэлегатаў, Саюз архітэктараў пакорліва змірыўся з сітуацыяй. У сваёй рэзалюцыі ён толькі мог прызнаць правал у галіне гарадскога і рэгіянальнага планавання і туманна згадаць "павышэнне якасці архітэктуры і будаўніцтва"[362]. У архітэктуры 1970-х гг. прaглядаюцца спробы надаць жылым дамам і адміністрацыйным будынкам сучасны выгляд, каб такім чынам прыцягнуць да іх увагу і адцягнуць ад вартых жалю і аднастайных тыпавых праектаў 1960-х гг. Урэшце ўрбаністычная настальгія змагла рэалізавацца толькі ў 1980-я гг. пры правядзенні рэстаўрацыі Траецкага прадмесця, якое прымыкае да цэнтра на паўночным захадзе і знаходзіцца на процілеглым беразе ракі Свіслач. Тут была створана музейная зона, якая складаецца з дамоў, збудаваных у стылі XIX ст., дзе размясціліся крамы і кафэ (іл. 14)[363].

Пасля адмовы ад утопіі пра "сацыялістычным горад" у другой палове 1960-х для стварэння новага міфа куды больш дзейснага, чым зварот да дарэвалюцыйнай спадчыны, стаў пад'ём антыфашысцкіх і пацыфісцкіх настрояў. Праз дваццаць гадоў пасля заканчэння Другой сусветнай вайны ЦК КПБ прыклаў усе нама-

[358] Тамсама, арк. 7–8.
[359] Тамсама, арк. 9.
[360] ЦДАНТД, ф. 68, воп. 1, спр. 273, арк. 81–84.
[361] Тамсама, арк. 95–104, цытата, арк. 104.
[362] ЦДАНТД, ф. 68, воп. 1, спр. 272, арк. 159–166, тут арк. 161.
[363] Пар.: Траецкае прадмесце. Фотаальбом. 2-е выд. Мінск, 2001.

ганні, каб стварыць вобраз Беларусі – "партызанскай рэспублікі". Рэзалюцыя ад 17 студзеня 1966 г. аб "увекавечанні гераічных подзвігаў савецкіх людзей" утрымлівала праграму з чатырох пунктаў: 1) паглыбленае вывучэнне гісторыі Другой сусветнай вайны; 2) перанос музея Вялікай Айчыннай вайны з вуліцы Карла Маркса ў будынак на Цэнтральнай плошчы, які першапачаткова прадугледжваўся для Нацыянальнага музея; 3) усталяванне мемарыяльных дошак і помнікаў; 4) стварэнне ў Мінску манумента ў памяць пра загінулых салдатаў і партызанаў[364].

На падставе гэтага да ўстаноўленага ў 1954 г. на плошчы Перамогі і дапоўненага ў 1961 г. Вечным агнём абеліска, прысвечанага памяці "вялікіх подзвігаў Чырвонай арміі" і "гераізму савецкіх людзей", дадаліся шматлікія помнікі па ўсёй тэрыторыі горада. Праўда, галоўны мемарыял Беларусі быў створаны ў 1967 г. не ў горадзе, а на тэрыторыі спаленай у час вайны вёскі Хатынь. І тым не менш, у гонар 25-й гадавіны вызвалення Мінска ў 1969 г. за 18 км ад горада на Маскоўскай шашы быў збудаваны Курган Славы. На 35-метровым кургане ўзносяцца ўверх чатыры штыкі абеліска вышынёй 35,6 м, якія сімвалізуюць чатыры франты, што прымалі ўдзел у вызваленні Мінска[365].

26 чэрвеня 1974 г. з нагоды 30-й гадавіны вызвалення Беларусі ад нямецкіх захопнікаў Мінск стаў дзясятым па ліку горадам у Савецкім Саюзе, якому было прысвоена званне "Горад-герой"[366]. Такі гонар быў абгрунтаваны ва Указе Прэзідыума Вярхоўнага Савета тым, што ў барацьбе супраць акупантаў беларуская сталіца вызначылася "заслугамі перад Радзімай", выканала "асаблівую ролю" ў развіцці партызанскага руху і такім чынам магла ўвасабляць мужнасць і гераізм[367]. На дэманстрацыі, якая адбылася

[364] НАРБ, ф. 4, воп. 81, спр. 2000, арк. 6–10.

[365] Пар.: Чернатов В. М. Сынам отчизны. Мемориальные сооружения воинской славы на территории Белоруссии. Минск, 1980. С. 85–125.

[366] Адразу пасля заканчэння вайны была зроблена спроба атрымаць званне "Горада-героя". Пар.: сумесны ліст мінскіх абкама і гаркама КП(б)Б, аблвыканкама і гарвыканкама ў СНК БССР і ЦК КП(б)Б ад 13 чэрвеня 1945 г. Освобождённая Беларусь. Документы и материалы. Кн. 2, №. 55, с. 181–189. У 1965 г. Ленінград, Кіеў, Масква, Адэса, Севастопаль, Валгаград і Брэсцкая крэпасць былі ўганараваны званнем "Горад-герой" і "Крэпасць-герой". У 1973 г. гэтае званне атрымалі Керч і Наварасійск, у 1976 г. – Тула і, нарэшце, у 1985 г. – Мурманск і Смаленск.

[367] Подвиг народа бессмертен. О праздновании 30-летия освобождения Советской Белоруссии от немецко-фашистских захватчиков. Минск, 1975. С. 6.

ў Мінску на два дні пазней, Першы сакратар ЦК КПБ П. М. Машэраў асабліва спыніўся на савецкім патрыятызме, каб раскрыць каштоўнасці гераічнага міфа. Ён гаварыў пра свой "любімы родны горад" як пра "вечнага салдата рэвалюцыі, барацьбіта і патрыёта" і адзначыў як "вялікі подзвіг на полі бітвы", так і "вялікі подзвіг на працоўным фронце". Па словах Машэрава, беларуская сталіца заўсёды аказвала супраціў усім замежным захопнікам і падпарадкоўвалася толькі генеральнай лініі КПСС[368]. Але з-за рознагалоссяў з беларускім кіраўніцтвам толькі праз чатыры гады, г. зн. у 1978 г., Л. І. Брэжнеў уручыў гораду ордэн Леніна і медаль "Залатая Зорка", якія належалі яму па праву[369].

У 1985 г. да 40-годдзя заканчэння вайны на праспекце, што ідзе да паўночнага выезду з горада, быў усталяваны 45-метровы абеліск "Горад-герой", на ім – мемарыяльная дошка з ордэнам Леніна і медалём "Залатая Зорка". Скульптура жанчыны, якая стаіць побач з фанфарай, што ўзносіцца да нябёс, увасабляе Радзіму-маці[370]. Пасля распаду Савецкага Саюза ў 1991 г. у Мінску налічвалася 587 помнікаў і мемарыяльных дошак. У той час як Кастрычніцкай рэвалюцыі прысвячалася толькі 23 месцы памяці, Другой сусветнай вайне – 179[371]. Але да афіцыйных месцаў памяці не належалі ні Мінскае гета, ні канцэнтрацыйны лагер Трасцянец, ні лагер для ваеннапалонных у Масюкоўшчыне. Уладзе былі патрэбныя не канкрэтныя ахвяры або месцы смутку, а абстрактныя героі і патрыятычныя манументы. Замоўчвалася вынішчэнне еўрапейскіх яўрэяў. Культ гераізму і рытуалы памяці знаходзілі водгук у ветэранаў і прышчэплівалі пасляваеннаму пакаленню савецкія каштоўнасці і нормы. Як паказвае стаўленне да музеяў, вопыт вайны шанаваўся больш, чым традыцыі ўласнай нацыянальнай культуры[372].

[368] Тамсама, с. 9–14.

[369] Пар.: Бессмертен твой подвиг, Минск. Пребывание Генерального секретаря ЦК КПСС, Председателя Президиума Верховного Совета СССР товарища Брежнева в городе-герое Минске на торжествах, посвящённых вручению городу ордена Ленина и медали "Золотая Звезда" 25 июня 1978 года. Минск, 1978.

[370] Пар.: Атлас памятников архитектуры и мемориальных комплексов Белоруссии / под общ. ред. В. А. Чантурия. Минск, 1988. С. 98–99.

[371] Памятники Минска. Минск, 1991. С. 4.

[372] Пар.: Chiari B., Maier R. Volkskrieg und Heldenstädte: Zum Mythos des Großen Vaterländischen Krieges in Weißrußland // Mythen der Nationen. 1945 – Arena der Erinnerungen / Hrsg. v. Flacke M. Mainz, 2004. Bd. II. S. 737–751.

## 3 Рэканструкцыя горада

### а) Арганізацыя аднаўлення

Мяркуючы па паведамленнях “Советской Белоруссии”, восенню 1944 г. Мінск жыў аднаўленнем. Лозунг дня гучаў так: “Адновім родны горад!” Гэты лозунг знаходзіў адлюстраванне не толькі ў загалоўках газет, але і ва ўлётках і надпісах на дамах (іл. 15)[373]. Для дасягнення мэты ў лістападзе 1944 г. партыя і дзяржава заснавалі Упраўленне па аднаўленні Мінска. Да разбору руін і завалаў было прыцягнута мясцовае насельніцтва, апрача таго, на аднаўленне горада набіралі будаўнікоў з правінцыі і выкарыстоўвалі працу нямецкіх ваеннапалонных. Пры ажыццяўленні гэтай стратэгіі партыйныя кіраўнікі дапусцілі шэраг пралікаў і памылак. Па-першае, на думку Масквы, гарадское планаванне павінна было азначаць не “аднаўленне” і абнаўленне, а “рэканструкцыю” і новую забудову[374]. Па-другое, знішчэнне гарадскога грамадства ў выніку палітыкі Вялікага тэрору і нямецкай акупацыі прывяло да таго, што не існавала выразнага суб'екта, які мог ідэнтыфікаваць сябе з беларускай сталіцай. Па-трэцяе, з прычыны недастатковай колькасці персаналу і матэрыялаў аж да канца 1940-х гг. Упраўленне па аднаўленні Мінска праяўляла сябе абсалютна неэфектыўна. У выніку першыя два пасляваенныя гады ў галіне горадабудаўніцтва адрозніваліся застоем і хаосам.

Пачатак гісторыі аднаўлення Мінска летапісец павінен будзе датаваць 8 кастрычніка 1944 г., – так гучыць каментар журналіста Я. І. Садоўскага ў “Советской Белоруссии”[375]. Пры гэтым

[373] Пар. таксама ілюстрацыю са зборніка “Мінск учора і сёння” (Мінск, 1988. С. 201) і ўспаміны пісьменніка С. Грахоўскага. Граховский С. Непобедимый и юный // Мы расскажем о Минске. Пер. с бел., 2-е, перераб. и доп. изд. Минск, 1966. С. 69–114, тут с. 80.

[374] Пар.: ч. II. 1 и III. 1. б.

[375] Начало массовых работ по восстановлению Минска. Будем работать не покладая рук. Из руин поднимем любимую столицу // СБ. 10.10.1944. № 190. С. 3. Пар.: Bohn, M. T. Feierte die russische Zarin den sozialistischen Frauentag? Reflexionen über Stalin in Efim Sadovskijs Tagebuch // Kollektivität und Individualität. Der Mensch im östlichen Europa. Festschrift für Prof. Dr. Norbert Angermann zum 65. Geburtstag // Hrsg. v. Brüggemann K., Bohn T. M., Maier K. Hamburg, 2001. S. 341–354. Пар. таксама ўспаміны пісьменніка С. Грахоўскага: Непобедимый и юный. С. 76.

гаворка ішла пра першы нядзельнік, на якім жыхары Мінска разбіралі руіны і даставалі цэглу для будаўніцтва. Гэтае мерапрыемства, падрыхтоўка да якога пачалася ў канцы верасня і набыла размах шырокамаштабнай прапагандысцкай і лагістычнай кампаніі ЦК КП(б)Б, мела вялікі поспех: 33 тыс. чалавек, гэта значыць больш за трэць усяго насельніцтва, прынялі ўдзел у разборы руін[376]. Аднак праз дзень Бюро гарадскога камітэта КП(б)Б указала на тое, што не ўсе 38 тыс. запланаваных чалавек узялі ўдзел у нядзельніку. З аднаго боку, не кожнае прадпрыемства ці арганізацыя накіравалі сваіх прадстаўнікоў; з другога – колькасць "неарганізаванага насельніцтва", гэта значыць занятых вядзеннем хатняй гаспадаркі жанчын, склала толькі 4500 чалавек. Урэшце прыборка цэглы прайшла не так паспяхова, як планавалася[377].

У наступныя тыдні гатоўнасць насельніцтва працаваць пастаянна змяншалася. 15 кастрычніка на вуліцах горада працавала 30 тыс. чалавек, 12 лістапада – толькі 16 тыс.[378]. ЦК КП(б)Б тлумачыў зніжэнне зацікаўленасці людзей тым, што партыя не правяла адпаведную растлумачальную працу. На справе палітычная агітацыя "прапісвалася" як лекі ў тых выпадках, калі адказным работнікам станавілася зразумела, што загады як рэгулёўны механізм не дзейнічаюць. Сімптаматычная для дынамікі працэсаў планавай эканомікі ў гэтай сувязі выснова ЦК наконт таго, што асобныя прадпрыемствы выкарыстоўвалі прадугледжаныя для нядзельніка працоўныя змены як звышуроч-

[376] Пар. пратакол паседжання Бюро ЦК КП(б)Б ад 30 верасня 1944 г. і заклік "Советской Белоруссии" ад 7 і 8 кастрычніка 1944 г. НАРБ, ф. 4, воп. 61, спр. 79, арк. 4–5; Все, как один, выйдем на восстановление родного города! // СБ. 7.10.1944. № 188. С. 1; Все на стройку! Сегодня первый массовый выход трудящихся на восстановление Минска // СБ. 8.10.1944. № 198. С. 3.

[377] Пар. пратакол паседжання Бюро ЦК КП(б)Б ад 9 кастрычніка 1944 г. і паведамленне аддзела інфармацыі ЦК КП(б)Б ад 9 кастрычніка 1944 г. ДАМВ, ф. 69, воп. 1, спр. 1, арк. 81–84; Освобождённая Беларусь. Документы и материалы. Кн. 1, № 65, с. 222–225. Пар. таксама паведамленне прадстаўніка Народнага Камісара па аднаўленні ў "Советской Белоруссии". Каменский В. Восстановим родную столицу – Минск. Организация труда на восстановительных работах // СБ. 14.10.1944. № 193. С. 3.

[378] Восстанавливать Минск ежедневно, по графику! // СБ. 14.11.1944. № 212. С. 2; Бельский И. Минчане восстанавливают свой город // СБ. 18.11.1944. № 215. С. 3.

ную працу ў інтарэсах уласнага прадпрыемства[379]. Акрамя таго, для “разняволенай” атмасферы Мінска на працягу двух гадоў пасля вызвалення горада і да пачатку ждана ўшчыны было характэрна і паслабленне цэнзуры[380]. Напрыклад, у “Советской Белоруссии” ад 22 лістапада 1944 г. намеснік народнага камісара па жыллёвым і грамадзянскім будаўніцтве У. Г. Каменскі скардзіўся на слабы ўдзел насельніцтва ў разборы руін. Прадпрыемствы, арганізацыі і “неарганізаванае насельніцтва”, па яго словах, усё часцей ухіляліся ад расчысткі горада. І прычынай было не дрэннае надвор’е, а халатнасць адказных работнікаў[381]. Іншымі словамі, партыйнае і дзяржаўнае кіраўніцтва было здольнае толькі на тое, каб перакладаць адказнасць за кепскую арганізацыю на ніжэйшых работнікаў. Напярэдадні зімы насельніцтва, відавочна, перш за ўсё турбавалі ўмовы ўласнага жыцця. А кіраўніцтва прадпрыемстваў не магло вызваляць працоўную сілу для работ, не звязаных з уласнай вытворчасцю. Сітуацыя не змянілася і ў пачатку 1945 г. Так, напрыклад, 17 траўня 1945 г. Гарадскі камітэт КП(б)Б адзначыў слабы ўдзел насельніцтва ў працах па аднаўленні Сталінскага раёна. 15 траўня з запланаваных 8838 чалавек на нядзельную змену з’явілася 1412 чалавек, што склала толькі 16%. Удзел неарганізаванага насельніцтва горада Мінска быў ацэнены як “абсалютна слабы”. Мабыць, ніхто не быў гатовы марнаваць свой час на непрадуктыўную працу: паводле ацэнак гарадскога камітэта, асноўная задача складалася ў тым, каб перавозіць цэглу і будаўнічае смецце “з аднаго кута ў другі”[382].

У такіх умовах першапачатковы энтузіязм насельніцтва Мінска скончыўся нічым. У той час як партыя шляхам скрупулёзнага падліку сабранай ацалелай цэглы спрабавала даказаць адваротнае, удзел жанчын у разборы руін і аднаўленні горада можна ацаніць толькі як чыста сімвалічны (іл. 16). З-за нястачы, што перажывалі жыхары горада, ні пра якую аб’яднальную сілу нядзельнікаў, за выключэннем першых тыдняў, не ішло і гаворкі. Новая спроба мабілізацыі насельніцтва была зроблена ЦК КП(б)Б толькі ў 1950 г. І сапраўды, азеляненне сталіцы

[379] Пар. пратакол паседжання 31 кастрычніка 1944 г. НАРБ, ф. 4, воп. 61, спр. 91, арк. 22–24.

[380] Пар.: ч. II. 1.

[381] Каменский В. О некоторых насущных вопросах восстановления Минска // СБ. 22.11.1944. № 218. С. 3

[382] Пар.: паседжанне Бюро Мінскага гарадскога камітэта КП(б)Б ад 17 траўня 1945 г. ДАМВ, ф. 69, воп. 1, спр. 20, арк. 240–241.

ў першай палове 1950-х гг. было праведзена дзякуючы актыўнаму ўдзелу яе жыхароў[383].

Такім чынам, выказаную Уладзімірам Карпавым у рамане "За годам год" ідэю аб тым, што дзякуючы сваім жыхарам пасляваенны Мінск паўстаў з руін, як фенікс з попелу, можна ахарактарызаваць толькі як легенду. Зыходзячы з гэтага, неабходна падвергнуць крытычнай ацэнцы працу дзвюх іншых груп, якія знаходзіліся ў распараджэнні Упраўлення па аднаўленні Мінска, – будаўнікоў з правінцыі і ваеннапалонных.

Непасрэдна пасля таго, як ЦК КП(б)Б мабілізаваў насельніцтва Мінска на разбор руін і завалаў, 3 кастрычніка 1944 г. усім абласцям БССР было загадана накіраваць будаўнічыя брыгады ў Мінск[384]. З аднаго боку, пастанова адпавядала імкненню сканцэнтраваць усе рэсурсы ў сталіцы; з другога – дзякуючы гэтай меры аднаўленне Мінска было абвешчана справай усёй рэспублікі. Але гэтая акцыя так і засталася нерэалізаванай. У дакументах можна знайсці пацвярджэнне дрэнных умоў жыцця рабочых, якія прыбылі ў лістападзе і снежні: у спехам абсталяваных інтэрнатах панавалі холад і цемра, а таксама бруд і беспарадак[385]. Не ў апошнюю чаргу па гэтай прычыне да пачатку 1945 г. Мінск пакінулі 447 рабочых[386]. Паколькі аднаўленне сталіцы яшчэ не было пачата, можна меркаваць, што некаторыя кваліфікаваныя рабочыя, востра запатрабаваныя ў сваіх рэгіёнах, былі занятыя ў большай ці меншай ступені бессэнсоўнай працай па разборы руін.

Прыцягненне іншагародніх спецыялістаў стала неабходным толькі пасля заканчэння вайны, калі з прыняццем Генеральнага плана былі створаны перадумовы для аднаўлення горада. Аднак і мірны час паказаў, што ў рашэннях партыйнага і дзяржаўнага кіраўніцтва былі памылкі. Такім чынам, з-за недахопаў у арганізацыі аднаўленне сталіцы ішло не па плане, а прабуксоўвала. Гэта можна выразна прасачыць на прыкладзе лёсу трох тысяч будаўнікоў, прыцягнутых да працы Саветам Народных Ка-

[383] Пар. вынікі, подведзеныя на паседжаннях ЦК КП(б)Б ад 29 жніўня 1950 г., 14 жніўня 1951 г., 29 сакавіка 1952 г. і 19 траўня 1955 г. НАРБ, ф. 4, воп. 81, спр. 342, арк. 16–17; спр. 462, арк. 4–8; спр. 562, арк. 4–7; спр. 856, арк. 9–16.

[384] НАРБ, ф. 4, воп. 61, спр. 81, арк. 20.

[385] Пар.: паседжанне ЦК КП(б)Б 19 снежня 1944 г. НАРБ, ф. 4, воп. 61, спр. 109, арк. 22–23.

[386] Пар.: паседжанне Бюро гарадскога камітэта КП(б)Б ад 22 сакавіка 1945 г. ДАМВ, ф. 69, воп. 1, спр. 26, арк. 136–138.

місараў БССР 7 ліпеня 1945 г. і Цэнтральным Камітэтам КП(б)Б 28 жніўня 1945 г. Ужо той факт, што зацвярджэнне гэтай рэзалюцыі двума органамі заняло больш за месяц, з'яўляецца характэрнай прыкметай збояў у працы цэнтралізаванай сістэмы кіравання[387]. Найбольш праблематычным аказалася тое, што дзяржаўнае і партыйнае кіраўніцтва на месцах не заўсёды карысталася аўтарытэтам. Нягледзячы на тое, што вярбоўшчыкі былі разасланы ва ўсе абласныя цэнтры БССР, да 8 кастрычніка 1945 г. у сталіцу прыбыло толькі 206 будаўнікоў[388]. Пра прычыны гэтай няўдачы застаецца толькі здагадвацца: ці ЦК і СНК не мелі выразнага ўяўлення, як мала было будаўнікоў пасля вайны, ці партыйнае кіраўніцтва на перыферыі не магло адправіць у сталіцу пэўную колькасць рабочых, так патрэбных Мінску. І, нарэшце, неабходна таксама прыняць да ўвагі, што мабільнасць сялян была абмежаваная з прычыны вядзення імі натуральнай гаспадаркі. Для адказу на пытанне аб тым, чаму колькасць так званых іншагародніх спецыялістаў у Мінску склала да 24 чэрвеня 1946 г. усяго толькі 1233 чалавекі, гэтыя аргументы здаюцца цалкам пераканаўчымі. Да таго моманту, калі Генеральны план сталіцы быў гатовы, для ўдзелу ў аднаўленчых работах быў прыцягнуты толькі 41% рабочых ад першапачаткова запланаванай колькасці[389].

Было нашмат больш складана ўключыць людзей у працу, чым іх набраць. Паводле справаздачы намесніка старшыні гарадскога Савета Я. Ф. Пастэрнака ад 26 жніўня 1946 г., вялікая колькасць рабочых дэзерціравала з будоўляў сталіцы з-за катастрафічных умоў жыцця. Акрамя таго, што ў "времянках" не было ніякіх выгод, рабочым не выдаваліся належныя прэміі. Людзі баяліся за асабістыя рэчы, таму вымушаны былі пакідаць у інтэрнатах вартаўнікоў[390]. Да ўсяго іншага, іншагароднія будаўнікі сутыкаліся з варожасцю ў адносінах да іх. Як сведчаць справаздачы кіраўніка Упраўлення па аднаўленні Мінска П. І. Катаводава ад 22 кастрычніка і 5 лістапада 1946 г., справа даходзіла нават да нападаў. Так, цывільныя і апранутыя ў ваенную форму людзі напалі ноччу на размешчаны за 4–5 км ад

[387] Пар.: паседжанне ЦК КП(б)Б ад 28 жніўня 1945 г. НАРБ, ф. 4, воп. 61, спр. 191, арк. 23.

[388] Пар.: паседжанне ЦК КП(б)Б ад 9 кастрычніка 1945 г. НАРБ, ф. 4, воп. 61, спр. 205, арк. 16.

[389] Пар.: даклад намесніка старшыні Мінгарвыканкама ад 26 жніўня 1946 г. ДАМВ, ф. 6, воп. 4, спр. 143, арк. 207–209.

[390] Тамсама.

Мінска барачны раён Козырава, збілі рабочых і адабралі маёмасць. У выніку нападу 20 верасня, які ажыццявілі дваццаць узброеных чалавек, восем чалавек атрымалі лёгкія раненні і два – цяжкія. У сувязі з гэтым Катаводаў расцэньваў пагрозу гвалту ў адносінах да рабочых у бліжэйшыя Кастрычніцкія святы як "палітычную". На думку Катаводава, з боку ваеннага каменданта горада і міліцыі прымалася недастаткова мераў у барацьбе з "бандытызмам"[391]. Паводле справаздачы Мінскага абласнога камітэта партыі канца 1946 г., рабочыя Упраўлення па аднаўленні Мінска, якія жылі ў пасёлку па вуліцы Фурманава, таксама пакутавалі ад тэрору з боку рэпатрыяваных з пятага будаўнічага батальёна. Гвалт і пабоі ў кастрычніку былі частай з'явай[392]. Відавочна, тыя, што нападалі, бачылі ў будаўніках (а гэта былі пераважна выхадцы з вёскі) свайго роду "дзічыну для палявання". У святле разгулу хуліганства пра ўсеагульны кантроль над горадам з боку ўладаў не ішло і гаворкі. Такія інцыдэнты былі хутчэй насмешкай над аднаўленнем сталіцы, якое прапагандавалася па ўсёй рэспубліцы.

У першыя два пасляваенныя гады набор будаўнічых рабочых у сталіцы і перыферыі толькі часткова пакрываў патрэбу, таму незаменным у аднаўленні горада быў патэнцыял ваеннапалонных аж да вяртання іх на радзіму ў 1947 г.[393]. 1 сакавіка 1947 г. у мінскім лагеры № 168 знаходзілася 28 075 ваеннапалонных, іх выкарыстоўвалі на будоўлях розных міністэрстваў і ўпраўленняў. Так, ва Упраўленні па аднаўленні Мінска былі задзейніча-

[391] НАРБ, ф. 781, воп. 1, спр. 6, арк. 126, 130.

[392] ДАМВ, ф. 1, воп. 10, спр. 100, арк. 67–67адв.

[393] Беларускі гісторык Анатоль Шаркоў, спасылаючыся на заблытаныя і супярэчлівыя звесткі архіваў ЦК КПБ і Міністэрства ўнутраных спраў БССР, падае звесткі пра колькасць ваеннапалонных у Беларусі, якая мянялася наступным чынам: 1945 г. – 83 159 чалавек, 1946 г. – 103 тыс. чалавек (больш за 88 тыс. ваеннапалонных і інтэрнаваных, а таксама 14 019 загінулых у рабочых батальёнах Міністэрства ўзброеных сіл), канец 1947 г. – 47 тыс. чалавек і ў другім паўгоддзі 1949 г. – 9917 чалавек (9246 ваеннапалонных і 671 інтэрнаваных). У студзені 1950 г. нарэшце было толькі 1066 ваеннапалонных, якія засталіся на беларускай тэрыторыі, з якіх 785 былі прызнаны ваеннымі злачынцамі і 281 чалавек знаходзіўся пад следствам. Шарков А. В. Военнопленные и интернированные на территории Беларуси. Роль органов внутренних дел в их содержании и трудовом использовании (1944–1951). Минск, 1997. С. 29–30, 34–35, 42, 46; Пар. таксама: Шарков А. В. Архипелаг ГУПВИ на территории Беларуси. 1944–1951 гг. Минск, 2003.

ны 3323 ваеннапалонныя (дадаткова 923 ваеннапалонныя – на аднаўленні будынка Акадэміі навук), пры будаўніцтве аўтамабільнага завода – 5791 і пры Галоўным упраўленні па індустрыялізацыі – 5535 (з іх 2237 чалавек – на будаўніцтве трактарнага завода)[394].

Прававой базай для прыцягнення ваеннапалонных да працэсу аднаўлення БССР стала пастанова Савета Народных Камісараў ад 10 і 16 лютага 1945 г. “Аб размяшчэнні і занятасці мабілізаваных (інтэрнаваных) немцаў”. Адказнасць за прыцягненне і ўтрыманне “ваеннапалонных” (гэты тэрмін стаў афіцыйным з траўня 1945 г.) была ўскладзена на будаўнічыя арганізацыі або падначаленыя ім упраўленні. Прадугледжвалася стварэнне працоўных батальёнаў і размяшчэнне іх у казармах. Ахова павінна была арганізоўвацца сіламі ўласнага персаналу – па ўзгадненні з Народным камісарыятам унутраных спраў (НКУС). Паход на працу павінен быў праходзіць без аховы, але пад наглядам кіраўніка. Умовы працы – працоўны час, працоўныя нормы (павышэнне з 60% у першым месяцы да 100% у трэцім месяцы), заробак і харчаванне, разам з дадатковым рацыёнам за асаблівыя заслугі, – прыраўноўваліся да тых, якія мела савецкае цывільнае насельніцтва. Са штомесячнага заробку адымаліся сродкі на пражыванне (харчаванне, жыллё і ахова) і 10% – на агульныя патрэбы (медыцынскі пункт, культурная работа). Падкрэслівалася, што лагеры нясуць выдаткі за хворых і непрацаздольных. Такім чынам, лагеры павінны былі функцыянаваць як аўтаномныя гаспадаркі[395].

Асноўная праблема такой сістэмы складалася ў тым, што будаўнічыя арганізацыі і прадпрыемствы выкарыстоўвалі працу ваеннапалонных, але лагерам за гэта не плацілі[396]. Таму лагеры больш не накіроўвалі прадугледжаную колькасць рабочых, а самастойна размяркоўвалі ваеннапалонных, матывуючы гэта

[394] Пар.: план Міністэрства ўнутраных спраў ад 10 красавіка 1947 г. па размеркаванні ваеннапалонных на мінскіх будаўнічых і прамысловых аб'ектах. АМУС, ф. 25, воп. 2, спр. 16, арк. 141–146.

[395] НАРБ, ф. 780, воп. 1, спр. 5, арк. 7–8, 9 (дадатак), а таксама арк. 13–14, 15 (дадатак); ф. 781, воп. 1, спр. 3, арк. 12–12адв. Пар.: Hilger A. Deutsche Kriegsgefangene in der Sowjetunion, 1941–1956. Kriegsgefangenenpolitik, Lageralltag und Erinnerung. Essen, 2000.

[396] 1 чэрвеня 1946 г. прадпрыемствы павінны былі дзесяцi беларускім лагерам 18 858 000 руб.; доўг мінскаму лагеру № 168 налічваў 6 536 000 руб. Пар.: даклад Міністэрства ўнутраных спраў ад 3 сакавіка 1946 г. АМУС, ф. 50, воп. 2, спр. 21, арк. 84–87.

іх хваробай або тым, што яны занятыя на іншай працы[397]. Паводле справаздачы Міністэрства ўнутраных спраў ад 3 траўня 1946 г. аб выкарыстанні ваеннапалонных у першым квартале 1946 г., працоўны патэнцыял быў выкарыстаны толькі на 65,2%: 55,3% былі занятыя на прадпрыемствах, 7,9% – на ўнутрылагернай працы і ў эканамічнай службе, 1,6% – у ахове і 0,4% – у вытворчасці прадметаў спажывання. Астатнія 26,8% складалі інваліды і хворыя, 8% ваеннапалонных адносіліся да нявызначанай групы, за якой, магчыма, стаялі афіцыйна вызваленыя ад працы афіцэры[398].

Абыходжанне з ваеннапалоннымі павінна было быць дэ-юрэ гуманным. У сувязі з гэтым 18 снежня 1945 г. намеснік Народнага камісара па жыллёвым будаўніцтве заявіў, што ваеннапалонныя павінны разглядацца як жаданая рабочая сіла і выкарыстоўвацца ў інтарэсах выканання працоўнай нормы[399]. Для павышэння прадуктыўнасці працы брыгад з ваеннапалонных 21 траўня 1946 г. ЦК КП(б)Б даў указанне прарабам і дырэктарам заводаў арганізаваць па месцы працы дадатковае гарачае харчаванне, продаж тытунёвых вырабаў і прадметаў першай неабходнасці[400]. Відавочна, што ахова ваеннапалонных спачатку была слабой. 15 сакавіка 1946 г. кіраўнік лагернага аддзялення № 12, якое знаходзілася ў падпарадкаванні галоўнага лагера № 168, інфармаваў кіраўніка Упраўлення па аднаўленні Мінска М. Ляванава, што суправаджэнне ваеннапалонных на працу не можа адбывацца толькі адным нарадам ад прадпрыемстваў, таму за кошт ведамства Ляванава неабходна наняць дадатковых ахоўнікаў[401]. Сапраўды, да восені 1946 г. Упраўленне па аднаўленні Мінска дапускала наяўнасць невялікай колькасці груп неахоўных ваеннапалонных. Вялікі розгалас атрымалі ўцёкі дзесяці ваеннапалонных, якія працавалі на нарыхтоўцы дроў за 30–35 км ад

[397] ДАМВ, ф. 69, воп. 1, спр. 62, арк. 71/72; НАРБ, ф. 4, воп. 29, спр. 331, арк. 59–61, воп. 61, спр. 271, арк. 11–15. З 65 296 ваеннапалонных БССР да 30 красавіка 1946 г. адна трэцяя была непрацаздольная па стане здароўя: 4550 чалавек знаходзіліся ў лазарэце, 16 685 – у санітарных аддзяленнях. У галоўным мінскім лагеры № 168 налічвалася 22 594 ваеннапалонных, з іх у лазарэце – 1850, у санітарных аддзяленнях – 4538. НАРБ, ф. 4, воп. 29, спр. 331, арк. 35.

[398] АМУС, ф. 50, воп. 2, спр. 21, арк. 84–87.

[399] НАРБ, ф. 781, воп. 1, спр. 3, арк. 64–65.

[400] НАРБ, ф. 4, воп. 61, спр. 271, арк. 11–15; ф. 781, воп. 1, спр. 4, арк. 19–22.

[401] НАРБ, ф. 781, воп. 1, спр. 6, арк. 50.

Мінска і дастаўлялі іх у горад[402]. Для павышэння прадукцыйнасці працы і ўзмацнення кантролю над ваеннапалоннымі ў распараджэнні Савета Міністраў БССР ад 10 красавіка 1947 г. гаварылася пра стварэнне "нармальных умоў жыцця": забеспячэнне жылой плошчай у памеры 2 кв. м на чалавека; на 15 ваеннапалонных – адзін рукамыйнік; два разы на месяц павінны былі прывозіць паліва, тры разы на месяц мыць бялізну. Для больш эфектыўнага выкарыстання працоўнага часу адлегласць, якую ваеннапалонныя праходзілі пешшу да месца працы, скарачалася да 3 км. Для таго каб прадухіліць магчымасці ўцёкаў малых груп, працоўныя групы павялічылі да 75 чалавек[403].

Пра напады насельніцтва на ваеннапалонных у дакументах нічога не сказана. Наадварот, у адпаведнасці з лістом намесніка міністра ўнутраных спраў ад 17 верасня 1946 г., на некаторых аб'ектах Упраўлення па аднаўленні Мінска ваеннапалонныя былі задзейнічаны разам з мясцовымі жанчынамі. Гэта прывяло да ўзнікнення "інтымных сувязяў"[404]. 9 снежня 1946 г. намеснік міністра жыллёвага будаўніцтва далажыў, што як абслуговы персанал, так і ваеннапалонныя лагернага аддзялення № 20 (Акадэмія навук) жывуць разам у невыносных умовах[405]. Гэтыя прыклады пацвярджаюць: насельніцтва з ваеннапалоннымі знаходзіла агульную мову. Відавочна, людзям было дастаткова, што здзейснілася адплата: у выніку паказальнага працэсу над 18 нямецкімі ваеннапалоннымі, які праходзіў у Мінску з 15 да 29 студзеня 1946 г., 30 студзеня на іпадроме ў прысутнасці 100 тыс. чалавек пакаралі смерцю 14 ваенных злачынцаў[406].

[402] НАРБ, ф. 781, воп. 1, спр. 5, арк. 72.
[403] НАРБ, ф. 780, воп. 1, спр. 21, арк. 1–2.
[404] Праўда, умовы жыцця ваеннапалонных падпадалі пад крытыку: старыя будынкі не маглі супрацьстаяць дрэннаму надвор'ю і ветру. Печы былі няспраўныя. Не было ні санітарных памяшканняў, ні пральняў. З-за адсутнасці транспартных сродкаў было немагчыма прывозіць неабходныя прадукты харчавання. НАРБ, ф. 780, воп. 1, спр. 16, арк. 162; ф. 781, воп. 1, спр. 5, арк. 72.
[405] НАРБ, ф. 781, воп. 1, спр. 5, арк. 81.
[406] Шарков. Военнопленные... С. 139. Пар.: Messerschmidt M. Der Minsker Prozeß 1946. Gedanken zu einem sowjetischen Kriegsverbrechertribunal // Vernichtungskrieg. Verbrechen der Wehrmacht 1941–1944 / Hrsg. v. Heer H., Naumann K. Hamburg, 1995. S. 551–568; Zeidler M. Der Minsker Kriegsverbrecherprozeß vom Januar 1946. Kritische Anmerkungen zu einem sowjetischen Schauprozeß gegen deutsche Kriegsgefangene // Vierteljahreshefte für Zeitgeschichte. 2004. № 52. S. 211–244.

Падводзячы вынік, можна канстатаваць, што з прычыны недастатковай арганізацыі і бюракратычных затрымак прыцягненне працоўнай сілы з шэрагаў мясцовага насельніцтва, іншагародніх спецыялістаў і ваеннапалонных не апраўдала чаканняў партыйнага і дзяржаўнага кіраўніцтва. Маштаб гаротнага становішча адлюстроўваецца ў рэзалюцыі Савета Народных Камісараў БССР ад 25 жніўня 1945 г. Згодна з гэтай рэзалюцыяй, план па аднаўленні Мінска быў выкананы да 1 жніўня толькі на 10,4%. У першым паўгоддзі 1945 г. ні адна "каробка" (так у народзе называлі выгаралыя дамы) не была адноўлена. Адказнасць за гэта ўсклалі на мясцовыя ўстановы і арганізацыі: а) Выканаўчы камітэт гарадскога Савета выкарыстаў сродкі на будаўніцтва не па прызначэнні і займаўся толькі "каробкамі", якія, паводле Генеральнага плана, падлягалі зносу; б) Упраўленне па здабычы дрэва ("Главснаблес") выдала будаўнічы матэрыял у недастатковай колькасці і нерацыянальна яго размеркавала; в) Народны камісарыят унутраных спраў (НКУС) не забяспечыў для аднаўленчых работ запланаваныя 6 тыс. ваеннапалонных; г) Народны камісарыят па жыллёвым будаўніцтве выкарыстоўваў не па профілі 3800 набраных з правінцыі рабочых[407]. Пра тое, як недахоп персаналу і матэрыялаў адбіўся на працы Упраўлення па аднаўленні Мінска, можна меркаваць па справаздачы Ляванава ад 6 кастрычніка 1945 г. У ім Ляванаў звярнуў увагу на тое, што яго ведамства не можа выканаць план, бо толькі 4% ваеннапалонных валодалі будаўнічай справай. З 5270 ваеннапалонных, якія знаходзіліся ў Мінскім лагеры № 168, толькі 4 тыс. былі працаздольнымі. З іх толькі 487 чалавек, а не 1500, як было прадугледжана, валодалі будаўнічымі спецыяльнасцямі. Такім чынам, пры патрэбе ў 2870 спецыялістаў было 790 (табліца 2). З прычыны гэтага Упраўленне па аднаўленні Мінска паспрабавала павялічыць колькасць працоўных за кошт людзей, якія толькі пачыналі асвойваць прафесіі – 211 цывільных асоб і 380 ваеннапалонных. Далей Ляванаў паспрабаваў выразна паказаць, што з неабходнай для працы тэхнікі ў наяўнасці мелася толькі невялікая колькасць (табліца 3)[408]. Паводле яго звестак, аднаўленне сталіцы, якое прапаганда апісвала як грандыёзнае, грунтавалася на ручной працы некваліфікаванай рабочай сілы.

[407] Замест прадугледжаных 80 чалавек кіраўнічы персанал налічваў толькі 50. НАРБ, ф. 781, воп. 2, спр. 5, арк. 37–43.
[408] НАРБ, ф. 780, воп. 1, спр. 3, арк. 103–120.

**Табліца 2.** Рабочыя Упраўлення па аднаўленні Мінска на 6 кастрычніка 1945 г.

| Прафесіі | Патрэба | Колькасць занятых | У працэсе атрымання адукацыі | |
|---|---|---|---|---|
| | | | Добраахвотнікі | Выеннапалонныя |
| Цесляры | 700 | 351 | 22 | 300 |
| Каменшчыкі | 400 | 118 | 13 | 50 |
| Бетоншчыкі | 50 | 13 | 13 | – |
| Пячнікі | 100 | 15 | 7 | – |
| Сталяры | 300 | 65 | 36 | 10 |
| Тынкоўшчыкі | 500 | 67 | 48 | 10 |
| Маляры | 500 | 72 | – | – |
| Страхары | 60 | 6 | 10 | 10 |
| Паркетчыкі | 40 | – | 2 | – |
| Арматуршчыкі | 20 | – | – | – |
| Слесары | 200 | 83 | 7 | – |
| Вярстоўнікі | – | – | 13 | – |
| Вадзіцелі | | | 38 | |
| Электраман-цёры | | | 2 | |
| Усяго | 2870 | 790 | 211 | 380 |

*Крыніца:* НАРБ, ф. 690, воп. 3, спр. 132, арк. 392.

**Табліца 3.** Матэрыяльная частка Упраўлення па аднаўленні Мінска на 6 кастрычніка 1945 г.

| | Патрэба | Наяўнасць |
|---|---|---|
| Металаапрацоўчыя станкі | 126 | 26 |
| Дрэваапрацоўчыя станкі | 118 | 30 |
| Драўляныя рамы | 10 | 4 |
| Ручныя лябёдкі | 40 | 3 |
| Механічныя лябёдкі | 80 | 8 |
| Маторы | 300 | 85 |
| Камнядомкі | 6 | 1 |
| Транспарцёрныя стужкі | 30 | 3 |
| Трэйлеры маторнага паліва | 6 | 1 |
| Сартавальныя машыны | 8 | – |
| Механічныя варштаты для ўсталявання калоды | 12 | 1 |
| Кампрэсары | 10 | – |
| Каляровая лесвічная клетка | 50 | 5 |
| Каляровы рашпіль | 5 | – |
| Вежавыя краны | 100 | 4 |

*Крыніца:* НАРБ, ф. 690, воп. 3, спр. 132, арк. 392.

Гэтае катастрафічнае становішча спачатку ніякім чынам не мянялася. У лютым 1946 г. кіраўнік Упраўлення па аднаўленні Мінска М. Лянанаў інфармаваў старшыню Дзяржплана І. Л. Чорнага аб разыходжанні паміж патрэбамі і наяўнасцю: а) план прадугледжваў прыцягненне 6 тыс. ваеннапалонных, на самай справе на працу з'явілася толькі 1200–1600 чалавек; б) патрэба ў добраахвотнай рабочай сіле з Мінска складала 2 тыс. чалавек, рэальная колькасць добраахвотнікаў у сталіцы не перавышала 600 чалавек; в) рэкрутаванне з правінцыі павінна было ахапіць 3 тыс. будаўнікоў, рэальна завербавалі толькі 402 чалавекі, у большасці некваліфікаваных жанчын. Пасля таго як з кастрычніка была прыпынена пастаўка матэрыялаў, працавалі выключна ўручную[409]. Скаргі Лянанава былі пачутыя, калі 6 траўня 1946 г. ЦК КП(б)Б і СМ БССР пацвердзілі, што колькасць цывільных асоб, неабходных для аднаўлення, складае 9 тыс. чалавек, і адначасова распарадзіліся правесці арганізаваную вярбоўку 7 тыс. будаўнікоў з правінцыі[410]. Пра наступствы названай меры ў дакументах нічога не сказана. Калі параўнаць гэтую пастанову з нерэальнымі планамі па прыцягненні працоўных з ліку ваеннапалонных, то можна выказаць здагадку, што справа зайшла ў тупік. Што тычыцца ваеннапалонных, то колькасць, запланаваная Упраўленнем па аднаўленні Мінска, а менавіта 6 тыс. чалавек, так і не была дасягнута: 30 красавіка 1946 г. у яго распараджэнні знаходзіліся 4250 ваеннапалонных[411], 14 жніўня 1946 г. іх колькасць складала толькі 3400[412]. 12 чэрвеня 1947 г. мінскі лагер ваеннапалонных накіраваў для аднаўлення сталіцы са скарочанага на той момант кантынгенту, які складаў 4 тыс. чалавек, толькі 2600 ваеннапалонных, або 65–70% ад патрэбнай колькасці[413].

З гэтага відаць, што такімі вынікамі работы Упраўленне па аднаўленні Мінска дыскрэдытавала сябе ў вачах кіраўнічых дзяржаўных і партыйных інстанцый. Пры высвятленні абставінаў выявілася, што рэпутацыя кіраўнічага персаналу была пастаўлена пад сумнеў. 24 студзеня 1946 г. Народны камісар па дзяржаўным кантролі І. П. Валошын праінфармаваў Старшыню СНК БССР і Першага сакратара ЦК КП(б)Б П. К. Панамарэнку аб выніках праверкі гаспадарчай дзейнасці Упраўлення па аднаўленні Мінска. Згодна з уласнымі дадзенымі, на 1 студзеня 1946 г. Упраўленне выканала

[409] НАРБ, ф. 781, воп. 1, спр. 6, арк. 4–11.
[410] НАРБ, ф. 781, воп. 1, спр. 4, арк. 12–14.
[411] НАРБ, ф. 4, воп. 29, спр. 331, арк. 23–34.
[412] НАРБ, ф. 780, воп. 1, спр. 13, арк. 20–21.
[413] ДАМВ, ф. 69, воп. 1, спр. 115, арк. 206–210.

план на 17,5%. На самай справе гэтая лічба складала толькі 15,6%. Да канца 1945 г. былі асвоены толькі 19,3% фінансавых сродкаў эканамічнага плана. Ні адзін з 43 аб’ектаў, аднаўленне якіх было запланавана, не быў завершаны. Адзінымі рэалізаванымі будаўнічымі аб’ектамі былі дамы для кіраўнікоў Упраўлення. З-за адсутнасці інтэрнатаў рабочыя размяшчаліся ў грамадскіх будынках, якія падлягалі рамонту. У выніку да 20 лістапада 1945 г. заўчасна звольніліся 2995 чалавек, што склала 65,6% ад агульнай колькасці працоўных грамадзян (4566), з іх 970 (21,2%) самавольна[414]. У адказ на гэта 4 красавіка 1946 г. міністр дзяржаўнага кантролю БССР вынес папярэджанне кіраўніцтву канторы па забеспячэнні і збыце Упраўлення па аднаўленні Мінска ў сувязі з безгаспадарчасцю і недахопамі ў бухгалтарскім уліку. У пададзеным 1 кастрычніка 1945 г. кіраўніком канторы і галоўным бухгалтарам інвентарным вопісам была паказана сума 448 861 руб., але пры наступнай рэвізіі, якую правяла Камісія па кантролі, была зафіксавана сума 657 783 руб. Акрамя таго, кіраўніка канторы і ўпаўнаважаных па ўборцы сена абвінавацілі ў тым, што ў адным выпадку на плошчы 90 га згніло сена, а ў іншым выпадку на плошчы 155 га сена не было ўлічана. Вінаватыя атрымалі вымовы і спагнанні[415]. 31 траўня 1946 г. газета “Звязда” абрынулася з крытыкай на Упраўленне па аднаўленні Мінска. Упраўленне не магло выканаць план і зацягвала здачу аб’ектаў ад квартала да квартала. Пры гэтым яно не асвойвала выдзеленыя фінансавыя сродкі і марнатраўна абыходзілася з матэрыяламі. Штат адміністрацыі быў раздзьмуты да 364 чалавек. На чатыры-пяць будаўнікоў прыпадаў адзін службовец. Таму прыйшоў час пакласці канец безадказнасці і неарганізаванасці[416]. Кіраўнік Упраўлення М. Лянанаў стаў ахвярай грамадскай крытыкі. З заключнай справаздачы намесніка міністра дзяржаўнага кантролю БССР У. П. Валахановіча ад 6 снежня відаць, што Ляванаў выкарыстаў службовае становішча для ўласнага ўзбагачэння[417].

[414] НАРБ, ф. 690, воп. 3, спр. 130, адзінаццаць непранумараваных старонак паміж арк. 1 і арк. 2.
[415] НАРБ, ф. 690, воп. 3, спр. 129, арк. 2–3.
[416] Вярхоўскі Г., Садоўская С. Парочны стыль работы. Аб дзейнасці ўпраўлення па аднаўленню горада Мінска // Звязда. 31.5.1946. № 107. С. 3.
[417] Ляванава абвінавацілі ў прыватызацыі свайго службовага аўтамабіля “Аўды”, прывезенага з Германіі. Апрача таго, ён атрымаў грошы ў памеры 2850 руб. на пераезд сваёй сям’і з трох чалавек, нягледзячы на тое, што яны не выязджалі з Масквы. І, нарэшце, ён выкарыстоўваў службовы аўтамабіль для перавозкі асабістых рэчаў у Маскву, у тым ліку дошак для прыватнага гаража. НАРБ, ф. 690, воп. 3, спр. 131, арк. 135–139.

Са звальненнем Ляванава структурныя недахопы пры аднаўленні Мінска, натуральна, не маглі быць пераадолены. Грамадская крытыка не спынялася. 19 красавіка і 14 траўня 1947 г. "Советская Белоруссия" надрукавала крытычны матэрыял пра арганізацыю, узровень механізацыі і тэмп працы[418]. І гэтыя папрокі былі абгрунтаванымі. Са справаздачы аддзела інфармацыі ЦК КП(б)Б вынікае, што ў першым паўгоддзі 1947 г. з вылучаных на аднаўленне Мінска 64 500 000 рублёў асвоілі толькі 14,2 млн. Гэта можна растлумачыць тым, што Упраўленню па аднаўленні Мінска даводзілася сутыкацца з недахопам персаналу і дэфіцытам матэрыялаў. У першай палове 1947 г. у распараджэнні Упраўлення знаходзілася толькі 63% ад патрэбнай колькасці рабочых, 28% вапны, 29% цэглы, 33% дрэва, а таксама 54% неабходнай колькасці цэменту. У гэтых умовах аддзел інфармацыі Цэнтральнага Камітэта ў якасці адзінага выйсця з сітуацыі прапанаваў новую мабілізацыю насельніцтва, што было раўназначна прызнанню няздольнасці кіраўніцтва[419]. Тым не менш, у наступныя гады асабовы склад Упраўлення па аднаўленні Мінска стабілізаваўся. Паводле агляднай справаздачы аддзела па будаўніцтве Мінскага гаркама КП(б)Б ад 17 лютага 1948 г., за перыяд з 1 студзеня 1946 г. да 1 снежня 1947 г. колькасць занятых павялічылася з 7065 чалавек да 22 540[420].

Праблематычнымі па-ранейшаму заставаліся ўмовы жыцця будаўнікоў у сталіцы. 15 верасня 1949 г. міністр па жыллёвым і грамадзянскім будаўніцтве БССР рэзка раскрытыкаваў і асудзіў за "палітычнае неразуменне" і "злачынна-нядбалае стаўленне" кіраўнічыя колы будаўнічых арганізацый. Нікога не хвалявалі дрэнныя ўмовы жыцця рэкрутаваных з правінцыі (жыллё, харчаванне, аплата). Толькі ў адным Упраўленні па аднаўленні Мінска гаворка ішла пра 631 "дэзерціра"[421]. Гэтая сітуацыя межавала з цынізмам: будаўнікі нічога не атрымлівалі з жылля, якое яны штодня ўзводзілі. Але ў іх не заставалася іншага выбару, бо будаўнічая галіна адкрывала ім дарогу з вёскі ў горад (іл. 17)[422].

[418] Симонова О. Лучше организовать труд на стройках Минска // СБ. 19.4.1947. № 79. С. 3; Боевые задачи восстановления Минска // СБ. 14.5.1947. № 95. С. 1.
[419] НАРБ, ф. 4, воп. 51, спр. 103, арк. 167–199, тут арк. 173.
[420] ДАМВ, ф. 69, воп. 1, спр. 193, арк. 1–42, тут арк. 6.
[421] НАРБ, ф. 781, воп. 1, спр. 3, акр. 68–69.
[422] Пар.: ч. V. 3. б. Пар. таксама: Bohn M. T. "Bau auf..." Der Maurer Denis Bulachow. Sozialistische Helden. Eine Kulturgeschichte von Propagandafiguren in Osteuropa und in der DDR / Hrsg. v. Satjukow S., Gries R. Berlin, 2002. S. 60–70.

### б) Афармленне цэнтра

Да канца сталінскай эпохі хаос у аднаўленні разбураных гарадоў паступова пачаў змяняцца руцінай. Пры гэтым аблічча беларускай сталіцы ўсё яшчэ заставалася далёкім ад гарманічнага. Праспект ужо прыцягваў увагу фасадамі сваіх жылых палацаў, аднак прайграваў на фоне прылеглых жылых раёнаў. Прычына – нездавальняльнае будаўніча-тэхнічнае абсталяванне цэнтра горада. Відавочна, гэта тлумачылася неэфектыўнасцю бюракратыі і недахопам інжынераў. У выніку перавага пры будаўніцтве шматкватэрных жылых дамоў аддавалася ўскраінам горада і вуліцам, што ішлі з горада, перш за ўсё ў раёнах аўтамабільнага і трактарнага заводаў на паўднёвым усходзе Мінска. На гарадскіх ускраінах і на шматлікіх незабудаваных тэрыторыях у цэнтры стала зноў з'яўляцца шмат драўляных дамоў. Індывідуальнае будаўніцтва было, аднак, пазбаўлена ўсялякай інфраструктуры. Мінск, як і раней, быў падобны на вялікую будоўлю[423].

Звесткі пра маштабы аднаўлення горада можна атрымаць з публікацыі тагачаснага галоўнага архітэктара горада Ю. А. Ягорава (1961). Згодна з ёй, пад час акупацыі не былі разбураны толькі 60 мураваных і 20 драўляных дамоў з 825 будынкаў, якія да вайны знаходзіліся ў цэнтры горада паміж паралельнымі вуліцамі, якія мяжуюць з поўначы і поўдня з вуліцай Савецкай (пасля яна стала праспектам), а таксама паміж плошчай Леніна на захадзе і ракой Свіслач на ўсходзе. Зразумела, што пасля заканчэння вайны цэнтр уяўляў сабой пустынную прастору. Яшчэ больш дзівіць факт, які тычыцца аднаўлення горада: з 220 выгаралых дамоў, што атрымалі ў народзе назву "каробкі", толькі 40 былі адноўлены (іл. 18). Фонд старых пабудоў служыў у асноўным крыніцай для атрымання цэглы. Спробы выратаваць гістарычную спадчыну тлумачыліся толькі недахопам памяшканняў. Так, зімой 1944/1945 г. у Мінскім гарсавеце адбыўся

[423] Пар.: недатаваны даклад старшыні Планавай камісіі гарсавета (Гарплан) Е. Ігудэсмана за 1949 г. і пратакол паседжання ЦК КП(б)Б ад 29 жніўня 1950 г. ДАМВ, ф. 2631, воп. 1, спр. 31, арк. 1–16; НАРБ, ф. 4, воп. 81, спр. 342, арк. 15–38, тут арк. 16–17. У паведамленні старшыні Мінгарвыканкама К. Н. Длугашэўскага і сакратара гарадскога камітэта КП(б)Б В. І. Шарапава ад 29 лістапада 1952 г. зазначалася, што з 95 чатырох- і шматпавярховых будынкаў, якія ўзводзіліся, толькі 25–30 знаходзіліся ў раёне праспекта імя Сталіна. ДАМВ, ф. 2631, воп. 1, спр. 50, арк. 1–15, тут арк. 13.

канфлікт паміж прадстаўнікамі розных міністэрстваў і ўстаноў, якія выступалі за неадкладнае выкарыстанне "каробак", і галоўным архітэктарам горада, які спрабаваў настаяць на пашырэнні праспекта і на новай структуры забудовы ў адпаведнасці з Генеральным планам. Паводле Ягорава, спрэчкі вяліся вакол пытання аб прызначэнні дамоў на праспекце. У той час як з-за вулічнага шуму архітэктары прадугледжвалі размясціць на праспекце ў асноўным будынкі крам і ўстаноў, ЦК КП(б)Б лічыў неабходным узводзіць там жылыя дамы, каб ажывіць цэнтр горада. Каб не ставіць у дамах ліфты, іх вышыня на праспекце не павінна была перавышаць пяці паверхаў. Пры гэтым будынкі не маглі быць вышэй за Дом урада на захадзе і будынак Цэнтральнага Камітэта партыі на ўсходзе[424].

Наколькі імкліва з 1950 г. у ходзе змены курсу савецкай палітыкі на эканомію ў галіне будаўніцтва ссоўваліся асноўныя задачы гарадского планавання з рэпрэзентатыўнай функцыі на развіццё архітэктуры, становіцца відавочна з вынікаў нарады 19–20 сакавіка ў Старшыні Савета Міністраў БССР А. Я. Кляшчова. Начальнік Упраўлення па справах архітэктуры У. А. Кароль адкрыта ігнараваў усё яшчэ не вырашанае пытанне аб праектаванні цэнтра і замест гэтага паставіў на парадак дня пытанне аб стане каналізацыі, якая апошні раз рамантавалася ў 1935–1938 гг. Справу аб аднаўленні цэнтра Кляшчоў адклаў убок як завершаную, заўважыўшы толькі, што прыйшоў час выпраўляць хібы ў галіне інфраструктуры апошніх 20–30 гадоў[425].

Зыходзячы з гэтага многія амбіцыйныя праекты пасляваеннага часу не ўвасобіліся ў жыццё[426]. З прычыны таго, што контуры новага праспекта яшчэ дакладна не акрэсліліся, беларускае партыйнае і дзяржаўнае кіраўніцтва вымушана было нават адмовіцца ад шырокамаштабнага святкавання 70-годдзя Сталіна (21 снежня 1949 г.), хоць гэта быў апагей культу асобы ў Савецкім Саюзе. Толькі трыццатая гадавіна другога абвяшчэння БССР (31 ліпеня 1920 г.), якое адбылося пасля хаосу грамадзянскай вайны, стала зручнай нагодай, каб замовіць праект пом-

[424] Егоров Ю. Е. Ансамбль главной магистрали Минска // ён жа. Ансамбль в градостроительстве СССР. Очерки. Москва, 1961. С. 129–174, тут с. 141–142, 144–145.

[425] НАРБ, ф. 7, воп. 4, спр. 2099, арк. 10–44, тут арк. 11, 14.

[426] Пар.: Ощепков Г. П. Создание нового центра советского Минска // Проблемы советского градостроительства. 1952. № 3. С. 6–46.

ніка Сталіну для ўстаноўкі на Цэнтральнай плошчы[427]. Аднак грамадскасць даведалася пра гэта толькі ў чэрвені 1951 г.[428]. Пасля таго як 21 верасня 1952 г. помнік быў нарэшце адкрыты, Выканаўчы камітэт Мінскага гарадскога Савета пераназваў вуліцу Савецкую ў праспект імя Сталіна[429]. Такім чынам, амаль за паўгода да смерці генералісімуса Мінск быў ахрышчаны як "сталінскі горад". Нягледзячы на тое, што ўжо на XX з'ездзе КПСС (14–25 лютага 1956 г.) Хрушчоў развянчаў "культ асобы", нясмелая "дэсталінізацыя" прымусіла сябе чакаць аж да XXII з'езда (17–31 кастрычніка 1961 г.). 3 лістапада 1961 г. у рубрыцы "Хроніка" "Советская Белоруссия" апублікавала кароткае паведамленне інфармацыйнага агенцтва БелТА. У ім гаварылася пра тое, што па шматлікіх прапановах працоўных і заявах грамадскіх арганізацый Выканаўчы камітэт гарадскога Савета пераназваў праспект імя Сталіна ў праспект імя Леніна (у 1991–2005 гг. – праспект Францыска Скарыны, з 2005 г. – праспект Незалежнасці). Пра дэмантаж помніка Сталіну не згадвалася. Затое ўпершыню ў газеце паведамляўся прагноз надвор'я[430].

Нягледзячы на ўсё гэта, да сярэдзіны 1950-х гг. сфармавалася аблічча цэнтра горада, якое захавалася да сённяшняга дня. У гэтым абліччы дамінуе праспект даўжынёй прыблізна 11 км. Раней ён быў вуліцай Савецкай, якую пашырылі (яе шырыня складала 18–26 м) і падоўжылі. У міжваенны час гэтая вуліца пралягала праз цэнтр горада, была транспартнай артэрыяй, мела шмат крамаў (іл. 19–22). Шырыня праспекта ў цэнтры – 48 м (праезная частка – 24 м і 2 тратуары па 12 м кожны), далей ён пашыраецца да 70 м. Траса пралягае ў заходнім і ўсходнім напрам-

[427] Пар.: Пастанова Савета Міністраў БССР ад 28 верасня 1950 г. НАРБ, ф. 781, воп. 2, спр. 39, арк. 371–373.

[428] Адначасова стало вядома, што асфальтаванне Цэнтральнай плошчы будзе завершана да 15 ліпеня 1951 г. Центральная площадь // СБ. 1.6.1951. № 109. С. 1.

[429] Пар.: пратакол паседжання Мінскага гарадскога Савета ад 20 верасня 1952 г. ДАМВ, ф. 6, воп. 4, спр. 400, арк. 2–3. "Советская Белоруссия" і "Мінская праўда" апублікавалі на дзень раней матэрыял пра адкрыццё ў прысутнасці шматтысячнага натоўпу помніка Сталіну на Цэнтральнай плошчы, якое нібыта ўжо адбылося. Открытие в Минске монумента товарища Сталина // СБ. 22.9.1952. № 226. С. 1. Пар. таксама: МП. 22.9.1952. № 194. С. 1.

[430] Пазней стала вядома, што Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР 2 лістапада 1961 г. прыняў рашэнне пра перайменаванне раёна імя Сталіна ў Заводскі раён і раёна імя Варашылава ў Савецкі раён // СБ. 3.11.1961. № 260. С. 4.

ках праз увесь цэнтр горада ад плошчы Леніна (1934, з 1991 г. плошча Незалежнасці) праз Цэнтральную плошчу (1949, з 1985 г. Кастрычніцкая плошча) да плошчы Перамогі (1954) і мае даўжыню 2,9 км. Далей яна мае працяг даўжынёй 2,7 км у паўночнаўсходнім кірунку і вядзе праз плошчу Якуба Коласа (1956) да Батанічнага саду (1932) і праз наступныя 5 кіламетраў упіраецца ў кальцавую дарогу на мяжы горада (1963)[431]. На праспекце былі размешчаны ўсе найважнейшыя ведамствы, крамы і ўстановы адукацыі, таму ў публікацыі 1961 г. галоўны архітэктар горада Ягораў адгукаўся пра яго наступным чынам: "Без праспекта Сталіна Мінск як сталіца Беларусі не можа існаваць ні ў функцыянальных, ні ў мастацкіх адносінах"[432].

Пра насычанасць гарадскога жыцця можна меркаваць па гісторыі трох галоўных плошчаў, якія знаходзяцца па ходзе праспекта. На дзвюх самых вялікіх плошчах беларускай сталіцы, плошчы Леніна і Цэнтральнай, у святочныя дні праходзілі дэманстрацыі і парады. У такія дні партыйнае і дзяржаўнае кіраўніцтва прымала прысягу мас на вернасць і ўмацоўвала пры гэтым сваю ўладу, атрыманую ад працоўнага класа[433]. Маштабы плошчаў 6,75 га і 3,74 га (для параўнання: Чырвоная плошча ў Маскве мае 5 га) адлюстроўваюць гігантаманію, характэрную для праектавальнікаў пасляваеннага часу. У той жа час аднастайнасць і адсутнасць фантазіі, з якімі пазней былі аформлены плошчы, сведчаць пра крах утапічных горадабудаўнічых канцэпцый[434].

З-за сваіх вялікіх памераў (450×150 м) плошча Леніна выходзіць за рамкі свайго прызначэння (як адкрытай пляцоўкі перад Домам урада). Дом урада пазначае сабой вяршыню на паўночным флангу плошчы. На пярэднім плане чатырохвугольніка, які ўтвараюць два бакавыя крыла будынка Дома ўрада, знаходзіцца помнік Леніну, першапачаткова пабудаваны ў 1933 г. і адноўлены ў адпаведнасці з арыгіналам у красавіку 1945 г. Ленін выяўлены ў позе правадыра рабочых, які паказвае народу шлях у будучыню. Пастамент абрамляюць гарэльефы "Кастрычніцкая рэвалюцыя", "Індус-

[431] Пар.: Лысенко А. В. Главная улица Минска (Ленинский проспект). Минск, 1963.
[432] Егоров Ю. Ансамбль главной магистрали Минска. С. 135.
[433] Пар.: Rolf M. Das sowjetische Massenfest. Hamburg, 2006.
[434] Пар.: Bohn M. T. Das "neue" Minsk – Aufbau einer sozialistischen Stadt nach dem Zweiten Weltkrieg. Handbuch der Geschichte Weißrußlands / Hrsg. v. Beyrau D., Lindner R. Göttingen, 2001. S. 319–333.

трыялізацыя ўсёй краіны", "Калектывізацыя сельскай гаспадаркі" і "Абарона Радзімы" (як запаветы Леніна ў алегарычнай форме). З прычыны таго, што такім чынам былі пазначаны неабходныя ўмовы для фармавання "новага чалавека", атмасфера суседняга з помнікам будынка здаецца недарэчнай не толькі па архітэктуры, але і па функцыі. У той час як будынак Дома ўрада, выкананы ў канструктывісцкім стылі, зіхаціць пафарбаваным у белы колер бетонам, каталіцкі сабор Святых Сымона і Алены, узведзены ў 1908–1919 гг., падкупляе сваёй чырвонай цаглянай готыкай. У народзе яго называюць проста Чырвоны касцёл. Доўгія гады планавалася знесці гэты рэлікт дарэвалюцыйнага часу і размясціць на яго месцы гіганцкіх памераў сучасны цэнтр кіно. Знойдзены ў 1968 г. выхад з цяжкага становішча (размяшчэнне ў Чырвоным касцёле Дома кіно) – сведчанне не толькі дактрынёрскага самазадавалення савецкай улады, але і абмежаваных фінансавых магчымасцяў. Для самаразумення беларускага дзяржаўнага кіраўніцтва паказальна тое, што на супрацьлеглым баку плошчы Леніна было запланавана суседства ўніверсітэта. Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт імя Леніна не толькі насіў ганаровую прыстаўку "дзяржаўны", але і праводзіў сваю навучальную дзейнасць пад наглядам помніка Леніну і пад непасрэдным назіраннем урада. На даху пабудаванага да пачатку 1960-х гг. будынка ўніверсітэта красаваўся лозунг на беларускай мове – "Слава перадавой савецкай навуцы!", нібы гераічная прысяга прафесарска-выкладчыцкага складу і студэнтаў сацыялізму. Не толькі кампазіцыя будынкаў, але і агульны ансамбль плошчы Леніна выглядаюць праблематычнымі. З прычыны таго, што збудаванне Дома ўрада ў 1930-я гг. праходзіла ўздоўж заходняга і ўсходняга кірункаў вуліцы Савецкай, праспекту не хапае канкрэтнай канчатковай кропкі. Улічваючы, што праспект як бы "ўпадае" ў плошчу Леніна, апошняя носіць характар транспартнай магістралі. Гэтае ўражанне ўзмацняецца яшчэ і тым, што з-за цэнтральнай паласы, размешчанай у заходняй частцы і ўпрыгожанай кветнікамі, уласна плошча для парадаў скарацілася ўдвая. Парады адбываліся толькі па святах, таму ўвесь астатні час плошча Леніна ўяўляла сабой нявыкарыстаную прастору[435].

Не менш сумная з пункту гледжання планіроўкі горада і гісторыя Цэнтральнай плошчы (220×170 м), якая сваім паўднёвым па-

[435] У савецкі час плошча Леніна была стаянкай, якая даволі часта пуставала. На мяжы новага тысячагоддзя на плошчы пабудавалі падземны гандлёвы цэнтр.

доўжным бокам мяжуе з праспектам. Яна ўтварае пандан з плошчай Леніна, звязанай з Домам урада, бо на супрацьлеглым ад Цэнтральнай плошчы баку праспекта знаходзіцца будынак Цэнтральнага Камітэта КПБ. Ён быў уключаны ў ансамбль Цэнтральнай плошчы з дапамогай сквера, які прымыкае да яго. З афармленнем плошчы былі звязаны вялікія амбіцыі з-за размяшчэння яе ў сэрцы горада. Аднак шматлікія архітэктурныя конкурсы плёну не далі (іл. 23). Замест таго каб надаць цэнтру горада ўрбаністычнасць, Цэнтральная плошча ўяўляла сабой толькі пустэльную адкрытую прастору, дзе губляўся чалавек. Адначасова гэтая плошча дэманстравала атамізацыю грамадства. "Сацыялістычны горад" паўставаў не горадам сацыяльнай камунікацыі, а месцам рэпрэзентацыі дзяржаўнай улады. Скандальным у архітэктурных колах у 1960 і 1970-я гг. лічыўся Палац культуры прафсаюзаў, пабудаваны паводле праекта У. П. Яршова ў 1949–1954 гг. на ўсходнім скрыжаванні Цэнтральнай плошчы і праспекта. Крытыкаваўся дарагі будаўнічы стыль і функцыянальныя недахопы. Гаворка ідзе пра будынак у стылі неакласіцызму, які сваімі калонамі і скульптурамі на звернутым да плошчы франтальным баку нагадвае антычны храм і з'яўляецца яркім прыкладам так званай "сталінскай архітэктуры". Нягледзячы на ўсё гэта, названы палац не мог параўнацца з маскоўскімі вышыннымі дамамі ў "кандытарскім" стылі. Цікавы таксама той факт, што прадстаўнікі інтарэсаў пралетарыяту – прафсаюзы – больш не хацелі здавольвацца клубам для рабочых ўзору 1920-х гг., а аддалі перавагу палацу ў духу феадальнай эпохі. Уражлівым сімвалам дзяржаўнай улады была ўсталяваная ў гонар Сталіна бронзавая 17-метровая фігура, што знаходзілася ў цэнтры плошчы з 1952 да 1961 г. (іл. 25). Сталін быў паказаны ў позе правадыра, які стаяў перад сваім штабам, выказваючы рашучасць сагнутай рукой і сціснутым кулаком. На самай жа справе ў тыя гады, калі ён стаяў на вялізнай плошчы, ён рабіў ураджанне адарванага ад навакольнага свету рэлікта[436]. Пасля

[436] У той час як стваральнікі помніка Сталіну – скульптары З. І. Азгур, А. А. Бембель і А. К. Глебаў, а таксама архітэктары У. А. Кароль і Г. У. Заборскі – былі прапанаваны сходам членаў Саюза архітэктараў БССР 8 кастрычніка 1952 г. на прысуджэнне прэміі імя Сталіна, І. М. Рудэнка крытыкаваў ігнараванне меркавання грамадскасці пры афармленні помніка. Фігура была апранута ў вайсковую форму без адпаведнага галаўнога ўбору. Калі Сталін павінен быў паўстаць як "грамадзянін і воін", то варта было адмовіцца ад паліто. ЦДАНТД, ф. 68, воп. 1, спр. 107, арк. 21–43.

фазы аднаўлення горада рэвалюцыйны пафас канчаткова змяніўся руцінай. Для мабілізацыі насельніцтва і ўпэўненасці ў сваёй сіле дзяржаўнае і партыйнае кіраўніцтва мела патрэбу ў новым міфе. У сувязі з гэтым у юбілейным 1967 годзе ў адным з будынкаў на Цэнтральнай плошчы, які спачатку прызначаўся для Нацыянальнага музея, быў адкрыты музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. У экспазіцыі музея і сёння няма звестак пра яўрэйскія ахвяры, а па-ранейшаму ўсхваляецца подзвіг партызан і Савецкай арміі. На даху панылага ў архітэктурным сэнсе будынка, выкананага ў духу функцыяналізму, знаходзіўся надпіс на рускай мове “Подвигу народа жить в веках”. І, нарэшце, пры праектаванні “сацыялістычнага горада” па адным з ключавых пытанняў узнікла супярэчнасць, якая не магла быць пераадолена аж да распаду Савецкага Саюза: ідэя Цэнтральнай плошчы ў Мінску, запазычаная з Генеральнага плана Масквы 1935 г., з-за недахопу сродкаў ператварылася ў фарс. У 1985 г. пасля ўвядзення ў эксплуатацыю метро Цэнтральная плошча была пераназваная ў Кастрычніцкую. Прастора плошчы, якая разглядалася як сэрца горада, стала выкарыстоўвацца толькі ў 1987 г., а менавіта з пачаткам будаўніцтва манументальнага Палаца Рэспублікі ў стылі мадэрн. Будаўніцтва доўжылася да пачатку XXI стагоддзя.

У 1954 г. Круглая плошча, якая знаходзіцца на процілеглым беразе ракі Свіслач, што перасякае праспект (да таго часу выкарыстоўвалася толькі як транспартная развязка), атрымала новае прызначэнне. Маштабна задуманаму комплексу (225×175 м) новай плошчы Перамогі ў 1948 г. саступіў нават Дом І з’езда РСДРП (1898), які спачатку там знаходзіўся і быў адрэстаўраваны адпаведна арыгіналу. Яго перанеслі непасрэдна на бераг ракі Свіслач. Плошча Перамогі ўяўляе сабой ваўчок, у сярэдзіне якога ўзвышаецца 38-метровы абеліск памяці загінулых салдат і партызан. З 1961 г. тут гарыць Вечны агонь. З 1970-х гг. на дахах звернутых да плошчы дамоў змешчаны надпіс на рускай мове “Подвиг народа бессмертен”. У 1984 г. у сувязі з будаўніцтвам метро плошча была пашырана і дапоўнена крытым падземным пераходам. Акрамя таго, што плошча Перамогі ўяўляе сабой ідэальнае месца для сустрэч ветэранаў, яна таксама выступае нібы перадпачаткам цэнтра горада. Архітэктурным афармленнем пачатку і канца праспекта горад абавязаны, з аднаго боку, Леніну, а з другога – партызанам.

Пасля апісання структуры прасторы і ансамбля будынкаў цэнтра горада застаецца адказаць на пытанне аб тым, як успрымала насельніцтва Мінска цэнтр горада. Інфармацыю пра гэта можна

атрымаць з апытання, праведзенага кафедрай горадабудаўніцтва Беларускага політэхнічнага інстытута ў 1987 г. сярод служачых, спецыялістаў, дзеячаў мастацтва, вучоных і студэнтаў (на жаль, колькасць апытаных дакладна невядомая). Згодна з гэтым апытаннем, 73% рэспандэнтаў назвалі цэнтрам горада Ленінскі праспект, пры гэтым толькі 20% рэспандэнтаў згадалі плошчу Перамогі і 10–15% – плошчу Леніна. Пры гэтым 15% рэспандэнтаў назвалі "сэрцам горада" праспект Машэрава на заходнім беразе ракі Свіслач (да 1980 – Паркавая магістраль, з 2005 г. – праспект Пераможцаў), забудаваны з сярэдзіны 1960-х гг. вышыннымі жылымі дамамі (іл. 27). Відавочна, што горад не ўражваў мінчан: толькі для 48% рэспандэнтаў Мінск ствараў ўражанне сталіцы і толькі 45% апытаных знаходзілі, што цэнтр горада выгадна адрозніваецца ад іншых гарадоў. Ва ўспрыманні звонку непаўторнасць горада была больш выразнай, чым ва ўспрыманні знутры: беларускім Мінск бачылі толькі 12,5% мясцовага насельніцтва і 60,4% мігрантаў. І па іншаму пункту думкі апытаных разышліся: 55% рэспандэнтаў адзначылі, што цэнтр надае гораду характар "зялёнага горада", 45% – "прыгожага горада". Цэнтр горада абсалютна не ідэнтыфікаваўся мінчанамі як гістарычнае месца: толькі 6% апытаных лічылі, што ў абліччы горада можна прачытаць яго 900-гадовую гісторыю. Практычна адзінымі аб'ектамі, што асацыяваліся з гістарычным мінулым, для рэспандэнтаў былі Дом І з'езда РСДРП і збудаваны пасля Другой сусветнай вайны абеліск Перамогі (іх назвалі адпаведна 38% і 22% апытаных). Паказальна, што пры апісанні плошчы Леніна дзве трэція рэспандэнтаў забыліся згадаць помнік Леніну. У цэлым у якасці цэнтральнага месца горада апытаныя назвалі плошчу Перамогі: 43% рэспандэнтаў палічылі яе сімвалам Мінска і 38% – найбольш прыгожай плошчай[437]. Гэты дзіўны вынік у дачыненні да плошчы, якая ляжыць на другім беразе Свіслачы, можна растлумачыць, з аднаго боку, тым, што абеліск размешчаны ў зыходнай кропцы бачнай восі, а з другога – той роляй, якую адыгрываў культ Другой сусветнай вайны ў грамадскай свядомасці.

Паказальная таксама і ступень папулярнасці асобных артэфактаў пабудаванага навакольнага свету: акрамя плошчы Перамогі, добрую ацэнку атрымала таксама плошча Леніна. Най-

[437] Хачатрянц К. К., Рондель И. Р. Образ центра – образ города. Социально-архитектурные исследования репрезентативности центра Минска // САБ. 1988. 4. С. 3–5.

больш прыгожымі будынкамі і ў той жа час прэтэндэнтамі на сімвал горада лічыліся Чырвоны касцёл і Дом урада на плошчы Леніна. Кастрычніцкая ж плошча (былая Цэнтральная), хоць і выконвала важную функцыю на парадах за кошт узвядзення на супрацьлеглым баку трыбуны для партыйнага і дзяржаўнага кіраўніцтва, зусім не згадвалася. Нароўні з Ленінскім праспектам як рэпрэзентатыўнай трыбунай дзяржаўнай улады важную ролю, якую не варта недаацэньваць, выконваў у грамадскай свядомасці праспект Машэрава як дзелавы раён (іл. 27).

### в) Недахопы ў інфраструктуры і сферы абслугоўвання

Нягледзячы на амбіцыйныя мэты праграмы па аднаўленні, развіццё горада суправаджалася структурна абумоўленымі недахопамі, бо прыярытэт аддаваўся перш за ўсё падтрымцы прамысловай вытворчасці, а ўладкаванне цэнтра і жыллёвае будаўніцтва займалі толькі другое і трэцяе месцы. У выніку разбурэнняў, якія прынесла вайна, інфраструктура была знішчана, і з прычыны бурнага прыросту насельніцтва ў 1950–1960-я гг. прапанова камунальных паслуг моцна адставала ад патрэбаў насельніцтва. Нават калі партыйныя кіраўнікі на месцах і кіраўнікі гарадскога Савета ў справаздачах для службовага карыстання і ў публікацыях у прэсе сцвярджалі, што першая пасляваенная пяцігодка выканана ў адпаведнасці з патрабаваннямі Сталіна аб "нармалізацыі ўмоў жыцця", асноўныя праблемы побыту доўга яшчэ заставаліся нявырашанымі. Санітарныя ўмовы аж да 1950-х гг., забеспячэнне вадой да 1960-х гг. і сфера паслуг да 1970-х гг. заставаліся нездавальняльнымі.

Ужо 26 снежня 1948 г. у сувязі з чаканай 30-й гадавінай першага абвяшчэння БССР (1 студзеня 1919 г.) "Советская Белоруссия" прапанавала на развароце шэраг артыкулаў, прысвечаных "новаму Мінску". Артыкулы пра прамысловасць, культуру, медыцыну, спорт, жыллё і адукацыю павінны былі сведчыць, што ў беларускай сталіцы зноў пануе бурлівае гарадское жыццё. Пры гэтым было падкрэслена, што на парадку дня стаіць не "рэстаўрацыя старога", а "стварэнне новага горада"[438]. У гэтым жа духу 2 снежня 1950 г. пісала і мясцовая газета "Мінская праўда", першы нумар якой выйшаў за месяц да гэтага. Напярэдадні выбараў у мясцовыя Саветы ў ёй на дзвюх старонках было

[438] СБ. 26.12.1948. № 256. С. 2.

апісана адрозненне паміж “новым, савецкім Мінскам” і “старым, дарэвалюцыйным Мінскам”[439].

Насуперак гэтым аптымістычным сцвярджэнням праверка, праведзеная па даручэнні намесніка старшыні Выканаўчага камітэта Мінскага гарадскога Савета і кіраўніка планава-фінансавага і гандлёвага аддзела Мінскага партыйнага камітэта ў траўні 1952 г. з мэтай параўнаць забеспячэнне насельніцтва ў міжваенны перыяд з перыядам аднаўлення горада, паказала, што “новы Мінск” у параўнанні са “старым” выйграваў толькі ў галіне інфраструктуры (водазабеспячэнне, каналізацыя, грамадскі транспарт). Што тычыцца медыцынскага абслугоўвання (бальніцы), грамадскай гігіены (лазні, пральні), магчымасцяў пакупак (крамы, кафэ), дашкольных устаноў (яслі, дзіцячыя сады), а таксама прапаноў у галіне культуры і адпачынку (тэатр, кіно, клубы), то “стары Менск” апынуўся тут у больш выгадным становішчы (табліца 4). Такім чынам, не былі створаны перадумовы для забеспячэння насельніцтва вялікага горада.

**Табліца 4.** Вытворчыя магутнасці ўстаноў інфрастуктуры і сферы абслугоўвання ў Мінску ў 1940–1951 гг.

| **Установы інфрастуктуры / сферы паслуг** | **1940** | **1946** | **1950** | **1951** |
|---|---|---|---|---|
| Водаправод | | | | |
| – Аб’ём (у тыс. куб.м/дзень) | 35,3 | 15,1 | 34,46 | 37,6 |
| – Даўжыня сеткі (у км) | 107,6 | 100,0 | 120,4 | 127,4 |
| – Гадавы расход (у тыс. куб. м) | 10250 | 5043 | 11789,3 | 12854 |
| Каналізацыя | | | | |
| – Даўжыня сеткі (у км) | 42,2 | 40,3 | 51,6 | 56,7 |
| – Платны прыём сцёкавых вод (у тыс. куб. м) | 4762,6 | 1567 | 5721,1 | 7279 |
| Трамвай | | | | |
| – працягласць ліній (у км) | 36,9 | 14 | 38 | 38 |
| – Вагоны | 71 | 14 | 78 | 78 |
| – Пасажыры | 48268 | 3200 | 37761,3 | 37972 |
| Аўтобусы | | | | |
| – Колькасць | | 17 | 82 | 140 |
| – Таксі (легкавыя аўтамабілі) | – | 4 | 51 | 99 |
| – Таксі (грузавыя аўтамабілі) | – | | 7 | 7 |
| – Пасажыры | – | – | 6547,4 | 12076,3 |

[439] МП. 2.12.1950. № 22. С. 2–3.

| **Установы інфрастуктуры / сферы паслуг** | **1940** | **1946** | **1950** | **1951** |
|---|---|---|---|---|
| Бальніцы | | | | |
| – Колькасць | 14 | 7 | 11 | 11 |
| – Колькасць ложкамесцаў | 2925 | 1885 | 2730 | 2830 |
| Дзіцячыя садкі | | | | |
| – Колькасць | 83 | 18 | 32 | 36 |
| – Колькасць месцаў | 5000 | 1545 | 2460 | 2770 |
| Яслі | | | | |
| – Колькасць | 49 | 11 | 17 | 17 |
| – Колькасць месцаў | 2792 | 705 | 1245 | 1270 |
| Лазні | | | | |
| – Колькасць | 6 | 4 | 4 | 4 |
| – Колькасць месцаў | 801 | 445 | 694 | 694 |
| – Наведвальнікі | 1714400 | 978500 | 1885300 | 2026900 |
| Пральні | | | | |
| – Колькасць | 1 | – | 1 | 1 |
| – Магутнасць (у кг) | 2864 | – | 500 | 500 |
| – Прыёмка бялізны (у кг) | 1122 | – | 263,7 | 367,2 |
| Тэатры | | | | |
| – Колькасць | 5 | 1 | 4 | 4 |
| – Колькасць месцаў | 3455 | 670 | 3140 | 3140 |
| Кінатэатры | | | | |
| – Колькасць | 8 | 3 | 3 | 4 |
| – Колькасць месцаў | 4573 | 935 | 1661 | 1661 |
| – Клубы | 26 | 8 | 17 | 23 |

*Крыніца:* ДАМВ, ф. 2631, воп. 1, спр. 53, арк. 1–3.

Акрамя таго, у першыя пасляваенныя гады не былі ўрэгуляваны пытанні па падтрыманні чысціні і парадку. У сувязі з тым, што не была наладжана ўборка горада, 27 красавіка 1947 г. “Советская Белоруссия” абвінаваціла гарадскі Савет у тым, што ён займаецца “грандыёзнымі планамі па аднаўленні” і пры гэтым пакідае без увагі “штодзённыя патрэбы”. З надыходам адлігі з-пад снегу паўсюдна выступілі бруд і смецце. Некаторыя тратуары і двары былі так забруджаныя, што па іх проста немагчыма было прайсці. Не хапала тратуараў і асфальтаваных вуліц. Асвятленне горада было абмежавана з самага пачатку: пры патрэбе 5 тыс. вулічных ліхтароў устанавілі толькі 200. Акрамя таго, арыентаванне ў горадзе ўскладнялася адсутнасцю таблічак з назвамі вуліц і нумароў дамоў. Забеспячэнне вадой было таксама праблематычным. З-за малой колькасці водаправодных калонак грамадскага

карыстання (перш за ўсё на ўскраінах) збіраліся доўгія чэргі[440]. Дзяржаўныя ініцыятывы не давалі жаданых вынікаў, таму 1 верасня 1950 г. "Советская Белоруссия" звярнулася да насельніцтва Мінска: "Хутчэй адновім родную сталіцу, наш сацыялістычны Мінск!" Толькі праз "любоў да роднага горада" працоўныя павінны былі ўключыцца ў работу па дасягненні агульнай мэты: "У дачыненні да чысціні і парадку Мінск павінен быць прыкладам для пераймання"[441].

Па гэтых закліках можна ўбачыць рэзкі кантраст паміж жаданым і сапраўдным. Зіхоткія фасады дамоў, пабудаваных на праспекце, засланялі сабой жылыя раёны, дзе ўзнікалі сапраўдныя ачагі эпідэмій. Забруджанасць пітной вады, навала бруду і закінутасць гарадскіх тэрыторый справакавалі выпадкі тыфу, малярыі і шаленства ў 1940–1950-я гг.[442]. 31 сакавіка 1945 г. Народны камісар дзяржаўнага кантролю І. П. Валошын упершыню далажыў Старшыні Савета Народных Камісараў БССР П. К. Панамарэнку пра катастрафічныя санітарныя ўмовы. Паводле яго слоў, з-за адсутнасці транспартных сродкаў з надыходам адлігі не была праведзена ачыстка вуліц і двароў. У выніку адсутнасці паліва гарадскія лазні працавалі толькі 17 дзён у студзені і 9 дзён у лютым. Акрамя таго, было задзейнічана толькі 5% ад прадугледжаных магутнасцяў пральняў[443]. Звесткі Валошына былі яшчэ раз удакладнены 30 ліпеня 1945 г. у справаздачы старшыні Выканаўчага камітэта Мінскага гарадскога Савета І. Паромчыка і старшыні Дзяржаўнай планавай камісіі (Дзяржплан) Е. Ігудэсмана. Згодна з гэтай справаздачай, пасля вайны ў дварах 2075 дзяржаўных дамоў збудавалі толькі 78 туалетаў і 155 смеццевых кантэйнераў. Для вывазу фекалій было толькі тры бочкі, павозка для гнаявой жыжы пры гэтым адсутнічала. Пры патрэбе 153 домакіраўнікоў працавалі толькі

[440] Кармолитова Л., Симонова О. Минский горсовет не заботится о благоустройстве столицы // СБ. 27.4.1947. № 85. С. 3.

[441] Дело чести трудящихся Минска // СБ. 1.9.1950. № 176. С. 1.

[442] З 16 жніўня 1949 г. "Советская Белоруссия" спрабавала растлумачыць насельніцтву небяспеку заражэння ад укусу камара // СБ. 16.8.1949. № 162. С. 4. Пасля таго як у 1950 г. 233 і ў 1951 г. 380 чалавек зрабілі прышчэпку ад шаленства, Мінгарвыканкам 13 сакавіка 1952 г. палічыў неабходным прыняць меры па адлове тысяч бяздомных сабак. ДАМВ, ф. 6, воп. 4, спр. 380, арк. 59–60, арк. 63–64.

[443] НАРБ, ф. 690, воп. 2, спр. 43, арк. 1–1адв.

15 служачых. У такіх умовах "каробкі", як у народзе называлі выгаралыя дамы, служылі туалетамі і месцамі навалы рознага бруду ў дварах[444]. У наступныя гады паляпшэнняў не назіралася. Наадварот, на нарадзе 4 сакавіка 1947 г. у намесніка Старшыні Савета Міністраў БССР Ц. Я. Кісялёва з нагоды стану горада Мінска высветлілася, што ў 1946 г. пры патрэбе 500 смеццевых кантэйнераў у наяўнасці было толькі 160 і што 20 смеццевых кантэйнераў, якімі ў 1947 г. карысталася больш за 200 тыс. чалавек, хапала толькі на 20 тыс.[445]. У гэтых умовах кіраўнікамі авалодала пачуццё бездапаможнасці. Так, кіраўнік аддзела камунальнай гаспадаркі Мінскага гаркама КП(б)Б паведамляў на працягу 1950 г. сакратару Мінскага гаркама партыі С. К. Ляшчэню пра нездавальняльную матэрыяльна-тэхнічную базу прыборкі вуліц. Апошняя адбывалася "ад выпадку да выпадку", таму горад, акрамя святочных дзён, знаходзіўся ў "забруджаным стане, які не вытрымліваў крытыкі". З-за непрыбранага снегу зімой 1949 г. некалькі дзён нават не працаваў грамадскі транспарт. Выхад з гэтага цяжкага становішча быў знойдзены толькі шляхам прыцягнення мясцовага насельніцтва[446]. Са справаздачы кіраўніка аддзела камунальнай гаспадаркі Выканаўчага камітэта Мінскага гарадскога Савета за 1951 г. вынікае, што магчымасцяў вывазу смецця хапала толькі на 50% адходаў хатніх гаспадарак[447]. І нарэшце, старшыня Выканаўчага камітэта Мінскага гарадскога Савета В. І. Шарапаў у справаздачы 1958 г. аб стане камунальнай гаспадаркі яшчэ раз звярнуў увагу на тое, што служба вывазу смецця з яе 38 смеццевымі машынамі і 14 цыстэрнамі магла вывезці толькі 190 тыс. куб. м смецця і 42 тыс. куб. м фекалій, у той час як патрэба складала адпаведна 387 500 куб. м і 113 тыс. куб. м[448].

Аж да 1960-х гг. балючымі былі таксама пытанні забеспячэння пітной вадой і зліву сцёкавых вод. 25 снежня 1945 г. на сваім паседжанні Бюро Мінскага гаркама КП(б)Б адзначыла, што з 214 водаправодных калонак агульнага карыстання толькі 100 былі гатовыя да працы, а з 113 фантанаў функцыянавалі

[444] ДАМВ, ф. 69, воп. 1, спр. 35, арк. 32–65, тут арк. 34; НАРБ, ф. 31, воп. 4, спр. 92, арк. 83–122, тут арк. 84–85.
[445] НАРБ, ф. 7, воп. 3, спр. 1843, арк. 107–132.
[446] ДАМВ, ф. 69, воп. 1, спр. 615, арк. 82–84.
[447] ДАМВ, ф. 2631, воп. 1, спр. 53, арк. 71–75.
[448] ДАМВ, ф. 2631, воп. 1, спр. 139, арк. 195–209.

толькі 50[449]. Згодна з інфармацыяй намесніка Старшыні Савета Міністраў БССР Ц. Я. Кісялёва ад 4 сакавіка 1947 г., з-за недастатковай колькасці месцаў для забору пітной вады насельніцтва брала ваду для піцця проста з ракі Свіслач[450]. Паводле справаздачы старшыні Выканаўчага камітэта Мінскага гарадскога Савета К. Н. Длугашэўскага за 1949 г., праблематычным было таксама тое, што прадпрыемствы аддавалі перавагу ўскраінам горада для будаўніцтва жылля, нягледзячы на адсутнасць водаправода[451]. Згодна з пратаколам паседжання ЦК КП(б)Б ад 25 жніўня 1951 г., толькі 10,5% гарадскіх гаспадарак былі падлучаны да водаправоднай сеткі. Асабліва ў летнія месяцы забеспячэнне насельніцтва пітной вадой праходзіла з вялікімі цяжкасцямі[452]. У адным недатаваным дакуменце за 1955 г. кіраўнік водаправодна-каналізацыйнага трэста Мінска далажыў сакратару Мінскага гаркама КПБ І. Д. Варвашэню пра тое, што павелічэнне ўдвая штодзённага забеспячэння пітной вадой з 28 тыс. куб. м у 1941 г. да 59 тыс. куб. м у 1954 г. нават прыблізна не адпавядае патрэбам горада з насельніцтвам 450 тыс., якому неабходна 95 800 куб. м. Зыходзячы з такіх умоваў, у жылых дамах на ўскраінах пітная вада часта даходзіла толькі да першага паверха[453]. Выйсце з цяжкага становішча абяцала пачатае ў 1956 г. будаўніцтва Заслаўскага вадасховішча (Мінскага мора), якое стала месцам адпачынку мінчан[454]. Праўда, у 1958 г. старшыня Выканаўчага камітэта Мінскага гарадскога Савета В. І. Шарапаў выказаў меркаванне пра тое, што нават штодзённае забеспячэнне аднаго чалавека 71 л вады далёка не адпавядала норме ў 115 л. Недастатковае забеспячэнне пацвярджае той факт, што пры агульнай даўжыні ўсіх вуліц Мінска ў 380 км водаправодная сетка складала толькі 210 км. Акрамя таго, становішча ўскладнялася марнатраўным выкарыстаннем пітной вады прамысловымі прадпрыемствамі[455].

[449] ДАМВ, ф. 69, воп. 1, спр. 27, арк. 314–316.
[450] НАРБ, ф. 7, воп. 3, спр. 1843, арк. 107–132.
[451] ДАМВ, ф. 2631, воп. 1, спр. 31, арк. 55–65, тут арк. 59.
[452] НАРБ, ф. 4, воп. 81, спр. 536, арк. 4–5.
[453] ДАМВ, ф. 69, воп. 1, спр. 991, арк. 26–28.
[454] Минск. Энциклопедический справочник. Изд. 2-ое, доп. и перераб. Минск, 1983. С. 173.
[455] ДАМВ, ф. 2631, воп. 1, спр. 139, арк. 195–209, тут арк. 196–197.

Як вынікае са справаздачы кіраўніка водаправодна-каналізацыйнага трэста Мінска сакратару Мінскага гаркама КПБ І. Д. Варвашэню за 1955 г. і са справаздачы старшыні Выканаўчага камітэта Мінскага гарадскога Савета Шарапава за 1958 г., сітуацыя з каналізацыяй была яшчэ больш сур'ёзнай, чым з водаправодам. З аднаго боку, даўжыня каналізацыйнай сеткі ў 130 км была значна менш агульнай даўжыні вуліц сеткі ў 380 км; з іншага боку, фільтрацыйны рэзервуар ачышчальнага збудавання пры дзённай норме перапрацоўкі ў 1 тыс. куб. м вады спраўляўся толькі з 550 куб. м. У розных раёнах горада, у тым ліку і на праспекце Сталіна, калектары былі засмечаны, а шматлікія фабрыкі не падлучаны да каналізацыі, таму каля 4 млн. куб. м сцёкавых вод і фекалій сцякала ў раку Свіслач[456]. У 1964 г. старшыня Дзяржаўнай кантрольнай камісіі па ахове прыроды паведамляў Першаму сакратару ЦК КПБ К. Т. Мазураву пра тое, што колькасць сцёкавай вады ў гарадской каналізацыйнай сістэме перавышала норму на 190 000 куб. м у дзень. Калектары маглі збіраць у дзень толькі 120–130 тыс. куб. м, а ачышчальная ўстаноўка магла апрацоўваць толькі 50–60 тыс. куб. м, таму рака Свіслач штодня забруджвалася 30–40 тыс. куб. м неачышчанай і яшчэ большай колькасцю слабаачышчанай сцёкавай вады[457].

У той час як у 1960 г. у беларускай сталіцы пачаўся працэс паляпшэння санітарна-гігіенічнай і экалагічнай сітуацыі, аж да распаду Савецкага Саюза насельніцтву Мінска даводзілася змагацца ў паўсядзённым жыцці з рознага роду дэфіцытам. Ужо на піку культурна-палітычнай адлігі 24 лютага 1957 г. "Советская Белоруссия" адзначала, што розніца паміж гарадскім ростам і спажываннем становіцца ўсё большай. Недахоп кватэр, камунальных паслуг, дзіцячых садкоў і кінатэатраў адчуваўся паўсюдна[458].

Нязручнасці пачыналіся ўжо з дарожнага пакрыцця і вулічнага асвятлення. Паводле справаздачы старшыні Мінгарвыканкама К. Н. Длугашэўскага за 1949 г., з часу міжваеннага перыяду колькасць заасфальтаваных і брукаваных дарог ска-

[456] ДАМВ, ф. 69, воп. 1, спр. 991, арк. 26–28; ДАМВ, ф. 2631, воп. 1, спр. 139, арк. 195–209, тут арк. 198–199.
[457] ДАМВ, ф. 6, воп. 3, спр. 355, арк. 322–325.
[458] Бюджет нашего города // СБ. 1957. № 47. С. 1.

рацілася з 28% да 19%, а асветленых вуліц – з 47% да 27%[459]. Паводле справаздачы старшыні выканкама В. І. Шарапава за 1958 г., з 380 км вуліц толькі 171 км меў нейкае пакрыццё[460]. Жылыя раёны ў асноўным былі найменш добраўпарадкаваны, таму мінчукам у дрэннае надвор'е і ў цёмны час сутак даводзілася дабірацца дадому па брудных, гразкіх і неасветленых вуліцах.

У грамадстве, дзе планавалася інтэграцыя жанчын у працоўную дзейнасць, асабліва востра адчуваўся недахоп ясляў і дзіцячых садоў. Паводле справаздачы старшыні Дзяржплана ад 30 чэрвеня 1958 г., патрэбе на 9 тыс. месцаў у яслях супрацьстаяла рэальнасць на 3815 месцаў, у выпадку з дзіцячымі садамі гэтая прапорцыя складала 16 тыс. да 8820. 3200 дзяцей ясельнага ўзросту і 4500 дзяцей, старэйшых за 3 гады, стаялі на чарзе[461].

Такім чынам, ва ўсіх планах па развіцці горада назіралася няўвага да трэцяга сектара. У 1960–1970-я гг. тры чвэрці ўсіх занятых працавалі ў так званай матэрыяльнай вытворчасці і толькі каля 15% – непасрэдна ў сферы абслугоўвання[462]. Паказчыкі мадэрнізацыі кажуць самі за сябе: паводле справаздачы сакратара Мінскага гаркама КПБ Шарапава ад 9 жніўня 1971 г., забеспячэнне насельніцтва (жыллё, гандаль, медыцынскае абслугоўванне, школа і вольны час) не адпавядала законным нормам (табліца 5). У складзеным у 1978 г. спісе аб велічыні тавараабароту на чалавека Мінск знаходзіўся на сёмым месцы сярод 26 гарадоў (сталіцы саюзных рэспублік і гарады з насельніцтвам больш за мільён чалавек), а па колькасці прадпрыемстваў рознічнага гандлю і сталовых – на апошнім. Яскравым прыкладам служыць таксама і нездавальняльнае медыцынскае абслугоўванне: па колькасці дактароў Мінск займаў шаснаццатае месца, па медыцынскім персанале – дзевятнаццатае, па колькасці бальнічных ложкамесцаў – перадапошняе[463].

[459] ДАМВ, ф. 2631, воп. 1, арк. 31, арк. 55–65, тут арк. 63.
[460] ДАМВ, ф. 2631, воп. 1, спр. 139, арк. 195–209, тут арк. 205.
[461] Тамсама, арк. 94–107, тут арк. 105.
[462] Комплексный план экономического и социального развития города Минска за 1976–1980 гг. Минск, 1978. С. 10, 12.
[463] Статистические данные по столицам союзных республик и по городам с населением свыше одного миллиона человек // Вестник статистики. 1979. № 11. С. 73, 78–79.

**Табліца 5.** Забеспячэнне насельніцтва Мінска паслугамі ў 1966–1971 гг.

| | **Сярэдняе забеспячэнне на 1 тыс. жыхароў** | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | **Адзінка вымярэння** | **горадабудаўнічая норма** | **па факце** | | |
| | | | 1.1.1966 | 1.1.1968 | 1.1.1971 |
| Жылая плошча (на чалавека) | $м^2$ | 9 | 6,31 | 6,7 | 7,06 |
| Агульнаадукацыйныя школы | Колькасць месцаў | 180 | 111,5 | 113,6 | 111,9 |
| Дашкольныя ўстановы | Колькасць месцаў | 70–90 | 52,6 | 57,4 | 56,1 |
| Бальніцы | Ложкамесцы | 12 | 10 | 9,6 | 10,1 |
| Паліклінікі | Пацыенты / дзень | 22 | 11,0 | 11,2 | 11,6 |
| Кінатэатры | Колькасць месцаў | 28–42 | 21,8 | 20,5 | 19,6 |
| Прадпрыемствы рознічнага гандлю | Колькасць рабочых месцаў | 8,4 | 6,3 | 6,5 | 6,3 |
| Сталовыя | Колькасць месцаў | 65 | 49,0 | 53,9 | 58,0 |
| Установы бытавога абслугоўвання | Колькасць рабочых месцаў | 8,7 | 5,2 | 5,6 | 5,6 |
| Пральні | Кг бялізны / дзень | 90 | 12,3 | 15,2 | 15,9 |
| Рэстараны | Колькасць месцаў | 5 | 3,1 | 2,9 | 3,3 |
| Тэлефоны | Падключэнні | 140 | 42 | 59 | 73 |
| Спажыванне вады (на чалавека) | Літр | 275–400 | 168,1 | 170,6 | 178,8 |

*Крыніца:* ДАМВ, ф. 69, воп. 9, спр. 33, арк. 44–45.

# IV. Міграцыя ў "сацыялістычны горад"

*"Пытанне паляпшэння жыллёвых умоў у такіх буйных гарадах, як Масква, Ленінград, Кіеў і гэтак далей, цесна звязана з прыростам насельніцтва, выкліканым прытокам міграцыі з іншых частак краіны. <...> Таму неабходна спыніць прыём у гарады рабочай сілы з іншых абласцей і пакрываць патрэбу вялікіх гарадоў у працоўных руках з ліку насельніцтва, якое там жыве".*

М. С. Хрушчоў (1956)[464]

## 1 Крыніцы росту горада

### а) Прамысловая вытворчасць і працоўныя рэсурсы

Да Першай сусветнай вайны Мінск быў толькі гандлёвым цэнтрам мясцовага значэння. Першыя імпульсы індустрыялізацыі з'явіліся з далучэннем да сеткі чыгунак Расіі ў 70-я гг. XIX ст. Прамысловасць складалася пераважна з рамеснай і саматужнай вытворчасці, а металаапрацоўка разам з харчовай, гарбарнай і тэкстыльнай, дрэваапрацоўчай і папяровай вытворчасцю заставаліся на нізкім узроўні. Тым не менш, палітыка паскоранай індустрыялізацыі, якая часткова праводзілася ў Беларусі ў 30-я гг. XX ст., спрыяла ўзнікненню ў Мінску прадпрыемстваў саюзнага значэння[465]. У канчатковым рахунку распачатая ў пасляваенны час мадэрнізацыя аграрнай Беларусі, якая на той момант у той ці іншай ступені характарызавалася вядзеннем

[464] Отчётный доклад Центрального Комитета Коммунистической партии Советского Союза XX съезду партии. Доклад Первого секретаря ЦК КПСС Н. С. Хрущева // XX съезд Коммунистической партии Советского Союза. 14–25 февраля 1956 г. Стенографический отчет. Т. I. Москва, 1956. С. 9–120, тут с. 79.

[465] Пар.: ч. II. 3.

натуральнай гаспадаркі, магла азначаць не што іншае, як канцэнтрацыю ўсіх рэсурсаў у сталіцы.

Паводле дадзеных Цэнтральнага статыстычнага ўпраўлення, з 1945 да 1948 г. колькасць прамысловых прадпрыемстваў павялічылася з 9 да 343, а колькасць рабочых – з 1067 да 25 781[466]. Мінск стаў адным з найважнейшых месцаў размяшчэння транспартнай і электроннай прамысловасці Савецкага Саюза. У канцы 40-х гг. быў адкрыты завод па вытворчасці грузавых аўтамабіляў (1947), велазавод (1947), у 50-я і 60-я гг. – трактарны завод (1950), завод па вытворчасці радыёпрыёмнікаў і тэлевізараў (1951), гадзіннікаў (1956) і халадзільнікаў (1962). У 1990 г. было выраблена 100 700 трактароў, 37 100 грузавікоў, 225 тыс. матацыклаў, 845 тыс. веласіпедаў, 1,1 млн. тэлевізараў, 728 тыс. халадзільнікаў, 11,9 млн. наручных гадзіннікаў (гл. дадатак, табліца XXIII). Доля машынабудавання і металаапрацоўкі ў валавым прадукце ўзрасла з 23,2% у 1950 г. да 70,3% у 1990 г., у той час як доля харчовай прамысловасці за той жа перыяд зменшылася з 28,8% да 7,8%, а дрэваапрацоўчай і папяровай прамысловасці – з 4,5% да 1,4%, і гэта азначала, што названыя галіны прамысловасці не выконвалі больш істотнай ролі (гл. дадатак, табліца XXIV). У выніку за кошт размяшчэння ключавых прадпрыемстваў Мінск пасля Другой сусветнай вайны ператварыўся ў савецкую прамысловую метраполію.

Адпаведна эканамічнаму значэнню горада ўзрасла і колькасць занятых у прамысловасці, якая, згодна з больш позняй ацэнкай, у 1940 г. складала ўжо 37 500 чалавек, у 1950 г. – 53 190, у 1985 г. – 338 600 і нязначна скарацілася да 324 900 у 1990 г. у сувязі з эканамічным спадам пад час перабудовы. Доля занятых у прамысловасці ад агульнай колькасці працоўных павялічылася з 30% у 1940 г. да больш за 40% у 60–70-я гады. Такім чынам, у прамысловасці ў пасляваенны час была занята прыкладна пятая частка ўсяго насельніцтва (гл. дадатак, табліца XXVI). Пры гэтым адназначна пераважала машынабудаванне. На такіх прамысловых гігантах, як трактарны і аўтамабільны заводы, у 1960 г. працавала 84 700 чалавек, або 60,6% ад колькасці ўсіх занятых у прамысловасці, а ў 1985 г. – 253 300 чалавек, або 74,8% (гл. дадатак, табліца XXV). Для мінскіх прадпрыемстваў была характэрна высокая цякучасць рабочай сілы. За перыяд з 1966 да 1969 г. 80–90 тыс. чалавек, г. зн. палова

[466] ДАМВ, ф. 2631, воп. 1, спр. 4, арк. 69–79; спр. 35, арк. 277–307.

занятых у прамысловасці, памянялі месца працы[467]. З аднаго боку, гэтую акалічнасць можна расцаніць як прыкмету таго, што прадпрыемствы ў большай ступені выкарыстоўвалі дапаможную працоўную сілу, чым кваліфікаваных рабочых. З іншага боку, гэта магло сведчыць пра тое, што рабочыя пастаянна знаходзіліся ў пошуках прадпрыемства, якое магло б забяспечыць іх жыллём. У такіх умовах прамысловыя прадпрыемствы Мінска наўпрост залежалі ад пастаяннага прытоку мігрантаў, што, у сваю чаргу, пагаршала становішча на рынку жылля. Гэта было зачараванае кола, з якога, нягледзячы на ўвядзенне сістэмы прапіскі, не было выйсця[468].

### б) Натуральны рост насельніцтва і павелічэнне яго колькасці ў выніку міграцыі

Пасля Другой сусветнай вайны спатрэбілася пяць гадоў, каб узровень насельніцтва Мінска вярнуўся да даваеннай адзнакі. У 1950 г. тут жыло 273 тыс. чалавек, што адпавядала колькасці жыхароў напярэдадні нападу Германіі на Савецкі Саюз. Пасля гэтага сталіца Беларусі перажыла сапраўдны дэмаграфічны бум. Колькасць насельніцтва павялічылася з 500 тыс. у 1959 г. да 1 млн. у 1972 г. і да 1,6 млн. у 1991 г. (графік 1). У гэтых лічбах адлюстроўваецца ўнікальны ў сваім родзе працэс, уласцівы Савецкаму Саюзу 1960–1970-х гадоў, а менавіта прырост насельніцтва ў сярэднім на 5,5% за год. Гаворка ідзе пра так званы “мінскі феномен”[469]. Па прычыне “ўцёкаў з вёскі” Мінск з этнічнага пункту гледжання паслядоўна ператвараўся з яўрэйскага горада ў беларускі. Яўрэйскае жыццё спыніла сваё існаванне ў выніку Халакосту, ахвярай якога стала вялікая частка беларускіх яўрэяў, і антысемітызму, характэрнага для эпохі позняга сталінізму, які непасрэдна пасля вайны прывёў да таго, што будынак сінагогі перадалі пад архіў Міністэрства замежных

[467] Пешкова А. Н. О текучести рабочей силы и использовании фонда рабочей силы в промышленности (на примере города Минска) // Проблемы народонаселения и трудовых ресурсов. Сборник статей / ред. коллегия: А. А. Раков и др. Вып II. Минск, 1971. С. 157–164, тут с. 158.

[468] Пар.: ч. IV. 2. а.

[469] Пар.: Польский С. А. Демографические проблемы развития Минска. Минск, 1976. С. 16; ён жа. Еще раз о “минском феномене” // Экономика социальной сферы крупного города: Опыт, проблемы, перспективы. Тезисы докладов научно-практической конференции. Минск, 29–30 мая 1989 г. Минск, 1989. С. 3–4.

спраў і ў канцы 1940-х гг. зачынілі яўрэйскі тэатр[470]. Да пачатку 1950-х гг. яўрэйскае насельніцтва Мінска, якое перад вайной складала каля 73 тыс., скарацілася прыблізна да 15 тыс.[471]. З 1959 да 1970 г. яно вырасла з 38 900 да 47 тыс., аднак у ходзе эміграцыі на мяжы 1960–1970-х гг. знізілася з 46 100 у 1979 г. да 39 100 у 1989 г.[472]. Пры гэтым доля яўрэйскага насельніцтва ад агульнай колькасці жыхароў Мінска скарацілася з 7,6% у 1959 г. да 2,4% у 1989 г. Доля беларусаў, наадварот, павялічылася з 63,8% да 71,8% (гл. дадатак, табліца VII). Праўда, гэты працэс трэба разглядаць з улікам русіфікацыі, якую пацягнула за сабой палітыка Хрушчова ў дачыненні да мовы ў галіне сярэдняй адукацыі[473]. Пад час перапісу насельніцтва ў 1970 г.

[470] У чэрвені 1946 г. была зарэгістравана яўрэйская абшчына колькасцю 80 чалавек, якой аддалі два пакоі ў сінагозе па вул. Няміга. Да ліпеня 1947 г. колькасць вернікаў узрасла да 1 тыс. Пар.: The Agony and Liquidation of the Jewish State Theatre of Belorussia (1948–1949). Introduced by Mordechai Altshuler // JEE. 1994. Vol. 25. Nr. 3. P. 64–72; Gershtein A. Notes on the Jewish State Theatre of Belorussia // JEE. 1995. Vol. 27. Nr. 2. P. 27–42; Smilovitsky Л. Jewish Religious Life in Minsk, 1944–1953 // JEE. 1996 Vol. 30. Nr. 2. P. 5–17; рускі пераклад: Попытки возобновления еврейской религиозной общины в Минске, 1944–1954 гг. // ён жа. Евреи Беларуси. Из нашей общей истории. 1905–1953. Минск, 1999. С. 286–302; ён жа. Die Partizipation der Juden am Leben der Belorussischen Sozialistischen Sowjetrepublik (BSSR) im ersten Nachkriegsjahrzehnt, 1944–1954 // "Existiert das Ghetto noch?" Weißrußland: Jüdisches Überleben gegen nationalsozialistische Herrschaft. Berlin / Hamburg / Göttingen, 2003. S. 277–294.

[471] Смиловицкий Л. Катастрофа евреев в Беларуси 1941–1944 гг. Тель-Авив, 2000. С. 30.

[472] ДАМВ, ф. 1035, воп. 1, спр. 642, арк. 20 (вынікі перапісу 1959 г.); Итоги Всесоюзной переписи населения на 15 января 1970 г. по городу Минск. Для служебного пользования. Минск, 1973. С. 65; Национальный состав населения СССР по данным Всесоюзной переписи населения 1989 г. Москва, 1991. С. 90. Пар. таксама: Brym R. J. The Jews of Moscow, Kiev and Minsk. Identity, Antisemitism, Emigration / Ed. by Spier H. Houndmills / London, 1995.

[473] Пар.: Bilinsky Y. The Soviet Education Laws of 1958–59 and Soviet Nationality Policy // Soviet Studies. 1962. Vol. 14. P. 138–157. У 1972/73 навучальным годзе 51,4% беларускіх школьнікаў навучаліся на рускай мове, у вялікіх гарадах – 97,6%; у Мінску не было ніводнай школы з выкладаннем на беларускай мове. Solchanyk R. Russian Language and Soviet Politics // Soviet Studies. 1982. Vol.34 P. 23–42, тут P. 37. Пар. таксама: Halbach U. Nationalitätenfrage und Nationalitätenpolitik // Handbuch der Geschichte Russlands. Bd. 5: 1945–1991. Vom Ende des Zweiten Weltkriegs bis zum Zusammenbruch der Sowjetunion / Hrsg. v. Plaggenborg S. II. Hlbbd. Stuttgart, 2003. S. 659–786, тут S. 679.

35,4% беларускага насельніцтва Мінска назвалі рускую мову роднай; у 1979 г. – ужо 39,4%, а ў 1989 г., пасля таго як галоснасць і перабудова спрыялі праяўленню большай талерантнасці і нацыянальная самасвядомасць зноў стала развівацца, – усё ж 38,3%[474]. На гэтым фоне доля рускіх ад агульнай колькасці жыхароў Мінска з 1959 да 1989 г. пастаянна знаходзілася ў межах 20% (гл. дадатак, табліца VII).

**Графік 1.** Рост насельніцтва Мінска з 1897 да 1991 г. (у тысячах).




*Крыніца:* як табліца VI у дадатку.

[474] Итоги Всесоюзной переписи населения на 15 января 1970 г. по городу Минск… С. 65; Численность, возрастная структура, состояние в браке, число и размер семей, национальный состав, уровень образования и источники средств существования населения города Минска. По данным Всесоюзной переписи населения на 17 января 1979 г. Статистический сборник. Для служебного пользования. Ч. I. Минск, 1980. С. 75; Национальный состав населения СССР по данным Всесоюзной переписи населения 1989 г. Москва, 1991. С. 90. Пар.: Bohn T. M. Bevölkerung und Sozialstruktur // Handbuch der Geschichte Russlands. Bd. 5: 1945–1991. Vom Ende des Zweiten Weltkriegs bis zum Zusammenbruch der Sowjetunion / Hrsg. v. Plaggenborg S. II. HlbBd. Stuttgart, 2003. S. 595–657, тут S. 605.

З прычыны таго, што ўключэнне бліжэйшых паселішчаў у рысу горада ў працэсе яго росту не прыводзіла да павелічэння насельніцтва Мінска нават на 3%, паўстае пытанне пра суадносіны натуральнага росту насельніцтва і росту насельніцтва ў выніку міграцыі[475]. Урэшце гаворка ідзе пра тое, каб высветліць, у якой ступені рост насельніцтва адбываўся за кошт мігрантаў з вёскі і для якога перыяду тэзіс Мошэ Левіна пра "асяляньванне" савецкіх гарадоў пацвярджаецца колькаснымі дадзенымі[476]. Каб адказаць на гэтыя пытанні, варта супаставіць суадносіны нараджальнасці і смяротнасці, а таксама колькасць тых, што прыбылі і выбылі. Паказаныя ў дадатку ў табліцы VIII звесткі не публікаваліся ў савецкі час. Яны былі даступныя толькі ў скарочаным выглядзе ў брашурах для службовага карыстання. Недахоп дадзеных Цэнтральнага статыстычнага ўпраўлення, якія сталі вядомы пасля распаду Савецкага Саюза, у тым, што ў іх улічваецца толькі перыяд з 1960 г., і пры гэтым, як правіла, ахопліваюцца вялікія перыяды часу. Далей усе дадзеныя ў абсалютным вылічэнні будуць прыводзіцца з табліцы VIII.

Мінск у выніку пасляваеннага аднаўлення і высокага ўзроўню міграцыі быў у дэмаграфічным плане аж да 1970-х гг. адносна маладым горадам, таму розніца паміж нараджальнасцю і смяротнасцю была істотнай аж да 1980-х гг. (графік 2). І без таго нізкі сярэдні ўзрост паступова павышаўся ад 26,8 гадоў (1959) да 28,4 гадоў (1970) і да 30 гадоў (1979)[477]. Доля пенсіянераў заставалася даволі нізкай – 6,8% у 1959 г. і 8,5% у 1970 г. Толькі ў перыяд з 1979 да 1989 г. быў зарэгістраваны адчувальны рост колькасці пенсіянераў з 8,9% да 12,9%[478]. На гэтым фоне нараджальнасць вырасла з 7498 у 1947 г. да пікавага значэння 29 871 у 1983 г. За бумам нараджальнасці адразу пасля вайны адбыўся часовы застой канца 1940-х – пачатку 1950-х гг. Пасля завяршэння фазы будаўніцтва горада з сярэдзіны 1950-х і да пачатку 1960-х гг. зноў адбыўся імклівы ўздым нараджальнасці з 10 тыс. да амаль 15 тыс. на год. З аднаго боку, падзенне нараджальнасці ў сярэдзіне 1960-х гг. можна растлумачыць

[475] У выніку далучэння перыферыйных раёнаў да горада ў 1959, 1962, 1965, 1967, 1972 і 1973 гг. насельніцтва Мінска вырасла на 27 500 чалавек. Польский С. А. Демографические проблемы… С. 12.

[476] Пар.: ч. І. 1.

[477] Польский С. А. Ключевые проблемы социально-экономического развития г. Минска. Минск, 1981. С. 5.

[478] Пожилые люди города Минска. Минск, 1998. С. 2.

тым, што здольныя да ўзнаўлення ўзроставыя катэгорыі нарадзіліся ў перыяд Другой сусветнай вайны (а гэты перыяд характарызуецца нізкім узроўнем нараджальнасці); з другога боку, гэта паказчык змены стаўлення да нараджальнасці ў залежнасці ад кватэрнага пытання. У 1970-я гг. адбыўся адпаведны мільённай колькасці насельніцтва горада хуткі ўздым нараджальнасці з 15 тыс. да амаль 30 тыс. на год. Чарговае падзенне нараджальнасці з сярэдзіны 1980-х гг. да 1991 г., калі нараджальнасць склала 20 918, было звязана з эканамічным крызісам перыяду перабудовы. Смяротнасць жа знаходзілася на адносна пастаянным узроўні з-за няўхільнага росту і паступовага старэння насельніцтва. Да 1974 г. смяротнасць была ў межах 5 тыс., але да 1989 г. яна павысілася да больш чым 10 тыс.

**Графік 2.** Нараджальнасць і смяротнасць, а таксама колькасць прыбылых у Мінск і выбылых з Мінска ў 1945–1991 гг.




*Крыніца:* як у табліцы VIII у дадатку.

У міграцыйнай статыстыцы асабліва прыкметныя моцныя ваганні колькасці прыбылых (графік 2). Нягледзячы на няўлічаныя звесткі пра тых, што жылі без прапіскі, з графіка адразу відаць, як на практыцы функцыянаваў механізм закрытага горада, які далей будзе разглядацца больш дэталёва. Надзвычай высокая колькасць тых, што прыехалі ў горад адразу пасля вайны (у 1946 г. яна склала 61 178 чалавек), звязана з вяртаннем насельніцтва з эвакуацыі, з войска і з партызанскіх атрадаў, а таксама з прымусовых работ у Германіі. Колькасць бяздомных са спаленых вёсак і "шукальнікаў шчасця" з іншых частак Савецкага Саюза, якія з'явіліся ў разбураным горадзе, невядомая. Згодна з ацэнкай дэмографа С. Польскага, насельніцтва Мінска адразу пасля вайны на 61,5% складалася з сельскіх жыхароў[479]. Відавочна, што аж да 1956 г., калі з'явіліся права на звальненне і права свабоднага выбару працоўнага месца, адначасова з адпраўкай у Мінск кіраўнічых работнікаў з Масквы і Ленінграда арганізаваны набор рабочай сілы (аргнабор) для аднаўлення жылых дамоў і прамысловых прадпрыемстваў адбываўся перш за ўсё з беларускай правінцыі. Пасля таго як у 1953 г. была дасягнута новая рэкордная велічыня прыбылых у горад (53 490), у Мінску ўвялі сістэму прапіскі, адпаведную ўсесаюзным нормам. З-за катастрафічнага становішча на рынку жылля, асабліва пасля таго як у 1956 г. Хрушчоў разгарнуў кампанію па стрымліванні росту буйных гарадоў, права пражывання ў гарадах стала жорстка абмяжоўвацца. З прычыны гэтага колькасць тых, што прыехалі ў горад, знізілася ў 1962 г. да 32 125 чалавек. У 1960-я гг. прамысловыя прадпрыемствы, аднак, зноў сталі мець патрэбу ў працоўнай сіле. У выніку гэтага зноў адкрылі "шлюзы" выдачы часовых прапісак, і колькасць тых, што прыбылі да канца 1960-х гг., вырасла да больш чым 60 тыс. Напярэдадні перапісу 1970 г. быў яшчэ раз праведзены дакладны статыстычны ўлік насельніцтва. Рэзкі рост колькасці прыбылых да пікавага значэння 81 140 у 1973 г. звязаны з асаблівай акцыяй Мінгарвыканкама, які даў каля 15 тыс. прапісак для рабочых, што нелегальна жылі ў горадзе на той момант[480]. У сувязі з узмацненнем "уцёкаў з вёскі" ў 1970-я гг. колькасць прыбылых заставалася на высокім узроўні (амаль 70 тыс.). На мяжы 1970–1980-х гг. вёска была знясілена дэмаграфічна і стала відавочна, што абласныя і раённыя цэнтры

[479] Польский С. А. Демографические проблемы… 86.
[480] Тамсама. С. 92.

таксама паглынаюць частку міграцыйнага патоку. Эканамічны крызіс апошніх гадоў існавання Савецкага Саюза прывёў да памяншэння колькасці прыбылых у Мінск у 1991 г. да 48 768 чалавек. Наконт выбылых з горада (неабходна таксама прымаць пад увагу і няўлічаныя выпадкі) варта адзначыць, што, з аднаго боку, на працягу ўсяго часу іх было значна менш, чым прыбылых, але ўсё ж даволі шмат; а з другога боку, што ў графіку крывыя прыбылых і выбылых праходзяць амаль паралельна. У канцы 1940-х і да сярэдзіны 1950-х гг. колькасць выбылых складала 25–30 тыс., у другой палове 1950-х гг. яна скарацілася да 20 тыс., а потым зноў узрасла да 50 297 у 1979 г. З гэтага моманту заўважаецца штогадовы паступовы спад да 37 827 чалавек. Такім чынам відавочна, што ваганне колькасці насельніцтва ў горадзе было вельмі высокім. Колькасць выбылых звязана, з аднаго боку, з функцыяй горада як месца знаходжання ВНУ, якія займаліся падрыхтоўкай спецыялістаў для іншых рэгіёнаў, і, з другога боку, з дрэннымі жыллёвымі ўмовамі, з-за якіх спробы ўладкавацца ў горадзе былі асуджаны на правал.

**Графік 3.** Натуральны рост насельніцтва і прыток мігрантаў у Мінску ў 1945–1991 гг.




*Крыніца:* як у табліцы VIII у дадатку.

Калі супаставіць натуральны рост насельніцтва з ростам насельніцтва ў выніку міграцыі, то можна ўбачыць, што да 1979 г. павелічэнне колькасці насельніцтва ў асноўным было вынікам

міграцыі (графік 3). Звесткі пра натуральны рост насельніцтва сведчаць аб бесперапынным павелічэнні: ад 5185 чалавек у 1947 г. да 12 458 чалавек у 1961 г. і ад 9903 чалавек у 1966 г. да 21 747 чалавек у 1983 г. Потым да 1991 г. назіралася зніжэнне да 9122 чалавек. Працэс міграцыі адбываўся, наадварот, больш скачкападобна. Гранічныя паказчыкі зарэгістраваны пад канец этапу аднаўлення на пачатку 1950-х гг. (27 647 чалавек у 1953 г.) і ў канцы фазы індустрыялізацыі на пачатку 1970-х гг. (42 500 чалавек у 1973 г.), зніжэнне паказчыкаў адзначаецца ў сувязі з паўторным засяленнем горада пасля вайны (7360 чалавек у 1950 г.), пасля абмежавання міграцыі ў сярэдзіне 1950-х гг. (13 876 чалавек у 1956 г.) і пасля знясілення працоўных рэсурсаў на перыферыі ў канцы 1970-х – пачатку 1980-х гг. (16 575 чалавек у 1980 г.). У выніку гарадское насельніцтва ў сярэдзіне 1950-х і ў канцы 1960-х – пачатку 1970-х гг. папаўнялася на трэць за кошт нараджальнасці і на дзве трэція за кошт міграцыі. Таму трэба зыходзіць з таго, што пікі росту горада ўяўлялі сабой “хвалі”, якія прыводзілі да “наваднення” Мінска сельскім насельніцтвам.

Мяркуючы па складзе насельніцтва, у 1950–1960-я гг. Мінск у значнай меры ператварыўся ў горад мігрантаў. Праўда, адказы на пытанне аб працягласці пражывання ў горадзе, якое задавалася пры перапісе насельніцтва 1970, 1979 і 1989 гг., паказваюць, што ўзровень цякучасці насельніцтва імкліва падаў з 1970-х гг. Да 1980-х гг. выявілася тэндэнцыя да аселасці, адпаведна да перавагі мігрантаў у другім пакаленні. Доля толькі новаперасяленцаў, якія жылі ў горадзе 2 гады, вырасла з 16,0% у 1970 г. да 18,2% у 1979 г. і зменшылася да 11,4% у 1989 г. За той жа перыяд павялічылася доля старажылаў, г. зн. тых, якія жылі ў горадзе больш за 25 гадоў, з 11,5% да 22,4% і 30,6% (гл. дадатак, табліца IX).

## в) Склад, паходжанне і матывы мігрантаў

Каб зразумець сутнасць тэзіса пра “асяляньванне” горада, неабходна прааналізаваць паходжанне мігрантаў і іх матывы. Звесткі пра ўзрост, пол і месца нараджэння перасяленцаў можна знайсці ў рэестрах прапісаных асоб за 1945–1969 гг. Цэнтральнага статыстычнага ўпраўлення, якія знаходзяцца ў Дзяржаўным архіве Мінскай вобласці. Колькасныя дадзеныя аб прычынах “уцёкаў з вёскі” можна прасачыць толькі на падставе Усесаюзнага перапісу насельніцтва 1970 г., а таксама апытання перыяду распаду Савецкага Саюза. На падставе гэтых

крыніц робіцца відавочным, што патэнцыяльнымі мігрантамі былі хутчэй вучні, якія імкнуліся да адукацыі і жыцця ў горадзе, маладыя савецкія грамадзяне, чым пагружаныя ў свой вясковы свет сельскія жыхары. Па прычыне суровых умоў жыцця ў горадзе гэтыя людзі былі вымушаны падтрымліваць зямляцкія адносіны[481]. Тры чвэрці ўсіх мігрантаў адносіліся ў 1950–1960-я гг. да ўзроставай групы ад 15 да 29 гадоў (гл. дадатак, табліца X). Названая група складалася часткова са студэнтаў, часткова з маладых рабочых, прычым мігрантаў сярод мужчын было значна больш, чым сярод жанчын. Асабліва выразна гэтая тэндэнцыя прасочваецца ў 1960-я гг. (гл. дадатак, табліца XI).

Пра мігрантаў з розных рэспублік СССР можна сказаць, што з канца 1940-х і да канца 1960-х гг. дзве трэція іх былі з БССР. На працягу першых двух пасляваенных гадоў колькасць мігрантаў з РСФСР складала амаль 30%, што было абумоўлена вяртаннем жыхароў Мінска з эвакуацыі. У 1950-я гг. колькасць мігрантаў з РСФСР заставалася на ўзроўні амаль 20%, бо ў Мінск адтуль прысылалі кіраўнікоў і кваліфікаваных рабочых, а таксама ў горадзе асядалі дэмабілізаваныя афіцэры. Толькі ў 1960-я гг. доля мігрантаў з РСФСР пачала змяншацца да 10% з прычыны масавага прытоку насельніцтва з беларускай вёскі. Нароўні з Расіяй рэгіёнам паходжання мігрантаў была Украіна. На яе долю прыпадала каля 4% мігрантаў на працягу ўсяго гэтага часавага адрэзка. Назіраўся і адток насельніцтва з Мінска – некалькі тысяч жыхароў у другой палове 1950-х гг. паехалі ў Казахстан у рамках кампаніі па асваенні цаліны, разгорнутай Хрушчовым. Пра недасканаласць сістэмы прапіскі сведчыць тое, што да 10% выбылых не былі ўлічаны (гл. дадатак, табліца XII).

[481] Праблема міграцыі абмяркоўвалася ў Савецкім Саюзе ў першую чаргу з пункту гледжання дэмаграфіі. Погляд на гэтую праблему з пункту гледжання сацыялогіі і гісторыі штодзённасці толькі пачынае развівацца. Пар.: Teckenberg W. Urbanisierung und soziale Folgen der Stadt-Land-Migration in der Sowjetunion // Kölner Zeitschrift für Soziologie und Sozialpsychologie. 1972. Bd. 24. S. 790–820. Змястоўныя артыкулы пра маскоўскія сем'і: Малышева М. Мигранты в крупном городе: история семьи Шинелевых; Долгих Е. Миграционные процессы сквозь призму индивидуального жизненного опыта // Судьбы людей: Россия. XX век. Биографии семей как объекты социологического исследования / отв. ред. В. Семенова, Е. Фотеева. Москва, 1996. С. 70–98, 355–372. Пар. па "гарадскіх качэўніках" таксама: Epste M. Russo-Soviet Topoi / The Landscape of Stalinism. The Art and Ideology of Soviet Space / Ed. by Dobrenko E., Naimark E. Seattle / London, 2003. P. 277–306.

Параўноўваючы горад і вёску, можна прыйсці да высновы: у 1950-я гг. "уцёкі з вёскі" ў горад пераўзыходзілі міграцыю з горада ў горад у чатыры разы, а ў 1960-я гг. – у два разы. Пры гэтым неабходна ўлічваць высокую мабільнасць насельніцтва: у 1950-я гг. колькасць мігрантаў з вёскі пераўзыходзіла колькасць мігрантаў з горада на 25%, у той час як колькасць выбылых у іншыя гарады перасягала колькасць выбылых у вёску спачатку прыкладна на 50%, а потым на 25%. Відавочна, што Мінск для многіх мігрантаў быў свайго роду "шлюзам" для пераезду ў іншыя гарады. У 1960-я гг. усё больш ўраўноўвалася колькасць мігрантаў з іншых гарадоў і з вёскі, у той час як выбылых у іншыя гарады спачатку было ў два разы, а потым у тры разы больш, чым у вёску (гл. дадатак, табліца XIII). Што тычыцца БССР, то рост насельніцтва за кошт прытоку мігрантаў з вёскі пераўзыходзіў рост насельніцтва за кошт прытоку мігрантаў з горада ў 1940-я гг. у тры разы, у 1950-я гг. – у чатыры-пяць разоў і ў 1960-я гг. – у тры-чатыры разы. Такім чынам, горад адназначна рос за кошт беларускага сельскага насельніцтва. Цікава, што на графіку крывыя прыбылых і выбылых выглядаюць у гэтай сувязі па-рознаму. У 1950-я гг. колькасць мігрантаў з вёскі перавышала колькасць мігрантаў з горада ў два разы, у 1960-я гг. – у паўтара раза. Што тычыцца выбылых, то суадносіны паміж горадам і вёскай былі, наадварот, менш супастаўныя. У 1950-я гг. іх можна было яшчэ суаднесці, а ў 1960-я гг. колькасць выбылых у іншыя гарады перавышала ў два разы колькасць выбылых у сельскую мясцовасць. Фактычна з 1960-х гг. паток мігрантаў ішоў у гарады; вяртанне ў вёску было хутчэй рэдкасцю (гл. дадатак, табліца XIII б). У Мінскай вобласці колькасць перасяленцаў з вёскі пераўзыходзіла колькасць перасяленцаў з іншых гарадоў больш чым у пяць разоў. Відавочна, што сельскія раёны ў непасрэднай блізкасці да Мінска разглядаліся як "трамплін" для ўладкавання ў беларускай сталіцы (гл. дадатак, табліца XIII в). На гэтай падставе можна прыйсці да высновы, што ў 1950-я гг. у рамках індустрыялізацыі рост горада адбываўся адназначна за кошт сельскага насельніцтва. Забеспячэнне жыллём у Мінску, асабліва часова занятых на будоўлях, было праблематычным, таму колькасць тых, што вярталіся назад у вёску, заставалася даволі высокай. У 1960-я гг. у сувязі з адукацыйным бумам сталіца ператварылася ў месца, куды на вучобу накіроўвалася моладзь. Праўда, Мінск для значнай часткі студэнтаў заставаўся толькі прамежкавым пунктам на шляху да пераезду ў іншыя гарады. Маштабы гэтай з'явы можна праілюстраваць наступным прыкладам: з 1960 да 1966 г. сельскагаспадарчыя ВНУ БССР скончылі 30 372 чалавекі, але толькі 9054 спецыялісты прыступілі

да працы на сельскагаспадарчых прадпрыемствах; з 1971 да 1976 г. гэтыя лічбы складалі адпаведна 108 300 і 37 200[482]. Такім чынам, "мінскі феномен" засноўваўся на скарачэнні колькасці і старэнні насельніцтва беларускіх вёсак.

Класіфікацыю мігрантаў па сацыяльных групах і індывідуальных інтарэсах у 1950-я і 1960-я гг. можна правесці толькі гіпатэтычна. У рамках перапісу насельніцтва 1970 г. "новаперасяленцам" задаваўся пытанне аб прычынах іх пераезду. Пад "новаперасяленцамі" разумеліся людзі, якія пераехалі ў Мінск у 1968–1969 гг. З 64 072 перасяленцаў 49 800 былі выхадцамі з БССР, у тым ліку 22 739 чалавек з Мінскай вобласці. З вёскі прыехалі 32 171 чалавек, з гарадоў – 31 901. Пры гэтым з малых гарадоў з колькасцю насельніцтва да 20 тыс. – 11 362 чалавекі[483]. Наконт матываў перасялення высветлілася, што пераважная большасць, г. зн. 27 896 чалавек, або 43,5%, прыехалі на вучобу. Адпаведна, яны мелі часовую прапіску. Доля выпускнікоў ВНУ, што працаўладкаваліся ў Мінску і атрымалі пастаянную прапіску, складала толькі 3,5%. Неўдакладненыя "асабістыя прычыны" назвалі ў якасці матыву пераезду 31,6% новаперасяленцаў. Гэта былі выпускнікі, якія заставаліся ў сталіцы дзякуючы шлюбу, і кар'ерысты, якія знаходзілі працу на мінскіх прадпрыемствах. 4,9% новаперасяленцаў прыехалі ў горад у рамках уз'яднання сям'і. Пад гэтым разумеліся найбліжэйшыя сваякі, г. зн. муж і жонка ці бацькі аднаго з партнёраў. Нязначнасць такіх выпадкаў, якая адлюстроўваецца ў адносна невялікай колькасці (3123), звязаная, з аднаго боку, з маладым узростам новаперасяленцаў, з другога – з нездавальняльным забеспячэннем жыллём у горадзе. Тым не менш 4,7% усіх новаперасяленцаў называлі прычынай пераезду змену месца працы і паказвалі пры гэтым на тое, што яны – дэмабілізаваныя афіцэры. Толькі 4,1% новаперасяленцаў былі накіраваны камсамолам або праз аргнабор. Такім чынам, атрыманне аду-

[482] Пешкова А. Н. Миграция сельского населения СССР: ее характер и социально-экономические последствия // Проблемы народонаселения и трудовых ресурсов. Сборник статей. Вып. I / под ред. В. Ф. Медведева, А. А. Ракова, М. И. Горячко. Минск, 1970. С. 37–43, тут с. 39; яна ж. Занятость населения Беларуси (Обзорная информация. Серия: экономика и организация производства). Минск, 1981. С. 34.

[483] Итоги Всесоюзной переписи населения 1970 года по Белорусской ССР. Ч. II. Минск, 1973 (Центральное статистическое управление при Совете Министров БССР. Для служебного пользования). С. 238, 240.

кацыі “адчыняла дзверы” ў закрыты горад. З боку сельскага насельніцтва гэтую магчымасць выкарысталі 51,9% новаперасяленцаў. Для людзей, якія прыязджалі з іншых гарадоў, шляхі пранікнення ў горад былі, наадварот, больш разнастайнымі. У параўнанні з сельскім насельніцтвам яны дзякуючы свайму прафесійнаму і сацыяльнаму ўзроўню знаходзіліся ў больш выйгрышным становішчы (табліца 6).

**Табліца 6.** Прычыны, па якіх мігранты ў 1968–1969 гг. перасяляліся ў Мінск.

| матывы | мігранты | | з горада | | з вёскі | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | у абсалютным вылічэнні | % | у абсалютным вылічэнні | % | у абсалютным вылічэнні | % |
| вучоба | 27896 | 43,5 | 11208 | 35,1 | 16688 | 51,9 |
| праца пасля заканчэння педагагічнай навучальнай установы | 2226 | 3,5 | 1676 | 5,2 | 550 | 1,7 |
| праца па лініі грамадскіх арганізацый | 1657 | 2,6 | 770 | 2,4 | 887 | 2,8 |
| аргнабор | 971 | 1,5 | 367 | 1,1 | 604 | 1,9 |
| змена месца працы | 3004 | 4,7 | 2413 | 7,6 | 591 | 1,8 |
| асабістыя прычыны | 20254 | 31,6 | 10866 | 34,1 | 9388 | 29,2 |
| перасяленне з сям’ёй | 3123 | 4,9 | 2435 | 7,6 | 688 | 2,1 |
| іншыя прычыны | 4941 | 7,7 | 2166 | 6,8 | 2775 | 8,6 |
| усяго: | 64072 | 100 | 31901 | 100 | 32171 | 100 |

*Крыніца:* Итоги Всесоюзной переписи населения 1970 г. по Белорусской ССР. Ч. II. Минск, 1973 (Центральное статистическое управление при Совете Министров БССР. Для служебного пользования). С. 243.

Гэтыя дадзеныя перапісу насельніцтва можна інтэрпрэтаваць наступным чынам: істотная прычына “ўцёкаў з вёскі” – розніца ва ўзроўні жыцця ў вёсцы і ў горадзе. Галоўным матывам была надзея на задавальненне асноўных матэрыяльных патрэбаў, а менавіта атрыманне “добраўпарадкаванай”, г. зн. абсталяванай усімі зручнасцямі, кватэры. На другім месцы стаяла самарэалізацыя ў прафесіі, у чым прасочваецца грэблівае стаўленне да сельскай працы. І толькі потым ішло культурнае жыццё горада, г. зн. правядзенне вольнага часу[484]. Паводле апуб-

[484] Паводле апублікаванага ў 1992 г. апытання, праведзенага сярод 1200 работнікаў сельскай гаспадаркі, прыярытэтамі, што паўплы-

лікаваных у 1992 г. выніках апытання 148 маладых рабочых Мінскага навукова-вытворчага аб'яднання "Інтэграл", жыццё ў вёсцы разглядалася, у прыватнасці маладымі жанчынамі, як невыноснае, але пры гэтым яны ўсё яшчэ адчувалі сувязь з роднай вёскай. Маладыя мужчыны, наадварот, лічылі тых, што засталіся ў вёсцы, няўдачнікамі, і таму звязаны з "уцёкамі з вёскі" кар'ерны рост быў натуральнай мэтай (табліца 7).

**Табліца 7.** Суадносіны горада і вёскі з пункту погляду 148 маладых супрацоўнікаў Мінскага навукова-вытворчага аб'яднання "Інтэграл" (апытанне, праведзенае незадоўга да распаду Савецкага Саюза).

| | **мужчыны** | **жанчыны** |
|---|---|---|
| Чаму Вы паехалі з вёскі? | | |
| я думаў, што жыццё ў горадзе больш цывілізаванае і што баўленне вольнага часу цікавейшае, чым у вёсцы | 48,6% | 62,6% |
| я лічыў, што людзі ў горадзе маюць значна больш матэрыяльных даброт, чым у вёсцы | 6,8% | 2,7% |
| я браў за прыклад маіх аднагодкаў | 20,3% | 5,4% |
| мне не падабалася сельскагаспадарчая прафесія | 24,3% | 29,7% |
| Вы прывыклі да горада? | | |
| так, я доволі хутка прывык да гарадскога жыцця і палюбіў яго | 64,9% | 62,2% |
| я прывыкаю даволі марудна і ўсё яшчэ ўспамінаю вёску | 28,4% | 33,8% |
| гарадское жыццё для мяне цяжкое | 6,7% | 4,0% |

валі на "push-" і "pull-"фактары пад час "уцёкаў з вёскі", былі названы: 1) атрыманне камфартабельнай (з санвузлом. – *Т. Б.*) кватэры; 2) удасканаленне ўмоваў і арганізацыі працы; 3) якасць дарог, што звязваюць гаспадаркі (практычна непраходныя ў непагадзь у сувязі з недахопам заасфальтаваных дарог. – *Т. Б.*); 4) павышэнне заробку; 5) самастойнасць на працоўным месцы; 6) культурныя прапановы ў вёсцы; 7) узровень медыцынскага абслугоўвання; 8) развіццё сферы паслуг; 9) асартымент тавараў у рознічным гандлі; 10) рэгламентаваны працоўны дзень; 11) пяцідзённы працоўны тыдзень; 12) права на адпачынак; 13) наяўнасць дашкольных навучальных установ; 14) мікраклімат у працоўным калектыве; 15) дапамога пад час будаўніцтва асабістага жылля; 16) умовы для павышэння кваліфікацыі; 17) дапамога пад час будаўніцтва асабістай прысядзібнай гаспадаркі; 18) разуменне кіраўнічым персаналам патрэбаў спецыялістаў; 19) развіццё фізкультуры і спорту. Коваленко В. А., Тарасевич В. Ф., Лешкович В. В. Каким быть селу? Минск, 1992. С. 31.

| | | |
|---|---|---|
| Што Вы можаце сказаць пра Вашых аднагодкаў і знаёмых, якія працягваюць жыць і працаваць у вёсцы? | | |
| гэта аптымісты, якія лічаць, што вёска хутка зраўняецца з горадам | | 5,4% |
| гэта няўдачнікі, якія не знайшлі свайго шляху ў горад | 43,2% | 37,9% |
| гэта людзі, якія з дзяцінства адданыя бацькам і бацькоўскаму дому | 20,3% | 32,4% |
| гэта людзі, якія любяць вясковую працу | 14,9% | 18,9% |
| гэта людзі, якія не ведаюць прывабнасці горада | 21,6% | 5,4% |
| Ці верыце Вы ў адраджэнне вёскі? | | |
| Так, у найбліжэйшыя гады ўмовы жыцця ў вёсцы наблізяцца да гарадскіх | 50,0% | 52,7% |
| усё застанецца як ёсць | 47,3% | 37,8% |
| розніца паміж горадам і вёскай толькі павялічыцца | 2,7% | 9,5% |
| Што можа Вас заахвоціць вярнуцца з горада назад у вёску? | | |
| толькі адсутнасць перспектывы на атрыманне кватэры ў горадзе | 66,2% | 43,2% |
| камфартабельны дом у вёсцы | 5,4% | 4,1% |
| я не вярнуся ні пры якіх умовах | 28,4% | 52,7% |

*Крыніца:* Коваленко В. А., Тарасевич В. Ф., Лешкович В. В. Каким быть селу? Минск, 1992. С. 25–26.

## 2 Мерапрыемствы па абмежаванні росту горада

### а) Стварэнне сістэмы прапіскі і яе функцыянаванне

Пасля вяртання мінчан у разбураны горад на працягу першых двух гадоў пасля вайны назіраўся рост колькасці насельніцтва, які працягваўся да канца сталінскай эпохі. Прычынай гэтага быў праведзены на дзяржаўным узроўні арганізаваны набор рабочай сілы (аргнабор) для будаўніцтва і адраджэння прамысловасці. Улічваючы хаос, выкліканы аднаўленнем горада, неабходна зыходзіць з таго, што колькасць бескантрольна праніклых у сталіцу, якая не паддаецца статыстычнаму ўліку, была вельмі высокай. Аднак ніякіх звестак пра гэта ў архівах няма, бо ў эпоху позняга сталінізму дзяржаўныя і партыйныя органы кіраваліся толькі інструкцыямі і ўстрымліваліся па магчымасці ад крытычных справаздач. Акрамя таго, статыстычны фетышызм, які наклаў адбітак на савецкую бюракратыю дру-

гой паловы XX ст., у поўнай меры выявіўся толькі пасля прыняцця 7-гадовага плана 1959 г. Нарэшце неабходна яшчэ ўлічыць, што 21 кастрычніка 1953 года, г. зн. пасля смерці Сталіна, Савет Міністраў СССР прыняў агульнае палажэнне аб рэгуляванні міграцыі ў гарады. Гаворка ішла аб унутранай службовай інструкцыі. Яна прадугледжвала дазвол на прапіску толькі ў тым выпадку, калі мелася індывідуальная жылая плошча, якая адпавядала наступным санітарным нормам: у жылых дамах 9 кв. м, у інтэрнатах для студэнтаў 6 кв. м і 4,5 кв. м у інтэрнатах для рабочых[485]. Наколькі нерэальнымі былі гэтыя лічбы для Мінска, можна меркаваць па тым, што агульная плошча на чалавека, якая разлічвалася з улікам плошчы кухні, пярэдняга пакоя і санвузла, з 1950 да 1965 г. павялічылася толькі з 5,8 кв. м да 9,6 кв. м (табліца 16). Легальны пераезд у беларускую сталіцу быў пры такіх умовах немагчымы.

Толькі пасля XX з'езда КПСС (люты 1956 г.) кіраўніцтва Мінска задумалася над абмежаваннем росту горада. Парадаксальным чынам "закрыццё" беларускай сталіцы па часе супала з "адкрыццём" савецкага грамадства ў сувязі з дэсталінізацыяй і культурна-палітычнай "адлігай". Падставай для гэтага паслужылі імпульсы звонку, а прычынай былі ўнутраныя праблемы. Неабходна адзначыць, што Хрушчоў на XX з'ездзе партыі выкрыў не толькі культ асобы, але і абвясціў абмежаванне росту буйных гарадоў і забеспячэнне прадпрыемстваў рабочай сілай за кошт мясцовага насельніцтва. Неабходныя дзеянні, што вынікалі з гэтага, былі падмацаваны ў красавіку 1956 г.: у працоўнае заканадаўства зноў вярнулі артыкул аб праве на звальненне, тым самым стварыўшы перадумовы для свабоднага рынку працоўнай сілы ва ўсесаюзным маштабе[486]. Але трэба ўлічваць, што з-за масы мігрантаў дзяржаўнае жыллёвае будаўніцтва не магло больш гарантавана забяспечваць насельніцтва жыллём у Мінску. Нягледзячы на тое, што з прычыны дэфіцыту жылля "сацыялістычны горад" тым самым губляў свае асноўныя рысы, нелегальныя шляхі вырашэння кватэрнай праблемы сведчылі: дзяржаўны кантроль не працуе і прэтэнзія на абсалютнае панаванне кампартыі ва ўсіх сферах паўсядзённага жыцця не мае пад сабой глебы.

[485] Пар. створаны ў 1968 г. для Мінгарвыканкама агляд развіцця сістэмы прапіскі. ДАМВ, ф. 6, воп. 3, спр. 578, арк. 125–128.

[486] Пар.: ч. II. 1.

Упершыню пытанне аб становішчы ў сістэме прапіскі было пастаўлена на парадак дня Мінгарвыканкамам на паседжанні 12 красавіка 1956 г. Начальнік упраўлення міліцыі А. Сяргееў апісаў безнадзейнае становішча, адзначыўшы, што ў некаторых выпадках адказныя за прапіску супрацоўнікі міліцыі прапісвалі грамадзян нягледзячы на адсутнасць звестак аб месцы жыхарства і колькасці чалавек. Акрамя гэтага, людзей прапісвалі без дазволу санітарных службаў і без пацвярджэння наяўнасці неабходнай жылплошчы. Таксама мелі месца выпадкі афер, калі для прапіскі выкарыстоўваўся статус дэмабілізаваных вайскоўцаў. Нарэшце, домакіраўніцтва выдавала фіктыўныя дакументы, на падставе якіх можна было атрымаць прапіску, напрыклад, даведкі, якія пацвярджалі пражыванне ў недабудаваных дамах, або даведкі аб рэгістрацыі ў дамавой кнізе як кватарантаў у няісных асоб[487]. Пры абмеркаванні гэтага выступлення закранала ся роля санітарнай службы і самавольныя будаўнічыя работы.

Згодна з рашэннем санітарна-эпідэміялагічнай службы г. Мінска раённыя санэпідстанцыі мелі права выдаваць спецыяльныя дазволы на прапіску. Вырашальнае значэнне пры гэтым мела наяўнасць дадатковай жылплошчы, а таксама ўмовы пражывання. Свабода дзеянняў для бюракратычнага самавольства, якую адкрывалі гэтыя няпэўныя ўказанні, абмяжоўвалася толькі загадам, паводле якога санітарная норма індывідуальнай жылплошчы павінна была складаць не менш за 5-6 кв. м[488]. У гэтай сувязі галоўны санітарны ўрач горада А. Шыманскі заўважыў, што практычна ні ў кога з мігрантаў не было прадпісанай законам і адпаведнай санітарнай норме жылплошчы 9 кв. м. Таму пры выдачы дазволу на прапіску на санітарнай службе ляжала большая адказнасць, чым на міліцыі. Шыманскі адзначыў, што ў 1955 г. санітарная служба не дазволіла прапіску толькі ў 9 тыс. выпадкаў з 20 тыс. Пры гэтым ён вымушаны быў прызнаць, што з наяўным персаналам немагчыма праверыць кожны асобны выпадак[489]. У адпаведнасці з гэтым у намесніка старшыні Мінгарвыканкама М. М. Астрэйкі былі ўсе падставы для абурэння беспрынцыповасцю прынятых рашэнняў. Ён намаляваў вобраз прайдзісвета, які мог звярнуцца ў санітарную

[487] ДАМВ, ф. 6, воп. 4, спр. 582, арк. 62–64.
[488] Тамсама, арк. 56.
[489] Тамсама, арк. 23.

службу і, пагражаючы, узяць без асаблівых перашкод даведку, якая дазволіла б атрымаць прапіску ў міліцыі. У канцы свайго гнеўнага выступу Астрэйка зрабіў выснову, што сістэма прапіскі знаходзілася ў стане "хаосу"[490].

У наступных выступленнях звярталася ўвага на злоўжыванні пры здачы ў арэнду жылля і на выпадкі самавольнага будаўніцтва ў горадзе. Меліся на ўвазе нелегальнае будаўніцтва драўляных дамоў на ўскраіне горада і выкарыстанне ўласнага зямельнага ўчастка для будаўніцтва "времянок". Старшыня Мінгарвыканкама В. І. Шарапаў даволі рэзка выступіў з нагоды апісаных парушэнняў. Спасылаючыся на прыклад Ленінграда, ён парэкамендаваў адпраўляць тых, што не маглі прад'явіць на працягу 24 гадзін штамп аб прапісцы, туды, адкуль яны прыехалі. Ён на поўным сур'ёзе верыў, што штамп у пашпарце мог стрымаць людзей[491].

Хоць як старшыня, так і намеснік старшыні Мінгарвыканкама на словах выступалі за радыкальныя рашэнні, Мінгарвыканкам абмежаваўся тым, што загадам ад 12 красавіка 1956 г. абвясціў вымову кіраўніку Мінскай гарадской санітарна-эпідэміялагічнай службы Шыманскаму (такім чынам знайшлі "ахвярнага казла"). Акрамя таго, пацвердзілі ўжо дзейныя прававыя прадпісанні, якіх неабходна было строга прытрымлівацца: 1) міліцыі даручалася выконваць пастанову Савета Міністраў СССР ад 21 кастрычніка 1953 г. па санітарных нормах; 2) забаранялася прапіска ў "времянках", а таксама засяленне членаў сям'і ў інтэрнатах; 3) санітарнай службе было даручана праводзіць праверкі на месцах; 4) прадпрыемствам і арганізацыям забаранялася прымаць на працу людзей без прапіскі або без дзейнага пашпарта; рабочая сіла павінна была набірацца па магчымасці з Мінска; калі прымалі на працу тых, хто не быў жыхаром Мінска, ім павінны былі даваць жыллё; 5) жыллёвым канторам і іх кіраўнікам забаранялася здаваць кватэры людзям без прапіскі ці дзейнага пашпарта; 6) інтэрнатам забаранялася сяліць людзей, што не працавалі на тых прадпрыемствах, за якімі былі замацаваны гэтыя інтэрнаты. Забараняліся змяшаныя інтэрнаты, каб перашкаджаць утварэнню сем'яў. Гэтыя палажэнні паказвалі на прыхаваныя магчымасці, якія трэба было пазней прыкрыць. Важнае ж рашэнне наконт зда-

[490] Тамсама, арк. 24.
[491] Тамсама, арк. 32.

чы жылля ў арэнду і самавольнага будаўніцтва, наадварот, адкладвалася[492].

Праз два тыдні пасля паседжання Мінгарвыканкама ЦК КПБ зрабіў спробу новай ініцыятывы па абмежаванні росту насельніцтва ў беларускай сталіцы. 28 красавіка 1956 г. на нараду склікалі кіраўнікоў буйных прадпрыемстваў, міліцыі і пашпартных сталоў. Сярод 126 удзельнікаў былі партыйныя актывісты, адміністрацыйныя работнікі, прадстаўнікі гарадскога і раённых саветаў дэпутатаў працоўных, міліцыі і пракуратуры, народныя суддзі, дырэктары прамысловых прадпрыемстваў і будаўнічыя падрадчыкі. Зыходзячы з колькасці прапісак, сакратар ЦК КПБ П. А. Абрасімаў памылкова ацаніў у сваім дакладзе штогадовае павелічэнне насельніцтва на 52 тыс. чалавек, што адпавядала велічыні сярэдняга горада[493]. Абрасімаў недаацаніў цякучасць насельніцтва. У сувязі з вялікай колькасцю выбылых прырост насельніцтва складаў толькі каля 25 тыс. чалавек на год (гл. дадатак, табліца VIII). Паколькі з-за пастаяннага прыбыцця і выбыцця горад быў перапоўнены, Абрасімаў з поўнай падставай аргументаваў, што павелічэнне прамысловай вытворчасці не прапарцыйнае павелічэнню жыллёвага фонду. Ён звярнуў увагу на тое, што пабудаваныя ў 1955 г. 100 тыс. кв. м жылля маглі задаволіць толькі 20 тыс. чалавек з разліку 5 кв. м на чалавека і адзначыў, што будаўніцтва жылля неабходна павялічыць у два разы. Прычыну абвастрэння жыллёвага крызісу Абрасімаў тлумачыў двума фактарамі: з аднаго боку, іншагароднім па месцы працы давалася часовае жыллё, а ўжо потым яны прэтэндавалі на пастаяннае жыллё ў гарвыканкаме; з другога боку, прадпрыемствы не асвойвалі ў поўным аб'ёме выдзеленыя дзяржавай сродкі на будаўніцтва і такім чынам не выконвалі абавязацельствы па жыллёвым будаўніцтве. Пры гэтым не гаварылася пра пагоню за валавымі паказчыкамі пад час сталінскіх пяцігодак, якая панавала ў эканоміцы СССР.

[492] Тамсама, арк. 50–54.

[493] Пра дакладныя дадзеныя былі, відавочна, інфармаваныя толькі эксперты. На сумесным паседжанні прадстаўнікоў Дзяржплана і Дзяржбуда 23 чэрвеня 1956 г. Н. Я. Трахтэнберг заявіў, што за 1954 і 1955 гг. насельніцтва павялічылася адпаведна на 25 тыс. і 30 тыс. чалавек. Ён адзначыў, што для скарачэння гадавога прыросту насельніцтва на 20 тыс. чалавек варта пры нараджальнасці 7–8 тыс. абмежаваць прыток мігрантаў 10–12 тыс. НАРБ, ф. 31, воп. 6, спр. 759, арк. 21.

Абрасімаў прапанаваў меры па стрымліванні росту горада, накіраваныя на прадухіленне "ўцёкаў з вёскі": 1) забараніць дырэктарам прадпрыемстваў прымаць на працу людзей з вясковай прапіскай; 2) забараніць арганізаваны набор рабочай сілы з сельскай мясцовасці; 3) адпраўляць па месцы пражывання асоб, якія на працягу апошніх двух гадоў самавольна паехалі з калгасаў; 4) прынятае Мінгарвыканкамам рашэнне па рэгуляванні сістэмы прапіскі зрабіць больш жорсткім адносна санітарнай нормы неабходнай плошчы.

Таксама Абрасімаў заклікаў абмеркаваць трэці пункт, які тычыўся адпраўкі людзей назад у калгасы. Ён дапускаў, што некаторыя былыя вяскоўцы жывуць у горадзе пэўны час і маюць рабочыя спецыяльнасці, а значыць, яны неабходныя для прамысловасці. Таму падкрэсліваў: яго прапанова тычылася толькі тых, што пакідалі вёску без дазволу старшыні калгаса. Гэтыя людзі не мелі кватэр і не былі звязаны ў якой-небудзь форме з горадам. Акрамя таго, Абрасімаў звярнуў увагу на яшчэ дзве групы. Першая група – асобы, якія ўхіляліся ад грамадска карыснай працы (у савецкім разуменні – святары, алкаголікі і крымінальныя злачынцы). Іх, на думку Абрасімава, трэба было неадкладна высяляць з горада. Другая група – дэмабілізаваныя афіцэры, што асядалі ў Мінску, хоць раней яны жылі ў іншых месцах. Акрамя таго, Абрасімаў пацвердзіў, што выпускнікі ВНУ могуць заставацца толькі ў тым выпадку, калі горад сапраўды мае ў іх патрэбу. Відавочна, ён разумеў, што лад жыцця новаперасяленцаў спрыяў "асяляньванню" горада.

На заканчэнне Абрасімаў яшчэ раз заклікаў выкарыстоўваць унутрыгарадскія рэсурсы: а) інтэграваць у рабочы працэс 25 тыс. беспрацоўных, што жылі ў горадзе (у тым ліку занятых на прыватных прысядзібных гаспадарках і хатніх гаспадынь, якія займаліся агародніцтвам. – *Т. Б.*); б) наём іншагародніх ажыццяўляць толькі з дазволу Мінгарвыканкама; в) работнікаў, якія ў сваёй галіне не маглі быць забяспечаны жылплошчай, уладкаваць на прадпрыемствы, дзе іх маглі забяспечыць жыллём; г) будаўніцтва асабістага жылля праводзіць гэтак жа інтэнсіўна, як і дзяржаўнага; д) Мінску варта пераняць маскоўскі эксперымент па будаўніцтве гарадоў-спадарожнікаў[494].

[494] НАРБ, ф. 4, воп. 95, спр. 69, арк. 1–12.

Пры абмеркаванні дырэктар фабрыкі імя Молатава апісаў дынаміку "ўцёкаў з вёскі" на прыкладзе свайго прадпрыемства. Яго фабрыка прыняла 1 тыс. рабочых з правінцыі і размясціла іх у прыватных кватэрах і бараках. Потым высветлілася, што яны не падыходзілі для працы на вытворчасці. У гэтай сувязі правялі праверку, якая выявіла, што 460 чалавек перасяліліся ў горад без дазволу калгасаў. Пасля 300 працаўнікоў звольнілі. Аднак толькі крыху больш за 10 чалавек вярнуліся ў вёску. Астатнія знайшлі ў горадзе іншую працу[495]. Старшыня Мінгарвыканкама В. І. Шарапаў змог да гэтага дадаць, што апісаны выпадак – не выключэнне. З 45 тыс. мігрантаў 22 тыс. супрацьзаконна атрымалі дазвол на прапіску. Паляпшэння сітуацыі можна было чакаць толькі ў выпадку захавання сістэмы прапіскі[496]. У канчатковым рахунку гэта сведчыла пра бездапаможнасць уладаў перад напорам насельніцтва, якое "ўцякала з вёскі".

Наступным крокам па абмежаванні росту горада стала паседжанне 23 чэрвеня 1956 г., на якім сабраліся прадстаўнікі Дзяржплана і Дзяржбуда, каб пераглядзець мэты развіцця горада, вызначаныя ў Генеральным плане. Старшыня Дзяржплана С. М. Малінін ва ўступным дакладзе выказаў, як ні дзіўна, меркаванне пра тое, што Мінск не належыць да катэгорыі буйных гарадоў, для якіх партыйным і дзяржаўным кіраўніцтвам прадугледжана дэканцэнтрацыя прамысловасці. Малінін сцвярджаў, што варта толькі вызначыць дынаміку росту прамысловага патэнцыялу і колькасці насельніцтва на працягу наступных 10–20 гадоў[497]. Н. Я. Трахтэнберг выказаў меркаванне, што колькасць работнікаў на вытворчых і транспартных прадпрыемствах саюзнага значэння да 1965 г. павялічыцца да 260–270 тыс., хоць Генеральным планам было прадугледжана павелічэнне толькі да 164 тыс. У сувязі з гэтым ён прыйшоў да высновы, што сістэма прапіскі можа абмежаваць прыток мігрантаў, але не спыніць яго[498]. Зыходзячы з гэтага, на паседжанні вырашылі накіраваць ва ўрад наступныя рэкамендацыі: а) павышэння вытворчых паказчыкаў дамагацца за кошт інтэнсіўнага, а не экстэнсіўнага выкарыстання працы; б) адмовіцца ад рэалізацыі новых прамысловых праектаў у Мінску; в) запланаваць будаўніцтва га-

[495] Тамсама, арк. 21.
[496] Тамсама, арк. 25–26.
[497] НАРБ, ф. 31, воп. 6, спр. 759, арк. 1.
[498] Тамсама, арк. 7, 21.

радоў-спадарожнікаў; г) спецыялізаваныя сельскагаспадарчыя ВНУ адкрываць за межамі сталіцы; д) старанна вывучаць пытанне аб выдачы дазволаў на будаўніцтва прыватных дамоў на 15–20 кватэр[499]. Мінск як буйны прамысловы цэнтр знаходзіўся яшчэ на стадыі будаўніцтва, таму выявілася, што рашэнне праблемы "ўцёкаў з вёскі" ў рамках шырокага рэгіянальнага планавання было заўчасным.

Калі 11 кастрычніка 1956 г. адбылося чарговае паседжанне Мінгарвыканкама, каб ліквідаваць недахопы ў сістэме прапіскі, прычынай якіх быў неафіцыйны рынак прыватнага жылля, было знойдзена прагматычнае рашэнне адносна легалізацыі тагачаснай сітуацыі. Так, начальнік 3-га аддзялення міліцыі меркаваў, што самавольныя забудоўшчыкі, якія ўжо даволі доўгі час жылі ў Мінску, павінны атрымліваць дазвол на пражыванне, у той час як на кватарантаў гэтая льгота не павінна распаўсюджвацца[500]. Галоўны архітэктар горада Л. П. Мацкевіч лаканічна заўважыў, што мерапрыемствы, накіраваныя супраць самавольнага жыллёвага будаўніцтва, больш неэфектыўныя, бо гэтае будаўніцтва прыняло "масавы характар"[501]. Начальнік 10-га аддзялення міліцыі паскардзіўся, што самавольныя забудоўшчыкі, справы якіх былі перададзены ў суд, абышліся грашовым штрафам і па-ранейшаму нелегальна жывуць у сваіх дамах[502]. У адказ сакратар Мінгарвыканкама А. Іваноў зазначыў, што для зносу самавольна збудаваных дамоў няма законных падстаў[503]. І. Б. Каждан прапанаваў больш не ўмешвацца ў сітуацыю ў тых выпадках, калі ўжо склалася своеасаблівая супольнасць – так званае вясковае паселішча[504]. Намеснік старшыні Мінгарвыканкама М. М. Астрэйка зрабіў выснову, што да гвалтоўнага рашэння ў выпадку неабходнасці можна звяртацца (але ў адносінах да дамоў, а не да людзей). Пры гэтым ён заклікаў праяўляць павагу да няпісаных законаў: дом, у якім ужо асталявалася сям'я, зносіць не варта. Дзяржава ж павінна ўмешвацца ў сітуацыю тады, калі будаўніцтва дома толькі пачата[505]. Ствараецца ўражанне, што

[499] Тамсама, арк. 57–60.
[500] ДАМВ, ф. 6, воп. 4, спр. 597, арк. 23.
[501] Тамсама.
[502] Тамсама, арк. 24.
[503] Тамсама.
[504] Тамсама, арк. 25.
[505] Тамсама, арк. 27.

адказныя асобы ў Мінску літаральна капітулявалі пад напорам мігрантаў з вёскі.

Бяссілле ўлады ўзяць сітуацыю пад кантроль выявілася ў прынятых 11 кастрычніка 1956 г. папраўках да сістэмы прапіскі: 1) санітарная норма для студэнцкіх інтэрнатаў падымалася з 6 кв. м да 6,5 кв. м на чалавека, у той час як у жылых дамах і рабочых інтэрнатах норма 9 кв. м і 4,5 кв. м адпаведна заставалася ранейшай; 2) дазвол на прапіску ў Мінску павінен быў выдавацца гарадскім упраўленнем міліцыі, на перапрапіску ў межах горада – раённымі аддзяленнямі міліцыі; 3) па ўзгадненні з санітарнай службай у выключных выпадках міліцыя магла дазволіць прапіску на плошчы, меншай за санітарную норму; 4) у выпадку паляпшэння жыллёвых умоў перапрапіска ў межах горада была магчымая нават тады, калі плошча для прапіскі была меншая за санітарную норму; 5) забаранялася прапіска субкватарантаў у дамах без тэхнічнага пашпарта і "времянках"; 6) каб прадухіліць нелегальнае будаўніцтва, міліцыя павінна была ўзмацніць кантроль над ускраінамі горада і ў выпадку неабходнасці неадкладна паведамляць райвыканкамам і прымаць контрмеры ў адпаведнасці з дырэктывай Мінгарвыканкама[506]. Так гарадскія ўлады шляхам цэнтралізацыі і ўзмацненнем жорсткасці сістэмы прапіскі спрабавалі супрацьстаяць незаконным дзеянням мігрантаў і крайнім мерам, на якія ішлі людзі, што мелі патрэбу ў жыллі. Тым самым, з аднаго боку, адкрываліся дзверы самавольству бюракратыі, з другога боку, наноўпрыбылых правакавалі на пошук іншых магчымасцяў.

З гэтай прычыны старшыня Мінгарвыканкама В. І. Шарапаў праз два гады быў вымушаны выступіць з паўторнай ініцыятывай, каб паскорыць "закрыццё" горада. 7 ліпеня 1958 г. ён падаў сакратару ЦК КПБ К. Т. Мазураву справаздачу аб дэфіцыце жылля ў Мінску і падняў пытанне аб прыняцці наступных мер: а) для атрымання прапіскі санітарную норму неабходна павысіць з 9 кв. м да 12 кв. м на чалавека; б) прыём на працу іншагародніх дазваляць толькі ў тым выпадку, калі адпаведныя прадпрыемствы будуць даваць ім жылплошчу; в) пазбавіць прадпрыемствы права выдзялення кватэр і цалкам перадаць гэта райвыканкамам; г) жыллё, якім не карыстаюцца ці якое не здаецца ў наём, варта перадаваць дзяржаве; д) абмежаваць

[506] Тамсама, арк. 37–39.

колькасць пакояў да пяці ў прыватных дамах; е) здаваць жыллё ў наём толькі з дазволу жыллёвых ведамстваў; ё) гарвыканкам павінен атрымаць магчымасць прымаць рашэнне аб зносе самавольна пабудаваных дамоў на працягу трох месяцаў; ж) нелегальныя будаўнічыя працы варта абкладаць штрафам у памеры 5 тыс. рублёў; з) забараніць перадачу кватэр членам сям'і пры пераездзе[507]. Сваю задачу Шарапаў бачыў, відавочна, у тым, каб абараніць інтарэсы мясцовага насельніцтва ад мігрантаў, якіх прыцягвалі перавагі жыцця ў сталіцы. Гэтаму, на яго думку, павінна было спрыяць пашырэнне кампетэнцый Мінгарвыканкама ў пытанні абмежавання свабоды выбару месца жыхарства. Такім чынам, яго прапановы нагадваюць калейдаскоп, у якім пераламляюцца самыя розныя грані нелегальнага і паўлегальнага пражывання ў горадзе.

З-за перанаселенасці горада існавала патрэба ў новых дзеяннях, таму 7 жніўня 1958 г. Мінгарвыканкам унёс два дапаўненні ў сістэму прапіскі ад 12 красавіка 1956 г. З аднаго боку, міліцыі забаранялася прапісваць людзей у кватэрах, што знаходзіліся на тэрыторыі прадпрыемстваў, у падвалах, грамадскіх памяшканнях (так званых "чырвоных кутках") і "времянках". У інтэрнаты для несямейных нельга было падсяляць членаў сям'і. З іншага боку, кіраўнікам прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў забаранялася браць на працу людзей без прапіскі і пашпартоў. Акрамя таго, дазвалялася прымаць на працу людзей з правінцыі толькі пры адсутнасці такіх спецыялістаў на мясцовым рынку працы і пры ўмове надзялення іх жылплошчай[508]. Так Мінгарвыканкам забяспечыў сябе юрыдычным інструментарыем, які адпавядаў рэальным умовам і на нейкі час прыпыніў рост нелегальнай міграцыі ў горад.

Тое, што рашэнне аб павышэнні санітарнай нормы індывідуальнай жылой плошчы да ўтапічнага памеру ў 12 кв. м было адкладзена, не паўплывала на сітуацыю (у рэчаіснасці санітарная норма агульнай жылой плошчы, якая ўключала яшчэ кухню, санвузел і пярэдні пакой, вырасла паступова з 8,4 кв. м у 1960 г. да 12,5 кв. м у 1975 г. – табліца 16). Відавочна, ЦК КПБ не лічыў магчымым пайсці насустрач гэтым ініцыятывам без кансультацыі з Масквой, бо 23 верасня 1958 г. загадчык аддзела будаўніцтва і камунальнай гаспадаркі ЦК КПБ парэкамен-

[507] НАРБ, ф. 4, воп. 97, спр. 27, арк. 122–124.
[508] ДАМВ, ф. 6, воп. 4, спр. 685, арк. 111.

даваў Першаму сакратару ЦК КПБ К. Т. Мазураву дачакацца прыняцця рашэння на саюзным узроўні[509]. Паколькі млын савецкай бюракратыі круціўся павольна, Шарапаў быў вымушаны ў 1960 і 1963 гг. зрабіць яшчэ дзве спробы, каб паскорыць прыняцце рашэння. ЦК КПБ адказаў адмовай на прапанову, унесеную ў 1960 г., матывуючы гэта запланаваным скарачэннем Узброеных сіл. І толькі прапанова ад 14 лютага 1963 г. прывяла да поспеху. Шарапаў спаслаўся на тое, што санітарная норма ў Кіеве складае 13,65 кв. м, у Тбілісі – 13 кв. м, у Рызе – 12 кв. м і ў Вільнюсе – 12 кв. м[510]. Пасля Мінгарвыканкам сваім рашэннем ад 12 красавіка 1963 г. унёс тры ўдакладненні ў сістэму прапіскі ў беларускай сталіцы: 1) у жылых дамах санітарная норма была павялічана з 9 да 12 кв. м на чалавека, у студэнцкіх інтэрнатах зніжана з 6,5 да 6 кв. м, а ў працоўных інтэрнатах засталася ранейшай – 4,5 кв. м; 2) у прыватных дамах дапускалася прапіска толькі аднаго кватаранта на год; 3) маладых спецыялістаў, якія пасля заканчэння інстытута або тэхнікума знаходзілі месца працы ў Мінску, павінны прапісваць без уліку санітарнай нормы[511].

Наколькі непаслядоўнымі былі мерапрыемствы па "закрыцці" горада, можна меркаваць па тым, што патрэба прадпрыемстваў у рабочай сіле прымусіла Мінгарвыканкам ужо праз месяц зноў унесці змены ў правілы прапіскі. Пастановай ад 9 траўня 1963 г. былі створаны прававыя асновы для ўзнікнення ў горадзе новага сацыяльнага пласта – "лімітчыкаў". Новае палажэнне гучала наступным чынам: у выпадках, калі прадпрыемствы набіралі работнікаў і забяспечвалі іх жылплошчай, можна было атрымаць у міліцыі спецыяльны дазвол на часовую прапіску на адзін год. Пасля заканчэння гэтага тэрміну прадпрыемства павінна было выдаць даведку, якая дазваляла хадайнічаць аб працягу прапіскі на пяць гадоў. Калі работнік звальняўся да заканчэння гэтага тэрміну, яго пазбаўлялі прапіскі ў інтэрна-

[509] НАРБ, ф. 4, воп. 97, спр. 27, арк. 99–100.
[510] НАРБ, ф. 4, воп. 97, спр. 138, арк. 35–36.
[511] Апрача таго, планавалася прасіць Савет Міністраў БССР зрабіць больш жорсткімі абмежавальныя меры. Па-першае, планавалася ўнесці змены ў артыкул 145 Крымінальнага кодекса. У тым выпадку, калі домаўладальніка двойчы прыцягвалі да адміністратыўнай адказнасці за здачу жылля асобе без прапіскі, ён мог быць прыцягнуты да крымінальнай адказнасці. Па-другое, быў запрошаны дазвол на ўвядзенне прапіскі ў Мінскім раёне. ДАМВ, ф. 6, воп. 3, спр. 251, арк. 290.

це і паведамлялі ў міліцыю. Акрамя гэтага, заслугоўвае ўвагі яшчэ адно палажэнне. Яно тычылася тых, што мелі патрэбу ў жыллі, пражывалі ў інтэрнатах і планавалі стварэнне сям'і: асобам, якія мелі пастаянную прапіску і страцілі яе з-за пераезду, даваўся дазвол на прапіску без уліку санітарнай нормы. Такім чынам, гэтымі двума палажэннямі ўносіліся паслабленні ў сістэму прапіскі як у інтарэсах прадпрыемстваў, так і ў інтарэсах грамадзян[512].

Але становішча па-ранейшаму заставалася незразумелым і нельга было выключыць складаныя сітуацыі ў асобных выпадках, таму 8 лютага 1968 г. Мінгарвыканкам унёс чарговыя папраўкі і тым самым пашырыў кола асаблівых выпадкаў: 1) забаранялася здаваць у арэнду жылое памяшканне ў бараках і старых дамах; 2) забаранялася прыняцце на працу людзей, якія не маглі штодня дабірацца ад месца жыхарства да месца працы, а таксама студэнтаў, прапіска якіх была абмежавана тэрмінам навучання; 3) па заявах прадпрыемстваў і арганізацый Мінгарвыканкам меў права дазваляць часовую прапіску, калі індывідуальная жылплошча адпавядала норме для рабочага інтэрната; пасля заканчэння тэрміну давалася пастаянная прапіска, калі людзі заставаліся працаваць на тым жа месцы і маглі пацвердзіць наяўнасць жылплошчы, якая адпавядала санітарнай норме; 4) акрамя таго, у асобных выпадках міліцыя мела права выдаваць спецыяльныя дазволы: а) асобам, якія працавалі ў Мінску больш за 5 гадоў без уліку санітарнай нормы, пры наяўнасці заяў ад прадпрыемстваў і арганізацый; б) асобам, якія бралі шлюб з жыхарамі Мінска; в) маладым спецыялістам, запатрабаваным у горадзе; г) мужу і жонцы, якія жылі ў інтэрнатах і ў якіх пасля шлюбу з'явілася магчымасць атрымаць уласную кватэру; тыя, што былі не ў шлюбе і жылі ў інтэрнатах, наадварот, залежалі ад заявы працадаўцаў[513]. Такім чынам, сістэма прапіскі ўяўляла сабой складаны набор палажэнняў, які з-за яго недасканаласці ўвесь час неабходна было мяняць, зыходзячы з рэалій жыцця. Што тычыцца 1970-х і 1980-х гг., то нічога канкрэтнага сказаць нельга, бо архіўныя справы за той перыяд часу яшчэ засакрэчаныя. Аднак калі б да іх быў доступ, то хутчэй за ўсё можна было б вызначыць, што і тыя гады характарызаваліся пэўнымі нюансамі ў сістэме прапіскі.

[512] ДАМВ, ф. 6, воп. 3, спр. 253, арк. 26–29.
[513] ДАМВ, ф. 6, воп. 3, спр. 578, арк. 118–124.

### б) Парушэнні і злоўжыванні ў сістэме прапіскі

Мігранты без прапіскі не мелі законных падстаў для атрымання ў горадзе працы і паступлення на вучобу, а таксама доступу да медыцынскіх паслуг. Аднак на самай справе мігранты і кіраўнікі на месцах парушалі правілы прапіскі з-за вялікай колькасці перасяленцаў і недахопу жылля. У гэтай сітуацыі жыццё ў горадзе для многіх мігрантаў рабілася магчымым з прычыны парушэння законаў, карупцыі і падману. З аднаго боку, органы ўлады парушалі службовыя інструкцыі; з другога – мігранты вырашалі свае праблемы шляхам подкупу службовых асоб і падробкі пашпартоў. Выключэнні сталі правілам. Памяншэнне колькасці парушэнняў сістэмы прапіскі дасягалася толькі час ад часу, калі партыйнае і дзяржаўнае кіраўніцтва чарговы раз прымала крокі па строгім захаванні прававых нормаў.

Нягледзячы на тое, што з 1956 г. Мінгарвыканкам кіраваўся наказам Хрушчова абмежаваць рост буйных гарадоў, у 1950-я гг. было незразумела, як на практыцы функцыянуе сістэма прапіскі[514]. Хоць намаганні, якія з 1960 г. прыкладаліся для сістэматычнага ўліку парушэнняў, сведчылі пра імкненне да татальнага кантролю над грамадствам, дадзеныя пашпартнага стала міліцыі за паўгоддзе сведчаць, што колькасць парушэнняў знаходзілася ў межах дапушчальнага. Колькасць заведзеных адміністрацыйных спраў паказвае, што ў цэлым парушэнні сістэмы прапіскі разглядаліся як дробнае правапарушэнне, а не як крымінальнае злачынства. Варта, аднак, адзначыць, што звесткі, якія дайшлі да нашага часу, маюць прабелы па асобных гадах. Акрамя таго, улік правапарушэнняў і абставін іх здзяйснення не абавязкова адпавядаў кожны год адной і той жа класіфікацыі. У дадатку ў табліцы XIV прыведзены звесткі толькі за кожнае другое паўгоддзе. Ад складання дадзеных двух паўгоддзяў вырашана было адмовіцца, бо двайны ўлік паўтаральных дадзеных сказіў бы карціну гадавой справаздачы.

[514] На аснове справаздачы начальніка ўпраўлення міліцыі Сяргеева, з якой ён выступіў на паседжанні 10 кастрычніка 1957 г., вымалёўваецца прыблізная карціна. Па яго словах, на трактарным, аўтамабільным і веласіпедным заводах працавалі 1882 чалавекі, якія жылі ў Мінску без прапіскі. Яшчэ 1500 чалавек не перапрапісаліся пасля змены кватэры. ДАМВ, ф. 6, воп. 4, спр. 645, арк. 34–35.

Тым не менш, па табліцы, якая ахоплівае перыяд з 1961 да 1970 г., можна прасачыць некалькі цікавых тэндэнцый: 1) раз на паўгода кантраляваліся 500–1000 прадпрыемстваў, арганізацый і навучальных устаноў. Апрача таго, у першай палове 1960-х гг. рэгулярна правяраліся больш за 20 тыс. дамоў, інтэрнатаў і баракаў, у сярэдзіне 1960-х гг. – больш за 50 тыс. кватэр і ў другой палове 1960-х гг. – больш за 200 тыс. жыхароў. Такім чынам перыядычна пад праверку падпадалі працоўныя адносіны на ўсіх прадпрыемствах, а таксама праводзілася выбарачная праверка ўмоў жыцця адной чвэрці насельніцтва; 2) у залежнасці ад інтэнсіўнасці кантролю і ад выдачы спецыяльных дазволаў за год адзначалася ад 6 да 10 тыс. парушэнняў. У сярэдзіне 1960-х гг. амаль палова ўсіх парушэнняў прыпадала на пражыванне ў горадзе без перапрапіскі пры змене месца жыхарства ў межах горада, амаль чвэрць – на нелегальнае знаходжанне ў горадзе і яшчэ амаль чвэрць – на непрацягненне пашпарта. Гаворка ішла пра людзей, якія трапілі ў горад з дапамогай прадпрыемства або ВНУ і пры спробе палепшыць дрэнныя жыллёвыя ўмовы ў службовых кватэрах знаходзілі альтэрнатыву на рынку прыватнага жылля, якое не адпавядала санітарнай норме. Некаторыя ж былі прапісаны па ранейшым месцы жыхарства, але жылі і працавалі ў Мінску, не маючы магчымасці легалізаваць свой статус з дапамогай адпаведнага жылля. Адлюстраваны ў табліцы спад абсалютных паказчыкаў парушэнняў можна растлумачыць тым, што з 1967 г. у Мінску не ўлічвалася адсутнасць перапрапіскі; 3) у першай палове 1960-х гг. кожны год рэгістраваліся каля 3 тыс. выпадкаў атрымання жылля без прапіскі; пры гэтым гаворка пераважна ішла пра кватарантаў у прыватных дамах; 4) за год заводзілася больш за 6 тыс. адміністрацыйных спраў, звязаных з парушэннем сістэмы прапіскі. Толькі ў дзвюх трэціх выпадкаў справа заканчвалася штрафам. Трэць праваправарушальнікаў абыходзілася папярэджаннем. Выпадкі грубых парушэнняў, якія перадаваліся на разгляд таварыскіх судоў, не ўлічваліся. Характэрна, што колькасць парушэнняў і колькасць заведзеных спраў супадалі толькі ў пачатку 1960-х гг. З гэтага вынікае, што ў другой палове 1960-х гг. органы ўлады з-за перагружанасці не рэагавалі на парушэнні праследам у абавязковым парадку.

Пра варыянты парушэнняў і пра парог талерантнасці органаў улады сведчаць справаздачы, якія начальнік аднаго з раённых аддзяленняў міліцыі з 1960 г. рэгулярна падаваў у Мін-

гарвыканкам[515]. Побач са звесткамі пра маштабы нелегальнага і паўлегальнага жыцця ў "закрытым" горадзе выклікаюць цікавасць заўвагі, якія апісваюць спецыфічныя сацыяльныя праблемы. Справаздачы адлюстроўваюць сітуацыю маргінальных груп грамадства. Урэшце ствараецца ўражанне, што ўнутраная міграцыя падпарадкоўвалася ўласнай дынаміцы і рэгулявалася хіба толькі дэфіцытам жылля.

Справаздача начальніка міліцыі А. Прыбыткова ў Мінгарвыканкам ад 15 чэрвеня 1961 г. змяшчае дадзеныя вынікаў праверак за 1960 г., а таксама аналіз парушэнняў за першае паўгоддзе 1961 г. Паводле гэтай справаздачы, у 1960 г. было праверана 27 357 дамоў, баракаў і інтэрнатаў, 1605 прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый, а таксама 9149 адрасоў людзей, якім раней было адмоўлена ў прапісцы. Пры гэтым выявілі 5123 парушэнні прапіскі, у тым ліку 2083 асобы без прапіскі, 2878 домаўладальнікаў, якія здавалі жыллё ў наём людзям без прапіскі, а таксама 47 чыноўнікаў, якія працаўладкоўвалі людзей без прапіскі. У выніку 1803 правапарушальнікі былі папярэджаны і 3320 аштрафаваны[516]. Акрамя таго, у рамках маштабнай кампаніі, якая праводзілася з 20 красавіка да 1 чэрвеня 1961 г., праверылі 1592 прадпрыемствы, установы і арганізацыі, 6274 шматкватэрныя дамы, 148 інтэрнатаў будаўнічых арганізацый, навучальных устаноў і г. д., а таксама 20 321 прыватны

[515] Першы даклад у шэрагу справаздач за паўгоддзе пра стан сістэмы прапіскі быў зроблены начальнікам упраўлення міліцыі Мінгарвыканкама А. Прыбытковым 6 верасня 1960 г. З даклада вынікае, што ў першым паўгоддзі 1960 г. было праверана 13 548 жылых дамоў, баракаў і інтэрнатаў, а таксама 1205 прадпрыемстваў, арганізацый і навучальных устаноў. Апрача таго, выявілі 3208 чалавек, у якіх не было прапіскі, і 921 чалавека з пратэрмінаванай прапіскай. За гэты перыяд часу было вызначана 2503 выпадкі парушэнняў пашпартнага рэжыму. 1043 чалавекі папярэдзілі, 1400 чалавек аштрафавалі. Да адказнасці прыцягнулі 1009 чалавек, што жылі ў Мінску без прапіскі, і 1047 чалавек, што здавалі жылплошчу людзям без прапіскі, а таксама 53 чалавекі з пратэрмінаванымі пашпартамі, 8 чалавек без пашпарта і 26 кіраўнікоў вытворчасці і прадпрыемстваў, якія прынялі на працу людзей без прапіскі ці пашпарта. У мэтах прафілактыкі парушэнняў сістэмы прапіскі і пашпартнага рэжыму супрацоўнікі міліцыі прачыталі 1204 лекцыі і правялі 17 урачыстых уручэнняў пашпарта. ДАМВ, ф. 6, воп. 3, спр. 103, арк. 110–117, тут арк. 110.

[516] ДАМВ, ф. 6, воп. 3, спр. 220, арк. 196–197.

дом[517]. На працоўных месцах выявілі 15 чалавек без пашпарта, у 166 чалавек пашпарты былі пратэрмінаваны, у 345 чалавек не было прапіскі, 525 чалавек мелі часовую прапіску, а 4131 чалавек – прапіску ў вёсках за межамі Мінскага раёна[518]. У жылых дамах было зафіксавана 65 чалавек без пашпарта, 432 чалавекі з пратэрмінаваным пашпартам, 1878 чалавек без прапіскі і 4673 з прапіскай, якая не адпавядала месцу жыхарства. Амаль палова ўсіх парушэнняў прыпадала на прыватныя дамы (табліца 8)[519].

**Табліца 8.** Зафіксаваныя парушэнні сістэмы прапіскі і пашпартнага рэжыму ў Мінску ў жылых дамах у першым паўгоддзі 1961 г.

| Парушэнні | у 6274 шматкватэрных дамах | у 148 інтэрнатах | у 20321 прыватным доме | усяго |
|---|---|---|---|---|
| без прапіскі | 653 | 208 | 1017 | 1878 |
| без перапрапіскі | 2002 | 547 | 2124 | 4673 |
| без пашпарта | 33 | 8 | 24 | 65 |
| з пратэрмінаваным пашпартам | 259 | 53 | 120 | 432 |
| Разам | 2947 | 816 | 3285 | 7048 |

*Крыніца:* ДАМВ, ф. 6, воп. 3, спр. 220, арк. 211, 217 і 225–226.

На падставе гэтага Прыбыткоў зрабіў выснову, што людзі, у якіх не было прапіскі, заставаліся ў горадзе галоўным чынам дзеля працы. Далей ён сцвярджаў, што людзі, якія не перапрапісаліся, жылі пераважна ў інтэрнатах і ў прыватных дамах. На яго думку, катэгорыя грамадзян без пашпарта фармавалася занятымі на асабістых прысядзібных гаспадарках сельскімі жыхарамі, якія пераехалі ў горад, і тымі студэнтамі, якім нядаўна споўнілася 16 гадоў, але яны жылі далёка ад дому[520]. Нарэшце Прыбыткоў адзначаў: у выпадку большасці тых, што парушылі сістэму прапіскі, гаворка ішла пра былых жыхароў інтэрнатаў, якія браліся шлюбам і перасяляліся ў кватэры, дзе жылая плошча не адпавядала патрэбнай санітарнай норме[521]. У цэлым

[517] Тамсама, арк. 198.
[518] Тамсама, арк. 199.
[519] Тамсама, арк. 208.
[520] Тамсама, арк. 209.
[521] Тамсама, арк. 219.

Мінгарвыканкам павінен быў разумець, што прычына пражывання без прапіскі хавалася ў абмежаваным колькасці месцаў у інтэрнатах і камунальных кватэрах, а таксама ў наяўнасці бюракратычных перашкод.

Роля, якую выконвалі прадпрыемствы ў паслабленні сістэмы прапіскі, была адзначана ў справаздачы начальніка ўпраўлення міліцыі Мінгарвыканкама П. Жука начальніку ўпраўлення міліцыі Міністэрства ўнутраных спраў В. І. Жукаву ад 12 студзеня 1963 г.[522]. З аднаго боку, Жук звярнуў увагу на тое, што прадпрыемствы самавольна працаўладкоўваюць людзей, прапісаных у сельскіх раёнах. На аўтазаводзе з чэрвеня 1961 да жніўня 1962 г. мелі месца больш за 600 такіх выпадкаў, на заводзе аўтаматычных ліній з ліпеня 1961 да верасня 1962 г. – 180 выпадкаў і на фабрыцы запасных частак са студзеня да верасня 1962 г. – 107 выпадкаў[523]. З іншага боку, Жук асуджаў не прадугледжаную законам практыку спецыяльных дазволаў: на падставе хадайніцтваў кіраўнікоў прадпрыемстваў Мінгарвыканкам дазваляў працаўладкоўваць пэўную колькасць лімітчыкаў з сельскай мясцовасці і даручаў міліцыі прапісваць іх нават без выканання санітарных нормаў. Такім чынам, у другім паўгоддзі 1962 г. стала магчымым працаўладкаванне 927 чалавек з сельскай мясцовасці, а таксама прапіска 1100 чалавек без уліку санітарнай нормы[524]. Жук лічыў, што рашэнне Мінгарвыканкама палягчае наём працоўнай сілы, але абцяжарвае барацьбу з парушэннямі сістэмы прапіскі. І ўсё таму, што працаўладкаваныя ў парадку выключэння людзі жылі ў сталіцы не па месцы прапіскі, а нелегальна[525]. Гэтая інфармацыя пацвярджала наяўнасць новага сацыяльнага пласта – лімітчыкаў.

Далейшы спектр парушэнняў Жук апісаў у сваёй справаздачы ад 28 ліпеня 1963 г. Найбольш распаўсюджанае парушэнне было звязана з адсутнасцю перапрапіскі пры пераездзе ў межах горада. Людзі, якія па сямейных абставінах або іншых прычынах пакідалі свае месцы ў інтэрнатах або на прыватных кватэрах, часта былі вымушаны на працягу доўгага перыяду здавольвацца часовым прыстанкам без магчымасці перапрапіскі. У прыватнасці ў будаўнічых арганізацыях назіралася пераўтва-

[522] АМУС, ф. 35, воп. 1, спр. 21, арк. 122–133.
[523] Тамсама, арк. 125.
[524] Тамсама, арк. 126.
[525] Тамсама, арк. 127.

рэнне інтэрнатаў для несямейных у інтэрнаты сямейнага тыпу, прычым толькі адзін з членаў сям'і афіцыйна меў месца і прапіску. Утваралася вялікая праслойка з людзей, якія працавалі і жылі ў Мінску, але прапісаны яны былі ў Мінскім раёне, бо ў горадзе з-за адсутнасці санітарнай нормы ў прапісцы ім адмаўлялася[526]. Часта домаўладальнікі здавалі людзям жыллё, не прапісваючы іх, каб не плаціць падаткі. Аднак за пэўную плату яны маглі прапісаць сваіх кватарантаў. Жук таксама адзначаў, што ў адпаведных установах прапіска за хабар была звычайнай справай. Злоўжыванне службовым становішчам выяўлялася як у выдачы фіктыўных даведак з месца працы, так і ў падачы недакладных звестак па жылплошчы[527]. У цэлым высветлілася, што прапіска ў Мінскім раёне і наяўнасць пакоя ў інтэрнаце або прад'яўленне даведкі аб арэндзе ў прыватным доме былі асноўнымі спосабамі трапіць у горад. Пры гэтым мігранты з самага пачатку сутыкаліся з самавольствам і карупцыяй.

З-за безвыходнасці сітуацыі яны часта сустракалі разуменне з боку міліцыі. З аднаго боку, са справаздачы Жука ад 17 студзеня 1966 г. відаць, з якімі цяжкасцямі праваральшчыкі сутыкаліся пры рэйдах, а з другога боку, наколькі паблажліва яны абыходзіліся з парушальнікамі закона. Жук паказваў на тое, што ў ліпені – жніўні, а потым у верасні 1965 г. у праверках удзельнічала 87 дэпутатаў райсаветаў, 219 работнікаў домаўпраўленняў і членаў вулічных камітэтаў, 376 міліцыянераў, 413 дружыннікаў і 25 добраахвотнікаў. У цэлым імі было праверана 4578 аб'ектаў нерухомасці, 638 "времянок", 170 недабудаваных аб'ектаў і 10 інтэрнатаў і выяўлена пры гэтым 2253 парушэнні сістэмы прапіскі. У 97% усіх выпадкаў парушальнікаў знайшлі ў "времянках". 1534 чалавекі жылі ў недабудаваных дамах, яшчэ не здадзеных у эксплуатацыю. 659 чалавек знайшлі прытулак у часовых збудаваннях на зямельных участках аднакватэрных дамоў. Акрамя таго, было ўстаноўлена 328 чалавек, якія змаглі пасяліцца ў кватэрах у якасці кватарантаў, хоць адказны домаўладальнік з боязі нарвацца на непрыемнасці з самага пачатку адмовіў ім у прапісцы[528]. Пры гэтым начальнік упраўлення міліцыі Мінгарвыканкама заступіўся за тых, хто ўжо даўно жыў і працаваў у Мінску: "Нельга адносіць іх да

[526] АМУС, ф. 35, воп. 1, спр. 22, арк. 1–12.
[527] Тамсама, арк. 6.
[528] АМУС, ф. 49, воп. 1, спр. 30, арк. 127.

катэгорыі злосных парушальнікаў, бо яны хочуць прапісацца, але з-за адсутнасці жылплошчы не могуць гэтага зрабіць". Жук прызнаваў тым самым, што парушэнне закона было толькі рэакцыяй на бядотнае становішча. На яго думку, да згаданых груп адносіліся наступныя грамадзяне: 1) людзі, якія прыбылі па аргнабору і атрымалі часовую прапіску тэрмінам на 5 гадоў; яны не маглі станавіцца на чаргу на атрыманне кватэры ні ў райвыканкамах, ні на прадпрыемствах, таму ў выпадку ўступлення ў шлюб былі вымушаны здымаць часовае жыллё, дзе прапіска была немагчымай з-за адсутнасці жылплошчы, адпаведнай санітарнай норме; 2) рабочыя з Мінскага раёна, якія з-за вялікай адлегласці ад дому да працы не кожны дзень вярталіся дадому; 3) студэнты ВНУ, якія не змаглі атрымаць месца ў інтэрнаце; 4) рабочыя з іншых рэгіёнаў, якія былі супрацьзаконна працаўладкаваны прадпрыемствамі і арганізацыямі[529]. Гэтай справаздачай начальнік упраўлення міліцыі Мінгарвыканкама, з аднаго боку, паказваў на "шэрыя зоны" і непадкантрольныя прасторы на першы погляд гамагеннага "сацыялістычнага горада"; з другога боку, даваў зразумець, што парушэнні сістэмы прапіскі правакаваліся парушэннем закона самімі органамі ўлады, і, такім чынам, недахопы пашпартнага рэжыму і прапіскі былі абумоўлены самой сістэмай.

Пра ролю інтэрнатаў у парушэннях прапіскі Жук далажыў сакратару гаркама КПБ і старшыні Мінгарвыканкама ў лісце ад 26 траўня 1966 г. Начальнік упраўлення міліцыі Мінгарвыканкама звярнуў увагу на тое, што 7% насельніцтва Мінска, або 53 955 чалавек, пераважна маладзевага ўзросту, прапісаны ў 242 рабочых і 49 студэнцкіх інтэрнатах. Для іх была характэрна вялікая цякучасць: склад жыхароў у гэтых інтэрнатах штогод істотна мяняўся (20–25%). Многія рабочыя і служачыя, прапісаныя ў інтэрнатах, пакідалі іх па сямейных або іншых прычынах і сяліліся на прыватных кватэрах, у "времянках", у бараках і дамах без тэхнічнага пашпарта, не будучы пры гэтым там прапісанымі. Адрас яны не паведамлялі ні ў міліцыю, ні ў ваенкаматы. Пры праверцы ўстанавілі больш за 3400 правапарушальнікаў: 1372 чалавекі жылі ў прыватных дамах без тэхнічнага пашпарта, 755 – у прыватных дамах з тэхнічным пашпартам, больш за 600 – у шматкватэрных дамах у сваякоў і знаёмых, 480 – у "времянках" і 206 – у бараках. У цэлым у інтэрнатах

529 Тамсама, арк. 128–129.

было прапісана на 4 тыс. чалавек больш, чым дазвалялі месцы[530]. Выходзячы з гэтага, можна сцвярджаць, што інтэрнаты служылі для несямейных важным перавалачным пунктам на шляху ў горад, але з-за перапоўненасці не маглі гарантаваць нармальных умоў жыцця і былі для маладых сем'яў толькі фармальным адрасам.

Мінгарвыканкам ускладаў адказнасць за сацыяльную неўладкаванасць мігрантаў непасрэдна на прадпрыемствы. Так, 12 жніўня і 19 верасня 1966 г. начальнік упраўлення па ахове грамадскага парадку Мінгарвыканкама Рудкоўскі крытыкаваў дырэктараў трактарнага завода і абутковага аб'яднання "Прамень" за набор рабочай сілы з Мінскага раёна. З 602 занятых на трактарным заводзе 300 чалавек, родам з аддаленых мясцовасцяў БССР, фіктыўна прапісаліся ў Мінскім раёне; на абутковай фабрыцы такіх было 61 з 182 работнікаў. Гэтыя людзі не мелі жылплошчы ў Мінскім раёне, таму нелегальна аселі ў горадзе. Людзі, што ўладкаваліся на працу без прапіскі, часта траплялі ў цяжкае становішча і былі вымушаны здавольвацца самымі прымітыўнымі ўмовамі жыцця. Многія з іх звярталіся са скаргамі ў розныя дзяржаўныя і партыйныя інстанцыі. Аднак іх поўнай інтэграцыі ў гарадскую супольнасць перашкаджаў той факт, што іх кватэры не адпавядалі неабходнай для прапіскі санітарнай норме. Пры гэтым яны траплялі ў залежнасць ад прыватных домаўладальнікаў: 289 рабочых трактарнага завода выкарыстоўвалі бязвыхаднае становішча новаперасяленцаў і за пэўную плату здавалі калегам жыллё ў сваіх дамах[531].

[530] ДАМВ, ф. 69, воп. 6, спр. 595, арк. 77–81. Ваенны камісар Мінскай вобласці ў лісце ад 17 жніўня 1961 г. на імя першага сакратара Мінскага гаркама КПБ і старшыні Мінгарвыканкама скардзіўся на "ненармальнае становішча" ва ўліку ваеннаабавязаных. Многія ваеннаабавязаныя жылі ў горадзе без прапіскі і запісу ў ваенных білетах, былі зарэгістраваны па адрасах, што не адпавядалі іх сапраўднаму месцу пражывання, або пастаянна мянялі кватэры. Напрыклад, у 21-м інтэрнаце Сталінскага раёна было прапісана 775 ваеннаабавязаных, што жылі ў іншых раёнах. Ваенкамату ўдалося вызначыць толькі 568 адрасоў. Апрача таго, у згаданых інтэрнатах жыло каля 100 ваеннаабавязаных без прапіскі, якія не стаялі на уліку ў ваенкамаце. Прычынай, напэўна, быў той факт, што названы кантынгент не меў прапіскі з-за пражывання ў памяшканнях, плошча якіх не адпавядала санітарным нормам. ДАМВ, ф. 69, воп. 1, спр. 1536, арк. 45–48.

[531] ДАМВ, ф. 6, воп. 3, спр. 416, арк. 29–31 і арк. 25–26.

Намеснік начальніка ўпраўлення аховы грамадскага парадку Мінгарвыканкама П. Жук у справаздачах ад 17 і 25 ліпеня 1967 г. у Міністэрства аховы грамадскага парадку і ў Мінгарвыканкам паведамляў пра факты непаслядоўных адносін райвыканкамаў да патрэбаў прадпрыемстваў, з аднаго боку, і гаротнага становішча мігрантаў, з другога боку. У якасці станоўчага моманту Жук адзначыў памяншэнне насельніцтва, якое нелегальна жыве ў Мінску, з 2,8% у 1966 да 1,6% у 1967 г. Мінскі гаркам КПБ і Мінгарвыканкам прынялі сумесную пастанову, у адпаведнасці з якой у інтарэсах прадпрыемстваў райвыканкамы мелі права працаўладкоўваць і прапісваць іншагародніх рабочых без уліку санітарнай нормы, таму колькасць рабочых у Мінску без прапіскі знізілася. Негатыўным фактам, на думку Жука, быў "лібералізм", які праяўлялі райвыканкамы ў дачыненні да пашпартнага рэжыму і прапіскі. У першым паўгоддзі 1967 г. зарэгістравалі каля 6 тыс. парушэнняў: 133 чалавекі не мелі пашпарта, у 210 чалавек пашпарт быў пратэрмінаваны, 1048 чалавек не мелі прапіскі, 2850 чалавек не былі перапрапісаныя. Акрамя таго, зарэгістравалі 1651 домаўладальніка, якія не выконвалі нормы, вызначаныя пашпартным рэжымам. Пры разглядзе правапарушэнняў былі зроблены папярэджанні і накладзены грашовыя штрафы. З 4385 спраў аб правапарушэннях, якія міліцыя завяла ў першым паўгоддзі 1967 г., па 1335 справах, ці 30,4%, вынеслі папярэджанні, а 2903 чалавекі, або 66,2%, аштрафавалі. Толькі 147 выпадкаў (3,4%) перадалі ў суд. Мяркуючы па памеры штрафаў, парушэнні пашпартнага рэжыму і сістэмы прапіскі разглядаліся як правапарушэнні, што не ганіліся грамадствам. 5 рублёў, якія ў сярэднім спаганяліся за правапарушэнне, былі толькі паловай максімальнага штрафу, прадугледжанага законам[532]. З гэтага можна зрабіць выснову: дзяржава ў пэўнай ступені заплюшчвала вочы на парушэнні насельніцтвам пашпартнага рэжыму.

Толькі ў сувязі з перапісам насельніцтва, які павінен быў адбыцца ў 1970 г., дзяржава сканцэнтравала ўвагу на дакладным уліку насельніцтва і бездакорным функцыянаванні пашпартнай сістэмы і сістэмы прапіскі. Са справаздачы намесніка начальніка ўпраўлення міліцыі В. А. Піскарова старшыні

[532] АМУС, ф. 49, воп. 1, спр. 25, арк. 232–252, тут арк. 234 і арк. 242–243; ДАМВ, ф. 6, воп. 3, спр. 487, арк. 25–27.

Мінгарвыканкама М. В. Кавалёву ад 29 верасня 1969 г. вынікае, што доля нелегалаў, якія жылі ў горадзе, узрасла з 1,6% па дадзеных на 1 ліпеня 1967 г. да 2,4% на 1 ліпеня 1968 г., але па дадзеных на 1 ліпеня 1969 г. знізілася да 1%. На думку Піскарова, мяркуючы па абсалютным ліку падобных выпадкаў, парушэнням супрацьстаяла бездакорнае правядзенне перапісу насельніцтва, дакладная рэгістрацыя адрасоў і захаванне грамадскага парадку. У 1968 г. і ў першым паўгоддзі 1969 г. былі выдадзены ўпершыню або абмяняны 112 тыс. пашпартоў, выдадзена 82 500 пастаянных і часовых прапісак, выраблена 279 тыс. перапрапісак у межах горада і зарэгістравана 41 700 выбылых з прычын перасялення ў іншыя рэгіёны, смерці, пазбаўлення волі і прызыву ў войска (табліца 9). Пад час праверак усіх інтэрнатаў і жылых дамоў, а таксама 1088 прадпрыемстваў і ўстаноў, праведзеных міліцыяй, статыстычным упраўленнем, райсаветам, вулічнымі і дамавымі камітэтамі, а таксама дружыннікамі, было выяўлена 355 чалавек без пашпартоў, 7052 чалавекі без прапіскі і 1720 нелегалаў, што працавалі ў Мінску. Акрамя таго, 4257 чалавек, маладзейшых за 16 гадоў, не былі ўпісаны ні ў пашпарты бацькоў, ні ў дамавыя кнігі, а 3298 чалавек пакінулі Мінск, не выпісаўшыся. З 8071 прыцягнутых да адміністрацыйнай адказнасці 5385 чалавек былі аштрафаваны, а 2480 вынесены папярэджанні (табліца 10)[533].

Пазней высветлілася, што "шлюзы" ў горад атрымалася закрыць толькі напярэдадні перапісу насельніцтва. Як толькі кантроль з боку бюракратычнага апарату слабеў, колькасць тых, што жылі без прапіскі ў горадзе, зноў імкліва ўзрастала. 10 ліпеня 1970 г. намеснік начальніка ўпраўлення міліцыі Мінгарвыканкама В. А. Піскароў паведаміў пра 10 тыс. нелегалаў, якія жылі ў горадзе, што складала 1,1% насельніцтва Мінска[534]. Праз паўтара года сітуацыя ў корані змянілася. 19 студзеня 1972 г. Піскароў далажыў Мінскаму гаркаму партыі аб праверцы 300 тыс. жыхароў, а таксама 900 прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый, якая выявіла, што больш за 30 тыс. чалавек, або 3% насельніцтва, не мелі прапіскі[535].

[533] ДАМВ, ф. 6, воп. 3, спр. 658, арк. 40–50, тут арк. 40–42.
[534] АМУС, ф. 49, воп. 1, спр. 57, арк. 104–108, тут арк. 106.
[535] ДАМВ, ф. 69, воп. 10, спр. 15, арк. 90–121.

**Табліца 9.** Выдача пашпартоў і прапісак у Мінску ў 1967–1969 гг.

| | 1967 г. | 1968 г. | І паўгоддзе 1969 г. |
|---|---|---|---|
| выдача і замена пашпартоў | 62 800 | 73 400 | 39 000 |
| прапіска | 45 500 | 55 000 | 27 500 |
| перапрапіска ў горадзе | 144 500 | 187 600 | 96 900 |
| выбылыя | 24 000 | 27 000 | 14 700 |

*Крыніца:* ДАМВ, ф. 6, воп. 3, спр. 658, арк. 54.

**Табліца 10.** Стан пашпартнай сістэмы ў Мінску ў 1967–1969 гг.

| | 1967 г. | 1968 г. | І паўгоддзе 1969 г. |
|---|---|---|---|
| правераныя жыхары па жыллёвых сектарах | 443 700 | 1 073 400 | 174 000 |
| правераныя прадпрыемствы і арганізацыі | 1063 | 571 | 517 |
| вынік: | | | |
| – асобы без пашпарта | 222 | 304 | 51 |
| – асобы без прапіскі | 6031 | 5610 | 1442 |
| – тыя, хто пераехаў без выпіскі | 2439 | 2556 | 742 |
| – дзеці да 16 гадоў, не ўнесеныя ў дамавыя кнігі | 894 | 3626 | 631 |
| – тыя, хто працаваў без прапіскі | 442 | 835 | 885 |
| меры: | | | |
| – складанне пратаколаў<br>з іх аб парушэннях службовых асоб | 8153<br>115 | 5190<br>66 | 2881<br>69 |
| – грашовыя штрафы | 5307 | 3460 | 1905 |
| – папярэджанні | 2637 | 1621 | 860 |
| – перадача справы ў суд | 3 | 5 | 3 |
| персанал, які выконваў праверкі: | | | |
| – пазаштатныя супрацоўнікі | 47 | 56 | 60 |
| – памочнікі | 660 | 737 | 707 |

*Крыніца:* ДАМВ, ф. 6, воп. 3, спр. 658, арк. 53.

Са статыстычных звестак вынікае, што сістэма прапіскі падрывалася парушэннем законаў грамадзянамі і бяздзейнасцю органаў улады. Падробкі пашпартоў і прапіскі, зафіксаваныя ў міліцэйскіх пратаколах, былі толькі адзінкавымі выпадкамі. Да ўвядзення права на звальненне ў 1956 г. ахвотнікі пераехаць цалкам залежалі ад працадаўцы. Міграцыя рэгулявалася перш за ўсё аргнаборам. З увядзеннем

права на свабодны выбар працоўнага месца наяўнасць жылплошчы была вырашальным фактарам для атрымання прапіскі. Менавіта па гэтай прычыне ў ходзе масавага жыллёвага будаўніцтва ў 1960-я гг. у пашпартных сталах расквітнела карупцыя[536].

Падробкай дакументаў займаліся як прафесійныя махляры, так і звычайныя людзі, якія карысталіся зручным момантам. Як вынікае са справаздачы міністра ўнутраных спраў БССР А. Н. Аксёнава першаму сакратару ЦК КПБ К. Т. Мазураву ад 6 траўня 1961 г., група махляроў, якая складалася з трох чалавек і займалася падробкай дакументаў, ілжыва сцвярджала, што ўдзельнічала ў подкупе міліцыі ў Мінску. Пры гэтым яны ставілі фальшывыя штампы аб прапісцы. За гэтыя паслугі, якія, натуральна, не прадугледжвалі сапраўднай прапіскі, ашуканцы бралі з падманутых ад 85 да 120 рублёў, што адпавядала прыблізна адной месячнай зарплаце[537]. Акрамя таго, і самі мігранты падраблялі дакументы: у справаздачы ад 26 студзеня 1962 г. начальнік упраўлення міліцыі Мінгарвыканкама А. Прыбыткоў далажыў начальніку ўпраўлення міліцыі Міністэрства ўнутраных спраў БССР В. І. Жукаву пра мужчыну, які нарадзіўся ў 1924 г. у Хабараўскім краі ва Усходняй Сібіры, быў двойчы асуджаны за крадзеж дзяржаўнай і асабістай маёмасці. Пасля прыезду ў Мінск у жніўні 1961 г. гэты чалавек, скарыстаўшыся пашпартам сваёй маці, паставіў фальшывы штамп аб прапісцы. На гэтай падставе 28 жніўня 1961 г. ён уладкаваўся бухгалтарам на завод халадзільнікаў. Пасля таго як парушэнне выкрылася, чалавека асудзілі ў снежні 1961 г. на тры з паловай гады пазбаўлення волі[538]. У службовым лісце дырэктару трактарнага завода начальнік упраўлення па ахове грамадскага парадку Мінгарвыканкама Рудкоўскі праінфармаваў аб наступным выпадку: мужчына, 1933 г. нар., паходжаннем з вёскі ў Гродзенскай вобласці, з 1959 да 1965 г. жыў з сям'ёй на цаліне ў Казахстане. Пасля пераезду ў Мінск у верасні 1965 г. ён

[536] 28 студзеня 1953 г. начальнік упраўлення міліцыі Міністэрства дзяржаўнай бяспекі ўпершыню зарэгістраваў выпадак выдачы дазволу на прапіску тым, хто працаўладкаваўся самастойна, за хабар і на аснове фальшывых дакументаў. АМУС, ф. 49, воп. 1, спр. 5, арк. 196–209, тут арк. 200.

[537] АМУС, ф. 35, воп. 3, спр. 46, арк. 157–158.

[538] АМУС, ф. 49, воп. 1, спр. 19, арк. 134–146, тут арк. 139–140.

з дапамогай махляра за 250 руб. атрымаў штамп аб прапісцы ў пашпарце, дзякуючы гэтаму ўладкаваўся на працу на трактарны завод і зняў кватэру[539].

Акрамя таго, пачасціліся выпадкі злоўжывання службовым становішчам сярод чыноўнікаў. Як вынікае з ужо згаданай справаздачы міністра ўнутраных спраў БССР ад 6 траўня 1961 г., камендант інтэрната дарожных рабочых, выкарыстоўваючы сваё службовае становішча, рабіў знаёмым прапіску і браў за гэта 350 руб., што адпавядала прыблізна трохмесячнай зарплаце. Але гэта яшчэ не ўсё: звальняючыся, ён выкраў дамавую кнігу кватэрнага аддзела Фрунзенскага райвыканкама, а таксама бланкі для прапіскі і выпіскі[540]. Прыклад атрымання дакументаў на аснове фіктыўных дадзеных можна знайсці ў справаздачы намесніка начальніка ўпраўлення аховы грамадскага парадку Мінгарвыканкама П. Жука ад 16 студзеня 1965 г.: у 1963 г. дырэктар Мінскага гандлёвага тэхнікума выдала выпускнікам даведкі аб тым, што яны толькі паступілі на вучобу. Замест таго каб прыступіць да працы ў правінцыі па размеркаванні, яны атрымалі часовую прапіску ў Мінску і магчымасць працаўладкавацца ў арганізацыях гандлю[541]. Асабліва абуральны выпадак Жук апісаў у справаздачы ад 16 ліпеня 1965 г.: у лютым 1965 г. у пашпартны стол аддзялення міліцыі Фрунзенскага раёна звярнулася з заявай жанчына, якая, нягледзячы на сапраўдную прапіску, не была ўпісана ні ў дамавую кнігу, ні ў рэгістрацыйны фармуляр у адрасным стале. Пасля высветлілася, што штамп за хабар паставіла супрацоўніца пашпартнага стала планава-эканамічнага ўпраўлення Міністэрства аховы грамадскага парадку. Прыператрусе яе кватэры былі выяўлены і іншыя пашпарты, уладальнікам якіх яна абяцала прапіску за плату. 24 чэрвеня 1965 г. на паказальным працэсе ў Мінскім абласным судзе яна была асуджана на 8 гадоў пазбаўлення волі. На слуханне запрасілі ўсіх супрацоўнікаў пашпартных сталоў Мінска[542]. Як доўга гэты жахлівы выпадак дзейнічаў на супрацоўнікаў пашпартных сталоў, застаецца невядомым.

[539] ДАМВ, ф. 6, воп. 3, спр. 416, арк. 29–31.
[540] АМУС, ф. 35, воп. 3, спр. 46, арк. 157–158.
[541] АМУС, ф. 49, воп. 1, спр. 25, арк. 139–148, тут арк. 144.
[542] Тамсама, арк. 261–272, тут арк. 266.

### в) Субурбанізацыя і ўтварэнне агламерацыі

Адразу пасля вайны дзяржава сканцэнтравала ўсе рэсурсы БССР у сталіцы, таму эканамічнае развіццё беларускай правінцыі спачатку адставала[543]. Субурбанізацыя і ўтварэнне агламерацыі пачалі выконваць ролю ў планаванні толькі пасля таго, як Хрушчоў у лютым 1956 г. на XX з'ездзе КПСС заклікаў да абмежавання росту буйных гарадоў[544]. 28 красавіка 1956 г. ЦК КПБ сабраў на нараду дырэктараў буйных прадпрыемстваў Мінска і кіраўнікоў аддзяленняў міліцыі, дзе на парадак дня па прыкладзе Масквы было пастаўлена будаўніцтва гарадоў-спадарожнікаў і дачных пасёлкаў[545]. У сувязі з гэтым 23 чэрвеня 1956 г. у Мінску прадстаўнікі Дзяржплана і Дзяржбуда абмеркавалі ролю гарадоў-спадарожнікаў у стрымліванні патоку мігрантаў з вёскі[546]. Тым не менш рэгіянальнаму планаванню ў БССР стала аддавацца належная ўвага толькі тады, калі ў пачатку 1960-х гг. яго сталі асвятляць у друку. У прыватнасці, у працах намесніка дырэктара Інстытута будаўніцтва і архітэктуры пры АН БССР І. Д. Белагорцава гаварылася, што абмежаванне росту сталіцы пры адсутнасці беларускіх прамысловых рэгіёнаў можа быць дасягнута толькі за кошт пераносу прадпрыемстваў за горад і будаўніцтва філіялаў за рысай Мінска шляхам стварэння вакол сталіцы гарадоў-спадарожнікаў. Белагорцаў прытрымліваўся таго пункту гледжання, што каля 30 населеных пунктаў з 750 тыс. жыхароў маглі стварыць Мінскую агламерацыю. Аднак у якасці гарадоў-спадарожнікаў ён канкрэтна называў толькі размешчаны за 58 км на ўсход ад сталіцы горад Жодзіна з яго аўтамабільным заводам, а таксама дачныя пасёлкі Ждановічы і Крыжоўку з курортнай зоны Заслаўскага вадасховішча (Мінскага мора) адпаведна за 10 і 22 км на паўночны захад ад Мінска[547]. Калі 10 сту-

[543] Пар.: ч. II. 2 і ч. IV. 1. а.

[544] Пар.: ч. II. 1.

[545] НАРБ, ф. 4, воп. 95, спр. 69, арк. 1–12, тут арк. 11.

[546] НАРБ, ф. 31, воп. 6, спр. 759, арк. 57–60.

[547] Пар.: Белогорцев И. Д. Городские поселения-спутники в Белоруссии // Города-спутники: сб. статей / отв. ред. В. Г. Давидович, Б. С. Хорев. Москва, 1961. С. 94–100; ён жа. К проблеме оптимальных размеров современного города // СНАРИСА. 1961. С. 20–29; ён жа, Чернова Л. Е. Агломерации городов Белоруссии // В помощь проектировщику. Вып. 5. Киев, 1961. С. 31–33. Пар. таксама: Hausladen G. The

дзеня 1962 г. старшыня Дзяржбуда У. А. Кароль выступіў з артыкулам у "Советской Белоруссии" аб "праблемах гарадскога будаўніцтва ў Беларусі", ён назваў у якасці патэнцыйных гарадоў-спадарожнікаў толькі размешчаныя ў радыусе 50 км ад Мінска раённыя цэнтры Дзяржынск і Смалявічы[548]. Такім чынам, пра адзіную і пераканальную канцэпцыю не ішло і гаворкі.

Па дэмаграфічным выбуху ў беларускай сталіцы ў 1960-я гг. можна меркаваць, што рэгіянальнае планаване не ўвасобілася ў практычную палітыку. Наадварот, назіраўся рост прамысловасці ў Мінску. Па ацэнцы эканаміста Т. М. Пучкаевай, павелічэнне колькасці рабочых у беларускай сталіцы ў 1959–1965 гг. на 90% і ў 1966–1970 гг. на 93% было звязана з пашырэннем і рэканструкцыяй ужо наяўных прадпрыемстваў[549]. Будаўніцтва філіялаў мінскіх прадпрыемстваў у гарадах і мястэчках вакол сталіцы абмяжоўвалася, як вызначылі дэмографы В. Ф. Мядзведзеў і С. А. Польскі, у асноўным толькі заводам па вытворчасці металарэзных станкоў у Мар'інай Горцы (раённы цэнтр у Мінскай вобласці), шарыкападшыпнікавым заводам у Маладзечна (раённы цэнтр у Мінскай вобласці), аўтамабільным заводам у Асіповічах (раённы цэнтр у Магілёўскай вобласці) і заводам па вытворчасці канвеераў у Баранавічах (раённы цэнтр у Брэсцкай вобласці). На падставе гэтых дадзеных Мядзведзеў і Польскі зноў паднялі пытанне аб праектаванні цэнтральнага прамысловага рэгіёна ў 80-кіламетровым кальцы вакол Мінска з гарадамі-спадарожнікамі і планаванні прамысловых цэнтраў у іншых частках рэспублікі з гарадамі на 150–200 тыс. жыхароў[550]. Іх заклік не застаўся па-за ўвагай. Аднак аказалася, што планаванне "вялікага Мінска",

Satellite City in Soviet Urban Development // SG. 1984. № 25. P. 229–247.

548 Король В. Проблемы градостроительства в Белоруссии // СБ. 1962. № 8. С. 3.

549 Пучкаева Т. М. К вопросу о плановом регулировании крупных городов республики // Архитектура и градостроительство / вып. и глав. ред. В. А. Король. Минск, 1972. С. 46–52, тут с. 47.

550 Пар.: Медведев В. Ф., Польский С. А. Проблема планировки и регулирования роста больших городов (на примере Белорусской ССР) // Проблемы урбанизации в БССР / под ред. Л. И. Валентея, В. В. Покшишевского, Б. С. Хорева. Москва, 1971. С. 88–99. Пар. таксама: Медведев В. Ф., Польский С. А. Планирование и регулирование роста городов (Белорусская ССР). Минск, 1969.

пра якое распавёў у інтэрв'ю часопісу "Нёман" у 1974 г. намеснік старшыні Мінгарвыканкама І. І. Ляўко, засталося толькі на словах[551].

І хоць Мядзведзеў і Польскі яшчэ ў 1971 г. высветлілі, што Мінскі раён служыць "транзітнай станцыяй" на шляху ў горад[552], у 1980 г. Л. Ціханава прыйшла да высновы, што гарады Мінскай вобласці ўжо ўзялі на сябе гэтую функцыю[553]. Іншымі словамі, субурбанізацыя і ўтварэнне агламерацыі ў БССР не вялі да ўрбанізацыі сельскай мясцовасці і прывязкі насельніцтва да гарадоў-спадарожнікаў. Наадварот, з аднаго боку, развіццё садовых таварыстваў у Мінску паказвае, што засяленне гарадскіх ускраін адпавядала індывідуальным патрэбам правядзення вольнага часу і адпачынку, аднак гэта ні ў якім разе не азначала, што людзі адмаўляліся жыць у Мінску.

Прававымі падставамі дзейнасці садовых таварыстваў служылі пастановы Савета Міністраў 1956–1957 гг. Было дазволена будаваць на зямельных участках плошчай 600 кв. м дачныя домікі плошчай 20 кв. м. На падставе гэтага да 1958 г. у раёнах Мінска і Дзяржынска ўтварыліся 34 таварыствы з 3665 чал. Згодна з пастановай Савета Міністраў БССР, іх грамадская функцыя вызначалася абавязкам калектыўнай апрацоўкі зямлі[554]. Неўзабаве высветлілася, аднак, што адна-дзве трэція членаў асобных таварыстваў парушалі ўскладзеныя на іх дзяржавай абавязкі. Прынамсі, старшыні райвыканкамаў Мінскай вобласці і Мінска, а таксама прафсаюзныя дзеячы вобласці адзначалі ў пастанове ад 2 жніўня 1961 г., што пры пасадцы садоў, пры апрацоўцы зямлі і пры зборы ўраджаю пачаў пераважаць "капіталістычны дух". На зямельных участках узнікалі вялікія асабістыя дамы, што супярэчыла элементарным будаўнічым нормам. Пры гэтым выкарыстоўваліся будматэрыялы, якія асобныя члены таварыстваў

[551] [Левко И. И.] Город-памятник сотворяя [вел интервью Анатолий Козлович] // Нёман. 1974. № 12 (23). С. 134–139, тут с. 135.

[552] Медведев В. Ф., Польский С. А. Проблемы планировки... С. 95. Пар. таксама: Польский С. А. Демографические проблемы... С. 24.

[553] Тихонова Л. Е. Современные миграционные процессы: особенности планирования и прогнозирования // Вопросы народонаселения, труда и уровня жизни / науч. ред. А. А. Раков, Л. П. Шахотько. Минск. 1980. С. 17–18.

[554] Пар. справаздачу Камітэта Дзяржкантролю за жнівень 1963 г. НАРБ, ф. 911, воп. 3, спр. 114, арк. 5–16. Пар. таксама: Lovell S. Summerfolk. A History of the Dacha. Ithaca / London, 2003.

нелегальна набывалі на прадпрыемствах. Гэтым грашылі дырэктары заводаў і высокапастаўленыя дзяржаўныя служачыя. Акрамя таго, таварыствы толькі ў нязначнай ступені фармаваліся з ліку супрацоўнікаў прадпрыемстваў, да якіх гэтыя таварыствы адносіліся. З-за парушэння "прынцыпаў калектывізму і камуністычнай маралі" было вырашана распусціць садовыя таварыствы і замяніць іх пансіянатамі, піянерскімі лагерамі, дзіцячымі садамі і іншымі сацыяльнымі ўстановамі[555]. Хоць колькасць парушэнняў на працягу наступных гадоў не зменшылася, Савет Міністраў БССР адмовіўся надаць законную сілу гэтаму рашэнню, спасылаючыся на спецыяльныя пастановы Савета Міністраў СССР[556]. Замест гэтага 10 верасня 1971 г. быў прыняты тыпавы статут садовых таварыстваў, згодна з якім забаранялася даваць зямельныя ўчасткі ў індывідуальнае карыстанне і прапаноўвалася перайсці да калектыўных формаў вядзення гаспадаркі[557]. Тым не менш, гэтая мера, згодна са справаздачай сакратара Мінскага гаркама партыі В. Ляпёшкіна ад 1 красавіка 1974 г., прывяла да таго, што паспяховыя садовыя таварыствы пачалі перажываць застой. У 1974 г. налічвалася 102 таварыствы з 12 099 чал. Відавочна, матывацыяй для ўступлення ў таварыства для рабочых і служачых была толькі магчымасць атрымаць зямельны ўчастак у індывідуальнае карыстанне[558].

З іншага боку, роля рабочых, якія прыязджалі з прыгарадаў і толькі ўскосна карысталіся перавагамі гарадскога жыцця, складалася ў тым, што беларуская сталіца паглынала пастаянны паток некваліфікаванай працоўнай сілы з прыгарадаў. Унутраны гарадскі патэнцыял працоўных у сярэдзіне 1960-х гг. быў значна знясілены, таму прыгарады Мінска пачалі выконваць істотную ролю пры наборы некваліфікаванай рабочай сілы. У сувязі з тым, што вытворчыя паказчыкі мінскіх прамысловых прадпрыемстваў за час 7-гадовага пла-

[555] НАРБ, ф. 911, воп. 3, спр. 114, арк. 109–110. Пар. таксама пратакол паседжання Мінгарвыканкама ад 3 жніўня 1961 г. ДАМВ, ф. 6, воп. 3, спр. 143, арк. 115–116.

[556] Пар. справаздачы сакратара раённага камітэта КПБ Мінскага раёна за 10 кастрычніка 1969 г. і травень 1970 г. ДАМВ, ф. 69, воп. 7, спр. 37, арк. 3–11; ДАМВ, ф. 69, воп. 8, спр. 27.

[557] ДАМВ, ф. 69, воп. 12, спр. 34, арк. 1–2.

[558] У сувязі з гэтым было рэкамендавана дазволіць таварыствам выкарыстоўваць невялікія зямельныя ўчасткі ў асабістых мэтах пры ўмове адкрыцця пансіянатаў. Тамсама.

на павялічыліся прыблізна ў 2,5 раза, а колькасць работнікаў павялічылася толькі ў 1,6 раза, 11 лютага 1965 г. намеснік міністра эканомікі хадайнічаў перад Саветам Міністраў БССР і Мінгарвыканкамам аб прыняцці на працу 4 тыс. чалавек з Мінскага раёна без прапіскі[559]. Шэраг асобных хадайніцтваў ад розных дзяржаўных устаноў сведчыць, што не хапала, у прыватнасці, нізкааплатнага абслуговага персаналу. Паводле перапісу насельніцтва 1970 г., у Мінску налічвалася 26 044 іншагародніх рабочых, 54,2% з якіх – асобы мужчынскага полу[560]. Яны складалі амаль 5% ад колькасці ўсіх працаўнікоў або амаль 10% ад колькасці занятых у вытворчай сферы. 22 857 (або 92,4%) усіх іншагародніх рабочых жылі ў вёсках, 15 479 (або 63,8%) былі з Мінскага раёна. Іх родныя гарады і вёскі знаходзіліся перш за ўсё ўздоўж чыгуначнай лініі Маладзечна – Заслаўе – Мінск – Рудзенск – Мар'іна Горка, якая ішла з паўночнага захаду на паўднёвы ўсход, і чыгуначнай лініі Негарэлае – Дзяржынск – Мінск – Смалявічы – Жодзіна, якая праходзіла з паўднёвага захаду на паўночны ўсход. 23 400 (або 94,7%) усіх іншагародніх рабочых штодня адольвалі шлях да 30 км (5–10 км – 12 100 рабочых, 11–20 км – 7 тыс. рабочых, 21–30 км – 4300 рабочых). Нягледзячы на гэта, палова ўсіх іншагародніх аддавала на дарогу больш за гадзіну; адна трэцяя – 40 хвілін[561]. Адметна тое, што населеныя пункты разам з прылеглай да іх тэрыторыяй,

559 ДАМВ, ф. 6, воп. 3, спр. 353, арк. 143. Паводле справаздачы начальніка Статыстычнага ўпраўлення г. Мінска ад 10 чэрвеня 1970 г., толькі 8477 чалавек з працаздольнага насельніцтва (жанчыны ва ўзросце ад 15 да 55 гадоў, мужчыны – ад 15 да 60 гадоў) не былі працаўладкаваны. ДАМВ, ф. 69, воп. 8, спр. 23, арк. 66–69.

560 Пар., напрыклад, звароты галоўурача 1-й клінічнай бальніцы, рэктара Політэхнічнага інстытута і дырэктара Батанічнага саду на імя старшыні Мінгарвыканкама ад 10 траўня 1965 г., 31 жніўня 1965 г. і 25 траўня 1966 г. ДАМВ, ф. 6, воп. 3, спр. 353, арк. 34 арк. 112; ДАМВ, ф. 6, воп. 3, спр. 416, арк. 75.

561 Польский С. А., Кунгурова Н. И., Рогозянский В. С. Региональные особенности маятниковой миграции в Белорусской ССР // Город и маятниковая миграция населения / под ред. С. А. Польского. Минск, 1973. С. 109–120, тут с. 110, 112, 115–119. Пар. таксама: Польский С. А. и др. Масштабы, направления и характеристика межпоселенных трудовых потоков в Белорусской ССР // Тамсама. С. 53–84; Польский С. А. Проблемы рационального использования трудовых ресурсов Минска // Проблемы расселения в БССР / ред. С. А. Польский. Минск, 1980. С. 136–150.

якія планаваліся ў дыскусіі 1960-х гг. як гарады-спадарожнікі, пастаўлялі сталіцы значную частку сваёй працоўнай сілы: з Маладзечна – 1900 чалавек, з Дзяржынска – 500 і з Смалявічаў – 1300[562]. Гэта сведчыць пра недастатковае развіццё мінскага рэгіёна. Сімптаматычна таксама тое, што сярод жыхароў Мінскага раёна ў сярэдзіне 1960-х гг. пачасціліся выпадкі вымушанага беспрацоўя. Гаворка ішла пра людзей, якія з-за адсутнасці прадпрыемстваў у вёсках не знаходзілі там працы і, не маючы прапіскі ў горадзе, не маглі і там прэтэндаваць на працоўнае месца[563].

На пачатку 1980-х гг. С. А. Польскі назваў чатыры важныя фактары, з прычыны якіх усе спробы абмежаваць рост насельніцтва ў Мінску не атрымоўваліся: па-першае, у сталіцы былі сканцэнтраваны ўсе рэсурсы рэспублікі; па-другое, недаацэнка рэгіянальнага планавання прывяла да недаацэнкі патэнцыйных субцэнтраў; па-трэцяе, экстэнсіўнае выкарыстанне прадпрыемствамі патэнцыялу рабочай сілы выклікала грэбаванне рацыяналізацыяй працэсу вытворчасці; па-чацвёртае, узроставая структура развівалася такім чынам, што павялічылася доля пенсіянераў і зменшылася доля працаздольных[564]. Польскі прытрымліваўся пункту гледжання, згодна з якім сістэма прапіскі пацярпела няўдачу, бо, з аднаго боку, не змагла гарантаваць "закрыццё" горада, а з другога – не быў улічаны адток людзей з горада[565]. Выхад з гэтай сітуацыі Польскі бачыў у субурбанізацыі і агламерацыі. У сваёй аптымістычнай ацэнцы гэтых рэгулёўных фактараў ён не ўлічыў, што з-за іерархічнасці савецкай сістэмы населеных пунктаў урбанізацыя ў сельскай мясцовасці не праводзілася, і мяжа горада была падзяляльнай лініяй паміж гарадскімі кварталамі з вышыннымі будынкамі і селішчамі з драўлянымі дамамі. У гэтых умовах савецкі "прыгарад" служыў толькі ўваходнымі варотамі ў "сацыялістычны горад"[566].

[562] Пар. справаздачу начальніка Статыстычнага ўпраўлення г. Мінска ад 10 чэрвеня 1970 г. ДАМВ, ф. 69, воп. 8, спр. 23, арк. 66–67.
[563] Пар. справаздачу загадчыка прыёмнай Савета Міністраў БССР ад 19 снежня 1964 г. ДАМВ, ф. 6, воп. 3, спр. 353, арк. 166–167.
[564] Польский С. А. Ключевые проблемы социально-экономического развития г. Минска. Минск, 1981. С. 26–27.
[565] Тамсама. С. 23–24.
[566] Тамсама. С. 40–41. Пар.: Ioffe G., Nefedova T. The Environs of Russian Cities. Lewiston, N. Y. et al, 2000.

## 3 Умовы жыцця мігрантаў у "закрытым" горадзе

### а) Кватаранты ў прыватных дамах і "времянках"

Без прапіскі мігранты не мелі легальнай магчымасці знайсці працу, паступіць на вучобу ў горадзе і карыстацца медыцынскімі паслугамі. У прыезджых з самага пачатку былі перашкоды ў выглядзе пошуку ўласнай кватэры і атрымання прапіскі. Невялікая колькасць кватэр ад райвыканкамаў і прадпрыемстваў давалася на падставе чаргі, патрапіць у якую маглі толькі мясцовыя жыхары. Месцаў у інтэрнатах было недастаткова, таму шматлікім іншагароднім рабочым і студэнтам даводзілася здымаць прыватныя кватэры[567]. З прычыны таго, што колькасць здаванай жылплошчы (пераважна ў камуналках) была абмежаванай, домаўладальнікі ў прыватным сектары, як правіла, пашыралі свае дамы прыбудовамі і тым самым спрыялі развіццю неафіцыйнага рынку жылля. Толькі ў 1961 г. было ўведзена абмежаванне на індывідуальнае жыллёвае будаўніцтва ў межах горада, яго замянілі кааператыўным жыллёвым будаўніцтвам. Тым не менш у домаўладальнікаў па-ранейшаму мелася магчымасць здаваць пакой або прапаноўваць жылплошчу ў "времянках"[568]. Той факт, што гэта было масавай з'явай, пацвярджае заклік у "Советской Белоруссии" ад 13 лістапада 1964 г. зносіць такое жыллё. Як правіла, "времянки" на зямельных участках прыватных забудоўшчыкаў рабіліся да пачатку будаўніцтва жылога дома. Хоць будаўнічы статут прадугледжваў знос "времянок" пасля заканчэння будаўніцтва дома або выкарыстанне іх у якасці хлявоў, на практыцы людзі абыходзіліся з імі па сваім меркаванні[569]. Кватарантаў не бянтэжылі ўмовы, для іх галоўным было хаця б фармальна пацвердзіць наяўнасць адпаведнай санітарнай норме жылплошчы для атрымання прапіскі.

567 Напрыклад, са справаздачы жыллёвага аддзела Рэспубліканскага Савета прафсаюзаў ад 1 красавіка 1957 г. вынікала, што месцы ў інтэрнатах мелі 10 466 студэнтаў; 4243 студэнты здымалі пакоі ў прыватных кватэрах. НАРБ, ф. 265, воп. 5, спр. 1186, арк. 69–73.

568 Пар.: ч. V.

569 Межевич В. Времянка // СБ. 13.11.1964. № 266. С. 2.

Статыстычных дадзеных аб кватэранаймальніках у Мінску за 1950–1960-я гг. няма. У дакументах час ад часу сустракаюцца адзінкавыя выпадкі. Колькасныя звесткі паказваюць толькі выбарачны аналіз умоў жыцця беларускіх сем'яў за 1978 г. і вынікі перапісу насельніцтва ў СССР за 1989 г. У 1970-я гг. 6,1% усіх мінскіх сем'яў здымалі пакоі ў асноўнага кватэраздымшчыка, 4,8% жылі ў здымных кватэрах і 3,3% здымалі жыллё ў прыватных дамах[570]. У канцы 1980-х гг. 60 643 чалавекі (або 3,8% ад агульнага насельніцтва Мінска) здымалі пакоі, 43 289 (або 2,7%) здымалі жыллё ў прыватных дамах і 17 354 (або 1,1%) цалкам здымалі кватэры[571]. Толькі асабістыя лёсы могуць адлюстраваць карціну сур'ёзнасці становішча.

Той факт, што ўладальнікі прыватных дамоў выкарыстоўвалі дэфіцыт жылля і пашыралі сваё жыллё, абмежаванае законам да 35 кв. м, да сапраўдных заезных двароў, было ўпершыню канстатавана на паседжанні Мінгарвыканкама 12 красавіка 1956 г. Як абуральны прыклад апісваўся выпадак аднаго забудоўшчыка з вул. Баграціёна, што здаў жыллё 15 кватарантам, з якіх толькі ў дваіх была прапіска. Хоць домаўладальнік даў жылплошчу нелегалам, якія жылі ў горадзе без прапіскі, і нажыўся на арэндзе на суму каля 1800 рублёў, што адпавядала двум сярэднямесячным заробкам, яго толькі аштрафавалі на 100 рублёў[572]. Гэты выпадак сведчыць, што насельніцтва з самага пачатку ігнаравала законы і што дзяржаўныя механізмы кантролю практычна не працавалі.

Наадварот, на працягу шэрагу гадоў заплюшчваліся вочы на прабелы ў законе, што мела фатальныя наступствы для сістэмы прапіскі. 13 ліпеня 1962 г. начальнік упраўлення міліцыі Мінгарвыканкама П. Жук паведаміў у справаздачы начальніку ўпраўлення міліцыі Міністэрства ўнутраных спраў БССР В. І. Жукаву, што домаўладальнікі прапаноўвалі жыллё кватарантам, якія мелі патрэбу ў прапісцы, па завышанай цане,

[570] Состав семей, доходы и жилищные условия рабочих, служащих и колхозников (Материалы выборочного исследования 10,8 тысяч семей рабочих, служащих и колхозников за сентябрь 1978 г.). Для служебного пользования. Минск, 1979. С. 45.

[571] Численность, возрастная структура, состояние в браке, число и размер семей, национальный состав, уровень образования и источники средств существования населения города Минска. По данным Всесоюзной переписи населения на 12 января 1989 г. Для служебного пользования. Минск, 1991. С. 121.

[572] ДАМВ, ф. 6, воп. 4, спр. 582, арк. 25.

але да іх не прымалася ніякіх мер. Каб паказаць сур'ёзнасць становішча, Жук прывёў выпадак з домаўладальнікам, якому належаў дом плошчай 55 кв. м па вул. Каменнай. Каб павялічыць колькасць квадратных метраў жылплошчы, што здавалася ў арэнду, у жніўні 1960 г. мужчына выпісаў сваю сям'ю ў складзе пяці чалавек з Мінска і для бачнасці пераехаў з імі ў Бялынічы Магілёўскай вобласці. Праз месяц ён зноў аб'явіўся ў Мінску, прапісаўшы, аднак, на гэты раз у сваім доме толькі жонку. Так ён змог зарабіць на сваёй жылплошчы суму, якая значна перавышала сярэднямесячны даход, які на той момант складаў 1 тыс. рублёў. У кастрычніку 1960 г. ён запатрабаваў з адной жанчыны аплату ў памеры 5 тыс. рублёў за жылплошчу, неабходную для прапіскі, і дадаткова атрымаў 3 тыс. рублёў за паўгода наперад. Увесну ён прапанаваў іншай кватарантцы за 2 тыс. рублёў прапісацца па яго адрасе. Улетку 1961 г. дайшло да скандалу, калі ён узяў з трэцяй жанчыны задатак у памеры 1400 рублёў, не зрабіўшы пры гэтым абяцанай прапіскі. Замест гэтага ён нелегальна здаў жыллё чарговай сям'і на 6 месяцаў за 1800 рублёў. Хоць па законе ніякага абвінавачвання домаўладальніку не магло быць прад'яўлена, аддзяленне міліцыі Кастрычніцкага раёна паспрабавала звязаць даходы, атрыманыя ад здачы жылплошчы, з фактам машэнніцтва і завяло крымінальную справу. Тым не менш народны суд Кастрычніцкага раёна спыніў справу за адсутнасцю доказаў[573]. Тым самым органы ўлады фактычна капітулявалі перад народнай кемлівасцю, даўшы насельніцтву магчымасць самім вырашаць праблемы, якія знаходзіліся па-за законам. Пры гэтым улада поўнасцю ўсведамляла наяўнасць канфлікту інтарэсаў. Па меншай меры справаздача начальніка ўпраўлення міліцыі Мінгарвыканкама П. Жука ад 18 ліпеня 1963 г. дазваляе зрабіць такую выснову. Паколькі кватаранты шукалі не толькі жылплошчу, але і магчымасць прапісацца, яны траплялі ў двайную залежнасць. Таму домаўладальнікі па-рознаму маглі выкарыстоўваць гэтую сітуацыю. Яны прымалі людзей без прапіскі, каб не плаціць падаткі, і, карыстаючыся выпадкам, прапаноўвалі прапіску за грошы[574].

Тое, што з-за недасканаласці сістэмы прапіскі і халатнасці ва ўстановах і ведамствах у горадзе развіўся некантралёўны рынак

[573] АМУС, ф. 49, воп. 1, спр. 20, арк. 198–212, тут арк. 205–207.
[574] АМУС, ф. 35, воп. 1, спр. 22, арк. 1–12, тут арк. 5.

жылля, было пацверджана шматлікімі прыкладамі ў справаздачы начальніка ўпраўлення ўнутраных спраў Мінгарвыканкама В. А. Піскарова ад 29 верасня 1969 г.

1. Выхадзец з Белгародскай вобласці, што на мяжы Расіі і Украіны, 16 лістапада 1968 г. уладкаваўся на працу на аўтазавод. Разам з жонкай і дзіцем ён прапісаўся ў вёсцы Пухавічы каля Мар'інай Горкі, але фактычна жыў у Мінску без прапіскі. Перад ім стаяла падвойная праблема. З аднаго боку, яго жыллёвыя ўмовы не адпавядалі санітарнай норме. З іншага боку, уладальнік жылля, які часова здаў яму кватэру, не згаджаўся яго прапісаць.

2. Выхадзец з Магілёўскай вобласці з моманту свайго прыбыцця ў Мінск у 1960 г. пяць разоў змяніў працу і больш за сем разоў – адрас. Пры адсутнасці жылплошчы ён не мог прапісацца ў горадзе. З красавіка 1968 г. ён зноў быў прапісаны ў сваёй роднай вёсцы ў Асіповіцкім райне, але ў красавіку 1969 г. уладкаваўся на Мінскі завод спецыяльнага інструмента і тэхналагічнай аснасткі.

3. Жанчына атрымала кватэру ў траўні 1968 г. у якасці кампенсацыі жылплошчы за дом у Сляпянскім завулку, які быў знесены ў ходзе рэканструкцыі горада. Але паколькі знос дома адкладваўся, яна здала яго ў арэнду за 100 рублёў у месяц рабочаму аўтакалоны. Той быў вымушаны пагадзіцца на гэтую прапанову, бо нядаўна з-за адсутнасці дамовы на арэнду кватэры па вул. Авангарднай ён быў літаральна выкінуты домаўладальнікам на вуліцу разам з сям'ёй з пяці чалавек.

4. 25 чэрвеня 1969 г. жанчына хадайнічала перад упраўленнем унутраных спраў Фрунзенскага райвыканкама аб прапісцы і падала завераныя ў домакіраўніцтве дакументы аб тым, што яна жыве на здымнай кватэры па вул. Карла Лібкнехта ў якасці субкватарантnamed. У ходзе праверкі высветлілася, што асноўная наймальніца год таму пераехала на іншую кватэру. Паколькі жыллёвае ўпраўленне забылася скасаваць дамову арэнды, кватэра здавалася незаконна.

5. Хоць у красавіку 1968 г. медсястра, будучы членам жыллёва-будаўнічага кааператыва, атрымала кватэру ў доме па вул. Ландара, яна па-ранейшаму разам з мужам і дзіцем лічылася па адрасе бацькоў яе мужа ў доме па вул. Лібаўскай, які быў запланаваны пад знос. Відавочна, гэта рабілася для таго, каб пасля зносу дома па вул. Лібаўскай атрымаць кампенсацыю ў выглядзе асобнай кватэры. Шлюбная пара праігнара-

вала патрабаванне міліцыі прапісацца па новым адрасе, бо хацела мець магчымасць прадаць кватэру ў доме па вул. Ландара.

6. У кастрычніку 1968 г. мужчына заехаў у кватэру плошчай 18 кв. м, якая знаходзілася ў адміністрацыйным будынку яго працадаўцы "Белэнергамантаж" на вул. Іванаўскай. Дом быў запланаваны пад знос, таму выканкам Ленінскага раёна адмовіў яму ў прапісцы. Па гэтай прычыне ў яго не было магчымасці прапісацца ў горадзе.

7. Мужчына, які жыў разам з маці ў двухпакаёвай кватэры ў доме па праспекце Леніна, быў унесены ў 1968 г. выканкамам Фрунзенскага раёна ў ордэр на атрыманне жылплошчы, якую бацькі яго жонкі атрымалі ў якасці кампенсацыі за знос іх дома. Мужчына катэгарычна адмовіўся выпісацца з кватэры па праспекце Леніна, таму міліцыя не магла вырашыць пытанне прапіскі яго і яго жонкі, з аднаго боку, а таксама бацькоў яго жонкі, з другога боку, бо бацькам яго жонкі памылкова была выдзелена трохпакаёвая кватэра плошчай 42 кв. м у доме па вул. Гая[575].

Гэтыя прыклады адлюстроўваюць лёс перасяленцаў. Яны як кватаранты станавіліся ахвярамі самавольства домаўладальнікаў і органаў улады, адказных за прапіску, і часта былі вымушаны здавольвацца пражываннем у бараках і часовых збудаваннях. Часам гэта працягвалася гадамі, пакуль не станавілася магчымым афіцыйна прапісацца ў горадзе.

### б) Самавольныя забудоўшчыкі на ўскраінах горада

З-за вострага недахопу жылля мігранты часам траплялі ў сітуацыі, калі яны ў прамым сэнсе слова павінны былі самі станавіцца кавалямі свайго шчасця. Самавольнае, нелегальнае будаўніцтва жылых дамоў было з'явай, характэрнай у 1940-я гг. для гарадскіх арэалаў, а ў 1950-я – для гарадскіх ускраін. Гэта тлумачыцца тым, што індывідуальнае жыллёвае будаўніцтва ў межах горада да 1963 г. не толькі дазвалялася, але і падтрымлівалася дзяржавай. Праўда, будаўніцтва прыватных драўляных дамоў адразу пасля вайны прасоўвалася павольна, бо, з аднаго боку, зацвярджэнне Генеральнага пла-

[575] ДАМВ, ф. 6, воп. 3, спр. 658, арк. 40–50.

на адкладвалася, а з другога – не хапала будматэрыялаў[576]. У гэтых умовах у планіровачных зонах, адведзеных пад будаўніцтва шматпавярховых дамоў, паўсталі цэлыя пасёлкі самавольна пабудаваных дамоў нізкай якасці. Мінгарвыканкам распачаў крокі па спыненні гэтага толькі 6 верасня 1951 г., але яны абмяжоўваліся пераважна тым, каб перакласці адказнасць на райвыканкамы. Апошнія разам з галоўным архітэктарам горада павінны былі сачыць за парадкам і прымаць рашэнні зносу нелегальна пабудаваных дамоў[577]. Аднак сумнеўна, што ўжываліся такія радыкальныя меры, калі ўлічваць абстаноўку ўсеагульнага хаосу, якая панавала ў горадзе ў перыяд аднаўлення. Прынамсі, такія выпадкі не зафіксаваны дакументальна.

Пасля таго як у пачатку 1950-х гг. Міністэрства будаўніцтва СССР прапанавала Савету Міністраў БССР па эканамічных прычынах перагледзець пытанне аб павелічэнні тэрыторыі Мінска і замест гэтага размяшчаць большую колькасць насельніцтва на меншай плошчы ў шматпавярховых дамах, ускраіны горада ўсё больш выходзілі з-пад кантролю[578]. Аднак відавочным бязладны рост паселішчаў на ўскраінах горада стаў толькі тады, калі ў сувязі з заклікам Хрушчова абмежаваць рост буйных гарадоў 12 красавіка 1956 г. Мінгарвыканкам заняўся праверкай функцыянавання сістэмы прапіскі. Галоўны архітэктар горада Л. П. Мацкевіч заўважыў з сарказмам, што Мінск пакутуе ад "засмечвання". Напрыклад, збіраецца група цыганоў, увечары ў суботу на вольнай тэрыторыі закладвае падмурак новага дома, у нядзелю святкуе завяршэнне будаўніцтва, а ў панядзелак заязджае ў дом, і іх не спыняе міліцыя[579]. Пра бездапаможнасць гарвыканкама сведчыць той факт, што прыняцце адпаведных дырэктываў адтэрмінавалі да 11 кастрычніка 1956 г., хоць было відавочна, што мігранты зносілі свае дамы ў вёсках і спехам будавалі сабе жыллё ў горадзе. Улічваючы, што самавольныя будаўнічыя працы прынялі

[576] Пар.: ч. V. 1.
[577] ДАМВ, ф. 6, воп. 4, спр. 346, арк. 114–115. Пар. таксама: Bohn T. M. Industrialisierung und Landflucht in der Sowjetunion. "Eigenmächtige Bautätigkeit" als Antwort auf die Wohnungsfrage in Minsk nach dem Zweiten Weltkrieg // Informationen zur modernen Stadtgeschichte. 2007. Nr. 2. S. 10–21.
[578] Пар.: ч. III. 1. c.
[579] ДАМВ, ф. 6, воп. 4, спр. 582, арк. 29.

масавы характар, быў санкцыянаваны існы стан рэчаў, і меры барацьбы з гэтага часу насілі прэвентыўны характар[580].

Было відавочна, што ўзмацненне жорсткасці кантролю за наплывам мігрантаў з прычыны "ўцёкаў з вёскі" не прыносіла пладоў. Спасылаючыся на тое, што бязладны рост прымітыўных драўляных дамоў ставіць пад сумнеў Генеральны план забудовы Мінска і цягне за сабой інфраструктурныя недахопы на шкоду насельніцтву, 28 снежня 1958 г. начальнік упраўлення камунальнай гаспадаркі ўнёс прапанову Старшыні Савета Міністраў БССР М. Я. Аўхімовічу павысіць штраф за незаконнае выкарыстанне зямельных участкаў ад 130 рублёў да 3 тыс. рублёў (г. зн. на суму, роўную тром сярэднямесячным заробкам) і прадугледзець пакаранне ў выглядзе папраўчых работ тэрмінам да 1 года[581]. Хоць 1 верасеня 1959 г. прапанаваны грашовы штраф уступіў у законную сілу, агульнае рашэнне праблемы было знойдзена толькі ў павелічэнні тэрыторыі горада, звязанай з пераглядам Генеральнага плана Мінска 25 траўня 1959 г.[582]. Так 8 жніўня 1959 г. вёскі Альшэва, Будзілава, Вілкаўшчына, Вялікая Слепня, Вялікае Сціклева, Дражня, Зацішша, Лошыца другая, Малая Сляпянка, Маляўшчына, Мядзвежына, Сакалянка, Сталовая, Шчотаўка, Шэйпічы, Юрэвічы і Яфімава, а таксама пасёлкі Калонія, Труд і Шэйпічы былі ўключаны ў рысу Мінска[583].

Аб ільготах, якія пры гэтым даваліся некаторым гараджанам, паведамляецца ў справаздачы начальніка ўпраўлення міліцыі Мінгарвыканкама А. Прыбыткова пра "времянки" ў Сталінскім раёне за травень 1961 г. З 708 "времянок", налічаных у лістападзе 1957 г., 48 былі пабудаваны ў 1950 г., 52 – у 1951–52 гг., 141 – у 1953–54 гг., 148 – у 1955 г., 187 – у 1956 і 132 – у 1957 г. У сувязі з пашырэннем рысы горада ў 1959 г. да Сталінскага раёна павінны былі далучыць 10 пасёлкаў з 600 "времянками". Паводле распараджэння Мінгарвыканкама і Мінскага гаркама КПБ ад 18 чэрвеня 1958 г. і Указа Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР ад 18 чэрвеня 1958 г., 150 "времянок" знеслі ў ходзе рэканструкцыі горада. У якасці

[580] Пар.: ч. IV. 2. а.
[581] НАРБ, ф. 7, воп. 4, спр. 2241, арк. 376–380.
[582] Жилищное законодательство. Минск, 1961. С. 225–228.
[583] Сборник законов Белорусской ССР и указов Президиума Верховного Совета Белорусской ССР. 1938–1973. Т. 1. Минск, 1974. С. 378. Пар.: ч. III. 1. с.

кампенсацыі ўладальнікі атрымалі кватэры або зямельныя ўчасткі для індывідуальнага жыллёвага будаўніцтва. У 64 выпадках людзі перапрадалі запланаваныя пад знос "времянки". У выніку ў Сталінскім раёне на 15 лютага 1961 г. налічвалася 1160 "времянок", у якіх жылі 5024 чалавекі, з іх 551 без прапіскі[584].

Наколькі вынаходлівымі маглі быць мігранты, калі гаворка ішла пра тое, каб атрымаць прапіску, сведчаць паводзіны 86 сем'яў, што жылі з 1955 г. у 78 "времянках" у пасёлку Дражня, які 8 жніўня 1959 г. адышоў да Сталінскага раёна Мінска. Пасля таго як 30 чэрвеня 1960 г. Мінгарвыканкам перадаў Мінскаму маторнаму заводу тэрыторыю, на якой знаходзіліся "времянки", пад забудову і загадаў пры гэтым пакрыць страты жыхарам, сталі адбывацца дзіўныя рэчы, як вынікала са справаздачы дырэктара маторнага завода ад 24 траўня 1961 г. З аднаго боку, уладальнікі "времянок" сталі здаваць жыллё людзям, якія хацелі на падставе гэтага атрымаць прапіску. Каб надаць сваім дзеянням законны выгляд, яны ў тэрміновым парадку пачалі ставіць новыя дзверы ў "времянках", якія дзякуючы гэтаму атрымлівалі выгляд шматсямейных дамоў. З іншага боку, уладальнікі "времянок" настойліва прэтэндавалі на новыя кватэры. Для гэтага паспешліва заключаліся шлюбы з мэтай атрымання кватэр большай плошчы. Акрамя таго, мелі месца выпадкі, калі людзі афіцыйна нідзе не працавалі, а зараблялі на жыццё тым, што здавалі свае "времянки"[585].

26 траўня 1961 г. начальнік Мінскага адраснага стала і ўпаўнаважаны аддзела па барацьбе з крадзяжом сацыялістычнай уласнанасці ўпраўлення міліцыі Мінгарвыканкама падрыхтавалі дасье на згаданых у справаздачы людзей[586]. Яно ўяўляла сабой пярэстую карціну розных граняў рынку нерухомасці ў "сацыялістычным горадзе".

1. З 1958 г. не прапісаны ў Мінску мужчына, рускі па нацыянальнасці, працаваў сталяром на будаўнічым прадпрыемстве. Апрача гэтага, ён займаўся будаўніцтвам і продажам "времянок". За "времянки" памерам 9×8 м ён атрымліваў 3 тыс. рублёў; за "времянки" памерам 4,5×4,2 м – 1500 рублёў (для параў-

[584] ДАМВ, ф. 6, воп. 3, спр. 223, арк. 311–313.
[585] Тамсама, арк. 300–303.
[586] Тамсама, арк. 304–307.

нання – сярэднямесячны заробак складаў каля 1 тыс. рублёў). 22 красавіка 1961 г. ён незаконна ўсяліўся ў фінскі домік ад маторнага завода, які быў пабудаваны для перасяленцаў. Толькі па распараджэнні пракурора і пры садзейнічанні міліцыі яго ўдалося выселіць.

2. Цыган з-пад Каўнаса, прапісаны з 1 сакавіка 1957 г. у вёсцы Вялікая Слепня Мінскага раёна, у 1958 г. купіў "времянку" ў пасёлку Дражня за 1 тыс. рублёў. У 1959 г. ён працаваў на дрывяным складзе, у 1960 г. – у дарожным будаўніцтве. З пачатку 1961 г. ён нідзе афіцыйна не працаваў, але пры гэтым адмовіўся ад прапановы працаваць на трактарным заводзе. Таму 4 красавіка 1961 г. раённае аддзяленне міліцыі запатрабавала, каб ён падаў даведку з месца працы на працягу пяці дзён. Яго сям'я складалася з жонкі і трох дачок. На той момант сям'я жыла ў доме ў Паўночным пасёлку, які яна атрымала ад маторнага завода ў якасці кампенсацыі за знос "времянки". Сваё новае жыллё сям'я абставіла мэбляй за 20 250 рублёў. Паколькі сярэднямесячны даход у той час быў роўны прыблізна 1 тыс. рублёў, гаворка ішла, паводле пратакола, складзенага супрацоўнікам міліцыі, аб астранамічнай суме.

3. Цыган, родам з Ленінграда, перасяліўся ў снежні 1957 г. з Калінінградскай вобласці ў Мінск і 5 студзеня 1958 г. афіцыйна прапісаўся. У 1959 г. ён купіў у Дражні "времянку" за 2800 рублёў. Ён звольніўся з гарачага цэха шарыкападшыпнікавага завода, бо з 1958 г. знаходзіўся на ўліку ў туберкулёзным дыспансеры. Пасля гэтага падзарабляў фурманам. Сям'я, якая прыехала з Оршы, складалася з беспрацоўнай жонкі (18 лютага 1959 г. яна прапісалася ў Мінску), а таксама дзвюх дачок і брата, які таксама працаваў фурманам. 24 сакавіка і 4 красавіка 1961 г. раённае аддзяленне міліцыі патрабавала ў яго брата на працягу пяці дзён падаць даведку з месца працы. Пасля зносу "времянки", якую павінны былі перанесці на іншае месца, сям'я часова размяшчалася ў фінскім доміку ад маторнага завода ў Паўночным пасёлку і на той момант не мела прапіскі.

4. Цыган з Віцебскай вобласці з 1946 г. пражываў у Мінску. З 1946 да 1953 г. ён нідзе афіцыйна не працаваў. З 1953 да 1958 г. працаваў на трактарным заводзе кіроўцам і зваршчыкам, часова быў заняты на пракладцы электрасеткі і з 1959 г. зноў працаваў кіроўцам. З-за хваробы ён знаходзіўся на лячэнні з лютага да траўня 1961 г. і быў вызвалены ад цяжкай працы

тэрмінам на шэсць месяцаў. Яго сям'я складалася з грамадзянскай жонкі, дзвюх яе дачок ад першага шлюбу, а таксама яго сястры з мужам і дачкой. Муж сястры жыў у Мінску з лістапада 1959 г. пасля дэмабілізацыі з войска і са студзеня 1961 г. працаваў на трактарным заводзе. Сям'я жыла ў Паўночным пасёлку, у доме, выдзеленым маторным заводам.

5. Карэнны мінчук прадаў сваю "времянку" ў пасёлку Дражня ў верасні 1960 г. за 1500 рублёў. У кастрычніку 1958 г. ён звольніўся з Міністэрства сувязі, дзе працаваў кіроўцам, і да лістапада 1960 г. нідзе афіцыйна не працаваў, пакуль не ўладкаваўся вартаўніком на будаўнічае прадпрыемства. У 1960 г. ён прадаў свой аўтамабіль "Масквіч-407" па спекулятыўнай цане і замест яго набыў "Волгу М-21". Яго сям'я складалася з жонкі, пасынка і трох дачок. Хоць сям'я жыла ў той час на іншай вуліцы, яна ўсё яшчэ была прапісана па адрасе іх былой "времянки"[587].

Рашэнне праблемы пазначылася 12 траўня і 20 ліпеня 1961 г., калі Мінгарвыканкам распарадзіўся зарэгістраваць 162 адзінкі нерухомай маёмасці як прыватную ўласнасць. Тым самым была ўзаконена тагачасная сітуацыя[588]. І калі ў 1963 г. індывідуальнае жыллёвае будаўніцтва ў межах горада канчаткова забаранілі, праблема "самавольнага будаўніцтва" больш не ўзнікала[589].

### в) Лімітчыкі на мінскіх прадпрыемствах

Арганізаваны набор рабочай сілы з беларускай правінцыі мінскімі прадпрыемствамі ў 1960-я гг. пацягнуў за сабой утварэнне новага сацыяльнага пласта ў беларускай сталіцы. Тое, што Мінгарвыканкам дазволіў прадпрыемствам у выглядзе выключэння набіраць людзей з сельскай мясцовасці і прапісваць іх без уліку санітарнай нормы, упершыню адзначаецца

[587] Тамсама.

[588] Размова ідзе пра дамы, пабудаваныя пераважна ў пасляваенны час: 52 дамы па 1-м, 2-м і 3-м Трубным завулку, 51 дом па 4-м і 5-м Сляпнянскім завулку, 27 дамоў па Сакалянскім завулку, 22 дамы па вуліцы Шэйпічы, па 2 дамы па Брэсцкім завулку, вуліцы Мядзвежына і вуліцы Мендзялеева, а таксама па адным доме па вул. Ключавой, вул. Савецкіх пагранічнікаў, вул. Собінава і па завулку Вільямса. ДАМВ, ф. 6, воп. 3, спр. 137, арк. 16–19; спр. 142, арк. 18–24.

[589] Пар.: ч. V.

ў справаздачы ад 12 студзеня 1963 г. начальніка ўпраўлення міліцыі Мінгарвыканкама П. Жука Міністэрству ўнутраных спраў[590]. Прававой асновай гэтага спецыяльнага дазволу стала рашэнне Мінгарвыканкама ад 9 траўня 1963 г. З рашэння вынікала, што дазвол на часовую прапіску тэрмінам на адзін год выдаваўся ў выпадку, калі прадпрыемствы хадайнічалі аб наборы працоўнай сілы з правінцыі і гарантавалі жылплошчу ў горадзе. Пасля заканчэння гэтага тэрміну прадпрыемствы павінны былі вырашаць пытанне аб працягу прапіскі на наступныя пяць гадоў. У выпадку ж заўчаснага звальнення рабочага неабходна было паведаміць у міліцыю і пазбавіць яго права на жыллё ад прадпрыемства[591]. Калі праз пяць гадоў пасля гэтага рашэння ў лімітчыкаў першай хвалі міналі дагаворы, неабходна было прымаць новае рашэнне аб іх далейшым знаходжанні ў горадзе. 8 лютага 1968 г. Мінгарвыканкам дазволіў выдаваць пастаянную прапіску пры ўмове, калі работнік працягваў працаваць на дадзеным прадпрыемстве і мог прад'явіць для прапіскі жылплошчу, адпаведную санітарнай норме[592]. Гэтымі рашэннямі стварылі перадумовы для таго, каб гарадскі рынак рабочай сілы ўзбагаціўся за кошт таннага і бяспраўнага люмпен-пралетарыяту. Для лімітчыкаў выраз "гарадское паветра робіць свабодным" губляў сэнс, бо іх прапіска залежала ад самавольства кіраўнікоў прадпрыемстваў і іх не ставілі ў чаргу на атрыманне кватэры.

Захаваўся шэраг хадайніцтваў у Мінгарвыканкам за 1965–1966 гг., дзе прадпрыемствы і арганізацыі спрабавалі атрымаць дазвол на набор рабочай сілы. Абгрунтаванні гэтых хадайніцтваў паказальныя для сацыяльнага статусу лімітчыкаў і для самаацэнкі карэнных жыхароў. З аднаго боку, для далейшага павышэння паказчыкаў вытворчасці было недастаткова наяўных рабочых. З іншага боку, гараджан не задавальнялі неспрыяльныя ўмовы працы і нізкааплатныя пасады. Дэфіцыт рабочай сілы асабліва востра адчуваўся ў сферы абслугоўвання. Адным словам, лімітчыкі павінны былі выконваць ролю некваліфікаваных падсобных рабочых на ніжняй прыступцы сацыяльнай іерархіі з самым нізкім прыбыткам: займацца ручной працай на прамысловых прадпрыемствах, працаваць прыбіральшчы-

[590] АМУС, ф. 35, воп. 1, спр. 21, арк. 122–133, тут арк. 126–127.
[591] ДАМВ, ф. 6, воп. 3, спр. 253, арк. 26–29.
[592] ДАМВ, ф. 6, воп. 3, спр. 578, арк. 118–124.

камі, падсобнымі рабочымі ў сталовых, гардэробшчыкамі і вартаўнікамі[593].

Тым не менш, у канцы 1960-х гг. часовыя працоўныя месцы для лімітчыкаў сталі галоўным "шлюзам" для перасялення ў сталіцу. Паводле звестак, пададзеных намеснікам начальніка ўпраўлення ўнутраных спраў Мінгарвыканкама Піскаровым 29 верасня 1969 г., амаль 40% усіх выдадзеных дазволаў на прапіску былі звязаны з адмысловымі дазволамі[594]. Класіфікацыя па сацыяльных катэгорыях 45 500 прапісак, выдадзеных у 1967 г., сведчыць аб памеры праблемы: сярод прапісаных было 17 700 лімітчыкаў і членаў іх сем'яў (39%), 13 тыс. студэнтаў і навучэнцаў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў (28,4%), 6800 членаў сем'яў (15%) і 3800 ваеннаслужачых або дэмабілізаваных (8,2%). На фоне агульнага недахопу жылля нядзіўна, што толькі 900 чалавек, або 2% усіх упершыню прапісаных, маглі падаць даведкі аб наяўнасці жылля, што адпавядала б санітарнай норме, і ўзаконіць сваё пражыванне ў горадзе (табліца 11). У гэтым сэнсе Мінск быў па-сапраўднаму "закрытым горадам" для шырокіх слаёў беларускага насельніцтва.

Як вынікае далей са справаздачы Піскарова ад 29 верасня 1969 г., мінскія прадпрыемствы і арганізацыі ў 1968 і І паўгоддзі 1969 г. хадайнічалі аб наборы 16 164 лімітчыкаў з іншых мясцовасцяў (табліца 12). Пры гэтым попыт быў задаволены з лішкам. Нават галіны, якія маглі набіраць працоўную сілу з унутрыгарадскога патэнцыялу, былі забяспечаны рабочай сілай з ліку лімітчыкаў. Сімптаматычна тое, што не ўсіх прапанаваных лімітчыкаў бралі на прадпрыемствы. Прычыну гэтага трэба шукаць, акрамя ўсяго іншага, у тым, што толькі такія прамысловыя гіганты, як трактарны і аўтамабільны заводы, маглі забяспечыць іх жыллём. Паколькі лімітчыкам, як правіла, не належала больш як 4,5 кв. м жылой плошчы, яны выкарыстоўвалі любую магчымасць, каб пераехаць з месца прапіскі і без перапрапіскі пасяліцца ў бараках і недабудаваных дамах[595].

[593] Пар. хадайніцтвы 1-й клінічнай бальніцы ад 10 траўня 1965 г., кандытарскай фабрыкі ад 17 чэрвеня 1965 г., Політэхнічнага інстытута ад 31 жніўня 1965 г. і Батанічнага саду ад 25 траўня 1966 г. ДАМВ, ф. 6, воп. 3, спр. 353, арк. 34, арк. 82 і арк. 112; ДАМВ, ф. 6, воп. 3, спр. 416, арк. 75.

[594] ДАМВ, ф. 6, воп. 3, спр. 658, арк. 40–50.

[595] Тамсама.

**Табліца 11.** Прапіска ў Мінску людзей з іншых мясцовасцяў у 1967–1969 гг. (у тыс.).

| Катэгорыя прапісаных | 1967 г. | | 1968 г. | | I паўгоддзе 1969 г. | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | усяго | % | усяго | % | усяго | % |
| Асобы, набраныя прадпрыемствамі і арганізацыямі, якія жылі ў горадзе з дазволу Мінгарвыканкама без уліку санітарнай нормы (разам з членамі сям'і) | 17,7 | 39,0 | 20,2 | 37,0 | 10,2 | 38,0 |
| Аспіранты і студэнты ў час вучобы | 9,2 | 20,2 | 11,0 | 20,0 | 5,0 | 18,5 |
| Навучэнцы сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў | 3,8 | 8,2 | 6,2 | 11,0 | 3,9 | 14,4 |
| Выпускнікі ВНУ па размеркаванні | 2,0 | 4,4 | 3,5 | 6,0 | 1,8 | 7,0 |
| Асобы, прапісаныя па месцы пражывання мужа (жонкі) | 3,7 | 8,2 | 3,9 | 7,8 | 1,7 | 6,3 |
| Пазашлюбныя дзеці па месцы жыхарства бацькоў | 0,8 | 1,8 | 1,3 | 2,3 | 0,4 | 1,5 |
| Непрацаздольныя састарэлыя бацькі па месцы жыхарства дзяцей | 1,5 | 3,2 | 1,7 | 3,0 | 0,6 | 2,2 |
| Вызваленыя зняволеныя з правам на жыхарства пры іх сем'ях | 0,8 | 1,8 | 1,0 | 1,8 | 0,5 | 1,8 |
| Ваенныя і іх сем'і, пераведзеныя ў Мінскі гарнізон | 1,3 | 3,0 | 1,4 | 2,5 | 0,8 | 3,0 |
| Дэмабілізаваныя афіцэры, сяржанты, салдаты | 2,5 | 5,2 | 3,3 | 6,0 | 1,6 | 6,0 |
| Асобы, прапісаныя ў адпаведнасці з санітарнай нормай | 0,9 | 2,0 | 0,8 | 1,5 | 0,4 | 1,4 |
| Асобы, прапісаныя без уліку санітарнай нормы з дазволу Мінгарвыканкама | 0,4 | 0,8 | 0,6 | 1,4 | 0,1 | 0,3 |
| Іншыя катэгорыі (хатнія гаспадыні, госці і інш.) | 1,1 | 2,2 | 0,9 | 1,6 | 0,3 | 1,1 |
| Усяго: | 45,7 | 100 | 55,0 | 100 | 27,5 | 100 |
| – у адпаведнасці з палажэннямі аб прапісцы | 27,6 | 60,0 | 34,2 | 62,0 | 17,0 | 63,0 |
| – у адпаведнасці з дазволам Мінгарвыканкама | 18,1 | 40,0 | 20,8 | 38,0 | 10,5 | 37,0 |

*Крыніца:* ДАМВ, ф. 6, воп. 3, спр. 658, арк. 51–52.

**Табліца 12.** Выдача прапіскі без уліку санітарнай нормы з дазволу Мінгарвыканкама ў 1968–1969 гг.

| Раёны | 1968 г. | | | І паўгоддзе 1969 г. | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | **Лімітчыкі** | **Прапіска** | **Інтэрнаты** | **Лімітчыкі** | **Прапіска** | **Інтэрнаты** |
| Заводскі | 3924 | 3639 | 1493 | 2984 | 989 | 481 |
| Савецкі | 2295 | 838 | 366 | 780 | 592 | 288 |
| Кастрычніцкі | 2135 | 554 | 300 | – | 360 | – |
| Фрунзенскі | 1890 | 1237 | 752 | 1175 | 383 | 285 |
| Ленінскі | 801 | 627 | 470 | 210 | 148 | 146 |
| Усяго: | 11015 | 6895 | 3589 | 5149 | 2472 | 1200 |
| У т. л. у Заводскім раёне: | | | | | | |
| Трактарны завод | 1000 | 1000 | 281 | 1000 | 33 | 10 |
| Аўтамабільны завод | 845 | 845 | 470 | 650 | 453 | 250 |
| У т. л. у Савецкім раёне: | | | | | | |
| Радыёзавод | 350 | 74 | – | – | 50 | – |
| Гадзіннікавы завод | 100 | 57 | 30 | – | 26 | – |
| У т. л. у Ленінскім раёне: | | | | | | |
| Мотавелазавод | 200 | 200 | 150 | – | – | – |

*Крыніца:* ДАМВ, ф. 6, воп. 3, спр. 658, арк. 55–60.

# V. Жыллёвыя ўмовы ў "сацыялістычным горадзе"

*"Жаданне вырашыць жыллёвае пытанне і стрымаць рост сучасных вялікіх гарадоў абсурднае. Сучасныя вялікія гарады знікнуць толькі з адмовай ад капіталістычнага спосабу вытворчасці, і тады будуць вырашацца зусім іншыя праблемы, а не забеспячэнне кожнага працоўнага яго ўласным дамком"*[596].

Фрыдрых Энгельс

З часу з'яўлення крытыкі капіталізму Марксам і Энгельсам рашэнне жыллёвага пытання стала адной з галоўных мэтаў сацыялістычнага гарадскога планавання. Для Мінска гэтая праблема актуалізавалася ў той момант, калі цэнтр горада быў адноўлены і колькасць насельніцтва дасягнула міжваеннага ўзроўню[597]. Да канца 1940-х гг. дзейнасць Мінгарвыканкама абмяжоўвалася пераважна кіраваннем старым жыллёвым фондам, які пацярпеў у вайну, у той час як адказнасць за ўзвядзенне шматкватэрных дамоў і дамоў для адной сям'і была ўскладзена на прадпрыемствы і прыватных асоб. Аднак у пачатку 1950-х гг. Мінгарвыканкам вымушаны быў канстатаваць, што, канцэнтруючыся на ўзвядзенні сваіх вытворчых будынкаў і на наладжванні працэсу вытворчасці, прадпрыемствы не аддавалі належнай увагі жыллёваму будаўніцтву. Таму Мінгарвыканкам пачаў кантраляваць цэнтралізацыю жыллёвага будаўніцтва і жылы фонд. 17 ліпеня 1962 г. Цэнтральнаму Камітэту КПБ і Савету Міністраў БССР быў прапанаваны новы варыянт Генеральнага плана Мінска, які прадугледжваў замену індывідуальнага жыллёвага будаўніцтва ў цэнтры горада кааператыўным будаўніц-

[596] Engels F. Zur Wohnungsfrage // Marx K., Engels F. Werke. Bd. 18. Berlin, 1962. S. 209–287, тут S. 243.

[597] Пар.: Воинов А. А. Жилищное строительство в Белорусской ССР. Минск, 1980.

твам[598]. У адказ на гэта ў святле новай рэдакцыі Генеральнага плана 23 чэрвеня 1963 г. Мінгарвыканкам забараніў будаўніцтва і перанос драўляных дамоў у межах горада[599]. У адным з інтэрв'ю часопісу "Нёман" у 1974 г. намеснік старшыні Мінгарвыканкама І. І. Ляўко нават прапанаваў задумацца пра знос "гарадскіх вёсак", якія складаліся з сялянскіх хат (малюнкі 28 а–г)[600].

Пры вывучэнні дадзеных афіцыйнай савецкай статыстыкі робяцца відавочнымі дзве істотныя праблемы: з аднаго боку, аж да 1960-х гг. у беларускім жыллёвым будаўніцтве меркай служыла не колькасць кватэр, а колькасць квадратных метраў агульнай жылой плошчы. Пасля Пастановы ЦК КП(б)Б і СНК БССР ад 15 жніўня 1931 г. санітарная норма асабістай плошчы стала 9 кв. м на чалавека, што адрознівалася ад агульнай жылой плошчы, якая ўключала кухню, калідор і санвузел[601]. Пасля гэтага папраўку ў Жыллёвы кодэкс БССР унеслі толькі ў 1983 г., калі была вызначана санітарная норма памерам 12 кв. м на чалавека (без далейшага ўдакладнення)[602]. Фактычна да прыняцця праграмы масавага жыллёвага будаўніцтва 1957 г. гаворка ішла не пра асобнае жыллё для кожнай сям'і, а толькі пра рассяленне неабходнай рабочай сілы ў жылых дамах. У статыстычных звестках замоўчваўся той факт, што населеная некалькімі сем'ямі камунальная кватэра ("камуналка") была асноўнай формай жылля. Сімптаматычна, што распаўсюджанае і ўсім вядомае слова *камуналка* ў афіцыйных дакументах

[598] Жилищное законодательство. Минск, 1968. С. 91–94; пар. таксама: Чыгір В. Ф. Жыллёва-будаўнічыя кааператывы ў Беларускай ССР. Мінск, 1973.

[599] Размешчаны за 17 км на паўночны ўсход ад рысы горада пасёлак Калодзішчы павінен быў стаць месцам для пераносу драўляных дамоў. ДАМВ, ф. 6, воп. 3, спр. 256, арк. 282.

[600] Левко И. И. Город-памятник сотворяя (Вёл интервью Анатолий Козлович) // Нёман. 1974. 23. № 12. С. 134–139, тут с. 137.

[601] Жилищное законодательство. Минск, 1961. С. 150–151. Пар.: Чигир В. Ф. Советское жилищное право. Ч. I–III. Минск, 1960–1964; ён жа. Советское жилищное право. Минск, 1968.

[602] Жилищный кодекс Белорусской ССР. Принят на восьмой сессии Верховного Совета Белорусской ССР десятого созыва 22 декабря 1983 года. Минск, § 46. Пар.: Чигир В. Ф. Право на жилище. Минск, 1979; Чигир В. Ф., Боровцов В. А. Конституционное право на жилище. Минск, 1985; Чигир В. Ф. Жилищное право. Изд. 2-е, исп. и доп. Минск, 1986.

не згадваецца. З іншага боку, пастаянная публікацыя звестак па жыллёвым будаўніцтве БССР стала магчымай толькі з 1960 г., калі з прыняццем 7-гадовага плана развіцця народнай гаспадаркі СССР пачала ажыццяўляцца цэнтралізацыя статыстычнага ўпраўлення. Аднак тыя дадзеныя, якія прапануюць статыстычныя штогоднікі, абмяжоўваюцца толькі адлюстраваннем росту планавых лічбаў у ходзе выканання пяцігадовых планаў. Звесткі па карыснай жылой плошчы не апублікаваныя, а звесткі па агульнай жылой плошчы на чалавека сталі друкавацца толькі з пачаткам перабудовы. У гэтых умовах рэалістычную ацэнку жыллёвых умоў можна зрабіць толькі ў тым выпадку, калі ўлічыць попыт насельніцтва на жыллё і прыватныя выпадкі звесці ў агульную карціну.

## 1 Жыллёвае будаўніцтва

### а) Узнікненне жыллёвага пытання

Каб апісаць недахопы аднаўлення горада ў пасляваенны перыяд, неабходна пачаць з разгляду таго, у якім становішчы знаходзіўся гарадскі жыллёвы фонд пасля вайны. Пры гэтым можна абапірацца на дадзеныя гарадскога статыстычнага ўпраўлення: паводле гэтых звестак, на 1 траўня 1945 г. у 2390 шматкватэрных дамах, 91 бараку і 22 "времянках" у распараджэнні 70 921 чалавека знаходзілася 288 868 кв. м жылой плошчы. Акрамя таго, 36 009 чалавек жылі ў 3619 прыватных дамах агульнай плошчай 117 207 кв. м. З гэтага вынікае, што жылая плошча ў дзяржаўным сектары складала 4 кв. м на чалавека, а ў прыватным сектары – 3,3 кв. м (табліца 13; гл. дадатак, табліца XV). Матэрыялы, з якіх былі пабудаваныя дамы, надавалі вясковы характар гораду з разбураным цэнтрам: усяго налічвалася 320 мураваных дамоў, 5600 драўляных і каля 200 дамоў з іншых матэрыялаў; 86% дзяржаўных і 98% прыватных дамоў былі драўлянымі[603]. 45,6% жылой плошчы належалі выканкамам, 28,9% – прыватным асобам і 25,5% – прадпрыемствам і арганізацыям.

[603] ДАМВ, ф. 2305, воп. 1, спр. 442, арк. 9, 13.

**Табліца 13.** Выкарыстанне жылой плошчы ў Мінску на 1 траўня 1945 г.

| | |
|---|---|
| Жылыя дамы | 3619 |
| Пакоі | 11135 |
| Жылая плошча (у кв. м) | 117207 |
| Жылая плошча ў адным доме (у кв. м) | 32,4 |
| Жыхары | 36009 |
| Жылая плошча на чалавека (у кв. м) | 3,3 |

*Крыніца:* ДАМВ, ф. 2305, воп. 1, спр. 442, арк. 8–9.

Пры аднаўленні сталіцы прыярытэтам для партыйнага і дзяржаўнага кіраўніцтва было будаўніцтва ключавых прадпрыемстваў і ўзвядзенне рэпрэзентатыўнага цэнтра. Жыллёвае будаўніцтва, з аднаго боку, перадавалася ў кампетэнцыю прадпрыемстваў, якія знаходзіліся ў падпарадкаванні народных камісарыятаў, а з другога боку – ускладалася на асабістую ініцыятыву насельніцтва. Аднак па розных прычынах абодва варыянты аказаліся неэфектыўнымі. Структурнымі праблемамі ў гарадскім жыллёвым будаўніцтве гарвыканкам пачаў займацца толькі з канца 1940-х гг. У сярэдзіне 1949 г. старшыня Гарадской планавай камісіі Е. А. Ігудэсман зазначыў у справаздачы, што кіраўнікі прадпрыемстваў не аддаюць належнай увагі жыллёваму будаўніцтву, а канцэнтруюцца на павелічэнні вытворчых паказчыкаў. Паводле яго слоў, у 1948 г. 62 з 92 прадпрыемстваў не выканалі сваіх абавязацельстваў у галіне жыллёвага будаўніцтва. У гэтых умовах пры хуткім росце насельніцтва асабістая жылая плошча складала ў сярэднім толькі 2 кв. м на чалавека. Насельніцтву не хапала тавараў першай неабходнасці. Не звярталася ўвага на пытанне пашырэння тэрыторыі горада. Не лічачы будынкаў, размешчаных на праспекце, і пасёлкаў трактарнага і аўтамабільнага заводаў, мела месца нераўнамернае размеркаванне новабудоўляў на тэрыторыі горада[604]. Як вынікае з пастановы Савета Міністраў БССР ад 3 ліпеня 1949 г., на працягу апошніх паўтара гадоў будаўнічыя арганізацыі асвоілі толькі 70% выдзеленых у іх распараджэнне сродкаў на патрэбы жыллёвага будаўніцтва Мінска[605]. Таму памер гарадскога жыллёвага фонду быў значна меншы за 796 тыс. кв. м, прадугледжа-

[604] ДАМВ, ф. 2631, воп. 1, спр. 31, арк. 1–16.
[605] НАРБ, ф. 7, воп. 3, спр. 385, арк. 54–60.

ных пяцігадовым планам на перыяд з 1946 да 1950 г. Паводле справаздачы старшыні Мінгарвыканкама К. Н. Длугашэўскага ад 19 студзеня 1950 г. і пастановы Савета Міністраў БССР ад 16 траўня 1950 г., за перыяд з 1946 да 1949 г. дэфіцыт жылля склаў 117 900 кв. м, або 24% ад плана. У 1949 г. толькі 20 з 51 будаўнічай арганізацыі выканалі план. Рашэнні дзяржавы і партыі не былі выкананы, і да пачатку 1950 г. жылая плошча адпавядала толькі 74% даваеннага ўзроўню пры такой самай колькасці жыхароў. Справа ўскладнялася яшчэ і тым, што 20,2% жылой плошчы было часовым жыллём невысокай якасці. З-за недахопу тэхнікі будаўнічыя арганізацыі ўзводзілі ў асноўным адна- і двухпавярховыя дамы. Акрамя таго, наяўнасць вялікай колькасці будаўнічых арганізацый прывяла да таго, што будоўлі былі раскіданы па ўсім горадзе. У выніку афармленне цэнтра заставалася незавершаным[606].

У гэтых умовах за перыяд з 1 траўня 1945 г. да 1 студзеня 1950 г. дзяржаўная жылая плошча (разам з “времянками”) павялічылася з 288 268 кв. м да 784 662 кв. м; колькасць шматкватэрных дамоў узрасла з 2390 да 3593, а колькасць баракаў – з 91 да 655. Аднак гэтага не хапала. Толькі 131 396 чалавек (48% усяго насельніцтва) жылі ў шматкватэрных дамах. 31 269 жыхароў (11,4%) былі вымушаны здавольвацца пражываннем у бараках, а 4510 жыхароў (1,6%) – у “времянках”. 249 чалавек усё яшчэ туліліся ў зямлянках, палатках і вагонах. Няўлічаныя астатнія 106 177 жыхароў (38,8% ад агульнага насельніцтва) жылі ў прыватных дамах. У шматкватэрных дамах шчыльнасць заселенасці складала 8 чалавек на 1 кватэру, або 3,1 чалавека на 1 пакой. Баракі на кожную ўмоўную кватэру мелі 3,8 чалавека. У цэлым на 167 175 чалавек, якія пражывалі ў дзяржаўным сектары, прыпадала 4,7 кв. м жылой плошчы на чалавека. Што тычыцца валодання нерухомасцю, то тут адбыліся істотныя змены: цяпер 64,9% жылога фонду знаходзілася ў руках прадпрыемстваў, а 33,2% – у распараджэнні райвыканкамаў (гл. дадатак, табліца XVI)[607].

[606] ДАМВ, ф. 2631, воп. 1, спр. 35, арк. 277–307; НАРБ, ф. 7, воп. 3, спр. 485, арк. 238–243.

[607] Паводле недатаванай справаздачы, жылая плошча баракаў складала 158 200 кв. м, або 20,2%, а інтэрнатаў – 109 300 кв. м, або 14%. У распараджэнні райвыканкамаў знаходзілася толькі 22 900 кв. м жылой плошчы ў дамах, пабудаваных у пасляваенны час. З 2180 райвыканкамаўскіх дамоў 1733, або 59,3%, былі драўлянымі. ДАМВ, ф. 69, воп. 1, спр. 616, арк. 1–7.

Нават на завяршальным этапе пяцігадовага плана ў Мінску ў жыллёвым будаўніцтве не адбылося істотных змен у лепшы бок. Наадварот, 29 жніўня 1950 г. ЦК КП(б)Б канстатаваў, што за першае паўгоддзе было выканана толькі 18,7% плана[608]. На паседжанні 24 кастрычніка 1950 г. назвалі дзве прычыны адставання: з аднаго боку, у будаўнічых арганізацый былі свае планы; з другога – установы і прадпрыемствы мелі іншыя прыярытэты[609]. Паводле справаздачы міністра гарадскога будаўніцтва Г. Папова пра "сур'ёзныя недахопы" ў жыллёвым будаўніцтве Мінска, зробленай восенню 1950 г., жылая плошча ў сталіцы налічвала 1 105 800 кв. м, што складала 91% ад жылой плошчы даваеннага часу. Пры прыблізна аднолькавай колькасці насельніцтва 250 тыс. чалавек карысная жылая плошча на чалавека скарацілася з 4,4 да 3,6 кв. м. Мяркуючы па справаздачы, рашэнні партыі і дзяржавы, як і раней, не выконваліся: за першыя тры кварталы 1950 г. было пабудавана толькі 27,9% запланаванага жылля. На думку Г. Папова, гэта магло мець негатыўныя вынікі: да канца года будаўнічая галіна была занята ў першую чаргу выкананнем плана, таму якасці не аддавалася належнай увагі. У бягучым годзе пры праверцы 69 дамоў не прынялі 29 аб'ектаў з-за будаўнічых недахопаў. Акрамя таго, не былі завершаны работы па пракладцы каналізацыйных і трубаправодных сетак, таму жыллёвае будаўніцтва зрушылася з цэнтра горада на ўскраіны. Варта ўлічваць і нерацыянальны падыход да жыллёвага будаўніцтва: з 1137 узведзеных за 1945–1950 гг. шматкватэрных дамоў 1083, або 62,3%, былі аднапавярховымі. Дамы канцэнтраваліся ў жылых раёнах на ўскраінах недалёка ад прадпрыемстваў, якія з-за адсутнасці інфраструктуры пакідалі не лепшае ўражанне. Індывідуальнае будаўніцтва на трактарным і аўтамабільным заводах ажыццяўлялася без тэхнічнай дакументацыі і кантролю з боку гарадскіх уладаў[610]. У пастанове ад 26 лютага 1951 г. Савет Міністраў БССР канстатаваў: за мінулы год здалі ў эксплуатацыю 75 300 кв. м жылой плошчы, што, у сваю чаргу, склала толькі 76,8% ад прадугледжаных планам 98 100 кв. м. З аднаго боку, будаўнічыя работы прыпалі не на пачатак года, а з другога – будаўніцтва асобных аб'ектаў зацягнулася. Адсутнасць ініцыятывы прадпрыемстваў стала прычынай таго, што прадугледжаныя на будаўніцтва фі-

[608] НАРБ, ф. 4, воп. 81, спр. 342, арк. 15–38, тут арк. 16–17.
[609] НАРБ, ф. 4, воп. 81, спр. 364, арк. 17–21, тут арк. 19.
[610] НАРБ, ф. 780, воп. 1, спр. 38, арк. 23–29.

нансавыя сродкі не былі цалкам асвоены. Разам з гэтым індывідуальнае будаўніцтва адбывалася на нізкім узроўні і без якоганебудзь кантролю[611].

Нягледзячы на тое, што ўзвядзенне індывідуальных дамоў у пасляваенны час успрымалася як важны фактар дапаўнення дзяржаўнага будаўніцтва, яго тэмпы былі вельмі павольнымі. Паказальны загаловак ліста, апублікаванага ў газеце "Правда" ад 23 траўня 1946 г.: "Чаму тармозіцца індывідуальнае жыллёвае будаўніцтва ў Мінску?". Жыхар беларускай сталіцы скардзіўся, што яму не выдзелілі зямельны ўчастак, хоць такое рашэнне было прынята пяць месяцаў таму[612]. Рэакцыя мясцовых партыйных кіраўнікоў на ўмяшанне з Масквы не прымусіла сябе чакаць: у пратаколе паседжання Бюро Мінскага гаркама КП(б)Б ад 30 траўня 1946 г. адзначана, што Упраўленне па справах архітэктуры адмовіла ў размеркаванні зямельных участкаў да зацвярджэння Генеральнага плана[613]. Аднак адсутнасць дазволаў на выкарыстанне гарадской тэрыторыі была не адзінай прычынай адставання індывідуальнага жыллёвага будаўніцтва. Пастанова СНК БССР ад 29 ліпеня 1946 г. канстатавала, што на 1 красавіка 1946 г. пабудавана толькі 32 дамы, хоць 202 прыватныя асобы атрымалі крэдыты ў памеры 1,9 млн. рублёў. Прычынай была адсутнасць планаў па будаўніцтве і недахоп будматэрыялаў. Акрамя гэтага, рэалізацыі інтарэсаў насельніцтва перашкаджалі бюракратычныя перашкоды: на 1 ліпеня 1946 г. існавала яшчэ 241 неразгледжаная заява[614]. Нягледзячы на гэта, паводле дадзеных Мінгарвыканкама, у перыяд з 4 ліпеня 1944 г. да 1 студзеня 1948 г. пабудавалі 1315 індывідуальных дамоў. Гаворка ішла ў асноўным аб прымітыўных пабудовах: 1059 дамоў былі драўляныя, 49 – мураваныя і 107 – змешанага тыпу; у 1026 дамах быў 1 пакой, у 139 – 2 пакоі[615].

Такім чынам, варта адзначыць, што жыллёваму будаўніцтву не аддавалася належнай увагі ў той момант, калі, з аднаго боку, колькасць насельніцтва і прамысловая вытворчасць зноў дасягнулі ўзроўню даваеннага часу, а з другога боку, калі праспект пачаў выконваць рэпрэзентатыўную ролю цэнтра горада. Як колькасць ква-

[611] НАРБ, ф. 7, воп. 4, спр. 6, арк. 267–237.

[612] Соколовский А. Почему тормозится индивидуальное жилищное строительство в Минске // Правда. 23.5.1946. № 121. С. 3.

[613] ДАМВ, ф. 69, воп. 1, спр. 78, арк. 117.

[614] НАРБ, ф. 7, воп. 3, спр. 124, арк. 80–84.

[615] НАРБ, ф. 7, воп. 3, спр. 1030, арк. 104.

тэр, так і размеркаванне дамоў не адпавядала прынятаму праекту Генеральнага плана агульнага горадабудаўнічага ансамбля з аднастайнымі жылымі кварталамі. Недахопы ў дзяржаўным сектары не маглі быць кампенсаваны індывідуальным жыллёвым будаўніцтвам. Акрамя таго, Мінгарвыканкам пачаў губляць кантроль над жылым фондам, бо вайна амаль цалкам разбурыла горад і будаўніцтва было перададзена ў кампетэнцыю прадпрыемстваў.

## б) Цэнтралізацыя жылога фонду

У выніку таго, што план першай пасляваеннай пяцігодкі па аднаўленні жылога фонду быў выкананы толькі на 75%, выявіліся недахопы, якія кожны жыхар горада штодня адчуваў на сабе. У гэтых умовах на пачатку 1950-х гг. у прэсе публікаваліся скаргі насельніцтва на недахопы ў будаўніцтве і супрацьзаконныя дзеянні жыллёвых упраўленняў. Так, 13 траўня 1951 г. жыхары аднаго з дамоў па вул. Энгельса скардзіліся ў "Советской Белоруссии" на тое, што першы паверх іх дома падобны на памыйную яму, бо каналізацыя месяцамі не працуе. Іх абурэнне выклікала абыякавае стаўленне начальніка жыллёва-эксплуатацыйнай канторы, які жыў у тым самым доме на другім паверсе. Умяшанне райвыканкама і санітарнай службы вынікаў не дало[616]. Як скаргі, што прайшлі цэнзуру і сталі здабыткам грамадскасці, маглі дапамагчы пацярпелым грамадзянам, застаецца незразумелым. Ва ўсякім выпадку пра "нармалізацыю ўмоў жыцця" ў тым сэнсе, які ў гэтыя словы ўкладваў Сталін, у пасляваенным Мінску не ішло і гаворкі[617].

Жыллёвае пытанне стала адным з галоўных у галіне "крытыкі і самакрытыкі". Нездарма перадавы артыкул "Советской Белоруссии" ад 6 чэрвеня 1951 г. меў гучны загаловак: "Жыллёвае будаўніцтва – справа першаступеннай важнасці". Тым, што рэдакцыя штодзённай дзяржаўнай газеты тлумачыла крызіс у жыллёвым будаўніцтве недастатковым кантролем партыі і дзяржавы, яна ставіла пад сумнеў ролю прадпрыемстваў як будпадрадчыкаў[618].

[616] Стеблина Н., Савчик А., Каскова М. Обращения остались без ответа // СБ. 13.5.1951. № 96. С. 3. "Советская Белоруссия" прывяла прыклад, пра які пісала газета "Мінская праўда". Пар.: 8 месяцаў не адказваюць на скаргу // МП. 17.4.1951. № 77. С. 3.

[617] Пар.: ч. II. 1.

[618] Жилищное строительство – дело первостепенной важности // СБ. 6.6.1951. № 113. С. 1.

Такога ж пункту гледжання прытрымліваўся старшыня Мінгарвыканкама К. Н. Длугашэўскі, які 18 верасня 1951 г. у газеце "Известия" выказаўся за цэнтралізацыю будаўнічай галіны. Ён абгрунтаваў сваю пазіцыю апісаннем сітуацыі ў Мінску: будаўнічыя арганізацыі атрымлівалі заказы ад прадпрыемстваў і ўстаноў, якія інвеставалі выдзеленыя ім міністэрствамі фінансавыя сродкі. Але будаваліся пераважна малапавярховыя жылыя дамы на гарадскіх ускраінах. Паводле яго слоў, гаворка ішла аб непрымальнай сітуацыі, якая была дапушчана Мінгарвыканкамам толькі таму, што ён быў зацікаўлены ў своечасовым асваенні сродкаў, выдзеленых на жыллёвае будаўніцтва. Таму Длугашэўскі выказаў меркаванне, што ўсе рэсурсы павінны канцэнтравацца ў адным міністэрстве або ўстанове, якія маглі б планаваць будаўніцтва шматпавярховых дамоў на базе тыпавых праектаў. У сувязі з гэтым ён прапанаваў альтэрнатыву жыллёваму будаўніцтву ад прадпрыемстваў, якая грунтавалася б на аб'яднанні ў жыллёва-будаўнічыя кааператывы: "Кааператыўнае жыллёвае будаўніцтва дазволіць найбольш рацыянальна выкарыстоўваць дзяржаўныя сродкі і будаўнічую тэхніку, хутчэй забяспечыць працоўных добраўпарадкаванымі кватэрамі, ліквідаваць хаос у гарадскім будаўніцтве"[619]. Хоць партыйнае і дзяржаўнае кіраўніцтва ўсведамляла ўсю сур'ёзнасць становішча, спатрэбілася яшчэ адно дзесяцігоддзе, каб гэтае меркаванне ўвасобілася ў практыку.

Між тым у жыллёвым будаўніцтве па-ранейшаму назіраліся недахопы: так, на паседжанні ЦК КПБ 23 красавіка 1953 г. адзначалася, што ў 1952 г. у Мінску было завершана будаўніцтва 111 жылых дамоў агульнай плошчай 86 700 кв. м. З-за недахопаў у арганізацыі (у тым ліку зацягванне заключэння дагавораў паміж заказчыкамі і будаўнікамі), у выкананні (у тым ліку некампетэнтнасць і ігнараванне тэрмінаў сезоннай працы, кліматычных умоў і ўмоў надвор'я) і ў тэхнічнай дакументацыі (у тым ліку пры пракладцы водаправода) не было здадзена ў эксплуатацыю яшчэ 18 300 кв. м жылой плошчы. Арганізацыі абвінавацілі ў ігнараванні "сацыялістычнага спаборніцтва" і тэхнічных новаўвядзенняў, такіх, як, напрыклад, метад прамысловага будаўніцтва[620]. 10 траўня 1954 г. ЦК КПБ сумесна з Саветам Міністраў БССР у сваёй пастанове падвялі вынікі выканання плана за 1953 г.: быў зда-

[619] Длугошевский К. В защиту кооперирования жилищного строительства // Известия. 18.9.1951. № 219. С. 2.
[620] НАРБ, ф. 4, воп. 81, спр. 710, арк. 35–41.

дзены ў эксплуатацыю 91 жылы дом плошчай 87 400 кв. м і не здадзены 19 жылых дамоў плошчай 22 600 кв. м. На гэты раз асабліва крытыкавалася Упраўленне па справах архітэктуры, у прыватнасці, за санкцыянаванне нерацыянальнага аздаблення кватэр, а таксама за дэкаратыўныя празмернасці ў афармленні фасадаў[621]. Нарэшце 19 траўня 1955 г. ЦК КПБ і Савет Міністраў БССР канстатавалі, што ў 1954 г. было здадзена ў эксплуатацыю 138 шматкватэрных дамоў жылой плошчай 137 тыс. кв. м, а 22 шматкватэрныя дамы плошчай 23 100 кв. м не здадзены[622]. Характэрная ў гэтым сэнсе неадназначнасць сітуацыі: з аднаго боку, выкананне плана ў жыллёвым будаўніцтве параўнальна з саракавымі гадамі, калі план выконваўся на 75%, у першай палове 1950-х гг. палепшылася нязначна. З іншага боку, той факт, што партыйнае і дзяржаўнае кіраўніцтва павінна было займацца пытаннямі жыллёвага будаўніцтва, сведчыць, што адкладалася вельмі неабходная рэформа ў дадзенай галіне.

У гэтым сэнсе прыклад Мінска пацвярджаў той факт, што курс Хрушчова на эканомію ў барацьбе супраць дэкаратыўных празмернасцяў у архітэктуры ў 1954–1955 гг. – толькі падстава для карэнных змен у будаўнічай галіне[623]. Як высветлілася, сапраўднай прычынай была неабходнасць выпраўлення глабальных памылак, дапушчаных на этапе аднаўлення горада: у пагоні за колькаснымі паказчыкамі прадпрыемствы не мелі магчымасці вырашаць іншыя задачы камунальнага забеспячэння. У гэтай сувязі старшыня Мінгарвыканкама В. І. Шарапаў у дакладной запісцы на імя старшыні Савета Міністраў БССР М. Э. Аўхімовіча праінфармаваў яго аб стане жыллёвага будаўніцтва на пачатак 1956 г.: у 1946–1955 гг. зарэгістраваны недахоп 6397 кватэр, або 191 900 кв. м жылой плошчы. Пабудаваныя 974 тыс. кв. м жылой плошчы адпавядалі толькі 83,5% ад запланаванага аб'ёму. З прычыны гэтага індывідуальная жылая плошча ў 1956 г. складала ў сярэднім толькі 4,08 кв. м. З улікам гэтага бядотнага становішча абмежаваная свабода дзеянняў выканкамаў, на думку Шарапава, была асабліва сумнай. На 1 студзеня 1956 г. у іх падпарадкаванні было толькі 2382 дамы жылой плошчай 318 300 кв. м. Сітуацыя пагаршалася дрэннай якасцю дамоў, бо побач з 1864 драўлянымі дамамі плошчай 166 тыс. кв. м было толькі 518 мураваных плошчай

621 НАРБ, ф. 4, воп. 81, спр. 856, арк. 9–16.
622 НАРБ, ф. 4, воп. 81, спр. 989, арк. 11–16.
623 Пар.: ч. II. 1.

152 200 кв. м. 630 дамоў мелі патрэбу ў капітальным рамонце, а яшчэ 296 прызначаліся пад знос. Акрамя гэтага, Шарапаў паказаў на праблемы ў індывідуальным жыллёвым будаўніцтве: хоць колькасць драўляных дамоў пасля вайны павялічылася з 3619 да 11 022, а іх плошча – з 117 207 кв. м да 444 200 кв. м (па дадзеных на 1 студзеня 1956 г.), на выдзеленых у 1944–1955 гг. 8085 зямельных участках пабудавалі толькі 5566 дамоў. Прычыну ён бачыў у тым, што, з аднаго боку, 70% зямельных участкаў не былі асвоены, а з другога боку, наяўныя ў продажы будматэрыялы пакрывалі толькі 10–15% попыту. У такіх умовах будаўніцтва індывідуальных дамоў займала ад трох да пяці гадоў[624]. Гэта азначала, што перад Мінгарвыканкамам стаяла складаная задача: па-першае, у яго падпарадкаванні быў толькі нікуды не варты жылы фонд даваеннага часу; па-другое, жыллёвае будаўніцтва ад прадпрыемстваў не адпавядала попыту на жыллё; па-трэцяе, індывідуальнае жыллёвае будаўніцтва не магло ліквідаваць наяўныя недахопы.

У такіх умовах ад партыі і дзяржавы патрабаваліся рашучыя меры. Між тым перамены ў будаўнічай палітыцы пазначыліся толькі пасля таго, як сакратар ЦК КПБ П. А. Абрасімаў у "Советской Белоруссии" 30 кастрычніка 1956 г. паставіў пад вялікі сумнеў гатоўнасць да працы міністэрстваў, ведамстваў і будаўнічых арганізацый[625]. Праблемы называліся сваімі імёнамі і ў іншых органах друку: планы па жыллёвым будаўніцтве не выкананы, не ажыццёўлены пераход да метаду прамысловага будаўніцтва і паранейшаму ў поўнай меры выяўляліся прыхільнасці архітэктараў да дэкаратыўных празмернасцяў пры афармленні фасадаў. З 197 жылых дамоў, якія будаваліся ў Мінску ў студзені 1956 г., 53 былі ўзведзены па індывідуальных праектах. Колькасць недахопаў дасягнула апагея і прывяла да таго, што жыллёвая праблема ў Мінску стала больш вострай, чым перад вайной[626].

[624] НАРБ, ф. 7, воп. 4, спр. 1797, арк. 204–218.

[625] Па словах Абрасімава, Мінская швейная фабрыка імя Крупскай і Мінская гарбарная фабрыка імя Куйбышава забяспечылі жыллём толькі 14% і 11% (адпаведна) сваіх работнікаў. Мінская шчацінна-шчотачная фабрыка за апошнія дзесяць гадоў пабудавала толькі адзін інтэрнат на 12 пакояў для 15 сем'яў, хоць на ёй працавала 500 чалавек. Абрасимов П. Больше внимания жилищному строительству // СБ. 30.10.1956. № 254. С. 2.

[626] Самодеев И. И. Жилищное строительство, благоустройство городов и сел в Белоруссии // Белорусский политехнический институт. Кафедра политической экономии. Сборник научных работ. Минск, 1957. Вып. 58. С. 61–79, тут с. 70–74.

Сітуацыю змяніла Пастанова ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР ад 20 лістапада 1957 г., у аснову якой лягла праграма жыллёвага будаўніцтва Хрушчова, прынятая 31 ліпеня 1957 г. У апублікаваным у "Советской Белоруссии" артыкуле ў духу палітыкі "адлігі" наўпрост ставілася пытанне пра нявырашаную жыллёвую праблему: "Праблема жылля ў рэспубліцы працягвае заставацца адной з самых вострых". Гэта тлумачылася тым, што адказныя работнікі дазвалялі сабе грубыя парушэнні рашэнняў партыі і інтарэсаў насельніцтва. Называліся канкрэтныя прычыны сітуацыі: не ў поўным аб'ёме асвойваліся сродкі, выдзеленыя на жыллёвае будаўніцтва, фінансавыя сродкі і матэрыялы часта выкарыстоўваліся не па прызначэнні, перавага аддавалася індывідуальным праектам, дапускаліся дэкаратыўныя празмернасці ў архітэктуры, участкі пад забудову былі раскіданы па ўсёй тэрыторыі горада. Акрамя гэтага, згадваліся наступныя недахопы: не падтрымлівалася індывідуальнае жыллёвае будаўніцтва, не аддавалася належнай увагі заснаваным на асабістай ініцыятыве калектыўным формам будаўніцтва, так званым "народным будоўлям". Ліквідаваць гэтыя сур'ёзныя недахопы павінна была дапамагчы пачатая ў 1958 г. эфектыўная структурная рэформа, паводле якой ролю будпадрадчыка жылых дамоў і грамадскіх будынкаў у Мінску, а таксама ў абласных цэнтрах Брэсце, Гомелі, Гродне, Магілёве, Маладзечне і Віцебску перадалі выканкамам. Цяпер функцыя міністэрстваў, ведамстваў, прадпрыемстваў і арганізацый абмяжоўвалася ўкладаннем сродкаў у матэрыялы і абсталяванне. У адпаведнасці з памерам іх інвестыцый ім выдзялялася жыллё. Меркавалася, што цэнтралізацыя жыллёвага будаўніцтва (калі зыходзіць з таго, што кожная сям'я павінна мець асобную кватэру) створыць перадумовы для таго, каб да канца 1965 г. на кожнага жыхара БССР прыпадала 8 кв. м. За перыяд бягучай пяцігодкі ў Мінску да 1960 г. было запланавана пабудаваць 1531 тыс. кв. м жылой плошчы ў дзяржаўным сектары і 435 тыс. кв. м жылой плошчы – у прыватным[627]. 27 чэрвеня 1958 г. Савет Міністраў БССР пастанавіў перадаць усе новыя жылыя дамы ў распараджэнне ўпраўлення капітальнага будаўніцтва Мінгарвыканкама[628]. Забеспячэнне кожнай сям'і кватэрай ва ўсесаюзным маштабе было абвешчана ў праграме партыі толькі ў 1961 г.[629].

[627] Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК. Т. 5. 1956–1965. Минск, 1986. С. 86–98. Цытата на с. 87. Пар. таксама: СБ. 2.8.1957. № 181. С. 1–2.

[628] Жилищное законодательство. Минск, 1961. С. 52.

[629] Пар.: ч. II. 1.

На самай справе задача, пастаўленая ў праграме жыллёвага будаўніцтва, была выканана ў Мінску толькі на дзве трэція: пабудаванае ў 1956–1960 гг. у беларускай сталіцы жыллё складала ў дзяржаўным сектары 928 тыс. кв. м і ў прыватным – 142 тыс. кв. м (гл. дадатак, табліца XVIII). Выходзячы з гэтага, можна паставіць пад сумнеў поспехі, дасягнутыя ў 1950-я гг. у жыллёвым будаўніцтве. Згодна з Усесаюзнай інвентарызацыяй жыллёвага фонду, на 1 студзеня 1960 г. колькасць шматкватэрных дамоў у Мінску за дзесяцігоддзе (1950–1960) вырасла з 3593 да 6557. З улікам "времянок" дзяржаўная жылплошча павялічылася з 784 662 кв. м да 2 328 649 кв. м карыснай плошчы і да 3 141 269 кв. м агульнай плошчы. Аднак гэта не пакрывала попыту: у 1960-я гг. у дзяржаўным сектары на аднаго чалавека прыпадала толькі 5,5 кв. м карыснай плошчы і 7,4 кв. м агульнай. 368 235 чалавек (67,5%) жылі ў шматкватэрных дамах і бараках, 47 756 чалавек (8,7%) – у інтэрнатах, 4321 (0,8%) – у недабудаваных і разбураных дамах і 1712 (0,3%) – у падвалах. Астатнія 123 433 жыхары горада (22,6%) знайшлі прытулак у драўляных дамах. Шчыльнасць заселенасці ў шматкватэрных дамах складала 6,3 чалавека на кватэру і 2,7 чалавека на пакой. У сярэднім кожная кватэра мела 2,3 пакоя (гл. дадатак, табліца XVII). У будаўніцтве індывідуальных дамоў, якія павінны былі ў 1960-я гг. саступіць месца мікрараёнам, можна адзначыць наступнае развіццё: з 1945 да 1960 г. колькасць драўляных жылых дамоў павялічылася з 3619 да 20 036, а колькасць людзей, што жыла ў іх – з 36 009 да 123 433. У 1960 г. у кожнай кватэры пражывала ў сярэднім 4,8 чал. На кожнага прыпадала 7,8 кв. м (табліца 14).

**Табліца 14.** Індывідуальнае жыллё і яго выкарыстанне ў Мінску на 1 студзеня 1960 г.

| | |
|---|---|
| Нерухомасць | 19411 |
| Домаўладальнікі | 24606 |
| Жылыя дамы | 20036 |
| Кватэры | 26281 |
| Жылая плошча (у кв. м) | 959412 |
| Сем'і | 27900 |
| Жыхары | 123433 |
| – пастаянныя | 105704 |
| – часовыя | 17727 |
| Плошча на чалавека ў кв. м | 7,8 |

*Крыніца:* ДАМВ, ф. 1035, воп. 1, спр. 638, арк. 67.

Праз два гады пасля таго як Мінгарвыканкам наладзіў кантроль над жыллёвым будаўніцтвам, суадносіны валодання дзяржаўным жылым фондам размяркоўваліся наступным чынам: 1 студзеня 1960 г. 73,3% жылой плошчы належалі прадпрыемствам ад розных міністэрстваў, 23,2% – райвыканкамам і 3,5% – арганізацыям і каапэратывам (гл. дадатак, табліца XVII). Калі ў гэты спіс уключыць яшчэ і прыватны сектар, то высвятляецца, што доля жылога райвыканкамаўскага фонду, якая да вайны складала палову гарадскога жылля, у 1960 г. ледзь дацягвала да пятай часткі. Прадпрыемствам і арганізацыям пад канец вайны належала адна чвэрць, а ў пачатку 1950-х гг. – палова ўсяго жылля. Нягледзячы на нерацыянальны падыход да індывідуальнага жыллёвага будаўніцтва, напярэдадні 1960 г. доля прыватнага сектара складала амаль чвэрць усёй жылплошчы з тэндэнцыяй да памяншэння (табліца 15).

**Табліца 15.** Суадносіны валодання жылой плошчай у Мінску з 1940 да 1960 г.

| | 01.01.1940 г. | 01.05.1945 г. | 01.01.1947 г. | 01.01.1952 г. | 01.01.1956 г. | 01.01.1960 г. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| а) у тыс. кв. м | | | | | | |
| усяго | 1 069,6 | 405,9 | 537,1 | 1 293,0 | 1 836,8 | 4 100,6 |
| райвыканкамы | 554,6 | 184,9 | 209,2 | 288,0 | 318,3 | 728,9 |
| міністэрствы і ведамствы | 218,0 | 103,8 | 190,5 | 687,0 | 1 074,3 | 2 412,3 |
| прыватны сектар | 297,0 | 117,2 | 137,4 | 318,0 | 444,2 | 959,4 |
| б) у % | | | | | | |
| усяго | 100 | 100 | 100 | 100 | 100 | 100 |
| райвыканкамы | 51,8 | 45,5 | 38,9 | 22,3 | 17,3 | 17,8 |
| міністэрствы і ведамствы | 20,4 | 25,6 | 35,5 | 53,1 | 58,5 | 58,8 |
| прыватны сектор | 27,8 | 28,9 | 25,6 | 24,6 | 24,2 | 23,4 |

*Крыніцы:* ДАМВ, ф. 1035, воп. 1, спр. 638, арк. 67, 69–70; ДАМВ, ф. 2305, воп. 1, спр. 595, арк. 10; ДАМВ, ф. 2631, воп. 1, спр. 4, арк. 72, спр. 53, арк. 181; НАРБ, ф. 7, воп. 4, спр. 1797, арк. 204.

### в) Пераход да масавага жыллёвага будаўніцтва

Абвяшчэнне масавага жыллёвага будаўніцтва ў 1957 г. стала перадумовай для зацвярджэння мікрараёнаў як новай галоўнай унутрыгарадской канцэпцыі засялення. Пытанне аб'ёмаў інвестыцый у жыллёвае будаўніцтва мог вырашаць толькі Мінгарвыканкам. У той жа час будаўнічыя арганізацыі павінны былі выкарыстоўваць метад прамысловага будаўніцтва і ўзводзіць жылыя дамы па тыпавых праектах. Таму ў 1962–1963 гг. на змену індывідуальнаму жыллёваму будаўніцтву прыйшло кааператыўнае. На практыцы масавае жыллёвае будаўніцтва азначала карэнныя змены. З аднаго боку, абмяжоўваўся ўплыў прадпрыемстваў пры выкарыстанні і размеркаванні жылплошчы. З іншага боку, мэта забяспечыць кожную сям'ю асобнай кватэрай азначала паступовы пераход ад камуналак у сталінскіх шматкватэрных дамах да маламетражных і малагабарытных кватэр у "хрушчобах", якія сталі адной з асноўных формаў пражывання[630].

Па выніках выканання пяцігадовых планаў у галіне жыллёвага будаўніцтва, пададзеных Мінскім гарадскім упраўленнем статыстыкі, адразу можна ўбачыць, што ў горадзе дамінавала канцэпцыя мікраараёна. Калі ў другой палове 1950-х гг. амаль 1 млн. кв. м жылой плошчы прыпадаў на шматкватэрныя дамы, якія будаваліся ў той ці іншай ступені па індывідуальных праектах, то 2,6 млн. кв. м жылплошчы, пабудаванай у першай палове 1960-х гг., прыпадала на панэльныя дамы, якія ўзводзіліся па тыпавых праектах (гл. дадатак, табліца XVIII). Адпаведны сітуацыі прыклад, прыведзены старшынёй Дзяржбуда БССР У. А. Каралём, ілюструе маштабы гэтага развіцця: калі ў 1956 і 1957 гг. у Мінску пабудавалі 190 жылых дамоў на 140 зямельных участках і 245 жылых дамоў на 164 участках, то ў 1958 г. – 259 жылых дамоў на 5-6 участках[631]. Гэта было цалкам лагічна, бо максімальныя паказчыкі ў жыллёвым будаўніцтве (4,3 млн. кв. м жылой плошчы, або 88 200 кватэр) былі дасягнуты толькі ў пачатку 1970-х гг., пасля таго як мікраараёны сталі комплексамі дамоў, дзе пражывала большая частка насельніцтва горада, і пяціпавярховыя "хрушчобы" саступілі месца шматпавярховым

[630] Пар.: ч. V. 3. в.

[631] Король В. А. Размещение жилищного строительства в Белоруссии // Размещение жилищного строительства в городах. Москва, 1960. С. 149–164, тут с. 150.

дамам. Паказальна, што ў 1970–1980-я гг. трэць жылых дамоў узвялі кааператывы. Удзел у кааператыўным жыллёвым будаўніцтве даваў прадпрыемствам магчымасць не залежаць ад Мінгарвыканкама. Толькі пры бліжэйшым разглядзе становіцца зразумела, што масавае жыллёвае будаўніцтва было звязана з памяншэннем плошчы кватэр. Калі сярэдняя плошча ў 47 500 кватэрах, пабудаваных у першай палове 1960-х гг., складала 55,5 кв. м, то ў 80 700 кватэрах, пабудаваных у другой палове 1960-х гг., сярэдняя плошча была толькі 43,6 кв. м. Сярэдняя плошча кватэры (55 кв. м) у новых дамах была зноў дасягнута толькі ў другой палове 1980-х гг. (гл. дадатак, табліца XVIII).

Нягледзячы на змены ў структуры жыллёвага будаўніцтва, недахопы, якія існавалі з 1950-х гг., не маглі быць ліквідаваны. 8 верасня 1965 г. "Советская Белоруссия" паведаміла пра пасяджанне выканкама Фрунзенскага раёна, на якім крытыкавалася якасць будаўніцтва мікрараёнаў. З аднаго боку, будаўнікі дрэнна выканалі сваю працу, з іншага – будаўнічая прамысловасць забяспечыла няякаснымі матэрыяламі, таму шмат жылых дамоў здалі ў эксплуатацыю з вялікімі недахопамі. Жыхары з першых дзён выпраўлялі дэфекты падлогі, сцен, вокнаў і дзвярэй; былі няспраўнасці і ў сантэхніцы. На фасадах дамоў выцвіла фарба. З-за дрэннай якасці бетонных пліт у кватэрах гулялі скразнякі. Працякаў дах, і з-за гэтага ў кватэрах было вільготна[632]. Пералік парушэнняў у будаўніцтве канкрэтна адлюстраваны ў справаздачы Камітэта народнага кантролю ад 24 сакавіка 1970 г.: пра надзвычай нізкую якасць будаўніцтва сведчыў той факт, што за перыяд з 1967 да 1969 г. толькі палову новабудоўляў прынялі з ацэнкай "добра". У гэтай сувязі крытыкавалася тое, што жылыя дамы прымаліся з істотнымі недахопамі і што будаўнікі неабгрунтавана атрымлівалі прэміі. Канстатавалася, што справаздачы будаўнічых арганізацый аб выкананні плана ў значнай ступені перабольшаны. Была таксама выказана крытыка з нагоды таго, што гатовыя дамы заставаліся незаселенымі на працягу 3–5 месяцаў, а асобныя кватэры пуставалі да года, бо размеркаванне райвыканкамамі жылой плошчы міністэрствам і арганізацыям праходзіла не заўсёды гладка. Акрамя таго, што на працягу доўгага часу ў новых дамах не было вады, газу і электрычнасці, 30 снежня 1969 г. Мінгарвыканкам дазво-

[632] Михинов Н. Чтобы доволен был новосел // СБ. 1965. № 212. С. 2.

ліў здачу ў эксплуатацыю дамоў без ліфта і гарачай вады. Нядзіўна, што ў гэтых умовах інфраструктура мікраараёнаў не была развіта[633]. Праблемы існавалі таксама і ў кааператыўным жыллёвым будаўніцтве. Паводле справаздачы начальніка аддзела па працы са зваротамі грамадзян Камітэта народнага кантролю ад 8 снежня 1969 г., у мінулым годзе запланавалі пабудаваць толькі 3249 кватэр, хоць у кааператывы (ад прадпрыемстваў і ўстаноў) хацелі ўступіць 18 тыс. чалавек. Парушэнні былі як пры прыняцці людзей у кааператывы, так і пры размеркаванні кватэр. Відавочна, што ў горадзе не існавала адзінага рэгулявання гэтых пытанняў[634].

Пасля пачатку масавага жыллёвага будаўніцтва ў Мінску жылая плошча павялічылася з 4,5 млн. кв. м у 1960 г. да 10 млн. кв. м у 1970 г. і да 24,5 млн. кв. м у 1990 г. (гл. дадатак, табліца XIX). Зыходзячы з колькасці насельніцтва, можна разлічыць памер агульнай жылой плошчы на чалавека: яна павялічылася з прыблізна 8,4 кв. м у 1960 г. да 10,9 кв. м у 1970 і да 15 кв. м у 1990 (табліца 16).

**Табліца 16.** Сярэдняя жылплошча на чалавека ў Мінску ў 1950–1990 гг. (у кв. м).

| Крыніца | 1945 г. | 1950 г. | 1960 г. | 1965 г. | 1970 г. | 1975 г. | 1980 г. | 1985 г. | 1990 г. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | 3,9 | 5,8 | 8,4 | 9,6 | 10,9 | 12,5 | 13,5 | 14,3 | 15,0 |
| 2. | – | – | 8,4 | 9,6 | 10,9 | 12,4 | 13,4 | 14,2 | 15,1 |
| 3. | – | – | – | – | 10,6 | 11,9 | 13,2 | 13,9 | 14,4* |

*1988 г.

*Крыніцы:* 1. Па разліках: Народное хозяйство города Минска в 1978 г. Минск, 1979. С. 152; Народное хозяйство города Минска в одиннадцатой пятилетке. Минск, 1986. С. 142; Народное хозяйство города Минска в 1990 году. Минск, 1991. С. 75. 2. Па разліках: Народное хозяйство Бело-

[633] НАРБ, ф. 911, воп. 6, спр. 900, арк. 1–4. Гэтыя дадзеныя можна праілюстраваць канкрэтным прыкладам: 4 студзеня 1969 г. дзяржаўная камісія выявіла ў доме № 33 па Магілёўскай шашы шэраг істотных недахопаў. Фарбавальныя працы былі выкананы толькі на 25%, не была паслана падлога, адсутнічалі ракавіны, пліты і сцёкавыя трубы, таму ў пратаколе запісалі, што дом не можа быць прыняты. Тым не менш Мінгарвыканкам сваім рашэннем (ранейшай датай) ад 31.12.1968 г., зацверджаным кантрольнай камісіяй, дазволіў здаць дом у эксплуатацыю. Нягледзячы на тое, што на ліквідацыю недахопаў дадаткова патрабавалася яшчэ 15 300 руб., будаўнічая арганізацыя атрымала 10 982 руб. прэміі. Тамсама, арк. 2.

[634] НАРБ, ф. 911, воп. 6, спр. 831, арк. 1–9.

русской ССР в 1968 г. Статистический сборник. Минск 1969. С. 420; Народное хозяйство Белорусской ССР. Юбилейный статистический ежегодник. Минск, 1978. С. 190; Народное хозяйство Республики Беларусь в 1991 г. Статистический сборник. Минск, 1993. С. 105. 3. Социальное развитие СССР. Статистический сборник. Москва, 1990. С. 211.

Пасля структурнай рэформы 1957 г. значная частка жылога фонду адышла ў распараджэнне райвыканкамаў. Доля жылплошчы, якая належала выканкамам, узрасла з 17,8% у 1960 г. да 44,1% у 1966 г. і да 52,7% у 1979 г. Доля міністэрстваў і ведамстваў скарацілася, наадварот, з 58,8% у 1960 г. да 38,2% у 1966 г. і да 25,0% у 1979 (табліца 17). Усё паказвала на тое, што кааператыўнае жыллёвае будаўніцтва ў працэнтных адносінах – нераўназначная альтэрнатыва індывідуальнаму жыллёвыму будаўніцтву. Пасля забароны будаўніцтва прыватных дамоў у межах горада ў 1963 г. іх доля ў агульнагарадскім жыллёвым фондзе да 1990 г. знізілася амаль з 25% да прыблізна 5%. Адпаведна зменшылася і доля насельніцтва, якое жыло ў прыватных дамах, з 22,6% ад агульнай колькасці насельніцтва ў 1960 г. да 4,4% у 1989 г. У колькасных адносінах кааператыўнае жыллёвае будаўніцтва аказалася больш прадуктыўным, чым індывідуальнае. Але кааператывы, якія падтрымліваліся дзяржавай, да 1979 г. змаглі павялічыць сваю долю толькі да 15,5% у агульнагарадскім жылым фондзе (табліца 17). У 1989 г. у кааператыўныя кватэры засялілася 17,1% насельніцтва Мінска. У гэтых умовах доля жыхароў, якія пражывалі ў дзяржаўных кватэрах, узрасла ў перыяд з 1960 да 1989 г. з 77,4% да 78,5% (табліца 18).

**Табліца 17.** Суадносіны валодання жыллём у Мінску ў 1960–1979 гг. (у тыс. кв. м).

| Год | Жылая плошча, усяго | | Выканкамы | | Міністэрствы і ведамствы | | Кааператывы | | Прыватная ўласнасць | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | у абсалютным вылічэнні | % | у абсалютным вылічэнні | % | у абсалютным вылічэнні | % | у абсалютным вылічэнні | % | у абсалютным вылічэнні | % |
| 1960 | 4100,6 | 100,0 | 728,9 | 17,8 | 2412,3 | 58,8 | – | – | 959,4 | 23,1 |
| 1966 | 4774,0 | 100,0 | 2107,7 | 44,1 | 1823,0 | 38,2 | – | – | 843,3 | 17,7 |
| 1979 | 16276,0 | 100,0 | 8579,0 | 52,7 | 4072,5 | 25,0 | 2521,9 | 15,5 | 1102,6 | 6,8 |

*Крыніцы:* Табліцы 14, 15 у гэтым раздзеле; Городское хозяйство Белорусской ССР (Основные фонды по состоянию на 1 января 1966 г.). Минск 1967. С. 323; Жилищно-коммунальное хозяйство Белоруссии в десятой пятилетке / под ред. А. И. Безлюдова. Минск, 1980. С. 130.

**Табліца 18.** Размеркаванне жыхароў Мінска па формах уласнасці жылля ў 1960–1989 гг.

| Год | Жыхары | | Размеркаванне па формах уласнасці жылля | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | Дзяржава | | Кааператывы | | Прыватная ўласнасць | |
| | у абсалютным вылічэнні | % | у абсалютным вылічэнні | % | у абсалютным вылічэнні | % | у абсалютным вылічэнні | % |
| 1960 | 545457 | 100 | 422024 | 77,4 | – | – | 123433 | 22,6 |
| 1989 | 1535209 | 100 | 1205554 | 78,5 | 262084 | 17,1 | 67541 | 4,4 |

*Крыніца:* Табліцы 14,15 у гэтым раздзеле; Численность, возрастная структура, состояние в браке, число и размер семей, национальный состав, уровень образования, источники средств существования, баланс трудовых ресурсов, жилищные условия населения Минска в разрезе внутригородских районов. По данным Всесоюзной переписи населения на 12 января 1989 года. Минск, 1991 (Для служебного пользования). С. 140.

Спробы сістэматычнага ўліку жылога фонду прадпрыемстваў былі зроблены ў 1965 і 1969 гг., але ў іх відаць пэўныя прабелы. Параўнальны аналіз развіцця прамысловых гігантаў (трактарны і аўтамабільны заводы), некалькіх вядомых прадпрыемстваў (завод "Ударнік", маторны завод), будаўнічай арганізацыі (будтрэст № 1) і некалькіх ВНУ (Беларускі політэхнічны інстытут і Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт) паказвае, што павелічэнне колькасці квадратных метраў жылой плошчы ад прадпрыемстваў і арганізацый адбывалася непрапарцыйна росту работнікаў (табліца 19). У сувязі з патрабаваннямі дзяржавы выдзяляць кватэры не толькі грамадзянам, якія працуюць на прадпрыемствах, але і не занятым на вытворчасці, колькасць кватэр ад трактарнага завода зменшылася амаль на 200, а аб'ём жылой плошчы – больш чым на 2000 кв. м. Колькасць жыхароў узрасла на 700 чалавек, таму шчыльнасць заселенасці кватэр павялічылася ў сярэднім з 5,4 да 5,6 чал. Відавочна, што прыярытэтамі трактарнага завода сталі будаўніцтва інтэрнатаў і падтрымка кааператыўнага жыллёвага будаўніцтва, каб звесці да мінімуму долю кватэр, якія павінны былі перайсці ў распараджэнне Мінгарвыканкама. З прычыны гэтага жылплошча ў інтэрнатах павялічылася амаль на 4 тыс. кв. м, а колькасць жыхароў інтэрнатаў адпаведна вырасла амаль на 900 чалавек. Тым не менш сярэдняя жылплошча на чалавека за перыяд з 1965 да 1969 г. скарацілася і ў кватэрах (з 5,7 да 5,4 кв. м), і ў інтэрнатах (з 4,9 да 4,3 кв. м) (табліца 19).

**Табліца 19.** Жылы фонд асобных прадпрыемстваў і арганізацый Мінска ў 1965–1969 гг.

| | Жылая плошча, усяго (у кв. м) | Інтэрнаты (у кв. м) | Баракі (у кв. м) | Колькасць кватэр | Жыхары | Жыхары ў інтэрнатах | Жыхары ў бараках |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| а) 1965 г. | | | | | | | |
| Трактарны завод | 163831 | 10613 | – | 4964 | 26775 | 2401 | – |
| Аўтамабільны завод | 153056 | 9897 | – | 5888 | 25961 | 2015 | – |
| Будтрэст № 1 | 62510 | 9891 | – | 1472 | 9269 | – | – |
| Беларускі політэхнічны інстытут | 26270 | 23383 | – | 82 | 293 | 5293 | – |
| Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт | 12845 | 12485 | – | – | – | 3207 | – |
| Завод "Ударнік" | 3424 | 372 | – | 101 | 430 | 69 | – |
| Маторны завод | 925 | – | – | 25 | 148 | – | – |
| б) 1969 г. | | | | | | | |
| Трактарны завод | 157221 | 12930 | – | 4782 | 26618 | 2983 | – |
| Аўтамабільны завод | 175306 | 11705 | 18705 | 6256 | 27393 | 2395 | 3969 |
| Будтрэст № 1 | 63880 | 10955 | 8952 | 1698 | 10103* | 2341 | 1814 |
| Беларускі політэхнічны інстытут | 24283 | 21585 | – | 68 | – | 4912 | – |
| Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт | 14477 | 14477 | – | – | – | 3929 | – |
| Завод "Ударнік" | 3439 | 419 | – | 131 | 463 | 87 | – |
| Маторны завод | 925 | – | – | 25 | 175 | – | – |

* 5516 чалавек, якія працавалі ў іншых месцах

*Крыніцы:* ДАМВ, ф. 1035, воп. 1, спр. 2127, арк. 1, 3, 4, 18, 58, 96, 135, 136, 144; спр. 3620, арк. 12, 14, 24, 53, 55, 57, 72, 73, 175, 155, 209, 210. Завод "Ударнік" выпускаў пагрузачныя і снегаачышчальныя машыны.

Такім чынам, з гэтага прыкладу можна зрабіць выснову, што магчымасці прадпрыемстваў і арганізацый у галіне жыл-

ля былі абмежаваныя. У залежнасці ад інтэнсіўнасці жыллёвага будаўніцтва недахоп у розных выпадках выяўляўся па-рознаму. Фактычна дэфіцыт адзначаўся паўсюль: не хапала жылля ўласным работнікам і тым больш новым супрацоўнікам. Як следства, назіралася высокая цякучасць рабочай сілы: па дадзеных таго часу, у другой палове 1960-х гг. амаль палова работнікаў прамысловасці змяніла месца працы. Згодна з праведзеным у 1968 г. апытаннем на 21 мінскім прадпрыемстве, 35% усіх звальненняў абумоўлівалася жыллёвым пытаннем[635].

Наколькі былі абмежаваныя магчымасці другарадных прадпрыемстваў у жыллёвым будаўніцтве, відаць на прыкладзе велазавода. Жылая плошча, якая належала прадпрыемству, павялічылася з 8274 кв. м у 1950 г. да 16 102 кв. м у 1955 г. і да 34 347 кв. м у 1965 г., але адміністрацыя завода не магла ў дастатковай меры забяспечыць жыллём свой калектыў, бо аддавала пэўную долю кватэр у распараджэнне Ленінскага райвыканкама. Хоць колькасць работнікаў, якая складала ў 1950 г. усяго 1520 чалавек, павялічылася з 1955 да 1965 г. зусім нязначна – з 5123 да 5694, на 1 студзеня 1965 г. у спісе чаргавікоў на кватэру было 1606 чалавек. 528 чалавек стаялі ў чарзе ўжо больш за 10 гадоў, 598 – ад 5 да 10 гадоў[636]. 8 студзеня 1965 г. дырэктар велазавода далажыў у ЦК КПБ, што з увядзеннем у 1958 г. кантролю над жыллёвым будаўніцтвам з боку Мінгарвыканкама жылплошча, якая размяркоўвалася штогод, скарацілася з 3 да 2 тыс. кв. м. Паколькі чвэрць жылля павінна была перадавацца райвыканкаму, ваенкамату і будаўнічым арганізацыям, завод штогод мог даваць кватэры толькі 5% чаргавікоў[637]. Магчымасці завода не дазвалялі яму рабіць у далейшым інвестыцыі ў жыллёвае будаўніцтва, таму ў 1965 г. кіраўніцтва прадпрыемства вырашыла перадаць увесь свой жылы фонд Мінгарвы-

[635] Паводле дадзеных А. Н. Пешкавай, у перыяд з 1966 да 1969 г. 80–90 тыс. работнікаў, занятых у прамысловасці, памянялі месца працы. Пешкова А. Н. О текучести рабочей силы и использовании фонда рабочего времени в промышленности (на примере города Минска) // Проблемы народонаселения и трудовых ресурсов. Сборник статей. Вып. II / ред. колл.: А. А. Раков и др. Минск, 1971. С. 157–164, тут с. 158, 162.

[636] Пар. справаздачы велазавода за адпаведны год. ДАМВ, ф. 2474, воп. 1, спр. 50, арк. 29, 31; спр. 103, 123 і арк. 27; спр. 287, арк. 53; спр. 288, арк. 114–115; спр. 301, арк. 36.

[637] НАРБ, ф. 4, воп. 97, спр. 193, арк. 1–2.

канкаму. Такім чынам, у завода засталося пяць інтэрнатаў, дзе жылі амаль 700 чалавек[638].

Тым не менш працэс перадачы жылога фонду ў распараджэнне Мінгарвыканкама нельга назваць бездакорным: у Мінску супраць дзяржаўнага кантролю былі настроеныя, у прыватнасці, прамысловыя канцэрны. 6 жніўня 1975 г. старшыня Мінгарвыканкама М. В. Кавалёў на старонках газеты "Известия" выказаў думку, што цэнтралізацыя жыллёвага будаўніцтва дазваляе прымаць шырокамаштабныя рашэнні ў галіне інфраструктуры. Шкадаваць, аднак, па яго словах, даводзіцца толькі пра тое, што кіраўніцтва прадпрыемстваў сваімі паводзінамі працягвае блакаваць прыняцце важных рашэнняў. Часам пры рэалізацыі праектаў, важных для ўсяго горада, яны ідуць сваім шляхам. Акрамя таго, на думку Кавалёва, некаторыя прадпрыемствы часта ўхіляліся ад унясення сваёй долі ў агульныя інвестыцыі і залазілі ў даўгі ў гарадскі бюджэт[639]. З прычыны гэтага Жыллёвы кодэкс БССР 1983 г. абвясціў поўны пераход гарадскога ведамаснага жылога фонду ў распараджэнне выканкамаў[640].

## 2 Выдзяленне кватэр

### а) Парадак выдзялення жылплошчы

Канстытуцыя БССР 1978 г., якая ўзяла за аснову брэжнеўскую канстытуцыю 1977 г., і Жыллёвы кодэкс БССР 1983 г. гарантавалі права грамадзян на жыллё. На практыцы гэтая расплывістая фармулёўка зусім не гарантавала асобную кватэру кожнаму грамадзяніну. Замест гэтага партыйнае і дзяржаўнае кіраўніцтва пастулявала толькі абавязацельства забяспечыць насельніцтва жыллём і жылплошчай[641]. Мелася на ўвазе жыллё, якое адпавядала санітарнай норме (з 1931 г. яна складала

[638] ДАМВ, ф. 2474, воп. 1, спр. 302, арк. 36.

[639] Ковалев М. Заботы города // Известия. 6.8.1975. № 182, с. 3. Пар.: Shomina E. C. Enterprises and the Urban Environment in the USSR // International Journal of Urban and Regional Research. 1992. Vol. 16. P. 222–233.

[640] Жилищный кодекс Белорусской ССР, § 6.

[641] Тамсама, § 1.

9 кв. м на чалавека, а з 1983 г. – 12 кв. м[642]). Забяспечыць жыллём насельніцтва Мінска з захаваннем санітарнай нормы з сярэдзіны 1970-х гг. і насельніцтва іншых беларускіх гарадоў з другой паловы 1970-х гг. не ў апошнюю чаргу стала магчымым за кошт будаўніцтва мікрараёнаў з шматпавярховымі дамамі[643]. Аднак статыстычныя звесткі не адлюстроўваюць ні маштабаў недахопу жылля ў 1950–1960-я гг., ні вострай патрэбы ў 1970–1980-я гг. у жыллі маладых сем'яў, якая не задавальнялася дзяржавай[644]. Правам на дадатковую плошчу звыш санітарнай нормы, згодна з укаранёнай у 1930-я гг. сістэмай прывілеяў, карысталіся людзі, якія мелі заслугі перад Радзімай, а таксама прадстаўнікі пэўных прафесій. Да першай катэгорыі адносіліся Героі Савецкага Саюза і персанальныя пенсіянеры, а таксама вынаходнікі і рацыяналізатары. Да другой катэгорыі належалі вучоныя, пісьменнікі, мастакі, скульптары, архітэктары і кампазітары, а таксама вышэйшыя ваенныя чыны, інжынеры, спецыялісты і дактары. Прадстаўнікі эліты валодалі правам на дадатковую жылплошчу ў выглядзе асобнага пакоя плошчай 9 кв. м або дадатковай жылой плошчы ў памеры 10 кв. м. Акрамя таго, па рашэнні выканкамаў маглі дапускацца выключэнні для людзей з хранічнымі захворваннямі, пералік якіх у законе не ўдакладняўся[645].

Пасля Другой сусветнай вайны задача партыі і дзяржавы ў Мінску складалася спачатку толькі ў тым, каб рассяліць насельніцтва ў вельмі абмежаваным жыллёвым фондзе. Да 1957 г. за гэта неслі адказнасць перш за ўсё працадаўцы, якія займаліся жыллёвым будаўніцтвам. З-за агульнага недахопу кватэр работнікаў сялілі, як правіла, у інтэрнатах, бараках і камуналках. Пасля вайны выканкамы займаліся ў першую чаргу забеспячэннем жылплошчай інвалідаў вайны, сем'яў загінулых, дэмабілізаваных і сем'яў вайскоўцаў. Пры гэтым выканкамы маглі браць жыллё са спецыяльнага фонду, які даваўся ў іх распараджэнне пастановай Савета Народных Камісараў СССР ад 21 верасня

[642] Жилищное законодательство. Минск, 1961. С. 150; Жилищный кодекс Белорусской ССР, § 46.

[643] Пар. для Мінска ў гэтым раздзеле табліцу 20 і для БССР у цэлым: Социальное развитие СССР. Статистический сборник. Москва, 1990. С. 209.

[644] Пар.: ч. V. 2. б.

[645] Жилищное законодательство. Минск, 1961. С. 146–147, 153–154. Пар. таксама: Жилищное законодательство. Минск, 1968. С. 133–136.

1945 г. Гэтая пастанова абавязвала будпадрадчыкаў перадаваць выканкамам 10% пабудаванага кожны год жылля[646]. Разам з гэтым да 1957 г. выканкамы распараджаліся фондам кватэр, ацалелых у гады вайны. Часта яны займаліся толькі тым, што на нейкі час сялілі людзей у "времянки". Перш за ўсё гэтае бядотнае становішча закранала работнікаў камунальных службаў. Пасля таго як з пачаткам масавага жыллёвага будаўніцтва выканкамы атрымалі магчымасць ажыццяўляць кантроль над гарадскім жыллём, яны па даручэнні дзяржавы пачалі даваць маламетражныя і малагабарытныя кватэры ў мікрараёнах. Неафіцыйны рынак жылля з самага пачатку абмяжоўваўся пераважна адносінамі найму ў прыватных дамах[647].

Першыя дзесяць гадоў пасля вайны, якія праходзілі пад знакам аднаўлення і індустрыялізацыі, райвыканкамы і кіраўнікі прадпрыемстваў і арганізацый мелі права па ўласным меркаванні распараджацца выдзяленнем жылля, ставіць на чаргу і кантраляваць яе. Рэгулёўны механізм, які займеў сілу закона, быў створаны толькі тады, калі Мінгарвыканкам атрымаў права распараджацца жыллём і даверыў прадпрыемствам і арганізацыям кантроль за так званым ведамасным жыллёвым фондам, які займаўся інвестыцыямі ў жыллёвае будаўніцтва. Адпаведна з пастановай Савета Міністраў БССР ад 28 лістапада 1959 г. і прыкладзенай да яго інструкцыяй Упраўлення камунальнай гаспадаркі, Савета прафсаюзаў і Міністэрства юстыцыі ад 17 снежня 1959 г. жыллё ў першую чаргу павінна было выдзяляцца тым, хто меў ім вострую патрэбу, а таксама спецыялістам. Першая катэгорыя – гэта людзі, што жылі ў разбураных дамах,

[646] Жилищное законодательство. Минск, 1961. С. 147. Пазней з-за шматлікіх выключэнняў для розных галін эканомікі і сфер кіравання гэты фонд зноў скарацілі. Толькі пад час фарсіравання Хрушчовым жыллёвай палітыкі ў сувязі з пастановай Савета Міністраў СССР ад 14.10.1954 г. і Савета Міністраў БССР ад 20.10.1954 г. аднавілі фінансавыя інвестыцыі. Ад іх былі вызвалены толькі Міністэрства лёгкага машынабудавання і Міністэрства авіяцыйнай прамысловасці. Акрамя таго, вызваляліся ад інвестыцый дамы работнікаў сферы транспарту і камунікацый, радыёвяшчання, што знаходзіліся за рысай населеных пунктаў, а таксама інтэрнаты ВНУ і інтэрнаты для работнікаў, якія не мелі сем'яў. Тамсама, с. 148–149. У 1953 г. катэгорыя дэмабілізаваных абмяжоўвалася афіцэрамі Савецкай арміі ў адстаўцы. Пар. таксама: Чигир В. Ф. Советское жилищное право. Минск, 1968. С. 49, 77–78.

[647] Пар.: ч. 1.

падвалах, бараках, вільготных кватэрах, на кухнях камуналак і ў пакоях, якія яны дзялілі з іншымі сем'ямі. Да другой катэгорыі адносіліся тыя, хто займаў ключавыя пазіцыі ў партыйным апараце, органах улады і на прадпрыемствах, г. зн. кадравыя работнікі, маладыя спецыялісты (выпускнікі вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў) і перадавікі вытворчасці (стаханаўцы). Акрамя таго, дзяржава павінна была забяспечваць жыллём інвалідаў вайны і дэмабілізаваных. Адказнасць за прапіску і размеркаванне жылля ўскладвалася на камісіі, у якія на ўзроўні горада ўваходзілі супрацоўнікі выканкамаў, работнікі кватэрных упраўленняў, прадстаўнікі прафсаюзаў, а таксама рабочыя і служачыя раёнаў горада. На прадпрыемствах рашэнне аб выдзяленні жылля прымалася адміністрацыяй і партыйным камітэтам, а потым зацвярджалася выканкамам. У любым выпадку жылплошча, якая выдаткоўвалася, павінна была складаць 6–9 кв. м на чалавека[648].

Размеркаванне жылля (паводле інструкцыі ад 17 снежня 1959 г.) ажыццяўлялася па спісах чаргавікоў, якія вяліся ў райвыканкамах або па месцы працы. У чаргу на атрыманне жылля ставіліся наступныя катэгорыі грамадзян: а) якія не мелі жылля і здымалі прыватныя кватэры або туліліся ў часовым жыллі (баракі, разбураныя дамы, падвалы); б) якія жылі ў кухнях і калідорах камуналак, у вільготных кватэрах, а таксама ў пакоях з іншымі кватэраздымшчыкамі; в) жыллё якіх не адпавядала санітарнай норме; г) сем'і, якія жылі ў інтэрнатах, а таксама ў службовых і вытворчых памяшканнях; д) спецыялісты, якія працавалі па размеркаванні пасля заканчэння навучальнай установы; е) дэмабілізаваныя, якія падпадалі пад юрысдыкцыю выканкамаў і якім было неабходна даць жыллё на працягу паўгода. Да катэгорый, што не мелі права станавіцца на чаргу ў выканкаме для атрымання жылля, належалі наступныя грамадзяне: а) якія займаліся будаўніцтвам жылля ад міністэрстваў, ведамстваў і арганізацый; б) якія мелі прыватны дом; в) жыллёвыя ўмовы якіх адпавядалі санітарнай норме ў дзяржаўным сектары; г) якія жылі за рысай горада; д) якія мелі часовую прапіску[649].

[648] Жилищное законодательство. Минск, 1961. С. 132–141.

[649] Тамсама. С. 133–141. У больш позніх варыянтах інструкцыі рабілася адрозненне паміж кадравымі ваеннымі і салдатамі тэрміновай службы. Калі першай катэгорыі дазвалялася выбіраць месца жыхарства, то другая катэгорыя абавязана была вяртацца ў родны го-

Разам з гэтым інструкцыя ад 17 снежня 1959 г. зноў абавязвала прадпрыемствы і арганізацыі перадаваць у распараджэнне выканкамаў 10% новага жылля, пабудаванага без удзелу работнікаў дадзеных прадпрыемстваў. Гэтая доля па-ранейшаму павінна была аддавацца сем'ям загінулых і інвалідам вайны, а таксама дэмабілізаваным афіцэрам[650]. Акрамя таго, што выканкамы займаліся рашэннем жыллёвай праблемы, якая стаяла вельмі востра, яны мелі права распараджацца 5% жылля, што знаходзілася ў іх падпарадкаванні, па ўласным меркаванні. Гаворка ішла аб тых кватэрах, што незалежна ад спіса чаргавікоў выдзяляліся асобам, якія пакутавалі на туберкулёз, захворванні нервовай сістэмы і мелі патрэбу ў жыллі, наменклатурным работнікам у якасці службовага жылля, а таксама жыхарам, якія падпадалі пад высяленне ў рамках планавых мерапрыемстваў па рэканструкцыі горада[651].

Улічваючы той факт, што праз 15 гадоў пасля вайны па-ранейшаму востра стаяла пытанне забеспячэння жыллём сем'яў загінулых і інвалідаў вайны, можна зрабіць выснову, наколькі складанай была сітуацыя ў цэлым[652]. У выніку толькі кадравыя работнікі, спецыялісты, цяжкахворыя і тыя, што жылі ў абсалютна непрымальных умовах, мелі шанец атрымаць жыллё ў парадку выключэння без чаргі ці, па меншай меры, патрапіць у спіс чаргавікоў. Уладальнікі прымітыўных драўляных дамоў не маглі разлічваць на атрыманне добраўпарадкаванай кватэры ў новым доме. Ім было наканавана весці ў горадзе лад жыцця, які мала чым адрозніваўся ад жыцця ў вёсцы. У адзінокіх заставалася магчымасць атрымаць месца ў інтэрнаце або здымаць прыватнае жыллё. Студэнты ВНУ, вымушаныя здавальняцца часовай прапіскай, маглі дамагчыся паляпшэння свайго становішча толькі шляхам заключэння шлюбу з мінчанамі. Мігранты, у сваю чаргу, цалкам залежалі ад працадаўцы і нічога не маглі чакаць ад гарадскіх уладаў. У гэтай сувязі

рад або вёску. Пар.: Инструкция с дополнениями и изменениями от 10 октября 1962 г., 13 апреля 1963 г. и 3 февраля 1967 г. Жилищное законодательство. Минск, 1968. С. 153–173.

650 З 1954 г. пасля заканчэння службы ў Савецкай арміі радавым не заставалася нічога іншага, як вяртацца ў родныя мясціны.

651 Жилищное законодательство. Минск, 1961. С. 133–141.

652 Пар.: Fieseler B. Arme Sieger. Die Invaliden des "Großen Vaterländischen Krieges" der Sowjetunion 1941–1991. Köln / Weimar / Wien, 2006.

трэба таксама сказаць пра тое, што на прадпрыемствах ляжаў цяжар абавязку аддаваць частку жылплошчы. Да "дзесяціны", якую пасля вайны яны павінны былі ўносіць у фонд выканкамаў, у адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў БССР ад 3 сакавіка 1959 г., дадалося яшчэ 10%, якія ішлі ў Міністэрства будаўніцтва на забеспячэнне жыллём будаўнікоў[653]. З прычыны гэтага ў дамах жылі прадстаўнікі розных прафесій.

Дзякуючы агульнаму паляпшэнню ўзроўню жыцця і развіццю савецкай сацыяльнай палітыкі ў Жыллёвым кодэксе БССР ад 22 снежня 1983 г. па-новаму былі вызначаны катэгорыі грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, і грамадзян, якія маюць ільготы на першачарговае атрыманне жылля. Да іх адносіліся: а) асобы, жылая плошча якіх была значна ніжэйшая за санітарную норму; б) асобы, якія жылі ў доме, што не адпавядаў тэхнічным і санітарным нормам; в) асобы, якія жылі ў камунальных кватэрах разам з хранічна хворым членам сям'і; г) асобы рознага полу, якія не былі сваякамі, не былі ў шлюбе, але жылі ў адным пакоі; д) асобы, якія доўга жылі ў інтэрнаце пасля заканчэння вучобы; е) асобы, якія доўгі час якія здымалі прыватнае жыллё. Акрамя таго, да тых, што мелі патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, адносіліся асобы, чые заслугі перад Радзімай былі высока ацэнены і хто меў патрэбу ў сацыяльнай дапамозе: а) інваліды вайны і сем'і загінулых; б) Героі Савецкага Саюза; в) цяжкахворыя; г) удзельнікі вайны; д) інваліды працы; е) члены сем'яў загінулых пры выкананні службовага абавязку; ё) перадавікі вытворчасці; ж) маці-гераіні; з) сем'і, якія мелі блізнят[654]. З аднаго боку, кодэкс змяшчаў толькі расплывістыя фармулёўкі, якія, аднак, дазваляюць выказаць здагадку пра памеры жыллёвага крызісу і яго наступствы. Відавочна, што значная частка беларускага насельніцтва на працягу доўгага часу тулілася ў часовым жыллі. З іншага боку, ідэалагічныя перадумовы савецкай сацыяльнай палітыкі адлюстроўваліся ў сістэме прывілеяў. Так, выяўлялася асаблівая павага да ветэранаў вайны і партызанаў, а таксама прапагандавалася асаблівае стаўленне да шматдзетных маці.

[653] Жилищное законодательство. Минск, 1961. С. 147–148. Сюды не ўваходзілі толькі інтэрнаты ВНУ, дамы работнікаў транспарту, а таксама Міністэрства прамысловасці будаўнічых матэрыялаў.

[654] Жилищный кодекс Белорусской ССР, §§ 34, 44.

## б) Дэфіцыт жылплошчы і патрэба ў жыллі

Няма ніякага сумневу ў тым, што кватэрнае пытанне было галоўнай праблемай савецкай рэчаіснасці. Пасля вайны і аж да распаду СССР мінчане пастаянна сутыкаліся з недахопам жылля. На працягу двух пасляваенных дзесяцігоддзяў існавала меркаванне, што мець асобную кватэру – штосьці нерэальнае. У 1940-я гг. жыллё часта можна было знайсці толькі ў бараках ці разбураных дамах, у 1950-я гг. людзі жылі ў перапоўненых камуналках, інтэрнатах і прымітыўных драўляных дамах. Толькі з 1960-х гг. насельніцтва пачало марыць пра невялікія добраўпарадкаваныя кватэры. Паколькі аж да 1970-х гг. не было агульнага спіса чаргавікоў для ўсіх жыхароў горада, то меркаваць пра колькасць чалавек, якія мелі патрэбу ў жыллі, можна па той частцы насельніцтва, што стаяла на чарзе ў райвыканкамах[655]. Да пачатку масавага жыллёвага будаўніцтва пры Хрушчове ў падпарадкаванні апошніх знаходзілася, аднак, менш за трэцюю частку гарадскога жылога фонду.

Тым больш паказальна ў гэтых умовах, што колькасць людзей, якія строга адпавядалі патрабаванням для пастаноўкі на чаргу ў райвыканкамах, за дзесяць гадоў (1950–1960) павялічылася больш чым у тры разы – прыблізна з 3 да амаль 10 тыс. (табліца 20). Пры гэтым трэба ўлічваць двaістасць сітуацыі. З аднаго боку, прадпрыемствы адказвалі за забеспячэнне жыллём большасці насельніцтва. З іншага боку, адказнасць райвыканкамаў распаўсюджвалася не толькі на тых, што афіцыйна стаялі ў чарзе на атрыманне кватэры, але і на асоб, якія патэнцыйна мелі патрэбу ў жыллі. Так, згодна з недатаванай справаздачай гаркама партыі, акрамя 3016 сем'яў, якія стаялі на чарзе на 1 снежня 1950 г., было яшчэ 1860 сем'яў, або 7167 чалавек, якія жылі ў дамах пад знос, а таксама 373 сям'і з зямлянак і падвалаў і 203 сям'і з тэрыторый ваенных гарадкоў. Усяго выканкамы павінны былі даць кватэры 5452 сем'ям[656]. Да 1956 г.

[655] Сістэматычны ўлік тых, што мелі патрэбу ў жыллі, на самай справе стаў праводзіцца толькі пасля 1950 г., калі пачаліся карэнныя перамены ў будаўнічай галіне. Адна з першых спасылак на гэта знаходзіцца ў архіўным фондзе за 1946 г.: у недатаваным лісце старшыня Мінгарвыканкама паведамляў сакратару гаркама партыі пра недахоп жылля пасля вяртання эвакуяваных і дэмабілізаваных. 2150 сем'яў, якія туліліся ў калідорах і "времянках", падалі заявы на атрыманне жылля. ДАМВ, ф. 6, воп. 4, спр. 143, арк. 384–387.

[656] ДАМВ, ф. 69, воп. 1, спр. 616, арк. 54–57. Пра гэта ішла гаворка ў справаздачы намесніка старшыні Мінгарвыканкама і загадчыка аддзела планавання гаркама партыі за травень 1952 г. Да 3351

суадносіны змянілася неістотна: да 6911 сем'яў, якія стаялі на чарзе, дадалося, згодна са справаздачай старшыні Мінгарвыканкама В. І. Шарапава, яшчэ 2174 сям'і з дамоў пад знос і 1372 сям'і з 82 непрыдатных для пражывання баракаў, пабудаваных з гафрыраванай ліставой сталі. Такім чынам, у 1956 г. выканкамы павінны былі забяспечыць жылплошчай 10 457 сем'яў[657].

**Табліца 20.** Колькасць чаргавікоў на атрыманне жылля ў спісе Мінгарвыканкама ў 1950–1960 гг.

| 01.12.1950 г. | 01.05.1952 г. | 01.01.1954 г. | 01.01.1956 г. | 01.01.1957 г. | 01.02.1959 г. | 01.01.1960 г. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 3016 | 3351 | 4772 | 6911 | 7229 | 8115 | 9767 |

*Крыніцы:* ДАМВ, ф. 69, воп. 1, спр. 616, арк. 54–57; ДАМВ, ф. 2631, воп. 1, спр. 53, арк. 5; НАРБ, ф. 7, воп. 4, спр. 1797, арк. 204; НАРБ, ф. 911, воп. 1, спр. 276, арк. 4; ДАМВ, ф. 1035, воп. 1, спр. 638, арк. 114.

Паколькі жыллёвыя ўмовы ў ведамасных і выканкамаўскіх дамах адрозніваліся неістотна, трэба зыходзіць з таго, што толькі трэцяя частка асоб, якія афіцыйна лічыліся маючымі патрэбу ў жыллі, знаходзілася ў спісах чаргавікоў райвыканкамаў. У дадзеным выпадку гаворка ішла, як правіла, пра сем'і, таму зразумела, што на самай справе тых, што мелі патрэбу ў жыллі, было ў тры-чатыры разы больш. Гэтая здагадка пацвярджаецца вынікамі Усесаюзнай інвентарызацыі жыллёвага фонду ад 1 студзеня 1960 г. На той час у спісах чаргавікоў на кватэру ў Мінску стаяла 7987 сем'яў і 1780 адзінокіх. Усяго ж гаворка ішла пра 28 162 чал. Яны наогул не мелі якога-небудзь жылля або жыллё было з плошчай менш за 4 кв. м на чалавека. Акрамя гэтых сем'яў, у трох з чатырох раёнаў горада было зарэгістравана 4858 сем'яў, або 18 476 чалавек, якія жылі ў старых бараках. Разам з гэтым выканкамы павінны былі забяспечыць работнікаў прадпрыемстваў, якія не мелі свайго жылля. Да гэтай катэгорыі адносіліся 26 495 сем'яў і 5932 адзінокіх (91 375 чалавек). Такім чынам, 39 350 сем'яў і 7712 адзінокіх або зусім не мелі жылля, або былі вымушаны туліцца на мізэрнай жылой плошчы. Усяго ў жыллі востра мелі патрэбу 138 013 чалавек (табліца 21). Пры агульным насельніцтве 538 500 жыхароў гэта адпавядала 25,6%. Але асобы, якія мелі патрэбу ў жыллі (а за іх забеспячэнне жылплошчай адказвалі прадпрыемствы), не былі ўлічаны.

сем'і ў спісе чаргавікоў дадалася яшчэ 1251 сям'я з дамоў пад знос і 452 сям'і, што жылі ў зямлянках, падвалах і калідорах. ДАМВ, ф. 2631, воп. 1, спр. 53, арк. 1–23, тут арк. 5.

657 НАРБ, ф. 7, воп. 4, спр. 1797, арк. 204–218, тут арк. 210.

**Табліца 21.** Асобы, якія мелі патрэбу ў жыллі і былі зарэгістраваны ў выканкамах Мінска на 1 студзеня 1960 г.

а) Звесткі пра чаргавікоў у выканкамах Мінска на 1 студзеня 1960 г.

| Катэгорыі | Сем'і | Адзінокія | Усяго |
|---|---|---|---|
| без жылля | 5084 | 1060 | 17942 |
| мелі жылплошчу менш за 4 кв. м на чалавека | 2802 | 714 | 9911 |
| іншыя | 101 | 6 | 309 |
| Усяго: | 7987 | 1780 | 28162 |

б) Жыхары баракаў і дамоў пад знос у Мінску на 1 студзеня 1960 г.

| Раён* | Сем'і | Адзінокія | Усяго |
|---|---|---|---|
| Варашылаўскі | 1802 | – | 6322 |
| Кастрычніцкі | 1835 | – | 7794 |
| Фрунзенскі | 1231 | – | 4360 |
| Усяго: | 4868 | – | 18476 |

в) Работнікі мінскіх прадпрыемстваў без ведамаснага жылля на 1 студзеня 1960 г.

| Раён | Сем'і | Адзінокія | Усяго |
|---|---|---|---|
| Варашылаўскі | 9306 | 1101 | 33213 |
| Сталінскі | 12351 | 3811 | 42569 |
| Кастрычніцкі | 2909 | 518 | 9811 |
| Фрунзенскі | 1929 | 502 | 5782 |
| Усяго: | 26 495 | 5932 | 91375 |

г) Дэфіцыт жылля ў Мінску (без уліку прадпрыемстваў, якія мелі сваё жыллё) на 1 студзеня 1960 г.

| Катэгорыі | Сем'і | Адзінокія | Усяго |
|---|---|---|---|
| без жылля | 22529 | 6524 | 79957 |
| якія мелі жылплошчу менш за 4 кв. м на чалавека | 12447 | 900 | 42231 |
| іншыя | 4347 | 288 | 15825 |
| Усяго: | 39350 | 7712 | 138013 |

* Сталінскі раён у арыгінале не быў улічаны.

*Крыніца:* ДАМВ, ф. 1035, воп. 1, спр. 638, арк. 113–114.

Як паказвае прыклад з 1950 г., людзі, якія мелі патрэбу ў жыллі, не надта шмат выйгралі ад таго, што іх паставілі на

чаргу ў райвыканкамах. На больш чым 3 тыс. месцаў спіса прэтэндавалі нароўні з іншымі 1318 сем'яў дэмабілізаваных і вайскоўцаў, 520 сем'яў загінулых і 434 сям'і інвалідаў вайны[658]. Аднак жылплошчы не хапала нават для забеспячэння гэтай часткі насельніцтва, што па законе мела прывілеі. Як вынікае са справаздачы старшыні Мінгарвыканкама К. Н. Длугашэўскага і сакратара гаркама партыі К. Т. Мазурава, у 1949 г. магло быць выдзелена толькі 400 кватэр, у 1950 г. – 239 кватэр[659]. У адпаведнасці з гэтым чакаць даводзілася доўга: з 3016 сем'яў, якія стаялі на чарзе на 1 снежня 1950 г., 88 былі пастаўлены на чаргу ў 1945 г., 348 – у 1946 г., 436 – у 1947 г., 547 – у 1948 г., 685 – у 1949 г., 894 – у 1950 г.[660]. У 1950-я гг. сітуацыя значна абвастрылася, бо райвыканкамы ў гэты час не выступалі ў якасці будпадрадчыкаў, а выкарыстоўвалі толькі "дзесяціну", якую ім павінны былі перадаваць прадпрыемствы, што займаліся будаўніцтвам жылля.

У такіх умовах не ў лепшым становішчы былі ў першую чаргу дзяржслужачыя – дактары, педагогі, пажарныя і міліцыянеры. Як вынікае са справаздачы начальніка міліцыі г. Мінска ад 17 снежня 1948 г., 322 з 1300 міліцыянераў з сем'ямі ад двух да пяці чалавек не мелі асобных кватэр; 265 міліцыянераў малодшага саставу туліліся ў дамах без выгод, прызначаных пад знос. У 1948 г. 400 міліцыянераў з сем'ямі былі вымушаны жыць за межамі горада[661]. У лісце за 1962 г. міністр унутраных спраў БССР А. Н. Аксёнаў давёў да ведама старшыні Мінгарвыканкама В. І. Шарапава, што 1405 сем'ям ахоўнікаў парадку не хапала жылплошчы. 687 сем'яў жылі сумесна з трыма-чатырма іншымі кватэраздымшчыкамі на плошчы менш за 4 кв. м на чалавека, 302 сям'і – у падвалах, 254 сям'і здымалі кватэры ў прыватным сектары, а 162 сям'і былі вымушаны здавольвацца пражываннем у бараках[662].

[658] ДАМВ, ф. 69, воп. 1, спр. 616, арк. 54–57. У 1956 г. гаворка ішла пра 1133 членаў сем'яў загінулых і інвалідаў вайны, 860 дэмабілізаваных афіцэраў, 220 сем'яў з хворымі на туберкулёз і 117 рэабілітаваных. НАРБ, ф. 7, воп. 4, спр. 1797, арк. 204–218, тут арк. 207.

[659] ДАМВ, ф. 69, воп. 1, спр. 615, арк. 44–46.

[660] ДАМВ, ф. 69, воп. 1, спр. 616, арк. 54–57.

[661] ДАМВ, ф. 69, воп. 1, спр. 255, арк. 49.

[662] ДАМВ, ф. 6, воп. 3, спр. 223, арк. 39–40. Паводле спіса акружнога ваеннага камісарыята, 18 кастрычніка 1955 г. у Мінску налічвалася 1267 афіцэраў, якія дэмабілізаваліся з арміі пасля 14 красавіка 1953 г. Жылплошчай былі забяспечаны толькі 814 афіцэраў (з іх 144 з

Нягледзячы на такое бядотнае становішча, па дадзеных афіцыйнай статыстыкі, якая зыходзіла з росту паказчыкаў у жыллёвым будаўніцтве, у 1960-я гг. у Мінску змаглі палепшыць свае жыллёвыя ўмовы 685 тыс. чалавек, а ў 1970-я гг. – 844 тыс. Пры гэтым колькасць кватэр у новых дамах вырасла адпаведна больш чым на дзве трэція (табліца 22). Гэтыя лічбы сведчаць: карэнныя жыхары рэгулярна паляпшалі свае жыллёвыя ўмовы і забеспячэнне жыллём мігрантаў адбывалася бесперабойна. Аднак такое ўяўленне зманлівае: хоць, паводле афіцыйных заяў, рашэнне жыллёвага пытання ў Мінску прасоўвалася наперад, у жыхароў горада пастаянна ўзнікалі прычыны для скаргаў. Скаргі і хадайніцтвы, якія тысячамі накіроўваліся ў самыя розныя партыйныя і дзяржаўныя інстанцыі, адлюстроўваюць рэальныя патрэбы і праблемы насельніцтва. Мінгарвыканкам падлічыў колькасць зваротаў за 1965–1966 гг. і сістэматызаваў іх па змесце. Вынік гаворыць сам за сябе: з 35 439 скаргаў 16 010 (45,2%) тычыліся жыллёвых умоў, а 2051 (5,8%) – прапіскі. Іншымі словамі, палова зваротаў была звязана з пытаннем прапіскі і жылля ў горадзе. 4783 звароты (13,5%) закраналі пытанні грамадскага парадку, а 2998 (8,4%) – інфраструктурныя недахопы. Такім чынам, пятая частка скаргаў датычылася канфліктаў і недахопаў у межах горада. Грунтуючыся на гэтых дадзеных, можна сцвярджаць, што доля зваротаў аб аказанні дапамогі па іншых пытаннях была нязначнай і складала 4103, або 11,6%[663].

**Табліца 22.** Колькасць мінчан, якія палепшылі свае жыллёвыя ўмовы ў Мінску (у тыс.).

| | Усяго | З іх | |
|---|---|---|---|
| | | Новабудоўлі | Старыя дамы |
| 1960–1965 гг. | 261 | 171 | 90 |
| 1965–1970 гг. | 424 | 290 | 134 |
| 1971–1975 гг. | 461 | 318 | 143 |
| 1976–1980 гг. | 383 | 260 | 123 |
| 1981–1985 гг. | 384 | 256 | 128 |

*Крыніца:* Народное хозяйство города Минска в одиннадцатой пятилетке. Минск, 1986 (Минское управление по статистике). С. 119.

дзесяціпрацэнтнага асобага фонду Мінгарвыканкама), 107 афіцэраў атрымалі зямельныя ўчасткі, 435 афіцэраў стаялі ў чарзе на кватэру. ДАМВ, ф. 69, воп. 1, спр. 1037, арк. 34.

663 ДАМВ, ф. 6, воп. 3, спр. 495, арк. 193–195.

Маштабы недахопу жылля можна ўявіць, калі ўлічыць попыт. Іншымі словамі, колькасць кватэр у новых дамах павінна быць супастаўлена з колькасцю людзей, якія мелі патрэбу ў жыллі. Апошняя складаецца, з аднаго боку, з колькасці зарэгістраваных і скасаваных шлюбаў і, з другога боку, з колькасці мігрантаў з іншых рэгіёнаў (навапераселенцаў). На аснове гэтых разлікаў можна вызначыць адмоўную тэндэнцыю: паколькі ў перыяд з 1950 да 1990 г. колькасць зарэгістраваных і скасаваных шлюбаў павялічылася адпаведна з 5254 да 16 563 і з 212 да 8043, трэба зыходзіць з таго, што колькасць маючых патрэбу ў жыллі сем'яў і разведзеных у 1950-я гг. складала ў сярэднім 8 тыс. чалавек на год, у 1960-я гг. – 10 тыс., у 1970-я гг. – 18 тыс. і ў 1980-я гг. – 22 тыс.[664]. Сюды адносіліся таксама навапераселенцы, якія большай часткай жылі ў інтэрнатах або здымалі жыллё. Таму гэты прыклад абмяжоўваецца фактычнай колькасцю мігрантаў, якая ў 1950-я гг. у сярэднім складала 18 тыс. чалавек, у 1960-я гг. – 22 тыс. чалавек, у 1970-я гг. – 28 тыс. чалавек і ў 1980-я гг. – 17 тыс. чалавек (гл. дадатак, табліца VIII). У адпаведнасці з гэтым, беручы пад увагу стварэнне новых сем'яў пасля разводаў і сем'і мігрантаў, у 1950-я гг. у сярэднім патрабавалася каля 20 тыс. кватэр, у 1960-я гг. – каля 25 тыс., у 1970-я і 1980-я гг. – у сярэднім 30 тыс. Фактычна ў 1960-я гг. было пабудавана толькі каля 13 тыс. кватэр, у 1970-я гг. – прыблізна 16 300 і ў 1980-я гг. – парадку 15 200; што тычыцца 1950-х гг., то дадзеных за той перыяд няма (табліца XVIII). Грунтуючыся на гэтым, можна зрабіць выснову: штогадовы дэфіцыт кватэр павялічыўся з 12 тыс. у 1960-я гг. да 14 тыс. у 1970-я гг. і да 15 тыс. у 1980-я гг.

Тое, што бядотнае становішча на рынку жылля беларускай сталіцы ніякім чынам не магло быць палепшана з дапамогай будаўніцтва мікраараёнаў з "хрушчоўкамі", партыйнаму і дзяржаўнаму кіраўніцтву стала зразумела толькі на рубяжы 1960–1970-х гг., г. зн. значна пазней, чым яны паведамілі пра рашэнне гэтай праблемы ў рамках праграмы масавага жыллёвага будаўніцтва 1957 г. і праграмы партыі 1961 г. 27 лютага 1969 г. сакратар Мінскага гаркама КПБ В. І. Шарапаў і старшыня Мінгарвыканкама М. В. Кавалёў давялі да ведама ЦК КПБ, што 72 тыс. сем'яў мелі патрэбу ў кватэрах. У той жа час

664 Население и здравоохранение города Минска. Статистический сборник. Минск, 1997. С. 19.

яны паведамілі, што яшчэ 26 тыс. сем’яў, якія жылі ў “времянках” на тэрыторыях, дзе было запланавана будаўніцтва, а таксама ў дамах пад знос, у хуткім часе ў сувязі з высяленнем трэба забяспечыць жыллём. Акрамя гэтага, варта ўлічваць той факт, што кожны год ствараласся 35 тыс. сем’яў[665]. 14 траўня 1974 г. сакратар гаркама партыі Ляпёшкін праінфармаваў ЦК КПБ, што ў спісах чаргавікоў на атрыманне кватэры ў райвыканкамах горада значацца 12 367 сем’яў, а ў спісах чаргавікоў прадпрыемстваў – 60 386 сем’яў. Да 1973 г. у чарзе на жыллё стаялі людзі, індывідуальная жылая плошча якіх не перавышала 5 кв. м. З 1973 г. у чаргу пачалі ставіць у выпадку, калі індывідуальная жылая плошча не перавышала 6 кв. м. Разам з 72 553 сем’ямі, якія павінны былі атрымаць жылплошчу ад дзяржавы, існавала яшчэ 18 017 сем’яў, якія з 1971 г. стаялі на чарзе на будаўніцтва кватэр у 334 жыллёва-будаўнічых кааператывах, агульны спіс якіх вёўся з 1971 г. Аднак магчымасці кааператываў дазвалялі штогод будаваць і размяркоўваць толькі 3500 кватэр[666]. Зыходзячы з сярэдняга памеру сям’і ў 3,5 чалавека, можна зрабіць выснову, што ў Мінску да канца 1970-х гг. чвэрць насельніцтва мела патрэбу ў жыллі.

Праблему можна праілюстраваць на прыкладзе 1975 г. З аднаго боку, было пабудавана 15 900 кватэр; з другога – зарэгістравана 13 499 шлюбаў, 4737 шлюбаў скасавана[667], а таксама налічвалася 67 845 новаперасяленцаў (гл. дадатак, табліца VIII; у гэтым выпадку варта прыняць да ўвагі 41 853 выбылых з Мінска)[668]. Аднак афіцыйная статыстыка абмежавалася тым, што прывяла лічбы, у адпаведнасці з якімі ў 1975 г. 82 тыс. чалавек палепшылі свае жыллёвыя ўмовы: 56 000 чалавек усяліліся ў новыя дамы, 26 тыс. чалавек пераехалі ў кватэры старога жыллёвага фонду[669]. Калі зыходзіць з гэтых дадзеных, то можа скласціся ўражанне, быццам сапраўды вялікая колькасць мінчан палепшыла жыллёвыя ўмовы. Аднак лічбы не адлюстроў-

[665] ДАМВ, ф. 69, воп. 7, спр. 46, арк. 19–22.
[666] ДАМВ, ф. 69, воп. 12, спр. 31, арк. 6–15.
[667] Население и здравоохранение города Минска… С. 19.
[668] Звесткі пра колькасць пабудаваных кватэр з: Народное хозяйство Белорусской ССР в 1986 г. Статистический ежегодник. Юбилейный выпуск к 70-летию Великого Октября. Минск, 1987. С. 203.
[669] Народное хозяйство города Минска в одиннадцатой пятилетке. Минск, 1986 (Минское управление по статистике). С. 119.

ваюць таго, што з пачаткам масавага жыллёвага будаўніцтва аўтаматычна паўстаў дысбаланс паміж прапановай і попытам. Адным словам людзі, якія мелі патрэбу ў жыллі і ў 1975 г. сталі на чаргу, засталіся ні з чым. Урэшце агульны дэфіцыт жылля ў Мінску выяўляўся таксама ў тым, што толькі ў 1989 г. санітарная норма індывідуальнай жылой плошчы перасягнула рубеж 9 кв. м, і гэта было зафіксавана ў час апошняга перапісу насельніцтва СССР (табліца 16).

### в) Размеркаванне кватэр

Пра рассяленне мінчан у разбураным горадзе і выкарыстанне ацалелых жылых дамоў пасля вайны нічога невядома. Мяркуючы па ўсім, адпрацаванага механізму размеркавання жылля не было. Прынамсі, у архіўных справах згадкі пра гэта няма. Справаздачы ў адпаведнасці са службовымі інструкцыямі і праверкі рэвізораў з'явіліся толькі з пачаткам хрушчоўскай эры. Аб кіраванні жылым фондам у перыяд позняга сталінізму можна меркаваць па скаргах насельніцтва, у якіх адлюстроўваецца лёс асобных людзей. Відавочна, што старшыні выканкамаў дапускалі самавольства. Два паказальныя выпадкі выдзялення кватэр сведчаць, што недатыкальнасць жылля ў пасляваенны час ніякім чынам не гарантавалася. У першым прыкладзе гаворка ідзе пра абвінавачванне ў супрацоўніцтве з акупантамі, у другім – пра наступствы эвакуацыі.

Прыклад 1. Удава афіцэра жыла ў пакоі плошчай 18 кв. м у доме № 24 па вул. Рэвалюцыйнай. Паколькі ў час вайны яна з 13-гадовым сынам-інвалідам знаходзілася ў акупаваным горадзе і не прымала ўдзелу ў падпольнай барацьбе, гэта было плямай у яе біяграфіі з пункту гледжання ўлады. Патрапіўшы ў верасні 1944 г. у жорны савецкай бюракратыі, яна тым не менш вырашыла абараняць свае правы, прычым падала скаргу на імя самога Сталіна. Скарга напісана ў адкрытым, але грубым тоне. Відаць, што пісаў неадукаваны чалавек. У кастрычніку 1944 г. скарга трапіла ў Мінскі гарадскі камітэт КП(б)Б. У ёй паведамлялася, што ўвечары 24 верасня 1944 г. да жанчыны прыйшоў старшыня выканкама Варашылаўскага раёна А. Д. Юркевіч і выселіў яе з пакоя, сказаўшы перанесці рэчы на кухню. Потым ён засяліў у гэты пакой супрацоўніка гаркама партыі Клявакіна. 25 верасня ўдава афіцэра падала скаргу на імя пракурора, аднак ёй не пайшлі насустрач. Замест гэтага ваенны пракурор паведаміў, што ёй прапануюць іншы, мен-

шы пакой[670]. Як вынікае з адказу супрацоўніка Мінгарвыканкама ад 31 кастрычніка, з часу вызвалення горада ўдава нідзе афіцыйна не працавала. Хоць яна павінна была перасяліцца ў іншы пакой у тым жа доме, яна катэгарычна адмовілася пакідаць свой пакой[671]. У гэтым выпадку хапіла трох аргументаў, каб умяшацца ў прыватнае жыццё: няўдзел у падпольнай барацьбе ў час нямецкай акупацыі, няўдзел у аднаўленні горада, а таксама тое, што прапанаваная наўзамен жылая плошча адпавядала санітарнай норме.

Прыклад 2. Па рашэнні Мінгарвыканкама жанчыну, якая вярнулася з эвакуацыі ў чэрвені 1947 г., выселілі з кватэры. Сітуацыя прасвятлілася дзякуючы заключэнню, якое ў красавіку 1949 г. загадчык аддзела грамадскіх арганізацый Мінскага гаркама партыі перадаў у Мінгарвыканкам. Згодна з заключэннем, у кватэры жанчыны часова пасялілі супрацоўніка дзяржаўнай бяспекі. Пасля таго як у кастрычніку 1947 г. ён выпісаўся, райвыканкам вырашыў перадаць гэтую кватэру інваліду вайны. Першапачатковая кватэранаймальніца паспрабавала аднавіць свае правы, звярнуўшыся ў розныя інстанцыі. 28 снежня 1947 г. яна напісала Сталіну, а 27 траўня 1948 г. і 31 студзеня 1949 г. звярнулася да першага сакратара ЦК КП(б)Б М. І. Гусарава. Апошні перадаў адну з яе заяў з просьбай аб дапамозе ў гарвыканкам і райвыканкам. Хоць была магчымасць прапанаваць жанчыне іншы, меншы, пакой, старшыня Мінгарвыканкама К. Н. Длугашэўскі быў непахісны. На думку Длугашэўскага, грамадзяне, якія чакалі сваёй чаргі з 1945 г., мелі большае права на атрыманне кватэры, чым тыя, што звярнуліся са скаргай да партыйнага кіраўніцтва. У гэтай сітуацыі жанчына вырашыла выкарыстаць апошнюю магчымасць і напісала ліст у "Советскую Белоруссию"[672]. З аднаго боку, гэты прыклад сведчыць, што мясцовыя "князькі" былі непадкантрольнымі і займаліся самавольствам. З іншага боку відавочна, што насельніцтва разлічвала на дапамогу палітычнага кіраўніцтва і грамадскасці.

Парушэнні пры выдзяленні жылля былі ўпершыню адзначаны гарвыканкамам і райвыканкамамі ў справаздачы, якую міністр дзяржкантролю БССР А. Кулікоў накіраваў у ЦК

[670] ДАМВ, ф. 69, воп. 1, спр. 9, арк. 214–215.
[671] Тамсама, арк. 218.
[672] ДАМВ, ф. 69, воп. 1, спр. 427, арк. 5–6.

КПБ і Савет Міністраў БССР адпаведна 15 і 18 чэрвеня 1955 г. Кватэры даваліся людзям, якія не мелі патрэбы ў паляпшэнні жыллёвых умоў і не стаялі на чарзе. Асобы, якія мелі патрэбу, не атрымлівалі нічога, нягледзячы на тое, што яны знаходзіліся ў спісе чаргавікоў. На працягу першых адзінаццаці месяцаў 1954 г. выканкамы выдзелілі 17 397 кв. м жылля 978 сем'ям. Наколькі гэтага было недастаткова, сведчыць той факт, што на 1 снежня 1954 г. яшчэ 4772 сям'і чакалі сваёй чаргі на жыллё. З прычыны такога становішча кожнае няправільнае рашэнне пагаршала сітуацыю. Мінгарвыканкам выдзеліў 396 кв. м жылля 22 чалавекам, якія не стаялі на чарзе, а выканкамы Ленінскага і Варашылаўскага раёнаў выдзелілі па-за чаргой адпаведна 460 кв. м жылля 19 чалавекам і 261 кв. м 15 чалавекам. Такое рашэнне Мінгарвыканкама старшыня выканкама Ленінскага раёна К. А. Печанко ў лісце ад 10 чэрвеня 1954 г. на імя сакратара Мінскага гаркама КПБ І. Д. Варвашэні назвала "сістэматычным падманам працоўных органамі Савецкай улады"[673].

Паказальныя наступныя прыклады супрацьзаконнага выдзялення жылля, згаданыя ў справаздачы: 1. Атрыманую 13 лютага 1953 г. ад Мінгарвыканкама кватэру па праспекце Сталіна, 13 бацька пакінуў сваім дочкам, пераехаўшы 22 снежня 1954 г. у свой дом. 2. 13 лютага 1953 г. шлюбная пара атрымала ад Мінгарвыканкама двухпакаёвую кватэру плошчай 31 кв. м па праспекце Сталіна, 13, хоць яны не стаялі ў спісе чаргавікоў. Муж быў асуджаны ў 1948 г. на пяць гадоў пазбаўлення волі і памілаваны ў 1951 г. Ён атрымаў пасаду інжынера ва Упраўленні па справах архітэктуры, аднак працаваў фатографам, пры гэтым займаўся асабістымі справамі ў службовы час. 3. Калі ў студзені 1954 г. вызвалілася двухпакаёвая кватэра плошчай 28 кв. м па праспекце Сталіна, 13, перавагу аддалі сям'і в. а. начальніка гарадскога кватэрнага ўпраўлення з 4 чалавек, у той час як сям'і інваліда вайны з 4 чалавек быў выдзелены пакой плошчай 14,5 кв. м у камунальнай кватэры па праспекце Сталіна, 19, дзе раней жыла сям'я в. а. начальніка кватэрнага ўпраўлення. 4. 7 верасня 1954 г. выканкам Варашылаўскага раёна выдзеліў сям'і начальніка кватэрнага ўпраўлення з 4 чалавек кватэру плошчай 37,3 кв. м, хоць гэтая сям'я з 1949 г. жыла ў пакоі плошчай 19,5 кв. м і не стая-

[673] НАРБ, ф. 690, воп. 11, спр. 190, арк. 35–50, 51–64.

ла на чарзе. Без дазволу выканкама ў гэты пакой засяліўся рабочы паліграфічнага камбіната. Пры гэтым абышлі прыбіральшчыцу, якая стаяла на чарзе і жыла з сям'ёй з 5 чалавек у падвальным памяшканні плошчай 7 кв. м. 5. Адзінокі аспірант лесатэхнічнага інстытута меў трохпакаёвую кватэру плошчай 61,2 кв. м, у якую ўзяў 4 кватарантаў. 6. Пасля смерці актрысы драматычнага тэатра ў траўні 1954 г. тэатр здаваў яе кватэру розным людзям, якія не мелі прапіскі і не плацілі кватэрнай платы. 7. Пасля пераезду мужчына адмовіўся здаць ключы ад сваёй былой кватэры плошчай 61,5 кв. м і здаваў яе ў наём васьмі чалавекам[674].

Людзі, якія мелі патрэбу ў жыллі, у гады “адлігі” маглі звяртацца са скаргамі да мясцовых партыйных кіраўнікоў і адказных работнікаў[675]. 15 траўня 1956 г. мінчанін чарговы раз напісаў скаргу Хрушчову па кватэрным пытанні. У пачатку ліста ён наракаў на тое, што яго скаргі не даходзяць да адрасата. Лісты, якія ён пасылаў праз гарвыканкам, не выходзілі за межы горада, а ліст ад 8 сакавіка, накіраваны ў прыёмную Хрушчова ў Маскве, быў вернуты ў Мінгарвыканкам для далейшага разгляду. Далей ён скардзіўся на тое, што атрымаў выклік ад 26 красавіка з'явіцца на паседжанне райвыканкама Ленінскага раёна, прызначанае на 8 траўня, дзе павінна была разглядацца яго скарга. З прычыны таго, што некалькімі днямі пазней ён атрымаў датаваны 28 красавіка ліст за подпісам старшыні выканкама, у якім паведамлялі, што пытанне аб выдзяленні яму кватэры будзе разгледжана ў парадку чаргі, у яго ўзнікла пытанне, навошта яго наогул запрасілі на паседжанне. Свой адказ мінчанін сфармуляваў шчыра, у духу прамовы Хрушчова па развянчанні культу асобы Сталіна на XX з'ездзе партыі: “Гэты факт сведчыць пра аднаасобніцкі стыль кіраўніцтва, пра культ асобы старшыні райвыканкама таварыша Печанко”. Толькі пасля таго, як такім чынам мінчанін паквітаўся з уціскам наменклатуршчыкаў, ён вярнуўся да свайго пытання: расказаў, што жыве з жонкай і пяццю дзецьмі ва ўзросце ад аднаго да пятнаццаці гадоў у пакоі плошчай 12 кв. м (з кухняй) у бараку на вуліцы Першамайскай, і пры гэтым засумняваўся, што гэта

[674] НАРБ, ф. 690, воп. 11, спр. 190, арк. 35–50, 51–64.
[675] Пар.: Kulavig E. Give Us Decent Homes! // ён жа. Dissent in the Years of Khrushchev. Nine Stories about Disobedient Russians. Houndmills / New York, 2002. P. 41–51.

адпавядае ўмовам жыцця ў сацыялістычным грамадстве, дзе ўрад лічыцца з жыллёвымі праблемамі працоўных. Мінчанін дазволіў сабе пакрытыкаваць сістэму і выказаў сваё абурэнне воклічамі: "Гэта ж падобна на стаўленне магнатаў да жыцця асобных катэгорый рабочых у краінах капіталу!" Спасылаючыся на ліст старшыні выканкама, мінчанін пісаў, што канца чаргі пакуль не відаць, хоць ён ужо пяць гадоў стаіць у спісе чаргавікоў. Таму ён выказаў крытыку ў дачыненні да таго, што курс Хрушчова не ператвараецца ў жыццё: "У мясцовых органах Савецкай улады традыцыя аднаасобнага стылю кіравання яшчэ не выкаранена. Замест гэтага парушаюцца нормы партыйнага жыцця і калектыўнага кіравання і працягвае сваё існаванне згубны для савецкага грамадства культ асобы"[676]. З прычыны таго, што мінчуку ўдалося вытрымаць свае звароты ў газетным стылі, яго скаргі не пацягнулі за сабой рэпрэсій, як у часы сталінізму, і нават прывялі да частковага поспеху ў вырашэнні яго жыллёвай праблемы: 21 ліпеня 1956 г. сакратар райкама партыі Ленінскага раёна паведаміў у гаркам партыі, што пытанне ставіцца яшчэ раз на парадак дня, хоць падыходзіла чарга тых, якія чакалі жыллё з 1950 г., а скаржнік стаяў у спісе чаргавікоў з 1951 г.[677]. Гэты прыклад паказвае, што скаргі маглі прывесці да поспеху, калі яны былі настойлівымі, з аргументамі са службовых інструкцый і вытрымліваліся ў стылі таго часу. У асобных выпадках бюракраты маглі праявіць гнуткасць, але рабілі гэта за кошт іншых.

У 1960-я гг. у выканкамах павялічылася колькасць справаздач па выніках праверак працы кватэрных аддзелаў выканаўчых камітэтаў. У іх адлюстраваны размах бюракратычнага самавольства. З аднаго боку, у кіраўнічых работнікаў заўсёды была магчымасць для асабістай нажывы. З іншага боку, асабліва настойлівым грамадзянам час ад часу ўдавалася абараніць свае інтарэсы. Пры гэтым мноства людзей, што мелі патрэбу ў жыллі, заставаліся ні з чым[678]. Два наступныя прыклады ілюструюць розныя варыянты падобных сітуацый.

[676] ДАМВ, ф. 5677, воп. 9, спр. 341, арк. 56–58 адв.

[677] Тамсама, арк. 59.

[678] Пар. у гэтым кантэксце: Ledeneva A. R. Russia's Economy of Favours: "Blat", Networking and Informal Exchange. Cambridge 1998; Bribery and "Blat" in Russia. Negotiating Reciprocity from the Middle Ages to the 1990s / Ed. by Lovell S., Ledeneva A., Rogachevskii A. Houndmills / London, 2000.

Прыклад 1. 27 сакавіка 1959 г. старшыня камісіі Дзяржаўнага кантролю Ф. А. Баранаў атрымаў справаздачу рэвізораў Ф. С. Кулачэнкі і В. І. Цяско аб размеркаванні кватэр у гарвыканкаме і райвыканкамах горада. Спачатку ў справаздачы гаварылася пра недахопы ў працы гарвыканкама, а таксама выканкама Варашылаўскага раёна: 1. Старшыня Мінгарвыканкама В. І. Шарапаў пры размеркаванні жылля пакідаў пэўны рэзерв, якім ён распараджаўся па ўласным меркаванні. Так, сям'я доктара з 4 чалавек атрымала кватэру плошчай 30 кв. м, хоць у іх ужо была кватэра плошчай 20 кв. м. У той жа час абышлі пенсіянерку, якая жыла на вул. Берасцянскай у зямлянцы плошчай 4 кв. м, дзе не было электрычнасці і нават немагчыма было стаць у поўны рост. 2. У перыяд з 1 студзеня 1958 г. да 1 сакавіка 1959 г. у Варашылаўскім раёне выдзелілі 18 кватэр, або 10% жылой плошчы, людзям, якія не значыліся ў спісе чаргавікоў. Пры гэтым кіраўнічыя работнікі пераследавалі свае асабістыя мэты замест таго, каб лічыцца з патрэбамі іншых. Так, напрыклад, старшыня і сакратар выканкама атрымалі адпаведна трохпакаёвую кватэру плошчай 46 кв. м і двухпакаёвую кватэру плошчай 32 кв. м па праспекце Сталіна. Пры гэтым праігнаравалі становішча трох сем'яў з дзесяці чалавек, якія жылі насупраць будынка выканкама на плошчы 16 кв. м, хоць яны стаялі ў чарзе з 1955 г.[679].

Прыклад 2. 22 чэрвеня 1960 г. па даручэнні першага сакратара Мінскага гаркама партыі А. Б. Насільскага камісія ў складзе пяці чалавек склала справаздачу аб працы кватэрнага аддзела выканкама Варашылаўскага раёна. Спачатку былі выказаны крытычныя заўвагі па некалькіх прынцыповых пунктах: з-за няўзгодненасці дзеянняў паміж кватэрным аддзелам і домакіраўніцтвам пуставала 14 кватэр. Пры выдзяленні жылля не выконвалася чарговасць. Людзі, якія ўжо атрымалі кватэру ад прадпрыемства, атрымалі яшчэ адну кватэру ад райвыканкама. У 13 з 21 службовай кватэры жылі людзі, якія па сваіх занятках не мелі адносін да кватэрнага аддзела. Разам з гэтымі недахопамі камісія прывяла яшчэ два характэрныя выпадкі, якія пралівалі святло на тое, што, з аднаго боку, выкарыстанне ўсіх магчымасцяў зваротаў грамадзян можа прыносіць плён, а з другога боку, на тое, што супрацоўнікі кватэрнага аддзела выкарыстоўвалі службовыя інструкцыі ва ўласных інтарэсах:

[679] НАРБ, ф. 911, воп. 1, спр. 276, арк. 4–9.

1) 30 лістапада 1957 г. пенсіянер-інвалід з сям'ёй з 4 чалавек, якія жывуць у двух пакоях агульнай плошчай 27 кв. м, хадайнічаў аб паляпшэнні жыллёвых умоў і 28 жніўня 1958 г. атрымаў двухпакаёвую кватэру плошчай 32 кв. м на першым паверсе. Неўзабаве яго сын пераехаў у Рыгу. Тым не менш гэта не спыніла пенсіянера, і ў сакавіку 1959 г. ён накіраваў заяву ў выканкам Варашылаўскага раёна з патрабаваннем паставіць ванну або выдзеліць новую кватэру[680]. 12 траўня 1959 г. яму было адмоўлена, але ён падаў новую заяву, цяпер ужо ў Мінгарвыканкам. У адказ на гэтую заяву 18 лістапада 1959 г. памочнік старшыні Мінгарвыканкама даў указанне старшыні выканкама Варашылаўскага раёна станоўча вырашыць пытанне па абмене кватэры. Пасля таго як бакі дамовіліся, пенсіянер дазволіў сабе адмовіцца ад прапанаванай яму 8 снежня 1959 г. кватэры з усімі выгодамі плошчай 30 кв. м. У выніку 2 лютага 1960 г. ён атрымаў на сваю сям'ю з 3 чалавек кватэру плошчай 41 кв. м. 2) Начальнік кватэрнага аддзела выканкама Варашылаўскага раёна вырашыў пашырыць сваю двухпакаёвую кватэру па праспекце Сталіна, у якой ён пражываў з сям'ёй з 4 чалавек. Таму 25 верасня 1958 г., падаўшы даведку аб хваробе дзіцяці, ён папрасіў выдзеліць яму яшчэ адзін пакой. Адначасова з гэтым ён хадайнічаў аб выдзяленні сваёй адзінокай суседцы, якая пражывала ў пакоі плошчай 14,7 кв. м, новай кватэры. 18 лістапада 1958 г. на паседжанні выканкама яму ўдалося дамагчыся выдзялення ёй аднапакаёвай кватэры плошчай 22 кв. м. Хоць кватэра начальніка кватэрнага аддзела выканкама і кватэра гэтай жанчыны не былі сумежнымі, выканкам пастанавіў, фіктыўна павялічыўшы колькасць членаў сям'і начальніка да 5 чалавек, выдаць яму дазвол выкарыстоўваць вызвалены пакой у кватэры. Выдаткі на знос сцяны, зняцце дзвярэй і капітальны рамонт узяло на сябе домакіраўніцтва. За гэта сваяк начальніка кватэрнага аддзела, які працаваў у яго падначаленні ў домакіраўніцтве, таксама атрымаў асобную кватэру. Здзіўляе, што такія дзеянні начальніка кватэрнага аддзела Варашылаўскага раёна Мінска ў адносінах да адзінокай суседкі расцэньваліся толькі як дробнае правапарушэнне. І толькі скарга ў студзені 1960 г. у выканкам Варашылаўскага раёна, у якой яго вінавацілі ў хабарніцтве, і ў сувязі з гэтым яго пісьмовае тлумачэнне пракурору ад

[680] ДАМВ, ф. 69, воп. 1, спр. 1474, арк. 1–18.

24 лютага 1960 г. сталі прычынай таго, што камісія зрабіла заключэнне, у аснову якога ляглі паказанні сведак[681]. Падставай да абвінавачвання начальніка кватэрнага аддзела паслужылі праблемы з жыллём адной сям'і. Жанчына, якая напісала скаргу на начальніка аддзела, у час вайны ўдзельнічала ў партызанскім руху, акрамя таго, у яе загінуў муж. Калі ў студзені 1944 г. яна разам з сынам, маці і дзвюма сёстрамі прыехала ў Мінск, ёй давялося пасяліцца ў драўляным доме, у пакоі плошчай 8 кв. м. У 1951 г. яна і адна з сясцёр выйшлі замуж і ўжо разам з мужамі, дзіцем і маці жылі ў тым самым пакоі. Аднак дзве сям'і былі пастаўлены на чаргу на атрыманне жылля толькі ў 1955 г., а менавіта: скаржніца разам з сынам і мужам, а таксама яе сястра з мужам, дзіцем і маці. Сітуацыя зрушылася з мёртвай кропкі пасля таго, як сын гэтай жанчыны паскардзіўся ў лісце на імя Хрушчова і Старшыні Савета Міністраў БССР К. Т. Мазурава, што ён не можа вучыцца з-за дрэнных жыллёвых умоў. 27 лістапада 1957 г. старшыня Мінгарвыканкама В. І. Шарапаў наклаў на ліст рэзалюцыю, што сям'і варта дапамагчы па-за чаргой. Аднак, паводле скаргі, кватэру далі 25 красавіка 1958 г., толькі тады, калі скаржніца ўручыла абвінавачанаму ў хабарах начальніку кватэрнага аддзела 5 тыс. рублёў, – суму, якая адпавядала двум месячным заробкам сям'і. Яна не падавала скаргу да таго часу, пакуль 5 студзеня 1960 г. яе сястра не атрымала жыллё ў камунальнай кватэры[682]. У выніку за адсутнасцю доказаў начальнік кватэрнага аддзела застаўся практычна беспакараным.

У сярэдзіне 1960-х гг. кватэрнае пытанне стала галоўнай праблемай горада. Па скаргах за першую палову 1960-х гг., якія захаваліся ў архіўным фондзе Дзяржкантролю, можна аднавіць прыватныя выпадкі і ў той жа час меркаваць пра самавольства органаў улады пры выдзяленні жылля і пра эфектыўнасць скаргаў. Гэта можна праілюстраваць наступнымі прыкладамі.

Прыклад 1. 18 красавіка 1963 г. інвалід вайны, слесар 1-га аўтобуснага парка, звярнуўся да старшыні Дзяржкантролю. У сваім лісце ён выразна выклаў сутнасць справы, расказаўшы, што ўжо 16 гадоў пражывае з сям'ёй з 4 чалавек у пакоі камунальнай кватэры без выгод па вул. Тыфліскай, хоць ужо неад-

[681] Тамсама, арк. 27–31, тут 27.
[682] Тамсама, арк. 32–35.

наразова скардзіўся на дрэнныя жыллёвыя ўмовы ў розныя інстанцыі. Жыллёвыя ўмовы былі невыноснымі, бо як у другім пакоі, так і на кухні жылі іншыя сем'і з 2 чалавек. У 1962 г. псіхічна хворая жанчына, якая жыла на кухні, атрымаўшы іншае жыллё, адмовілася туды пераязджаць. Таму слесар вырашыў, што мае права прасіць Дзяржкантроль садзейнічаць або ў вызваленні кухні, або ў атрыманні іншай кватэры. Пры гэтым ён звярнуў увагу на тое, што яму, як рацыяналізатару, належыць дадатковая жылплошча, на якую ён, тым не менш, не прэтэндуе[683]. Толькі з умяшаннем Дзяржкантролю пасля шматгадовых бясплённых высілкаў слесар нарэшце дамогся поспеху. 15 чэрвеня 1963 г. старшыня выканкама Кастрычніцкага раёна інфармаваў Дзяржкантроль аб рашэнні ад 23 траўня, згодна з якім у бягучым каляндарным годзе слесару павінны былі даць іншую кватэру, а суседку з кухні перасяліць у вызвалены пакой[684].

Прыклад 2. Каб дамагчыся паляпшэння сваіх жыллёвых умоў па вул. Жукоўскага, 1 чэрвеня 1963 г. мінчанка звярнулася ў Дзяржкантроль. Яна пісала, што яе жыллё, якое знаходзіцца ў хляве, ужо тры разы было праінспектавана прафсаюзам будаўнічых рабочых і 7-м будаўнічым трэстам. Хоць усе ўдзельнікі праверкі прыйшлі да высновы, што ў такіх умовах жыць немагчыма, яе становішча не змянілася. Каб скарга гучала больш пераканаўча, мінчанка напісала пра свайго бацьку, які ў час вайны ўдзельнічаў у наступленні ад Сталінграда да Вены, за што быў узнагароджаны. Пасля вяртання з эвакуацыі сям'я спачатку жыла ў вагончыку, які належаў друкарні "Во славу Родины". Калі бацька ўладкаваўся на працу ў друкарню Акадэміі навук, сям'я перасялілася ў падвал разбуранага будынка акадэміі. Пасля смерці маці ў 1954 г. сям'я пераехала ў прыватны хлеў. Ужо дзевяць гадоў сям'я стаяла ў спісе чаргавікоў выканкама на атрыманне кватэры. Мінчанка падкрэсліла, што яе бацька заслужыў кватэру хоць бы з мінімальнымі выгодамі і што яе муж ужо 11 гадоў працуе ў будаўнічай галіне[685]. У гэтым выпадку дзівіць аператыўнасць прыняцця рашэння: 4 чэрвеня 1963 г. начальнік аддзела скаргаў Дзяржкантролю паведаміў жанчыне, што ён дамогся праверкі жыллёвых умоў прафсаюзам, які

[683] НАРБ, ф. 911, воп. 3, спр. 809, арк. 162–163.
[684] Тамсама, арк. 158.
[685] НАРБ, ф. 911, воп. 3, спр. 811, арк. 110.

24 траўня прыйшоў да высновы – ёсць законныя падставы выдзеліць ёй жыллё[686]. 7 чэрвеня 1963 г. ён паведаміў жанчыне, што па яе заяве аб паляпшэнні жыллёвых умоў па-за чаргой, якая была накіравана праз прафсаюз у будаўнічы трэст, прынята адмоўнае рашэнне[687].

Прыклад 3. 9 студзеня 1964 г. у Дзяржкантроль прыйшоў ліст ад Паліны Сцяпанаўны, у якім яна ў блытанай форме апісвала свае дрэнныя жыллёвыя ўмовы ў доме па Слуцкай шашы[688]. Заключэнне інспектара Дзяржкантролю ад 21 студзеня 1964 г. мела больш дакладныя звесткі. Сям'я складалася з шлюбнай пары – Міхаіла Іванавіча (1909 г. н.) і Ганны Пятроўны (1914 г. н.), іх дачкі Валянціны Міхайлаўны (1944 г. н.), іх сына Анатоля Міхайлавіча (1946 г. н.), іх сына Леаніда Міхайлавіча (1941 г. н.) з жонкай Палінай Сцяпанаўнай (1940 г. н.) і іх дзіцяці, а таксама іх дачкі Лідзіі Міхайлаўны (1939 г. н.) з мужам Канстанцінам Канстанцінавічам (1936 г. н.) і іх дваіх дзяцей. Першапачаткова дом быў вартоўняй з паветкай на смеццевай звалцы. У 1950 г. яго перадалі Ганне Пятроўне ў якасці службовага жылля, і сям'я, якая раней жыла на прыватнай кватэры, пераехала ў гэтую "времянку" плошчай 26 кв. м. Пасля закрыцця смеццевай звалкі ў 1957 г. на "времянку" завялі дамавую кнігу, у выніку чаго сям'я змагла афіцыйна атрымаць прапіску. З 1959 г. сумежная з "времянкой" паветка плошчай 12 кв. м выкарыстоўвалася Леанідам Міхайлавічам у якасці жылля. У 1959–1960 гг. сям'я Канстанціна Канстанцінавіча пераехала ў прыбудову плошчай 6–8 кв. м. Усе гэтыя часовыя пабудовы, размешчаныя на адным зямельным участку, былі трухлявымі, без электрычнасці, водаправода і каналізацыі. У 1961 г. тэрыторыя перайшла ў падпарадкаванне Упраўлення грамадзянскай авіяцыі. У адказ на заяву сям'і ад 12 снежня 1961 г. выканкам Кастрычніцкага раёна прыняў рашэнне аб зносе "времянок" і хадайнічаў, каб у якасці кампенсацыі сям'і далі новую асобную кватэру з выгодамі. Пасля працяглай перапіскі паміж кіраўніцтвам аэрапорта і Мінгарвыканкамам 16 ліпеня 1963 г. кіраўніцтва аэрапорта паведаміла Мінгарвыканкаму аб немагчымасці выканаць яго рашэнне, бо дадзеная сям'я не мела ніякага дачы-

[686] Тамсама, арк. 109.
[687] Тамсама, арк. 108.
[688] НАРБ, ф. 911, воп. 3, спр. 893, арк. 222–223. Прозвішчы не названы з мэтай захавання таямніцы прыватнага жыцця.

нення да аэрапорта, а іх “времянка” не замінала паветраным зносінам. Тым не менш 8 жніўня 1963 г. выканкам адмовіўся перагледзець рашэнне ад 12 снежня 1961 г. У аэрапорта быў свой будаўнічы аддзел, разам з гэтым ён атрымліваў жыллё ад гарвыканкама, але клапаціўся аб забеспячэнні жыллём толькі сваіх работнікаў. Улічваючы рашэнне выканкама Кастрычніцкага раёна ад 12 снежня 1961 г., ніхто з членаў сям'і не стаў на чаргу на атрыманне жылля ні ў выканкаме, ні па месцы працы[689]. Пасля таго як 25 студзеня 1964 г. пытанне было перададзена на разгляд у гарвыканкам[690], яго старшыня В. І. Шарапаў паведаміў, што сям'ю будуць мець на ўвазе пры размеркаванні жылля ў 1964 г.[691]. Аднак 30 сакавіка 1964 г. намеснік старшыні гарвыканкама заявіў, што камітэт па прамысловасці КПБ 24 сакавіка таго ж года прыняў рашэнне: Упраўленне грамадзянскай авіяцыі абавязана паклапаціцца пра перасяленне сям'і і знос барака[692]. Такім чынам, гэты выпадак паказвае, што ведамасная і службовая валакіта прыводзіла да ігнаравання ўказанняў кіроўных органаў, а прыняцце рашэнняў пастаянна зацягвалася.

Напярэдадні такіх юбілеяў, як 40-я і 50-я гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі, партыі надарыўся выпадак разрадзіць сітуацыю шматспадзеўнымі рашэннямі. 11 кастрычніка “Советская Белоруссия” апублікавала прынятую за два дні да гэтага пастанову ЦК КПБ аб выдзяленні жылля 1122 мінскім сем'ям, у якіх былі дрэнныя жыллёвыя ўмовы. Гаворка ішла пра 387 рабочых, служачых і пенсіянераў, 288 сем'яў загінулых, 204 сям'і інвалідаў вайны, 154 дэмабілізаваных афіцэра і 89 рэабілітаваных. Для гэтых катэгорый грамадзян патрабавалася зарэзерваваць 10% усіх новых кватэр, якія знаходзіліся ў падпарадкаванні Мінгарвыканкама, і, акрамя таго, дадаткова – кватэры ад іншых ведамстваў і арганізацый[693]. Наколькі на справе выканкамы былі несвабодныя ў сваіх дзеяннях, відаць са справаздачы старшыні Мінгарвыканкама В. І. Шарапава ад 7 ліпеня 1958 г., накіраванай у ЦК КПБ. Ад агульнай плошчы пабудаванага ў 1956–1957 гг. жылля (299 300 кв. м) 74,6% (223 300 кв. м) належалі прадпрыемствам, 16,2% (48 371 кв. м) знаходзіліся

[689] НАРБ, ф. 911, воп. 3, спр. 893, арк. 213–215.
[690] Тамсама, арк. 212.
[691] Тамсама, арк. 211.
[692] Тамсама, арк. 210.
[693] НАРБ, ф. 4, воп. 81, спр. 1256, арк. 32–33. Пар.: СБ. 1957. № 241. С. 1.

ў прыватнай уласнасці і толькі 15,2% (45 300 кв. м) былі ў распараджэнні выканкамаў[694]. Паводле справаздачы Шарапава, 55,8% з тых, што атрымалі жыллё ад прадпрыемстваў, арганізацый і выканкамаў у 1956–1957 гг., былі рабочыя, 12,4% – інтэлігенцыя. Сем'і інвалідаў вайны і загінулых – 7%. Доля ваеннаслужачых складала 6,2%, а дэмабілізаваных афіцэраў – 4,5% (табліца 23).

**Табліца 23.** Тыя, што атрымалі дзяржаўнае жыллё ў Мінску ў 1956–1957 гг.

| Прафесійныя групы і сацыяльныя катэгорыі | 1956 г. | | 1957 г. | |
|---|---|---|---|---|
| | Сем'і | Жылая плошча (у кв. м) | Сем'і | Жылая плошча (у кв. м) |
| Рабочыя | 2992 | 54935 | 3422 | 58983 |
| Вучоныя, інжынеры і тэхнікі, службоўцы | 121 | 20950 | 1302 | 25537 |
| Ваеннаслужачыя | 332 | 10770 | 376 | 11280 |
| Дэмабілізаваныя афіцэры | 227 | 5017 | 295 | 7347 |
| Інваліды вайны, сем'і загінулых | 348 | 7080 | 454 | 8245 |
| Персанальныя пенсіянеры | 23 | 624 | 62 | 1351 |
| Рэабілітаваныя | 41 | 540 | 70 | 1128 |
| Іншыя, з улікам пераселеных з баракаў | 90 | 1784 | 163 | 3165 |
| Усяго: | 5274 | 101700 | 6211 | 117628 |

*Крыніца:* НАРБ, ф. 4, воп. 97, спр. 27, арк. 120.

Праз дзесяць гадоў кампанія паўтарылася пад іншым лозунгам. На гэты раз гаворка ішла пра тое, каб паскорыць абяцанае рашэнне жыллёвага пытання, абвешчанае ў праграме жыллёвага будаўніцтва 1957 г. і ў праграме партыі 1961 г.[695]. 4 жніўня 1967 г. ЦК КПБ і Савет Міністраў БССР прынялі пастанову аб перасяленні 7723 мінскіх сем'яў з баракаў, старых дамоў і "времянок" у новыя кватэры. У гэтай сувязі ўсе ўстановы, што інвеставалі ў 1967 г. у жыллёвае будаўніцтва, павінны былі перадаць 10% жылога фонду Міністэрству прамысловага будаўніцтва. Гэта не распаўсюджвалася толькі на інтэрнаты і жылыя дамы органаў дзяржбяспекі і арміі[696]. Пар-

[694] НАРБ, ф. 4, воп. 97, спр. 27, арк. 116–125, тут арк. 119.
[695] Пар.: ч. II. 1.
[696] НАРБ, ф. 4, воп. 81, спр. 2103, арк. 54–57.

тыйнае і дзяржаўнае кіраўніцтва не ўлічыла, аднак, што ў гэтым выпадку на прадпрыемствы ляжа празмерная нагрузка. Пры Хрушчове яны страцілі кантроль над жыллёвым будаўніцтвам і больш не маглі аддаваць сваё жыллё. Паказальныя абгрунтаванні невыканання плана ў сувязі з недахопам жылля на прадпрыемствах: 1. Дырэктар маторнага завода адзначыў, што завод змог забяспечыць жыллём толькі 4 сям'і з 10 у сувязі з занадта высокімі патрабаваннямі перадачы жылля. Ён звярнуў увагу на тое, што завод страціў 34% жылля, пабудаванага ў 1967 г.: 10% трэба было перадаць у распараджэнне выканкамаў, яшчэ 10% – у Міністэрства будаўніцтва, 8% – зарэзерваваць для дамоў пад знос на будаўнічых участках, 5% перадавалася ў ваенкамат і 1% было неабходна забраніраваць для службовых кватэр. З прычыны гэтага завод змог выдзеліць сваім работнікам толькі 1386 кв. м жылля, або 38 кватэр[697]. 2. 29 траўня 1968 г. памочнік дырэктара оптыка-механічнага завода імя Вавілава ў лісце ЦК КПБ тлумачыў немагчымасць выканаць патрабаванні па забеспячэнні жыллём 3 сем'яў з баракаў тым, што са згоды Мінгарвыканкама гэтыя баракі былі ператвораны ў інтэрнаты для іншагародніх рабочых[698]. 3. 29 траўня 1968 г. дырэктар трактарнага завода паведаміў, што толькі 14 сем'ям, якія жывуць у бараках, ёсць магчымасць даць жыллё. Забеспячэнне іншых 26 сем'яў немагчымае, бо ў 1967 г. у спісе чаргавікоў завода значылася 4500 чалавек, але выдзеліць можна было толькі 122 кватэры. З прычыны такога ж катастрафічнага становішча ў жыллёвым пытанні завод па ўзгадненні з гарвыканкамам, гаркамам партыі і ЦК скараціў у 1968 г. колькасць кватэр, якія павінны былі выдзяляцца сем'ям, што жылі ў бараках, з 90 да 40[699]. Застаецца заўважыць, што дзяржаўнае і партыйнае кіраўніцтва памылялася, мяркуючы, што з дапамогай пастаноў можна паскорыць рашэнне жыллёвага пытання. Яно сустракала пярэчанне прадпрыемстваў, бо магчымасці апошніх былі абмежаваныя. У такіх умовах баракі заставаліся рэальнасцю аж да другой паловы 1970-х гг.[700].

[697] НАРБ, ф. 4, воп. 97, спр. 247, арк. 180.
[698] Тамсама, арк. 177.
[699] Тамсама, арк. 181–182.
[700] Пар.: ч. V. 3. 1.

## 3 Жыллёвыя ўмовы

### а) “Добраўпарадкаванне” як праява ўрбаннасці

Пасля Другой сусветнай вайны рабочых, набраных з сельскай мясцовасці на працу ў Мінск, размяшчалі ў бараках і інтэрнатах, дзе яны працягвалі весці звыклы для сябе сельскі лад жыцця. З-за таго, што паўсядзённае жыццё характарызавалася рознага роду недахопамі і дэфіцытам, пра “нармалізацыю ўмоў жыцця”, прапагандаваную пры Сталіне, не магло быць і гаворкі[701]. Толькі пачатае Хрушчовым масавае жыллёвае будаўніцтва прывяло да таго, што ў Мінску з’явіліся магчымасці для індывідуальнай самарэалізацыі. Да добраўпарадкавання ў савецкім разуменні адносіліся такія элементарныя рэчы, як забеспячэнне электрычнасцю, пітной вадой і газам, а таксама падключэнне да цэнтральнага ацяплення і каналізацыі. Звесткі пра жылы фонд і інфраструктурнае абсталяванне жылых дамоў можна знайсці ў матэрыялах па інвентарызацыі жыллёвага фонду Мінска за 1945 і 1950 гг., усесаюзнай інвентарызацыі за 1960 г., у дадзеных выбарачнага абследавання ўмоў жыцця беларускіх сем’яў за 1978 г., а таксама ў выніках перапісу насельніцтва СССР 1989 г. На падставе павярхавасці жылых дамоў можна не толькі атрымаць уражанне пра сілуэт горада, але і зрабіць выснову пра інтэнсіўнасць будаўнічых работ. У тым, як мяняўся матэрыял сцен, можна ўбачыць змены жыллёвых умоў і прасторавую сегрэгацыю насельніцтва. А па добраўпарадкаванні жылля насельніцтва можна меркаваць аб умовах жыцця ў горадзе.

У святле суадносін паміж жаданым і сапраўдным “сацыялістычнага горада” можа выглядаць паказальным Генеральны план 1946 г., згодна з якім адбывалася аднаўленне Мінска. Па гэтым плане ў сярэдзіне 3 канцэнтрычных колаў павінна была ўзвышацца “гарадская карона” (цэнтр горада). Для 50% жыхароў недалёка ад цэнтра былі прадугледжаны трохпавярховыя і чатырохпавярховыя дамы, яшчэ для 30% жыхароў – двухпавярховыя дамы ў цэнтры горада і для астатніх 20% жыхароў – аднапавярховыя дамы на ўскраінах[702]. На практыцы спраектаваныя шыкоўныя жылыя дамы на галоўным праспекце і на прылеглых да яго вуліцах былі дапоў-

[701] Пар.: ч. II. 1.
[702] Пар.: ч. III. 1. б.

нены добрымі працоўнымі пасёлкамі на паўднёва-ўсходняй ускраіне горада (трактарны завод, аўтамабільны завод) (іл. 29). Разам з гэтым прадпрыемствы, якія займаліся жыллёвым будаўніцтвам, будавалі на гарадскіх пустках адна- і двухпавярховыя дамы для невялікай колькасці жыхароў (іл. 30). Гаворка ішла ў асноўным аб эксперыментальных дамах, будаўніцтва якіх было нявыгадным з эканамічнага пункту гледжання. Асноўная маса рабочых, між тым, жыла ў бараках і "времянках". Фактычна з 1945 да 1950 г. у жыллёвым фондзе дзяржаўнага сектара было пабудавана каля 10 тыс. аднапавярховых дамоў, 500 двухпавярховых, 90 трохпавярховых і 44 чатырохпавярховыя дамы. Такім чынам, у 1950 г. жылы фонд па прыкмеце паверхавасці размяркоўваўся наступным чынам: менш за 15% прыпадала на трох- і чатырохпавярховыя дамы, прыкладна пятую частку складалі двухпавярховыя дамы і амаль дзве трэція – аднапавярховыя (табліца 24).

**Табліца 24.** Паверхавасць жылых дамоў у Мінску ў 1945–1960 гг.

| Паверхі | 1945 г. | | 1950 г.* | | 1960 г. | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | Дамы | Жылая плошча | Дамы | Жылая плошча | Дамы | Жылая плошча |
| а) у абсалютным вылічэнні | | | | | | |
| 1 паверх | 5772 | 285015 | 14258 | 784277 | 24281 | 1191830 |
| 2 паверхі | 310 | 79187 | 822 | 233485 | 1467 | 474656 |
| 3 паверхі | 31 | 22317 | 122 | 80519 | 348 | 293590 |
| 4 паверхі | 16 | 18577 | 60 | 86887 | 357 | 488063 |
| 5 паверхаў | 1 | 883 | 6 | 18934 | 132 | 302156 |
| ≥ 6 паверхаў | – | – | 2 | 6437 | 21 | 81386 |
| Усяго: | 6130 | 405979 | 15270 | 1210539 | 26606 | 2831681 |
| б) у % | | | | | | |
| 1 паверх | 94,1 | 70,2 | 93,4 | 64,8 | 91,2 | 42,0 |
| 2 паверхі | 5,1 | 19,5 | 5,4 | 19,3 | 5,5 | 16,8 |
| 3 паверхі | 0,5 | 5,5 | 0,8 | 6,6 | 1,3 | 10,4 |
| 4 паверхі | 0,3 | 4,6 | 0,4 | 7,2 | 1,4 | 17,2 |
| 5 паверхаў | 0,0 | 0,2 | 0,0 | 1,6 | 0,5 | 10,7 |
| ≥ 6 паверхаў | – | – | 0,0 | 0,5 | 0,1 | 2,9 |
| Усяго: | 100 | 100 | 100 | 100 | 100 | 100 |

* У 1950 г. прыватны сектар не быў улічаны. Каб атрымаць рэальную карціну, табліца дапоўнена ў радку "1 паверх" 11 022 драўлянымі дамамі плошчай 444 200 кв. м (звесткі на 1 студзеня 1956 г.). Пар.: НАРБ, ф. 7, воп. 4, спр. 1797, арк. 204–218.

*Крыніца:* ДАМВ, ф. 2305, спр. 442, арк. 8, 14; ДАМВ, ф. 2305, спр. 595, арк. 9; ф. 1035, воп. 1, спр. 638, арк. 72.

Такая сітуацыя, відавочна, засталася незаўважанай адказнымі асобамі ў Крамлі. Для іх беларуская сталіца ўяўляла сабой, магчыма, "пацёмкінскую вёску". Інакш немагчыма растлумачыць, з якіх эканамічных меркаванняў зыходзіла Міністэрства будаўніцтва СССР, прапанаваўшы выкарыстоўваць у новай рэдакцыі Генеральнага плана Мінска 1952 г. новы прынцып будаўніцтва жылля, зыходзячы з паверхавасці: цяпер 70% жылой плошчы павінна было прыпадаць на чатырох- і пяціпавярховыя дамы, 20% – на двух- і трохпавярховыя і 10% – на аднапавярховыя[703]. Між тым праект агульнага горадабудаўнічага ансамбля не быў увасоблены ў жыццё. Спачатку праграма пацярпела няўдачу ад недастатковага ўдзелу прадпрыемстваў у жыллёвым будаўніцтве, а потым разам з пераарыентацыяй гарадскога планавання адышла на другі план[704]. У дзяржаўным сектары, у аснове якога ляжала жыллёвае будаўніцтва ад прадпрыемстваў, з 1950 да 1960 г. было пабудавана каля 1 тыс. аднапавярховых дамоў, 600 двухпавярховых, 220 трохпавярховых, 300 чатырохпавярховых і 126 пяціпавярховых. Відавочна, прадпрыемствы, зыходзячы з інтарэсаў дзяржавы, адмаўляліся даваць заказы будаўнічым арганізацыям на ўзвядзенне шыкоўных жылых дамоў у цэнтры і замест гэтага сваімі сіламі будавалі шматкватэрныя дамы на свабодных тэрыторыях. У выніку ў 1960 г. толькі 27,6% жылой плошчы прыпадала на трох- і чатырохпавярховыя дамы, 16,8% – на двухпавярховыя і 42% – на аднапавярховыя. Пра "гарадскую карону" (цэнтр горада) і гамагенны выгляд горада не ішло і гаворкі. Варта адзначыць, што 90% жылых дамоў былі аднапавярховымі (табліца 24).

Пры Хрушчове рашэнні ў галіне гарадскога планавання сталі прымацца не на саюзным, а на рэспубліканскім узроўні, а ў галіне жыллёвага будаўніцтва права даваць заказы перайшло ад прадпрыемстваў да выканкамаў[705]. Ва ўмовах масавага жыллёвага будаўніцтва ў змененым Генеральным плане 1958 г. была аддадзена перавага будаўніцтву мікрараёнаў з чатырох- і пяціпавярховымі шматкватэрнымі дамамі, а новы Генеральны план 1965 г. прадугледжваў будаўніцтва жылых раёнаў з вышыннымі дзевяціпавярховымі дамамі[706]. Такім чынам, гарадскі цэнтр пры планаванні "сацыялістычнага горада" ссоўваўся

[703] Пар.: ч. III. 1. в.
[704] Пар.: ч. II. 1.
[705] Пар.: тамсама.
[706] Пар.: ч. III. 1. в.

да ўскраін. Эстэтычны ўзор горадабудаўніцтва пасляваеннага часу замяніўся на эканамічны прынцып масавага жыллёвага будаўніцтва. Як і раней, самым важным было размясціць насельніцтва на мінімальнай плошчы, але цяпер праблема росту горада вырашалася за кошт павышэння паверхавасці будынкаў. У гэтай сувязі шчыльнасць заселенасці жылля вызначалася не колькасцю жыхароў, якія не былі адзін з адным у роднасных адносінах (камунальныя кватэры), а асобным размяшчэннем сем'яў у жылых дамах (асобныя кватэры). Сімптаматычна тое, што катэгорыя "кватэра" з'явілася ў савецкай статыстыцы разам з катэгорыяй "жыллё" толькі ў 1960-я гг.

Па матэрыялах, з якіх будаваліся дамы, можна меркаваць пра розную якасць жылля. Матэрыял сцен адлюстроўвае не толькі адрозненне паміж прыватным драўляным домам і дзяржаўным шматкватэрным домам, ён сімвалізуе пераход ад прымітыўнай хаціны да добраўпарадкаванай кватэры ў доме новага тыпу. У той жа час гаворка ідзе пра прыкмету прасторавай сегрэгацыі і расслаенне гарадскога грамадства, абумоўленага месцам пражывання. Існуе наступная заканамернасць: "дрэва" азначае пабудаваны на свабоднай гарадской прасторы вясковы дом, "цэгла" – прыкмета шыкоўнага жылога дома сталінскай эпохі ў цэнтры горада і добрага рабочага пасёлка на гарадской ускраіне, "бетонны блок" характарызуе пяціпавярховы дом з плоскім дахам у мікрараёнах эпохі Хрушчова, а "бетонная пліта" – шматпавярховы дом у жылым раёне часоў Брэжнева.

Пра вясковы выгляд шматлікіх раёнаў Мінска ў пасляваенны час сведчыць такі факт: па дадзеных на 1 траўня 1945 г. разам з 300 муранымі жылымі дамамі налічвалася яшчэ 5600 драўляных дамоў (табліца 25, дапоўненая пералічанымі ў табліцы 18 прыватнымі дамамі). На момант правядзення Усесаюзнай інвентарызацыі жыллёвага фонду 1 студзеня 1960 г. змяніліся толькі суадносіны: разам з 4400 муранымі дамамі існавала 20 тыс. драўляных (табліца 26). Пры гэтым агульная плошча, на якой стаялі драўляныя дамы з ўчасткамі парадку 600 кв. м, складала больш за 1 тыс. га (іл. 31)[707]. Што тычыцца жыллёвых умоў насельніцтва ў цэлым, то варта ўлічваць розныя ўмовы ў дзяржаўных шматкватэрных дамах, дзяржаўных драўляных

[707] Пастановай Савета Міністраў ад 26.08.1948 г. плошча зямельных участкаў у прыватным сектары ў рысе горада была скарочана да 300–600 кв. м. Жилищное законодательство. Минск, 1961. С. 71.

бараках і прыватных дамах. З 1945 да 1960 г. доля гарадскога жылля ў мураваных дамах вырасла прыблізна з 20% да 60% (табліцы 25–26, дапоўненыя дадзенымі па прыватным сектары ў 1945 г. з табліцы 13). Перавага стала аддавацца будаўніцтву шматкватэрных дамоў і інтэрнатаў. Акрамя таго, разам з павелічэннем колькасці дзяржаўных драўляных дамоў прыблізна з 2 тыс. у 1945 г. да 3700 у 1960 г. захоўвалася значэнне баракаў у жыллёвым будаўніцтве пасляваеннага часу, якое не варта недаацэньваць. Разам з гэтым статыстычныя звесткі сведчаць: метад блокавага будаўніцтва пасля так званага "карэннага пералому ў будаўніцтве" (снежань 1954 г.) да 1960 г. быў ужыты ў дзяржаўным сектары пры ўзвядзенні толькі 182 дамоў, што склала ўсяго 3% дзяржаўнага жылля (табліца 26).

**Табліца 25.** Будаўнічыя матэрыялы дзяржаўнага жылога фонду Мінска на 1 траўня 1945 г.

| **Матэрыял сцен** | **Дамы** | **Жылая плошча** | |
|---|---|---|---|
| | | **у кв. м** | **у %** |
| Цэгла | 281 | 74661 | 25,8 |
| Штучны камень | 13 | 3600 | 1,2 |
| Натуральны камень | 16 | 6770 | 2,3 |
| Дрэва | 2045 | 171299 | 59,3 |
| Дрэва і камень | 25 | 3942 | 1,4 |
| Іншае | 131 | 28570 | 9,9 |
| Усяго: | 2511 | 288772 | 100 |

*Крыніца:* ДАМВ, ф. 2305, воп. 1, спр. 442, арк. 13.

**Табліца 26.** Будаўнічыя матэрыялы дзяржаўнага і прыватнага жылых фондаў Мінска на 1 студзеня 1960 г.

| **Матэрыял сцен** | **Дзяржаўны сектар** | | | **Прыватны сектар** | | | **Усяго** | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | **Дамы** | **Жылая плошча** | | **Дамы** | **Жылая плошча** | | **Дамы** | **Жылая плошча** | |
| | | **у кв. м** | **у %** | | **у кв. м** | **у %** | | **у кв. м** | **у %** |
| Цэгла | 2640 | 1592046 | 76,3 | 1237 | 52520 | 6,8 | 3697 | 1644566 | 58,1 |
| Бетонныя блокі | 182 | 61896 | 3,0 | 518 | 18710 | 2,4 | 700 | 80606 | 2,8 |
| Дрэва | 3671 | 422024 | 20,2 | 16401 | 623719 | 80,2 | 20072 | 1045743 | 36,9 |
| Іншае | 54 | 9580 | 0,5 | 1903 | 81942 | 10,5 | 1957 | 91522 | 3,2 |
| Усяго: | 6547 | 2085546 | 100 | 20059 | 776891 | 100 | 26606 | 2831681 | 100 |

*Крыніца:* ДАМВ, ф. 1035, воп. 1, спр. 638, арк. 94, 110.

Уладальнікамі і жыхарамі прыватных дамоў былі пераважна рабочыя і іх сем'і, пры гэтым сярод іх налічвалася шмат пенсіянераў (табліца 27). Можна меркаваць, што ў першым выпадку гаворка ішла пра мігрантаў, а ў другім – пра карэннае насельніцтва. Нягледзячы на перавагу драўляных дамоў варта адзначыць, што ў прыватным сектары існавала таксама значная колькасць дамоў з цэглы (1237 дамоў з 7416 жыхарамі) і з бетонных блокаў (518 дамоў з 2689 жыхарамі)[708]. На самай справе толькі партыйныя работнікі, дырэктары прадпрыемстваў і кіраўнікі будаўнічых арганізацый мелі доступ да названых будматэрыялаў, аднак гэта не адлюстроўвалася ў статыстычных звестках.

**Табліца 27.** Прыналежнасць домаўладальнікаў г. Мінска да сацыяльных груп на 1 студзеня 1960 г.

| Сацыяльныя групы | Уладальнікі | Дамы | Кватэры | Пакоі | Плошча ў кв. м | Сем'і | Жыхары | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | пастаянна | часова | усяго |
| Рабочыя | 14967 | 10366 | 15752 | 34727 | 427129 | 16494 | 64063 | 9326 | 73389 |
| Службоўцы | 4990 | 2894 | 5211 | 13961 | 165485 | 5443 | 20998 | 4056 | 25054 |
| Калгаснікі | 35 | 17 | 37 | 73 | 1127 | 45 | 136 | 29 | 165 |
| Саматужнікі* | 1 | 1 | 1 | 1 | 50 | 1 | 2 | 3 | 5 |
| Саматужнікі** | 133 | 79 | 150 | 343 | 4048 | 155 | 583 | 148 | 731 |
| Прадстаўнікі свабодных прафесій | 2 | 1 | 2 | 3 | 43 | 2 | 6 | – | 6 |
| Пенсіянеры | 4038 | 2387 | 4605 | 11574 | 132852 | 5142 | 17825 | 3693 | 21518 |
| Іншыя | 495 | 265 | 529 | 1298 | 15401 | 576 | 2131 | 492 | 2623 |
| Усяго: | 24611 | 20059 | 26287 | 61982 | 746135 | 27858 | 105744 | 17747 | 123491 |

* Саматужнікі ў каапэратывах, ** іншыя саматужнікі.

*Крыніца:* ДАМВ, ф. 1035, воп. 1, спр. 638, арк. 97.

Гарадская жыццёвая прастора за некалькі дзесяцігоддзяў ад пачатку масавага жыллёвага будаўніцтва пры Хрушчове зведала сапраўдную метамарфозу. Пад час перапісу насельніцтва 1989 г. амаль дзве трэція ўсіх жыхароў паведамілі, што жывуць у "панэльным доме" (канструкцыя з жалезабетону, бло-

[708] ДАМВ, ф. 1035, воп. 1, спр. 638, арк. 94.

каў і панэляў), амаль адна трэць насельніцтва – у цагляных дамах. У кааператыўным жыллёвым будаўніцтве выкарыстоўваўся пераважна бетон. У маргінальным прыватным сектары больш чым дзве трэція дамоў былі з дрэва (каля 50 тыс. чалавек жылі ў вясковых дамах); у дзяржаўным сектары гэты матэрыял, з якога будаваліся баракі, на той час амаль не выкарыстоўваўся (табліца 28).

**Табліца 28.** Колькасць жыхароў г. Мінска, якія жылі ў дамах рознага тыпу (у залежнасці ад матэрыялу сцен) у 1989 г.

| Матэрыял сцен | Від уласнасці | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Дзяржава | | Жыллёва-будаўнічыя кааператывы | | Прыватная ўласнасць | | Усяго | |
| | Жыхары | у % | Жыхары | у % | Жыхары | у % | Жыхары | у % |
| Цэгла | 465169 | 38,6 | 22805 | 8,7 | 9127 | 13,5 | 497105 | 32,4 |
| Бетон* | 732175 | 60,7 | 239207 | 91,3 | 4990 | 7,4 | 976379 | 63,6 |
| Дрэва | 5331 | 0,4 | 8 | 0,0 | 46231 | 68,4 | 52070 | 3,4 |
| Дрэва і камень | 2162 | 0,2 | 64 | 0,0 | 6246 | 9,2 | 8472 | 0,5 |
| Гліняная цэгла | 14 | 0,0 | – | – | 15 | 0,0 | 29 | 0,0 |
| Іншыя | 203 | 0,0 | – | – | 932 | 1,4 | 1135 | 0,1 |
| Усяго: | 1205554 | 100 | 262084 | 100 | 67541 | 100 | 1535209 | 100 |

*Жалезабетон, бетонныя блокі, бетонныя пліты.

*Крыніца:* Численность, возрастная структура, состояние в браке, число и размер семей, национальный состав, уровень образования, источники средств существования, баланс трудовых резервов, жилищные условия населения города Минска в разрезе внутригородских районов. По данным Всесоюзной переписи населения на 12 января 1989 г. Минск, 1991. С. 140.

Урэшце ж якасць жыцця насельніцтва вызначалася не фасадамі жылых дамоў, а доступам да камунальнай інфраструктуры. Што тычыцца прыватных дамоў на адну сям'ю, то ў іх часта не было самага элементарнага: у 1960 г. яшчэ чвэрць усіх дамоў не мела электрычнага святла. У 1979 г. у тры чвэрці ўсіх дамоў не былі падведзены водаправод і каналізацыя. Жыццё ў прыватным доме азначала забеспячэнне пітной вадой з калонкі на бліжэйшым рагу вуліцы і карыстанне прыбіральняй у двары. Таму словазлучэнне “ўласны дом” не адпавядала свайму сапраўднаму значэнню. Фактычна гаворка ішла аб прымітыўных драўляных будынках, жыццё ў якіх істотна адрознівалася ад жыцця гарадскога свету. Некаторыя ўдакладненні варта зрабіць таксама наконт дзяржаў-

ных шматкватэрных дамоў: з 1950 г. у іх была толькі электрычнасць, да 1960 г. і палова жылога фонду не была падключана да водаправода і каналізацыі (гл. дадатак, табліца XX). Выхад з гэтага бядотнага становішча стаў магчымым у канцы 1950-х гг. дзякуючы з'яўленню Заслаўскага вадасховішча, якое па меншай меры гарантавала забеспячэнне водаправоднай вадой[709].

З 1960-х гг. перасяленне ў асобную кватэру ў новым доме, абсталяваную газавай плітой, цэнтральным ацяпленнем і санвузлом, азначала далучэнне насельніцтва, большая частка якога паходзіла з сялянскага асяроддзя, да дасягненняў сучаснай цывілізацыі. Паколькі ў пасляваенны час у распараджэнні выканкамаў было ў першую чаргу старое жыллё, якасць іх жылога фонду значна саступала якасці жылога фонду прадпрыемстваў. Пасля таго як у ходзе масавага жыллёвага будаўніцтва суадносіны валодання сталі іншымі, то да канца 1970-х гг. сітуацыя змянілася карэнным чынам. Што датычыцца якасці жылля, то ў 1979 г. самымі лепшымі былі дамы жыллёвабудаўнічых кааператываў, якія пачалі сваю дзейнасць толькі ў 1960-я гг. (гл. дадатак, табліца XX). "Добраўпарадкаванай" жыццёвая прастора для большасці жыхароў Мінска стала толькі ў 1970-я гг. Таму ўражанне манатоннасці, якое аптычна стваралі велізарныя жылыя масівы эпохі Брэжнева, на той час для мінчукоў не мела прынцыповага значэння.

### б) Камуналка, барак, інтэрнат

Па іроніі гісторыі дэфіцыт жылля ў Мінску ў пасляваенны час прывёў да таго, што горадабудаўнічыя ўтопіі канца 1920-х гг. сталі рэальнасцю, хоць у 1930-я гг. на іх было накладзена табу з-за трыумфу "сацыялістычнага рэалізму"[710]. Аднак змястоўны кампанент, характэрны для структурнай мадэлі "сацыялістычнага горада" ў перыяд позняга сталінізму, не адпавядаў ідэалам, якія авангард звязваў са скасаваннем сям'і, эмансіпацыяй жанчыны і дамамі-камунамі. Калектыўныя формы пражывання ў пасляваенны час былі абумоўлены бядотным становішчам. Гэта выяўлялася ў высокай шчыльнасці заселенасці: у 1950 г. на чалавека прыпадала 5,8 кв. м жылля (табліца 16). Характэрна, што да 1960 г. афіцыйная жыллёвая статыстыка зыходзіла не

[709] Пар.: ч. III. 3. в.
[710] Пар.: ч. II. 1.

з колькасці дзяржаўных кватэр, а з колькасці дзяржаўнай жылой плошчы. У рэальнасці жыллёвае будаўніцтва арыентавалася не на попыт, а на вытворчасць. Дзяржава зыходзіла толькі з неабходнасці рассялення працоўнай сілы, якая прыязджала ў горад, у наяўным жыллі[711]. У гэтых умовах жыццё ў камуналках, бараках і інтэрнатах разам з пражываннем у "времянках" і вясковых хатах характарызавала паўсядзённае жыццё беларускай сталіцы.

Пад час Усесаюзнай інвентарызацыі жыллёвага фонду было ўстаноўлена, што на 1 студзеня 1960 г. у 58 551 дзяржаўнай кватэры Мінска налічвалася больш за 137 580 жылых пакояў і імі карысталася 94 485 кватэранаймальнікаў, або 368 235 чалавек (гл. дадатак, табліца XVII). У сярэднім на кожную кватэру прыпадала 2,3 жылых пакоя, 1,6 кватэранаймальніка і 6,3 жыхара. Іншымі словамі, кожныя дзве сям'і з трох пражывалі ў камуналках[712]. Кожная сям'я мела адзін пакой. Кухня, калідор і санвузел (калі такія былі) выкарыстоўваліся сумесна. Часам людзі жылі ў кухні. Недахоп месца і вымушаная цесната пражывання выклікалі агрэсію ў жыхароў, якія выпадковым чынам апынаіся пад адным дахам. Па ўспамінах відавочцаў, сумеснае пражыванне падпарадкоўвалася строгім правілам, у адпаведнасці з якімі, у прыватнасці, павінна была выконвацца чарговасць пры эксплуатацыі месцаў агульнага карыстання. Іерархічныя структуры ўскладняліся асабістымі адносінамі. Нагляд з боку "домоуправов" і назіранне суседзяў па кватэры азначалі, акрамя сацыяльнай дысцыпліны, палітычны кантроль[713].

16 лютага 1957 г. "Советская Белоруссия" паведаміла пра абсурдны выпадак. Апісвалася трагічная сітуацыя А. П. Кузняцо-

[711] Пар.: ч. V. 1. a.

[712] ДАМВ, ф. 1035, воп. 1, спр. 638, арк. 110.

[713] Пар. у дачыненні да Масквы: Семенова В. Равенство в нищете: символическое значение "коммуналок" // Судьбы людей: Россия. XX век. Биографии семей как объект социологического исследования / отв. ред.: В. Семенова, Е. Фотеева. Москва, 1996. С. 373–389. Пар. таксама: Boym S. Common Places. Mythologies of Everyday Life in Russia. Cambridge, Ma. / London, 1994. P. 121–167; Paola M. Kommunalka. Une histoire de l'Union soviétique à travers l'appartement communautaire. O. O. 1995; Schlögel K. Kommunalka – oder Kommunismus als Lebensform. Zu einer historischen Topographie der Sowjetunion // Historische Anthropologie 1998. Bd. 6. S. 329–346; Герасимова К. Советская коммунальная квартира // Социологический журнал. 1998. № 1-2. С. 224–243.

вай, якая пяць гадоў жыла ў пакоі плошчай 9 кв. м у камуналцы па вул. Розы Люксембург, 72 разам з іншай жанчынай. Пасля таго як у снежні 1956 г. яе суседка па пакоі выпісалася, Кузняцова не атрымала ў домакіраўніцтве дазволу цалкам заняць пакой. У гэтай сітуацыі два іншыя кватэраздымшчыкі, якія жылі ў суседніх пакоях, самавольна вырашылі пытанне на сваю карысць. Яны знеслі сцяну, каб аб'яднаць пакой Кузняцовай з кухняй, атрымаўшы на гэта дазвол у выканкаме Фрунзенскага раёна, завераны ранейшай датай. Потым яны бессаромна вынеслі ўсе пажыткі Кузняцовай з кватэры. У сітуацыі агульнага недахопу жылля ў Мінску Кузняцова не змагла знайсці сабе іншага прытулку, таму напісала ў "Советскую Белоруссию". Рэдакцыя звярнулася ў выканкам, але змагла толькі высветліць, што аднаўленне сцяны немагчымае "па тэхнічных прычынах". Разам з тым народны суд адхіліў пазоў абодвух кватэранаймальнікаў з просьбай выселіць Кузняцову з "агульнай кухні". У выніку "Советская Белоруссия" змагла выкрыць выканкам Фрунзенскага раёна ў невыкананні ўскладзеных на яго абавязкаў па забеспячэнні грамадзян жыллём[714]. Ва ўмовах культурна-палітычнай "адлігі" часоў Хрушчова рэдакцыя "Советской Белоруссии" дазваляла сабе, звяртаючыся да сталінскага дыскурсу "крытыкі і самакрытыкі" і супрацьпастаўляючы калектыўнае кіраванне культу асобы, праліваць святло на праблемы паўсядзённага жыцця ў Мінску, якія ніяк не адпавядалі патрабаванням "сацыялістычнага горада".

У адрозненне ад такой формы пражывання, як "камуналка", у спецыяльнай літаратуры да гэтага часу не аддавалася належнай увагі значэнню для працэсу ўрбанізацыі ў СССР у пасляваенны час "субкультуры баракаў", дзе жылі пралетарызаваныя сельскія жыхары[715]. Пасля вызвалення Мінска ад нямецкіх акупантаў у ліпені 1944 г. будаўніцтва баракаў было самым хуткім і рацыянальным спосабам змякчэння наступстваў недахопу жылля для мясцовага насельніцтва і размяшчэння набранай з правінцыі працоўнай сілы для аднаўленчых работ. На практыцы баракі паступова прымалі дзве асноўныя формы: спачатку гаворка ішла пра будынак з агульнымі памяшкан-

[714] Лящевич Л. Так ли надо относиться к жалобам трудящихся. По следам неопубликованных писем // СБ. 16.12.1957. № 40. С. 2.

[715] Пар. з кароткай праблематызацыяй паняцця ў: Стариков Е. Н. Маргиналы // В человеческом измерении. Перестройка: гласность, демократия, социализм. Москва, 1989. С. 180–203, тут с. 184.

нямі для начлегу і месцамі агульнага карыстання. Потым пачалі пераважаць адна- і двухпавярховыя драўляныя пабудовы з вялікай колькасцю маленькіх пакояў. На прыкладзе Мінска відавочна, што значэнне баракаў у перыяд позняга сталінізму не варта недаацэньваць: з 1 траўня 1945 г. да 1 студзеня 1950 г. іх колькасць павялічылася з 91 да 655, а колькасць жыхароў – з 6161 да 31 269. У 1950 г. баракі з агульнай жылой плошчай 132 133 кв. м не толькі складалі дзясятую частку гарадскога жылля (плошча якога з прычыны адсутнасці дадзеных па прыватным сектары можа быць вызначана толькі прыблізна), але і былі прытулкам для 11,4% насельніцтва Мінска (гл. дадатак, табліцы XV–XVI).

Пасля смерці Сталіна баракі страцілі сваё значэнне ў жыллёвым будаўніцтве Мінска. Больш за тое, у хрушчоўскую эпоху яны сталі цяжарам з-за свайго непрыдатнага стану. З іх зносам не спяшаліся, бо не было магчымасці даць іх жыхарам неабходную колькасць кватэр у новых дамах. Неаднаразова прынятыя спробы паскорыць вырашэнне праблемы пастановамі “зверху” цярпелі няўдачу з-за жорсткага супраціву прадпрыемстваў і арганізацый, магчымасцяў якіх не хапала, каб забяспечыць жыллём сваіх работнікаў[716]. Так, 15 красавіка 1958 г. ЦК КПБ даручыў шэрагу міністэрстваў і ведамстваў да 1960 г. выдзеліць кватэры ў новых дамах 4773 сем’ям, якія пражывалі ў 393 старых бараках[717]. У якой меры гэтая ініцыятыва ўвасобілася ў жыццё, дакументы замоўчваюць. Аднак вынікі Усесаюзнай інвентарызацыі жыллёвага фонду ад 1 студзеня 1960 г. паказваюць, што поспех названай акцыі не мог быць вялікім, бо ў трох з чатырох раёнаў горада ў бараках былі прапісаны 4868 сем’яў, або 18 476 чалавек (табліца 21). З-за таго, што не рабіўся неабходны рамонт, дамы разбураліся яшчэ хутчэй. Таму з-за забароны на будаўніцтва прыватных драўляных дамоў у межах горада 18 снежня 1962 г. Савет Міністраў БССР абавязаў мінскіх будпадрадчыкаў штогод да 50-х угодкаў Кастрычніцкай рэвалюцыі рэзерваваць 5% кватэр у новых дамах для перасялення 8849 мінскіх сем’яў са старых баракаў[718]. Пастанова гэтая выконвалася даволі неахвотна, таму 4 жніўня 1967 г. ЦК КПБ і Савет Міністраў БССР палічылі неабходным

[716] Пар.: ч. V. 2. в.
[717] НАРБ, ф. 4, воп. 81, спр. 1303, арк. 36–40.
[718] ДАМВ, ф. 6, воп. 3, спр. 230, арк. 232.

падняць гэтую квоту да 10%. Такім чынам планавалася перададолець наступствы Другой сусветнай вайны, якія па-ранейшаму адчувалі на сабе 7723 сям'і, што жылі ў бараках, разбураных дамах і "времянках"[719]. Аднак праблема існавала аж да сярэдзіны 1970-х гг. 14 траўня 1974 г. сакратар гаркама КПБ В. Ляпёшкін далажыў у ЦК КПБ, што з 1967 г. 1535 сем'яў інвалідаў вайны і сем'яў загінулых змаглі палепшыць свае жыллёвыя ўмовы і што 7750 сем'яў перaселены са старых дамоў[720].

Вытрымкі са справаздачы аддзела прапаганды ЦК КП(б)Б сведчаць аб невыносных умовах жыцця ў бараках трактарнага завода і будтрэста № 2 Галоўпрамбуда адразу пасля вайны. 22 траўня 1947 г. на трактарным заводзе налічвалася прыблізна 1200 рабочых, 35% з іх была сельская моладзь, якая летам 1946 г. прыйшла на завод па закліку камсамола. У шасці бараках на кожнага прыпадала толькі 1,5–2 кв. м. Нягледзячы на тое, што гаворка ішла пра сем'і, рабочыя жылі ў пакоях з двухпавярховымі ложкамі на 28–40 чалавек. На працоўных месцах не было ні інструментаў, ні матэрыялаў. Акрамя таго, скардзіліся на адсутнасць ацяплення[721]. Паводле справаздачы ад 18 траўня 1949 г., большасць з 1144 рабочых будтрэста № 2 былі размешчаны ў бараках, якія нагадвалі хутчэй стайні[722]. Па сведчаннях саміх жыхароў, у пакоях зімой замярзала пітная вада. У такіх умовах не магло быць і гаворкі ні пра "камуністычную мараль", ні пра энтузіязм. На парадку дня былі прагулы і звальненні: у першым квартале 1947 г. 206 рабочых самавольна пакінулі трактарны завод, а 272 рабочыя па адным або па некалькі дзён проста не выходзілі на працу. У красавіку 119 чалавек паехалі ў вёску, каб дома адзначыць Вялікдзень[723]. Сацыялістычнае спаборніцтва ператварылася ў фарс: хоць 80%

[719] НАРБ, ф. 4, воп. 81, спр. 2103, арк. 54.

[720] ДАМВ, ф. 69, воп. 12, спр. 31, арк. 6–15. У справаздачы старшыні Дзяржкантролю ў ЦК КПБ ад 27 сакавіка 1968 г. аб выкананні пастановы ад 4 жніўня 1967 г. былі названы 2209 мінскіх сем'яў. Пастанова пераклала адказнасць за 1161 сям'ю на органы эканомікі і кіравання, а за 1048 сем'яў – на выканкамы. Такім чынам, партыя змагла запісаць сабе ў актыў пэўныя поспехі: да 1 сакавіка 1968 г. 2158 сем'яў былі забяспечаны жыллём, 1138 – праз органы эканомікі і кіравання, 1020 – праз выканкамы. НАРБ, ф. 4, воп. 97, спр. 247, арк. 163.

[721] ДАМВ, ф. 69, воп. 1, спр. 169, арк. 12–15.

[722] ДАМВ, ф. 69, воп. 1, спр. 435, арк. 51–60.

[723] ДАМВ, ф. 69, воп. 1, спр. 169, арк. 12–15.

работнікаў будтрэста былі маладога ўзросту, камсамольская арганізацыя налічвала толькі каля 80 членаў[724].

Ва ўмовах масавага жыллёвага будаўніцтва ў хрушчоўскую эпоху прыйшлі да высновы, што больш няма сэнсу ўкладаць сродкі ў баракі. Часам жыхарам на працягу доўгіх гадоў адмаўлялі ў неабходным рамонце, матывуючы часовым характарам іх жылля. Пад час культурна-палітычнай "адлігі" гэта прадметна абмяркоўвалася ў прэсе: 16 лютага 1957 г. "Советская Белоруссия" напісала пра прэтэнзіі жыхароў барака па вул. Ціміразева, якія ўжо два гады спрабавалі даведацца, хто нясе адказнасць за іх жыллё. Ніхто не спаганяў кватэрную плату, нікога не хвалявала адсутнасць вады і электрычнасці. Улетку ў выніку мантажных работ на заводзе ацяпляльнай тэхнікі быў сур'ёзна пашкоджаны падмурак барака. Аднак ніяк не маглі вырашыць, хто будзе несці адказнасць за рамонт: той, хто ўсталёўваў ацяпляльнае абсталяванне, або будтрэст № 29 Міністэрства будаўніцтва, у падпарадкаванні якога знаходзіўся гэты барак. Будтрэст папросту ігнараваў абавязкі, якія 12 ліпеня 1956 г. на яго ўсклаў Мінгарвыканкам[725]. Падобны выпадак паўтарыўся ў пачатку 1960-х гг. На гэты раз жыхары састарэлага барака па вул. Фабрыцыуса спрабавалі дамагчыся праўды з дапамогай скаргаў. Яны напісалі скаргу на імя Хрушчова і 13 студзеня 1964 г. паслалі копіі ў ЦК КПБ, старшыні Мінгарвыканкама і ў Камітэт партыйна-дзяржаўнага кантролю. У сваёй скарзе жыхары пісалі, што ў сувязі з пашырэннем інструментальнага завода было вырашана знесці іх барак, але з 1962 г. знос неаднаразова адкладаўся. Барак пастаянна перадаваўся ў распараджэнне то аднаго, то другога будаўнічага трэста, але ніхто не браў на сябе адказнасць за яго рамонт. Тым часам з-за пагрозы абвальвання і нездавальняльнага стану электраправодкі, а таксама з-за няспраўных комінаў жыць у бараку стала небяспечна[726]. На запыт Дзяржкантролю намеснік міністра будаўніцтва БССР 4 лютага 1964 г. паведаміў, што прафсаюз прапанаваў знесці барак[727]. Урэшце прызналі: баракі – часовае жыллё, таму рабіць рамонт у іх немэтазгодна. Каб пазбавіцца ад праблемы, будпадрадчыкі па магчымасці выводзілі такое жыллё са свайго жылога фонду.

[724] ДАМВ, ф. 69, воп. 1, спр. 435, арк. 51–60.

[725] Беспризорные дома. По письму Мироновича, Черенковской, Павловича и др. // СБ. 16.2.1957. № 40. С. 2.

[726] НАРБ, ф. 911, воп. 3, спр. 893, арк. 256–258.

[727] Тамсама, арк. 255.

Горадабудаўнічая праграма рэканструкцыі зноў пацярпела няўдачу з-за немагчымасці перасяліць жыхароў у шматкватэрныя дамы. Да няшчасця жыхароў баракаў, адтэрміноўка рашэння праблемы заставалася адзінай стратэгіяй уладаў.

У адрозненне ад камуналкі і барака інтэрнат на працягу ўсяго савецкага перыяду быў для навучэнцаў і студэнтаў своеасаблівым трамплінам у вялікі горад. У 1950 г. інтэрнаты плошчай 109 300 кв. м складалі амаль дзясятую частку гарадскога жылля Мінска, адстаючы, аднак, ад баракаў. Выканкамам належаў толькі адзін будынак з трыма пакоямі плошчай 35 кв. м (гл. дадатак, табліца XVI), які лічыўся інтэрнатам. У прадпрыемстваў жа, наадварот, пятую частку жылля (109 265 кв. м) складалі інтэрнаты[728]. Да часу правядзення Усесаюзнай інвентарызацыі жыллёвага фонду ў 1960 г. жылая плошча інтэрнатаў амаль падвоілася да 209 230 кв. м. Пры гэтым доля інтэрнатаў у жылой плошчы горада займала ўсё яшчэ 9% (гл. дадатак, табліца XVII). 46 654 жыхары інтэрнатаў складалі 8,7% ад агульнага насельніцтва[729]. Паводле справаздачы начальніка ўпраўлення аховы грамадскага парадку П. Жука ад 26 траўня 1966 г., 53 955 чалавек пераважна маладога ўзросту лічыліся ў 242 рабочых і ў 49 студэнцкіх інтэрнатах, што складала 7% насельніцтва Мінска. Гэта было жыллё для навучэнцаў і студэнтаў, таму склад жыхароў інтэрнатаў абнаўляўся кожны год прыкладна на 20–25%[730].

Як і ў выпадку з баракамі, сітуацыя ў інтэрнатах перыяду позняга сталінізму характарызавалася цеснатой і антысанітарыяй. Гэта тычылася, у прыватнасці, інтэрнатаў для будаўнікоў: паводле справаздачы прафсаюзнага камітэта Міністэрства камунальна-бытавога і жыллёвага будаўніцтва ад 15 траўня 1950 г., на кожнага прыпадала толькі 3–4 кв. м жылой плошчы. Сем'і пражывалі разам з адзінокімі. У пакоі плошчай 18 кв. м жыло па 7–8 чалавек. Часам мужчынам даводзілася дзяліць адзін ложак на дваіх. Не было шафаў і крэслаў, часта – нават элементарных санвузлоў[731]. 12 ліпеня 1951 г. Прэзідыум Беларускага рэспубліканскага Савета прафсаюзаў раскрытыкаваў стан інтэрнатаў Галоўнага ўпраўлення па аднаўленні Мінска. Гаворка ішла аб перанаселеным часовым жыллі, дзе на кожнага

[728] ДАМВ, ф. 2305, воп. 1, спр. 595, арк. 8адв.
[729] ДАМВ, ф. 1035, воп. 1, спр. 638, арк. 95–96.
[730] ДАМВ, ф. 69, воп. 6, спр. 595, арк. 77–81.
[731] ДАМВ, ф. 69, воп. 1, спр. 613, арк. 46–49.

прыпадала толькі 2,2 кв. м жылой плошчы, а жыхары былі пазбаўлены магчымасці гатаваць ежу і мыць бялізну. 25 шлюбных пар жылі ў пакоях з халасцякамі, 40 сем'яў– па дзве сям'і ў пакоі[732]. 25 студзеня 1952 г. Прэзідыум адзначыў такія ж нездавальняльныя ўмовы ў студэнцкіх інтэрнатах, дзе на чалавека ў сярэднім прыпадала толькі 1,7–3,0 кв. м. З прычыны таго, што ў інтэрнаце Інстытута замежных моў, разлічанага на 225 месцаў, пражывала 347 студэнтаў і 30 аспірантаў, 120 студэнтаў былі вымушаны жыць у навучальных аўдыторыях, а яшчэ 70 – у бараках. У Політэхнічным інстытуце 130 студэнтаў жылі ў спартыўнай зале, 200 студэнтаў – у недабудаваным доме для вучоных. З 344 жыхароў інтэрната па вул. Энгельса 232 былі вымушаны спаць па двое на ложку[733].

Сітуацыя заставалася напружанай да пачатку масавага жыллёвага будаўніцтва. Паводле справаздачы Беларускага рэспубліканскага Савета прафсаюзаў ад 1 красавіка 1957 г., 10 466 студэнтаў жылі ў інтэрнатах, у той час як 4243 студэнты здымалі кватэру або жылі ў "времянках", а 2779 студэнтаў пражывалі сумесна з бацькамі[734]. У інтэрнатах на кожнага прыпадала толькі 2,5–4,7 кв. м жылой плошчы (табліца 29). Наколькі катастрафічным быў стан інтэрнатаў, вынікае са справаздачы Белсаўпрафа ад 27 верасня 1957 г. аб інтэрнатах Мінскага аўтамабільнага завода. Ні адзін з іх не быў падрыхтаваны да зімы. Дахі працякалі, вокны былі ў дрэнным стане, адсюль – вільгаць у памяшканнях. З прычыны дрэннага абсталявання кухняў людзі былі пазбаўлены магчымасці гатаваць ежу. Так, напрыклад, адзін інтэрнат на 400 мужчын меў адну пліту з васьмю канфоркамі; у іншым інтэрнаце, дзе жылі 205 жанчын, не было чым паліць пліту. Акрамя таго, не было памяшканняў для мыцця і сушкі бялізны. З-за перанаселенасці ва ўсіх прызначаных для гэтага памяшканнях жылі людзі. Што тычыцца мэблі, то 3 інтэрнаты на 900 чалавек мелі толькі 29 шафаў. Нягледзячы на дрэнныя жыллёвыя ўмовы, сустракаліся выпадкі, калі кіраўніцтва інтэрнатаў нажывалася на жыхарах. Пры максімальнай плаце за інтэрнат, якая складала 30 рублёў у месяц, з людзей бралі больш за 35 рублёў, за электрычнасць замест 1 рубля – 15 рублёў, за карыстанне пасцельнай бялізнай замест 5 рублёў – 10 рублёў[735].

[732] НАРБ, ф. 7, воп. 4, спр. 1790, арк. 134–138.
[733] НАРБ, ф. 7, воп. 4, спр. 2865, арк. 55–69.
[734] НАРБ, ф. 265, воп. 5, спр. 1186, арк. 69–73.
[735] НАРБ, ф. 265, воп. 9, спр. 26, арк. 43–46.

**Табліца 29.** Забеспячэнне студэнтаў ВНУ г. Мінска інтэрнатамі на 1 красавіка 1957 г.

| ВНУ | Колькасць студэнтаў | Студэнты з месцам у інтэрнаце | Студэнты без месца ў інтэрнаце | Плошча інтэрнатаў (у $м^2$) | Жылая плошча на чалавека (у $м^2$) |
|---|---|---|---|---|---|
| Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя М. Горкага | 1418 | 502 | 600 | 1468 | 2,9 |
| Беларускі політэхнічны інстытут імя Сталіна | 4200 | 3200 | 600 | 13689 | 4,7 |
| Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт імя У. І. Леніна | 3200 | 1767 | 900 | 6839 | 3,8 |
| Лесатэхнічны інстытут імя С. М. Кірава | 1371 | 968 | 300 | 2165 | 2,3 |
| Беларускі дзяржаўны інстытут народнай гаспадаркі імя В. У. Куйбышава | 1800 | 1000 | 240 | 3600 | 3,6 |
| Медыцынскі інстытут | 2955 | 1446 | 909 | 5200 | 3,5 |
| Беларускі інстытут механізацыі сельскай гаспадаркі | 764 | 744 | – | 1860 | 2,5 |
| Беларускі дзяржаўны інстытут фізічнай культуры | 566 | 330 | 180 | 1020 | 3,1 |
| Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут замежных моў | 870 | 430 | 400 | 2388 | 4,5 |
| Беларуская дзяржаўная кансерваторыя імя А. В. Луначарскага | 207 | 53 | 64 | – | – |
| Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут | 137 | 26 | 50 | 96 | 3,9 |
| Усяго: | 17488 | 10466 | 4243 | 38295 | 3,6 |

*Крыніца:* НАРБ, ф. 265, воп. 5, спр. 1186, арк. 74.

У 1960-я гг. на этапе імклівага росту горада для многіх мігрантаў інтэрнаты сталі свайго роду трамплінам для наступнага працяглага пражывання ў "закрытым горадзе". Каб захаваць атрыманую прапіску, людзі гатовы былі жыць на мяжы закона. Паводле справаздачы Упраўлення аховы грамадскага парадку ад 26 траўня 1966 г., 3400 прапісаных у інтэрнатах чалавек па сямейных або іншых прычынах пераехалі ў прыватныя кватэры, "времянки", дамы без тэхнічнага пашпарта і баракі, дзе яны не былі прапісаны або перапрапісаны. У інтэрнатах было прапісана на 4 тыс. чалавек больш, чым дазвалялі месцы[736]. Паводле дадзеных Упраўлення аховы грамадскага парадку ад 12 чэрвеня 1967 г., пры праверцы мінскіх інтэрнатаў Міністэрства будаўніцтва зарэгістравалі 1355 парушэнняў прапіскі: 976 рабочых былі прапісаны ў інтэрнатах, хоць там не жылі, а 379 рабочых, наадварот, жылі ў інтэрнатах без прапіскі. Мяркуючы па гэтым, 18% рабочых Міністэрства будаўніцтва не мелі прапіскі[737].

Можна зрабіць выснову, што ў пасляваенны час камунальныя кватэры, баракі і інтэрнаты ўяўлялі сабой месца сацыялізацыі для патоку мігрантаў. У той час як камуналка ўяўляла сабой "плавільны кацёл" розных каштоўнасцяў і нормаў, спрыяючы развіццю менталітэту савецкага чалавека, барак быў своеасаблівым працягам сельскай субкультуры ўнутры горада. На фоне цяжкіх умоў жыцця ў 1940-я гг. дзіўнай выглядае настальгічная ідэалізацыя прынцыпу "роўнасці ў галечы", якую можна сустрэць ва ўспамінах відавочцаў аб іх перасяленні з вёскі ў горад[738].

### в) Маламетражныя кватэры ў мікрараёнах

На пачатку 1960-х гг. дзякуючы заснаванай на ўзвядзенні панэльных дамоў праграме забудовы мікраёнаў не толькі быў пераадолены востры недахоп жылля, але і распаўсюдзіўся гарадскі лад жыцця. У сувязі з масавым перасяленнем мігрантаў першага пакалення ў "хрушчобы" на другі план адышлі баракі,

[736] ДАМВ, ф. 69, воп. 6, спр. 595, арк. 77–81.
[737] ДАМВ, ф. 69, воп. 6, спр. 603, арк. 70–74.
[738] Пар. з Масквой: Мигранты в крупном городе: история семьи Шинелевых // Судьбы людей: Россия. XX век. Биографии семей как объект социологического исследования / отв. ред.: В. Семенова, Е. Фотеева. Москва, 1996. С. 70–98; Долгих Е. Миграционные проекты сквозь призму индивидуального жизненного опыта // Тамсама. С. 355–372; Семенова В. Равенство в нищете: символ и значение "коммуналок" // Тамсама. С. 373–389, тут с. 383.

драўляныя дамы і камуналкі. Атрыманне асобнай кватэры для большасці насельніцтва ўпершыню зрабіла магчымым "сыход" у прыватнае жыццё[739]. Але перасяленне азмрочвалі і недахопы ў будаўніцтве, на адрас якога з усіх бакоў гучала крытыка, і маламетражныя ды малагабарытныя кватэры, якія не адпавядалі патрэбам нават адной сям'і з адным – двума дзецьмі. У гэтым сэнсе ўрбанізацыя пасля Другой сусветнай вайны прывяла да знікнення традыцыйнай вялікай сям'і. Характэрным у гэтай сувязі было памяншэнне да мінімальнай плошчы кухні – цэнтра жыцця сям'і. Хоць жыхары мікрараёнаў у кватэрах мелі цэнтральнае ацяпленне, ванну і туалет (калі ўсё было падключана і працавала), яны плацілі за гэта сацыяльнай адчужанасцю. Жыццё ў асобных кватэрах не спрыяла з'яўленню новых кантактаў, а з-за дрэннай гукаізаляцыі ў кватэрах узнікалі канфлікты з суседзямі. З прычыны арыентацыі жыхароў на сям'ю і наяўнасці сацыяльнага забеспячэння на прадпрыемствах канцэпцыя калектыўнага добрасуседства была асуджана на правал[740].

Характэрна, што катэгорыя асобнай кватэры пачала выконваць ролю ў савецкай сацыяльнай статыстыцы толькі з пачатку 1960-х гг. Усесаюзная інвентарызацыя гарадскога жыллёвага фонду на 1 студзеня 1960 г. дае ўяўленне пра сітуацыю ў Мінску ў пачатку масавага жыллёвага будаўніцтва. Паводле дадзеных, тры чвэрці насельніцтва жылі ў шматкватэрных дамах і бараках дзяржаўнага сектара, а адна чвэрць – у драўляных дамах прыватнага сектара (табліца 30). Пры гэтым трэба ўлічваць, што кожныя дзве з трох дзяржаўных кватэр былі камуналкамі[741] і што сёмую

[739] Пар.: Shlapentokh V. Public and Private Life of the Soviet People. Changing Values in Post-Stalin-Russia. New York, 1989; Kharkhodin O. Reveal and Dissimulate: A Genealogy of Private Life in Soviet Russia // Public and Private in Thought and Practice. Perspectives on a Grand Dichotomy / Ed. by Weintraub J., Kumar K. Chicago / London, 1997. P. 333–363; Вайль П., Генис А. 60-е. Мир советского человека. Изд. 2-е, испр. Москва, 1998.

[740] Пар.: Teckenberg W. Das Leben in sowjetischen Städten. I. Einige sozio-demographische Aspekte. II. Konzeption und Realität des Mikrorayons // Osteuropa. Zeitschrift für Gegenwartsfragen des Ostens. 1982. Bd. 32. S. 87–99, 213–225; Ruble B. A. From khrushcheby to korobki // Russian Housing in the Modern Age. Design and Social History / Ed. by Brumfield W. C., Ruble B. A. Cambridge / New York, 1993. P. 232–270; Boym S. The Archaeology of Banality: The Soviet Home // Public Culture. 1993–1994. № 6, P. 263–292; Gerchuk I. The Aesthetics of Everyday Life in the Khrushchev Thaw in the USSR 1954–64 // Style and Socialism. Modernity and Material Culture in Post-War Eastern Europe / Ed. by Reid S. E., Crowley D. Oxford / New York, 2000. P. 81–99.

[741] Пар.: ч. V. 3. б.

частку жыхароў прыватных дамоў складалі кватаранты з часовай прапіскай (табліца 31). Хоць указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 26 жніўня 1948 г. дазваляў будаўніцтва і куплю адна- і двухпавярховых прыватных дамоў плошчай да 60 кв. м і да 5 пакояў[742], у Мінску ў 1960 г. з больш чым 20 тыс. дамоў налічвалася толькі 22 дамы вышэй аднаго паверха[743]. З суадносін уладальнікаў, дамоў і кватэр відаць, што ў 25% усіх выпадкаў гаворка ішла пра двухкватэрныя дамы. У сярэднім у кожнай дзяржаўнай кватэры было больш за 2,3 пакоя, а ў кожнай кватэры, якая знаходзілася ў прыватнай уласнасці, – больш за 2,4 пакоя; плошча кватэр у дзяржаўным сектары ў сярэднім складала 53 кв. м агульнай плошчы, у прыватным сектары – 36,5 кв. м. Інтэрнаты не ўлічваліся пры падліку шчыльнасці заселенасці: індывідуальная жылая плошча складала 5,7 кв. м у дзяржаўным сектары і 5, 8 кв. м у прыватным сектары, што было нашмат ніжэй санітарнай нормы ў 9 кв. м. Калі да карыснай плошчы дадаць кухні, калідоры і санвузлы, то ў дзяржаўных кватэрах на чалавека прыпадала 8,4 кв. м, а ў прыватных дамах – 7,8 кв. м. У дзяржаўным сектары на кватэру прыпадала ў сярэднім 6,3 чалавека і 2,7 чалавека на пакой, у прыватных – адпаведна 4,7 і 2 чалавекі (табліца 30).

**Табліца 30.** Жыллёвы фонд г. Мінска на 1 студзеня 1960 г.*

| Катэгорыі | дзяржаўны сектар | прыватны сектар |
|---|---|---|
| Дамы | 6547 | 20059 |
| – асабістая плошча | 2106751 кв. м | 746135 кв. м |
| – агульная плошча | 3135516 кв. м | 959412 кв. м |
| Жыхары | 371 224 | 123491 |
| – асабістая плошча / чал. | 5,7 кв. м | 6 кв. м |
| – агульная плошча / чал. | 8,4 кв. м | 7,8 кв. м |
| Кватэры | 59123 | 26281 |
| – агульная плошча | 1893100 кв. м | 746224 кв. м |
| – плошча / кватэра | 32 кв. м | 28,4 кв. м |
| Колькасць пакояў | 137368 | 60912 |
| Сярэдняя плошча пакоя | 15,2 кв. м | 12,2 кв. м |
| Колькасць жыхароў у разліку на пакой | 2,7 | 2 |

* Без уліку інтэрнатаў агульнай плошчай 209 тыс. кв. м на 47 756 чалавек (гл. дадатак, табліца XVII).

*Крыніца:* ДАМВ, ф. 1035, воп. 1, спр. 638, арк. 63–64.

742 Жилищное законодательство. Минск, 1961. С. 70.
743 ДАМВ, ф. 1035, воп. 1, спр. 638, арк. 95–96.

**Табліца 31.** Плошча і заселенасць прыватных дамоў у Мінску на 1 студзеня 1960 г.

| Плошча | Уладальнікі | Дамы | Кватэры | Пакоі | Жыхары | | Плошча (кв. м) |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | пастаянна | часова | |
| ≤ 30 кв. м | 6468 | 6751 | 7040 | 10883 | 24407 | 3137 | 129025 |
| 30–60 кв. м | 13759 | 11132 | 14382 | 38083 | 61352 | 10723 | 454505 |
| 60–100 кв. м | 3899 | 2009 | 4294 | 11522 | 17764 | 3393 | 143040 |
| ≥ 100 кв. м | 485 | 167 | 571 | 1494 | 2221 | 494 | 19565 |
| Усяго: | 24611 | 20059 | 26287 | 61982 | 105744 | 17747 | 746135 |

*Крыніца:* ДАМВ, ф. 1035, воп. 1, спр. 638, арк. 98.

Беларуская прэса ў пачатку 1960-х гг. апісвала мікрараёны як месца, якое змагло ўвасобіць у сабе калектыўны лад жыцця савецкіх людзей. Пад гэтым мелася на ўвазе, у прыватнасці, "далейшае развіццё і ўдасканаленне калектыўнага выхавання дзяцей у дашкольных установах, групах падоўжанага дня і школах-інтэрнатах; сістэмы грамадскага харчавання і бытавога абслугоўвання шляхам выцяснення непрадукцыйнай дробнай хатняй гаспадаркі шырокай сеткай сталовых, дамавых кухняў, устаноў бытавога абслугоўвання; аховы здароўя, спартыўных пляцовак і стадыёнаў і інш."[744]. Такім чынам, мікрараён стылізаваўся пад новую ячэйку "сацыялістычнага горада". Аднак гэта было толькі на словах. У наступных дыскусіях сацыяльныя эксперыменты больш не абмяркоўваліся. Пры планаванні гаворка ішла ў першую чаргу аб рашэнні тэхнічных праблем[745].

Для мікрараёнаў беларускіх гарадоў была запланавана тэрыторыя 20–70 га з чатырох- і пяціпавярховымі панэльнымі дамамі на 7–24 тыс. чалавек. Пры арганізацыі мікрараёнаў выкарыстоўваліся наступныя прынцыпы: па-першае, акружэнне тэрыторыі магістральнымі вуліцамі, якія забяспечвалі б доступ да ўнутрыгарадскога руху; па-другое, такая сістэма дарог, якая, з аднаго боку, не дазваляе скразнога руху, а з другога – адкрывае доступ да ўсіх дамоў; і, па-трэцяе, наяўнасць культурных устаноў і прадпрыемстваў бытавога абслугоўвання, а таксама паркаў, сквераў і спартыўных пляцовак[746]. Спраектаваны

[744] Микрорайоны Белоруссии / под ред. В. А. Короля. Минск, 1963. С. 3.

[745] Пар.: Аникин В. И. Жилой район крупного города: Опыт Белоруссии. Москва, 1987.

[746] Микрорайоны Белоруссии… С. 10, 16.

ў 1958–1959 гг. мікрараён па вул. Валгаградскай (да 1961 г. вул. Сталінградская) на паўночным усходзе Мінска быў прататыпам і паказальным аб'ектам беларускага гарадскога планавання. Размешчаныя на тэрыторыі 38,2 га семдзесят шэсць 4–5-павярховых дамоў з роўным дахам і чатыры 8-павярховыя інтэрнаты былі разлічаны на 12 200 чалавек. Кожныя пяць жылых дамоў утваралі двары з дзіцячымі дашкольнымі ўстановамі, а ў тарцы паміж дамамі размяшчаліся крамы (іл. 32). Усяго было запланавана 4732 кватэры, у тым ліку 1765 аднапакаёвых (37,2%), 2527 двухпакаёвых (53,45%) і 440 трохпакаёвых (9,3%)[747]. Нягледзячы на прыгожыя абяцанні планавання, даўнія працўнікі не прынялі гэтай канцэпцыі і праз дзесяцігоддзі пасля з'яўлення мікрараёна працягвалі наракаць на манатонныя пабудовы і неспрыяльныя ўмовы жыцця (іл. 33). Акрамя таго, крытыкавалася плошча кватэр, якая не адпавядала патрэбам сем'яў[748].

Як паказваюць вынікі апытання 1982–1983 гг., жыллёвае асяроддзе мікрараёнаў задавальняла іх жыхароў. Мікрараёны Зялёны Луг-5 і Масюкоўшчына-2, якія складаюцца з шматпавярховых дамоў эпохі Брэжнева, структурна падобныя адзін на аднаго (іл. 34). Яны знаходзяцца на паўночна-ўсходняй і паўночна-заходняй ускраінах горада, кожны мае зялёныя зоны. Будаўніцтва жылога раёна Зялёны Луг з сямі мікрараёнаў, разлічанага на 92 тыс. жыхароў, пачалося ў 1962 г.; аднайменная вёска была ўключана ў склад горада ў 1976 г. Недалёка ад вёскі Масюкоўшчына ў 1976 г. паўстаў жылы раён з двух мікрараёнаў на 22 400 жыхароў. Згодна з вынікамі апытання, уласная кватэра была вырашальным фактарам для добрага маральнага стану жыхароў. Дом і двор займалі другое месца. З-за аднастайнасці комплексаў шматпавярховых дамоў многія жыхары адчувалі цяжкасці з арыентаваннем. На карысць Зялёнага Луга сведчыла блізкае размяшчэнне да вады (іл. 35), супраць Масюкоўшчыны – найбліжэйшая пустка. Зялёны Луг, як больш гамагенны жылы комплекс, больш заахвоч-

[747] Пар.: Громов П. А. и др. Планировочные принципы опытно-показательного микрорайона в Минске // СНРИСА 1960. № 3. С. 139–151; ён жа і інш.: Прогрессивные приёмы застройки жилых территорий // СНРИСА 1961. № 5. С. 30–44.

[748] Громов П. А. Формирование жилищной среды в новых микрорайонах Минска // Преобразование городской среды. Тезисы докладов республиканской научно-технической конференции (10–11 мая 1973 г.). Минск, 1973. С. 97–98.

ваў да прагулак, чым Масюкоўшчына (табліца 32). Характэрна, што ў апытанні не згадваўся былы лагер для ваеннапалонных у Масюкоўшчыне.

**Табліца 32.** Апытанне жыхароў мікрараёнаў Зялёны Луг-5 і Масюкоўшчына-2 у 1982–1983 гг. (станоўчыя адказы ў %).

| Пытанне | Зялёны Луг-5 | Масюкоўшчына-2 |
|---|---|---|
| Паводзіны | | |
| Ці агледзелі Вы ўвесь мікрараён? | 81,2 | 72,6 |
| Ці гуляеце Вы ў вольны час па мікрараёне? | 97,0 | 18,2 |
| Ці ёсць у Вас сябры, знаёмыя сярод суседзяў? | 25,7 | 34,2 |
| Ці можаце Вы паказаць дарогу ад Вашага дома да прыпынку? | 58,5 | 47,6 |
| Намеры | | |
| Ці хочаце Вы пакінуць мікрараён? | 0,0 | 4,8 |
| Ці хочаце Вы, каб Вашы дзеці потым жылі ў гэтым мікрараёне? | 91,4 | 60,5 |
| Стаўленне да навакольнага асяроддзя | | |
| Ці падабаецца Вам дом, у якім Вы жывяце? | 59,3 | 41,3 |
| Ці падабаецца Вам двор побач з домам? | 27,8 | 25,8 |
| Ці разглядаеце Вы двор як "Ваш"? | 53,0 | 35,1 |
| – Моладзь | 57,9 | 27,8 |
| – Пенсіянеры | 57,1 | 6,6 |
| Ці баіцёся Вы ісці ўвечары адна дадому? (пытанне да жанчын) | 32,3 | 79,4 |

*Крыніца:* Хачатрянц К. К., Пономарева Е. С., Колонтай А. Н. О социальной эффективности архитектурной композиции микрорайонов // САБ. 1984. Ч. 2. С. 6–11, тут с. 7.

У рэчаіснасці масавае жыллёвае будаўніцтва азначала для сем'яў жыццё ў цеснаце ў маламетражных і малагабарытных кватэрах. З 1961 да 1972 г. колькасць кватэр у Мінску вырасла з 85 900 да 219 400. У той час як доля двухпакаёвых кватэр павялічылася з 43,1% да 52,6%, доля трохпакаёвых кватэр скарацілася з 27,1% да 20,7%. Амаль на адным узроўні заставаліся долі аднапакаёвых (21,4% і 19,2%) і чатырохпакаёвых кватэр (8,5% і 7,5%) (гл. дадатак, табліца XXI). Недахоп больш зручных для сем'яў трох- і чатырохпакаёвых кватэр адлюстроўваецца ў выніках даследавання Інстытута будаўніцтва і архітэктуры ў 1967–1968 гг. Даследаванне ахоплівала 29 400 кватэр у Мінску, заселеных у перыяд з 1964 да 1966 г. На 874 500 кв. м жылой плошчы пражывалі 106 тыс. чалавек, пры гэтым на кожнага прыпадала 8,2 кв. м. Амаль кожная кватэра адпавядала адной

сям'і[749], дзве трэція сем'яў складаліся з 3–4 чалавек (табліца 33). Больш за тры чвэрці кватэр мелі толькі 1–2 пакоі (табліца 34).

**Табліца 33.** Склад сем'яў у кватэрах Мінска ў новых дамах у 1967–1968 гг. (у %).

| 1 чалавек | 2 чалавекі | 3 чалавекі | 4 чалавекі | 5 чалавек | 6 чалавек і болей |
|---|---|---|---|---|---|
| 3,7 | 14,3 | 30,0 | 35,0 | 13,0 | 4,0 |

*Крыніца:* Громов П. А. Формирование структуры городского жилого фонда и условия его заселения // Архитектура и градостроительство / глав. ред. В. А. Король. Минск, 1972. С. 69–73, тут с. 71.

**Табліца 34.** Колькасць жылых пакояў у новабудоўлях Мінска ў 1967–1968 гг. (у %).

| 1 пакой | 2 пакоі | 3 пакоі | 4 пакоі і больш |
|---|---|---|---|
| 26,0 | 56,0 | 17,3 | 0,7 |

*Крыніца:* Громов П. А. Формирование структуры городского жилого фонда и условия его заселения // Архитектура и градостроительство / глав. ред. В. А. Король. Минск, 1972. С. 69–73, тут с. 71.

На пытанне, ці магло ў такіх умовах быць выканана ў Мінску абяцанне праграмы партыі 1961 г. выдзеліць да 1980 г. кожнай сям'і па кватэры, можна адназначна даць адмоўны адказ, зыходзячы з вынікаў выбарачнага абследавання 1978 г.: з 10 800 абследаваных у Мінску сем'яў толькі дзве трэція жылі ў асобных кватэрах. Аднак было ўстаноўлена, што даміноўная ў 1950-я гг. форма пражывання ў камуналцы страціла сваё ранейшае значэнне, і доля камуналак складала менш за 10%. З прычыны забароны 1963 г. на індывідуальнае жыллёвае будаўніцтва ў цэнтры горада прыватныя дамы, доля якіх была роўная 5%, выконвалі толькі другарадную ролю. На “времянки” прыпадала толькі 1,3%. Аднак кідаецца ў вочы, што 8,1% усіх сем'яў здымалі кватэры. Акрамя таго, важная роля адводзілася інтэрнатам: 9,1% усіх сем'яў нейкі час карысталіся гэтым часовым жыллём (табліца 35). Хоць такі вынік паказваў, што востры недахоп жылля, характэрны для 1950–1960-х гг., быў пераадолены, аднак пра поўнае вырашэнне жыллёвага пытання не было і гаворкі.

[749] Громов П. А. Формирование структуры городского жилого фонда и условий его заселения // Архитектура и градостроительство / глав. ред. В. А. Король. Минск, 1972. С. 69–73, тут с. 70.

**Табліца 35.** Размеркаванне мінскіх сем'яў па тыпах жылля ў 1978 г. (у %).

| Асобная кватэра | Камуналка | Інтэрнат | Падвал | Барак | Прыватны дом | Здыманне кватэры | | Палаткі, вагоны |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | дзяржаўны сектар | прыватны сектар | |
| 67,2 | 9,3 | 9,1 | 0,3 | 0,8 | 5,0 | 4,8 | 3,3 | 0,2 |

*Крыніца:* Состав семей, доходы и жилищные условия рабочих, служащих, колхозников (Материалы выборочного обследования 10,8 тысяч семей рабочих, служащих, колхозников за сентябрь 1978 года). Для служебного пользования. Минск, 1979. С. 45.

Ва ўмовах масавага жыллёвага будаўніцтва ў Мінску ўзмацнілася тэндэнцыя да падзелу вялікіх сем'яў. Некалькі пакаленняў адной сям'і больш не імкнуліся жыць разам. Паводле дадзеных канца 1970-х гг. Мінскага бюро па абмене кватэр, у маладых людзей, якія жылі з бацькамі, было два шляхі да самастойнасці: з аднаго боку, ім дзесьці ў 26-гадовым узросце пераходзілі кватэры ад бабуль і дзядуляў (тым было каля 70 гадоў і іх выпраўлялі жыць да бацькоў маладых). З іншага боку, яны імкнуліся здымаць кватэры[750]. Мяркуючы па рэкламных аб'явах у штотыднёвым дадатку да газеты "Вячэрні Мінск", 90% сем'яў, што хацелі зняць кватэру, былі шлюбнымі парамі, якія яшчэ не дасягнулі 30-гадовага ўзросту, 585 мелі дзяцей[751]. Такім чынам, дэфіцыт жылля адчувалі перш за ўсё маладыя сем'і. Паказальныя вынікі праведзенага ў 1977–1978 гг. апытання сярод прыкладна 2000 чалавек, якія ўпершыню ўступілі ў шлюб і зарэгістравалі нараджэнне дзіцяці. Высветлілася, што толькі 3% маладых мелі ўласную кватэру; 52% жылі ў бацькоў, 31% – у інтэрнаце, 14% здымалі кватэру (табліца 36). Толькі 21% шлюбных пар стаялі ў чарзе на кватэру; толькі 16% мелі рэальныя шанцы на паляпшэнне жыллёвых умоў у найбліжэйшыя гады[752]. Разам з тым пры нараджэнні першага дзіцяці 17,2% усіх шлюбных пар мелі асобную кватэру, 43,7% жылі ў бацькоў, 30,6% здымалі кватэры. У інтэрнатах жыло 8,5%. Стварэнне сям'і цягнула за сабой, як правіла, перасяленне з інтэрната на прыватную кватэру (табліца 36). Пасля нараджэння другога дзіцяці 22% тых, хто ўжо меў жыллё, і 65% тых, хто яшчэ жыў у бацькоў, былі ўнесены ў спіс чаргаві-

[750] Шахотько Л. П., Босина Л. Г. Семья и ее жилищные условия // Вопросы народонаселения, труда и уровня жизни / науч. ред.: А. А. Раков, Л. П. Шахотько. Минск, 1980. С. 3–16, тут с. 4.

[751] Тамсама.

[752] Тамсама, с. 8.

коў на кватэру. Такім чынам, рашэнне аб нараджэнні другога дзіцяці матывавалася пошукам кватэры[753].

**Табліца 36.** Жыллёвыя ўмовы мінскіх сем'яў пасля шлюбу, а таксама пасля нараджэння першага і другога дзіцяці ў 1977–1978 гг. (вынікі апытання ў %).

| | Уласнае жыллё | Жыллё бацькоў | Інтэрнат | Прыватная кватэра |
|---|---|---|---|---|
| Шлюб | 3 | 52 | 31 | 14 |
| 1-е дзіця | 17,2 | 43,7 | 8,5 | 30,6 |
| 2-е дзіця | 61,1 | 18,8 | 4,0 | 16,1 |

*Крыніца:* Шахотько Л. П., Босина Л. Г. Семья и ее жилищные условия // Вопросы народонаселения, труда и уровня жизни / науч. ред. А. А. Раков, Л. П. Шахотько. Минск, 1980. С. 3–16, тут с. 9, 10.

Савецкія сацыяльныя тэхнакраты на аснове дадзеных перапісу насельніцтва 1989 г. адзначылі станоўчы вынік для жыхароў Мінска пачатага пры Хрушчове масавага жыллёвага будаўніцтва. Без сумневу, у 1970–1980-я гг. напружанне ў жыллёвай сферы зменшылася: упершыню ў савецкай гісторыі сярэдняя санітарная норма жылой плошчы ў 9 кв. м, прынятая ў 1931 г., стала рэальнасцю, а санітарная норма агульнай індывідуальнай плошчы 14 кв. м перавысіла патрабаванні Жыллёвага кодэкса БССР 1983 г. на 2 кв. м (табліца 37). Аднак за гэтымі лічбамі па-ранейшаму хавалася адносна высокая шчыльнасць заселенасці: напрыклад, у той жа час на кожнага жыхара ФРГ прыпадала 37 кв. м жылой плошчы, а ГДР – 28 кв. м[754]. Акрамя таго, у Мінску сярэдняя жылая плошча сем'яў, якія мелі больш за адно дзіця, і тых, хто пражываў асобна ад сям'і, па-ранейшаму не адпавядала санітарнай норме (табліца 37).

**Табліца 37.** Размеркаванне мінскага насельніцтва па сярэдняй агульнай і карыснай жылой плошчы на чалавека ў 1989 г.

| | Сярэдняя плошча на кожнага (у кв. м) | |
|---|---|---|
| | Агульная плошча | Карысная плошча |
| Усё насельніцтва | 14 | 9 |
| – Члены сям'і, якія жывуць разам з сям'ёй | 14 | 9 |

[753] Тамсама с. 9.
[754] Zapf K. Haushaltsstrukturen und Wohnverhältnisse // Geschichte des Wohnens. Bd. 5: 1945 bis heute. Aufbau, Neubau, Umbau / Hrsg. v. Flagge I. Stuttgart, 1999. S. 563–614, тут S. 578.

| | Сярэдняя плошча на кожнага (у кв. м) | |
|---|---|---|
| | Агульная плошча | Карысная плошча |
| – Члены сям'і, якія жывуць асобна ад сям'і | 8 | 5 |
| – Адзінокія | 24 | 14 |
| Усе сем'і | 14 | 9 |
| – 2 чалавекі | 19 | 12 |
| – 3 чалавекі | 14 | 9 |
| – 4 чалавекі | 13 | 8 |
| – 5 і больш чалавек | 11 | 7 |

*Крыніца:* Численность, возрастная структура, состояние в браке, число и размер семей, национальный состав, уровень образования, источники средств существования, баланс трудовых ресурсов, жилищные условия населения города Минска в разрезе внутригородских районов. По данным Всесоюзной переписи населения на 12 января 1989 года. Минск, 1991 (Для служебного использования). С. 152.

Паказальныя для жыллёвых умоў у Мінску факты, якія робяцца відавочнымі, калі паглядзець на вынікі перапісу насельніцтва 1989 г. Хоць ужо амаль тры чвэрці насельніцтва жылі ў асобных кватэрах, усё яшчэ больш за 11% жыхароў былі вымушаны жыць у камуналках, а амаль 8% – у інтэрнатах (табліца 38). Больш за 300 тыс. чалавек пражывалі ў мікрараёнах, пабудаваных у хрушчоўскую эпоху, больш за 700 тыс. чалавек – у жылых раёнах часоў Брэжнева (табліца 39). 47,6% насельніцтва, якія мелі асобныя кватэры, жылі ў двухпакаёвых кватэрах, а 31,8% – у трохпакаёвых. 67,7% насельніцтва, якія жылі ў камунальных кватэрах, мелі адзін пакой, 24% – два пакоі. 59,7% насельнікаў інтэрнатаў жылі ў шматмесных пакоях, 41,3% мелі асобныя пакоі. Дзве трэція з 180 тыс. жыхароў камуналак жылі ў дамах, пабудаваных у 1960–1970-я гг. (табліца 39). Пазбавіцца ад камуналкі з дапамогай масавага жыллёвага будаўніцтва не атрымалася. У камунальных кватэрах пражывала 57 251 сям'я, 13 324 адзінокія і 3099 разведзеных; у інтэрнатах жылі 15 540 сем'яў, 35 119 адзінокіх і 44 242 разведзеных (гл. дадатак, табліца XXII). Між тым, прыватныя драўляныя дамы перасталі выконваць істотную ролю ў забеспячэнні жыллём: менш за 5% насельніцтва Мінска жылі ў прыватных дамах (табліца 38). Каля 8 тыс. чалавек, якія пражывалі ў пабудаваных пасля 1960-х гг. драўляных дамах у бліжэйшых да Мінска вёсках, змаглі ў выніку ўключэння іх у рысу горада стаць мінчанамі (табліца 39). У 56,7% насельнікаў, якія жылі ў прыватных дамах, было чатыры і больш пакояў, 29,1% жылі ў прыватных дамах на дзве сям'і, мелі па адным пакоі, а 41,7% – па два пакоі

(гл. дадатак, табліца XXII). Значная колькасць людзей па-ранейшаму пакутавала ад недахопу жылля: сціплы кут у камуналцы быў рэальнасцю для 8937 чалавек, або 2389 сем'яў, 2201 адзінокіх і 595 разведзеных. У прыватных дамах на некалькі сем'яў пражывала 454 чалавекі, або 109 сем'яў, 96 адзінокіх і 33 разведзеных, а ў інтэрнатах – 664 сям'і, або 1560 чалавек (гл. дадатак, табліца XXII). Можа здацца дзіўным разыходжанне паміж колькасць асоб, якія мелі пастаянную прапіску (1,6 млн), і колькасцю зарэгістраваных на момант перапісу (1,5 млн). Тут розніца ў няпоўных 100 тыс. чалавек тлумачыцца прынятымі ў перапісе насельніцтва СССР паняццямі – “пастаяннае насельніцтва” і “наяўнае насельніцтва”. Трэба зыходзіць з таго, што прыкладна 5% насельніцтва ў Мінску мела часовае месца жыхарства і пражывала ў знаёмых і сваякоў або неафіцыйна здымала жыллё ў прыватным сектары (табліца 38).

**Табліца 38.** Размеркаванне насельніцтва Мінска паводле тыпу жылля ў 1989 г.

| Жыхары | Колькасць перапісаных | З іх жывуць | | | | | Іншае | На прыватных кватэрах |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | у асобных кватэрах | у прыватных дамах | у камуналках | у прыватных дамах на некалькі сем'яў | у інтэрнатах | | |
| 1607077 | 1535209 | 1160444 | 25173 | 180751 | 43289 | 125552 | 815 | 17354 |
| 100% | 95,8% | 72,2% | 1,6% | 11,2% | 2,7% | 7,8% | 0,0% | 1,1% |

*Крыніца:* як у табліцы 37. С. 121.

**Табліца 39.** Размеркаванне насельніцтва Мінска паводле тыпу і года будаўніцтва жылля ў 1989 г.

| Год | Колькасць перапісаных | Размеркаванне паводле тыпаў жылля | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | асобная кватэра | прыватны дом | камуналка | прыватны дом на некалькі сем'яў | інтэрнаты |
| да 1941 | 18361 | 7251 | 1809 | 3638 | 5078 | 585 |
| 1941–1950 | 32989 | 15461 | 3356 | 5995 | 5614 | 2563 |
| 1951–1960 | 175598 | 98331 | 14852 | 22405 | 24700 | 15310 |
| 1961–1970 | 403929 | 303506 | 4108 | 68818 | 6352 | 21145 |
| 1971–1980 | 508561 | 382808 | 600 | 61026 | 921 | 63206 |
| 1981–1988 | 395753 | 353085 | 448 | 18858 | 623 | 22739 |
| Усяго: | 1535209 | 1160444 | 25173 | 180751 | 43289 | 12552 |

*Крыніца:* як у табліцы 37. С. 145.

# VI. "Шэрыя" зоны і паўафіцыйныя сферы савецкай штодзённасці

## 1 Новыя Шэйпічы – "нічыйны" пасёлак

28 жніўня 1955 г. у газеце "Советская Белоруссия" з'явіўся артыкул з простым загалоўкам – "Новыя Шэйпічы". З-за таго, што матэрыял называўся фельетонам, ён абяцаў быць цікавым. Гаворка ідзе пра жанр, які знаходзіцца паміж апавяданнем і рэпартажам і да якога сталі звяртацца з пачаткам "адлігі" пасля смерці Сталіна. У лірычным уступе аўтар апісваў амаль кафкіянскую сітуацыю: маладая пара хоча зарэгістраваць нованароджанае дзіця і сутыкаецца з нечаканымі праблемамі, і ўсё гэта ператвараецца ў сапраўдную адысею. Не знаходзіцца ніводнага органа ўлады ні ў горадзе, ні ў вёсцы, у кампетэнцыю якога гэта ўваходзіла б. Адмову зарэгістраваць дзіця маладой пары абгрунтоўваюць тым, што яна з "нічыйнага пасёлка". Далей аўтар тлумачыць падаплёку гэтай незвычайнай гісторыі, умела балансуючы на мяжы выдумкі і рэчаіснасці. Ён распавядае пра тое, як першапраходца па імені Аляксандр Трафімавіч Двароўскі ў час нядзельнай прагулкі адкрыў невядомую для сябе зямлю і заснаваў пасёлак, не задумваючыся аб правілах сацыялістычнага гарадскога планавання. Пасёлак назвалі Новымі Шэйпічамі. З'явіўшыся як быццам з нічога, пасёлак прыцягваў шукальнікаў прыгод, якія прыязджалі сюды поўныя вялікіх чаканняў. Аднак неўзабаве нябачаныя дагэтуль умовы жыцця ў "новым свеце" прывялі да таго, што бацька-заснавальнік выклікаў абурэнне маладой абшчыны. Мараль гісторыі простая: з прычыны таго, што пасёлак Новыя Шэйпічы ізаляваў сябе ад вонкавага свету і не быў "савецкім", ён не мог карыстацца дасягненнямі сацыялізму, а на практыцы яго жыхары былі пазбаўлены сферы паслуг. Ва ўсякім выпадку, да такой высновы прыйшла "Советская Белоруссия"[755].

Крытычныя ноткі артыкула можна вытлумачыць як паслабленне цэнзуры і прадвеснік дэсталінізацыі. Калі паспрабаваць

[755] Михонов Н. Новые Шейпичи // СБ. 28.8.1955. № 204. С. 2.

зразумець артыкул у святле духу таго часу, то можна сцвярджаць, што культурны код, які ляжаў у яго аснове, быў так званым "сталінскім клопатам пра чалавека". Маюцца на ўвазе два выказванні Сталіна, якія тычацца ліквідацыі жабрацкіх кварталаў у "сацыялістычным горадзе" і нармалізацыі ўмоў жыцця ў ходзе аднаўлення краіны пасля вайны[756]. На фоне абвешчанага ў снежні 1954 г. карэннага пералому ў будаўніцтве фельетаніст насыпаў солі на раны мясцовых партыйных кіраўнікоў, адказных за стварэнне ў цэнтры беларускай сталіцы "музея сацыялістычнага рэалізму пад адкрытым небам". Новыя Шэйпічы, узніклыя ў звіліне ракі Свіслач на паўднёвым усходзе горада, уяўлялі сабой прыклад самавольнага будаўніцтва, што было свайго роду "пустазеллем", адным словам, тым злом, якое павінна быць знішчана. Аднак гвалтоўнае вырашэнне пытання шляхам хірургічнага ўмяшання здавалася немагчымым. Прынамсі, так бачылася сітуацыя "Советской Белоруссии": "Закрываць Новыя Шэйпічы занадта позна", – такой была выснова фельетона[757].

Як адрэагавалі кіраўнікі горада на пазіцыю афіцыйнай штодзённай газеты? Якія меры прымаліся дзяржаўнымі і партыйнымі органамі ўлады, каб ліквідаваць недахопы ў Новых Шэйпічах? Адказ просты: хоць, ці дакладней, менавіта таму, што грамадства было старанна арганізавана на ўзор ваеннай каманднай сістэмы, адказных не знайшлося. Улады дзейнічалі толькі ў рамках ускладзенай на іх кампетэнцыі. "Нічыйны пасёлак" ні да кога не адносіўся, таму рашэнне праблемы зацягвалася.

Справа зрушылася з мёртвай кропкі толькі ў студзені 1956 г., калі выканкам Мінскага раёна хадайнічаў аб перадачы Новых Шэйпічаў пад юрысдыкцыю Мінска[758]. Гэта прывяло да падрабязнага разгляду сітуацыі, у ходзе якога не толькі ўпраўленне міліцыі, але і Міністэрства фінансаў і Міністэрства абароны вызначылі свае пазіцыі[759]. У асобных пунктах іх меркаванні супярэчылі адно аднаму, што было ў духу савецкай службовай цяганіны. Але гісторыю Новых Шэйпічаў у агульных рысах усё ж можна рэканструяваць.

[756] Пар.: ч. II. 1. а.
[757] Михонов Н. Новые Шейпичи. С. 2.
[758] НАРБ, ф. 7, воп. 4, спр. 725, арк. 60–61.
[759] НАРБ, ф. 7, воп. 4, спр. 725, арк. 52–55, 59, 62–63.

У кастрычніку 1947 г. калгас імя Панамарэнкі выдзеліў Міністэрству ўнутраных спраў участак памерам 25,5 га побач з Мінскам. Тут пабудавалі аддзяленне лагера для нямецкіх ваеннапалонных, у задачу якога ўваходзіла здабыча жвіру і пяску. Такім чынам, дадзены зямельны ўчастак з 1948 г. не быў зарэгістраваны ў кадастры Мінскага раёна. Аднак лагер праіснаваў не больш за два гады. Да канца 1949 г. усе ваеннапалонныя, якія знаходзіліся ў БССР, былі дэпартаваны на радзіму або прызнаны ваеннымі злачынцамі і сасланы ва ўсходнія раёны Савецкага Саюза[760]. Тым не менш, афіцыйнага закрыцця лагера, відавочна, не адбылося. Напрошваецца здагадка: баракі проста перайшлі да аховы. Вясной 1950 г. пачалося нелегальнае будаўніцтва драўляных дамоў на тэрыторыі былога лагера. Тады ж на "сцэне" з'явіліся новыя "акторы" – "гандляры нерухомасцю". Яны забяспечвалі прыватным жыллём прыезджых. Так фармаваўся пасёлак, які атрымаў імя ад размешчанай за 200–300 м ад яго вёскі Шэйпічы. Да пачатку 1957 г. у Новых Шэйпічах пабудавалі каля 200 дамоў, дзе жылі каля 1500 чалавек, пераважна рабочыя і служачыя суседняга велазавода. Але ў дакументах таксама можна сустрэць згадкі пра людзей, якія нідзе не працавалі. Назавем іх капіталістамі. Яны знаходзілі шляхі доступу да будматэрыялаў і жылі, атрымліваючы даходы ад сваіх дамоў. Акрамя таго, у Новых Шэйпічах знайшлі прытулак 60 міліцыянераў з сем'ямі[761]. Гаворка ішла пра групу людзей, на самай справе прапісаных у Мінскім раёне, пражыванне якіх у дадзеным пасёлку надавала яму статус нейкай легальнасці. Па вялікім рахунку, тут усё было добра арганізавана. Вынаходлівыя жыхары правялі электрычнасць ад гарадской сеткі, усталявалі радыёкропкі і пранумаравалі дамы. Але ўсім было зразумела, што на гэтай тэрыторыі не дзейнічаюць закон і ўлада. З адміністрацыйнага пункту гледжання пасёлак нікому не падпарадкоўваўся, а яго жыхары ні да кога не адносіліся[762]. Ні выканкам Мінскага раёна, ні выканкам Сталінскага раёна г. Мінска не лічылі сябе

[760] Пар.: ч. III. 3. а.

[761] 17 сакавіка 1948 г. начальнік упраўлення міліцыі г. Мінска далажыў сакратару гаркама КП(б)Б і старшыні Мінгарвыканкама, што 1300 супрацоўнікаў міліцыі маюць вострыя жыллёвыя праблемы. 400 міліцыянераў з сем'ямі неабходна было выселіць за межы горада. ДАМВ, ф. 69, воп. 1, спр. 251, арк. 49.

[762] НАРБ, ф. 7, воп. 4, спр. 725, арк. 62.

адказнымі за дадзены пасёлак, таму жыхары Новых Шэйпічаў не былі зарэгістраваны ні ў адным адрасным стале. Мужчыны прызыўнога ўзросту не былі на ўліку ў ваенкаматах. Не было таксама і фінансавага органа, куды б плацілі падаткі і рабілі розныя адлічэнні.

Сур'ёзна заняцца праблемай Новых Шэйпічаў Мінгарвыканкам вырашыў пасля ХХ з'езда партыі, на якім Хрушчоў не толькі развянчаў культ асобы, але і абвясціў абмежаванне росту буйных гарадоў[763]. Пры гэтым характэрна, наколькі стрымана прагучалі ў Мінгарвыканкаме ў красавіку 1956 г. заявы работнікаў міліцыі, якія выдатна ведалі пра сітуацыю. Наконт выпадкаў самавольнага будаўніцтва прынялі кампраміснае рашэнне: паселішча не зносіць, аднак "душыць у зародку" падобнае "пустазелле", калі яно будзе з'яўляцца на ўскраінах горада[764]. На закрытым паседжанні ЦК КПБ у кастрычніку 1956 г. толькі некалькі рашучых партыйных кіраўнікоў выступілі за "чысткі". Яны прапанавалі жыхароў вёсак, якія пакінулі свае калгасы за апошнія некалькі гадоў без адпаведнага дазволу, выслаць назад. Прапанова знайшла падтрымку ў нешматлікіх прысутных начальнікаў ад эканомікі, у якіх быў свой інтарэс па выкарыстанні вялікай колькасці працоўнай сілы[765]. Так быў санкцыянаваны сярэднявечны прынцып, які абвяшчаў – "гарадское паветра дарує свабоду". Сапраўды, выпадак з Новымі Шэйпічамі быў не выключэннем, а хутчэй заканамернасцю. Ён сімвалізаваў пакутлівае адраджэнне і развіццё "сацыялістычнага горада" ў перыяд паміж пасляваеннай рэканструкцыяй і бумам росту насельніцтва[766].

Рашэнне праблемы Новых Шэйпічаў стала магчымым толькі дзякуючы таму, што публікацыя працытаванага фельетона супала па часе з карэнным пераломам у горадабудаўніцтве Савецкага Саюза. 23 і 24 жніўня 1955 г. саюзнае партыйнае і дзяржаўнае кіраўніцтва прыняло рашэнні, у адпаведнасці з якімі, з аднаго боку, адказнасць за гарадское планаванне ўскладалася на саюзныя рэспублікі, а з другога – прадпісвалася выкарыстанне прамысловых метадаў у будаўнічай галіне[767]. У выніку дзяржаўнае і партыйнае кіраўніцтва Мінска

[763] Пар.: ч. II. 1.
[764] ДАМВ, ф. 6, воп. 4, спр. 582, арк. 22–43, 50–54.
[765] ДАМВ, ф. 6, воп. 4, спр. 597, арк. 22–27, 37–39.
[766] Пар.: ч. IV. 3. б.
[767] Пар.: ч. II. 1.

вызвалялася ад неабходнасці выканання рашэнняў Крамля 1950 г. Яно не павінна было больш прытрымлівацца ўказанняў абмяжоўваць тэрыторыю беларускай сталіцы ў інтарэсах кампактнай забудовы. Пашырэнне рысы горада рабілася ў сувязі з пераглядам Генеральнага плана забудовы[768]. З уключэннем Новых Шэйпічаў у беларускую сталіцу 8 жніўня 1959 г. адначасова легалізаваліся самавольныя пабудовы[769]. Так апошні "свабодны горад" БССР стаў "савецкім". Па чутках, у 1960-я гг. у Новых Шэйпічах аселі перш за ўсё цыганы. І гэта была менавіта тая частка насельніцтва, якая пры рэканструкцыі пасёлка на мяжы 1960–1970-х гг. першай атрымала магчымасць парадавацца доўгачаканым кватэрам у новабудоўлях мікраараёна Серабранка. Рэшткі вёскі Шэйпічы на паўднёва-заходнім баку прытоку Свіслачы захаваліся да сёння. Яны знаходзяцца пасярод двухмільённага Мінска, за 30 хвілін хады ад цэнтра.

Калі ў 1930-я гг. у Магнітагорску існаваў, па словах Стывена Коткіна, "сталінізм як цывілізацыя"[770], то пасля Другой сусветнай вайны ў Новых Шэйпічах і іншых месцах на схіле жыцця "вялікага правадыра" паўстала заснаваная "бацькамі-першапраходцамі" паралельная культура. Гаворка ідзе пра прыватных прадпрымальнікаў і сялян, якія ўцяклі з вёскі. Яны рашаліся на жыццё на мяжы закону і маглі весці такі лад жыцця, бо знайшлі для гэтага тэрыторыю, свабодную ад закону. Дзяржаўнае і партыйнае кіраўніцтва Мінска было ў гэтым выпадку бездапаможным. Калі ператварэнне класаў у аморфную масу і атамізацыя грамадства адбываліся ў разгар эпохі сталінізму, то беларускі варыянт позняга сталінізму сведчыў пра няздольнасць апарату супрацьстаяць наплыву мігрантаў з вёскі, якія шукалі лепшай долі. Таму, кажучы мовай бальшавікоў, пра масавы энтузіязм у пабудове сацыялізму пасля Другой сусветнай вайны больш не магло ісці і гаворкі[771]. "Нармалізацыя ўмоў жыцця" была свайго роду заклінаннем позняга сталінізму, практычным наступствам якога стала кансалідацыя новых сацыяльных іерархій і сыход у прыватную сферу.

[768] Пар.: ч. ІІІ. 1. в.

[769] Сборник законов и указов Президиума Верховного Совета Белорусской ССР 1938–1973 гг. Т. І. Минск, 1974. С. 378.

[770] Пар.: Kotkin S. Magnetic Mountain. Stalinism as a Civilization. Berkeley / Los Angeles / London, 1995.

[771] Тамсама. С. 198–237.

## 2 Рэпетыцыя паўстання: "тэмпературныя" ваганні ў перыяд "адлігі"

Каб пераадолець супярэчнасць паміж жаданым у галіне эканомікі і сапраўдным у сацыяльнай сферы, улада савецкай сістэмы выкарыстоўвала інструмент "грамадскага кантролю". За гэтым стаяў інтарэс – прывесці ў адпаведнасць план і яго выкананне шляхам узаемадзеяння ўсіх удзельнікаў. Для гэтага стварылі сетку органаў кантролю, у якую ўключылі ўсе грамадскія арганізацыі. Установы дзяржаўнага і партыйнага кантролю ў Савецкім Саюзе, якія часам дубляваліся, бяруць пачатак з часоў рэвалюцыі і грамадзянскай вайны. У 1934 г. была створана Камісія дзяржаўнага кантролю пры Савеце Народных Камісараў, якой у 1940 г. надалі статус Народнага камісарыята, а ў 1946 г. пад час рэформы дзяржаўнага кіравання яна стала міністэрствам. Пры Хрушчове ў 1957 г. адбылося пераўтварэнне Дзяржкантролю ў Камісію пры Савеце Міністраў, а ў 1962 г. Дзяржкантроль зноў стаў Камітэтам партыйна-дзяржаўнага кантролю пры ЦК КПСС і Савеце Міністраў СССР[772]. У БССР Дзяржкантроль, які з лютага 1958 да жніўня 1961 г. існаваў пад назвай "Камісія савецкага кантролю Савета Міністраў БССР", у часы Хрушчова ў першую чаргу займаўся праверкай выканання ўрадавых пастаноў і апрацоўкай скаргаў насельніцтва, таму яго архіў змяшчае не толькі справаздачы аб выніках праверак, але і меркаванні грамадзян. У працы былі задзейнічаны прафесійныя рэвізоры, таму справы, як правіла, вельмі змястоўныя, а дадзены архіўны фонд – важная крыніца для вывучэння гісторыі штодзённасці Савецкага Саюза[773].

[772] Пасля зняцця з пасады Хрушчова сувязь дзяржаўнага і партыйнага кантролю зноў ліквідавалі. Замест Дзяржкантролю ў 1965 г. на лакальным узроўні стварылі Камітэт народнага кантролю, які быў арганізаваны Саветамі, складаўся з інспектараў, што працавалі на грамадскіх пачатках, і падпарадкоўваўся партыйным органам. Пар.: Brunner G. Sowjetische "Volkskontrolle" zwischen Partei und Staat // Osteuropa. 1969. Bd. 19. S. 826–836; Adams J. S. Citizen Inspectors in the Soviet Union: The People's Control Committee. New York, 1977; Remington T. Institution Building in Bolshevik Russia: The Case of State Kontrol // SR. 1982. Vol. 41. P. 91–103.

[773] НАРБ, ф. 911: Комиссия Советского контроля СМ БССР (24.2.1958–5.8.1961) / Комиссия Государственного контроля СМ БССР (Госконтроль) (5.8.1961–18.12.1962) / Комитет партийно-государственного

Архіўная справа 1958 г., якая складаецца з больш чым 100 старонак, змяшчае дакументы пра калектыўны пратэст жыхароў вуліц Карла Лібкнехта і Розы Люксембург Фрунзенскага раёна (знаходзіцца на паўночным захадзе Мінска). Асаблівасць сітуацыі ў тым, што ў дыскусіях аб пашкоджанай ацяпляльнай установцы і іншых будаўнічых недахопах адбіваюцца формы ўрэгулявання канфліктаў, якія існавалі ў грамадстве, такія, як фармаванне выяўлення інтарэсаў грамадзян і іх права ўдзелу ў прыняцці рашэнняў[774]. У справе знаходзім наступныя дакументы: а) заключэнне кантрольнай камісіі ад 31 траўня 1958 г. аб стане дамоў №№ 77 і 81; б) недатаваны ліст жыхароў у выканкам, у газету "Советская Белоруссия" і Дзяржкантроль; в) заключэнне кіраўніцтва трэста "Мінскводаканал" ад 14 чэрвеня 1958 г.; г) справаздачу выканкама Фрунзенскага раёна Мінгарвыканкаму ад 26 чэрвеня 1958 г. пра будаўнічыя недахопы ў раёне; д) праект ліста намесніка старшыні Дзяржкантролю сакратару партыйнай арганізацыі адпаведнага домакіраўніцтва, датаваны пачаткам верасня 1958 г.; е) справаздачу начальніка будтрэста аб правядзенні рамонтных работ ад 30 верасня 1958 г.; ё) выніковую справаздачу ўпаўнаважаных інспектараў старшыні Дзяржкантролю[775].

На аснове гэтых дакументаў можна рэканструяваць развіццё падзей. Жылыя дамы ў раёне вуліц Карла Лібкнехта і Розы Люксембург былі гатовыя да засялення восенню – зімой 1957 г. Аднак радасць многіх жыхароў з нагоды атрымання новай кватэры азмрочвалася не толькі будаўнічымі недаробкамі, але і ігнараваннем гэтай сітуацыі з боку адказных будаўнічых арганізацый і домакіраўніцтва. Шматлікія скаргі не прыносілі выніку. Нягледзячы на тое, што жыхары звярталіся ў ЦК КПБ і Савет Міністраў БССР, неабходныя рамонтныя работы не выконваліся. Скарга ў "Советскую Белоруссию" пацягнула за сабой, па меншай меры, праверку. Заява ад 7 студзеня 1958 г. у Мінгарвыканкам і ў Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР з просьбай

контроля ЦК КПБ и СМ БССР (18.12.1962–21.12.1965) / Комитет народного контроля БССР (9.12.1965).

[774] Калі пры вывучэнні грамадзянскай супольнасці прымаюцца да ўвагі сацыялістычныя сістэмы ўлады, то пры гэтым заўсёды згадваецца дысідэнцкі рух. Пар.: Europäische Zivilgesellschaft in Ost und West. Begriff, Geschichte, Chancen / Hrsg. v. Hildermeier M., Kocka J., Conrad C. Frankfurt am Main / New York, 2000. S. 8 (прадмова).

[775] НАРБ, ф. 911, воп. 1, спр. 75.

стварыць камісію па праверцы і замяніць ацяпляльны кацёл на пячное ацяпленне засталася без адказу. У выніку 6 красавіка 1958 г. адбыўся першы сход жыхароў, падрабязнасці якога, на жаль, невядомыя. У сувязі з гэтым, па меншай меры, быў праведзены інспекцыйны абход аднаго з дамоў, у якім удзельнічаў і начальнік кватэрнага ўпраўлення. Але гэта не прынесла вынікаў, бо справаздача аб недаробках або была свядома праігнаравана, або проста згубілася. На той момант, калі нарэшце 31 траўня 1958 г. інспектары Дзяржкантролю канстатавалі ў дамах №№ 77 і 81 сляды затаплення, цярпенню жыхароў прыйшоў канец.

Сход жыхароў, які адбыўся 6 чэрвеня 1958 г., стаў пікам канфлікту. На парадку дня стаяла пытанне павышэння платы за ацяпленне нягледзячы на нізкую тэмпературу ў кватэрах у зімовы перыяд. У сходзе прынялі ўдзел каля 400 жыхароў, кіраўнікі кватэрнага ўпраўлення і домакіраўніцтва разам з інжынерамі і бухгалтарамі, а таксама начальнік будаўнічай арганізацыі – дэпутат гарсавета. Па фармальных прыкметах сход адпавядаў прынятым у асяроддзі "партыйнай грамадскасці" ўзорам[776]. Спачатку выбралі старшыню і сакратара для вядзення пратакола. Потым выступілі бухгалтар і інжынер домакіраўніцтва. Спецыялісты адзначылі, што, з аднаго боку, павышэнне платы за ацяпленне звязана з высокімі выдаткамі энергіі, а з другога – што ацяпляльны кацёл пры адсутнасці зваротнага ходу гарачай вады пастаянна напаўняецца халоднай вадой.

Кватэранаймальнікі выказалі незадаволенасць: яны патрабавалі, каб выдаткі, звязаныя з сістэмай ацяплення, узяло на сябе домакіраўніцтва, акрамя таго, прапанавалі перадаць ацяпляльны кацёл на баланс гарадскога ацяпляльнага трэста і паставіць печкі. Жыхары таксама адзначылі, што будаўнікі, якія працавалі ў суседніх дамах, кралі паліва і што з-за халатнасці торф захоўваўся пад адкрытым небам. Наконт будаўнічых недаробак жыхары скардзіліся, што не працуе сантэхніка і што водазабеспячэнне трэцяга паверха ажыццяўляецца з перабоямі. Акрамя таго, з 24 гадзін да 7 гадзін раніцы адключалі ваду

[776] Пар.: Studer B., Unfried B. Der stalinistische Parteikader. Identitätsstiftende Praktiken und Diskurse in der Sowjetunion der Dreißiger Jahre. Köln / Weimar / Wien, 2001; Erren L. Selbstkritik und Schuldbekenntnis. Kommunikation und Herrschaft unter Stalin (1917–1953). München, 2006; Unfried B. "Ich bekenne" Katholische Beichte und sowjetische Selbstkritik. Frankfurt / New York, 2006.

ва ўсім доме[777]. Разам з гэтым была выказана незадаволенасць безадказным злівам адпрацаванай вады туберкулёзнай бальніцай, якая знаходзілася непадалёк[778]. Скаргі жыхароў на інфраструктуру ў раёне тычыліся не толькі адсутнасці зялёных насаджэнняў, асвятлення, умацаваных тратуараў і смеццевых кантэйнераў, але і недахопу ясляў, дзіцячых садкоў і аптэк, а таксама абмежаванай магчымасці купляць тавары з-за нязручнага часу працы магазінаў. Потым пасыпаліся папрокі на адрас адказных работнікаў – ад агульных да канкрэтных. На фоне афіцыйнага лозунга, які абвясціў "эканомію ў краіне", у дадзенай сітуацыі гаворка ішла пра "марнатраўства, факт жульніцтва і абкраданне народа". Начальніка домакіраўніцтва абазвалі п'яніцам, а начальнік кватэрнага ўпраўлення абурыў усіх сваёй пыхай. Было прапанавана на бліжэйшых выбарах выказаць недавер начальніку будтрэста і іншым дэпутатам гарсавета. Жыхары выказалі крытыку і на адрас сістэмы: зыходзячы з прынцыпу раўнапраўя ў Савецкім Саюзе, жыхары раёна мелі такое ж права на ацяпленне кватэр, як і міністры, што жылі ў шыкоўных дамах на праспекце. А старшыня райвыканкама і сакратар партыйнай арганізацыі раёна абавязаны былі праверыць сітуацыю з выездам на месца, калі яны не хацелі пазбавіцца права "есці дзяржаўны хлеб". У выніку зрабілі выснову, што паўсюль развялося занадта шмат начальнікаў, а простых работнікаў мала, таму працаваць няма каму.

Замест таго каб пайсці насустрач патрабаванням жыхароў, тым самым ліквідаваўшы глебу для незадаволенасці, начальнік кватэрнага ўпраўлення ўпарта настойваў на сваім. Ён хоць і сказаў, што прыняў да ведама ўсе прапановы жыхароў, але паставіў пад сумнеў права прыняцця самастойнага рашэння сходам. Відавочна, ён думаў, што, спасылаючыся на прадугледжаны законам абавязак жыхароў аплачваць перарасход энергарэсурсаў на ацяпленне, зможа выкруціцца з гэтай сітуацыі, але гэтым толькі яшчэ больш справакаваў жыхароў. Яго пагроза скасаваць дагаворы аб арэндзе жылля і выселіць людзей на

[777] Паводле справаздачы "Мінскводаканала" ад 14 чэрвеня 1958 г., жылы раён знаходзіўся на ўзвышэнні, але там не было воданапорнай станцыі. Таму ўначы, калі калектары перапаўняліся вадой, адзін з насосаў адключалі.

[778] Паводле заключэння Дзяржкантролю ад 15 снежня 1958 г., з-за пашкоджання калектара з лютага 1957 г. да ліпеня 1958 г. туберкулёзная бальніца злівала сцёкавыя воды праз Нямігу ў Свіслач.

вуліцу перапоўніла чашу цярпення. У выніку старшыня сходу неадкладна пазбавіў слова начальніка кватэрнага ўпраўлення.

У гэтых абставінах начальнік будтрэста быў вымушаны зрабіць дыпламатычны ход. Як дэпутат гарсавета ён у папулісцкай манеры выказаў абурэнне велізарным ростам платы за ацяпленне. Кіруючыся прынцыпамі, на якіх будавалася ўлада ў СССР, ён заняў пазіцыю дэмакратычнага цэнтралізму. Дэпутат выказаў меркаванне, што калі падключыць яшчэ чатыры дамы да ацяпляльнай сістэмы, то выдаткі на кожную кватэру паменшацца. Акрамя таго ён прапанаваў стварыць камісію жыхароў з пяці чалавек, якая ўдзельнічала б і ў падліку выдаткаў на ацяпленне, і ў размеркаванні сродкаў у памеры 200 тыс. рублёў, выдзеленых у яе распараджэнне на развіццё інфраструктуры. У канцы свайго выступу ён паведаміў, што мог бы даць дадаткова яшчэ 70 тыс. рублёў на будматэрыялы, каб жыхары самі маглі зрабіць рамонт.

Тым не менш гэтыя прапановы не зрабілі ніякага ўражання на жыхароў. Прымаючы рэзалюцыю сходу, яны выказаліся за тое, каб склікаць наступны сход у тым самым месяцы і запрасіць старшыню выканкама і сакратара партыйнай арганізацыі Фрунзенскага раёна. Акрамя гэтага, для ажыццяўлення кантролю неабходна было задзейнічаць як Камісію савецкага кантролю Савета Міністраў БССР, так і незалежную інстанцыю. Разам з гэтым ад домакіраўніцтва запатрабавалі зрабіць пераразлік выдаткаў на ацяпленне, звярнуўшыся пры гэтым да выканкама з патрабаваннем перадаць ацяпляльны кацёл на баланс гарадскога ацяпляльнага трэста, а таксама паклапаціцца аб паляпшэнні інфраструктуры.

Ці быў праведзены чарговы сход жыхароў, інфармацыі ў фондзе Дзяржкантролю няма. Захаваўся толькі ліст з 92 подпісамі, які быў накіраваны пасля 6 чэрвеня 1958 г. у райвыканкам, Камісію савецкага кантролю і ў "Советскую Белоруссию". Яго аўтары выказалі пратэст супраць самавольства домакіраўніцтва і кватэрнага ўпраўлення. З аднаго боку, яны падкрэслілі безгаспадарчасць і халатнасць. З другога – запатрабавалі зрабіць пераразлік выдаткаў на ацяпленне, спасылаючыся на няспраўнае абсталяванне. Жыхары ў лісце апелявалі да аўтарытэту Мінгарвыканкама і райвыканкама, і гэта сведчыць аб тым, што іх пратэст быў накіраваны выключна супраць бюракратаў. Пачатая Хрушчовым палітыка дэсталінізацыі надавала ім упэўненасці ў сабе. Яны адважыліся сказаць, што лёс 4–5 тыс. чала-

век не можа вырашацца простым "росчыркам пяра". Відавочна, жыхары мелі на ўвазе ўзяты XX з'ездам партыі 1956 г. курс на карэнны пералом у жыцці краіны, бо сваю скаргу скончылі легкадумнай, на думку функцыянераў, заўвагай наконт таго, што "часы дыктату" прайшлі.

Урэшце жыхарам удалося адстаяць свае інтарэсы ў барацьбе супраць домакіраўніцтва і будаўнічага трэста па ўсіх пунктах. 4 верасня 1958 г. выканаўчы камітэт прыняў рашэнне выставіць рахунак на суму каля 17 тыс. рублёў за перарасход пры аплаце вады і ацяплення домакіраўніцтву, а не жыхарам. 30 верасня 1958 г. начальнік будтрэста паведаміў, што ўсе недахопы ў дамах №№ 77, 81, 83, 85, 87, 89, 118, 120, 121 і 132 выпраўленыя. Пры гэтым ён не забыўся згадаць, што жыхары самі вінаватыя ў многіх выпадках вымушанага рамонту, бо самавольна ставілі антэны і выкідалі смецце праз адчыненыя вокны, наносячы тым самым шкоду дамам.

Тым не менш радасць жыхароў была нядоўгай. 20 лютага 1959 г. "Советская Белоруссия" апублікавала ліст жыхароў заселенага на год раней дома № 73 па вул. Карла Лібкнехта, якія зноў скардзіліся на вільготныя сцены і недастатковае ацяпленне[779]. А 11 красавіка 1963 г. 32 жыхары дамоў №№ 116, 120 і 126 па вуліцах Розы Люксембург і Карла Лібкнехта паскардзіліся ў Дзяржкантроль на тое, што трэці паверх у другой палове дня не забяспечваецца вадой[780]. Нарэшце 25 жніўня 1965 г. "Советская Белоруссия", абагульняючы скаргі жыхароў адпаведнага раёна, паведаміла, што на ўвесь раён ёсць толькі два прадуктовыя магазіны і адна булачная, недастаткова зялёных насаджэнняў. Побач з дамамі №№ 208, 210, 214 і 216 утварылася некалькі велізарных лужын, бо пры планаванні не прадугледзелі сцёкаў. Пры пераносе ацяпляльнай лініі дамы №№ 156, 172 і 174 апынуліся адрэзанымі як ад галоўнай вуліцы, так і ад школы і дзіцячага садка, бо забыліся зноў пакласці асфальт і зрабіць тратуары[781].

Такім чынам, для гісторыі важнасць гэтага прыкладу, які дэманструе паўсядзённыя праблемы "сацыялістычнага горада", складаецца ў рэакцыі грамадзян. Яны скарысталіся той свабодай дзеяння, якую ім дала КПСС пад кіраўніцтвам Хрушчова

[779] Кто же не устранит недостатки // СБ. 20.2.1959. № 43. С. 3.
[780] НАРБ, ф. 911, воп. 3, спр. 809, арк. 125–126.
[781] Леонидов Н. Улицы родного города // СБ. 25.8.1965. № 200. С. 2.

ў імкненні пазбавіцца ад "культу асобы" і дазволіць спраўдзіцца прынцыпу "калектыўнага кіравання". Наяўнасць гэтых перадумоў прывяла да фармавання супольнасцяў з агульнымі інтарэсамі і да адкрытасці механізмаў улады. Голас народа змог знайсці шляхі для выражэння, бо памяняліся законы партыйнага жыцця. Такім чынам, сутнасць справы заключалася ў супрацьстаянні жыхароў і бюракратыі. Пры гэтым зварот у дзяржаўную інстанцыю, якой на мясцовым узроўні быў райвыканкам, сімвалізаваў перавагу патрыярхальнага мыслення ў палітычнай культуры. Аднак недахопы, якія выклікалі незадаволенасць, з прычыны неэфектыўнасці сістэмы не былі належным чынам ліквідаваны.

## 3 Пяцідзясятнікі – "уцекачы" з савецкага грамадства

Трагедыя гісторыкаў у тым, што яны пры пошуку ў архівах "рэальнай гісторыі" і "аб'ектыўнай праўды" церпяць няўдачу. Яны хочуць атрымаць доступ да звестак пра лёс простых людзей, але могуць зразумець што-небудзь толькі праз прызму ўспрымання бюракратаў, праз іх ацэнку паводзінаў "падданых". Між тым рэканструкцыя фактаў уяўляе сабой толькі першы крок гістарычнага метаду. Майстэрства складаецца хутчэй у тым, каб пад час працы з крыніцамі ставіць пытанні, якія робяць магчымай інтэрпрэтацыю падзей у рамках гістарычнага кантэксту. Калі гаворка ідзе пра гарадское жыццё ў сацыялістычным грамадстве, то ўсё ўскладняецца тым, што "грамадзянскай супольнасці" практычна не існавала. Наадварот, манаполія "партыйнай грамадскасці" прадугледжвала татальны кантроль над грамадствам[782]. Альтэрнатыва – даследаванне гісторыі рэлігійных суполак і сектаў у Савецкім Саюзе, якая застаецца вядомай

[782] Пар.: Shlapentokh V. Public and Private Life of the Soviet People. Changing Values in Post-Stalin-Russia. New York, 1989; Вайль П., Генис А. 60-е. Мир советского человека. Изд. 2-е, испр. Москва, 1998; Kharkhodin O. The Collective and the Individual in Russia. A Study of Practices. Berkeley / Los Angeles / London, 1999; Грушин Б. А. Четыре жизни России в зеркале опросов общественного мнения. Очерки массового сознания россиян времен Хрущева, Брежнева, Горбачева и Ельцина. Жизнь 1-я. Эпоха Хрущева. Жизнь 2-я. Эпоха Брежнева. Москва, 2001–2003; Sphären von Öffentlichkeit in Gesellschaften sowjetischen Typs. Zwischen partei-staatlicher Selbstinszenierung

толькі ў агульных рысах[783]. Пры гэтым неабходна паставіць наступныя пытанні: дзе знаходзіліся ў Мінску сферы, у якіх маглі фармавацца незалежныя групы? якой ступенню свабоды дзеяння ў валодалі гэтыя групы? чаму савецкая ўлада не перашкаджала стварэнню і функцыянаванню такіх груп? На падставе гэтых пытанняў павінны быць знойдзены аргументы, якія абгрунтоўваюць наступныя тэзісы: 1. Пяцідзясятнікі адчувалі сябе ў беларускай сталіцы як дома, аднак будавалі сваё жыццё нібы па-за Савецкім Саюзам. 2. Камуністычная партыя і камсамол баяліся вуліцы, а не ўніверсітэтаў. 3. У гісторыі Беларусі грамадзянская мужнасць у меншай ступені праяўляецца ў разважаннях інтэлігенцыі, чым у паводзінах простых людзей.

Рух пяцідзесятнікаў, які зарадзіўся ў пачатку XX ст. у ЗША, ужо ў першай палове 1920-х гг. дасягнуў Савецкага Саюза. У 1930-я гг., у эпоху сталінізму, члены Саюза хрысціян веры евангельскай пераследаваліся гэтак жа, як і члены іншых рэлігійных абшчын. Пачатак Другой сусветнай вайны суправаджаўся зменай у савецкай палітыцы ў дачыненні да рэлігіі. Была зроблена спроба ўзмацніць кантроль над пратэстанцкімі суполкамі з дапамогай цэнтралізацыі царкоўнага праўлення: у 1944 г. гэта прывяло да аб'яднання хрысціян евангельскага напрамку з баптыстамі. У 1945 г. да Усесаюзнага савета евангельскіх хрысціян-баптыстаў далучыліся пяцідзясятнікі. Так званае "Жнівеньскае пагадненне" прадугледжвала хрышчэнне святым духам з улікам і без уліку "гаварэння на розных мовах", што выцесніла гласалалію з грамадскіх рэлігійных абрадаў. У гэтых умовах палова савецкіх пяцідзясятнікаў супраціўлялася аб'яднанню з афіцыйна зарэгістраванымі дзяржавай евангельскімі хрысціянамі-баптыстамі, замест гэтага аддаючы перавагу нелегальнаму становішчу. Пры Хрушчове ў аснове аднаўлення пераследу рэлігіі ляжала ўзмацненне атэістычнай прапаганды

und kirchlichen Gegenwelten / Hrsg. v. Rittersporn G., Rolf M., Behrends J. C. Frankfurt am Main u.a., 2003.

783 Пар.: Candle in the Wind. Religion in the Soviet Union / Ed. By Shirley E. U. Jr., Rowe M. Lanham, Mad. / London, 1989; Religionen in der UdSSR. Unbekannte Vielfalt in Geschichte und Gegenwart / Hrsg. v. Basse O., Stricker G. Zollikon, 1989; Religious Policy in the Soviet Union / Ed. by Ramet S. P. Cambridge, 1993; Anderson J. Religion, State and Politics in the Soviet Union and Successor States. Cambridge / New York / Melbourne, 1994; Davis N. A Long Walk to Church. A Contemporary History of Russian Orthodoxy. Boulder / San Francisco / Oxford, 1995.

і рэпрэсій супраць царкоўнага кіраўніцтва. Так, у 1960 г. Усесаюзны савет евангельскіх хрысціян-баптыстаў прыняў новы статут для абшчын і адпаведную інструкцыю для царкоўных старастаў, якія прадугледжвалі абмежаванні ў місіянерскай дзейнасці і ў служэнні ў зарэгістраваных памяшканнях. У святле гэтага людзі праходзілі абрад хрышчэння толькі пасля дасягнення 30 гадоў і толькі пасля заканчэння трохгадовага выпрабавальнага тэрміну; была спынена праца з дзецьмі і моладдзю, абмежаваны кантакты з іншымі абшчынамі; скарацілася колькасць музычных інструментаў, якія выкарыстоўваліся пад час набажэнства. Хоць гэтыя правілы былі перагледжаны на ўсесаюзнай канферэнцыі ў 1963 г., нелегальны "Саюз абшчын" з уласным саветам аддзяліўся ад Усесаюзнага савета евангельскіх хрысціян-баптыстаў. У 1970-я гг. згадка пра скептычна настроеных пяцідзясятнікаў трапіла ў загалоўкі буйных заходніх сродкаў масавай інфармацыі. Гэта адбылося пасля таго, як некаторыя з іх, звярнуўшыся ў амбасаду ЗША, захацелі дамагчыся выезду з Савецкага Саюза. Каб не дапусціць ад'езду савецкіх пяцідзясятнікаў з краіны, Крэмль прыняў рашэнне аб рэгістрацыі аўтаномных абшчын хрысціян евангельскай веры[784].

Што тычыцца пасляваеннай гісторыі Мінска, то дзейнасць пяцідзясятнікаў зафіксавана толькі ў справаздачах у Савет Міністраў БССР упаўнаважаных па справах рэлігійных культаў – прадстаўнікоў органа ўлады, створанага ў 1966 г. у выніку аб'яднання пасады ўпаўнаважанага па справах праваслаўнай царквы з пасадай упаўнаважанага па справах рэлігій. У першай палове 1960-х гг. упаўнаважаным па справах рэлігійных культаў у Мінскай вобласці быў А. Панамароў. У другой палове 1960-х гг. яго змяніў А. І. Лагвіненка. Па стылі справаздач можна зразумець, што ўпаўнаважаны быў адукаваным чалавекам. Часам аўтар асуджаў сітуацыю з доляй іроніі. Кідаецца ў вочы, наколькі педантычна выконваліся абавязкі названага

[784] Пар.: Lane C. Christian Religion in the Soviet Union. A Sociological Study. Albany, 1978. P. 138–191; Sawatsky W. Soviet Evangelicals Since World War II. Kitchener, Or., 1981; Alexeyeva L. Soviet Dissent. Contemporary Movements for National, Religious, and Human Rights. Middletown / Conn., 1985, P. 201–231; Fletcher W. C. Soviet Charismatics. The Pentecostals in the USSR. New York / Berne / Frankfurt am Main, 1985; История евангельских христиан-баптистов в СССР. Москва, 1989; Hollenweger W. J. Charismatisch-pfingstliches Christentum. Herkunft, Situation, ökumenische Chancen. Göttingen, 1997.

ведамства. У цэлым праца ўпаўнаважанага па справах рэлігій праходзіла, мяркуючы па ўсім, спакойна. Стваралі праблемы толькі пяцідзясятнікі. Хоць яны і даймалі ведамства сваёй непачцівасцю, але ў савецкім дзяржаўным апараце не было, відавочна, іншай інстанцыі, якая б падзяліла з ім гэтыя клопаты[785]. На што ж скардзіліся ўпаўнаважаныя па справах рэлігій?

Пры ўзмацненні атэістычнай прапаганды ў часы Хрушчова ў Мінску ў сярэдзіне 1950-х гг. упершыню пасля вайны была адзначана незалежная дзейнасць пяцідзясятнікаў[786]. Аднак толькі пасля пашырэння рысы Мінска ў 1959 г. справа дайшла да сістэматычнага кантролю ў рамках пераследу царквы ва ўсесаюзным маштабе. У жылым раёне паўднёва-ўсходняй прамысловай часткі горада, а таксама ў пасёлках Дражня і Сцяпянка на ўсходзе горада былі створаны тры групы колькасцю 120 чалавек, якія неўзабаве аб'ядналіся ў адну суполку пад кіраўніцтвам токара-матарыста трактарнага завода Мікалая Кібалкі. Члены абшчыны былі пераважна рабочымі сярэдняга ўзросту і вялі звыклы для іх сельскі лад жыцця.

Асноўнай прычынай аддзялення ад евангельскіх хрысціян-баптыстаў яны назвалі тую акалічнасць, што ў малітоўны дом баптыстаў забаронены ўваход дзецям. У сувязі з тым, што абшчына пяцідзясятнікаў не была зарэгістравана афіцыйна, вернікі не мелі магчымасці адкрыць уласны малітоўны дом. Зыходзячы з гэтага, яны былі вымушаны праводзіць рэлігійныя сходы нелегальна ў прыватных дамах. Кожную першую і трэцюю нядзелю месяца збіралася ўся абшчына, у астатнія дні тыдня збіраліся раніцай ці вечарам па пяць-дзесяць чалавек. Іх

[785] Наступная інфармацыя пра пяцідзясятнікаў абапіраецца на справаздачы ўпаўнаважанага па справах рэлігійных культаў за ліпень 1955 г. (ДАМВ, ф. 3651, воп. 2, спр. 5, арк. 54–62), 15 студзеня 1960 г. (ДАМВ, ф. 3651, воп. 2, спр. 9, арк. 6–8), 26 траўня 1960 г. (ДАМВ, ф. 69, воп. 1, спр. 1467, арк. 5–6), 16 снежня 1960 г. (ДАМВ, ф. 3651, воп. 2, спр. 9, арк. 98–99), 17 ліпеня 1961 г. (ДАМВ, ф. 69, воп. 1, спр. 1537, арк. 22–24), 16 снежня 1965 г. (ДАМВ, ф. 69, воп. 6, спр. 400, арк. 4–8), 19 сакавіка 1968 г. (ДАМВ, ф. 812, воп. 1, спр. 9, арк. 100–108), 3 лютага 1970 г. (ДАМВ, ф. 812, воп. 1, спр. 23, арк. 108–115), 3 сакавіка 1974 г. (ГАМО, ф. 69, воп. 12, спр. 26, арк. 40–44) і 14 сакавіка 1975 г. (ДАМВ, ф. 69, воп. 13, спр. 33, арк. 6–20).

[786] Пар. пастановы ЦК КПБ ад 28 ліпеня і 17 лістапада 1954 г., якія абапіраюцца на адпаведныя рэзалюцыі ЦК КПСС. Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК. Минск, 1986. Т. 4. 1945–1955. С. 567–572.

не спыніў нават пачаты па месцы працы працэс супраць Кібалкі. Пасля таго як у евангельскіх хрысціян-баптыстаў адбыўся раскол, у ліпені 1961 г. мінская суполка пяцідзясятнікаў стварыла нават свой уласны кіраўнічы орган: Кібалка быў абраны прэсвітарам, сталяр Уладзімір Зямлевіч і слесар Міхаіл Пачарняеў – дыяканамі, а токар Леанід Ганчарэнка – кіраўніком моладзевага гуртка.

З нелегальным стварэннем абшчыны пяцідзясятнікаў пачаліся праблемы ва ўпаўнаважанага па справах рэлігій. Як дзяржаўны чыноўнік ён быў абавязаны сігналізаваць пра пагрозу грамадскаму парадку з боку сектаў. Таму ён адзначаў, што адмова ад ваеннай службы супярэчыць савецкаму патрыятызму. Акрамя таго, звяртаў увагу на тое, што з-за гласалаліі пад час служэння пяцідзясятнікі стваралі шмат шуму, і гэта перашкаджала суседзям, у прыватнасці тады, калі дзеці выконвалі хатнія заданні.

Вялікую цікавасць уяўляюць філантрапічны і сацыяльны аспекты дзейнасці пяцідзясятнікаў. Яны арганізавалі моладзевую музычную групу, дапамагалі людзям, якія трапілі ў бяду, і падтрымлівалі кантакты са сваімі аднаверцамі па ўсім Савецкім Саюзе. Напрыклад, яны клапаціліся пра паралізаваную жанчыну (і яе пяцігадовую дачку), якая не магла абыходзіцца без дапамогі звонку, хоць і атрымлівала пенсію ад дзяржавы і аліменты на дзіця ад былога мужа. Пяцідзясятнікі забяспечылі не толькі догляд дзіцяці, але і ўзялі на сябе паходы па інстанцыях і нават дапамаглі перакрыць дах. Акрамя таго, у красавіку 1961 г. яны наладзілі сустрэчу моладзі з Брэста, Магілёва, Жытоміра, Рыгі і Малдавіі. Пры гэтым яны, як правіла, не парушалі грамадскага парадку. Толькі аднойчы пяцідзясятніка зафіксавалі як "парушальніка парадку": пад час наведвання паліклінікі трактарнага завода ён так гучна абураўся знікненнем яго Бібліі, што давялося нават выклікаць міліцыю. Тым не менш пяцідзясятнікі ўвесь час сутыкаліся з паклёпам: так, напрыклад, 70-гадовую пенсіянерку абвінавацілі ў падбухторванні жонкі афіцэра, якая працавала выхавальніцай у дзіцячым садзе, да чытання Бібліі. У выніку, знаходзячыся ў рэлігійным экстазе, жанчына нібыта хацела прынесці сваю 13-гадовую дачку ў "ахвяру" Богу.

Паменшыць колькасць клопатаў упаўнаважаны меў двума шляхамі: ён выклікаў прадстаўнікоў абшчыны пяцідзясятнікаў, каб абавязаць іх выконваць рэлігійныя законы і падштурхнуць да аб'яднання з хрысціянамі-баптыстамі евангельскай веры. Але знайсці агульную мову з людзьмі, якія баяліся толькі Страшнага суду, было немагчыма. Разам з тым яшчэ застава-

лася надзея ўнесці раскол у абшчыну евангельскіх хрысціян-баптыстаў. Апрача таго, упаўнаважаны імкнуўся пераканаць міліцыю і партыйныя органы ў неабходнасці забараніць якія-небудзь дзеянні пяцідзясятнікаў і перашкаджаць іх інтрыгам у судовым парадку. Тым не менш, на яго здзіўленне, ні адна з інстанцый не паставілася да яго прапаноў з належнай увагай. Дзяржава запатрабавала толькі штрафаваць пяцідзясятнікаў за арганізацыю нелегальных сходаў і прыцягваць да крымінальнай адказнасці за ўхіленне ад вайсковай службы.

У лістападзе 1965 г. дэлегацыя з дзевяці чалавек паспрабавала дамагчыся ва ўпаўнаважанага па справах рэлігійных культаў афіцыйнай рэгістрацыі абшчыны пяцідзясятнікаў на 100 чалавек. Увосень 1968 г. Кібалка беспаспяхова хадайнічаў перад кіраўніком абшчыны евангельскіх хрысціян-баптыстаў аб магчымасці карыстацца малітоўным домам два-тры дні на тыдзень. Упаўнаважаны па справах рэлігій пасля гутаркі з пяцідзясятнікамі Мікалаем Кібалкам, Уладзімірам Ганчарэнкам, Міхаілам Пачарняевым, Васілём Марчанкавым, Іванам Радутам і Фёдарам Бураком у лютым 1970 г. адзначыў, што іх пазіцыі разышліся, калі паўстала альтэрнатыва: далучыцца да евангельскіх хрысціян-баптыстаў або захаваць самастойнасць. Кібалка адзначыў: называць іх малітоўныя сходы “зборышчам” – абразліва. Не лічыў ён сябе і “падпольным змагаром”. Рытуалы пяцідзясятнікаў істотна не адрозніваліся ад рытуалаў евангельскіх хрысціян-баптыстаў. Ганчарэнка, Пачарняеў і Марчанкаў сказалі, што іх рэлігійныя дзеянні нікому не шкодзяць. Дэкрэт “Аб аддзяленні царквы ад дзяржавы і школы ад царквы” даў поўную свабоду дзеянням вернікаў, але пры гэтым забраў у іх магчымасць займацца выхаваннем. З прычыны гэтага, казалі вернікі, савецкая моладзь у большасці сваёй амаральная. Гэтым яны закранулі вельмі слабы пункт у савецкай дактрыне, якая грунтавалася перш за ўсё на выцясненні рэлігіі з выхавання і адукацыі дзяцей і моладзі.

Упаўнаважаны па справах рэлігій не адважыўся на рэпрэсіі. Яго надзея на магчымасць расколоць рух пяцідзясятнікаў не спраўдзілася. Пасля таго як у сярэдзіне 1970-х гг. колькасць мінскіх пяцідзясятнікаў павялічылася да 400 чалавек, ён нарэшце здаўся і прапанаваў дзяржаўнаму і партыйнаму кіраўніцтву ўзаконіць суполку, абгрунтаваўшы сваю прапанову тым, што яе дзеянні будзе лягчэй кантраляваць, калі яна будзе зарэгістраваная, тым больш што можна было “прывязаць” іх да малітоўнага дома евангельскіх хрысціян-баптыстаў.

У цэлым пяцідзясятнікі адрозніваліся тым, што яны звязвалі сваю дактрыну свабоднай волі з ідэалам рэлігійнага выхавання і сумленнай працы. На аснове эсхаталагічных уяўленняў яны схіляліся да сузірання і сацыяльнай ізаляцыі; адначасова, зыходзячы з місіянерскага задання, адчувалі сябе абавязанымі здзяйсняць філантрапічныя ўчынкі. Канфлікты з савецкай уладай узнікалі з дылемы: з аднаго боку як незарэгістраваная абшчына пяцідзясятнікі былі вымушаны праводзіць сходы нелегальна; з другога боку, зыходзячы са сваёй асноўнай пацыфісцкай дактрыны, маладыя мужчыны-пяцідзясятнікі адмаўляліся выконваць вайсковую павіннасць. Тым не менш пяцідзясятнікі да некаторай ступені маглі свабодна разгортваць сваю дзейнасць у Мінску, гэтаму спрыяла іх невялікая колькасць, а таксама імкненне ўладаў забяспечыць правапарадак, што зноў стала адной з найважнейшых задач у Савецкім Саюзе пры Хрушчове[787]. З гэтага прыкладу можна зрабіць тры высновы: 1) пяцідзясятнікі стварылі нелегальную абшчыну, камунікатыўныя формы якой адпавядалі ўмовам незалежнага аб'яднання, а ў місіянерскую задачу ўваходзілі педагагічныя мэты[788]; 2) існаванне такіх феноменаў, як пяцідзясятнікі, паказвае, што пры папулярным у беларускай гістарыяграфіі паняцці "таталітарызм" гаворка ідзе пра міф, пры дапамозе якога можна зняць адказнасць са свайго пакалення за ўключанасць у сістэму[789]; 3) калі Мінск пасля распаду Савецкага Саюза па-ранейшаму ганарыцца званнем "Горада-героя", то разам з партызанамі варта было б аддаць належнае і кіраўнікам руху пяцідзясятнікаў – Мікалаю Кібалку, Васілю Марчанкаву і Уладзіміру Ганчарэнку[790].

[787] Пар.: Schröder H. "Lebendige Verbindung mit den Massen". Sowjetische Gesellschaftspolitik in der Ära Chruščev // Vierteljahreshefte für Zeitgeschichte. 1986. Bd. 34. S. 523–560, тут S. 525–529.

[788] Гістарыяграфія да гэтага часу ігнаруе ролю сектаў у беларускім грамадстве. Пар.: Канфесіі на Беларусі (канец XVIII – XX ст.) / нав. рэд. У. І. Навіцкі. Мінск, 1998.

[789] Пар.: Касцюк М. Бальшавіцкая сістэма ўлады на Беларусі. Мінск, 2000; Костюк М. Р. Большевистская система власти в Белоруссии. Москва, 2002.

[790] Беларускія этнолагі бачылі ў рэлігіі рэлікт традыцыйнага аграрнага грамадства, які закранае толькі неадукаваныя, некваліфікаваныя пласты насельніцтва і мае значэнне перш за ўсё для пенсіянераў і хатніх гаспадынь. Пар.: Изменения в быту и культуре городского населения Белоруссии / под ред. В. К. Бондарчика. Минск, 1976. С. 94–95.

## 4 Ваенны гарадок Усходні – анклаў бяспраўных цывільных асоб

Праграма КПСС 1961 г. – "праграма пабудовы камуністычнага грамадства" – заявіла пра вырашэнне жыллёвага пытання ў Савецкім Саюзе ў бліжэйшае дзесяцігоддзе. І на самай справе ў жыллёвым будаўніцтве ў 1960–1970-я гг. былі зроблены вялікія намаганні, якія знайшлі сваё адлюстраванне ў аднастайных жылых масівах на ўскраінах гарадоў. Калі асобная і добраўпарадкаваная па ўсіх патрабаваннях сучаснага жыцця кватэра ўяўляла для сем'яў невядомую раней раскошу, то навакольнае асяроддзе, якое нагадвала будаўнічую пляцоўку з пратаптанымі дарожкамі, з неаздобленымі лесвічнымі клеткамі і цёмнымі пад'ездамі, з самага пачатку выклікала пачуццё небяспекі. Пры гэтым для шырокіх слаёў насельніцтва гэта было нормай гарадскога жыцця на этапе "развітога сацыялізму" часоў Брэжнева. Пра ідылію камуністычнага грамадства ўсеагульнага дабрабыту не магло быць і гаворкі, асабліва калі за аснову браць заходнія стандарты, на якія ў ідэалагічным спаборніцтве сістэм спасылаліся даволі часта.

Далейшыя звесткі пра сацыялістычную рэчаіснасць можна атрымаць, калі разглядаць адхіленні ад нормы. Пры гэтым само сабой узнікае пытанне, якімі рамкамі абмежавала сябе сістэма. Гэта была іерархія кантролю і адказнасці, якая не толькі спрыяла супрацьдзеянню ў выкананні многіх рашэнняў партыі і дзяржавы, але і вяла да ўзнікнення закрытых месцаў, дзе панавалі ўласныя правілы і ігнараваліся законныя правы грамадзян. Такая сітуацыя выклікае асацыяцыю з ваенізаваным грамадствам. І сапраўды, на прыкладзе Мінска можна пераканаўча праілюстраваць безнадзейнасць і бесперспектыўнасць становішча цывільных грамадзян, якія жылі ў ваенных гарадках. У выпадку з ваенным гарадком Усходні іх лёс знайшоў адлюстраванне толькі ў перапісцы з кіраўнічымі органамі. У чым жа была праблема?

17 верасня 1962 г. два пасёлкі – Уручча і № 17, размешчаныя на другі бок ад кальцавой дарогі (яна пазначала рысу горада на паўночным усходзе Мінска), былі аб'яднаны ў ваенны гарадок Усходні, які адміністрацыйна стаў падпарадкоўвацца Мінгарвыканкаму. У сувязі з гэтым Савет Міністраў БССР даў указанне гарвыканкаму на працягу 1962–1965 гг. забяспечыць кватэрамі людзей, якія жылі ў ваенным гарадку, але не

былі звязаны з арміяй і працавалі ў Мінску[791]. Калі 18 снежня 1964 г. Мінгарвыканкам перадаў пасёлак Усходні ў распараджэнне выканкама пасялковага савета ваеннага гарадка, адбылося намінальнае перакладанне адказнасці, таму што горад не хацеў умешвацца ва ўнутраныя справы гэтага ваеннага гарадка. У пасёлку жылі вайскоўцы – афіцэры з сем'ямі. Цывільнае насельніцтва складалі былыя вайскоўцы, якія працавалі на прадпрыемствах і ва ўстановах Мінска, а таксама работнікі гандлю і грамадскага харчавання, выкладчыкі і медыцынскія работнікі. У абедзвюх катэгорый грамадзян былі дрэнныя жыллёвыя ўмовы. У сярэдзіне 1960-х гг. у пасёлку было 30 драўляных баракаў, дзе жылі 400 сем'яў, з якіх 148 не мелі дачынення да войска. 30 сем'яў пражывалі ў старых дамах, 5 – у “времянках” і 3 – у зямлянках. Так склалася, што ўсе магчымасці для паляпшэння жыллёвых умоў не былі выкарыстаны з самага пачатку. З аднаго боку, ваенкамат забяспечваў кватэрамі выключна вайскоўцаў. З другога боку, выканкам Усходняга не меў жыллёвага фонду, бо армія была вызвалена ад агульнапрынятага абавязацельства аддаваць 10% жылой плошчы ў новабудоўлях у распараджэнне камунальных уладаў. І нарэшце, людзей з Усходняга не бралі ў разлік пры размеркаванні кватэр ні ў выканкамах горада, ні на мінскіх прадпрыемствах, бо яны не былі прапісаны ў сталіцы. У гэтых умовах партыйная арганізацыя і выканкам ваеннага гарадка хадайнічалі перад Мінскім гаркамам і абкамам партыі аб далучэнні пасёлка да Мінска і аб садзейнічанні ў выдзяленні фінансавых сродкаў для будаўніцтва жылля[792].

У выніку 10 студзеня 1967 г. Савет Міністраў БССР прыняў чарговую пастанову аб забеспячэнні кватэрамі цывільных асоб, якія жылі ў закрытых ваенных гарадках[793]. У наваколлі Мінска гэта закранула 897 чалавек, 758 з якіх працавалі ў Мін-

[791] Пар. справаздачу першага аддзела Савета Міністраў намесніку старшыні Савета Міністраў ад 7 чэрвеня 1967 г. НАРБ, ф. 7, воп. 5, спр. 2062, арк. 195–196. Паводле спіса першага аддзела Савета Міністраў ад 17 студзеня 1968 г. колькасць пераселеных у Мінск складала: 188 у 1963 г., 110 у 1964 г., 63 у 1965 г., 67 у 1966 г. і 23 у 1967 г. Астатнія 790 чалавек яшчэ чакалі перасялення. НАРБ, ф. 7, воп. 5, спр. 2383, арк. 84–85.

[792] ДАМВ, ф. 69, воп. 6, спр. 390, арк. 30–32.

[793] Пар. справаздачу намесніка старшыні Мінгарвыканкама ў Мінаблвыканкам. НАРБ, ф. 7, воп. 5, спр. 2062, арк. 210.

ску[794]. Аднак ужо 26 траўня 1967 г. камандуючы Беларускай ваеннай акругай палічыў неабходным паскардзіцца ў Савет Міністраў БССР на тое, што Мінгарвыканкам адмовіўся прымаць адпаведную катэгорыю людзей на чаргу на атрыманне жылля. Перасяленне адбывалася ў лепшым выпадку ў межах тэрыторыі горада, у той час як па цывільных асобах, якія жылі ў ваенных гарадках, размешчаных у наваколлі Мінска, ніякіх рашэнняў не прымалася[795]. 7 чэрвеня 1967 г. адрэагаваў першы аддзел Савета Міністраў БССР: Мінгарвыканкам вызвалілі ад яго абавязацельстваў і замест гэтага дазволілі будаўніцтва жылых дамоў у Мінскім раёне для цывільнага насельніцтва, якое пражывала ў ваенных гарадках. 8 чэрвеня 1967 г. гэтая прапанова, якая азначала ў той жа час субурбанізацыю, была ўхвалена Старшынёй Савета Міністраў[796]. Пры гэтым тэма далучэння да горада была пакуль закрыта. У лісце ад 5 кастрычніка 1967 г., накіраваным у ЦК КПБ і Мінгарвыканкам, старшыня выканкама ваеннага гарадка Усходні чарговы раз звярнуў увагу на асабліва складанае становішча цывільнага насельніцтва ў ваенных гарадках. Толькі пасля гэтага, 3 студзеня 1968 г., Савет Міністраў прыняў пастанову аб перасяленні на працягу двух гадоў усіх афіцэраў запасу мінскіх ваенных гарадкоў у прыгарадную зону Мінска[797].

Пастановы выконвалася вельмі павольна. 9 ліпеня 1968 г. камандуючы Беларускай ваеннай акругай давёў да ведама Старшыні Савета Міністраў, што пераехаць у Мінск яшчэ не змагла ніводная з 160 сем'яў; у Мінскую вобласць пераехалі толькі 4 з 48 сем'яў[798]. Акрамя таго, ваенкамат са свайго боку дзейнічаў выбарачна. Як вынікае з ліста старшыні выканкама пасялковага савета Усходняга ў Савет Міністраў БССР і Мінгарвыканкам, перавага аддавалася афіцэрам запасу, якія пакідалі добраўпарадкаваныя кватэры тым, хто прыходзіў ім на змену[799]. У той жа час выдзяленне кватэр ваенкамат зацягваў, каб выкарыстоўваць рэзерв, які знаходзіўся ў яго распараджэнні, па сваім

[794] Пар. справаздачу камандуючага Беларускай ваеннай акругай Старшыні Савета Міністраў БССР ад 26 траўня 1967 г. НАРБ, ф. 7, воп. 5, спр. 2062, арк. 213–214.
[795] НАРБ, ф. 7, воп. 5, спр. 2062, арк. 213–214.
[796] Тамсама, арк. 195–196.
[797] НАРБ, ф. 7, воп. 5, спр. 2383, арк. 43.
[798] НАРБ, ф. 7, воп. 5, спр. 2384, арк. 6–7.
[799] Тамсама, арк. 1–2.

меркаванні. 19 снежня 1969 г. намеснік старшыні Мінгарвыканкама накіраваў скаргу Старшыні Савета Міністраў БССР і камандуючаму Беларускай ваеннай акругай аб тым, што не засяляюцца два дамы на 180 кватэр, выдзеленыя ў кастрычніку 1969 г.[800]. У цэлым акцыя перасялення скончылася ў пачатку 1970-х гг.[801]. Для Усходняга праблема вырашылася ў 1978 г. з далучэннем яго да Мінска. На тэрыторыі ваеннага гарадка паўстаў жылы раён з шматпавярховымі дамамі.

Падводзячы вынікі, можна адзначыць, што ў справах выразна прасочваецца канфлікт кампетэнцый паміж гарадскімі ўладамі, з аднаго боку, і ваеннымі ведамствамі – з другога. У той час як першыя абавязаны былі клапаціцца пра інтарэсы пацярпелых грамадзян, другія распараджаліся жылплошчай, якая перадавалася ў іх рэзерв, і пры гэтым адбівалі нападкі тых, што, на іх думку, хацелі "паласавацца гэтым пірагом". Так цывільныя асобы ваеннага гарадка на дзесяцігоддзі патрапілі ў бязвыхадную сітуацыю. Ваеннае ведамства адмовілася даць ім годнае жыллё, а выканкамы і прадпрыемствы горада не мелі права ўносіць іх у спісы чаргавікоў на атрыманне кватэры, бо ў гэтых людзей не было сталічнай прапіскі. З прычыны ўсяго гэтага ваенны гарадок Усходні на працягу дзесяці гадоў уяўляў сабой свайго роду анклаў бяспраўных і абяздоленых цывільных асоб.

[800] НАРБ, ф. 7, воп. 5, спр. 3064, арк. 3.
[801] Пар.: Справаздача кіраўніка кватэрнага ўпраўлення Беларускай ваеннай акругі ад 3 лютага 1970 г. НАРБ, ф. 7, воп. 5, спр. 3064, арк. 6, 8.

# VII. Высновы

*“Адметны факт сучаснага грамадства – гэта рост вялікіх гарадоў”*[802].

Эрнэст В. Берджэс

*“Савецкі Саюз – краіна вялікіх гарадоў”*[803].

Чонсі Д. Харыс

У эпіграфе да гэтай працы было названа месца, якое ўзнікла ў фантазіі Бертольта Брэхта: “Мінск – адзін з найбольш сумных гарадоў свету”. Такую перабольшаную характарыстыку пісьменнік даў Мінску, каб развянчаць пазітыўны вобраз горада ў літаратуры сталінскага часу. Але спасылка на гэтае сцверджанне Стэфана Гейма ў яго звароце да сумлення пісьменнікаў пад назвай “Сум Мінска” ўяўляла сабой аднабаковы погляд на нібыта пануры культурны ландшафт савецкай правінцыі. Тых, хто падарожнічаў і мог зрабіць прамежкавы прыпынак у Мінску па шляху з Берліна ў Маскву, беларуская сталіца таго часу прыцягвала па дзвюх прычынах: з аднаго боку, пры Сталіне быў збудаваны цэнтр, які маштабамі свайго праспекта і манументальнасцю архітэктуры неакласіцызму нагадваў “музей сацыялістычнага рэалізму пад адкрытым небам”. З іншага боку, масавыя “ўцёкі з вёскі” ў горад у 1940–1950-я гг., якія адбываліся ў рамках дзяржаўнай праграмы пасляваеннага аднаўлення, прывялі да “асяляньвання” горада, што знайшло адлюстраванне ў вобразе жыцця і формах пражывання насельніцтва. Акрамя таго, неабходна ўлічваць, што Мінск вабіў да сябе беларускую моладзь пад час савецкага “адукацыйнага буму” ў 1960–1970-я гг., таму адбылося “вымыванне вёскі”. Кожны прадстаўнік пісьменніцкага цэха, які імкнецца найбольш дакладна адлюстраваць сацыяльную рэчаіснасць у Савецкім Саюзе, павінен пры гэтым паклапаціцца не толькі пра выбар прадмета даследавання, але і пра тое, на чым сфаку-

[802] Burgess E. W. The Growth of the City: An Introduction to a Research Project // Urban Pattern: Studies in Human Ecology / Ed. by Theodorson G. A. Revised Edition. University Park / London, 1982. P. 35.

[803] Harris C. D. Cities of the Soviet Union. Studies in Their Functions, Size, Density, and Growth. Chicago, 1970. P. 1, 401.

саваць сваю ўвагу. І нарэшце, што тычыцца "феномена Мінска", неабходна ўбачыць не толькі прыкметныя з першага погляду контуры, але і абрысы на заднім плане.

Асноўнай адметнай рысай гісторыі Савецкага Саюза была ўнікальная па сваіх маштабах дынаміка ўрбанізацыі ў 1930-я і 1950–1960-я гг., а таксама дуалізм сучасных і традыцыйных элементаў як структурная праблема ўрбанізацыі. Нездарма эпоха сталінізму, якая прайшла пад лозунгам "пабудовы сацыялізму ў адной краіне", была цесна звязана з канцэпцыяй мадэрнізацыі і пры гэтым выкарыстала архітэктурную метафару. Усе напрамкі па даследаванні СССР, якія апрыёры ігнаруюць створанае навакольнае асяроддзе і толькі між іншым закранаюць пытанне пра горад як жыццёвую прастору, не могуць хоць бы прыблізна апісаць маніфестацыю ўлады на рэпрэзентатыўных плошчах і паўсядзённае жыццё насельніцтва ў перапляценні асабістых, паўафіцыйных і нелегальных сфер. "Мінскі феномен" можа ў гэтым выпадку служыць павучальным прыкладам, бо страшныя наступствы Другой сусветнай вайны прывялі да планавання "ўзорнага сацыялістычнага горада", а індустрыялізацыя БССР пасля пашырэння савецкай гемісферы на Захад спрычыніўся да сапраўднага дэмаграфічнага буму ў беларускай сталіцы.

## 1 Праект "сацыялістычны горад"

У савецкім дыскурсе "сацыялістычны горад" супрацьпастаўляўся гістарычна паўсталаму ўяўленню "капіталістычнага горада". Таму спецыялісты з Масквы, якія ў пасляваенныя гады выконвалі вырашальную ролю ў планаванні Мінска, былі не зацікаўлены ў аднаўленні адпаведніка арыгіналу. Замест гэтага ў разбураным горадзе, які ляжаў перад імі, яны бачылі шанец стварыць нешта прынцыпова новае. "Рэканструкцыя" прадугледжвала перасоўванне цэнтра на спраектаваны праспект і звязанае з гэтым аднаўленне цэнтра горада. Аб захаванні гістарычнай спадчыны пры гэтым не вялося і гаворкі. Хутчэй пад эгідай Крамля ішоў працэс ператварэння "старога Мінска" ў савецкі горад.

Горадабудаўнічым узорам выступіў Генеральны план Масквы 1935 г., які прадугледжваў радыяльна-кальцавую структуру вуліц, узвядзенне манументальнага цэнтра і ссоўванне прамысловых прадпрыемстваў на ўскраіны горада, а таксама пашырэнне зялёных зон у цэнтры. Прынцыпы, якія стаялі за гэтым ("зе-

ляніна, паветра, святло"), і звязаны з імі занальны падзел горада ("праца, пражыванне, вольны час") не выцякалі ні з "Камуністычнага маніфеста", ні з праграмы партыі бальшавікоў; наадварот, яны хутчэй адпавядалі "Афінскай хартыі", абвешчанай пратаганістамі Міжнароднага кангрэса сучаснай архітэктуры (CIAM) у 1933 г. Такім чынам, у праекце "сацыялістычны горад" гаворка ішла не так пра марксісцка-ленінскую ўтопію, як пра распаўсюджаны за межамі савецкага блока мадэрнісцкі праект, толькі пад іншай назвай. Паколькі Генеральны план Масквы быў не ўніверсальнай інструкцыяй па горадабудаўніцтве, а ўяўляў сабой праект па рэканструкцыі горада, які склаўся гістарычна, то пасляваенны Мінск захоўваў німб архітэктурнага ансамбля і суцэльнага твора мастацтва. Савецкае горадабудаўніцтва ў другой палове 1940-х гг. перажывала крызіс, таму запланаваная дэцэнтралізацыя гарадскога планавання пачалася пры Хрушчове. У сувязі з гэтым у 1955 г. афармленне беларускай сталіцы нарэшце перадалі ў кампетэнцыю Савета Міністраў БССР.

Пасля Другой сусветнай вайны сацыяльныя эксперыменты больш не былі прадметам дыскусій архітэктараў. Калі дойліды і кіраваліся якой-небудзь ідэяй, то, паводле афіцыйнай прапаганды, – ідэяй "сталінскага клопату пра чалавека". Гаворка ішла пра нармалізацыю ўмоў жыцця, а таксама пра ліквідацыю ўбогіх кварталаў на ўскраінах горада. Пры гэтым не выклікаў сумневу той факт, што, з аднаго боку, мелася на ўвазе жыллё для ўсёй сям'і, а з другога – рассяленне рабочых у шыкоўных шматкватэрных дамах у цэнтры горада. Абавязкі, ускладзеныя на архітэктараў пры афармленні архітэктурнага асяроддзя, былі вельмі дакладныя. М. І. Калінін (ён у якасці Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР яшчэ ў час вайны займаўся арганізацыяй гарадскога планавання) абмежаваўся ўказаннем на эстэтыку ансамбля і функцыянальнасць гарадской прасторы. А. А. Жданаў (ён на пасадзе ўпаўнаважанага па культурна-палітычных справах ЦК бальшавікоў валодаў манаполіяй тлумачэння паняцця "сацыялістычны рэалізм") паспеў да сваёй смерці ў 1948 г. выказаць абвінавачванні ў "фармалізме" толькі ў галіне літаратуры, кіно і музыкі. З гэтай прычыны архітэктары яшчэ валодалі пэўнай свабодай дзеянняў, тым больш што ў дачыненні да горадабудаўніцтва генеральная лінія была вызначана партыяй толькі ў 1955 г. Абапіраючыся на вынікі конкурсаў на найлепшы праект Палаца Саветаў у Маскве, праведзеных у першай палове 1930-х гг., вядучыя архітэктары выбралі класіцызм як адэкватны сродак выражэння "сацыялістычнага рэаліз-

му". У сувязі з гэтым у дачыненні да Мінска характэрны той факт, што ў выніку недастатковай колькасці спецыялістаў "нацыянальныя формы" пачалі абмяркоўвацца толькі ў 1940-я – пачатку 1950-х гг., калі ў будаўнічай галіне ўжо пазначыўся карэнны пералом. Таму так званая "нацыянальная беларуская" архітэктура сталінскай эпохі была зведзена да капіявання "рускай" архітэктуры дарэвалюцыйнага часу.

З маскоўскай будаўнічай нарадай 1954 г. звычайна звязваюць змену ўзору ў савецкім гарадскім планаванні. Тым не менш, "карэнны пералом у будаўніцтве" нельга абмяжоўваць толькі адзінкавай падзеяй і звязваць выключна з асобай Хрушчова. Гаворка ішла хутчэй пра працэс, які пачаўся яшчэ пры Сталіне і ў выніку правядзення шэрагу мерапрыемстваў распаўсюдзіўся на ўвесь перыяд праўлення Хрушчова. Прычынай стала жыллёвае пытанне, якое вынікала з планаў індустрыялізацыі пасляваеннага часу. У сувязі з гэтым у 1950 г. міністр будаўніцтва СССР запатрабаваў ад Савета Міністраў БССР знізіць выдаткі ў будаўніцтве на 25% і павялічыць паверхавасць жылых дамоў. Пасля змены ўлады ў Крамлі кампанія супраць дэкаратыўных "празмернасцяў" на фасадах будынкаў расцягнулася на некалькі гадоў. Цэлы шэраг пастаноў стварыў новую аснову для горадабудаўніцтва: з аднаго боку, у 1955 г. пачалася індустрыялізацыя будаўніцтва, а з другога – гарадское планаванне з саюзнага ўзроўню пераводзілася на рэспубліканскі. У 1956 г. амаль усе вялікія гарады былі вымушаны ўвесці сістэму прапіскі і змірыцца з абмежаваннем працэсу індустрыялізацыі. У 1957 г. абвясцілі масавае жыллёвае будаўніцтва, якое перадалі ў распараджэнне выканкамаў. З дапамогай абмежавання росту буйных гарадоў планавалася дасягнуць усебаковай мадэрнізацыі. У гэтых умовах Праграма КПСС 1961 г. парвала з марксісцка-ленінскай фобіяй урбаннасці і абвясціла горад "зародкам" эканамічнага прагрэсу і месцам сацыялізацыі працоўных. На парадак дня былі пастаўлены як урбанізацыя сельскай мясцовасці, так і рашэнне жыллёвага пытання ў гарадах. Замена прыватнага жыллёвага будаўніцтва кааператыўным у 1962 г. стала прадвеснікам ліквідацыі вясковых паселішчаў у гарадах. Так сэрца "сацыялістычнага горада" было зрушана з цэнтра ў мікрараёны. У канчатковым рахунку адбылася замена канцэпцыі: ад кампактнага горада – да функцыянальнага. І нават калі можна заўважыць прывязку да "новага будаўніцтва" і канструктывізму 1920-х гг., то гэта абумоўлена, у першую чаргу, эканомнымі формамі ў архітэктуры, а не сацыяльнай сутнасцю гарадскіх утопій.

## 2 Урбанізацыя Беларусі

Праз беднасць прыродных рэсурсаў і статус пагранічнага рэгіёна як пры царскім рэжыме, так і пры бальшавіках эканамічнай сферы Беларусі не аддавалася належнай увагі. Да пачатку Другой сусветнай вайны Беларусь з 80% сельскага насельніцтва заставалася аграрнай краінай. Прамысловасць абмяжоўвалася ў асноўным выпускам паперы, апрацоўкай скуры і вытворчасцю прадуктаў харчавання. Мінск – як рэзідэнцыя царскага губернатара, а потым сталіца савецкай рэспублікі – меў прывілеяванае становішча. Пасля з'яўлення чыгункі ў 70-я гг. XIX ст. нароўні з прамысловасцю па апрацоўцы мясцовай сыравіны стала развівацца і металаапрацоўка. Нягледзячы на тое, што суіснаванне фабрык і саматужнай вытворчасці заставалася структурнай асаблівасцю Мінска, пасля Першай сусветнай вайны горад ператварыўся з гандлёвага цэнтра мясцовага значэння ў эканамічны міжрэгіянальны цэнтр. Прарыў у эпоху мадэрнізму, які пазначыўся ў 1930-я гг., быў перапынены ў выніку нападу Германіі на Савецкі Саюз у чэрвені 1941 г.

Пасля вызвалення ад нямецкай акупацыі ў ліпені 1944 г. БССР з далучанымі ўсходнімі раёнамі Польшчы нагадвала адсталую краіну на пачатковым этапе развіцця, а яе сталіца Мінск – ахвяра палітыкі выпаленай зямлі – уяўляла сабой дашчэнту спалены і разбураны горад. У ходзе савецкай праграмы аднаўлення пасля Другой сусветнай вайны Беларусь абралі месцам размяшчэння ключавых галін прамысловасці (аўтамабіле- і машынабудаўнічай, а таксама электратэхнічнай). Лозунг пасляваеннага часу быў наступным: Мінск як сталіца павінен аб'яднаць у сабе ўсе важныя функцыі савецкай рэспублікі ў такіх галінах, як прамысловасць, кіраванне і культура. Толькі пасля таго, як у выніку росту насельніцтва ў 1960-я гг. горад пачаў "трашчаць па швах", канцэпцыя цэнтралізацыі была заменена канцэпцыяй рэгіянальнага планавання, якая ахоплівала ўсю рэспубліку. У 1970-я гг. БССР змагла прадэманстраваць самы высокі сярод усіх савецкіх рэспублік эканамічны рост, з прычыны якога адбыўся паспяховы пераход ад адсталай аграрнай рэспублікі да сучаснай індустрыяльнай. Аднак за ростам планавых і вытворчых паказчыкаў хаваўся той факт, што розніца ва ўзроўні развіцця паміж горадам і вёскай, нягледзячы на ўсе ідэалагічныя ўстаноўкі, так і не была пераадолена.

Беларуская мадэль урбанізацыі характарызавалася дамінаваннем Мінска, канцэнтрацыяй насельніцтва ў вялікіх гарадах

і стагнацыяй малых гарадоў. Без сумневу, асновай гарадскога росту былі "ўцёкі з вёскі". У той час як за перыяд з 1950 да 1990 г. гарадское насельніцтва павялічылася з 1,6 да 6,9 млн. чалавек, сельскае насельніцтва паменшылася з 6,1 да 3,4 млн. чалавек. Доля гарадскога насельніцтва ў адносінах да ўсяго насельніцтва павялічылася за гэты часавы адрэзак з прыблізна 21% да 66%. Пры гэтым ступень урбанізацыі, якая звычайна служыць індыкатарам існавання ўрбаннага грамадства, была ніжэй за 70%.

У якасці савецкай індустрыяльнай метраполіі Мінск прыцягнуў да сябе амаль чвэрць насельніцтва БССР. За перыяд з 1950 да 1990 г. колькасць жыхароў горада павялічылася з прыблізна 274 тыс. да больш за 1,6 млн. чалавек. Аж да распаду Савецкага Саюза толькі дзесяць беларускіх гарадоў з насельніцтвам больш за 100 тыс. адпавядалі статусу "вялікага горада", і толькі абласныя цэнтры Брэст, Гомель, Гродна, Магілёў і Віцебск з колькасцю насельніцтва больш за 250 тыс. чалавек змаглі трапіць у катэгорыю "буйны горад". "Найбуйнейшы горад" Мінск адрозніваўся тым, што яго штогадовыя тэмпы росту, якія складалі 5,5%, у 1960-я гг. не былі дасягнуты ні адным параўнальна вялікім горадам СССР.

## 3 Урокі гарадской гісторыі Мінска

Для Мінска пасляваеннага часу ў кантэксце савецкага гарадскога планавання і ўрбанізацыі Беларусі характэрны чатыры моманты: а) "закрыты горад" як сімвал узаемасувязі міграцыі з вёскі і сістэмы прапіскі; б) "двухаблічны вобраз Савецкага Саюза" як праяўленне разыходжанняў паміж грамадскай і прыватнай сферамі жыцця; в) "абумоўленае месцам пражывання расслаенне" як паказчык сацыяльнай сегрэгацыі ў нібыта раўнапраўным грамадстве; г) "горад-герой" як ідэалагічная метамарфоза "сацыялістычнага горада". Гэтыя чатыры элементы характарызуюць амбівалентнасць савецкай метраполіі паміж полюсамі індустрыяльнага прагрэсу, каманднай сістэмы, "дэфіцытнай" эканомікі і традыцыямі. Планам партыі і дзяржавы супрацьстаялі абмежаваныя магчымасці прадпрыемстваў і ўстаноў, таму штодзённае жыццё рэгулявалася толькі цесным узаемадзеяннем сістэмы прывілеяў і ценявой эканомікі.

"Закрыты горад". Каб апісаць спецыфіку ўрбанізацыі Савецкага Саюза, неабходна паставіць пытанне аб палітычных патрабаваннях і сацыяльных праблемах, на якія павінны былі

рэагаваць планавальнікі гарадоў. На самай справе развіццё гарадоў у Савецкім Саюзе можна зразумець толькі на фоне перапляцення розных інтарэсаў: з аднаго боку, прадпрыемствы востра мелі патрэбу ў вялікай колькасці працоўнай сілы, з другога боку, выканкамы не маглі даць дастатковай колькасці жылля. У той час як партыйнае і дзяржаўнае кіраўніцтва рабіла стаўку на рацыянальнае размеркаванне прамысловага патэнцыялу па ўсёй краіне і на аднароднае развіццё іерархічна ўзгодненай сістэмы паселішчаў, насельніцтва спрабавала пазбегнуць працэсу калектывізацыі сельскай гаспадаркі і ў пошуках паляпшэння ўзроўню жыцця імкнулася ў горад.

У 1950–1960-я гг. Беларусь уяўляла сабой "грамадства плыннага пяску" (Мошэ Левін). У эпоху позняга сталінізму міграцыя стала, перш за ўсё, вынікам спусташэння вёскі. У нейкай ступені гэта можна растлумачыць дэмабілізацыяй Савецкай арміі і партызанскіх фармаванняў, а таксама арганізаваным наборам рабочай сілы (аргнабор). Пасля знішчэння значнай часткі беларускай эліты пад час Вялікага тэрору і яўрэйскай часткі насельніцтва ў перыяд нямецкай акупацыі ў Мінску адбыўся працэс перагрупоўкі гарадскога грамадства. Напярэдадні Другой сусветнай вайны беларуская сталіца знаходзілася пад юрысдыкцыяй Мінскай вобласці і аднаўленне краіны пасля вайны праходзіла пад знакам хаосу і імправізацыі, таму немагчыма даць ацэнку ні колькасці ахвяр, ні колькасці новаперасяленцаў, якія самавольна прыбылі ў горад. Меры па абмежаванні росту горада спатрэбіліся толькі пасля таго, як Крэмль у 1956 г. узаконіў права на звальненне, якое стварыла ўмовы для ўзнікнення ўсесаюзнага рынку працоўнай сілы. Для Мінска гэта азначала забарону на далейшае пашырэнне прамысловасці і ўвядзенне сістэмы прапіскі. Прапіска ў горадзе надалей была звязана з пацвярджэннем наяўнасці санітарнай нормы памерам 9 кв. м на аднаго чалавека. З улікам таго, што само мясцовае насельніцтва ў сярэднім мела толькі палову прадугледжанай законам жылплошчы, легальнае перасяленне ў горад было амаль немагчымым. Пасля таго як у 1963 г. санітарную норму павялічылі да 12 кв. м, стала зразумела: шматлікія шляхі пранікнення ў горад не могуць быць закрыты дэкрэтамі.

На практыцы механізмы па "закрыцці" горада не працавалі па самых розных прычынах, у тым ліку з-за ігнаравання законаў грамадзянамі, злоўжыванняў на ценявым рынку нерухомасці, падману і карупцыі ў адпаведных установах. Урэшце партыйнае і дзяржаўнае кіраўніцтва не магло абмежаваць рост горада. Апошні на дзве трэція быў выкліканы міграцыяй з вёскі.

Паколькі з 1932 г. членам калгаса не выдаваліся пашпарты і пакінуць вёску можна было толькі з дазволу старшыні калгаса, гаворка ішла пра дзве катэгорыі: з аднаго боку, гэта былі студэнты ВНУ і навучэнцы сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, якія пасля заканчэння вучобы спрабавалі застацца ў горадзе ў якасці "маладых спецыялістаў" або шляхам стварэння сям'і; а з другога боку, гэта былі лімітчыкі, якія атрымалі па хадайніцтве прадпрыемстваў часовую прапіску. З-за кепскіх умоў у інтэрнатах і на фоне ўсеагульнага дэфіцыту жылля абедзве катэгорыі былі вымушаны здымаць жылплошчу, яны часта не мелі магчымасці афіцыйна прапісацца або перапрапісацца. У выніку гэтага ў канцы 1960-х гг. колькасць насельніцтва, якое пражывала ў горадзе нелегальна, складала каля 3%.

Прымаючы пад увагу колькасць мігрантаў, якая ў 1973 г. склала 80 тыс. чалавек, ствараецца ўражанне, што працэсы "ўцёкаў з вёскі" і імклівай урбанізацыі літаральна выпрабоўвалі на трываласць дзяржаву і партыю. Відавочна, маладое пакаленне кіравалася дэвізам "гарадское паветра даруе свабоду". Кампраміс, на які пайшоў Мінгарвыканкам, часова адкрыўшы "шлюзы", каб аслабіць напор мігрантаў, пацягнуў, аднак, за сабой іх каласальную цякучасць. Інтэграцыя ў гарадское грамадства часта цярпела няўдачу па прычыне таго, што перасяленне было магчыма толькі часова і нелегальна, і жыллёвыя ўмовы новаперасяленцаў у большасці выпадкаў пакідалі жадаць лепшага. Лічба больш за 50 тыс. чалавек – мігранты, што з'ехалі з горада ці былі накіраваны на працу за яго межы ў 1979 г., – кажа сама за сябе. У культурным аспекце палітыка Хрушчова ў галіне сярэдняй адукацыі прывяла да таго, што мігранты ўжо ў другім пакаленні зазнавалі русіфікацыю. Нягледзячы на гэта, прыхільнасць насельніцтва Мінска да вёскі захавалася аж да распаду Савецкага Саюза: або праз падтрыманне кантактаў са сваякамі, якія пастаянна жылі ў сельскай мясцовасці, або шляхам набыцця дачы.

"Двухаблічны вобраз Савецкага Саюза". На падставе тэзіса аб "грамадстве плыннага пяску" неабходна звярнуць увагу на дваістую структуру савецкіх гарадоў і адрозніваць грамадскую і прыватную сферы. Гаворка ідзе пра тое, каб не толькі апісаць няўдачы ў гісторыі закладання і будаўніцтва праспектаў і цэнтральных плошчаў, а перш за ўсё пра тое, каб пранікнуць у сутнасць "шэрых зон" паўсядзённага жыцця і даследаваць субкультуры і грамадскае асяроддзе. Асаблівую ўвагу пры гэтым варта аддаць паўафіцыйным, багатым на нелегальную дзейнасць сфе-

рам (напрыклад, самавольна забудаваныя пасёлкі з драўлянымі дамамі і месцы сустрэч рэлігійных суполак).

Найважнейшым структурным элементам "сацыялістычнага горада" быў галоўны праспект, у Мінску – вуліца Савецкая, у 1952 г. перайменаваная ў праспект Сталіна, а ў 1961 г. – у праспект Леніна. Па ходзе праспекта размясціліся галоўныя плошчы горада. Там знаходзіліся ўсе асноўныя ведамствы, установы адукацыі і крамы. Афіцыйная функцыя плошчаў станавілася відавочнай у святы, калі пад час парадаў і дэманстрацый партыйнае і дзяржаўнае кіраўніцтва імкнулася, відаць, пераканаць масы ў сіле сваёй улады. Акрамя гэтага, непрапарцыйна вялікія памеры збудаванняў у цэнтры горада хутчэй сведчылі пра раз'яднанасць індывідаў у грамадстве. Ніякае іншае месца Мінска так не сімвалізуе правал ідэі "сацыялістычнага горада", як Цэнтральная плошча. Ні адзін з прапанаваных на шматлікіх архітэктурных конкурсах праектаў па афармленні "сэрца горада" так і не быў рэалізаваны. Прычыны гэтага трэба шукаць у галіне супярэчнасці інтарэсаў бюракратыі планавання і эканомікі горада. З аднаго боку, Саюз архітэктараў БССР і Упраўленне па справах архітэктуры, якое знаходзілася ў падпарадкаванні Савета Міністраў, пастаянна знаходзіліся ў нацягнутых адносінах. З другога боку, у будаўніцтве ўсё больш праглядалася неабходнасць эканоміі. Акрамя таго, інфраструктура заставалася па-за полем зроку. У той час як архітэктары спрачаліся пра першынства неакласіцызму або мадэрнізму, у развіцці горада выявіліся сур'ёзныя праблемы ў жыллёвым будаўніцтве і забеспячэнні пітной вадой. Пра адвольнасць атрыманага ў канчатковым рахунку горадабудаўнічага ансамбля можна меркаваць па тым, што Першы Сакратар ЦК КПСС М. С. Хрушчоў і Першы Сакратар ЦК КПБ П. М. Машэраў на працягу дзесяці гадоў параўноўвалі галоўны праспект Мінска з зусім не падобнымі да яго шыкоўнымі вуліцамі – Неўскім праспектам у Ленінградзе і Крашчацікам у Кіеве.

Каб Мінск адпавядаў патрабаванням "сацыялістычнага горада", пасля вайны ў цэнтры і на прылеглых да яго вуліцах пабудавалі дыхтоўныя добраўпарадкаваныя жылыя дамы: у кватэрах было электрычнае святло, цэнтральнае ацяпленне, гарачая вада і санвузел. Аднак, насуперак лозунгу Сталіна, разам з імі на паўднёва-заходняй перыферыі, быццам бы каля брамы, якая вядзе ў горад, размяшчаліся больш чым сціплыя рабочыя пасёлкі. Праўда, пасёлак трактарнага завода цалкам адпавядаў мадэлі горада-саду. Але магчымасцяў па забеспячэнні новаперасяленцаў неабходным жыллём відавочна не хапала. Масам, якія

накіроўваліся ў горад, патрабавалася спрыянне пры будаўніцтве індывідуальных драўляных дамоў на свабоднай тэрыторыі ў цэнтры і на ўскраінах. Інфраструктура была слаба развітай, а прапанова ў сферы паслуг – катастрафічнай, таму пра дэклараваную "нармалізацыю ўмоў жыцця" не вялося і гаворкі. У такіх умовах хутчэй вёска была перанесена ў горад. У цэлым жыллёвае будаўніцтва пасляваеннага часу, якое ажыццяўлялася прадпрыемствамі і арганізацыямі, арыентавалася не на попыт, а на вытворчасць. Спачатку планы былі накіраваны толькі на рассяленне рабочых на наяўнай жылой плошчы. Гаворка ніякім чынам не ішла пра тое, каб даць кожнай сям'і асобную кватэру. У гэтых умовах "камуналка" ператварылася ва ўрбанную форму пражывання. Без сумневу, меўся на ўвазе інструмент сацыяльнага кантролю. Па іроніі гісторыі, насельніцтва было вымушана пражываць калектыўна, што дыктавалася тагачаснымі ўмовамі; у гэта ўкладваўся зусім іншы сэнс, чым у горадабудаўнічыя ўтопіі 1920-х гг., якія мелі на мэце эмансіпацыю жанчыны. Замест гэтага ў барачных раёнах развілася вясковая субкультура, якая характарызавалася захаваннем традыцый сельскага ўкладу жыцця. У якасці асноўнай распазнавальнай прыкметы сталінізму можна назваць недахоп магчымасцяў для індывідуальнай самарэалізацыі.

Толькі масавае будаўніцтва пры Хрушчове дазволіла большай частцы насельніцтва ажыццявіць сыход у прыватную сферу. Партыйная праграма 1961 г. паставіла задачу на працягу дваццаці гадоў забяспечыць кожную сям'ю жыллём. Хоць востры недахоп жылля пасляваенных гадоў і змог быць пераадолены ў брэжнеўскі час пад эгідай выканкамаў, але ў якасці платы за гэта сем'і здавольваліся маламетражнымі і малагабарытнымі кватэрамі, не разлічанымі на сем'і з дзецьмі, што пагаршалася нездавальняльнымі сацыяльнымі ўмовамі ў мікрараёнах. З пункту гледжання дзяржавы, прынцып індывідуалізацыі мог адначасова перашкодзіць калектыўным пратэстам. З-за розніцы паміж попытам і прапановай абдзеленымі заставаліся перш за ўсё маладыя сем'і. Аднак перспектыва атрымання кватэры была асноўнай прычынай таго, што савецкаму кіраўніцтву ўдалося ўмацаваць у свядомасці насельніцтва "масавы кансэнсус" (Віктар Заслаўскі).

Цэлы шэраг прыкладаў з гісторыі штодзённасці сведчыць: насуперак знешняй карціне татальнага кантролю побач з "афіцыйным" Мінскам заўсёды існаваў Мінск "неафіцыйны". Неабходна назваць утвораны на паўднёва-ўсходняй ускраіне ў пачатку 1950-х гг. дзякуючы кемлівай прадпрымальніцкай жылцы неле-

гальны пасёлак Новыя Шэйпічы; згадаць паспяховы калектыўны пратэст жыхароў, што мерзлі ў адным з раёнаў напрыканцы 1950-х гг., які змог перамагчы волю кіраўнічага апарату сярэдняга звяна; у гэтым шэрагу стаіць і дзейнасць пяцідзясятнікаў у прыватных дамах горада на пачатку 1960-х гг., якая даводзіла да адчаю ўпаўнаважанага па справах рэлігійных культаў; а таксама жыццё загнаных у кут цывільных асоб у ваенным гарадку Усходні ў сярэдзіне 1960-х гг., якое нагадвала існаванне ў гета. У гэтым ракурсе для таго, каб зразумець савецкую сістэму ўлады, трэба браць пад увагу і патрон-кліенцкія адносіны, якія ў першую чаргу тычыліся эліты. Без сумневу, сацыялізацыя, звязаная з правам на эмансіпацыю, у Савецкім Саюзе была немагчымая па-за дзяржавай і партыяй. Для простага савецкага грамадзяніна, у адрозненне ад адданага партыі таварыша, была характэрна імправізацыя – следства ўсеагульнага дэфіцыту, а таксама здольнасць да згуртаванасці, якая выклікалася абмежаванымі жыллёвымі ўмовамі. Сацыялізму савецкага ўзору былі ўласцівы некаторыя вольнасці выканання на месцах загадаў, што спускаліся зверху.

"Расслаенне, якое вызначалася месцам жыхарства" савецкага насельніцтва. Па прычыне адсутнасці сацыялагічных дадзеных немагчыма вызначыць, ці была ў Мінску сацыяльная або этнічная сегрэгацыя. Праўда, абапіраючыся на прасторавую структуру горада, можна зрабіць выснову аб сацыяльнай арганізацыі грамадства. На іншым баку афіцыйнай класавай схемы ў Савецкім Саюзе ўтварылася пэўная стратыфікацыйныя мадэль грамадства, якая засноўвалася на "сістэме закрытых гарадоў" (Віктар Заслаўскі) і на індывідуальных жыллёвых умовах. Што тычыцца заробку, забеспячэння таварамі, устаноў адукацыі, сістэмы аховы здароўя і магчымасці правядзення вольнага часу, то ў Беларусі назіралася пагаршэнне ў напрамку ад сталіцы і вялікіх гарадоў да сярэдніх і малых гарадоў і вёсак. Да 1970 г. насельніцтва Мінска склала каля 1 млн. чалавек. 600 тыс. жылі ў асобных кватэрах. Пры гэтым неабходна бачыць розніцу паміж пабудаванымі ў стылі сталінскага ампіру шыкоўнымі жылымі дамамі ў цэнтры, недагледжанымі пяціпавярховымі дамамі з роўным дахам у мікрараёнах перыяду Хрушчова ("хрушчобы") і шматпавярховымі дамамі ў гарадах-спадарожніках эпохі Брэжнева. Каля 100 тыс. чалавек здавольваліся камуналкай, месцам у інтэрнаце або туліліся ў прымітыўным драўляным доме. 16 тыс. лімітчыкаў былі вымушаны жыць у часовым жыллі. Больш за 10 тыс. чалавек пражывалі ў горадзе на нелегальным становішчы. 27 тыс. чалавек кожны вечар выязджалі з Мінска, бо жылі за яго межамі.

Савецкі "горад-герой". Пасля таго як у брэжнеўскую эпоху стала відавочным, што канцэпцыя "сацыялістычнага горада" страціла сэнс, у Мінску была зроблена спроба стварыць новы міф. У 1974 г. Мінск стаў дзясятым па ліку горадам Савецкага Саюза, якому прысвоілі ганаровае званне "Горад-герой". Кангламерат з антыфашызму, партызанскай ідэалогіі і пацыфізму служыў з гэтага часу магічнай формулай, якая накіроўвала працоўны клас па шляху, паказаным партыяй. Фактычна гісторыя будаўніцтва горада пасля вайны пачалася з нуля. З сацыяльна-гістарычнага пункту гледжання пасля нямецкай акупацыі назіралася стыгматызацыя тых, хто супрацоўнічаў з акупантамі і быў вывезены ў Германію на прымусовыя работы, а таксама няўважлівае стаўленне да інвалідаў вайны і сем'яў загінулых. З ідэалагічнага пункту гледжання памяць пра вайну азначала частковае ажыўленне вопыту вайны, да якога належала толькі перамога, а не гора і пакуты, не кажучы ўжо пра Халакост. Такім чынам, культ герояў быў арыентаваны на будучыню. Напрошваецца здагадка, што міф пра партызанскую рэспубліку быў жаданнем аўтаноміі ад Крамля. За ўсім гэтым стаяла табу на смерць. Пра лёс ахвяраў можна было даведацца не ў горадзе, а ў спаленай дашчэнту вёсцы. У гэтым сэнсе Хатынь можна назваць нацыянальным мемарыялам. Размешчанае на паўночны ўсход ад сталіцы месца памяці міжволі сімвалізуе дылему беларускай гісторыі XX стагоддзя. Яно сведчыць пра дэфіцыт урбаннай культуры.

Такім чынам, можна зрабіць выснову, што ўсе ідэалагічныя мэты, ускладзеныя на "сацыялістычны горад", былі звязаны з фобіяй урбаннасці. З аднаго боку, маецца на ўвазе патрабаванне аб пераадоленні "супярэчнасцяў паміж горадам і вёскай", якое стала клішэ, а з другога – лозунг "сацыяльная гігіена шляхам разгрупавання пабудоў", які супрацьпастаўляўся заходнееўрапейскай канцэпцыі горада ("урбанізацыя праз павелічэнне шчыльнасці"). Калі ў беларускім выпадку браць пад увагу прымітыўныя ўмовы жыцця ў вёсцы, а таксама недахоп жылля і драўляныя дамы ў Мінску, незавершаны выгляд Цэнтральнай плошчы сталіцы і перанясенне мікрараёнаў на ўскраіны, то нельга не адзначыць, што ідэя "сацыялістычнага горада" ператварылася ў сваю супрацьлегласць. Звязаная з гэтым канцэпцыя мадэрнізацыі ў канчатковым рахунку пацярпела няўдачу з-за няздольнасці партыйнага і дзяржаўнага кіраўніцтва трымаць пад кантролем "грамадства плыннага пяску" (Мошэ Левін) і стрымліваць прыток насельніцтва ва ўрбанныя цэнтры. У 50–60-я гг. XX ст. "уцёкі з вёскі" сталі прычынай працэсаў "вымывання вёскі" і "асяляньвання горада" ў Беларусі.

# Дадатак

**Табліца І.** Насельніцтва Беларусі ў 1913–1991 гг.

| Год | Насельніцтва на пачатак года ў тыс. | Сярод іх | | У % | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | Горад | Вёска | Горад | Вёска |
| 1913* | 6899,1 | 990,1 | 5909,0 | 14,3 | 85,7 |
| 1939** | 8912,2 | 1854,8 | 7056,4 | 20,8 | 79,2 |
| 1941 | 9092,0 | 1968,7 | 7123,3 | 21,7 | 78,3 |
| 1950 | 7709,9 | 1619,5 | 6089,5 | 21,0 | 79,0 |
| 1955 | 7757,2 | 2064,4 | 5692,8 | 26,6 | 73,4 |
| 1960 | 8147,4 | 2605,1 | 5542,3 | 32,0 | 68,0 |
| 1965 | 8557,9 | 3208,6 | 5349,3 | 37,5 | 62,5 |
| 1970 | 9002,3 | 3907,8 | 5094,5 | 43,4 | 56,6 |
| 1975 | 9345,2 | 4678,2 | 4667,0 | 50,1 | 49,9 |
| 1980 | 9621,8 | 5391,4 | 4230,4 | 56,0 | 44,0 |
| 1985 | 9968,9 | 6111,4 | 3857,5 | 61,3 | 38,7 |
| 1990 | 10259,3 | 6799,6 | 3459,7 | 66,3 | 33,7 |
| 1991 | 10260,4 | 6881,0 | 3379,4 | 67,1 | 32,9 |

* У сучасных межах.
** Пасля далучэння Заходняй Беларусі – усходніх абласцей Другой Рэчы Паспалітай.

*Крыніца:* Население Республики Беларусь. Статистический сборник. Минск, 1996. С. 2.

**Табліца ІІ.** Гадавы прырост насельніцтва ў Беларусі ў 1959–1991 гг. (у тыс.).

| Год | Народанасельніцтва | | | Гарадское насельніцтва | | | Сельскае насельніцтва | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Агульны прырост | Экспаненцыяльны прырост | Баланс міграцыі | Агульны прырост | Экспаненцыяльны прырост | Баланс міграцыі | Агульны прырост | Экспаненцыяльны прырост | Баланс міграцыі |
| 1959 | 100,9 | 145,0 | -44,1 | 84,7 | 47,9 | 36,8 | 16,2 | 97,1 | -80,9 |
| 1960 | 85,9 | 146,2 | -60,3 | 102,8 | 52,1 | 50,7 | -16,9 | 94,1 | -111,0 |
| 1965 | 97,8 | 95,7 | 2,1 | 121,6 | 45,0 | 76,6 | -23,8 | 50,7 | -74,5 |
| 1970 | 77,0 | 77,7 | -0,7 | 145,5 | 53,2 | 92,3 | -68,5 | 24,5 | -93,0 |
| 1975 | 43,3 | 66,8 | -23,5 | 144,5 | 62,6 | 81,9 | -101,2 | 4,2 | -105,4 |
| 1980 | 73,1 | 58,9 | 14,2 | 141,7 | 67,3 | 74,4 | -68,6 | -8,4 | -60,2 |
| 1985 | 59,5 | 59,3 | 0,2 | 135,7 | 71,5 | 64,2 | -76,2 | -12,2 | -63,0 |
| 1990 | 1,1 | 32,6 | -31,5 | 78,0 | 51,6 | 26,4 | -76,9 | -19,1 | -57,8 |
| 1991 | 20,4 | 17,4 | 3,0 | 69,4 | 40,3 | 29,1 | -49,0 | -22,9 | -26,1 |

*Крыніца:* Население Республики Беларусь. Статистический сборник. Минск, 1996. С. 10–12.

**Табліца III.** Колькасць гарадоў і пасёлкаў гарадскога тыпу ў БССР у 1939–1989 гг.

| | 1939* | 1959 | 1970 | 1979 | 1989 |
|---|---|---|---|---|---|
| Усяго | 173 | 184 | 204 | 207 | 211 |
| < 3000 | 53 | 45 | 55 | 50 | 51 |
| 3000–5000 | 57 | 57 | 50 | 32 | 23 |
| 5000–10000 | 33 | 50 | 51 | 66 | 51 |
| 10000–20000 | 14 | 15 | 20 | 27 | 48 |
| 20000–50000 | 11 | 7 | 15 | 13 | 16 |
| 50000–100000 | 2 | 6 | 4 | 9 | 10 |
| 100000–250000 | 3 | 3 | 7 | 6 | 6 |
| 250000–500000 | | | 1 | 3 | 5 |
| 500000–1000000 | – | 1 | 1 | – | – |
| > 1000000 | – | – | – | 1 | 1 |

* Разам з землямі Заходняй Беларусі, далучанымі ў 1939 г.

*Крыніца:* Численность, состав и движение населения Белорусской ССР. Статистические материалы. Минск, 1996. С. 45; Население Республики Беларусь. Статистический сборник. Минск, 1995. С. 50.

**Табліца IV.** Размеркаванне насельніцтва ў гарадах і пасёлках гарадскога тыпу ў БССР у 1939–1989 гг. (у тыс.).

| | 1939* | 1959 | 1970 | 1979 | 1989 |
|---|---|---|---|---|---|
| Усяго | 1854,8 | 2480,5 | 3907,8 | 5234,3 | 6641,4 |
| < 3000 | 106,9 | 106,2 | 116,9 | 92,7 | 97,0 |
| 3000–5000 | 215,8 | 233,2 | 204,1 | 126,4 | 91,6 |
| 5000–10000 | 222,3 | 331,5 | 357,8 | 478,4 | 384,5 |
| 10000–20000 | 205,3 | 216,3 | 265,7 | 375,1 | 639,7 |
| 20000–50000 | 375,6 | 219,7 | 496,6 | 394,1 | 503,9 |
| 50000–100000 | 183,4 | 425,8 | 260,5 | 623,2 | 751,8 |
| 100000–250000 | 545,4 | 438,3 | 1026,9 | 916,9 | 862,3 |
| 250000–500000 | – | – | 272,2 | 968,3 | 1727,5 |
| 500000–1000000 | – | 509,5 | 907,1 | – | – |
| > 1000000 | – | – | – | 1259,2 | 1583,1 |

* Разам з землямі Заходняй Беларусі, далучанымі ў 1939 г.

*Крыніца:* Численность, состав и движение населения Белорусской ССР. Статистические материалы. Минск, 1996. С. 45; Население Республики Беларусь. Статистический сборник. Минск, 1995. С. 51.

**Табліца V.** Гарады з насельніцтвам больш за 100 тыс. жыхароў у БССР, 1897–1990 гг. (у тыс.).

| | **1897** | **1926** | **1939** | **1959** | **1970** | **1979** | **1989** | **1990** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Мінск | 91 | 132 | 239 | 509 | 907,1 | 1261,9 | 1589,4 | 1612,8 |
| Гомель | 37 | 86 | 139 | 168 | 272,3 | 382,8 | 500,8 | 506,1 |
| Магілёў | 43 | 50 | 99 | 122 | 202,3 | 290,4 | 359,2 | 362,6 |
| Віцебск | 66 | 99 | 167 | 148 | 230,8 | 296,6 | 350,0 | 356,4 |
| Гродна | 47 | 50* | 49 | 73 | 132,5 | 194,8 | 270,5 | 277,0 |
| Брэст | 47 | 48* | 41 | 74 | 121,6 | 177,3 | 258,0 | 268,8 |
| Бабруйск | 34 | 51 | 84 | 98 | 137,5 | 192,2 | 221,2 | 222,9 |
| Бара-навічы | Няма звестак | 23* | 27 | 58 | 101,5 | 130,7 | 159,3 | 162,8 |
| Барысаў | 15 | 26 | 49 | 59 | 84,1 | 111,7 | 143,8 | 146,8 |
| Пінск | 28 | 32* | 30 | 42 | 61,8 | 89,9 | 118,6 | 121,6 |
| Орша | 13 | 22 | 38 | 64 | 100,7 | 112,4 | 123,1 | 124,0 |
| Мазыр | Няма звестак | Няма звестак | Няма звестак | Няма звестак | 48,8 | 73,5 | 100,3 | 102,4 |

*1931 год як частка польскіх усходніх абласцей.

*Крыніца:* Bevölkerungsstatistik Weißrutheniens. Verzeichnis der kleineren und kleinsten Verwaltungseinheiten der Weißruthenischen SSR einschl. der 1939 eingegliederten Ostgebiete Polens sowie der Gouvernements Brjansk und Smolensk mit statistischen Angaben über ihre Bevölkerung auf Grund der sowjetamtlichen Volkszählung vom 17.12.1926 und der amtlichen polnischen Volkszählungen vom 30.9.1921 und 9.12.1931. Berlin, 1942. S. 70, 96, 82, 106; Численность, состав и движение населения Белорусской ССР. Статистические материалы. Минск, 1996. С. 21; Население Республики Беларусь. Статистический сборник. Минск, 1995. С. 7.

**Табліца VI.** Насельніцтва горада Мінска ў 1800–1991 гг. (у тыс.).

| | | | |
|---|---|---|---|
| 1800 | 6,7 | 1943 (I паўгоддзе) | 101,0 |
| 1811 | 11,2 | 1944 (чэрвень) | 110,0 |
| 1812 | прыкл. 3,5 | 1944 (10 жніўня) | 43,0 |
| 1825 | 15,6 | 1944 (27 кастрычніка) | 84,8 |
| 1840 | 22,5 | 1945 | 150,7 |
| 1863 | 30,1 | 1946 (1 студзеня) | 158,7 |
| 1885 | 58,4 | 1947 (1 студзеня) | 206,7 |
| 1890 | 75,5 | 1947 (1 кастрычніка) | 218,2 |
| 1897 | 90,9 | 1950 | 273,6 |
| 1913 | 106,7 | 1955 | 401,7 |
| 1917 | 154,0 | 1959 | 509,5 |
| 1920 | 104,0 | 1960 | 538,5 |
| 1921 | 103,0 | 1965 | 721,5 |
| 1926 | 131,6 | 1970 | 917,4 |
| 1931 | 163,0 | 1975 | 1121,7 |
| 1936 | 206,0 | 1979 | 1276,2 |
| 1941 | 270,4 | 1980 | 1307,0 |
| 1941 (пачатак ліпеня) | 70,0 | 1985 | 1476,8 |
| 1941 (канец ліпеня) | 150,0 | 1989 | 1613,0 |
| 1941 (кастрычнік) | 170,0 | 1990 | 1636,9 |
| 1942 (травень – лістапад) | 101,0–103,0 | 1991 | 1658,2 |

*Крыніца:* АМУС, ф. 49, воп. 1, спр. 1, арк. 25, 26адв., 41, 79адв., 182, 183адв., 246; ЦДАНДТ, ф. 6, воп. 2, спр. 20, арк. 18адв.; Минск: энцикл. справочник. Изд. 2-е, доп. и перераб. Минск, 1983. С. 9; Шибеко З. В. Минск в конце XIX – начале XX в. Очерк социально-экономического развития. Минск, 1985. С. 112; Шыбека З. Гарады Беларусі (60-я гады XIX – пачатак XX ст.). Мінск, 1997. С. 220; Население Республики Беларусь. Статистический сборник. Минск, 1996. С. 7; Gerlach Ch. Kalkulierte Morde. Die deutsche Wirtschafts- und Vernichtungspolitik in Weißrussland 1941 bis 1944. Hamburg. 1999. S. 419.

**Табліца VII.** Насельніцтва Мінска паводле нацыянальнага складу ў 1897–1989 гг. (у %).

| | 1897 | 1926 | 1939* | 1959 | 1970 | 1979 | 1989 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| а) абсалютныя лікі | | | | | | | |
| беларусы | 8164 | 55778 | 129066 | 325026 | 601890 | 871210 | 1153991 |
| рускія | 23474 | 16720 | 23409 | 116327 | 214260 | 282977 | 325125 |
| яўрэі | 46541 | 53686 | 73536 | 38842 | 47058 | 46332 | 39154 |
| палякі | 10369 | 13717 | 3580 | 5580 | 9419 | 14647 | 18479 |
| татары | 1146 | 1283 | Няма звестак | 1749 | 2182 | 2875 | 2925 |
| украінцы | – | 1465 | Няма звестак | 18345 | 35214 | 46226 | 53244 |
| астатнія | 1218 | 1648 | 9072 | 5542 | 9587 | 12073 | 17052 |
| б) у % | | | | | | | |
| беларусы | 9,0 | 42,4 | 54,0 | 63,8 | 65,6 | 68,4 | 71,8 |
| рускія | 25,8 | 9,6 | 9,8 | 22,8 | 23,4 | 22,2 | 20,2 |
| яўрэі | 51,2 | 40,8 | 30,8 | 7,6 | 5,1 | 3,6 | 2,4 |
| палякі | 11,4 | 3,4 | 1,5 | 1,1 | 1,0 | 1,2 | 1,2 |
| татары | 1,3 | 1,0 | Няма звестак | 0,3 | 0,2 | 0,2 | 0,2 |
| украінцы | Нет свед. | 1,1 | Няма звестак | 3,6 | 3,8 | 3,6 | 3,3 |
| астатнія | 1,3 | 1,3 | 3,9 | 0,7 | 0,8 | 0,7 | 0,9 |

*Вытворная абсалютных лікаў з працэнтных дадзеных.

*Крыніца:* Шибеко З. В. Минск в конце XIX – начале XX в. Очерк социально-экономического развития. Минск, 1985. С. 117; Bevölkerungsstatistik Weißrutheniens. Verzeichnis der kleinsten Verwaltungseinheiten der Weißruthenischen SSR einschl. der 1939 eingegliederten Ostgebiete Polens sowie der Gouvernements Brjansk und Smolensk mit statistischen Angaben über ihre Bevölkerung auf Grund der sowjetamtlichen Volkszählung von 17.12.1926 und der amtlichen polnischen Volkszählungen vom 30.9.1921 und 9.12.1931. Berlin, 1942. S. 42–43; Либерман Б. И. Город Минск. Минск, 1940. С. 23; Национальный состав населения Республики Беларусь и распространенность языков. Статистический сборник. Т. I. Минск, 2001. С. 37, 45.

**Табліца VIII.** Рост насельніцтва ў Мінску ў 1940–1991 гг.

| Год | Нара-джаль-насць | Смя-рот-насць | Экспаненцыяльнае павелічэнне (розні-ца паміж смерцямі і нараджэннем) | Пры-было | Выбы-ла | Мігра-цыйны прырост |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1945 | 4048 | 1826 | 2222 | 58274 | 8760 | 49514 |
| 1946 | 6428 | 1765 | 4663 | 61178 | 15236 | 45943 |
| 1947 | 7498 | 2313 | 5185 | 44158 | 26182 | 17976 |
| 1948 | 6642 | 1874 | 4768 | 39766 | 25412 | 14354 |
| 1949 | 7040 | 1810 | 5230 | 37013 | 24507 | 12506 |
| 1950 | 6963 | 1762 | 5201 | 35082 | 27722 | 7360 |
| 1951 | 7554 | 1760 | 5794 | 48418 | 27555 | 20863 |
| 1952 | 8544 | 1822 | 6722 | 44769 | 26802 | 17967 |
| 1953 | 8746 | 1880 | 6866 | 53490 | 25843 | 27647 |
| 1954 | 10368 | 2066 | 8302 | 50207 | 30145 | 20062 |
| 1955 | 11299 | 2162 | 9137 | 47905 | 30999 | 16906 |
| 1956 | 11787 | 2227 | 9560 | 40756 | 26880 | 13876 |
| 1957 | 12140 | 2229 | 9911 | 41977 | 22547 | 19430 |
| 1958 | 12992 | 2311 | 10681 | 39770 | 22327 | 17443 |
| 1959 | 13606 | 2417 | 11189 | 34434 | 18729 | 15705 |
| 1960 | 14482 | 2283 | 12199 | 34737 | 15184 | 19553 |
| 1961 | 14751 | 2293 | 12458 | 33505 | 16258 | 17247 |
| 1962 | 14709 | 2689 | 12020 | 32125 | 15521 | 16604 |
| 1963 | 14769 | 2831 | 11938 | 36028 | 16610 | 19418 |
| 1964 | 14060 | 2808 | 11252 | 38615 | 17249 | 21366 |
| 1965 | 13384 | 3002 | 10382 | 40496 | 19527 | 20969 |
| 1966 | 13110 | 3207 | 9903 | 43649 | 20647 | 23002 |
| 1967 | 13699 | 3308 | 10391 | 45665 | 25474 | 20191 |
| 1968 | 14583 | 3471 | 11112 | 54383 | 28187 | 26196 |
| 1969 | 15323 | 3962 | 11361 | 60096 | 29698 | 30398 |
| 1970 | 16774 | 4134 | 12640 | 60595 | 31906 | 28689 |
| 1971 | 18024 | 4352 | 13672 | 60825 | 34394 | 26431 |
| 1972 | 18593 | 4676 | 13917 | 61909 | 37908 | 24001 |
| 1973 | 19015 | 4868 | 14147 | 81140 | 38640 | 42500 |
| 1974 | 20729 | 5068 | 15661 | 74677 | 39837 | 34840 |
| 1975 | 21637 | 5449 | 16188 | 67845 | 41853 | 25992 |
| 1976 | 22609 | 5956 | 16653 | 65355 | 41823 | 23532 |
| 1977 | 22802 | 6069 | 16733 | 70091 | 44835 | 25256 |
| 1978 | 23321 | 6541 | 16780 | 73426 | 48242 | 25184 |
| 1979 | 24065 | 6878 | 17187 | 67841 | 50297 | 17544 |
| 1980 | 24942 | 7045 | 17897 | 64972 | 48397 | 16575 |
| 1981 | 25777 | 7158 | 18619 | 67078 | 48618 | 18460 |
| 1982 | 26784 | 7634 | 19150 | 66759 | 48989 | 17770 |

| Год | Нараджальнасць | Смяротнасць | Экспаненцыяльнае павелічэнне (розніца паміж смерцямі і нараджэннем) | Прыбыло | Выбыла | Міграцыйны прырост |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1983 | 29871 | 8124 | 21747 | 63696 | 47674 | 16022 |
| 1984 | 28616 | 8968 | 19648 | 60021 | 48326 | 11695 |
| 1985 | 27439 | 9134 | 18305 | 63023 | 45331 | 17692 |
| 1986 | 28261 | 8679 | 19582 | 57518 | 42940 | 14578 |
| 1987 | 27265 | 9132 | 18133 | 57892 | 41752 | 16140 |
| 1988 | 27360 | 9820 | 17540 | 58531 | 42639 | 15892 |
| 1989 | 25639 | 10360 | 15279 | 59208 | 40433 | 18775 |
| 1990 | 23508 | 10845 | 12663 | 52041 | 40558 | 11483 |
| 1991 | 20918 | 11794 | 9122 | 48768 | 37827 | 10941 |

